Міленка Ергавіч

АРЭХАВЫ ПАЛАЦ

Міленка Ергавіч

АРЭХАВЫ ПАЛАЦ

Раман

Пераклад з харвацкай Сяргея Шупы

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2019

УДК 821.163.4-31
ББК 84(4Хор)-44
Е69

Knjiga je objavljena uz financijsku potporu
Ministarstva kulture Republike Hrvatske.

Кніга апублікаваная з фінансавай падтрымкай
Міністэрства культуры Харвацкай рэспублікі.

На вокладцы выкарыстаны выявы маскаронаў
Вялікага Анофрыевага фантана ў Дуброўніку, Харватыя.

ISBN 978-985-23-0042-1

©Miljenko Jergović, 2003.
©Шупа С., пераклад на беларускую мову, 2019.
©Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2019.

XV

Пані Марыя, я – дачка, а не пачвара! Я даглядала яе трыццаць гадоў, так і ўсё маё жыццё прайшло, і нікому я не жалілася. Я не ўцякла, як дзеці ўцякаюць ад бацькоў. На другі канец свету ўцякаюць. І не дзіва, што ўцякаюць. Усякія бываюць сярод нас. Я была не такая і цяпер маю права нешта сказаць. Усю раніцу я хадзіла з кабінета ў кабінет, мяне ганялі з першага на чацверты паверх і назад. Не ведаю, чаму яны так робяць. Ці было б гэтак, калі б я прыйшла паведаміць пра забойства? Я не пачвара, пані Марыя, паверце мне, але мне палягчэла, паверце. Перада мной нібыта адкрыўся свет. І перад дзецьмі таксама. Ці можаце вы ўявіць сабе, як гэта – даглядаць родную маці і бачыць, як яна ператвараецца ў прывід, у страшыдла, у... не ведаю, як гэта ўвогуле назваць? Была маці, добрая ці дрэнная, няважна, я не ведаю, якая я сама сваім дзецям, дык не мне яе судзіць. Але ж я яе любіла! Я магу гэта сказаць і добра ведаю, што кажу. Але тры апошнія месяцы гэта ўжо была не яна. У яе ўсяліўся д'ябал! А я не веру ў д'яблаў, духаў, сурокі, калі б вы думалі, што я выдумляю. Але мы ўначы замыкаліся ў спальні, бо толькі так у тым доме можна было заснуць. Я і двое маіх дзяцей. Раніцамі я прыбірала тое, што яна паразбівала, прыбірала ейнае... ейныя спаражненні па хаце, яны былі на кожным кроку, на сценах, на столі, жах, вы не паверыце, колькі ўсяго з жывой істоты можа выйсці. За месяц была разбіта і запаскуджана кожная рэч у хаце. Вялікую дубовую шафу, якой ужо сто гадоў, важыць не меней за паўтоны, адной ноччу пасекла сякерай. А сякера вялізная, мужчына проста так не падніме! Вось такая, пані Марыя, была тая дзевяностасямігадовая старая, пра якую ўчора і сёння пішуць усе газеты. Я гэта разумею, для іх яна – мілая бабулька са Страдуна, у кожнага такая была. Кранальная*

* Да словаў, пазначаных зорачкай (*), маецца каментар у канцы кнігі.

карцінка, як мор цюленяў або сабакі ў скуралупні. Зараз усе разарвалі б таго хлопца, і ўрэшце яго разарвуць! Яму канец, ён ужо ніколі не будзе лекарам, дый хто ведае, які ён наагул выйдзе з турмы. Яго пасадзяць, я добра ведаю. Але чаму вы яго не схавалі? Людзі ж яго заб'юць! Чаму вы не возьмеце яго пад арышт? Няўжо чакаеце, пакуль сапраўды не прыйдуць па яго і не лінчуюць, як на Дзікім захадзе? Так бы ўся справа вырашылася. Без клопату і суду і вашага ўмяшання ў гэтую трагедыю. Так, пані Марыя, гэта трагедыя! Але не дзевяностасямігадовай старой, а таго хлопца, які нас уратаваў. Мяне і маіх дзяцей! Я магла б маўчаць, бо маё няшчасце падышло да канца, але я не буду, нават калі скончу, як ён. Калі трэба некага разарваць – вось вам мы: мы ўжо прызвычаіліся. З намі не можа здарыцца нічога, што з намі ўжо не здарылася. Смерць – не самае страшнае, пані Марыя! Горшае тое, што чалавек перажыве. І ганьба – не самае страшнае. Ёсць шмат яшчэ горшых рэчаў, і не дай божа, каб вы адчулі гэта на сваёй скуры. Ні вы, ні вашы блізкія. Я не змагу жыць з тым, калі той хлопец пацерпіць праз яе. Не жадаю, хай вы хоць сто разоў падумаеце, што я пачвара, а не чыёсьці дзіця! Але тое, тое, тое, не ведаю, як яго назваць, гэта не была мая маці! Калі б я паверыла, што гэта яна, я ў той самы момант скочыла б праз гэтае акно, праціснулася б паміж кратаў, але не вынесла б таго, што мяне нешта гэткае нарадзіла на свет. Думаеце, што я вар'ятка? Так, так, напэўна думаеце, што я звар'яцела, што я ў шоку, што ўсё, што я вам кажу, – няпраўда і што заўтра ўсё пераменіцца, калі нехта са мной пагаворыць, пераканае мяне, растлумачыць, пашле да псіхіятра, напхае, як гуску, заспакаяльнымі. Але вы памыляецеся! Вы не ведаеце, як вы памыляецеся, не ведаеце, колькі разоў за апошнія тры месяцы я хацела ўратаваць сваіх дзяцей і сябе, але не мела адвагі, не ведала, як даць рады, а сёння мне шкада, ніколі сабе не прабачу, бо гэта я вінаватая, што ў гэтага хлопца цяпер прападае жыццё. Так, я забіла б, і рука мая не задрыжала б, калі б я толькі ведала...

Марыя Каблар глядзела на жанчыну, якая не пераставала крычаць, і ёй было няясна, як тая трапіла ў яе кабінет, хто яе паслаў і з якой мэтай. Яна была ўсяго толькі паліцэйскім архіварыюсам, і ёй заставалася тры месяцы да пенсіі. Ужо два з паловай гады, ад

таго часу, як дакументацыя была кампутарызаваная, яна сядзела ў кабінеце нумар 407, нічога не рабіла і чакала, пакуль прыйдзе час заслужанага адпачынку. Яна піла каву, перакульвала мініяцюрны пясочны гадзіннік, ад восьмай да чацвёртай гадзіны паспявала перакуліць яго дакладна сямсот дванаццаць разоў; яна пералічвала шмат разоў, і заўсёды выходзіла сямсот дванаццаць. Яна рэдка чытала газеты або ўключала малы японскі транзістар, так што, можна сказаць, апрача кавы і пясочнага гадзінніка, яе працоўны дзень не меў ніякага іншага зместу. За два з паловай гады ў дзверы кабінета пастукалі разоў дзесяць, заўсёды памылкова, апрача аднаго разу, калі прыйшлі праверыць супрацьпажарнае абсталяванне. Напачатку яна баялася звальнення, а пасля супакоілася, зразумеўшы, што ўсе пра яе забыліся і наўрад ці хто знойдзе яе сярод двухсот супрацоўнікаў аж да таго дня, калі яна, дачакаўшыся шасцідзесяці пяці гадоў, пойдзе ў аддзел кадраў і паведаміць, што выходзіць на пенсію. Так і будзе, калі яна сама не прыгадае, дык не ўспомняць і яны, і яна можа сядзець там яшчэ дваццаць гадоў. Пасля таго, як шэсць гадоў назад яна развялася з мужам, які сышоў да дзяўчыны на трыццаць гадоў маладзейшай, і пасля таго, як паўміралі або выехалі з горада ўсе сябры і тыя, з кім яна магла б сустрэцца ў Гарадской кавярні, Марыя Каблар чакала ўжо толькі пенсіі, каб вярнуцца ў Гламач*, з якога выехала паўстагоддзя перад тым і дзе яе ўсё яшчэ, як ёй здавалася, чакаў жыццёвы спакой. Прыход незнаёмкі яе занепакоіў; яна баялася, што тая апынулася тут невыпадкова, бо адразу звярнулася да яе па імені; ну добра, імя напісанае на дзвярах, але пад ім напісана «старшы архіварыюс», таму малаверагодна, што адбылася памылка. Хутчэй нехта ўспомніў і вырашыў некага ёй падсунуць, хоць бы дзеля таго, каб нагадаць, што яна тут сядзіць, нічога не робіць і атрымлівае заробак. І акурат тады, калі ёй засталося працаваць усяго тры месяцы.

Думаю, што вы памыліліся, я не займаюся паліцэйскімі справамі, асцярожна вымавіла яна, гледзячы на заплаканую жанчыну праз акуляры. Так яна рабіла заўсёды, калі хацела выглядаць больш сур'ёзна і самаўпэўнена.

Я не памылілася. Я ўвесь час спрабую гэта сказаць, але ніхто мяне

не хоча выслухаць. Я сапраўды не памылілася. Я спрабую ўратаваць ні ў чым не вінаватага чалавека. А гэта не памылка. Гэта не грэх. Скажыце, хіба ўжо і гэта грэх? насядала госця. Яна выглядала даволі шчырай, але разам з тым невыносна тэатральнай. Або яна вар'ятка, або зачараваная тым, што апынулася ў будынку паліцыі.

Пані, я ўсяго толькі архіварыюс. І ніхто болей. Праўда... А дзе ў вас архіў? Тады пакажыце мне архіў!.. Ці вы прачыталі, што напісана на дзвярах?.. Не, нашто мне чытаць? схлусіла жанчына, а Марыю Каблар пачала ахапляць паніка. Значыць, нехта яе паслаў. Факт.

Той, хто паслаў вас да мяне, памыліўся. Паверце!.. Прабачце, а вы верыце ў Бога?.. А хто вы такая, каб у мяне пра гэта пытацца? разлавалася яна. Яшчэ і атэізм ёй прышыюць. Яна не разумела чаму. За тры месяцы да пенсіі ёй нічога не могуць зрабіць – ні па чалавечых, ні па дзяржаўных законах. Якая іх справа, ці ходзіць яна ў царкву, калі добра ведаюць, што не ходзіць.

Я ніхто, вось хто я. І не веру ў Бога, але веру, што чалавеку ўсё ў жыцці адплаціцца, усякае зло... Добра, і што тады? Чаму вы не хочаце мне дапамагчы? Наведніца сядзела, сціскаючы на каленях мініяцюрную лакаваную сумачку, з якімі ходзяць на пахаванне і ў тэатр. Гэтая дэталь Марыю трошкі засмуціла. Гумовыя боты на нагах у старога, што чакае ў чарзе ў банку, футболка University of Los Angeles на целе цыганёнка, які жабруе перад царквой, гальштук на смяротна хворым, спушчаная пятля на панчосе былой брытанскай прэм'еркі, чорная лакаваная сумачка ў руках у жанчыны, якая прыйшла ў паліцыю: падрабязнасці, якія заўсёды краналі яе мацней, чым відовішча сапраўднага няшчасця.

Я вам дапамагла б, але проста гэта не мая праца... Гэта нічыя праца. Страшна, што дапамагчы чалавеку стала працай... Але я вам, пані, не магу дапамагчы. Гэта проста не ў маёй моцы... Мяне завуць Дыяна. Вы напэўна ведаеце з газет... На жаль, я насамрэч вельмі рэдка чытаю газеты... Ну тады вы мусілі чуць на вуліцы. Пра гэта гаворыць увесь горад. Мэнгеле з нашага шпіталя пазбавіў жыцця дзевяностасямігадовую старую. Так пішуць... Паверце мне, я не ведаю. Не чула. Стараюся чуць як найменей. А гэта ваша маці?

Мне вельмі шкада, пані… Дыяна, вы не запомнілі? І нічога вам не шкада. Калі б вам было шкада, вы мяне выслухалі б... Хіба ж я не выслухала? Вы гаварылі, а я слухала... І хоць нешта зразумелі?.. Не... Вось бачыце. Вы толькі й чакаеце, каб я пайшла. Цярпіце мяне, бо вы прыстойная жанчына і не прагоніце мяне, як прагналі іншыя... Мне насамрэч шкада. Я ўпэўненая, што так не робіцца. Кожнага трэба было б выслухаць... Вы толькі так кажаце. Бо, па-вашаму, гэта прыгожа гучыць.

Марыя сапраўды верыла, што ў паліцыі мусіў бы працаваць нехта, чыім абавязкам было б толькі выслухоўваць людзей. Тады было б менш забойстваў з адчаю ці з помсты. Скажам, нейкі псіхіятр або святар, чыёй працай было б супакоіць людзей і пераканаць, што ўсё будзе добра.

Хто той хлопец, спыталася Марыя. *Які хлопец?.. Той, пра якога вы казалі. Хлопец, які не вінаваты... Доктар Арэс Улахавіч*, адказала Дыяна, быццам для яе гэтае імя мусіла нешта значыць. Марыя аўтаматычна кіўнула, нібыта і сапраўды значыла. А *хто ён вам?.. Ніхто, а хто б мусіў быць!* Дыяна расхвалявалася, адчуваючы нейкі намёк; яшчэ не пачаліся плёткі паміж суседзямі, а напэўна пачнуцца, яна ведала, што пачнуцца, і ведала, што найперш будуць гаварыць пра тое, што яна спала з маладым доктарам і таму цяпер родную маці гатовая прадаць, толькі каб уратаваць яго.

Чаму вы ўсе такія, чаму адразу думаеце пра гэта?.. Нічога я не думала. Проста пытаюся... Ці верыце вы, што родная маці можа ператварыцца ў пачвару, у некага зусім незнаёмага?.. Не ведаю. Думаю, што можа. Што заўгодна можа здарыцца з чалавекам у старасці... Дык чаму вы тады ў мяне пра яго пытаецеся?.. Вы думаеце, што... Не, не думаю, я ведаю, пра што вы падумалі... Ні пра што я не падумала, шчыра выбачаюся, але не падумала. Мне няёмка, вось я нават пачырванела, сапраўды ні пра што такое я й не падумала.

Марыя глядзела на яе і думала: ці гэтая жанчына вар'ятка, ці яна сапраўды сказала нешта такое, што не павінна была або не хацела сказаць. Ёй ніколі і ў галаву не прыйшло б рабіць такія намёкі. Яна зразумела, што ўжо не можа ад Дыяны проста так адвязацца. Калі Дыяна зараз выйдзе з кабінета, Марыя пойдзе на пенсію, вернецца

ў Гламач, будзе праводзіць свае дні там, дзе б меўся быць рай, але яе не перастане мучыць тое, што яна, магчыма, пакрыўдзіла і адштурхнула жанчыну, якая прыйшла да яе ў кабінет з сапраўднай праблемай. Упершыню за трыццаць гадоў працы ў паліцыі. Калі яна толькі ўладзілася працаваць у архіве і атрымала службовае пасведчанне і пісталет – былі такія часы, што выдавалі пісталеты і архіварыюсам – яна спадзявалася, што ўсё будзе, як у кіно. Інспектары будуць прыходзіць да яе з нявырашанымі выпадкамі дваццацігадовай даўнасці, яна будзе па начах капацца ў дасье і ў неістотных з выгляду дакументах знаходзіць ключы да разгадкі забойстваў і жыць трывожным жыццём поўным справядлівасці. Але ніколі нічога падобнага не адбылося. Праца ў паліцыі не адрознівалася ад працы на камунальным прадпрыемстве; яна парадкавала паперы, у якіх нікому ніколі не будзе патрэбы, а ўсяго праз шэсць месяцаў у яе забралі і пісталет. Мабыць, пачаліся гады эканоміі. Яна не марыла пра жыццё як у фільмах, не верыла, што яго заслугоўвае, толькі на кароткі час падумала, што нешта такое і з ёй можа здарыцца. Пазней ёй самой было смешна. Усё ж ёй тады было ўжо трыццаць пяць, не смаркачка нейкая, каб марыць пра такія рэчы.

А якой яна была, пакуль не састарэла? спыталася яна ў Дыяны, каб неяк выправіць становішча. *Я ўжо й не ведаю. Ва ўсякім разе была нармальная... Усё ў вас будзе добра. Адчуваецца, што вы моцная... Гэта вы так толькі кажаце. Вы мяне не ведаеце... Не ведаю, але адчуваецца, калі жанчына гатовая да барацьбы... Вы верыце ў такія рэчы?.. Мушу верыць. Інакш я не магла б... Не маглі б працаваць у паліцыі?* Марыя ўсміхнулася, і толькі тады Дыяна заўважыла адбітак гадоў на яе твары. І яна паверыла, што гэтая жанчына сапраўды нічога не вырашае. Мабыць, таму яна і не прагнала яе.

Не, я думала не пра гэта. А проста пра жыццё. Хочаце, я замоўлю нам кавы? Гэта і праўда найбольшае, што я магу для вас зрабіць... Добра, і гэта ўжо хоць нешта, сказала Дыяна і павесіла сумачку на білца крэсла. Знак даверу, які не застаўся незаўважаны.

Цяпер мне ўжо крыху лягчэй, сказала Дыяна пасля таго, як юнак у чорна-белай уніформе афіцыянта прынёс каву. Яна паглядзела на яго: чарнявы, прышчаваты, з тонкім чорным пушком пад носам.

Першы курс вучэльні, сказала Марыя, калі ён выйшаў, у *паліцыю іх прысылаюць на практыку. Так лягчэй, чым наймаць прафесіянала... Вы гэта сказалі якраз так, як кажуць у паліцыі. Ніхто б так не сказаў: прафесіянала,* усміхнулася Дыяна. *Я рада, што вам ужо лепей... Але вы ўсё яшчэ думаеце, што я вар'ятка?.. Скажу вам шчыра: нічога я не думаю. Толькі ведаю, што вам нялёгка. Як і кожнаму, хто ўваходзіць у гэты будынак. Вядома, калі толькі не атрымаць новыя правы... Мне было вельмі важна, каб вы мне паверылі. Каб мне хоць нехта паверыў... Я вам веру. Кожнаму слову. З чаго б вам хлусіць старому архіварыюсу? Такога яшчэ ніколі не было. І не будзе. Яшчэ тры месяцы, і я выйду на пенсію... Па старасці? Немагчыма,* схлусіла Дыяна, *вы зусім не выглядаеце на столькі гадоў... І больш ніколі не ўвайду ў гэты будынак. Паглядзіце на гэтую сцяну. Тут некалі стаялі дасье з нераскрытымі сэксуальнымі злачынствамі. Ад столі да падлогі, уся сцяна поўная згвалтаванняў. Да мяне тут працаваў нейкі чалавек з Трэбіня, яго звольнілі, бо ён чытаў усе тыя жахі, і аднойчы яго заспелі за тым, як ён мастурбаваў. Можаце сабе ўявіць? Самазадавальняцца, чытаючы пра згвалтаванне пятнаццацігадовай дзяўчынкі! Думаю, мяне і прызначылі на гэтае месца, бо я жанчына, дык можа і не ўвайду ў спакусу. Вось такая гісторыя пра паліцыю і маю працу ў паліцыі... А дзе цяпер тыя дасье?.. Думаю, што бальшыня іх знішчана за даўнасцю гадоў. Хто б захоўваў дакументацыю пра згвалтаванні трыццацігадовай даўнасці. Нядаўна большая частка архіву была камп'ютэрызавана. Ад таго часу я сяджу і нічога не раблю... Значыць, пра гэта цяпер больш нічога не вядома. Цягнік прайшоў, быццам нічога ніколі і не здарылася... Ну так. Больш-менш... Гэта несправядліва. Нехта ж гэта зрабіў. У сэнсе, згвалціў. І нейкія жанчыны пацярпелі. Гэта ўжо на ўсё жыццё... Бальшыні з іх ужо няма... Усё роўна несправядліва... Я згодная, але што цяпер зробіш.* Марыя падумала, што, можа, і гэтая жанчына была згвалтаваная. Ніколі не ведаеш, калі скажаш нешта непатрэбнае. Таму лепш заўсёды быць уважлівай, пра што б ні была гаворка, і пра непрыгожае і сумнае гаварыць як мага асцярожней. Вось, мабыць, і не трэба было казаць, што было ў тых дасье, бо, можа, і яна...

Той лекар будзе абвінавачаны ў забойстве маёй маці, сказала Дыяна, *і што цяпер мне рабіць? І не забіў ён яе, і гэта ўжо была не яна.* Марыі не спадабалася, што размова зноў вяртаецца на пачатак. Яна хацела, каб Дыяна супакоілася, а не пераклала на яе плечы нешта, ад чаго, ясная рэч, можа быць толькі шкода і нейкі супольны сорам. Яна адчула гэта як небяспеку, якая набліжаецца і якую можна пазбегнуць, толькі калі Дыяна адступіцца ад таго, што надумала.

Найлепш было б дачакацца суду, сказала Марыя, *паліцыя так проста не адступае. Калі ўжо ўчэпяцца, то так лёгка не адпусцяць. Мая вам парада – чакаць і нікому нічога не казаць. Ведаеце, горад малы... Што вы гэтым хочаце сказаць?* яна нахмурылася і выпрастала спіну. *Тое, што брыдкія чуткі лёгка разыходзяцца. Людзі толькі й чакаюць ахвяры... Але ахвяра не я, а хлопец, які ні за што ні пра што трапіць у турму.* Дыяна ўжо падумала ўстаць і пайсці, не сказаўшы больш ні слова, бо ўсё гэта не мае сэнсу. Калі нехта такі бяздушны і не хоча зразумець, што гаворка тут не пра сваркі на рыбным рынку ці на дзіцячай пляцоўцы, а пра тое, ці зусім невінаваты чалавек, няважна хто, пацярпіць ні за што і заплаціць жыццём за нешта, чаго можна было б і пазбегнуць, калі б толькі мы былі людзьмі.

Калі чутка разыдзецца, спрабавала Марыя яе супакоіць, *тады ўсё будзе дарэмна. Тады і суд вам не паверыць. Я тысячу разоў бачыла такія сітуацыі.* Яна хлусіла, бо і ў судзе ніколі не была. *Вы будзеце сведчыць праўду, а другі бок зробіць з вас вар'ятку. Абвінаваўчы бок запросіць сведкаў, найчасцей суседзяў, якія скажуць, што вы ненармальная і заўсёды былі такая. Не віталіся, калі сустракалі іх на лесвічнай пляцоўцы, мучылі родную маці, якая, вядома ж, была цудоўнай жанчынай, і ўсё такое. Папярэджваю, такое заўсёды канчаецца аднолькава,* расла ў Марыі самаўпэўненасць, і яна імгненна прыдумала цэлую гісторыю: *Аднойчы здарылася, гэта было даўно, напэўна гадоў трыццаць таму, што адзін стары, капітан на пенсіі, які жыў на Лападзе*, згарэў у сваёй кватэры. Паліцыя прыйшла да высновы, што было ўчынена самагубства, але ягоная дачка, пазней яна мусіла перабрацца ў Аўстралію, хадзіла па Дуброўніку і расказвала, што бацька не пакончыў з сабою, а што яго дзеля спадчыны*

забіў родны сын, яе зводны брат. І што вы думаеце, як справа скончылася і каму паверылі? Так што лепш вы спакойна дачакайцеся суду, а тады скажаце праўду. Можа, людзі будуць шакаваныя, можа, на вас усякае будуць казаць за спінай, але вам паверацъ...

Вы так думаеце? Не ведаю, як я буду жыць, калі не зраблю нешта для гэтага хлопца, сказала Дыяна, і Марыі гэта прагучала як прыгожая хлусня чалавека, які ўсё жыццё пагражае дзеля нечага ахвяраваць сабою. Але як бы там ні было, яна не хацела ўблытвацца ў гэтую гісторыю, асабліва цяпер, калі да канца было так блізка. Марыя Каблар гэты канец адчувала не як выхад на пенсію, а як канец жыцця поўнага непаразуменняў і падманаў, да якіх ёй ніколі не ўдавалася прыстасавацца, і дзе ўсё нагадвала бясконцыя аўтамабільныя курсы. Інструктары мяняліся, крычалі на яе і нервавaліся, бо яна за столькі гадоў не магла навучыцца таму, на што іншым дастаткова два месяцы. Не было ў такім жыцці занадта ні клопатаў, ні смутку, усё праходзіла лёгка, але без нейкай мэты і сапраўднага задавальнення. Пасля таго, як яе кінуў муж, яна зразумела, што ніколі яго не кахала, але сама не магла ні на што рашыцца, бо сваё каханне або яго адсутнасць не мела з чым параўнаць. Для каго іншага самота пасля гэтулькіх гадоў шлюбу была б невыносная, але Марыя ўжо на другую раніцу пасля мужавага адыходу пачала і далей жыць сваім жыццём, быццам заўсёды была старой векавухай, з рытуаламі, якія ўсе былі падобныя да таго з пясочным гадзіннікам. Нязручнасць яна адчувала толькі ад цемры і таго, чаго ў цемры не відаць, а таксама ад таго, што пасля ягонага адыходу яна больш ні з кім не размаўляла даўжэй за дзесяць хвілін. Яна пачала заўважаць, хто вакол яе памёр, знік ці выехаў з горада, а пасля і сама вырашыла, што ўжо на першым месяцы пенсіі пакіне гэты пусты горад і вернецца ў Гламач. Усё жыццё было канчаткова растрачана, але яна аб гэтым не шкадавала. Толькі хацела, каб тое, што настане пасля, будзе такім, якім яно было да таго, як яна пачала ўсведамляць сябе жывою. Дыяніна з'яўленне было першай сур'ёзнай пагрозай яе спакою.

Толькі будзьце спакойная, сказала яна, *і нікому занадта не верце.* Дыяна павярнулася па сваю сумачку, *вы мне дапамаглі, праўда дапамаглі!* І яна сапраўды ў гэта верыла. Марыя ўстала, рукавом

зачапіла кубачак, толькі каб пачуўся звон парцаляны. *Было вельмі прыемна пазнаёміцца,* сказала яна і працягнула руку. *Мы яшчэ абавязкова ўбачымся,* адказала ёй Дыяна, шукаючы на стале і пад сталом, ці яна чаго не забылася. Яна выходзіла задаволеная, хоць і не дамаглася нічога з таго, што намервалася, ідучы ў паліцыю. Нават не расказала, што́ адбывалася ў гарадскім шпіталі, дзеля чаго доктара Ўлахавіча трэба было цалкам апраўдаць і спыніць цкаванне, якое працягваецца ў газетах і на гарадскіх плошчах. Яна была задаволеная, што дабілася таго, каб яе паўгадзіны нехта слухаў, што б яна ні казала, бо для яе гэта магло значыць новы пачатак, пасля чаго можна забыцца пра мінулыя месяцы, пра час, які ў нейкі момант здаўся канчатковым і суцэльным крахам, калі яна перастала памятаць, як яе маці некалі выглядала і ці яна наагул мела маці.

Марыя вярнулася да свайго чакання. Яшчэ разоў дваццаць перакуліла пясочны гадзіннік, і так мінуў яшчэ адзін дзень. Збіраючыся дадому, яна ўзяла кубачкі ад кавы, каб паставіць іх на радыятар перад сваім кабінетам, адкуль іх падбярэ юнак у чорна-белай уніформе афіцыянта, і яна яшчэ раз, магчыма апошні, успомніла пра госцю. Некага іншага гэтая гісторыя зацікавіла б, падумала яна, людзі занадта цікаўныя, таму з імі і здараецца ў жыцці столькі няшчасцяў. Калі не ведаеш таго, чаго табе не трэба ведаць, і таго, што не звaліцца на галаву табе і тваім блізкім – калі яны ў цябе ёсць, дык шмат дрэнных рэчаў проста абыдуць цябе стараной. Задаволеная сабою яна замкнула кабінет і знікла.

XIV

Пасля таго, як вар'ятка Ма́нда падчас сваіх начных шаленстваў разбіла кулаком тоўстае матавае шкло ў кухонных дзвярах і раніцай яна знайшла яе ў лужыне крыві і спаражненняў, такую бледную, нібыта з яе ўжо выцекла ўсё жыццё, Дыяна выклікала хуткую дапамогу. Досыць было ўжо хлусні і падманаў, яна больш не магла хаваць ад горада тое, што горад насамрэч ужо ведаў – што яе маці на дзевяноста сёмым годзе жыцця зусім страціла розум. Але як: яна лаялася і праклінала найгоршай кляцьбою і найстрашнейшымі спосабамі, выварочваючы вантробы блізкім і паказваючы сябе так, як непрыстойна паказваць, нават калі чалавек яшчэ малады. Яна раздзявалася дагала, худая як прывід, хапалася за высахлую цыцку і крычала: *хочаш малака, курва партовая, хочаш, пакармлю тваіх байструкоў?* Або хапала сябе паміж ног і, пускаючы струмень, казала: *глядзі, сухапіздзіна, што такое жанчына!* Дыяна ад гэтага і ад яшчэ горшых рэчаў хавала дзяцей як магла, але страшнейшым за тое, што адбывалася ў іх у душах, было для яе тое, што нехта яшчэ мог пачуць вар'ятку Манду – так адной ноччу Дарыян назваў сваю бабку Рэгіну, і пасля таго ўсе трое пачалі званць яе гэтым імем, магчыма, спрабуючы пераканаць сябе, што яна не мае нічога агульнага з бабуляй, з якой яны жылі раней. Дыяна ўжо два з паловай месяцы, амаль адразу пасля таго, як пачалося найгоршае, спрабавала ўладкаваць маці ў гарадское псіхіятрычнае аддзяленне, але там не было месца і для нармальных, а дзе ўжо для вар'ятаў. Дзясятак хранічных псіхічнахворых, пакінутых сем'ямі, гадамі займалі палову аддзялення, тым часам як другая палова належала нервова знясіленым ветэранам вайны і некалькім дзецям з лепшых сем'яў, якія прайшлі ўжо дзявятае кола наркатычнага пекла і не было ім ратунку, а бацькі хацелі схаваць іх ад людзей. Месца для нейкай шалёнай і агрэсіўнай бабулькі там не было. Можа, знайшлося б месца

ў якім іншым аддзяленні, Рэгіна і так хварэла на сотню хваробаў, але Дыяна яшчэ магла змірыцца з тым, каб псіхіятры пабачылі, у што ператварылася яе маці, але каб гэта бачылі іншыя дактары – да гэтай раніцы пра такое не магло быць гаворкі.

Хуткая дапамога прыехала праз гадзіну. *Што гэта, свінні тут жывуць ці што?* не стрымаўся тоўсты санітар з паголенай галавой. Дыяна ў паніцы прыдумляла, што б схлусіць, яна думала пра гэта ўвесь час, пакуль чакала хуткую, але нічога, што магло б растлумачыць карціну дарэшты зруйнаванай, засранай, засцанай і закрываўленай кватэры, не прыходзіла ёй у галаву. Мірне і Дарыяну яна сказала зачыніцца ў спальні, пакуль вар'ятку Манду не адвяжуць. Лепш, каб санітары іх не бачылі.

Ану, бабка, хадзем, сказаў лысы і паспрабаваў падхапіць яе пад пахі, пакуль ягоны калега, немалады сівы худзяга ў акулярах, хацеў узяць яе за ногі, але вар'ятка Манда імгненна павярнулася і схапіла яго зубамі за руку. *Матка боска*, адскочыў ён на два метры назад, *а ты што маўчыш, яцітваю, супакой яе!* зароў ён на Дыяну. Яна стаяла ля сцяны, на якой былі відны сляды гідоцця, якое ў адну з мінулых начэй старая размазвала па сценах; яна маўчала і глядзела ў падлогу. *Яна ненармальная,* урэшце прамовіла яна. *Во як, а мы думалі, што ты яе тут трымаеш, каб вартавала хату і кусала паштароў!* сказаў сівы. Лысы зноў рушыў на вар'ятку Манду, гэтым разам ён зайшоў ёй з-за спіны, але яна вывернулася, як котка, і клацнула зубамі. *Не наша гэта праца, хадзем адсюль!* сказаў сівы. *Людзі, не адыходзьце, прашу вас*, узмалілася Дыяна. *Сіньярына, мы больш па інфарктах і пнеўманіях, калі трэба – выклікайце нас, а з гэтымі справамі выклікайце некага іншага*, сказаў сівы. Лысы стаяў над вар'яткай Мандай і глядзеў на яе зверху: *А калі б я цябе трэснуў нагой у галаву!* Яна шалёна шчэрылася, бліскала рэдкімі і вострымі жоўтымі зубамі і чакала нагоды схапіць яго за яйцы.

Тут Дыяна зразумела, на што трэба ціснуць, вырашыўшы любою цаной скончыць тое, што пачала. *Забярыце яе, прашу вас!* узмалілася яна перад лысым. *А куды ж яе забіраць, калі мы нават не ведаем як?.. У шпіталь. Бо сцячэ крывёю... Калі не сцякла дагэтуль, не сцячэ і адгэтуль*, зноў умяшаўся сівы, *хадзем, Дамір, пакуль старая не цап-*

нула цябе за задніцу, сам ведаеш, у шпіталі няма нічога ад слупняку, жартаваў ён, стараючыся як мага хоць неяк прынізіць Дыяну, *ніхто нам не паверыць... А можна за сто марак?* папрасіла яна лысага. *Ані за пяцьсот!* кінуў ёй сівы праз плячо. *Будзьце ж вы людзьмі, дзеля Бога!* маліла яна. *Ану, зараз баба вам дасць пізды кавалачак!* раптам і вар'ятцы Мандзе спадабалася ідэя, што яе некуды павязуць. *Ай, дай кожнаму па сто марак*, злітаваўся лысы. *Я не павязу, божа барані!* упіраўся сівы. *Павязеш, Трыпуне*, сказаў лысы, а *ты не глядзі!* звярнуўся ён да Дыяны і схапіў старую сярэднім і вялікім пальцамі за шыю, яна захрыпела, *баліць, старая, баліць, га? будзеш кусацца, наступны раз не адпушчу*, сказаў ён і ўхапіў яе пад пахі. Вар'ятка Манда, відаць, зусім гэтага не чакала і не паспела зрэагаваць, але Трыпун не паспеў узяць яе за ногі, і яна пачала шалёна малаціць імі па паркеце. *Трымай яе, Трыпуне!* што той цяпер і спрабаваў рабіць, бо яму ўжо надакучылі яе выварочванні, але таму, што старая нечакана зноў набралася сілы, яму гэта цяжка ўдавалася, і яна раз за разам трапляла яму то ў нос, то па барадзе.

Ну ўсё, старая курва! крыкнуў ён, калі ўрэшце здолеў схапіць яе за худыя калені. Ён адчуў, як яе рэпкі пад яго вялікімі пальцамі труцца аб вярхі зношаных костак. Ён зморшчыўся, як быццам паскроб пазногцямі па школьнай дошцы.

Пакуль яе зносілі па сходах, вар'ятка Манда вішчала, *людзі, ратуйце, забіваюць, рэжуць!* і было відаць толькі, як на дзвярах адсоўваюцца шторкі з вочак, праз якія суседзі падглядаюць і ўсё запамінаюць. Дыяна ішла пару прыступак ззаду, у хатніх пантофлях, з чорнай лакаванай сумачкай праз плячо і двумастамі нямецкімі маркамі ў потнай руцэ.

У карэце хуткай дапамогі лысы дастаў шпрыц і старой, якую Дыяна і Трыпун ледзь трымалі на ляжанцы, проста праз хатнюю сукенку ўсадзіў іголку ў азадак. *Ну, баба, зараз супакоішся!* Праз пяць хвілін Рэгіна Дэлавале ляжала як мёртвае муміфікаванае цела з лагоднай усмешкай на спакойным і мірным твары, у якім Дыяна тады апошні раз бачыла нешта, што нагадвала ёй маці. Калі яна спіць, яна такая, як была раней, падумала яна, упэўненая, што лепш бы ўсё жыццё заставалася побач з гэтым нерухомым целам і даглядала

б яго, чым яшчэ раз, хоць бы і на пяць хвілін, у ім прабудзілася б вар'ятка Манда.

Перад самым шпіталем лысы ўсадзіў яшчэ адну ін'екцыю. *Глядзіце, я за тое, што цяпер раблю, магу страціць працу*, сказаў ён. *У прыёмным пакоі скажаш, што вы знайшлі яе непрытомную ад страты крыві. Не дай Бог ляпнеш, што́ я ёй зрабіў, знайду, дзе б ты ні была і вырву язык, ясна?* Дыяна кіўнула. *Ты што, здурнеў? Як ты ёй можаш верыць!* уздыхнуў Трыпун. *А цяпер грошы на бочку!* Дыяна падала лысаму дзвесце марак, ён узяў толькі адну паперку. *Другую яму!* махнуў ён указальным пальцам так, нібыта яе праганяе. *Ну, дачакаўся я, што баба за мяне плоціць!* пажартаваў Трыпун, працягваючы далонь.

У прыёмным пакоі Дыяна аддала Рэгініну медычную карту і вываліла ўсю неабходную хлусню маладой доктарцы, напэўна, стажорцы, прыгажуні з вялікімі чорнымі вачыма, якая аднолькава прыгожа ўсміхалася і хмурылася. *Не хвалюйцеся, усё будзе добра*, сказала доктарка, пагладзіўшы яе па плячы. *Я буду яе даглядаць як родную бабулю!* Зусім нечакана ў Дыяны з вачэй пырснулі слёзы. Яна горка плакала на поўных грудзях незнаёмай дзяўчыны, якая ў непрытомнай вар'ятцы Мандзе бачыла сваю бабулю і якую яна, Дыяна, падманула, як не падманвала нікога ў жыцці. Плакала і не магла перастаць, па сабе і па той дзяўчыне і па тым, што адбудзецца, калі вар'ятка Манда прачнецца і дзяўчына зразумее, што такое жах і ў што можа ператварыцца прыгожая і кранальная гісторыя. *Прабачце, калі ласка*, румзала яна, а маладая доктарка нават не ведала, за што прабачаць, яна да такіх выпадкаў не была падрыхтаваная. Калі яна пачынала працаваць, ёй, напэўна, далі сотню парадаў, як сябе паводзіць з хворымі і іх роднымі, калі трэба схлусіць і калі сказаць праўду, але ёй не сказалі, што рабіць, калі ў цябе ў абдымках жанчына, якая магла б быць тваёй маці, чые гарачыя слёзы – найдзіўнейшая вадкасць, якую ты калі-небудзь адчувала на сваім целе. Магчыма, гэта больш за ўсё нагадвала парафін, які сцякаў па свечцы адной даўняй зімовай ноччу на Колачэпе*, а яна лавіла тыя гарачыя кроплі сваёй далонню.

Вяртаючыся дадому са складзеным маладой доктаркай спісам

рэчаў, якія па абедзе трэба было прынесці вар'ятцы Мандзе – піжаму, хатні халат, мыла, шпількі, зубную шчотку, – Дыяна ведала, што не паспее пераступіць парог кватэры, як старая ўжо прачнецца – і разматаецца клубок сораму, і ўвесь шпіталь даведаецца праўду, што Рэгіна Дэлавале не ўпала ў кому ад страты крыві, а што яе нечым усыпілі, каб падкінуць вар'ятку дактарам. Нічога такога ніколі яшчэ не здаралася, прынамсі яна не чула, і таму гісторыя будзе яшчэ цікавейшая, будзе яшчэ ахвотней і хутчэй пераказвацца, аж пакуль не дойдзе да апошняй гандляркі на рынку. А тады пачнецца паласканне яе імя, і гэта будзе цягнуцца гады й гады, і перажыве вар'ятку Манду, перажыве Дыяну і стане вечным дадаткам да сямейнага прозвішча, непарушнейшым за гарадскія муры і мацнейшым за моц святога заступніка. Тут стагоддзямі памятаюць, хто ў каго ў сям'і быў вар'ятам, захоўваюць успаміны пра дэбільных дзяцей, якія паміралі, не дажыўшы да сямі гадоў, ведаюць, чый брат згвалціў чатырнаццацігадовую дзяўчынку і кінуў яе ў расколіну ў скале над Попавым полем і чыя прабабка ўцякла з туркам, а пасля задзірала спадніцу на ізмірскіх завулках і прымала ў сябе французскіх гандляроў і падарожных пісьменнікаў, памятаюць кожнага байструка, народжанага ад таго часу, калі гэты горад быў яшчэ не горадам, а навіслай над морам крушняй камення, занатоўваюць весткі пра здарэнні ў далёкіх азіяцкіх партах, пра кожныя пранцы, трыпер і ганарэю, і няма такой сям'і, якая жыла б у горадзе хоць адно пакаленне і каб з ёй не звязвалі прынамсі дзясятак ганебных гісторый, адзіная абарона ад якіх – што і ў чужым двары ці радаводным дрэве можна назбіраць гэтулькі ж брыды і мярзоцця. Яна ведала, што ёй давядзецца з гэтым немінуча змірыцца, і не была да гэтага гатовая. Яе агортваў жах ад думкі, што ёй давядзецца адказваць такой самай меркай кожнаму, хто пачне казаць нешта брыдкае ці пра каго яна пачуе, што ён разносіць благую славу і цешыцца гэтым.

Дзяцей яна дома не заспела. Яны па звычцы ўцяклі з хаты, як уцякалі апошнія месяцы, дый што ім было рабіць у пакоях, дзе няма на што сесці і нельга нічога ўзяць у рукі, каб яно не было запаскуджана. Яна стаяла пасярод таго, што некалі было гасцёўняй, няздольная паварушыцца. Ні мятлой, ні шчоткай не вычысціць

і не вымыць таго, на што не хапіла б і спецфургона гарадской камунальнай службы разам з камандай санэпідэмстанцыі: бруд, які можна вычысціць, толькі калі ён чужы. Найлепш было б замкнуць і апячатаць гэтае страшнае месца, ніколі сюды не вяртацца і нікога не пускаць усярэдзіну. Вар'ятка Манда здолела знішчыць усё, што магло лічыцца ў доме ўспамінам, па чым людзі сумуюць, калі іх дом згарыць. Для Дыяны гэтая кватэра больш не была сваёй, гэта было ўсяго толькі месца, дзе яна праводзіла ноч.

Яе перапаўняла рашучасць не дапусціць любою цаной, каб вар'ятку Манду вярнулі. Яна была гатовая змагацца, як ільвіца, пераступіць цераз любы труп і рызыкаваць сабою і ўсім, што мае, абы не прыняць яе назад, нават калі дзеля гэтага давядзецца разам з Мірнай і Дарыянам уцячы з горада і жыць недзе ў іншым месцы ў найманым жытле і прыбіраць у чужых пад'ездах. Ёй ужо даводзілася гэта рабіць, і яна ведала, што можна выжыць і так, а дзеці ўжо вялікія, хай выкручваюцца самі. Усё лепш, чым калі б вар'ятка вярнулася і ўсё пачалося зноў. Але няма надзеі пазбавіцца ад яе жывой. Яна знайшла нейкую старую піжаму, узяла Мірніна ружовае кімано – тая два гады назад атрымала яго ад свайго шведа, ды так ні разу і не надзела і не хацела нават бачыць, – пазбірала розную драбніцу ў пляжны нэсэсэр і запхала ўсё гэта ў пластыкавы пакет. Яна ведала, што вар'ятцы Мандзе нічога з гэтага ў шпіталі не спатрэбіцца, але гэта неістотна; Дыяна рабіла гэта дзеля самой сябе, каб пераканаць дактароў, што яна не пачвара і што клапоціцца пра сваю маці.

Яна выйшла з дому, хоць ісці ў шпіталь было яшчэ рана. Хацела пагуляць хоць пару гадзінаў, каб там трошкі прызвычаіліся да вар'яткі Манды, каб, можа, яна іх аблаяла і пакусала і каб яны паспелі дзе знайсці ўтаймавальную кашулю, бо калі яна прыйдзе зарана, можа стацца так, што давядзецца нешта тлумачыць або, не дай божа, старая будзе яшчэ спаць. Таму яна ішла да шпіталя павольна, маленькімі крокамі, кружною дарогай. Яна разлічыла, што так ёй спатрэбіцца не меней за сорак пяць хвілін. Яна спынялася перад кожнай вітрынай, разглядала стракатыя летнія сукенкі, заходзіла ў крамкі з каструлямі і талеркамі, дома ўжо не засталося ніводнай,

усміхалася прадавачкам, і ў яе ўвесь час было ўражанне, што яна робіць гэта апошні раз, бо неўзабаве разыдуцца чуткі пра вар'ятку Манду і ніхто ўжо не паглядзіць на Дыяну так, як глядзіць цяпер.

Панічка, гляньце во, сапраўдны каралеўскі сярвіс, мабыць сама міс Сімпсан з іх ела!* сказала малая пузастая гандлярка з маршчыністым тварам цыркавога карліка. Яна выглядала так, быццам прачытала ўсе любоўныя раманы, якія толькі былі апублікаваныя, і быццам у ёй жывуць усе гісторыі, у якіх кожны няшчасны канец меў свой вялікі сэнс. Вось нехта, каго не будзе цікавіць вар'яцтва Рэгіны Дэлавале, падумала Дыяна і адчула нейкую блізкасць з карліцай, якой захацелася сказаць нешта прыгожае і незабыўнае. *Яна купалася ў Трстэне*, зусім голая, яна і Эдвард*. Мой дзядзька бачыў яе сваімі вачыма. Калі быў маленькі.* Карліца здзівілася, магчыма нават падумала, што гэтая жанчына з яе смяецца. *Вы пра міс Сімпсан, якая не магла быць каралевай, таму і ён адмовіўся быць каралём?* Дыяна ўсміхнулася, ёй захацелася пагладзіць карліцу па галаве, калі б толькі ніхто на іх не глядзеў. Тая так міла вылупіла свае маленькія вочкі, аздобленыя сеткай глыбокіх індзейскіх маршчын. *Так, пра яе, хіба вы не ведалі, што аднойчы ўлетку, недзе ў трыццаць шостым, яны былі ў нас, патаемна, і купаліся як нудысты?.. Голыя!..* Уражаная карліца склала далоні. *Так, так*, пацвердзіла Дыяна, нібыта яны гаварылі пра нейкіх супольных сваякоў.

Яна выйшла з крамы шчаслівая, што некаму ўпрыгожыла жыццё. Малая прадавачка кухоннай парцаляны цяпер мае нешта, чым будзе займацца месяцамі. Паедзе ў Трстэна, будзе скакаць па скалах над морам і дакранацца да камянёў, у надзеі, што вось да гэтага самага каменьчыка, да гэтай самай скалы і да гэтага скамянелага адбітку дагістарычнай ракавінкі дакраналіся пальцы Уоліс Сімпсан, калі яна голая нахілялася, каб пацалаваць Эдварда, а на гладкай белай заднічцы ў яе былі відны чырвоныя сляды ад сасновай ігліцы, ракавінак і вострага каменя. Чым менш кахання было ў тваім жыцці, думала Дыяна, тым лепш у табе прыжываюцца такія гісторыі. Быццам бы ўсе ў горадзе, акрамя карліцы з талеркамі міс Сімпсан, тры чвэрці жыцця правялі ў закаханасці, а ў гэтай астатняй чвэрці зрабіліся зусім неадчувальныя да іншых.

Свой шлях да шпіталя яна здолела расцягнуць на дзве гадзіны. На ўваходзе яна глыбока ўдыхнула, нібы збіраючыся нырнуць, каб упаляваць страшную мурэну, і цвёрда рушыла наперад. Калі тая карліца можа вытрываць цэлае жыццё, дык можа і яна пацярпець яшчэ зусім трошкі, падбадзёрвала яна сама сябе, але пасля пяці маршавых крокаў яе спыніў вартаўнік. *А ты куды!* гаркнуў ён з сваёй кабінкі. *Я шукаю Рэгіну Дэлавале*, ёй не хацелася казаць – маці, бо раптам ужо ўсё стала вядома. *Ды нават і калі майго тату, не пройдзеш!* Яна здзіўлена паглядзела на яго, можа пачалася эпідэмія грыпу, і таму да хворых нікога не пускаюць, а можа і нешта іншае...

Што ўтаропілася! У шпіталь не ўваходзяць проста так! Ды што ў шпіталь! Так і ў карчму не ўваходзяць. Найперш трэба сказаць добры дзень, пасля я такая і такая, вось калі ласка мае дакументы, я прыйшла па такой і такой справе, а тады я ўжо ацаню абстаноўку і вырашу, ці можна цябе пусціць. Божа ж ты мой, мусіць жа быць нейкі парадак, гаворачы, ён кланяўся то ў адзін, то ў другі бок, быццам звяртаўся да нябачнай аўдыторыі або чытаў публічную лекцыю пра тое, якія правы і абавязкі мае той, хто апынецца перад вартаўніком.

Хіба цяпер не час для наведнікаў? спыталася яна. *Дык жа ж не*, запярэчыў ён, даючы зразумець, што ўжо само такое пытанне нясе ў сабе абразу ягонай пасадзе. *А калі можна наведваць?.. Адказ можаш атрымаць на інфармацыі*, працягваў ён падкрэслена афіцыйным тонам. *А дзе інфармацыя?* Вартаўнік паказаў пальцам некуды ў сябе за спінай. *Але і туды ты можаш прайсці, толькі калі я цябе пушчу!.. Дык пусціце вы мяне або не?.. Пусцім, калі будзеш прыстойна сябе паводзіць і прыгожа папросіш... Прабачце, што з вамі?* паглядзела яна на яго з пагардай. Ёй ужо пачынала быць усё роўна, увойдзе яна ці не. Калі ён не пусціць яе, дык у пэўным сэнсе будзе лепей для ўсіх. І для Дыяны, бо сустрэча з вар'яткай Мандай адкладзецца да заўтра, і для дактароў, бо да заўтра яны ўжо прыдумаюць, што рабіць з шалёнай старой.

Ай, праходзь! махнуў ён рукой, як паліцыянт, калі прапускае няспраўны грузавік. *Як вы са мной размаўляеце?* раз'юшылася яна. *А як, калі можна спытацца?* пачаў выкручвацца ён. *Я з табой кароў*

не пасвіла, каб ты мне тыкаў, хамло!.. Выбачаюся, што ты сказала?.. Тое, што чуў, сяло, і хто цябе ў горад пусціў такога!.. Слухай, я магу і перадумаць, паспрабаваў прыгразіць ён. Але ўрэшце, замест каб справакаваць вартаўніка не прапусціць яе, яна дамаглася таго, што ён адступіў і спалохаўся. *Але ж у мяне такая праца*, сказаў ён ёй наўздагон, нібы выбачаючыся.

Яна не ведала, дзе шукаць вар'ятку Манду, хадзіла ад аддзялення да аддзялення па шпітальных калідорах, якія то нагадвалі катакомбы, і яна мусіла нахіляцца, каб прайсці праз нізкі ўваход у радыялогію, чые сцены былі абабіты сталлю і нагадвалі падводную лодку, то ператвараліся ў лабірынты, якія вадзілі коламі міма шкляных сценаў, за якімі старыя з вырачанымі вачыма паміралі з трубкамі ў горле. Ёй здавалася, быццам яна трапіла ў іншы свет ці прынамсі ў іншую дзяржаву, дзе існуюць іншыя звычаі і правілы і адкуль жывому гэтак сама цяжка выйсці, як цяжка было ўвайсці. Яна аблілася халодным потам, сэрца білася як шалёнае, і яна была ўпэўненая, што яе схопіць першы кардыялагічны патруль і, абвінаваціўшы ў цяжкім інфаркце, нацягне на яе зялёную піжаму з шпітальным кляймом.

Пасля добрых дваццаці хвілін бадзяння яна выпадкова натрапіла на аддзяленне неадкладнай дапамогі і на тую самую маладую доктарку. *Як яна?* спыталася Дыяна пра вар'ятку Манду, перш чым дзяўчына паспела раскрыць рот. *Не ведаю, што вам сказаць... Страціла шмат крыві?.. Не, але... Скажыце мне, што здарылася!* Дыяна старалася выглядаць як мага больш заклапочана, перапыняла доктарку, зазірала ёй у вочы, баючыся яе нападу. *Выглядае, што ў яе інсульт, яе перавялі ў неўралогію... Яна непрытомная?.. Прытомная, калі так можна сказаць, але не ў сабе... Што вы маеце на ўвазе?.. Не ведаю, як вам растлумачыць. Сама сябе не памятае. Давялося яе звязаць.* Дыяна зноў пачала плакаць. Проста не ведала, што яшчэ можна было б зрабіць. Плакала ад страху і хвалявання, або ад шчасця, бо здавалася, што падман удаўся. *Можаце пагаварыць з галоўным лекарам Анофрыем, ён вам раскажа больш*, сказала дзяўчына. Яна была ўжо не такая шчырая і сардэчная, як раніцай, хоць ёй і было шкада Дыяну, але да шкадавання дамешвалася ней-

кае далёкае пачуццё гідлівасці, што ў любым выпадку было куды лепш, чым Дыяна спадзявалася.

Доктарка завяла яе ў маленечкі кабінет, дзе за вялізным пісьмовым сталом сядзеў магутны сівы мужчына з вялікім носам і выпнутай ніжняй сківіцай, падобны да гіганцкага бульдога-альбіноса, паказала ёй на крэсла і хуценька выйшла. Дыяна села, перш чым галоўны лекар нешта сказаў. Ён не павітаўся і нават не варухнуўся ў сваім чорным фатэлі, што быў абцягнуты парэпаным дэрматынам. Ён і ўстаць не можа. Хто ведае, як ён увогуле адсюль вылазіць і як сядае назад, спярша падумала яна, бо сапраўды здавалася, што і самы худы чалавек, а не такі тоўсты, як гэты, не пралез бы паміж сцяной і сталом да фатэля.

Вось, сказала яна, больш каб адвесці ягоны позірк, чым каб парушыць маўчанне. *Вы, значыць, пані Дэлавале*, сказаў ён тым глыбокім і гучным голасам, які і шэптам чуецца як горнае рэха. *Не, дакладней так, дзявочае прозвішча Дэлавале*, заблыталася Дыяна. *Калі гэта тое, на што мы маем падазрэнне, тады добра, але калі не, то мы вашу маці не зможам трымаць у шпіталі. У выпадку, калі гэта інсульт, гэты стан не будзе працягвацца доўга, і мы яе выпішам. Але калі справа ў нечым іншым, а вы якраз тут каб мне сказаць так гэта ці не, тады вы не павінны былі прывозіць яе да нас дзеля рассечанага запясця. Дык вось я ў вас пытаюся: як ваша маці паводзіла сябе апошнімі днямі?*

Ён глядзеў на яе вачыма, якія, здаецца, могуць зазірнуць у душу і ўбачыць любую хлусню. Яна не ведала, што адказаць і як выйграць час. *Што з ёй адбываецца?* спыталася яна дрыготкім голасам. Ён паглядзеў на яе, упэўнены, што яна хлусіць, або прынамсі, як чалавек з багатым досведам кантактаў з хлуслівымі пацыентамі і іхнімі сваякамі, адмаўчаўся пару секунд, каб яна здалася, і сказаў: *Нічога асаблівага, толькі што я мусіў эвакуаваць палову аддзялення, улучна з усімі сёстрамі. Ведаеце, у нас па традыцыі, якую нават камуністы не парушалі, працуюць сёстры міласэрнасці, пабожныя манашкі, чыя ахвярнасць дзеля хворых і ўсіх, хто пакутуе, сапраўды бязмерная. Я мусіў іх прыбраць з аддзялення, пакуль ваша маці тут. Тое, што яна робіць і кажа – не для чалавечых вушэй і вачэй. Вы пра*

гэта нічога не ведаеце, праўда? Калі праўда, тады мы маем справу з інсультам, але вельмі незвычайным, якога ў гэтым шпіталі не было за апошнія трыццаць пяць гадоў. Менавіта столькі, колькі я памятаю! Увогуле, такія выпадкі бываюць толькі ў кнігах. А ў кнігах, ведаеце, чаго толькі не пішуць, дык я не схільны верыць у розныя дзівосы. Так што, шчыра кажучы і паміж намі, я мяркую, што ваша маці ў стане хранічнага маніякальнага псіхозу, або як там псіхіятры гэта называюць, і думаю, што гэта ганьба – прывезці яе да нас! Вядома, я не магу гэтага даказаць, дый каб мог, вы не адказвалі б ні па якім законе. Але кажу вам, пані, гэта не прыстойна, не маральна, не па-людску і ў дачыненні да тых, хто тут працуе, і да хворых, якія ляжаць у гэтым аддзяленні і якія дзеля вашай маці сёння не мелі належнага дагляду. Спытаюся таксама, якім спосабам вы яе ўсыпілі, што вы ёй далі, перш чым выклікалі хуткую дапамогу? Вось тут ужо можна было б гаварыць пра сур'ёзныя наступствы для вас. Калі вы напхалі яе седатывамі, вы стварылі сваёй маці смяротную небяспеку. Існуе вельмі малая розніца паміж дозай, якая на дзевяностасямігадовую старую нагоніць глыбокі сон, і дозай, якая для яе будзе летальнай. Асабліва калі такімі рэчамі займаюцца дылетанты. А вы, пані Дэлавале, ці як вас там, вы ж дылетант, так? Ну дык не думайце, што вам удасца так лёгка выкруціцца. Я гатовы сведчыць, што вы спрабавалі забіць сваю маці. Вядома ж, у выпадку, калі мае дапушчэнні слушныя, а нешта мне падказвае, што гэта так, і ў выпадку, калі ваша маці не перанесла надзвычай дзіўны інсульт, а я глыбока ўпэўнены, што не і што гэты ваш фокус у нас не пройдзе. Такі інсульт быў бы большым дзівам, чым з'яўленне цюленя ў нашым порце. І таму зараз у вас апошняя магчымасць прызнацца і сказаць мне што насамрэч здарылася!

Скончыўшы, ён грукнуў аб стол хімічным алоўкам, быццам трымаў у руцэ судзейскі малаток, і Дыяна ўжо каторы раз за дзень адчула, як яе агарнуў сорам. Вось жа ўсім было асабліва важна прынізіць яе і нагой адштурхнуць убок.

Думаеце, што я зараз укленчу і пачну вас умаляць, вы гэта думаеце? яна глядзела на яго, як ваўчыха, што збіраецца скочыць на сваю тлустую і бездапаможную ахвяру, якая трапіла ў пастку

паміж сцяной і чорным пісьмовым сталом. Аднак галоўны лекар Анофры не адступіў. У ім у той момант кіпела ўся нянавісць, якая назбіралася ад таго дня, калі ён маладым лекарам увайшоў у гэты шпіталь, спадзеючыся, што затрымаецца тут не больш як два-тры гады, каб толькі набрацца досведу, адпрацаваць стаж і атрымаць рэкамендацыі на добрае месца па спецыяльнасці, а застаўся практычна на ўсё жыццё, спецыялізаваўся зусім не ў тым, у чым хацеў, хадзіў па вуліцах, якія рабіліся ўсё цяснейшымі па меры таго, як цела ягонае рабілася ўсё шырэйшым, і прымірыўся з праўдай, што, не трэба было вучыцца на лекара, каб стаць тым, чым ён стаў: чалавекам, які дарэмна марыў уцячы з роднага горада, паехаць туды, дзе ніхто нічога не ведае ні пра яго, ні пра ягоных блізкіх, і жыць з відам на нейкае швейцарскае возера. Але гэтая мара не спраўдзілася, таму ён не адчуваў розніцы паміж сабой і апошнім гарадскім смецяром. Ён ненавідзеў пацыентаў і іх вечна заклапочаных родных, якія падманваюць, хлусяць і крадуць, і яшчэ думаюць, што могуць падмануць і саму смерць. Ён ненавідзеў стажораў, а тым болей маладых стажорак, якія толькі прабягуць праз ягонае аддзяленне і невядома якім манерам, праз чый ложак і хуй дабяруцца туды, дзе б хацеў быць і ён. Ён ненавідзеў тых, хто памірае, і тых, хто выздараўлівае, і даўно ўжо не было такога зыходу хваробы, якому ён мог бы радавацца. З аднолькавай прыкрасцю і без ніякай жарсці ён пісаў і «norm.» і «exit. leth.». А цяпер перад ім сядзела жанчына, якую ён злавіў на хлусні, і ўсё роўна ён нічога не мог ёй зрабіць.

Вы гуляеце са мной, думаеце, што так можна? сказаў ён, *адказвайце, калі ў вас пытаюцца!* зароў ён, а Дыяна спрабавала не міргаючы глядзець яму ў вочы. Быццам бы і леў нічога не можа зрабіць, пакуль антылопа не адвядзе позірк. *Вы...* ён не ведаў, што сказаць, ніводная лаянка не здавалася яму дастаткова моцнай, *курва!* ціха вымавіў ён. *Думаю, што размова скончаная*, стрымана адказала яна, устала і выйшла. *Прэч адсюль!* крыкнуў галоўны лекар Анофры, калі Дыяна ўжо зачыняла дзверы. Ягоны голас адгукнуўся рэхам у калідоры, пафарбаваным двума адценнямі тлустага зялёнага колеру, трэцяга зялёнага адцення быў лінолеум на падлозе.

Што ён вам сказаў? спыталася маладая доктарка. *Вас гэта*

сапраўды цікавіць? Калі цікавіць, пытайцеся ў яго. Думаю, ён з прыемнасцю вам адкажа, хоць яна і была раззлаваная, Дыяна адчувала сябе значна лепей. Яна была ўпэўненая, што вар'ятку Манду ёй не вернуць. Проста няма як, хіба што выслаць поштай. *Нервы не вытрымалі. Так увогуле ён добры лекар, можа найлепшы ў горадзе. Ведаеце, гэта ўзрост*, дзяўчыне было непрыемна. *Добра, а зараз скажыце, дзе мая маці?* холадна сказала Дыяна. *Яе толькі што вярнулі ў аддзяленне... Я магу яе бачыць?.. Калі жадаеце... Так, жадаю, з чаго гэта мне не жадаць. Ці думаеце, мяне нешта здзівіць?.. Мы былі вымушаны яе звязаць*, сказала доктарка, каб падрыхтаваць Дыяну, але словы гучалі страшней, чым тое, што значылі. *Гэта нармальна*, адказала Дыяна. *Пра інсульт гаворкі няма, энцэфалаграма ў яе ідэальная, як у самага нармальнага чалавека.* Дыяна ўсміхнулася: *Я ў гэтым і не сумнявалася!*

Яны стаялі над ложкам, на якім вар'ятка Манда ляжала наўзнак, без падушкі пад галавой, накрытая шэрай салдацкай коўдрай і прывязаная паверх яе скуранымі рамянямі. Яна магла глядзець толькі ў столь ці на абшарпаную тумбачку побач з ложкам. Яна маўчала, што здзівіла Дыяну, бо апошнімі месяцамі яна пачынала лаяцца і крычаць, як толькі прачыналася пасля адной-дзвюх гадзінаў дзённага сну. *Бабуля*, паклікала яе доктарка, *бачыце, хто да вас прыйшоў*. Але старая нават не варухнулася і не падала знаку, што чуе. Па рытмічным і рэгулярным мірганні можна было бачыць, што яна прытомная і абсалютна спакойная. Дыяна не ведала, што рабіць. Больш за ўсё ёй хацелася павярнуцца і выйсці, але гэта было б груба ці можа нават непрыстойна ў дачыненні да дзяўчыны, якая ёй верыла і, магчыма, усё яшчэ верыць. Заставаўся і зусім малы шанец, што вар'ятка Манда нейкім цудам знікла, гэтаксама як і з'явілася, і што звязаная старая – гэта тая Рэгіна Дэлавале, якая прапала адной лістападаўскай раніцай, калі нейкая іншая жанчына ў ейным целе пачала лаяцца і крышыць усё навокал. Дыяна сур'ёзна ў гэта не верыла, але ўсё ж не наважвалася зрабіць нешта, аб чым пасля шкадавала б. *Яна нас чуе?* спыталася яна хвілін праз дзесяць. *Не ведаю*, сказала доктарка і правяла далонню ў старой перад вачыма. Вар'ятка Манда міргнула. *Можа, адвяжам яе?* запрапанавала

дзяўчына. Дыяна не хацела казаць ні так, ні не. *Не ведаю. Я ў гэтым не разбіраюся... Думаеце, я разбіраюся? Вы ўсё ж яе дачка, дык вырашайце*, у яе голасе чулася непрыязнасць. *Я больш не магу*, сказала Дыяна і накіравалася да выхаду.

Яна стаяла, прыхінуўшыся да калідорнай сцяны, з рукамі за спінай, і не ведала што рабіць. Спахапілася, што недзе забылася пакет з рэчамі для вар'яткі Манды, напэўна, у кабінеце галоўнага лекара. І тады з палаты пачуўся крык. Яна ўбегла ўсярэдзіну і ўбачыла, што вар'ятка Манда сціскае маладой доктарцы шыю. Дыяна схапіла яе за рукі. Яна спрабавала ламаць старэчыя пальцы, крычала, а тады ў пакой убеглі два мужчыны ў белых халатах. Адзін адштурхнуў Дыяну так, што яна ўпала і змахнула лямпу з тумбачкі. Яна засталася так ляжаць, хоць была зусім прытомная і ўраўнаважаная, але ёй здавалася, што калі яна ўстане, то зробіцца вінаватая ва ўсім гэтым вэрхале і крыках, і ў страшным грукаце – нібы дошкай білі аб дошку. Яна бачыла доктарчыну нагу ў белай драўлянай клумпе, на памаранчовай хлапечай шкарпэтцы былі намаляваныя футбольныя мячы.

З вамі ўсё добра? мужчына ў белым халаце дапамог Дыяне ўстаць, пакуль другі спрабаваў трапіць вар'ятцы Мандзе іголкай у азадак. Доктарка сядзела на падлозе, прыхіліўшыся да ложка, апусціўшы мёртвыя рукі, і хапала ротам паветра. *Са мной усё добра*, адказала Дыяна, *я не вінаватая*.

Ёй далі шклянку вады і завялі да доктара Ўлахавіча, маладога анестэзіёлага, які, як нейкая медычная зорка, вярнуўся з навучання ў Заграбе, хоць меў прапановы з усіх бакоў як адзін з найлепшых студэнтаў у гісторыі факультэта, гэтаксама добры ён быў і як стажор. Яго ўзялі, хоць яшчэ адзін анестэзіёлаг шпіталю быў непатрэбны. Там і так ужо было тры, і ў іх фактычна не было працы, бо хірургічныя аддзяленні па сутнасці не працавалі, як дзеля нястачы хірургаў, гэтак і дзеля састарэлага і няспраўнага абсталявання, таму хворых на аперацыі слалі ў іншыя шпіталі і гарады, але доктара Ўлахавіча з гатовасцю прынялі, як бы сельскі футбольны клуб прыняў маладога Марадону, спадзеючыся, што з ім удасца прасцей здабыць грошы на рэканструкцыю шпіталя. У аддзяленні ён займаўся агульнай практыкай і ўнутранымі хваробамі, нічога не рабіў або, у перыяды кры-

тычнага надвор'я і павышанай нецярпімасці Анофрыя, размаўляў з пацыентамі і іхнімі сваякамі.

Ён падаў Дыяне руку, *Арэс*, прадставіўся ён, і ў першы момант яна не ўцяміла, што гэта значыць. Толькі пазней, убачыўшы на дзвярах кабінета надпіс «д-р Арэс Улахавіч, анестэзіёлаг», яна зразумее, што ён назваў сваё імя, дактары такога ніколі не робяць, і для Дыяны гэта будзе пацверджаннем бездакорнай галантнасці, якой яна вытлумачыць і Арэсавы трагічныя пакуты.

Няшчасная жанчына цалкам псіхічна хворая. Гучыць непрыгожа, але па-народнаму дакладна: яна вар'ятка! Не мусіце мне нічога казаць, я ўсё ведаю. Мне ясна, што гэта пачалося не сёння, і я сабе ўяўляю, што вам з ёй давялося пражыць. Мне таксама ясна, чаму вы прывезлі яе да нас. У псіхіятрыі яе не захацелі прыняць, так? Праблема ў тым, што нам і пры найлепшым жаданні, а я яго маю, мае яго і доктарка Фочыч, вы з ёй ужо знаёмыя, няма чаго рабіць з вашай маці ў гэтым аддзяленні. Ведаю, што для вас гэта страшна, але сапраўды ад гэтага выпадку разбураецца ўся сістэма. Мы не дапамагаем нават тым, каму маглі б дапамагчы, казаў ён спакойным ціхім голасам, у якім адначасна чулася і разуменне і халодная разважлівасць.

Але я не магу ўзяць яе дадому! закрычала яна. *Паверце, я гэта разумею і я ніколі б вас не прымушаў і не намаўляў. Паспрабуем затрымаць яе дзеля тых ран на руках, наколькі здолеем. Але ненадоўга. Не больш як на два-тры дні. За гэты час трэба было б нешта прыдумаць.*

У той вечар і здарылася ўсё, што прывяло да смерці Рэгіны Дэлавале, ці то вар'яткі Манды. Спярша, адразу пасля таго, як Дыяна выправілася дадому, у кабінет да доктара Арэса Ўлахавіча ўляцеў, як фурыя, галоўны лекар Анофры і накінуўся на яго з пытаннем, хто яго ўпаўнаважыў пакінуць старую псіхічна хворую бабу ў аддзяленні. Ці ўсведамляе ён, колькі парушае правілаў і як ставіць пад пагрозу жыцці хворых і чалавечую годнасць персаналу? Арэс адказаў яму, што для яго клятва Гіпакрата вышэйшая за ўсё гэта, на што Анофры цынічна ўхмыльнуўся і зазначыў, што *для маладога калегі вышэйшая за ўсё пізда і што гэта адзіная прычына, чаму*

ён вярнуўся з Заграба ў горад. Ад іншых, мабыць, і можна схаваць, як ён абыходзіцца з доктаркай Фочыч, але ад яго не. Пачуўшы гэта, Арэс падскочыў, як апараны. *Я не дазволю!* закрычаў ён, што Анофры зразумеў як адкрыты выклік на фізічнае сутыкненне, перакуліў стол з камп'ютарам і рушыў на маладога калегу. У той момант, як на няшчасце, у кабінет увайшла маладая доктарка, што прадухіліла бойку, але паслужыла галоўнаму лекару за новы доказ ягонага тэзісу. Што яна тут робіць, калі яе дзяжурства ўжо чатыры гадзіны як скончылася і яна даўно мусіць быць па-за сценамі шпіталя?

Пасля пагроз і абразаў, на якія супернік адказаў толькі часткова, галоўны лекар Анофры выйшаў з кабінета, каб загадаць старшай медсястры адвязаць хворую Рэгіну Дэлавале, бо ў ягоным аддзяленні, дзе не ляжаць небяспечныя псіхічныя хворыя, ніхто не можа быць прывязаны да ложка. Зрабіўшы гэта і прыгразіўшы, што калі нехта зноў паспрабуе звязаць хворую, ён ужыве найстражэйшыя дысцыплінарныя меры супраць старшай сястры, якую ад гэтага моманту назначае адказнай, Анофры пайшоў дадому.

На працягу ночы доктар Арэс Улахавіч чатыры разы загадваў старшай сястры ўводзіць Рэгіне Дэлавале ўнутрымышачна супакаяльныя сродкі. Пры гэтым дзевяностасямігадовую старую кожны раз мусілі трымаць тры санітары, двух з якіх клікалі з аддзялення траўматалогіі. Кожны раз ён падвойваў дозу, але пасля кароткай фазы спакою старая ўставала з ложка і выпраўлялася ў свой разбуральны паход. Пры гэтым яна выяўляла неверагодную фізічную сілу і жывучасць, зусім неўласцівую не толькі яе веку, але і полу. Калі доктар Улахавіч чацверты раз загадаў ёй падвоіць дозу, старшая сястра яго папярэдзіла, хоць ён як выдатны стажор-анестэзіёлаг мусіў гэта ведаць сам і ведаў бы, нават калі б быў усяго толькі студэнтам першага курса медыцыны, што прадпісаная доза смяротная. Гэта значыць – яна забіла б і мужчыну маладзейшага веку і мацнейшага фізічнага складу. У адказ на гэта доктар Улахавіч толькі паўтарыў сваю інструкцыю. Праз сорак пяць хвілін была канстатаваная смерць Рэгіны Дэлавале.

Раніцай галоўны лекар Анофры заявіў пра выпадак у паліцыю, вычытаўшы ў медычнай картцы хворай факт забойства. Ён, відаць

па ўсім, запрасіў і журналістаў, якія пасля напісалі пра Мэнгеле з нашага шпіталя, а афера, найбольшая ад заканчэння вайны, у імгненне скаланула ўвесь горад. Міф пра геніяльнага маладога анестэзіёлага разбуралі тыя самыя людзі, якія яго стварылі, і пераважна тымі самымі аргументамі, але ўсё, што да ўчорашняга дня ўспрымалася як прычына для пахвалы, сёння ператварылася ў падставу для суворага асуджэння. Падчас навучання ён быў такі выдатны, бо ўжо і тады планаваў дасканалае забойства медыкаментамі. Спакой і стрыманасць якраз пацвярджалі ягоную бяздушную прыроду, характэрную для псіхапатаў у белых халатах, якіх, як мы ведаем, у гісторыі было нямала. Ягоны прыгожы і чысты твар сведчыў пра тое, што найбольшыя злачынцы зусім не выглядаюць як злачынцы.

Вядома ж, ніхто не браў пад увагу тое, што доктар Арэс Улахавіч пакінуў за сабой пісьмовы след, у медычнай карце была запісана дакладная доза супакаяльных сродкаў, і ўжо толькі з гэтай прычыны гэта не было дасканалае злачынства і гісторыя пра яго ледзяную бяздушнасць траціла сэнс. Гэтая і некаторыя іншыя дэталі, якія абвяргалі газетныя і вулічныя разумовыя пабудовы, замоўчваліся і адкідаліся, нібыта гаворка ішла пра кінасцэнар, а не пра жыццё, і трэба было прыбраць усё, што занадта ўскладняла гісторыю ці парушала яе жанравую пабудову.

Няшчасны Арэс праз каханне трапіў у складанае становішча, з якога было цяжка выбрацца. Рэч у тым, што непрыстойная заўвага галоўнага лекара Анофрыя адносна доктаркі Фочыч мела рэальныя падставы – ён ніколі не вярнуўся б у горад, калі б не яна – і не дазволіў бы сабе, калі б не быў закаханы, умешвацца ў жыццё, якія яго не датычылі, і гэтым падпісаць прысуд Рэгіне Дэлавале, жанчыне, з якой ён не быў знаёмы, а яна была маці іншай жанчыны, да чыйго лёсу ягоная абранніца выявіла такую літасць. Няпраўда, што менавіта яна намовіла яго падвойваць дозу седатываў аж да смяротнай – заплаканая доктарка Фочыч пакінула шпіталь задоўга да тых падзеяў, але Арэс ведаў, чаго яна ад яго чакае і што зрабіла б сама, калі б апынулася ў такой самай сітуацыі. Як у заснулай старой яна бачыла сваю бабулю, так і ў вар'ятцы Мандзе яна бачыла нешта, што не мае іншай прычыны для існавання, як толькі зрабіць свет вакол

сябе няшчасным. І адно і другое цалкам зразумелае і блізкае сэрцу і сведчыць пра высакароднасць душы, у якую Арэс закахаўся больш, чым у доктарчыну фізічную прыгажосць. Тым часам нічога з гэтага не можа быць аргументам ні перад людзьмі, ні перад абвінаваўцамі і суддзямі, бо інакш законы мусілі б быць запісаныя ў большую колькасць тамоў, чым іх ёсць у вашынгтонскай Бібліятэцы Кангрэсу, і не знайшоўся б ніхто, апрача хіба што Бога, хто б іх усе так добра ведаў, што мог бы судзіць у поўнай адпаведнасці з чалавечай душою.

Усё гэта Дыяне было ясна пасля таго, як яна распісалася ў атрыманні пасведчання аб смерці Рэгіны Дэлавале, а слёзы, якія яна пралівала на гарадскіх могілках і якія здзівілі яе дзяцей і задаволілі родных і сяброў, былі адрасаваныя прыгажуну Арэсу і маладой доктарцы. Зямля, якая гулка бухала аб чорную фанеру труны, хавала не Дыяніну маці, бо яна ўжо даўно была мёртвая, а гэтых дваіх маладых людзей, у якіх яна, не будзе перабольшаннем сказаць, угледзелася і закахалася, і закаханасць гэтая ніяк не была пазбаўлена эратычных канатацыяў. Можа і больш, чым Арэсаў маральны ўчынак, і які зрабіў яе абавязанай маладому доктару, Дыяну вабіла да яго і ягонай каханай іх чыстая прыгажосць, узмоцненая сэнсам белых лекарскіх халатаў і дзіцячых дэталяў, накшталт шкарпэтак з выявай футбольных мячоў.

Абвінавачанне Арэса ў забойстве яна ўспрыняла як апошнюю помсту вар'яткі Манды, з якой яе трохмесячнае вар'яцтва набыло свой канчатковы злачынны сэнс. Яна пайшла з гэтага свету паводле свайго ўласнага рашэння, паспеўшы паставіць сваю пячатку на жыццях тых, хто правёў яе ў апошнюю дарогу. Дзякуючы гэтаму яе дзевяноста сем гадоў не спыняцца і будуць трываць далей, пакуль ёсць тыя, чый жыццёвы шлях быў ёю зменены. Тры чалавекі, дзве жанчыны і мужчына, будуць да скону памятаць пра яе і ў душах сваіх насіць яе зло, каб, калі зусім страцяць надзею, перадаць яго іншым і такім чынам зрабіць несмяротным праклятце вар'яткі Манды.

Пасля пахавання яна сядзела ў спальні на ложку і разгублена глядзела на сваіх дзяцей, як і яны, не ведаючы, што рабіць і куды ісці, калі больш няма таго, што напаўняла яе жыццё пакутамі і стра-

хам, і цяпер, калі яго больш не стала, яна не адчувала ніякага шчасця. *Вось і ўсё*, сказала Мірна і машынальна схапілася за сваю левую цыцку. Дарыян засмяяўся, яна ўздрыгнула, пасля зразумела і пачала рагатаць, як шалёная. *Ды перастаньце вы ўжо!* Дыяна хацела быць строгай, але яе словы так не прагучалі, дый насамрэч не было ніякіх прычынаў для строгасці. Тады яна і сама засмяялася, нястрымна і няўцешна, і чым больш яна смяялася, тым больш мяшаліся ў ёй радасць і смутак, як мяшаюцца прэсная і салёная вада, ствараючы глыбокія магутныя віры, у якіх топяцца чужынцы і самагубцы, тонуць прабітыя мячы, піўныя бутэлькі і пластмасавыя караблікі, ахвяры нядбайнасці, абыякавасці або проста старасці.

Мірна яшчэ раз схапілася за левую цыцку, цяпер ужо наўмысна, думаючы даць гэтым новую прычыну для смеху, але гэта, наадварот, смех спыніла.

XIII

Калі Мірне споўнілася дзесяць, у яе за два месяцы нечакана выросла левая цыцка. Правая па-ранейшаму заставалася плоская, як у хлопчыка-раўналеткі, а левая стала буйною, тугой і цвёрдай, амаль як палова дыні, з сапраўдным жаночым смочкам, які набрыньваў пры дотыку з халоднай сценкаю ванны. *Як малы пісюнчык*, сказаў Дарыян, і яна больш не пускала яго ў лазенку, калі прымала душ. Смочка на правым баку амаль не было, малы, светлы і непрыкметны, ён не рэагаваў ні на цяпло, ні на холад. Кожны дзень яна гэта правярала і не магла вырашыць, каторы бок яе больш палохае і каторы агідна пацвярджае, што з ёй нешта не ў парадку. Пра сваю жаноцкасць яна яшчэ нічога не ведала, бо Дыяна была ўпэўненая, што яшчэ не наспела нагода ёй пра гэта сказаць. Зрэшты, калі ў Мірны пачала расці цыцка, Дыяна паехала ў Каір, дзе, падарожнічаючы па Афрыцы ад краю да краю, правядзе чатыры вар'яцкія месяцы з Маркам Радзіцам, капітанам дальняга плавання, у якога яна ўжо шмат гадоў была шалёна закаханая і які, як яна думала, прыняў яе дзяцей як сваіх родных. Іх яна пакінула пад наглядам сваёй васьмідзесяціпяцігадовай маці, чым былі абураныя блізкія і далёкія суседзі, і па горадзе пайшлі чуткі, што Дыяна, удава нябожчыка Віда Кралева, кінула дзяцей і ўцякла з нейкім неграм, у якога ягоная штука, як сведчылі ўдовы ў чорных хустках, была такіх памераў, што ён мог бы ёю абтрэсці шаўкоўніцу, не залазячы на дрэва.

Такія абгаворы Рэгіну Дэлавале не хвалявалі. Колькі ўжо яна ўсяго за свой век зазнала, дый сама ўжо перамыла косткі палове горада, таму было неяк і нармальна, што ёй гэта вяртаецца. Апрача таго, ёй нават трохі падабалася адведзеная ёй роля. Мала каму з жанчын выпадзе, няхай хоць бы і ў абгаворах, зноў зрабіцца ў такім узросце пакутніцай, якая сама без ніякай дапамогі даглядае дваіх дзяцей. Гэта прыблізна як другая маладосць, трэція зубы,

цудоўнае перараджэнне, нешта, у чым любая пакута салодкая. Яна ведала, што нованабыты аўтарытэт будзе трываць нядоўга, бо Дыяна вернецца і яна зноў стане старой бабай, якім горад надае не больш увагі, чым сабакам, якія загараюць на рынкавым пляцы. Але цяпер усе пачціва вітаюцца з ёю, пытаюцца пра здароўе і ці ёй што трэба, спадзеючыся, што яна ім паскардзіцца і ўзбагаціць новымі падрабязнасцямі гісторыю пра курву, якая ўцякла з хуястым неграм. Але яна адказвала, што ў яе ўсё добра, і кожны раз дзівілася, чаму ўсе наракаюць на адлігу, а яна нічога не адчувае.

Старая баба жаліцца не таму, што ёй баляць косці, а таму, што ёй патрэбны кавалак мужыка! сказала яна, нагнаўшы жаху на тых, хто будзе гэта далей пераказваць. І нагадваць, што нешта ў гэтым ёсць, усё ж кроў – не вадзіца, дык ясна, у каго негрыцянская курва ўрадзілася.

Ёсць жанчыны, у якіх такая глыбокая, што ніводзін наш не можа запоўніць! І тады яны шукаюць негра, кампетэнтна засведчыў Міё Алаваня, Рэгінін аднагодак і гарадскі кот канца дваццатых, у якога пасля аферы з нейкай немкай у маладосці адваліўся нос, чым закончылася адна і распачалася другая Міева кар'ера. З вялікага каханка ён ператварыўся ў мясцовага мудраца і спецыяліста па ўсіх аспектах эротыкі і размнажэння ў людзей і жывёлаў. Так ён мог зачыніцца ў хляве і ўгаварыць любога каня, быка і кныра ўзлезці на самку. Ніхто не ведаў, як яму гэта ўдаецца, а ён раўніва захоўваў таямніцу свайго ўмельства і так зарабляў вялікія грошы. Казалі, што Міё Алаваня падобным спосабам лячыў і людзей ад імпатэнцыі, хадзіла легенда, што ён нейкаму Ахму, партызанскаму маёру з Гацка, які ў бітве на Нярэтве* застаўся без яец, дапамог зрабіць дзіця. Так што Мію можна было верыць, таму і верылі, калі ён казаў, што нейкім жанчынам з анатамічных прычын патрэбны неграў хуй. Тутэйшыя толькі й спадзяваліся, што іхнія жонкі не такія.

Рэгіна нікому не хацела даваць падставы зларадстваваць, не хвалявалі яе і размовы пра негрыцянскія здольнасці, у гэтым яна была нагэтулькі ж рашучая, як і ў намеры скарыстаць нагоду, якая б ёй не надарылася, калі б Дыяна не звар'яцела па тым Марку Радзіцы. Зрэшты, з дзецьмі вялікага клопату й не было. Трэба было ўсяго толькі

мыць, прасаваць і даглядаць, каб не выходзілі на холад лёгка апранутыя ды каб мелі што з'есці. Варыць усё роўна было не трэба, бо яны ніколі нават не пакаштавалі яе курыцы, толькі капрызна затыкалі насы і рабілі грэблівыя грымасы, калі тая варылася ў самай вялікай у хаце зялёнай каструлі. Замест таго яны елі свае эўракрэмы і паштэты, што Рэгіну асабліва не нервавала, хоць яна і не разумела, як нехта можа не есці вараную курыцу, калі сама яна за два дні з'ядала цэлую і яшчэ аблізвала пальцы, як іх аблізвала ўся ейная радня. З новымі пакаленнямі прыходзяць і новыя звычаі, таму яна не здзівілася б, калі б прыйшлі такія часы, што ніхто ўжо не будзе варыць у каструлі курыцу і ўсіх будзе ванітаваць ад аднаго выгляду трохпальцых абскубаных ножак, якія тырчаць з кіпучай вады, як цяпер ванітуе яе ўнучку. Можна сказаць, у тым, што Дыяна пакінула яе адну з дзецьмі, было і гастранамічнае задавальненне. Яна магла варыць курыцу, калі ёй заманецца, не баючыся папрокаў дачкі , што яна, маўляў, забылася, што́ яны елі ўчора, і таму сёння зварыла тое самае.

Мірна спрабавала схаваць ад бабулі дзіва, якое на ёй вырасла, клікала на дапамогу Дарыяна, які шырокім вайсковым бандажом шчыльна абмотваў ёй верхнюю частку цела, надзявала шырокія кашулі і ўцякала прэч з Рэгініных вачэй. У школе было лягчэй, чым дома, нават пасля таго, як дзеці пачалі заўважаць, што левы бок у яе таўсцейшы за правы, а хлопчыкі ганяліся за ёй, каб уласнаручна праверыць, што гэта такое, а яна біла іх усім, што трапляла пад руку. Але ёй неяк здавалася, што яе дэфармацыя ў класным асяроддзі не такая ўжо ненармальная. Яна суцяшала сябе тым, што тая цыцка ўсё ж меншы жах, чым фіброзныя прышчавыя твары, горб на спіне сіраты Аны і вадзянкавая галава Назіфа з першай парты, але калі праз тры месяцы дыняватая нарасць пачала набліжацца да сваёй кульмінацыі, Мірна зразумела, што гэта страшней за ўсе прышчыкі і ўсе гарбы, бо гэта нешта нястрымнае, смертаноснае і ганебнае. Скончыцца тым, што гэтая цыцка вырасце большая за яе і заб'е яе, як забівае рак. Можа гэта і ёсць рак, яна не ведала, як і не ведала, чаму яе ахапляе страшны сорам, калі яна ў люстэрку ў лазенцы бачыць палову таго, што яна бачыла на целах дарослых жанчын на пляжах на Млеце і Корчуле*, ад чаго ёй маці прыкрывала вочы,

і што яна ўгадвала пад чорнай кофтай сваёй бабулі. У свае дзесяць гадоў яна думала, што цыцкі вырастаюць пасля таго, як народзяцца дзеці, і толькі па іх відаць, ці нейкая жанчына ўжо нараджала. Яна ўяўляла іх як тэтрапакі з малаком, якія пасля родаў застаюцца на целе на ўсё жыццё, і калі яна глядзела на голых млецкіх купальшчыц, яна была ўпэўненая, што ніколі не будзе нараджаць, бо ёй здавалася агіднай ужо сама думка пра сапсаванае малако пад скурай састарэлых жаночых целаў. А цяпер вось у яе вырасла цыцка, прычым толькі адна, з чаго можна было лёгка зрабіць выснову, што яна ненармальная, выродлівая, і толькі пытанне часу, калі ўсе, а не толькі Дарыян, даведаюцца пра яе выродлівасць.

Перамену ў целе сястры ён не ўспрымаў так драматычна, бо ніколі не разважаў над сэнсам цыцкі на жаночым целе. Адной дэталлю паміж ног Мірна адрознівалася ад яго ўсё жыццё, таму і яе вялізную цыцку, нібы скрадзеную з вокладкі часопіса ў вітрыне газетнага кіёска, ён успрымаў як працяг адрознення, што напэўна была не ягоная праблема, і наагул яго не здзіўляла несіметрычнасць на яе целе. Яму нават здавалася больш нармальным, каб у яе выросла адна цыцка, а не дзве. Да другой ён бы ўжо напэўна адчуваў рэўнасць, бо яна значыла б не толькі розніцу ў поле, але і ва ўзросце, і ўжо ж напэўна пасля матчынага вяртання з Афрыкі ён больш не хацеў бы купацца разам з сястрой. Бо звычайна Дыяна засоўвала іх абаіх у ванну і вышароўвала за адзін раз, не зважаючы на Рэгініны заўвагі, што такія вялікія дзеці ўжо мусяць мыцца самі. Ёй не хацелася клапаціцца пра тое, ці яны добра вымылі вушы, ногі і спіны, і чырванець перад людзьмі, якія казалі б, што яна не надае дзецям дастаткова ўвагі, дык яна за дваццаць хвілін іх адмывала, а пасля пакідала плюхацца ў ванне, маленькіх галышоў без уяўлення пра розніцу і яе сэнс і без адзінага валаска на целе. Дыяна трымалася думкі, што яе блізняты па сутнасці будуць заставацца аднаполыя, пакуль у іх на адпаведным месцы не вырастуць валасы. Толькі тады яна іх раздзеліць і навучыць сораму, які раздзяляе пол. Яна не магла сабе ўявіць, дый нават не чула, што такое магчыма, каб у яе дачкі найперш вырасла адна цыцка, нашмат пераросшы абедзве Дыяніны, а толькі пасля з'явіцца ўсё астатняе.

Пасля таго, як за выходныя цыцка ў яе відавочна зрабілася яшчэ большая, у панядзелак раніцай Мірна сказала Дарыяну, каб той не прыносіў бандаж, бо яна ў школу не пойдзе, застанецца ў ложку, а ён хай скажа настаўніцы, што яна захварэла. Яму было ўсё роўна, ён сабраў партфель, абуўся і пайшоў.

Дзе твая сястра? спыталася бабуля, калі ён выходзіў. *Там, у пакоі, кажа, што хворая*, крыкнуў ён і пайшоў сваёй дарогай. Рэгіна спалохалася, што дзіцяці сапраўды дрэнна, бо малая была выдатніцай і проста так ад школы не ўцякала б, але ёй не хацелася цяпер шукаць дактароў, таму яна паспяшалася ў пакой, і там было на што паглядзець. Пад паўпразрыстай спальнай кашуляй яе малой унучкі вымалёўвалася нешта такое, што Рэгіна на імгненне падумала, што страчвае розум. Яна не магла паверыць сваім вачам! Адна вялікая цыцка з пукатым смочкам тырчала, нібы здзекуючыся з ейных гадоў. *Дзетачка мая, што гэта ў цябе?* Мірна расплакалася, зразумеўшы, што знікла і тая малая, зусім мізэрная, але ўсё ж светлая надзея, што яна мае на сваім целе нешта зусім звычайнае, дзеля якой яна і вырашыла паказаць цыцку бабулі, хапаючыся, як несправядліва асуджаны на смерць, за апошняе, што магло б яе ўратаваць. Больш не было як хаваць тое, што яна хавала тры месяцы, а цяпер вось зразумела, што тая прывідная цыцка можа і страшнейшая, чым яна думала. Бабуля прыкрыла рот рукою, што дагэтуль рабіла пры ёй толькі адзін раз: калі адмірал Бошка Алач скочыў з акна сваёй кватэры на дзявятым паверсе і ўпаў якраз ім пад ногі. Цыцка была такім самым страшным відовішчам, як раструшчаная адміралава галава, з якой па асфальце разлілася нейкая шэра-жоўтая мешаніна накшталт той гідоты, якую рыбакі дастаюць з чэрава вялізнага тунца і раскідваюць па беразе.

Бабуля, што са мной? Мірна хадзіла за ёй па кухні, заломваючы пальцы. *Ды каб яго чорт, адкуль жа ж мне ведаць! Але ж нехта напэўна будзе ведаць*, адказвала старая. *Дык ідзі спытайся, калі ласка, спытайся ў каго-небудзь*, у адчаі маліла Мірна. *Як я спытаюся! Вось так пайду і скажу, што ў дзіцяці вырасла цыцка вялікая, як дыня, але толькі адна, і што б гэта магло быць? Дык мяне адразу завязуць у вар'ятню. Нехта мусіць прыйсці паглядзець.*

Мірна задумалася: яна прывядзе людзей, каб на яе глядзелі, – не, пра гэта не можа быць і гаворкі. Яна хутчэй памрэ, што, магчыма, і здарыцца. Але ж калі? Колькі ў яе застаецца часу, перш чым гіганцкая цыцка пацягне яе да зямлі? Сем дзён ці сем гадоў? Або яна назаўсёды застанецца замкнутая дома і будзе хаваць сваю ганебную выродлівасць, пакуль далакопы не вынесуць яе з хаты ці пакуль гэтая страшная пухліна не знойдзе сваё месца ў слоіку з фармалінам, у ранішняй тэлепраграме, сярод ненароджаных дзяцей, лёгкіх у курцоў і апошніх экземпляраў вымерлых жывёльных відаў? Яна не думала, што бабуля жадае ёй зла, але, можа, усё ж ёсць у яе намеры нейкая зараднасць. Не толькі яна адна старая, але нешта старэчае вырасла і на целе ейнай унучкі, таму яна цяпер будзе ўсім гэта паказваць, каб такім чынам амаладзіцца ці апраўдаць тое, што яна ўсё яшчэ жыве, хоць кожнай раніцы, ужо гадамі, заклікае сырую зямлю, а апошнім часам і Бога, каб забралі яе і каб яна больш не мучылася.

Хто ведае, што насамрэч думала Рэгіна Дэлавале, але надвячоркам таго самага дня яна склікала ў кухню ўсіх старых суседак, усяго дзевяць, пасадзіла іх вакол стала і каля кухоннай печы на дровы. *Зараз вы нешта пабачыце*, сказала яна і пайшла па Мірну. Жанчыны не прамовілі ні слова, маладзейшыя пераглядаліся між сабою, грымасамі нешта паказвалі і трымцелі перад дзівам, пра якое Рэгіна ім нічога не сказала, але яны ведалі, што гэта вялікае дзіва, тым часам як дзве найстарэйшыя, у чорных хустках вечных удоваў, у акулярах, што ледзь не падаюць з носа, старанна вывязвалі кручком свае белыя ніцяныя карункі, нібыта адчувалі, што ім у жыцці не засталося шмат часу і што яны трапяць проста ў пекла, калі не скончаць свае святочныя абрусы або сурвэткі на тэлевізар.

Хадзем у кухню, сказала бабуля, *не трэба, прашу цябе*, Мірна нацягнула прасціну, каб прыкрыць свой сорам, *ну ўсё, цяпер трэба, прыйшлі жанчыны, яны ведаюць*, Рэгіна выцягнула яе з ложка. *Лепей, каб ты спусцілася да іх, чым я прывяду іх сюды*. Мірна далей ужо не ўпіралася, думаючы, што і так ужо ўсё скончана і што яе цела насамрэч перастае быць выключна яе ўласнасцю, бо яе і мёртвую будуць разглядаць і пераварочваць, як каму захочацца. Мёртвай ёй будзе ўсё роўна, дык можна ўжо цяпер пачынаць прызвычайвацца.

Рэгіна падштурхнула ўнучку перад сабой у кухню; убачыўшы ўсіх тых жанчын, Мірна інстынктыўна адхіснулася, але дарогі назад не было. *Паднімі майку!* загадала бабуля, але дзіця не магло паварушыцца. Старая хуткім рухам са спіны задрала Мірне майку, рукі ў яе самі сабой узляцелі ў паветра, белая тканіна прыкрыла ёй вочы, яна бачыла чорныя постаці, галасы суседак мяшаліся: *Божачкі мае, дзетачка, напалову жанчына – напалову мужык, як бы сёння зрабілі адну палову, а заўтра другую, а прыгожая цыцка – калі вось так закрыць другі бок, і твар, і твар, нельга глядзець на твар, вось так добра, калі цела відаць да паловы і калі галава пакрытая, а ці ў яе ўжо нешта выросла паміж ног? ці ёсць валасы? як гэта пачалося? кажаш, за адну ноч, яшчэ ўчора была аднолькавая і з аднаго боку і з другога, ды не, што ты, а дай памацаць, якая мяккая, ох, беднае дзіцятка...*

Мірна слухала іх, не рухаючыся, ёй здавалася, што ўсё гэта быў адзін голас, то глыбокі, то пранізлівы, сіплы і дзіцячы, і яна магла б так стаяць гадзінамі, каб толькі ёй не прыбіралі майку з твару.

А можна і я памацаю? пачула яна і адразу адчула, як ледзяныя пальцы мнуць цыцку быццам нежывую, дакладна так, як абмацваюць качан капусты ў агародзе або зрываюць струк бобу. Ніколі ніхто так груба не дакранаўся да яе рукі, твару, цела, і гэта было доказам таго, што чужая і агідная пухліна – гэта не нешта жывое і роднае, а пакута і прыкрасць, як каменне, якое трэба павыцягваць з зямлі, у якую будзе садзіцца вінаграднік, як моцныя дажджы, якія абмываюць усю зямлю, зносяць яе ў мора, а на месцы вінаградніку застаецца толькі голая скала. Цыцка – гэта пракляцце, і калі яна ў пары з другой, і калі толькі адна, зразумела яна.

Прыкрыйся, што стаіш, як слуп, крыкнула Рэгіна, крыху спалохаўшыся, ці ўнучка не цешыцца з таго, што яе разглядаюць голую. Мірна толькі цяпер абудзілася ад здранцвення, у якім жанчыны маглі рабіць з ёй што хацелі, рэзаць яе кухоннымі нажамі і рассыпаць па грудзях гарачае вуголле – яна ні пікнула б. Яе ахапіў жах, і яна з вар'яцкім віскам пабегла ў пакой, кінулася ў ложак і пачала трэсціся, быццам да кожнага нерва ў целе быў падлучаны электрычны дрот. Яна ні пра што не думала, нічога не адчувала, не адрознівала жыццё ад смерці, не мела болю і хацела толькі, каб усё

гэта чым раней скончылася, што б гэта ні было і які б ні быў канец. Толькі час ад часу, у тупой ліхаманцы, ёй здавалася, што яна адчувае дотык ледзяных пальцаў, і яна кідалася на другі край ложка, спрабавала ўцячы ад таго, ад чаго ўжо не было куды ўцякаць, бо яно ўжо здарылася і так застанецца назаўсёды.

Нарада ў кухні працягвалася доўгія гадзіны. Некаторыя суседкі лічылі, што ў малую ўсяліўся д'ябал, і калі яго з яе выгнаць, то ганебная цыцка знікне сама па сабе.

У якасці экзарцыста прапанавалі нейкага млецкага пустэльніка і расстрыгу, пасля аднаго манаха з Сіня* і яшчэ аднаго, які дваццаць гадоў сядзеў у зэніцкай турме*, бо дыстанцыйна выганяў д'ябла з славенскага партбоса Борыса Кідрыча*, што мела вынікам раптоўную Кідрычаву смерць, і камуністы, як сцвярджала найстарэйшая сярод прысутных, не перастаючы спрытна вязаць карункі, за гэтыя вуду-чарадзействы засудзілі экзарцыста, які наагул быў дамініканцам, белым манахам.

А можа варта было паклікаць таго трэбіньскага ходжу, не зважаючы на розніцу ў веры і ўсе небяспекі, якія з гэтага выцякаюць, бо ён па Ўсходняй Герцагавіне і Падрынні з апантаных д'яблам дзяцей зняў больш сурокаў, чым усе каталіцкія святары разам узятыя.

Ідэя выгнання з унучкі д'ябла Рэгіне не падабалася, хоць яна апошнім часам упершыню ў жыцці пачала адкрываць для сябе Бога і царкву, але ўсё роўна не разумела сэнс экзарцызму і не магла паверыць, што д'ябал улазіць у людзей, як п'яны ў сваё паліто. Яна была больш схільная думаць, што тут гаворка ідзе пра нейкае спадчыннае парушэнне. Пра такія рэчы шмат гаварылася ў тэлевізіі, і гэта ідэальна адпавядала таму, што яна думала пра Віда Кралева, памерлага Дыянінага мужа. Не было ёй гідка думаць, што тут была і спадчына па Іву Дэлавале, яе нябожчыку мужу і Мірнінаму дзеду. Нават здавалася лагічным, што жаночыя праклятцці пераносяцца па мужчынскай лініі. Ніколі ў жанчыне не можа быць столькі зла, колькі бывае яго ў тым, што пакіне ім муж ці бацька.

Адна суседка настойвала, што яны маюць справу з медычнай праблемай, і таму дзяўчынку трэба тэрмінова весці да доктара, існуюць гарманальныя таблеткі, ін'екцыі і цуды медыцыны, бо тая

цыцка магла б малую забіць або знявечыць на ўсё жыццё. Дактары мусяць спыніць яе рост, каб да той самай велічыні магла вырасці другая, калі на гэта прыйдзе адпаведны час. Але гэтай суседцы хутка заткнулі рот і астатнія кумкі, і сама Рэгіна. Было малаверагодна, што гэта нейкая вядомая хвароба, бо тады пра такія выпадкі нехта ўжо чуў бы. Такіх дзяўчатак нехта ўжо бачыў бы на вуліцы ці на пляжы. Яшчэ менш верагодна, што ў амбулаторыі знойдуцца лекі на такую вялікую цыцку. А калі дзіця ўсё ж завядуць у шпіталь, дык праз тры дні ўвесь горад будзе ведаць пра выродства малой Кралевай, і ганьба прагрызе каменныя сцены дома Дэлавале.

Вядома ж, усе дзевяць жанчын зарэкліся, што будуць маўчаць аб убачаным. Яны зграшылі б супраць дзіцяці перад Богам, калі б некаму хоць нешта сказалі, але мінула не тры, а ўсяго два дні, як увесь горад ужо гудзеў пра дзіва з вуліцы Пад Старай Морвай. Цыцка на целе дзесяцігадовай дзяўчынкі ўмомант перарасла сваю сапраўдную велічыню і зрабілася найбольшай у доўгай і слаўнай гісторыі горада. З яе ўжо пырскала малако, вакол смочка выраслі тры доўгія і тоўстыя чорныя валасіны, хадзіла пагалоска, што паглядзець на дзіва едуць дактары з Амерыкі, прыедуць і гаспадары італьянскага цырку, бо можа ў малой вырасце і барада. Гэтая гісторыя аднолькава забаўляла як прымітыўных і паўпісьменных гандлярак на рынку, гэтак і інтэлектуальную эліту, прафесараў і журналістаў, а таксама рэжысёраў і актораў мясцовага тэатра, якія па суботах збіраліся ў Гарадской кавярні і строілі жарты на адрас малой Амазонкі і тых прычын, з якіх менавіта цяпер, у часе ўскладнення палітычнай сітуацыі ў краіне і пагрозы вайны, яна з'явілася менавіта тут, на гэтым самым месцы. *Ці яна нас яшчэ не мабілізуе і не пашле абараняць гэтыя муры?* пытаўся ўголас мясцовы лірык і лайдак, які за недахопам таленту і натхнення ўвесь свой мастацкі сэнс знаходзіў на рагу стала ў Гарадской кавярні. Ягоны досціп быў сустрэты за сталом грэблівымі выразамі твараў. Яго не ўспрынялі ні як добры жарт, ні як асабліва мудры каментар. А што яшчэ ён мог высіліцца сказаць?

Мірна да вечара так і не здолела супакоіцца. Дарыян заспеў яе ў ложку, яна ўся дрыжала і, усхліпваючы, неразборліва адказвала на пытанні. Ён пабег да бабулі і спытаўся, што здарылася. *Гэта не*

для мужчынскіх вушэй, дзетка, сказала яна. *Пабачым, што будзе для тваіх вушэй, калі вернецца маці*, адказаў ён і вярнуўся да сястры.

Усю ноч ён сядзеў з ёю і спрабаваў даведацца, што здарылася, але яна яму спачатку не магла, а пасля не хацела сказаць. Што тады круцілася ў яго ў галаве, адзін Бог ведае, але брат так ніколі і не даведаўся, дзеля чаго Мірна нагэтулькі не ў сабе. Пакуль ён нічога не будзе ведаць пра жанчын і мужчын, ён будзе часта пытацца, але калі пачне ўсведамляць і спазнаваць адрозненні паміж імі, больш інстынктыўна, чым свядома, то перастане памятаць пра гэты дзень.

Калі, ужо дванаццацігадовым, адной позняй летняй ноччу ён убачыць у тэлевізіі Бергманаву «Дзявочую крыніцу» і зразумее, што значыць слова згвалтаванне, Дарыян пачне верыць, што ў той дзень, калі ён быў у школе, а пасля хадзіў паляваць на галубіныя гнёзды, ягоную сястру згвалцілі. Ён будзе ў гэта верыць і тады, калі вар'ятку Манду будуць спускаць у магілу, і яго ніколі больш не пакіне тое адчуванне віны, якое нарадзілася, калі ён бачыў у Бергманавым фільме, як бацька згвалтаванай дзяўчыны лупцуе сябе бярозавым галлём. Яму і ў галаву не прыйшло, што Мірнін злом мог мець нешта агульнае з цыцкай, нічога не зразумеў ён і з таго факту, што ўвесь горад пра гэта гаворыць. Ён зрабіўся надоўга няшчасным і насіў цяжар у сэрцы, бо ён быў адзіны, хто не лічыў гіганцкую цыцку выродлівым дзівам, а таму і не здагадваўся, што ўся праблема была ў ёй.

Раніцу пасля бяссоннай ночы брат з сястрой праспалі. Рэгіна не хацела іх будзіць, бо сон важнейшы за школу. Нават старалася, каб у хаце было чым цішэй, не даставала каструлі з буфета, не перакрыквалася праз акно з суседкамі. Ведала, што яны не спалі ўсю ноч. Яна любіла гэтых дзяцей больш, чым сваю дачку, бо дзеці ні ў чым не вінаватыя, але яе любоў да іх была ўбогая, суворая і няўстойлівая. Аднак і такая любоў прыходзіла толькі тады, калі з імі здаралася нешта дрэннае, калі яны хварэлі, плакалі ці спалі. Малыя верабейкі, брацік і сястрычка смерці, ледзь відаць, як дыхаюць.

Сама яна любіла шмат паспаць, але ніколі не мела на сон досыць часу, таму і злітавалася з іх дваіх і з іх сну, дазволіўшы ўсёй мілаце свайго сэрца напоўніць гэтую ранішнюю думку пра ўнукаў. Так зда-

ралася кожны раз, калі яна ў Мірне і Дарыяну пазнавала нешта сваё, тое самае пачуццё, жаданне, а тым болей страх. Тады яна расчулена іх абдымала і бараніла, чаму Дыяна заўсёды дзівілася і раптоўныя Рэгініны прыступы любові прыпісвала ейным гадам, старэчаму маразму ці вар'яцтву, якое ў малых дозах заўсёды заўважала ў маці. Яна не заўважала, што ва ўнуках бабуля любіць толькі тое, што адчувае і ведае ў сабе. Дый не магла заўважыць, бо Рэгініны праявы замілавання і пяшчоты здараліся выключна рэдка, звычайна яна рабіла ўражанне больш ці менш абыякавай і незацікаўленай. А часам і нечувана халоднай, нават у тых сітуацыях з унукамі, якія кранулі б сэрца любой бабулі ў гэтым свеце.

Жывучы ў сваім парушаным свеце, Рэгіна Дэлавале дзяліла з іншымі толькі тое, што яны пасылалі з сваіх цэлых і некранутых душаў як выпадковыя знакі пазнавання. Яна была апантаная тым, што адбывалася ў яе ўнутры, і калі б нехта мог увайсці ў яе сэрца, то адчуў бы там жанчыну, якой не адбалелі абра́зы, расчараванні і падманам скрадзеныя гады, адным словам, жанчыну, якая без мужа дажыла да пяцідзесяці, а не старую, якой ужо споўнілася восемдзесят пяць. Гэтае непаразуменне паміж душой і целам, дзе першая была маладая ў няшчасці, а другое знасілася ў адпаведнасці з гадамі, было магчымай прычынай доўгага жыцця Рэгіны Дэлавале. Ёсць два натуральныя шляхі пайсці з гэтага свету: або пойдзеш, як бальшыня людзей, прымірыўшыся з растрачаным жыццём, або скончыш вар'яцтвам, бо душа не вытрымае неспакою. Інтэнсіўнасць вар'яцтва ўрэшце заўсёды вызначыць даўжыню жыцця.

Надвячоркам таго самага дня Мірна сказала бабулі, што ў школу больш хадзіць не будзе. *Маці цябе заб'е, калі вернецца!* спрабавала пераканаць старая, але ўсё было дарэмна. Дзяўчынка вырашыла, што больш ніколі не выйдзе з дому і не пакажа людзям сваю ганьбу. Зрэшты, яна не верыла, што дачакаецца дня матчынага вяртання з афрыканскіх падарожжаў. Чакаць заставалася яшчэ дзён дваццаць, што ёй як некаму, хто памірае, здавалася занадта доўгім тэрмінам. Яна ляжала ў ложку і глядзела ў сцяну, на якой віселі партрэты актораў і поп-спевакоў, рэліквіі даўняга бестурботнага часу, які скончыўся праз некалькі дзён пасля матчынага ад'езду, калі

Мірна ўпершыню заўважыла, што ў яе левы бок грудзей большы за правы. Калі б маці не паехала, магчыма, усё было б іначай, яна своечасова завяла б яе да доктара, зрабіла б тое, што трэба было зрабіць; а цяпер ужо безнадзейна позна. Няма ніякіх сродкаў, каб нехта яе выраўняў ці хаця б спыніў буянне дзікай плоці. Ёй зрабілася шкада самой сябе – без бацькі, маці кінула, засталася яна адна на гэтым свеце. Паліліся слёзы, і Мірна ўрэшце знайшла нешта, што было ёй знаёмае, пачуццё, якое не было для яе новым і ў якім яна прынамсі на кароткі час магла супакоіцца.

Назаўтра настаўніца Клара Шарамет, сівагаловая старая дзеўка, фанатычна цярплівая з вучнямі, але вядомая ў горадзе як дзівачка, так што бацькі падпісвалі супраць яе петыцыі з патрабаваннем, каб яе датэрмінова выправілі на пенсію, спыталася ў Дарыяна, дзе ён быў учора і чаму ягонай сястры ўжо трэці дзень няма ў школе. Ён схлусіў, што яму балеў жывот, а Мірна таксама хворая. Ён ліхаманкава спрабаваў прыгадаць, на што яна хворая, але занадта доўга яму нічога не прыходзіла ў галаву. *Ваша маці яшчэ не вярнулася з падарожжа?* перапыніла настаўніца яго роздум. *Яшчэ не, але хутка вернецца*, адказаў ён. *А як ваша бабуля?* спыталася яна пяшчотна і занепакоена, нічога не падазраючы.

Дарыяну гэта надало адвагі, ён падумаў, што яна не звярнула ўвагу на хлусню, як тады, калі рабіла выгляд, што не бачыць, як дрэнныя вучні спісваюць у добрых, дзеля чаго сярод вучняў мела славу найдурнейшай і тым самым найлепшай настаўніцы. *Бабуля добра, яна адзіная не хварэе*, адказаў ён, можа, занадта бадзёра. Яна ўхвальна паківала галавой, і якраз калі ён ужо падумаў, што гэта ўсё і яна пакіне яго ў спакоі, нечакана спыталася: *Ты нічога мне не забыўся сказаць?.. Нічога*, адказаў ён і ведаў, што на гэтым справа не скончыцца.

Была пятая гадзіна надвячоркам, калі Рэгіна адчыніла дзверы свайго дома і ўбачыла настаўніцу Клару Шарамет. Яна не магла схаваць крыху гідлівы выраз твару; яна не цярпела гэтай жанчыны, ніхто не ведаў чаму, але Рэгіна была адна з тых, хто разносіў па горадзе гісторыю, быццам Клара любіцца з жанчынамі і таму кожнай зімою на канікулах ездзіць у Нямеччыну, хоць нічому та-

кому, як і ніякім іншым злым чуткам, што за ёй хадзілі, настаўніца не давала ніякіх падставаў, а ў Нямеччыну ездзіла проста таму, што па маці была немка і мела ў Гамбургу пяцёра малочных братоў і сёстраў, усіх як адзін багатых або прынамсі заможных людзей, якія намаўлялі яе там застацца, купілі ёй кватэру, у гаражы яе чакала ўласная машына, але яна не хацела пакінуць сваю самоту ў злосным міжземнаморскім горадзе і школу, якая ёй дасканала кампенсавала кожны жыццёвы недахоп, спароджаны яе залішняй адасобленасцю. Яна не выходзіла замуж, бо проста ніколі ні ў кога не закахалася. Яна праз гэта зусім не пакутавала, бо проста не лічыла вартым увагі, дый побач не было нікога, хто б ейную ўвагу мог прыцягнуць. Як той, хто, не выкурыўшы за ўсё жыццё ніводнае цыгарэты, няздольны ўявіць сабе, што можа быць прыемнага ў тытуні, і таму шкадуе ахвяраў тытунёвай залежнасці, гэтак сама і Клара Шарамет ціха, без словаў шкадавала ўсіх, хто далучае да сваіх гора й няшчасця яшчэ і чужыя.

Яе бацька, мостарскі малявальнік шыльдаў, а пазней уладальнік кінатэатра «Арыён», у 1945 годзе быў адсуджаны на смерць партызанскім судом, бо за чатыры гады вайны прымаў у сваім доме італьянскіх і нямецкіх афіцэраў і пікнікаваў з імі летнімі начамі на беразе Нярэтвы. Як прымаў і камуністычных падпольшчыкаў, даваў ім усё, што ім было трэба, а ў падвале сваёй хаты, не зважаючы на смяротны страх сваёй Гудрун, Кларынай маці, хаваў параненую партызанку Палому Леві, а калі яна ачуняла, перавёз яе таемна ў сваім мерсэдэсе, праз усе патрулі і варты, аж да Ябланіцы. Стары Шарамет быў супраць Гітлера, але не мог быць супраць прыстойных людзей, а толькі з такімі, без розніцы ўніформаў і азнакаў на іх, ён сябраваў. Нацысты яму былі агідныя, калі ён глядзеў на іх здалёк, а як толькі яны набліжаліся, яшчэ нават не пазнаёміўшыся з імі, ён разумеў, што гэта ветлівыя і прыстойныя людзі, якія, калі б не вайна, збіралі б каменьчыкі незвычайных формаў на берагах Нярэтвы ці шукалі б і апісвалі ў наваколлях Главацічава дзівосныя зёлкі, якіх у Нямеччыне не водзіцца.

Легкадумны і галантны Шарамет пражыў вайну ў раскошы, не надаючы ўвагі таму, што гавораць на гарадскіх вуліцах, і адкры-

та пагарджаючы ўсташамі*, бо сярод іх не знаходзіў прыстойных і культурных людзей і не меў ніякага жадання з імі пазнаёміцца, і таму здолеў настроіць супраць сябе кожнага, хто правёў вайну ў голадзе і страху або каму тое ці другое войска ці банда забілі некага блізкага. Насамрэч яго ненавідзелі ўсе, каму ён не дапамагаў, а знайшліся і такія, якія забывалі, што ён для іх зрабіў.

За пару месяцаў да вызвалення Мостара да яго прыйшоў Франка Рэбац, камуніст ад часоў Вукаварскага з'езду*, і папярэдзіў, каб ён на нейкі час знік з горада: бо і жонка ў яго немка, і зарабляў ён на італьянцах і немцах, і яшчэ шмат з кім з іх сябраваў...

Гая Шарамет рассмяяўся: *Братка ты мой, ды хто мяне кране? Гэта ж прыстойныя людзі*. Франка не быў упэўнены, каго той лічыць прыстойнымі – фашыстаў ці камуністаў. Ён толькі сказаў: *З прыстойнымі і ўсякая набрыдзь прыйдзе*. Калі ён пайшоў, Гудрун спыталася ў яго, што значыць слова набрыдзь. Гая адказаў: *Ты не паверыш, але я не ведаю. Чую пра набрыдзь ад самага нараджэння, можа тысячу разоў і сам яго вымавіў, але і да сёння я ні ў кога не пытаўся, што яно значыць. Бачыш, чаму добра, што ты немка. Пытаешся пра тое, што я нібыта ведаю, а насамрэч не ведаю. Дык вось, пры першай нагодзе знайду каго разумнейшага, каб патлумачыў мне, што ж такое гэтая набрыдзь*.

Але перш чым ён паспеў у некага спытацца, партызаны ўвайшлі ў горад, ён быў арыштаваны і адданы пад суд. І знайшлося супраць Гаі Шарамета больш сведкаў, чым супраць найгоршага забойцы. Адны хлусілі, другія казалі праўду, якая была нічым не лягчэйшая за хлусню, а ён сядзеў з ланцугамі на руках, слухаў, як у яго за спінай публіка ў судовай залі выкрыквае баявыя лозунгі, і ніяк не мог паверыць, што пракурор і суддзя ўрэшце не зразумеюць, што здарылася памылка. Ён нават падумаў, што сэнс працэсу ў тым, каб яго запалохаць, бо ім відавочна не давала спакою, што ён цэлыя чатыры гады не даваў вайне задурыць яму галаву ці зрабіць яго набрыддзю, якая палезе праз чужыя галовы дамагацца нейкай сваёй справядлівасці. Першы раз ён сур'ёзна спалохаўся, калі прызначаны яму адвакат замест пакарання павешаннем, якога патрабаваў пракурор, пачаў дамагацца, каб ягонага падабароннага Гаю Шарамета проста

расстралялі. Але ён і надалей спадзяваўся, што прыйдзе нехта і скажа: *Ці ведаеце вы, хто гэты чалавек?* І тады ўсе пад смех і жарты пойдуць у тую карчомку пад Старым мостам і ўп'юцца ў пень. І суддзя, і пракурор, і адвакат, і ўсе іншыя, а ён галантна за ўсіх заплаціць.

Ягоны аптымізм ствараў уражанне сур'ёзнага псіхічнага разладу, ад якога людзі робяцца серыйнымі забойцамі, але аптыміст у кепскія часы мог загубіць толькі сам сябе. Калі Гаю Шарамета ставілі да сценкі і чорнай хусткай завязвалі яму вочы, ён у адзін момант усраўся і ўсцаўся. *Ах якія парфумы запахлі ў здрадніка!* было апошняе, што пачуў у жыцці бацька настаўніцы Клары, але, на шчасце, ён ужо нічога не адчуў у той момант, калі ўпаў у гразь, ад якой так хацеў быць чым далей.

Кларыну маці вывезлі ў лагер для этнічных немцаў недзе ў Славоніі, але ў апошні момант яна здолела сунуць трохгадовую дачку ў рукі цётцы Тэрэзе, Гаевай старэйшай сястры і жонцы Пэры Даманавіча, партызанскага камандзіра, які загінуў, вызваляючы Мостар. Тэрэза Клару і выгадавала, гадамі беспаспяхова спрабуючы вярнуць дзіця матцы, якая зноў убачыць дачку толькі праз дванаццаць гадоў. Але тады ўжо ўсё было гатова і скончана; кожны лёс заняў сваё месца пад небам, і Клары нават у галаву не прыходзіла перабрацца ў Нямеччыну. Кожную зіму яна будзе ездзіць у Гамбург, адчуваць братоў, сясцёр і родных як сваю кроў і плоць, але нічога болей. Пасля таго, як перад заканчэннем яе навучання ва ўніверсітэце памерла цётка Тэрэза, яна жыла далей сама, без кахання і замужжа, і была цалкам шчаслівая.

Я хацела б пабачыць Мірну, загаварыла першай настаўніца. *Ай, дальбог, не ведаю*, сказала Рэгіна і саступіла з праходу, прапускаючы Клару, хоць і не запрасіла яе ўвайсці і не мела намеру гэта рабіць. *Яна хворая?.. Нічога я не ведаю... Добра, тады завядзіце мяне да яе... А нашто?* спыталася старая ў непрыяцелькі, хітравата жмурачыся. Яна спрабавала змусіць яе адступіцца, хоць бы гэта было і на шкоду яе ўнукам, але пры гэтым адкрыта не адмовіць і не бразнуць дзвярмі ў яе перад носам, бо ў прыстойных дамах так не робіцца. Ніхто не ведае, чаму не робіцца, але такі ўжо звычай і яго трэба трымацца. *Я хачу яе бачыць, бо я яе настаўніца*, адказала Клара, прызвычаеная

да ўсіх мясцовых звычаяў. І накіравалася да драўляных сходаў, якія вялі на другі паверх. *Чакай, малой нядобра*, ішла за ёй Рэгіна. *Каторыя дзверы?* Старая паказала пальцам на Мірнін і Дарыянаў пакой. *Вялікі вам дзякуй. Больш вы мне не патрэбныя*.

Дзяўчынка хутчэй чакала б, што ў яе пакоі з'явіцца злая ведзьма з казкі пра Гензэля і Грэтэль, а не яе настаўніца. Яна нацягнула прасціну на галаву і спрытна скруцілася вожыкам. Яна застанецца так ляжаць, што б ні спрабавала настаўніца, бо раней ці пазней тая мусіць устаць і пайсці. Клара села на ложак, апусціла далонь на дрыготкі белы клубок і трошкі памаўчала, быццам не ведаючы, што казаць і з чаго пачаць.

Што б ні здарылася, думаю, што гэта не так страшна, сказала яна і зноў замаўчала. *Нічога важнага ты не прапусціла, і ніхто на цябе не злуе. Чуеш мяне? Добра, ты не мусіш нічога казаць. Я прыйшла, бо пачала хвалявацца. Усё астатняе няважна. Ты не хворая? Калі была б, не хавалася б. Але ўсё ў парадку, з намі ўсімі так бывае, што хаваемся. Не можа чалавек увесь час рабіць тое, чаго ад яго чакаюць. І я таксама не магу, і тады хаваюся, а іншыя хто заўважыць, а хто не заўважаць. Заўважаюць тыя, хто цябе любіць і выпадкова апынуўся побач. Мірна, ці ты слухаеш мяне? Ну так, што за глупствы я кажу, вядома слухаеш. Табе нешта баліць? Калі так – проста паварушы нагой. У цябе нейкая праблема ў школе? Нехта цябе пакрыўдзіў? Ці здарылася нешта іншае?*

Мірна зусім трошкі выпрастала правую нагу. *Нешта страшнае?* Выпрастала да канца, так што нага вылезла з-пад прасціны. *Нехта табе нешта сказаў?.. Не*, вымавіла ўрэшце Мірна. Настаўніца глыбока ўздыхнула і паляпала цела пад прасціной. *Я не магу вам паказаць*, сказала дзяўчынка. *Што?* спыталася Клара, памалу здагадваючыся, што гэта за страшныя рэчы, якія дзесяцігадовая дзяўчынка не магла б паказаць. *Добра, не трэба нічога мне казаць. І не абавязкова зараз нічога паказваць. Але я табе нешта скажу: нічога, што б ты магла мне паказаць, не будзе для мяне такім страшным, як для цябе. Я табе ўжо гэта казала, так? Так, я паўтараюся. Ведаеш, калі я была маладзейшая, і то не нашмат маладзейшая, чым цяпер, я хавалася ад іншых. Не ад вучняў, а ад сяброў і прыяцеляў, тых, каму я дара-*

гая. Я рабіла так заўсёды, калі не ведала, што са мною, бо я баялася, што страчу іх, калі пакажуся ім такая. Сёння мне гэта смешна, тое, якая я была, але мне не смешны страх, які я перажыла. Калі ты не хочаш мне сказаць, што з табой, я пастаўлюся да гэтага з павагай і пайду. Ты не мусіш ісці ў школу ні заўтра, ні паслязаўтра, але ты не можаш застацца тут назаўсёды. Некалі ты мусіш выйсці. Ніхто не будзе цябе прымушаць, проста больш так не зможаш. Дык падумай, што табе лягчэй: зрабіць гэта адразу ці адкласці на нейкі іншы дзень. І адно і другое ў парадку. Але я думаю, глядзі – я думаю, а не патрабую, каб і ты так думала – што лягчэй зрабіць гэта цяпер, адразу. Хочаш, каб я зараз пайшла?

Мірна не адказвала. Калі яна скажа настаўніцы, каб пайшла, яна пазбегне большага сораму і застанецца сама. Гэтае другое ёй больш не здавалася такім добрым. *Паварушы нагой, калі хочаш, каб я засталася!.. Застаньцеся*, шапнула яна. І абедзве патанулі ў маўчанні, якое цягнулася вельмі доўга. Мірна ведала, што настаўніца застанецца на столькі, на колькі яна будзе хацець, а Клары больш не было куды спяшацца. Яна слухала дыханне гэтага дзіцяці і адчувала сябе патрэбнай як ніколі. Гэта было тое, чаго яна ад сябе найчасцей чакала і дзеля чаго не магла ўявіць сабе ні жыццё ў Нямеччыне, ні выхад на пенсію; адчуваць сябе патрэбнай! Гэтае пачуццё застаецца з ёй усё жыццё, і няма ў ім, як і ў шмат чым іншым, нейкай глыбокай прычыны. Проста такой нарадзілася Клара Шарамет і толькі яе інакшасць прымушала людзей прыдумляць прычыны і схаваныя ганебныя матывы, хоць сама перад сабою і перад небам, якое ўрэшце вызначае ўсе цуды, яна была зусім звычайная жанчына.

Вы не будзеце мяне ненавідзець? калі пачуўся голас з-пад прасціны, было ўжо вельмі позна, пакой патанаў у змроку. *Ну што ты, Мірна, не буду*. Найперш з-пад прасціны вынырнула галава, *цёмна*, сказала Клара, *не запальвайце святло*, сказала дзяўчынка і скінула з сябе прасціну.

Вы што-небудзь бачыце?.. Ну дык жа цёмна... У мяне тут нешта вырасла... Дзе, жанчына прыкусіла язык, *ой, дык гэта і ёсць праблема? Мама табе пра гэта нічога не казала? Ну так, вядома, бо не паспела. Ніколі не ведаеш, калі гэта здарыцца. У жанчын грудзі*

пачынаюць расці ў розным часе, паміж дзесяццю і чатырнаццацю гадамі, як у каго, але гэта нармальна... У мяне вырасла толькі адна. Вялізная... Як гэта – толькі адна? Ну так, не растуць абедзве аднолькава хутка... Не, другой зусім няма... Ты ўпэўненая?.. Так, яе няма... Ведаеш што, Мірна, напэўна і гэта нармальна... Як гэта – нармальна?.. Нічога страшнага. Вырасце і другая... Дык гэта так і трэба?.. Вядома. Ну ты ж, напэўна, бачыла жанчын на пляжы... Бачыла, але... і тут Мірна спынілася.

Яна не ведала, у што верыць. Ёй здавалася немагчымым, што існуе нешта, што здараецца з кожнай дзяўчынкай, а яна пра гэта нічога не ведае. *Неўзабаве з табой пачнуць адбывацца і іншыя рэчы, якія таксама не такія страшныя і ненармальныя, але пра гэта табе раскажа мама, калі вернецца. Не трэба ў яе нічога пытацца. Яна сама табе ўсё скажа, як толькі цябе ўбачыць.*

Клары пачало рабіцца трошкі няёмка. У цемры пакоя, куды святло трапляла толькі ад зорнага неба, яна сядзела з дзяўчынкай і не магла ёй сказаць тое, што сказаць так проста, але з нейкай прычыны проста так не кажацца, а тым болей дзіцяці, якое ты сама не нарадзіла.

Але я цяпер мабыць не пайду ў школу, сказала дзяўчынка, калі настаўніца ўжо ўстала. *Пра гэта не можа быць і гаворкі. З чаго гэта ты не пойдзеш? Тое, што з табой цяпер адбываецца, хутка будзе адбывацца і з іншымі. Што гэта было б, калі б усе дзяўчаткі перастаралі выходзіць з дому, як толькі пачыналі б ператварацца ў жанчын?.. Але яна толькі адна і вялізная. І гэта відаць... Ну і што з таго, што відаць? Гэта нармальна, што відаць. Выспіся, а заўтра пабачымся. І радуйся, што ўсё добра.*

Што вы так доўга рабілі ў яе пакоі? Рэгіна чакала яе ля дзвярэй. Клара падумала, што зараз было б добра сказаць гэтай бабе ўсё, што трэба было б ёй сказаць і яшчэ нашмат болей, але яна не сказала нічога, акрамя да пабачэння, выходзячы з хаты. Але і гэтага ў нейкім сэнсе было зашмат. *Каб вочы мае цябе не бачылі, пізда касая*, прамармытала Рэгіна, бразнуўшы за настаўніцай дзвярмі.

Яна была раз'юшаная, павук атруціўся б, калі б яе ўкусіў. Быццам нехта зганьбіў яе дом і атруціў паветра, якім яна дыхае. Яна сядзела

каля распаленай пліты, ламала пальцы і праклінала ўсё запар: дачку, якая блядуе невядома дзе і невядома з кім, а не было б дзіва, калі і з неграм, яе дзяцей, якія яшчэ як след не вылупіліся з яйка, а ўжо множаць сямейную ганьбу і працягваюць адтуль, дзе спыніліся бацькі. Праклінала сама сябе, бо зноў падманулася, як гэта заўсёды здараецца, і зноў нехта ад яе чакаў, каб яна адчула сябе вінаватай. А Рэгіна Дэлавале сама перад сабой ні ў чым не была вінаватая. Ведалі б і іншыя, што яна невінаватая, калі б пражылі ейнае жыццё дзень за днём і год за годам ці калі б прынамсі пачулі ад некага ейную гісторыю. Ад яе самой яе не пачуюць. Яна будзе маўчаць, як магіла, і цярпець пакуль можа, а калі больш не зможа, дык хай праглынуць яе мёртвыя вусны.

Пайшоў прэч, байструк курвін, закрычала яна на Дарыяна, які зайшоў у кухню па хлеб з еўракрэмам. Той вышмыгнуў на дыбачках, нібы ўцякаючы з клеткі з ільвамі, куды трапіў у нейкім кашмарным сне.

Мірна паслухалася настаўніцу і наступнай раніцай пайшла ў школу. Яна надзела найшырэйшую Дарыянаву кашулю, а наверх Дыянін плашч-дажджавік, але не было на вуліцы пары вачэй, якія ў яе не ўтаропіліся б. Жанчыны ў чорным перашэптваліся і паказвалі на дзяўчынку пальцамі, мужчыны ў Гарадской кавярні адкладалі газеты на стол і праводзілі яе позіркам, дзятва смяялася, і Мірне было ясна, што гэта адбываецца не з прычыны яе цыцкі, яны яе і не маглі бачыць, а таму, што бабуліны сяброўкі разнеслі гісторыю па ўсім горадзе, і гісторыя тая будзе расці, аж пакуль у яе не ўтаропяцца ўсе да апошняга. Чым больш тых, хто так на яе глядзіць, тым менш будзе тых, хто яе не бачыў. Гэта ў нейкім сэнсе і добра. Дарыян ішоў за пару крокаў ззаду яе і не паднімаў позірку з дарогі. Яны выглядалі як гарадскія сіроткі, з якіх злітаваўся б толькі казачнік, але ён быў на далёкай поўначы і ўжо даўно памёр.

Клас, як ні дзіўна, выявіў значна менш цікавасці да Мірнінай цыцкі. Калі яна зняла плашч, усе, як на загад, паглядзелі на тое, што напухала пад кашуляй, і ўмомант расчараваліся, бо, наслухаўшыся расповедаў дарослых, спадзяваліся ўбачыць нешта большае. Пасля яны ўжо былі гатовыя забыцца пра тую цыцку. Калі ты малы і ме-

раеш жыццё днямі, а не гадамі, з табой часта здараюцца цуды, але яшчэ часцей ты расчароўваешся і разумееш, што ніякіх цудаў няма.

Бурлівей рэагаваў Борыс Вэрбэр, сын пары мастакоў, якія за год да таго перабраліся сюды з Заграба, але і ён так рэагаваў выключна таму, што да ягоных бацькоў не дайшла гісторыя пра малую Амазонку. *Глядзі якая сісяра!* цапнуў ён Мірну, на што Дарыян кінуўся на яго, і распачалася бойка, з якой малы Вэрбэр выйдзе з разбітым брывом. Калі настаўніца ўвайшла ў клас, кроў была паўсюль, Борыс роў, нібыта з яго лупяць скуру, з'явіўся і дырэктар, *хто тут біўся?* схапіў ён Дарыяна за вуха і пацягнуў у свой кабінет. Настаўніца пабегла за імі, але спынілася на паўкроку, як баскетбаліст, які пераходзіць у контратаку, пабегла назад да скрываўленага Борыса, і ўзнялася сумятня, якая, аднак, не будзе мець трывалых наступстваў, якія, як гэта звычайна бывае, унеслі б новыя праблемы ў настаўніцкі пакой і пасварылі б яшчэ непасвараныя вучнёўскія сем'і. Малога Вэрбэра завялі ў Дом здароўя, дзе яму трыма швамі залаталі рассечанае брыво, Клара разрывалася паміж яго ашалелымі бацькамі і дырэктарам, якому трэба было растлумачыць таемныя першапрычыны гісторыі, а таксама чаму Дарыянавы бацькі заўтра не могуць прыйсці ў школу, і ўрэшце ўсё супакоілася ў педагагічнай ідыліі.

Бацька Тобіяс Вэрбэр назаўтра прыйшоў у клас. *Добра, што ты бароніш сястру, але ўсё ж не трэба забіваць сябра*, сказаў ён Дарыяну, *а ты паглядзі, што з табой будзе, калі не будзеш абыходзіцца з дамай як джэнтльмен*, павярнуўся ён да сына. І ўсе маглі ганарыцца: Мірна братам, бо яе абараніў, дырэктар настаўніцай, бо яна ведае пра вучняў і тое, чаго не ведаюць бацькі, Борыс Вэрбэр сваім бацькам, бо той на агульную думку быў круты мужык, якія сярод бацькоў сустракаюцца рэдка. Толькі Дарыяну не было кім і чым ганарыцца.

Пасля крывавага двубою Мірніна цыцка больш не была класнай тэмай, але гарадской яна застанецца аж да Дыянінага вяртання з Афрыкі, пасля якога пачалася вайна*. Калі яна распакоўвалася з дарогі, пачало даносіцца рэха выбухаў. Дзеля таго што цэлыя чатыры месяцы яна не чула пра бацькаўшчыну ні слова, яна не мела ўяўлення, што гэта такое, і таму напалоханая прыбегла ў кухню, Рэгіна якраз складала талеркі ў буфет.

Мама, што гэта? а маці сярдзіта засмяялася, нібыта чакала менавіта гэтага пытання: *Нічога, хутка прыйдуць і будуць рэзаць нас, як свіней! І пытацца не будуць, хто з нас дзвюх свіння, а хто не.* Дыяну гэтыя словы шакавалі больш, чым выбухі. Якою б яна часам ні была, старая ніколі так не гаварыла. *Мама, што з табой?.. Пытаешся, што са мной, гэта ты ў мяне пытаешся? Вось твае дзеці, у іх пытайся, хай яны табе скажуць! Паглядзі на малую, калі ты маці, а пасля нешта ў мяне пытайся... А што мне ў яе глядзець. Ты пра цыцку? Каб я на яе паглядзела? Каб я ведала, якая ты, ніколі б не паехала... І лепей было б, каб не паехала... Ідзі адсюль, крыса старая, усё жыццё мне загубіла. Кожны дзень мой атруціла.*

І так, пакуль на горад падалі снарады, яны лаяліся і сварыліся, ды так, што ўпершыню не давалі адна адной ніякай літасці і не было нічога, што б адна пра адну ні прыпомніла і адразу не сказала б. Тая сварка не будзе забытая. Яны былі адна адной цяжарам у жыцці, як дзве прыблуды ў адным доме, які пакінулі гаспадары. Яны даймалі адна адну і тады, калі цэлымі днямі маўчалі адна адной у твар, бо ў кожны момант ведалі, хто пра што маўчыць. *Налізалася чорнага хуя, курва партовая!* сказала старая якраз тады, калі Дарыян увайшоў у кухню. *Гудзе сірэна. Трэба ісці ў сховішча*, спакойна сказаў ён і выйшаў.

Наступны месяц, а столькі працягвалася і вайна, будзе найцяжэйшы ў Дыяніным жыцці, горшы і за тыя тры, якія яна правяла з вар'яткай Мандай. Сын, а яшчэ болей дачка аддаліліся ад яе і ўспрымалі яе як чужую. Яны не прабачылі ёй ейнай адсутнасці, але яна не ведала чаму, бо ёй ніхто не сказаў, як развівалася гісторыя з Мірнінай левай цыцкай, ніколі яна не даведаецца і пра збор чорных варонаў у кухні, кульмінацыяй якога было нешта падобнае да згвалтавання. Яна цяжка пераносіла пагарду ў вачах дзяцей і іх раптоўна абуджаную жорсткасць, якая ў стаўленні да Рэгіны была ў іх яшчэ й большая, чым да яе.

Адносіны толькі трошкі палепшацца пасля таго, як на дваццаць трэці дзень вайны, калі яны будуць у сховішчы, запальны снарад трапіць у іхні дом, і ён згарыць дашчэнту, не застанецца ніводнай рэчы, якая паслужыла б успамінам пра ранейшае жыццё. Калі вай-

на раптоўна спыніцца, гэтак сама раптоўна, як, прынамсі для яе, Дыяны, пачалася, яна адчуе сябе голай і босай з гэтай тройцай на шыі, пра якую трэба клапаціцца. Абавязак, а не любоў звязвала яе тады з маці і дзецьмі, пра што яна ведала і сама, бо не праходзіла дня, каб яна не падумала, як бы яна цяпер, калі б не яны, паехала ў Каір і разам з Маркам, адзіным, хто зрабіў яе шчаслівай, села б на трансакіянскі карабель, працавала б кухаркай ці пакаёўкай і ўрэшце знайшла б тое, чаго шукала ў жыцці.

Пройдуць гады, перш чым яна зноў адчуе да Мірны і Дарыяна нешта, у чым бы магла прызнацца іншым. Пакуль жа яна будзе ўспрымаць іх як нейкую ўдовіну спадчыну, як нешта падобнае да чорных жалобных адзежын, якія жонкі маракоў і рыбакоў аднойчы надзенуць, каб ніколі больш не здымаць.

Калі не лічыць пажару, у якім згарэлі сямейныя памяткі, ніхто з іх чатырох ні па чым не адчуў вайну. Тэма, якая будзе вызначаць жыццё горада ў наступныя гады, іх не датычыла, бо была меншая і не такая бурлівая, як унутраныя разломы, якія будуць працягвацца да канца Рэгінінага жыцця, калі ўжо і Дыяна памалу ўвойдзе ў сваю першую старасць. Пасля збору суседак для агляду ўнучынай цыцкі, Рэгіна будзе паводзіць сябе як забойца, які хаваецца ад паліцыі і адначасна стварае сабе алібі, кожны дзень новае. Вінаватых у тым, што яна зрабіла, яна будзе знаходзіць паўсюль, найчасцей у Дыяне, якая няздольная быць сапраўднай маці, бо ў яе жаночы орган мацнейшы за душу, пасля ў Мірне, бо пайшла ў той самы корань і ў свае дзесяць была ўжо малой курвай, дзеля чаго мусіла быць пазначаная і фізічна, у настаўніцы Клары, якая сваю ненармальнасць пераносіць на вучняў. Рэгіна будзе вінаваціць усіх, хто хоць нейкім чынам мог быць звязаны з выродлівымі з'явамі ў сям'і Дэлавале. Праз некалькі месяцаў яна, напрыклад, прыгадала, што малая непасрэдна перад пачаткам росту цыцкі была прышчэпленая ад слупняку. У той прышчэпцы нешта было. Нехта рабіў на дзіцяці эксперыменты, і таму яе ўнучка пацярпела. Гэтае адкрыццё яе не раззлуе, але загоніць у глыбокую дэпрэсію. А дэпрэсія будзе трымацца да наступнага алібі. У тым эксперыменце Рэгіна Дэлавале бачыла нешта, што звязвае два лёсы і жыццёвыя няшчасці, ейнае

і ўнуччына, разумеючы каторы раз, што ты ў гэтым свеце асуджаны на пакуты, боль і сорам, як толькі народзішся жанчынай.

Мірніна выспяванне адбылося па-за чаргою і насуперак правілам, паводле якіх, колькі існуе свет, людзі пераходзяць з дзіцячага свету ў дарослы. Першай парою яна ўвесь час будзе да маці непрыязная, ускосна вінавацячы яе за тое, што з ёю здарылася, а пасля настане доўгая пара абыякавасці, аж пакуль абедзве не прызвычаяцца да гэтага як да нейкіх нармальных адносін, якія нікога ні да чаго не абавязваюць. Так перад ёй адкрылася шырокая прастора свабоды, з якой яна будзе чэрпаць, пакуль будзе што.

Пасля першай цыгарэты не пройдзе і трох дзён, як яна ўжо будзе курыць пры Дыяне, будзе мяняць хлопцаў, асабліва ў летнім сезоне, як на канвееры, і шакаваць горад непрыстойнымі паводзінамі на пляжах і ў парках. Гэтак будзе аж да таго дня, калі яна з шведам Максам, саракагадовым яхтсменам, уладальнікам вялізнай яхты, які, марнуючы без меры сямейнае багацце, цэлыя гады плаваў у цёплых марах, пражыве двухмесячную авантуру ў плаванні па карнацкім архіпелагу. Максава закаханасць выявіцца ў дзясятках тысяч долараў, якія ён здолее патраціць у адрыятычных рэстаранах, начных клубах, казіно і іншых месцах, у якіх можна патраціць столькі грошай, колькі трэба, каб чалавек дзякуючы гэтым тратам мог зрабіцца ўсім тым, кім не змог стаць у жыцці.

Гэта трывала да той раніцы, калі ў адной кавярні на шыбеніцкай набярэжнай Мірна сказала яму, што яна цяжарная, на што ён падскочыў ад шчасця, пааблівaў шампанскім усіх кліентаў на тэрасе, зафундаваў пітво ўсёй набярэжнай, некуды пабег і вярнуўся з цудоўным ружовым кімано, сказаўшы Мірне, каб пачакала яго яшчэ дзесяць хвілін, ён толькі сходзіць у банк па грошы, а затым адплыў і больш ніколі не азваўся, магчыма, ліхаманкава раздумваючы, ці ён не даў гэтай дзяўчыне свой адрас і нумар тэлефона ў Мальмё, бо калі даў, узнікнуць праблемы, якія ён не ўмее вырашаць. Мірна чакала Макса, аж пакуль не настаў вечар, а тады без куны ў кішэні выйшла на магістраль і чакала, пакуль нехта спыніцца і давязе яе да Дуброўніка. З ружовым кімано ў руцэ і пасведчаннем асобы ў кішэні, без ніякіх слядоў таго, што адбывалася з ёй апошнія два

месяцы, апрача таго, што яна насіла ў жываце, яна адчувала сябе, як тыя ўцекачы, якіх а трэцяй гадзіне ночы выганяюць з ложка і пасылаюць за тысячы кіламетраў. Аборт быў зроблены ў тым самым шпіталі, дзе знойдзе свой канец вар'ятка Манда.

Дарыян пасля Дыянінага вяртання з Афрыкі замкнуўся ў сабе. Ён унікаў матчыных і бабіных сварак, уцякаў ад Мірны, ягоны доўг якой з дня ў дзень усё больш павялічваўся, аж пакуль нарэшце ён не быў гатовы пайсці і больш ніколі не вярнуцца да сямейных пагарэлішчаў. Да Рэгінінай смерці ён не зробіць гэтага з той простай прычыны, што яшчэ не знойдзецца добрая нагода, якая некуды яго павядзе.

Настаўніца Клара неаднаразова за апошні год быцця класнай кіраўніцай у яе блізнятаў спрабавала Дыяне нешта сказаць пра тое, што здарылася ў часе афрыканскіх падарожжаў, але ўрэшце адступілася, будучы адштурхнутая самым грубым чынам пад намёкі пра яе сэксуальныя схільнасці. У вывяржэнні гневу, які яна не магла выказаць у сваім доме, Дыяна выкарыстоўвала фрагменты дурнаватых Рэгініных выдумак пра настаўнічына знаходжанне ў Мірніным пакоі і гэтым самым супакойвала сваё сумленне і захоўвала ў чысціні ўспамін пра Марка Радзіцу, які ўсё ж быў для яе найважнейшы.

Калі застанешся, цябе напэўна будуць праклінаць, але я буду твой да смерці, сказаў ён у іх апошнюю каірскую ноч. Яна ляжала, прыхіліўшы галаву да ягоных грудзей, горка плакала і ў наплывах лютасці, нібы нейкая акторка ў амерыканскім фільме, рвала ў яго з грудзей валасы. Да раніцы яна не адказала на ягоную прапанову, а ён яе не паўтарыў. Ён ведаў, што нешта такое проста немагчымае, бо яна не кіне дзяцей і не пойдзе з ім, як і ён не вернецца ў родны горад. Яны спазніліся сустрэцца на дзесяць гадоў, і гэтага нельга было выправіць. Яна будзе жыць далёка ад яго, чакаць паштовак з Сінгапура, Ганконга і Ліверпуля, аж пакуль аднойчы яны не перастануць прыходзіць і жар у ёй не пачне згасаць.

Праз паўгода пасля ваеннага месяца Мірніна правая цыцка выросла да велічыні левай. Але ні гэта, ні дзень яе першай менструацыі, ужо нікога не цікавілі.

XII

Я думала, што ты разумнейшая, сказала маці Дыяне ў той дзень, калі зрабілася канчаткова ясна, што менструацыя не спазняецца, а проста Від пасеяў нежаданае семя, якое цяпер буяе, і цяпер з яго напэўна народзіцца жыццё, а з гэтага і каханне паміж мужчынам і жанчынай.

І гэта ўсё, што ты маеш мне сказаць? спыталася яна ў Рэгіны. *Усё будзе добра,* лаканічна адказала старая, не збіраючыся паглыбляцца ў праблемы, якія ўзнікалі ў Дыянінай галаве.

Мама, што мне рабіць?.. Нічога, дзетка, усё будзе так, як мае быць, калі ўжо так сталася... Мама, у мяне мала часу на роздум, ламала яна пальцы, чакаючы пачуць нешта накшталт ухвалення ці спадзеючыся, што Рэгіна возьме на сябе адказнасць за тое, на што сама яна не можа наважыцца.

А што такое? Хочаш забіць тое, што расце ў цябе ў жываце? Можаш, хто ж табе забараняе. Але не будзе табе ад гэтага лепей. Кажу табе, што не будзе, сказала Рэгіна, не жадаючы яе ні падбадзёрыць, ні суцешыць, бо і яе ніхто не суцяшаў, калі яна ў свае трыццаць восем нараджала Дыяну.

Не ведаю, ці я кахаю яго, паспрабавала дачка яшчэ раз. *Быццам бы гэта нехта можа ведаць*, буркнула маці, надзела тапкі і пайшла ў агарод за домам праверыць, як узыходзіць тое, што яна пасадзіла.

Быў канец красавіка 1980 года, горад жыў цішэй, чым звычайна. На пляцы чулася толькі пстрыканне фотаапаратаў і гамана нямецкіх, англійскіх і італьянскіх дзяцей. Нашы маўчалі ў адпаведнасці з доўгім публічным рытуалам, які пачаўся каля Новага года, калі ў люблянскім шпіталі была ампутаваная нага пажыццёваму прэзідэнту дзяржавы і найулюбёнейшай асобе ў скупой і крывавай любоўнай гісторыі балканскіх народаў і народнасцяў. Кожны дзень ананімны лекарскі кансіліюм выдаваў кароткія

паведамленні, у якіх прыгожымі і падбадзёрлівымі навінамі пра хуткае выздараўленне насамрэч абвяшчалася немінучая смерць. Ніхто пра яе ўголас ці нават шэптам не наважваўся згадаць, бо такі зыход быў для грамадства непрымальны. І рэч тут была не толькі ў палітычных прычынах, якія не давалі памерці найвялікшаму сыну бацькаўшчыны, але і ў нечым, што каранілася значна глыбей у калектыве і ў кожным яго члене. Жыццё, якое згасала ў Любляне, было для народа архетыпічнай дадзенасцю, незалежна ад таго, ці ты належаў да бальшыні, слепа ўлюбёнай у дзяржаву і ўсе яе пісаныя правы і звычаі, або ты быў часткай ледзь заўважнай меншыні, якая ненавідзела тую дзяржаву, а дзяржава адплачвала ёй той самай, калі не горшай меркай. Той чалавек быў нечым значна большым за бацьку ці караля і больш канкрэтным за Бога. Ён быў незаменны, як на троне, гэтак і ў галовах сваіх падданых. Тое, што ён за некалькі гадоў перад тым быў абраны пажыццёвым прэзідэнтам, было не так знакам ягонага абсалютызму і ідэалогіі, як выяўленнем найшчырэйшага жадання і волі бальшыні грамадзянаў. Абмежаваць такому чалавеку прэзідэнцкі мандат было гэтак сама неўяўляльна, як аддаць сваіх састарэлых бацькоў у старцоўскі дом. Вядома, такое бывае, але не ў прыстойных дамах і не ў Югаславіі.

Ва ўсіх касцёлах у горадзе просты люд шчыра маліўся за ягонае выздараўленне, даручаючы Ўсявышняму паклапаціцца аб адным атэісту, а ўжо Бог сам будзе ведаць, чаму варта прыслухацца да гэтага даручэння. Стваряючы чалавека, Бог стварыў сабе і канкурэнта. Калі Ён не пачуе малітваў за выздараўленне Ціта, дык пабачыць сам, у якога монстра неўзабаве ператворыцца ягоны найдасканалейшы твор.

Вось жа, Дыяніна цяжарнасць прыпала на час, калі ніводнае рашэнне, якое чалавек мог прыняць наконт сябе і свайго жыцця, не выглядала важнейшым за тое, што адбывалася ў люблянскім клінічным цэнтры. Верагодна, ужо й тады нехта ведаў, што ўсё гэта ілюзія і што ўсе не памруць разам з васьмідзесяцівасьмігадовым хворым, але Дыяна ў паведамленнях пра паміранне знайшла зручную прычыну, каб нічога не вырашаць у сувязі з жыццём, якое ў ёй нараджалася. Яна яго і не прыняла і не адкінула, а проста чакала:

тэлевізійныя навіны, ранішнія газеты, месяцы цяжарнасці і месяцы хваробы, а тады прыйдзе момант, калі ўжо будзе позна нешта вырашаць, а новае жыццё трэба будзе прыняць, як Божы дар.

У першамайскім паведамленні лекарскага кансіліюму праўду перасталі хаваць. Капітаны прызналі, што карабель тоне, і выставілі гэтае прызнанне на агульны агляд у выглядзе кароткага і дакладнага сказу, у якім не згадвалася смерць, але ў адрозненне ад папярэдніх стылістычна аднолькава складзеных сказаў, ён быў пазбаўлены ўсялякай надзеі. Замест коскі, гэтага наймілейшага сэрцу знака прыпынку, які робіць адносным сэнс любога няшчасця, там стаяла кропка, у якой нельга было сумнявацца ўжо дзеля самой структуры смерцяпісу прэзідэнтавых лекараў. Цяпер пытанне было толькі ў тым – калі, у які дзень і а каторай гадзіне механічныя сімулятары жыцця ў люблянскім шпіталі будуць выключаныя і якім чынам будзе абвешчана навіна, што памёр той, пра чыю бясспрэчную несмяротнасць складзена як найменей сто тысячаў вершаў, ва ўсялякім выпадку больш, чым на любую іншую тэму на гэтай мове.

У той чацвер Дыяна цэлы дзень сядзела перад уключаным тэлевізарам. За спінаю ў яе быў яшчэ ўключаны і стары радыёапарат пад назваю «Авала». На стале ляжала разгорнутая свежая газета, а яна плакала і не магла перастаць, нават калі Рэгіна ўваходзіла і выходзіла з пакоя, суцяшала яе, сварылася, абражала, абдымала і ўрэшце пакідала ў спакоі. Яна казала ёй, што нарадзіць дзіця – гэта цудоўна і што ў яе апошняя магчымасць гэта зрабіць, бо ўжо тахкае біялагічны гадзіннік. Пасля казала, што хай будзе і спарон, ніякага сораму ў гэтым няма, а жыццё без дзяцей мае і свае перавагі. Прапаноўвала, што яна выгадуе ёй дзяцей, бо напэўна яшчэ пажыве, у яе родзе жылі доўга. Пасля прапаноўвала пайсці ў шпіталь, даць у руку лекарам, каб зрабілі аборт пад поўнай анестэзіяй...

Яна давала Дыяне ўсё, што ў іншых абставінах не была гатовая даць і што б не прыйшло ёй у галаву нават як магчымасць, толькі каб тая перастала плакаць і супакоілася. Яна рабіла гэта, бо спалохалася, што дачку апаноўвае перадродавая істэрыя, якая будзе расці і развівацца, пакуль зусім не замгліць Дыянін розум і не прытупіць усе пачуцці. А тады больш не будзе дарогі назад. Яна прадчувала,

якім цяжкім можа быць вяртанне з душэўнай сумятні, напоўненай падманнымі вобразамі і галасамі, калі ў сэрцы і ў галаве больш няма месца, у якім ты такі, які ёсць, бо ўсё, што ты бачыш і адчуваеш – гэта памылка ўспрымання і чужыя думкі. А найстрашнейшае тое, што гэты ўяўны свет непараўнальна больш пераканаўчы за любую рэальнасць. Рэальнасць невыразная і неадназначная, а вар'яцтва яскравае і праўдзівае. Большай праўды за вар'яцтва няма.

Аднак дарэмнымі былі ўсе матчыны спробы. Не дапамаглі ні поўхі, ні пагрозы, што яна кінецца пад аўтобус, калі Дыяна не перастане. Яна плакала па Ціту і адкідала ўсялякую думку, якая не датычыла яго. Нічога, што Рэгіна ў той першамайскі дзень магла сказаць або зрабіць, не магло параўнацца з ім.

Пасля, не без дакораў сумлення, Дыяна будзе прыгадваць матчыны словы і прапановы як рэдкія і, пэўна, апошнія праявы Рэгінінага мацярынскага гераізму. Яна будзе пытацца, куды той гераізм прапаў і адкуль узяўся, але адказу не знойдзе, хоць ён быў ясны і напрошваўся сам у гісторыях з мінулых часоў, якія Дыяне не былі незнаёмыя. Яна таксама будзе пытацца ў сябе пра сапраўдныя прычыны сваёй першамайскай роспачы і прыйдзе да высновы, што з прычыны цяжарнасці яна была больш адчувальная за іншых, і таму горка выплакалася за ўвесь горад і за палову краіны. Ва ўсялякім разе яна будзе адганяць ад сябе думкі, якія будуць з'яўляцца ў першыя гады Мірнінага і Дарыянавага жыцця, што ў нараджэнні яе дзяцей, ці, дакладней, у непрыняцці супрацьлеглага рашэння, вызначальную ролю адыграла паміранне Ёсіпа Броз Ціта.

Урэшце, недзе каля дзясятай гадзіны сон праглынуў Дыяніны слёзы, і наступнай раніцай яна прачнулася з цяжкім кан'юнктывітам і ў дэпрэсіі. Першае, што яна падумала, было – што яе жыццё, як і тое, што расце ў яе ва ўлонні, не абяцае нічога іншага, апрача пакутаў, і што страх – адзіная сапраўдная прычына, дзеля якой яна даўно не наклала на сябе рукі. Другое, што яна зразумела, было тое, што гэтай раніцай яна ніякага страху не адчувае. Калі чалавеку сапраўды кепска, ён перастае баяцца, а Дыяне, паводле яе ўласнай ацэнкі, у той дзень другога траўня 1980 года было сапраўды кепска, і яна зрабіла выснову, што гэтым варта было скарыстацца.

Яна пайшла ў лазенку, напоўніла ванну цёплай вадою і ўзяла з люстэрка Відавы лёзы для галення. Села ў ванну і вырашыла пачакаць, пакуль яе цела не прызвычаіцца да тэмпературы вады. У нейкім фільме яна бачыла, што гэта робіцца менавіта так. Неўзабаве ёй забалелі калені; яна гадамі марыла пра тое, што аднойчы купіць вялікую ванну, у якой зможа выцягнуць ногі і аддацца прыемнасці.

А тады ёй раптам захацелася па малой патрэбе. Апошнія некалькі тыдняў яна сікала кожных паўгадзіны – яна не ведала, ці гэта неяк звязана з цяжарнасцю, або ў яе запаленне мачавога пухіра. Яна разважала над тым, што зараз трэба ўстаць і дабрацца да ўнітаза, але адна толькі думка, што дзеля гэтага давядзецца вылазіць з вады і голымі пяткамі ступаць па халоднай кафлянай падлозе, выклікала ў яе дрыготку. Яна зразумела, што цяпер ёй абсалютна ўсё роўна і можна спакойна аблегчыцца проста ў ванну, бо пасля яна і так перарэжа сабе жылы. Яна дала змяшацца вадзе з вадою і адразу адчула насалоду ад аблягчэння ўнізе і лёгкіх дрыжыкаў пасля доўгага цярпення. Яна выцягнула ногі і паклала іх на край ванны, боль у каленях ператварыўся ў новую прыемнасць.

Калі прайшло ўжо столькі часу, што ў яе пачала зморшчвацца скура на кончыках пальцаў, яна ўспомніла пра лёзы. Узяла пакецік, пачала яго раскрываць, і раптам ёй зрабілася шкада ўсё гэта спыніць. Нашто дзеля жыцця, якое не мае сэнсу, спыняць моманты прыемнасці? Цяпер у яе ўсё добра, а пакуты, калі яны аб'явяцца зноў, яна лёгка спыніць. Яна ведала, што яны аб'явяцца, але ад гэтага не адчувала сябе няшчаснай. Як ёй быць няшчаснай, калі ўсё, што яна цяпер бачыць і чуе, такое прыгожае. Апрача ног, якія ў яе перад вачыма. І яны былі б прыгожыя, калі б не зараслі валасамі. Валасы раслі ад мінулай восені і цяпер нагадваюць тыя брыдкія і тлустыя чорныя пасмы, якімі лысыя мужчыны прыкрываюць голую галаву. Калі яна апусціць ногі ў ванну, яна іх не будзе бачыць, але тады вернецца боль у каленях. Яна выгнулася і ўзяла з люстэрка Відаў прыбор для галення. Разгарнула лязо і ўставіла яго ў апарат. Прыпынілася, трошкі пасумнявалася, а тады ўзяла і Відаву пену для галення. Пры такой нагодзе яна здалася ёй нечым больш элегантным, чым звычайнае мыла. Яна папырскала левую нагу ніжэй ад ка-

лена. Густая пена была падобная да снегу і пахла хвояй. Мужчыны голяцца кожны дзень і ніколі пра гэта не думаюць. Шкада, бо гэта так прыгожа. Снег, які пахне хвояй, у балончыку з пенай для галення. Яна размазала пену ўздоўж нагі і правяла лязом ад ступні да калена. З-пад пены з'явілася белая і чыстая скура, без адзінай чорнай кропачкі і без кроплі крыві. Яна шчыра дзівілася сваёй левай назе, быццам яна належала некаму іншаму ці была зусім не нага, а, як і снег з пахам хвоі, была творам добрага чараўніка. Яна асцярожна вадзіла лязом і глядзела, як яе нага робіцца ўсё маладзейшай. Пасля перайшла на правую, якая зрабілася ніяк не менш прыгожая, але Дыяна ўсё ж адчула расчараванне. Чалавек хутка прызвычайваецца, і няма той прыгажосці, якая, паўтарыўшыся, трошкі цябе не расчаруе.

Скончыўшы з правай нагой, яна паглядзела на рукі. І на іх павырасталі чорныя валаскі, праўда, не такія, як на нагах, але і гэтыя заслугоўвалі працы і задавальнення. Яна пагаліла левую руку да локця, а на правай трошкі парэзалася. Але нічога страшнага. Прыемнасць была мацнейшая за кроў.

Пасля яна глыбока ўздыхнула; хіба так мае скончыцца авантура, якая несла з сабой толькі шчасце? Ёй захацелася за любую цану працягнуць падарожжа па новаадкрытай беласці. Верхам вялікага пальца на назе яна выцягнула затычку, вада спачатку ціха, а пасля з булькаценнем выцякала з ванны. Калі яна выцекла да паловы, Дыяна зноў працягнула руку да люстэрка і ўзяла манікюрныя нажніцы. Яна сядзела ў пустой ванне і ўпершыню ў жыцці падразала валасы, якія, як гаворыцца, прыкрываюць сорам. Сэрца ў яе білася ад узбуджэння, яна адчувала сябе так, нібы ёй яшчэ нават не споўнілася пятнаццаць. Шкада, што не можаш прыпомніць шмат рэчаў, якія ты магла б зрабіць упершыню ў жыцці і якія не былі б самагубствам. Яна страсянула балончык з пенай, яшчэ раз глыбока ўздыхнула, заплюшчыла вочы і націснула на галоўку. Пена была лёгкая і пяшчотная і ледзь адчувальная на руках і нагах, але яе дотык да іншага месца ўразіў Дыяну. Валасы відавочна баранілі гэтае месца ад залішняй адчувальнасці. Доўга, з вялікай увагай, прыемнасцю і асцярожнасцю яна вадзіла лязом па Венерыным узгорку і навакольных далінах,

пагорках і вулканах, стараючыся расцягнуць працэс як найдаўжэй, а калі прыйдзе канец, добра ведаць, што яна пра той канец дастаткова доўга думала, каб пра яго не шкадаваць.

З дзявочым хваляваннем яна апусціла пальцы, а пасля і далонь на голы пагорак. Гэта быў найпрыемнейшы дотык да цела, які яна калі-небудзь адчувала ў жыцці, бо цела было нібыта і ейнае і чужое. Тады яна без вялікага суму ўспомніла пра Віда і пра тое, што гэтую змену яму трэба будзе неяк вытлумачыць, калі ён вернецца з падарожжа па Босніі, куды ён выехаў за дзесяць дзён да таго, у тым часе, калі паведамленні лекарскага кансіліюму былі поўныя аптымізму, а яна ўсё яшчэ не ведала, што цяжарная. Думка пра гэта азначала вяртанне ў жыццё па-за ваннай, якое тым часам перастала быць хваравіта-дэпрэсіўным і зрабілася здарова-змрочным.

Від меўся вярнуцца ў нядзелю позна ўвечары з гатовымі фатаграфіямі Бані Ўручыцы пад Тэслічам, якія разам са здымкамі і тэкстамі пра дзесяць іншых рэўматычных курортаў ва ўсёй Босніі стануць часткай «Адрыятычнага правадніка», выдання на дзясятку еўрапейскіх моваў, якое будзе запрашаць багатых падстарэлых рэўматычных і сухотных турыстаў на адмысловыя туры з дзвюх частак: спачатку два тыдні аздараўлення ў адной з баснійскіх водалячэбніц, а пасля тыдзень марскіх прыгодаў. Баня Ўручыца была шостым ці сёмым месцам, у якім за апошні год Від Кралеў праводзіў па тры тыдні ў якасці асістэнта-аператара пры Пэтру Парджыку, легендарным бялградскім мастаку і асабістым фатографу ўсіх югаслаўскіх уладароў ад Пэтра Першага Караджорджавіча-аб'яднальніка* да маршала Ціта. Парджык узяўся за гэтую працу на просьбу і даручэнне найвышэйшых баснійска-герцагавінскіх партыйных начальнікаў, упэўненых, што толькі ён можа тыя лячэбніцы і шпіталі зняць так, каб яны выглядалі прывабна для швабаў. А можа ён надасць ім нешта ад царскай і каралеўскай харызмы, так што самі будынкі зробяцца маршаламі і фельдмаршаламі. Кралева прымацавалі да яго як самага перспектыўнага маладога югаслаўскага фатографа, пераможцу ўсеюгаслаўскіх конкурсаў мастацкай фатаграфіі, на якія ён дасылаў павялічаныя ў некалькі дзясяткаў разоў здымкі марскіх рачкоў, чые ножкі і клюшні выглядалі

як пагрозлівыя навукова-фантастычныя абстракцыі ці як вежы і гіганцкія скамянелыя выкапні, але ўсяму гэтаму асаблівае значэнне – што, магчыма, і прадвызначыла Кралеваву славу – дадавала тое, што ён свае фатаграфіі называў імёнамі і важнымі тапонімамі з народна-вызваленчай барацьбы і сацыялістычнай рэвалюцыі, напрыклад, «Бітва за параненых» або «Стрэлы з Любінай магілы». Але Парджыку асістэнт не быў патрэбны, дый Від Кралеў ніякім асістэнтам ні пры кім быць не мог. Стары цэлымі днямі наракаў на свае хваробы і перабіраў на далоні рознакаляровыя пілюлькі, перакладваў іх і размяшчаў па парадку, складаў з іх каларыстычныя ўзоры і развіваў тэорыю пра тое, чаму нядобра, што лек на сэрца сіні, а на мачавы капшук і прастату – зялёны.

Нехта мусіў і пра гэта паклапаціцца, казаў ён, *цяжка паверыць, што некаму будзе лягчэй сцаць ад зялёнага. Гэта як збіваць тэмпературу чырвонымі пілюлямі. Дальбог, быццам яны збіраюцца лячыць адных дальтонікаў! І быццам візуальныя мастакі асуджаныя памерці, як толькі захварэюць! Вы пра гэта не задумваліся? Ну вядома, мяне гэта зусім не здзіўляе. Вы яшчэ малады. Прыйдзе і ваш час задумацца.*

Так мудрасловіў стары майстар, пакуль Від цягаў за ім камеры і штатывы. Нагружаны, як асёл, ён раздумваў пра тое, што падчас Парджыкавага пасляабеднага адпачынку ён проста пойдзе на аўтобусную станцыю, купіць білет і пакіне старога аднаго займацца адзінай справай, якая яго цікавіла і для якой яму не былі патрэбныя ні камеры, ні штатывы. Ён бы так і зрабіў яшчэ падчас самай першай экскурсіі, калі ім трэба было здымаць лячэбніцу ў Кладні, але баяўся, што за такія ўцёкі яго, у найлепшым выпадку, надоўга пазбавяць магчымасці ўдзелу ў выставах, калі наагул не арыштуюць за сабатаж.

Кожны другі дзень з баснійскага ЦК тэлефанаваў таварыш Фэйзіч і распытваў, як ідзе праца. Размовы з ім Парджык даручыў весці Віду. А той звычайна хлусіў, што таварыш Пэтар у гэты момант якраз абыходзіць мясцовасць, чакае, пакуль ранішняе або папаўдзённае святло азорыць аб'ект, ці выдумляў нейкае неверагоднае глупства, скажам, што стары праводзіць тэхнічны агляд

аб'ектыва або ўзгадняе план з контрапланам, што прыводзіла Фэйзіча ў асаблівае захапленне. *Так і працягвайце, працоўныя і грамадзяне Босніі і Герцагавіны будуць вам удзячныя*, казаў ён.

Віду напачатку здавалася, што Фэйзіч з іх здзекуецца, а пасля ён з жахам зразумеў, што той абсалютна сур'ёзны і што ўдзячнасць працоўных і грамадзянаў – гэта насамрэч нейкі від пагрозы з намёкам на тое, што здарыцца, калі праца не будзе выкананая найлепшым чынам. Прычым пагрозы, якая датычыць толькі яго, а не Пэтра Парджыка, паважанага мастацкага дзеяча і героя сацыялістычнай працы, які ўжо дзеля сваіх гадоў і папярэдніх заслугаў быў паза ўсякім сумневам, тым часам як ён, маладзенькі саракагадовы асістэнт, яшчэ толькі мусіць даказаць, чаго ён варты, і за той доказ можа дорага заплаціць.

Чаму вы не адмовіцеся? спытаўся ён у Парджыка, калі той ужо шосты дзень хадзіў, сагнуўшыся да зямлі, бо ў яго паміж двума пазванкамі зацiснуўся нейкі нерв. *Ад чаго мне адмаўляцца, чалавеча? Ад такой працы не адмаўляюцца! Пара вам гэта зразумець, пакуль не позна. Калі вы ўпершыню здымаеце нейкую важную шышку, вам здаецца, што вы ўхапілі зорку з неба. Ведаеце, які для мяне быў гонар, калі мяне ў 1913 годзе паклікалі ў Белы палац фатаграфаваць Яго вялічаства Пэтра? А я і паняцця не меў, што гэта значыць. Пазбыўся бяды на ўсё жыццё, але ж і дралі мне задніцу як хацелі! І адно і другое адначасова. Я заўсёды мог прыгожа апранацца, сам плаціў рахункі ў найлепшых рэстаранах, кожны год ездзіў у Парыж і ніколі не было ветру ў кішэнях, але пасля таго, як зняў першага, больш ніколі не мог ім адмовіць. Што б са мной было, калі б я сказаў не, калі мяне паклікалі зрабіць першыя здымкі Аляксандра Караджорджавіча* ўжо як новага караля? Гніў бы я на катарзе, чалавеча! Або калі б пасля не захацеў здымаць генерала Пэру Жыўкавіча*, яго сям'ю і сабачку? Слухайце, я гэтаму ёлупу мусіў і ягонага цуцыка здымаць, а я прашу прабачэння, здымаць цуцыкаў – гэта найвялікшае прыніжэнне, якое можа перажыць фатограф, бо каб вам той цуцык пазіраваў, вы мусіце прыкідацца такім дурнем, што проста пяром не апісаць. Цяжка быць дурнем і быць славутым. Лепш быць проста дурнем. Пасля я здымаў і генерала Нэдзіча*, і Дымітрыя Лёціча*, і немцаў,*

а здымаў бы і дзядзьку Дражу, калі б не хаваўся ад ягоных пасланцоў. Ну дзе мне ісці на Раўну Гору*, каб па дарозе застацца без галавы. Або каб мяне там затрымалі на які гадок! А я ведаў, што Дража не мае шанцаў і не будзе пасля ў мяне пытацца: а што ж ты, Пэра, не хацеў мяне здымаць, хіба ж я, халера, такі ўжо брыдкі? Наіўны быў дзядзька Дража, але ж лепш я пра гэта памаўчу. Вось, а пасля настаў сорак пяты. Ці ж мог я сказаць Ціту, што не буду яго здымаць? Мог, ясна, што мог, але пасля б выбіраў – каб мяне ці павесілі, ці расстралялі. Толькі што ягоныя дупалізы множыліся, як амёбы. Шэсць рэспублік, у кожнай мінімум па дваццаць маленькіх цітаў, а ты, Пэра, цягайся ад Трыглава да Джэўджэліі* і кожнага паздымай. Маць іх за нагу! А ўжо праз год іх мяняюць, дык здымай новых. Толькі не падумай, што я за караля, пляваць мне і на яго, і на манархію, але тады ты хаця б ведаў, колькі ёсць такіх, што могуць прыйсці да Пэтра Парджыка і сказаць: здымі, Пэра, гэтага мудрага чалавека! Апрача караля, гэта быў толькі старшыня ўрада, тады яшчэ прынц Павал*, ну і, можа, яшчэ нехта ў выключных абставінах. А за Ціта іх ужо было не падлічыць. У пяцьдзясят нейкім там годзе мне загадалі сфатаграфаваць футбалістаў, якія ў Фінляндыі перамаглі расейцаў*. Прыйшоў міністр паліцыі Крцун і загадаў, а я кажу яму: слухай, чалавеча, ну як я буду здымаць нейкіх ёлупаў, якія ганяюць мяч з канца ў канец па нейкім лузе, і так лайдачаць усё жыццё. І ведаеш, што мне Крцун кажа? Кажа: а ці ты, таварыш, здымаў бы расейцаў, калі б яны перамаглі? І што мне было рабіць, давялося згадзіцца. Калі б не згадзіўся, скончыў бы на Голым востраве*. Вось так і цяпер. Выцягнулі мяне з ложка, каб я здымаў тое баснійскае дурноцце, а я толькі сказаў: разумею! Ты не мусіў! Калі б ты сказаў, што не ўмееш, што не маеш досведу, што ты дурань і крэтын, пакінулі б цябе ў спакоі і ніколі болей не клікалі б. А цяпер усё. Ты ўвайшоў у сістэму, і дарогі назад няма. Але табе палягчэе, калі ў цябе зелень зашалясціць пад носам. Тады забудзешся і нават не ўспомніш, што ты рабіў, пакуль цябе наступны раз не паклічуць. А тады зноў крыху папакутуеш. То прыемнасць, то пакута. Такая ўжо гэта праца. Такое і жыццё. То прыемнасць, то пакута. Толькі ў мяне на прыемнасць ужо няма часу. Вось так. Я свае грошы і патраціць не паспею. Маць іх за нагу!*

Але пакажа ім яшчэ дзядзька Пэра з магілы! Калі мяне на лафеце павязуць па Алеі Вялікіх, я буду ведаць, што ўсё скончылася. Не будзе больш: здымі таго, здымі гэтага.*

І так Від цэлымі днямі цягаў абсталяванне з аднаго канца санаторыя ў другі, слухаў Парджыкавы гісторыі пра даўнія часы і галашэнні пра пілюлі, пры гэтым стары фатограф так і не зрабіў ні аднаго адзінюткага здымка. Толькі за дзень да вяртання ці ўжо ў той самы дзень Пэтар Парджык спехам, без ніякай асаблівай падрыхтоўкі і незалежна ад таго, як кладуцца ранішнія ці папаўдзённыя цені, шлёпаў два дзясяткі здымкаў, не мяняючы ні апарата, ні аб'ектыва. Пазней таварышы ў камітэтах і турыстычных аб'яднаннях дзівіліся ягонай геніяльнасці, а на газетных старонках у культурнай рубрыцы на тыя здымкі выходзілі рэцэнзіі найбольшых югаслаўскіх аўтарытэтаў у галіне мастацкай фатаграфіі, мастацтвазнаўцаў і ўніверсітэцкіх прафесараў эстэтыкі, хоць тыя здымкі нічым не адрозніваліся ад дылетанцкіх фотак, якія выраблялі пенсіянеры-рэўматыкі, бавячы па курортах час паміж працэдурамі. Стары ўжо даўно перастаў быць фатографам, а ад мастацтва яго ванітавала ўжо тады, калі ён здымаў генерала Пэру Жыўкавіча, і ён усё гэта ведаў сам і не баяўся, што могуць даведацца іншыя. Ён паказваў Віду Кралеву, у што ператвараюцца юнацкія замілаванні і як канчаюць мастакі, якім дзівіліся каралі. Нават можна было сказаць, што ў гэтых шчырых прызнаннях з Паржыкавага боку была нейкая нязвыклая асалода. Яму не было цікава вучыць саракагадовага маладзёна жыццю, ён не рабіў бы гэтага, нават калі б Від быў удвая маладзейшы, не было яму насамрэч справы і да таго, каб маладога калегу не напаткаў такі самы лёс. Сваю споведзь ён прамаўляў толькі як малую помсту ўсім, ад Пэтра Першага Аб'яднальніка да маршала Ціта, улучна з ягонымі захопленымі крытыкамі, якія пазбавілі яго веры ў тое, што фатаграфія – гэта цуд, бо на ёй відна голая праўда вока.

Мы маглі б сёння нешта зрабіць, сказаў ён Віду за снеданнем у санаторыі Ўручыца, нядзельнай раніцай чацвёртага траўня 1980-га*. *Не тое што маглі б, а мусілі б*, нервова адказаў Від. *А чаму б чалавек, скажыце, калі ласка, наагул нешта мусіў, апрача як памерці?* спытаўся Парджык, ухапіў крышку солі і затрымаўся на

хвілінку, уяўляючы сабе, як сібірская завея падае на носік званарага ўкрутую яйка. Ён саліў яго ўжо трэці раз і захапляўся велічнасцю карціны. *Дык і памраце, калі будзеце столькі саліць,* з'едліва адказаў Від ужо зусім знерваваны, бо сёння ад'язджаць, а Парджык зноў нічога не сфатаграфаваў. *А хто кажа, што я гэтае яйка буду есці? А вось і не буду! Пэра Парджык не есць тое, чаму ён дзівуецца. Я, ведаеце, проста дзівуюся вось гэтаму яйку. Не абы якому, а менавіта гэтаму. Гэта значыць, што я мастак. Мастакі ўмеюць адрозніць яйка ад яйка. Вы, калі вы нервуецеся, можаце прагуляцца і паразглядацца на баб. Можа вам зачэпіцца за вока нейкая маладзейшая. А мяне пакіньце ў спакоі. Калі буду гатовы, я вас знайду. Калі буду гатовы. Тую рэшту часу, якая мне засталася ад жыцця, я хачу правесці як душа жадае, і вам раю тое самае. Вам няма куды спяшацца. Паверце. Няма куды.*

Ён гаварыў, апускаючы галаву аж да паверхні стала, каб чым найлепей бачыць, як соль рассыпаецца па яйку і ў якія ўзоры складваюцца крышталі. Ён быў не надта задаволены, бо яго вялікі, указальны і сярэдні пальцы ўсё яшчэ не зусім добра валодалі тэхнікай саляной завеі, і таму ўсё гэта крыху нагадвала завіруху штучнага снегу ў амерыканскіх фільмах саракавых гадоў. Але ён быў упэўнены, што ўрэшце дасць рады і што яшчэ сёння ідэальна пасоліць яйка. У Віда ў душы гнеў мяшаўся са шкадаваннем. Не зважаючы на тое, што ўсе позіркі ў зале для сняданкаў скіраваныя на яго, стары з прыціснутай да стала шчакою і з высока ўзнятай правай рукой, з якой сыпалася соль, нагадваў дзіця, якое загулялася і не падазравала, што, калі не перастане дурэць, атрымае поўху.

Добра, значыць, мы ўсё яшчэ не ведаем, калі будзем здымаць? спытаўся Від. *Як у вока! Пацэлілі вы, малады калега. Усё яшчэ нічога не ведаем*, сказаў Парджык, спрабуючы разгладзіць наносы і сумёты на паверхні яйка. *Добра, я іду пачытаць газеты*, Від устаў з-за стала і рушыў у бок тэлевізійнага пакоя. Пасля перадумаў і вырашыў спачатку схадзіць на рэцэпцыю, патэлефанаваць Дыяне і сказаць, што не мае ўяўлення, калі яны выедуць з Бані Ўручыцы, але малаверагодна, што ён дабярэцца дахаты да раніцы. Апошнімі днямі яе голас па тэлефоне гучаў неяк дзіўна. І гэта яго непакоіла. Ён і так не

быў упэўнены, што яна яго кахае, а гэтыя баснійскія раз'езды, думаў ён, толькі спрыяюць таму, каб яшчэ больш астыла тое, што ніколі з Дыянінага боку не было такое палкае, як з ягонага. Ён цягаўся за ёй ужо амаль дваццаць гадоў, кожную вясну і восень рабіў прапановы, быў ёй сябрам і тым, каму не адказваюць на званкі і каго пазбягаюць у горадзе, мяняў дзеля Дыяны месцы працы і прафесіі, і ўрэшце затрымаўся на фатаграфіі. Ці таму, што яна сапраўды любіла людзей мастацтва, ці таму, што ўжо памалу ўваходзіла ў той узрост, калі ёй ужо было не так важна, чым займаюцца яе мужчыны.

Яна кінулася яму ў абдымкі пад канец лета 1978 года, пасля нешчаслівага сезона, які правяла ў ложку, змардаваная запаленнем лёгкіх і той лёгкай гарачкай, якая ў пэўных выпадках, як кажуць, бывае сімптомам вар'яцтва, а калі не пройдзе і за тры месяцы, дык зробіць вар'яткай і самую здаровую жанчыну. Яна была стомленая, як сабака, калі ён вывеў яе на першую прагулку, без упынку пацела і адчувала боль у кожнай мышцы. Праз паўгадзіны яна папрасіла Віда адвесці яе дадому, схапіла яго за руку і ўся прыціснулася да яго, каб зразумець, што не існуе сур'ёзных прычынаў, з якіх яна адмаўляла яму ўсе гэтыя гады, бо адзінае важнае ў гэтым жыцці – мець некага, хто давядзе цябе да ложка, калі ты хворая і стомленая і не дойдзеш сама.

Яны ажаніліся напярэдадні Новага 1979 года, пасля чаго Від усімі спосабамі спрабаваў намовіць яе завесці дзяцей. Гэта яе апошняя магчымасць, і неўзабаве яна пашкадуе, калі ёй не скарыстаецца. Насамрэч ён не надта прагнуў стаць бацькам, але яму было патрэбнае нешта такое, што назаўсёды ўмацавала б іх шлюб і абудзіла ў Дыяне сапраўднае каханне. Раздумваючы над сваім бацькоўствам, ён заўсёды ўяўляў на сабе яе позірк. Ён бачыў, як Дыяна глядзіць на яго збоку, калі ён вучыць свайго сына хадзіць, яна была побач, калі ён мяняў дачцэ пялюшкі, глядзела з скалы на бацьку з сынам на іх першай рыбалцы, пасля як ён вучыць малога веславаць, заплятае малой касічку і, трымаючы за руку, вядзе яе ў школу... Ніводная Відава карцінка з дзецьмі не была без яе, ён не ўяўляў нічога ў сувязі з яшчэ не народжанымі дзецьмі, што засталося б паміж ім і імі. Навязлівы вобраз хлопчыка і дзяўчынкі быў на працягу 1979 і 1980 гадоў адзіным, што займала ягоныя думкі і чым ён разлічваў заваяваць

Дыяніна каханне. Пры гэтым ён не адчуваў меры, не ўмеў зачараваць жонку ці задобрыць яе дробнымі хітрыкамі, а навальваўся як вол і сыпаў заўсёды тымі самымі словамі і аргументамі, чым насамрэч страчваў яе прыхільнасць, і ўрэшце зноў, праўда, ужо ў вузейшай прасторы, Дыяна пачала пазбягаць яго, як рабіла гэта дваццаць гадоў. Яна ўздыхала з палёгкай, толькі калі ён выязджаў у камандзіроўкі і яго доўга не было.

Разоў дзесяць ён набіраў яе нумар, але не мог дазваніцца. Толькі калі ён пачаў нервова біць па апараце, тоўстая рэгістратарка, якая была побач увесь гэты час і тупа глядзела на яго безвыніковыя спробы, працадзіла скрозь зубы: *Няма сувязі, няўжо незразумела? Усю раніцу няма сувязі*. Ён пайшоў у тэлевізійны пакой, пенсіянеры глядзелі перадачу «Дазвольце звярнуцца», выдатнік страявой службы Карла Папец сказаў, што мае толькі адно жаданне – каб чым раней выздаравеў таварыш Ціта, пенсіянеры на гэта кіўнулі галовамі, а падпаручнік Мусадык Боравіч дадаў, што Карла – добры таварыш, *заўсёды гатовы дапамагчы тым, хто слаба саабражае*, і таму заслужыў найдаражэйшае салдацкае прызнанне. *Бачыш!* сказаў стары ў акулярах з тоўстымі шкельцамі, які сядзеў найбліжэй да тэлевізара і ледзь не датыкаўся носам да экрана, на што дзядзька з ваўнянай шапкай на галаве і з вусамі ветэрана Солуні* заўважыў: *Я дальбог з-за тваёй галавы нічога не бачу!* Від узяў газету са століка за тэлевізарам, сеў у фатэль у куце і разгарнуў спартовую старонку. У Спліце гулялі вялікі матч «Хайдук» – «Црвэна звэзда». Ён некалькі разоў прачытаў заяўленыя склады камандаў, спрабуючы супакоіць нервы, але нічога не выходзіла. Футбол можа ўратаваць чалавека ад нервовага зрыву, але толькі тады, калі справы яшчэ не зайшлі занадта далёка, а гэтым разам яны сапраўды зайшлі. Яму здавалася, што Пэтар Парджык імкліва страчвае розум; гэтая дурасць з яйкам было нешта зусім новае, што не здаралася з ім у ранейшых паездках.

Від баяўся, што так працягнецца і далей, што стары зусім з'едзе з глуздоў да таго, як праект будзе гатовы, а таварыш Фэйзіч напэўна палічыць яго ва ўсім вінаватым ці прымусіць яго самога скончыць Парджыкаву працу, пасля чаго ён паводле дынастычных законаў пяройме тытул прыдворнага фатографа. Ён будзе рэдка бываць дома,

Дыяна знойдзе сабе каханка, калі яшчэ не знайшла, або вар'яцтва старога створыць нейкія іншыя праблемы, пра якія ён цяпер не можа і здагадвацца, але ў кожным разе яны будуць не меншыя, чым тыя, пра якія ён цяпер думае. Ён яшчэ раз прачытаў прозвішчы гульцоў «Хайдука» і «Звэзды», якія надвячоркам выбегуць на поле, пасля склаў газету і пачаў чытаць першую старонку. Стан таварыша Ціта застаецца крытычны, паведамляў люблянскі кансіліюм. Від Кралеў, напэўна, быў адзін з рэдкіх югаславаў, у якога былі праблемы важнейшыя за гэтую.

Парджык не паказваўся, і Від усё больш нерваваўся, таму падчас абеду вырашыў яго пашукаць і запрапанаваць, што сам хуценька зробіць тых пару дзясяткаў фатаграфіяў курорта, калі ўжо маэстра не мае ахвоты ці натхнення, каб рушыць у дарогу яшчэ за белага дня. Від знайшоў старога ў ягоным пакоі, той хроп, мабыць, змораны саленнем яйка. Ён абудзіў яго, гатовы да сваркі, хай нават гэта будзе ягоны апошні эпізод у кар'еры мастацкага фатографа. Тым часам Парджык выскачыў з ложка, *ваша праўда, абсалютна ваша праўда*, паўтараў ён у адказ на Відава дакучлівае бурчанне, *вось, за дзесяць хвілін я буду гатовы*, замітусіўся ён па пакоі, зусім забыўшыся пра свой рэўматызм, падагру і старасць. Няёмкасць ад факту, што ён паставіў маладога калегу ў непрыемную сітуацыю, пасля папаўдзённага сну раптам зрабілася для яго важнейшай за ўсе хваробы. Від пачаў сярдзіта збіраць абсталяванне і нагрузіў на сябе цэлы музей тэхналагічнага антыкварыяту, бо Парджык упарта адмаўляўся замяніць свае трыццаці- і пяцідзесяцігадовыя камеры на новыя, тэхнічна больш дасканалыя і лягчэйшыя, цвердзячы, што яны нічым не лепшыя і нават горшыя і менш надзейныя і існуюць толькі на тое, каб кожны дурань мог займацца фатаграфіяй.

Від шыбаваў за тры крокі наперадзе, а стары бег трушком за ім і спрабаваў неяк яму дагадзіць. *Мне праўда вельмі шкада. Але ведаеце, на што падобны мозг пажылога чалавека. Тое, што вы кожнай раніцы выціскаеце з сваіх кішак, я нашу ў галаве! Правільна робяць у Нэгоцінскім краі*, калі старога заводзяць у лес, кладуць на галаву праснак і трах па ім абухом! Гэта не я цябе забіў, а гэты хлеб. Вось і са мной даўно трэба было гэтак зрабіць. Паверце мне! О, Божа, як*

мне прыкра, што я чалавека давёў да такой сітуацыі. Зараз, зараз, за паўгадзіны я ўсё скончу. Вы толькі скіньце ўсё гэтае жалеззе на гэтай горцы, а астатняе я ўжо сам. Ідзіце ў гатэль, адпачніце, я ведаю, што вы ад мяне стаміліся. У вас яшчэ засталіся грошы? Калі не, у мяне ёсць. Ідзіце, папіце кавы, супакойцеся. Вой, Пэра, бедны Пэра, што ж ты нарабіў, дзе твой сорам...

Від спыніўся і паклаў на зямлю сваю ношу: *Ды перастанеце вы ўжо калі-небудзь! Вы што думаеце? Што гэта маё жыццё? Дык жа не, і мяне не цікавіць тое, што вы кажаце! Мяне ўвогуле не цікавіць, што вам цяпер прыкра, і я ўвогуле папрасіў бы вас памаўчаць. Я лепш, ведаеце, трошкі паслухаў бы, як цвыркаюць птушкі ці равуць мядзведзі, а не вас.* Васьмідзесяціпяцігадовы прыдворны фатограф з сумам паглядзеў на Віда, і вочы ў яго заблішчэлі: *Як скажаце, толькі не злуйцеся на мяне.* Пасля гэтага Пэтар Парджык больш не прамовіў ні слова, аж пакуль каля чацвёртай гадзіны не пстрыкнуў свой апошні здымак. Від увесь гэты час сядзеў на нейкім пні метраў за дзесяць ад старога, курыў цыгарэту за цыгарэтай і марна спрабаваў супакоіцца. Усё ў яго ішло наперакасяк, і ў прынцыпе зусім няважным было тое, што раніцай вырабляў стары і што Віда давяло да такога стану. Ён думаў пра Дыяну і пра яе ўпартую адмову нарадзіць яму дзіця, думаў пра сваю бяду, у якую ён трапіў у той дзень, калі па вушы закахаўся ў васямнаццацігадовую гімназістку і вырашыў, што ніколі не адступіцца ад свайго кахання. Ён не мог яе кахаць усе гэтыя дваццаць гадоў. Больш верагодна, што безразважная ўпартая цвердалобасць не давала яму прыслухацца да свайго сэрца, калі толькі і яно само не было цвёрдым і безразважным і не ператварала ў пачуцці тое, што з пачуццямі не мае нічога агульнага. Месяцамі ён, седзячы на ўнітазе з апушчанай накрыўкай, прабіваў іголкай пакецікі з прэзерватывамі, спадзеючыся, што праз дзірачку ў гумовай плеўцы праб'ецца ягонае каханне. І пры гэтым усё роўна заўсёды адчуваў сябе няшчасным, але прынамсі думаў, што робіць гэта з нейкіх вышэйшых і больш высакародных меркаванняў. А цяпер ён быў проста няшчасны, і нічога болей. І гэтае пачуццё было такое моцнае, што ён мог бы некага забіць, калі ўжо не мае адвагі забіць самога сябе.

Было ўжо без дваццаці пяць, калі Парджык і Кралеў селі ў белы гольф, які баснійскі ЦК даў ім для заканчэння праекту «Здаровы той, хто добра адпачыў». *Прабачце яшчэ раз*, сказаў стары, *усё ў парадку*, адказаў Від, *вы тут не вінаваты, проста ў мяне ўсяго ўсякага назбіралася*. Пакуль яны выязджалі з паркінга, нейкая жанчына выбегла з санаторыя, трымаючыся за галаву. Твар у яе быў істэрычна заплаканы. *Выглядае, што ў нас у тэрапеўтычным нехта памёр*, заўважыў Від. *Добра, што паспелі выехаць*, адказаў стары і адразу падумаў, што зноў ляпнуў нейкую дурасць, бо якое дачыненне яны двое маглі б мець да некага, хто памёр, спрабуючы гаючымі водамі выправіць нешта непапраўнае, уратаваць нейкае сэрца, якое дажывала свой час і аб якім, мабыць, трэба было больш клапаціцца, пакуль яно было маладое і здаровае. Ён уявіў сабе старога дзеда, які ляжаў на дне басейна, утаропіўшыся ў блакітныя пліткі на столі, а між яго цыянозных сіне-бэзавых вуснаў не прабівалася ніводнай бурбалкі – на іх панаваў той ненатуральны спакой, які ў жывых выклікае паніку і дзеля якога яны выдумалі Бога і перакананне, што пад гэтым небам існуе нешта больш каштоўнае, чым уздых між вуснаў. Хутка і я так, падумаў ён і хацеў сказаць гэта ўголас, але перадумаў, бо малады калега сёння ўжо дастаткова ад яго нацярпеўся.

Дарога на Зэніцу была прывідна пустая. Апрача міліцэйскіх аўтамабіляў і рэдкіх вайсковых грузавікоў не было амаль нікога, што было дзіўна, асабліва для канца доўгага вікэнду, які пачаўся яшчэ на Першага траўня і доўжыўся чацвёрты дзень. Было б лагічна, каб людзі вярталіся з адпачынку, каб студэнты ехалі ў Зэніцу і Сараева, бо заўтра пачнуцца праца і навука. Пачынала цямнець, праз вокны дамоў уздоўж дарогі свяціліся тэлевізары, румянец захаду знікаў за гарамі, а Пэтар Парджык патанаў у сне. Від зіркаў на яго краем вока; маэстра калыхаўся і падаў то на адзін, то на другі бок, паводле таго, куды яго кідалі загіны дарогі. Які ён стары, падумаў ён, але дзеля таго, што гэтая думка не мела працягу і ягоная старасць не кранала Віда так, як кранае нешта жывое і дарагое, блізкае да свайго пачатку або канца, Від пераключыўся на нешта іншае, на тэму, якая будзе больш займаць яго думкі ў дарозе. Начному кіроўцу, калі ён у машыне сам або адзіны, хто не спіць, важна знайсці нешта, пра што думаць. Тады

дарога робіцца прыемнай і чалавек патанае ў меланхоліі і лёгкім смутку, пра што пасля будзе ўспамінаць як пра час без ніякіх клопатаў. Людзі, якія не любяць ездзіць або ненавідзяць адзіноту ў машыне, проста няздольныя даць нейкай думцы доўга і свабодна лунаць у свядомасці. Від пачаў ад матчу «Хайдук» – «Црвэна звэзда», які ўжо даўно скончыўся, але невядома з якім лікам. Калі б побач з ім не спаў стары, ён уключыў бы радыё, але цяпер ён не мог гэтага зрабіць, бо Парджык падумаў бы, што ён яму гэтым помсціць і напэўна зноў паглядзеў бы на яго тым позіркам самотнай саламандры, які ўразіў Віда, калі яны ўзнімаліся на горку, нягледзячы на ўвесь ягоны гнеў. У той момант ён ведаў, што Парджык памрэ, праз год, два ці пяць, а ён, прачытаўшы гэтую навіну ў ранішняй газеце, успомніць ягоны позірк і будзе адчуваць сябе вінаватым. Ён захацеў зрабіць нешта добрае, нечым парадаваць старога, вядома, калі надарыцца нагода.

Замест таго, каб уключыць радыё, ён пачаў пракручваць у галаве ўсе матчы «Хайдука» і «Звэзды», якія памятаў на працягу доўгіх трыццаці гадоў, цягам якіх змянілася дзясятак пакаленняў футбалістаў. Прыходзілі і адыходзілі таленты, нараджаліся і прападалі за першай барнай стойкай, найлепшыя гульцы мелі на спіне нумары дзевяць і дзесяць, у «Хайдуку» Юрыца Еркавіч, а ў «Звэздзе» Ёван Ачымавіч, пасля былі развітальныя матчы, букеты ружаў, крышталёвыя і срэбныя кубкі, слёзы і скандаванні, Джаіч, які прабіваецца праз левы край, найлепшы гулец, якога Від у жыцці бачыў, брамнік «Хайдука» Мэшкавіч, які быў хворы на курыную слепату і слаба бараніў браму ў вечаровых матчах, фінал Кубка маршала Ціта, прадстаўнікі прэзідэнта ў ганаровай ложы, слёзы радасці, найстарэйшы гулец цалуе кубак, каментатар дзясяты раз паўтарае словы – найдаражэйшы трафей, запасныя гульцы, якія за апошнія дзесяць хвілін выйшлі з лавы на поле, Міяч, Маткавіч, Драмічанін, Бошка Кайганіч...

Кар'еры гульцоў – як чалавечыя жыцці, з нараджэннем і смерцю, толькі што карацейшыя за жыццё, так што ў трыццаць гадоў змесціцца цэлае стагоддзе, пра якое чалавек можа думаць, едучы вось так праз ноч па пустых дарогах берагамі Босны і Врбасу, міма маленечкіх баснійскіх вёсак, па дваццаць хатак, не болей, і мячэццю

пад гарою. Ніколі яго не пакідала тое самае адчуванне, пра што б ён ні думаў у дарозе: людзі, якія жывуць за тымі вокнамі, будавалі свае хаткі на бяспечнай адлегласці адны ад адных, каб маглі дыхаць адным паветрам і заставацца сябрамі, а не як на моры, дзе дамы растуць адзін на адным, кожны можа кожнаму зазірнуць у спальню і нікуды нельга ўцячы ад чужых вачэй, апрача як у мора. Таму далмацінцы – маракі, і ім не цяжка гадамі быць далёка ад сваіх гарадоў і мястэчак, заплыць у Аўстралію і Новую Зеландыю і ніколі не вярнуцца, тым часам як баснійцы застаюцца на месцы, сотнямі гадоў не мяняюцца і выклікаюць у чужых вачах лёгкую пагарду, а часам і непрыкрытую нянавісць, бо гэта тупыя і абмежаваныя людзі, якія ніколі не бачылі свету і для якіх дваццаць кіламетраў ад хаты – далёкая дарога, для іх ужо далёка, калі знікаюць з віду іхнія стрэхі. Ім усё роўна дзе яны – на суседняй вуліцы або на канцы свету: ім увесь час хочацца вярнуцца дадому. Яны шчаслівыя, бо жывуць адно ад аднаго дастаткова далёка. Нават на стадыёнах яны не крычаць уголас усе разам, а па адным кідаюць рэплікі гульцам суперніка, расказваюць жарты, высмейваюць крываногіх нападнікаў і нізкалобага цэнтральнага паўабаронцу, але затое заўсёды ведаеш, хто што сказаў, і пра кожнае слова, вымаўленае сто гадоў і тысячу матчаў таму, ведаеш, чыё яно было і хто першы яго вымавіў.

Калі б ён жыў тут, ён фатаграфаваў бы не ракаў, а сотні старых пантофляў і зношаных чаравікаў, паскладаных на бетонных ганках перад баснійскімі дамамі. Можна было б падумаць, што баснійцаў гэтулькі ж, колькі й кітайцаў, а насамрэч усё тлумачылася тым, што старыя чаравікі ніколі не выкідаюцца на сметнік, а пакідаюцца перад уваходнымі дзвярмі, каб лёгка знайшліся, калі трэба выйсці ў двор або ў краму насупраць.

Відавы думкі блукалі паміж футбалістамі і баснійцамі з блакітнымі агеньчыкамі іх вокнаў, калі раптам ён заўважыў міліцыянта з паднятым угару асветленым знакам «Стоп». Ён прытармазіў і звярнуў на жвіровую ўзбочыну. Парджык расплюшчыў вочы, не разумеючы дзе ён. Від апусціў бакавую шыбу, смуглявы вусаты міліцыянт нахіліўся да яго, раскрыў рот, каб нешта сказаць, і праглынуў камяк у горле.

Што здарылася? спытаўся Від. *Нічога, толькі прашу вас, будзьце асцярожныя*, прамармытаў міліцыянт, па шчоках у яго цяклі слёзы. *Так, вядома, ноч*, разгублена адказаў яму Від, і яны паехалі далей. *Сёння ўсе звар'яцелі*, ён паглядзеў на Парджыка, а той тужліва ўсміхнуўся. *Ён думаў, што мы ведаем, а вось бачыце, нічога мы не ведаем... Пра што вы гаворыце?.. Я, малады чалавек, не зусім упэўнены, але мне здаецца, што памёр мой апошні кароль і валадар*.

І толькі тады да Віда дайшло, і калені ў яго зрабіліся ватныя. За ўсе гэтыя месяцы ён так і не паспеў падумаць пра тое, што будзе, калі Ціта памрэ, а ён жа мусіў адчуць, як адчуваюць у ноч перад адлігай, што пра гэта думаюць усе.

Але ж гэта немагчыма! выкрыкнуў ён са шчырасцю гаспадыні на рынку.

Думаеце, што немагчыма? Ну так, і я гэтак думаў, калі забілі караля Аляксандра. Я здымаў, як сустракалі ягонае мёртвае цела на спліцкай набярэжнай. І ведаеце, што я зняў? Страх! Нічога іншага. Толькі страх. Людзі плачуць, а насамрэч баяцца, як баіцца і гэты міліцыянер. Ён хацеў, каб мы яму дапамаглі, вось што ён насамрэч хацеў. Трэба было выйсці з машыны, абняць яго і сказаць – не хвалюйся, вусаты, усё будзе добра! Каб ён вам расказаў, што ў яго жонка і трое дзяцей, але Ціта для яго важнейшы. А ведаеце, што тут самае дзіўнае? Ён і напраўду так думае. Ён зараз аддаў бы і сваіх дзяцей на пагібель, каб толькі Ціта быў жывы. Толькі пасля ён зразумеў бы, што ўчыніў гэта не ад любові, а ад страху, і тады б звар'яцеў. Бачыце, вось як яно. І не кажыце цяпер – ладна, стары Пэра сам не ведае, што кажа, – бо я гэта ведаю напэўна. Не раз праверана. Людзі – дзіўныя стварэнні і могуць лёгка здзічэць. Так, малады калега, памёр Ціта, мой апошні кароль! Мне не страшна, мне проста сумна. І сумна таму, што ён у мяне апошні. Выпадкова памёр ён, а не я. А вы ўжо глядзіце самі, як вам быць. Вы малады, у вас яшчэ будзе не адна такая ноч.*

Віду хацелася верыць, што Парджыкавы словы – гэта проста працяг яго ранішніх дурасцяў, але не выходзіла. Ён уключыў радыё. Грала нейкая цяжкая музыка, напоўненая змрочнымі струннымі і далёкім рэхам вялікіх тэатральных бубнаў. Ён мяняў станцыі, але на ўсіх цягуча гучаў той самы рэквіем. І толькі на адной праз трэскат,

прылівы і адлівы электрамагнітных хваляў, якія перакочваліся праз баснійскія горы, чуўся далёкі жаночы голас, які нешта сакатаў па-італьянску. *Вось бачыце*, сказаў Пэтар Парджык, і гэта былі апошнія словы, прамоўленыя ў белым службовым гольфе Камісіі па справах інфармацыі баснійска-герцагавінскага Цэнтральнага камітэта.

Або аўтамабіль наехаў на разліты на дарозе бензін, або рэзка вывернуў, каб аб'ехаць нейкую калдобіну, гэта ўжо ніколі не будзе дакладна высветлена, бо міліцэйскі агляд месца аварыі быў праведзены крайне павярхоўна, што было апраўдана аб'ектыўнымі абставінамі і замяшаннем з прычыны смерці маршала Ціта. Карацей, гольф саслізнуў на сустрэчную паласу, па якой якраз ехаў аўтобус маршруту Зэніца – Тэсліч. Кіроўца Стыпа Валян не паспеў затармазіць і ўрэзаўся ў гольф з боку пасажыра; аўтобус правалок легкавушку яшчэ метраў дваццаць, пакуль не спыніўся. Стыпа Валян галавой разбіў пярэднюю аўтобусную шыбу, хвіліну ці дзве быў непрытомны, а пасля выйшаў з аўтобуса з крывавай галавою, зусім адзін, бо не вёз ніводнага пасажыра. Ён быў спытаўся ў начальніка станцыі, ці не адмяніць рэйс, а той яму адказаў, што ў гэты момант для іхняга працоўнага калектыву найважней, каб аўтобусы курсіравалі нармальна і паводле раскладу, бо святым абавязкам кожнага працоўнага чалавека і грамадзяніна мусіла б быць захаванне ўспамінаў пра найвялікшага сына Айчыны. А як захоўваюцца ўспаміны? А так, што жывыя працягваюць справы вялікіх людзей.

Вось жа гэтая краіна была створаная з успамінаў, і менавіта таму Стыпа Валян ехаў сваім пустым аўтобусам у Тэсліч.

І так, як быў, увесь скрываўлены, ён дакульгаў да кіроўцы гольфа, які сядзеў зашчэмлены пакарабачанай бляхай, вострыя краі якой прарэзалі яму жывот і левае надкаленне. Але ён зусім не выглядаў параненым, здавалася, што нейкім цудам у тых месцах у яго прарасла бляха, як на скалах над каньёнам Нярэтвы растуць самотныя сосны, проста з голага каменю, без ніякай глебы. Кіроўца ўсміхнуўся скрываўленай галаве, нібыта нейкаму знаёмцу, якога даўно не бачыў, пасля раскрыў рот, каб спытацца, ці праўда, што памёр Прэзідэнт, але вусны не зварухнуліся, у горле не было голасу, ніжняя сківіца была нібы прыкаваная да верхняй. Усяму гэтаму Від

шчыра здзівіўся, і гэта было апошняе, што здарылася перад тым, як адышоў ягоны дух.

Праз паўгадзіны прыехала міліцыя і хуткая дапамога. Стыпа Валян правядзе тры дні ў зэніцкім шпіталі, пасля яго выклічуць у Службу дзяржаўнай бяспекі для дачы паказанняў, бо ўсе дарожныя здарэнні з удзелам партыйных і дзяржаўных аўтамабіляў мусілі разглядацца ў гэтай службе. Правёўшы ўвесь травень у адпачынку з прычыны хваробы, першага чэрвеня ён выйшаў на свой стары маршрут. Бывала, што пры змене надвор'я яму магла забалець галава, але гэта, разам з лагоднай усмешкай Віда Кралева, было адзіным наступствам перажытай аварыі.

Гэтая ўсмешка наведвала ягоныя сны і гадамі яго супакойвала, і няшчасны шафёр ніяк не мог зразумець, што за духі прыходзяць да яго і што ж ён за бяздушны чалавек, што з таго страшнага здарэння памятае толькі добрую і пяшчотную мужчынскую ўсмешку.

Тое, што засталося ад славутага югаслаўскага фатографа, магчыма і найбольшага побач з Скрыгінам, Дабцам і Афрычам, і ягонага перспектыўнага асістэнта, які, як пісалася ў некралогах, сваімі нешматлікімі, але выключнымі працамі паклаў пачатак аднаму з самых выразных адгалінаванняў югаслаўскага мадэрнізму і эксперыментальнай фатаграфіі, усю ноч спрабавалі з дапамогай зварачнага апарата выцягнуць са знявечанай машыны трое работнікаў зэніцкага металургічнага камбіната. Міліцыя падняла іх з ложка і прывезла апухлых з пахмелля выканаць працу, дзеля якой, калі б не яны, давялося б чакаць спецыяльную каманду з Сараева, якая не даехала б і да раніцы. Узнік бы міжрэспубліканскі скандал, калі б людзі з бялградскай мастацкай акадэміі прыбылі на месца здарэння раней, чым з разбітай машыны выцягнуць цела іх колішняга прафесара і шматгадовага дэкана Пэтра Парджыка, таму трое металургаў пад наглядам таго самага вусатага міліцыянта мусілі рабіць тое, чаго яшчэ ніколі ў жыцці не рабілі. Яны стагналі і наракалі без словаў, у начной цемры свяціліся і сыпалі іскрамі тры ацэтыленавыя пальнікі, чыё блакітнае ззянне было таго самага роду, што і свечань тэлевізараў, якія ўпершыню ў гісторыі баснійскіх дарогаў не выключаліся да самай раніцы.

А першай гадзіне ўначы ў кухні Рэгіны Дэлавале зазваніў тэлефон. Яна чула званок праз сцены і чакала праз сон, пакуль ён не перастане. Тэлефон змаўкаў на некалькі секундаў, а тады зноў пачынаў званіць. Дзяжурны інспектар маглайскага аддзялення міліцыі разоў пятнаццаць набіраў нумар, які яму паслалі з Сараева, і кожны раз чакаў дванаццаць гудкоў, пакуль яму ўрэшце не адказаў немалады жаночы голас.

Аддзяленне міліцыі Маглай турбуе. Ці гэта нумар Дыяны Кралевай? Рэгіна знямела ад страху, у яе нават бліснула думка сказаць, што памыліліся нумарам, бо чаго б раптам Дыяну шукала міліцыя? *Так*, усё ж адказала яна. А *вы... ?* спытаўся голас, не пакідаючы магчымасці не адказаць або схлусіць. *Я яе маці*, прызналася яна. *Мушу вам паведаміць, што ваш зяць Від Кралеў трапіў у транспартнае здарэнне на трасе Тэшань – Зэніца і на месцы аварыі памёр ад цялесных пашкоджанняў*. Рэгіна трымала трубку і маўчала. Калі яна не адкажа, дык можа станецца так, што пачутае ёю наагул не адбылося. *Ці вы мяне чуеце, ці чулі, што я сказаў?* спытаўся голас нязменены тонам. *Я вас чую*, адказала Рэгіна. *Тады прыміце мае спачуванні*, скончыў голас, і ў трубцы пачуліся кароткія гудкі.

Рэгіна села на зэдлік і апусціла на стол локці, якія нехта толькі што напоўніў свінцом. Яна не ведала, што цяпер трэба рабіць. Яна жыла на свеце семдзесят пяць гадоў і ні з чым падобным ніколі не сутыкалася. Можа, спачатку трэба было расплакацца і так пайсці да Дыяны, але як яе разбудзіць? Закрычаць яшчэ перад дзвярмі яе спальні або ціха ўвайсці і паклікаць яе, патрэсці за плячо? Яна не ведала, як зрабіць, таму, хоць любая іншая на яе месцы проста ўпала б у роспач і ўзняла б крык ад моцнага жалю і тугі, што нешта такое выпала на яе долю, яна проста сядзела, утаропіўшыся ў тры развешаныя кухонныя анучы, і паўтарала: *Бедны Віда, беднае дзіця*... Нельга было сказаць, што яна надта ўжо адчувала гэтыя словы, але яны здаваліся ёй найбольш дарэчнымі ў сітуацыі, у якой яна апынулася. Насамрэч ёй найбольш хацелася легчы назад у ложак і толькі раніцай падумаць пра тое, што яна пачула, але гэтага яна зрабіць не магла.

Яна села на край Дыянінага ложка, але перш, чым паспела да яе дакрануцца, дачка прачнулася.

Памёр Віда, толькі сказала яна.

Не Віда, мама, а таварыш Ціта, спакойна адказала Дыяна, не варухнуўшыся.

Віда. Загінуў у Босніі. Віда, дачушка, ён. Толькі што пазванілі.

Дыяна раптам выпрасталася, рухаючыся, як механічная лялька; яна глядзела на маці і не разумела, пра што маці кажа: *Хто пазваніў?... Баснійская міліцыя... Адкуль яны ведаюць?* яна тупа глядзела на Рэгіну, думаючы, што тая нешта выдумала; зноў у ёй гаворыць зло, не любіць яна Віда, як не любіла ніводнага Дыянінага хлопца і ніводнага мужчыну, які набліжаўся да іхняга дома.

Была аварыя, і Віда цяпер мёртвы. Вось як, дзіця маё, прамовіла Рэгіна сур'ёзна з непрывычным акцэнтам і інтанацыяй тэлевізійнага дыктара.

Мама! Дыяна ўскінула рукі і моцна абняла старую, доўга яе не пускала і ні пра што не думала, апрача таго, што нібыта нешта забылася або згубіла, але ніяк не можа ўспомніць што. Напрыклад, ключы, пакуль шукала дробязь у торбе.

Віда хавалі шостага траўня, на старых могілках над горадам, сярод ссівелых каменных надмагілляў, спісаных імёнамі даўно памерлых родаў. Ягоная магіла здалёк выглядала адзіным аазісам кветак і зелені сярод шэрай і бязводнай каменнай пустэльні.

Дыяна стаяла паміж Відавымі старэйшымі братамі, іх было шэсць, усе ў аднолькавых чорных гарнітурах і гальштуках; яны выглядалі як заплаканыя неапалітанскія кантрабандысты зброяй, і толькі каўняры, абсыпаныя перхаццю, разбуралі гэтае ўражанне, ператвараючы іх у тое, чым яны былі. Яна адзіная не плакала; сціскаючы ў кулаку букет белых ружаў, яна адчувала паколванне ў міжножжы, як калі Від, два дні не голячыся, сярод ночы спускаўся ніжэй, не зважаючы на Дыяніны хіхікі, выкліканыя нейкай унутранай няёмкасцю, якая абуджалася кожны раз, калі адбывалася нешта, што выходзіла за межы яе ўяўлення пра каханне. Тое, што яна аднойчы зрабіла ў ваннай і што яе ўзбуджала, як толькі яна пра гэта думала, яна ўспрымала як першы акт п'есы, якая мелася скончыцца на могілках. Як бы ён, бедны, здзівіўся, думала яна, калі б убачыў або адчуў пад рукою яе паголены ўзгорак, напэўна ж болей, чым

калі б яна сказала яму, што цяжарная, і хто ведае, што адбывалася б далей і як бы Від у сваёй галаве знайшоў месца для яе мацярынства і таго другога, пра што больш мараць і менш гавораць.

Яе думкі імкнуліся ўцячы з могілак, яна старалася не глядзець на Рэгіну, якая стаяла побач з Відавай маці, цёткай Нусрэтай, хапала яе пад руку, суцяшаючы, пакуль тая плакала, і пачынаючы рыдаць, як толькі тая пераставала. Яна паводзіла сябе з ёй як найлепшая сяброўка, як сястра ў няшчасці, хоць адкрыта ёю пагарджала, як за яе «турэцкае» імя і паводзіны, якія сваёй мяккасцю і сціпласцю пярэчылі Рэгінінай прыродзе, гэтак і за той факт, што тая нарадзіла і выхавала сямёра сыноў, што абражала яе да глыбіні душы і прымушала гадзінамі аналізаваць Нусрэціну фізіялогію і стан органаў, праз якія прайшло столькі дзяцей. А калі Від бываў дома, яна рабіла брыдкія намёкі на адрас свякрові, упэўненая, што ён іх не зразумее. Дыяна не раз у такіх сітуацыях рабіла ў хаце скандал, спрабуючы яе прысароміць або сілаю прымусіць замаўчаць, але ўсё было дарэмна, бо Нусрэта была адной з Рэгініных навязлівых тэмаў, вакол якой яна развіла цэлую тэорыю пра мусульманскіх парадзіх, заснаваную на прачытанай у газетах або пабачанай па тэлевізары інфармацыі, дзе людзі з мусульманскімі імёнамі і прозвішчамі звычайна выступалі ў ролі лютых ваяроў і іх прымітыўных жонак, якія высокай нараджальнасцю кампенсавалі ваенныя страты. Але падчас пахавальнай цырымоніі яна абдымала Нусрэту, як родную, каб самой знайсці месца на тым святе смутку.

Пасля пахавання ўся калона накіравалася ў Гатэль Атрант, дзе Відавы браты былі зарэзервавалі даўгі ўрачысты стол, бо можна наклікаць няшчасце, калі з могілак пайсці адразу дадому. Смерць трэба пакінуць недзе па дарозе, найлепей у карчме, дзе яна, задураная алкаголем, перакінецца на каго іншага і на нейкі час пакіне ў спакоі сям'ю ў жалобе. Дыяне прызначылі месца на чале стала, дзе яна зноў апынулася ў атачэнні Відавых братоў, якія звярталіся да яе выключна «дарагая нявестка» і бачылі ў ёй сваю вечную ўдаву. Якую яны будуць шанаваць і даглядаць, пакуль яна зноў не выйдзе замуж, пасля чаго зробіцца ім найгоршым ворагам – бо плюне на магілу каханага і парушыць слова, цана якому вымяраецца толькі яе жыццём. Яна адчувала гэта і хацела чым раней уцячы дадому, але не вы-

падала, бо адна другую змянялі пасмяротныя здравіцы ейнаму Віду. Паўчаркі моцнай чытлуцкай лазовіцы вылівалі на зялёны гатэльны варсаніт, маўляў, хай і мёртвая душа нап'ецца, а другую палову выпівалі да дна, і мужчыны і кабеты, і старыя і маладыя. Гэта рабіла і Нусрэта, а з ёй, вядома ж, і Рэгіна, якая пасля пятай чаркі была ўжо такая п'яная, што ўстала, узняла рукі, супакойваючы публіку, і прамовіла: *Я скажу вам нешта, пра што і нябожчык Віда не ведаў, а ўчора бы мусіў даведацца, беднае дзіця, хай яму Бог прабачыць. Нявестка цяжарная. Дыяна носіць Відава дзіця!*

Апошнія словы яна выкрыкнула і звалілася на крэсла. Шасцёра братоў утаропіліся ў сваю ўдавіцу, а яна апусціла позірк і чакала, што зараз зямля ў яе праваліцца пад нагамі.

Пэтра Парджыка пахавалі днём пазней у Алеі Вялікіх у Бялградзе, з салютам і вайсковым аркестрам, у прысутнасці югаслаўскай культурнай і грамадскай эліты. Палітыкаў было мала, магчыма, яны бераглі сілы для паслязаўтрашняга пахавання маршала Ціта, але з Сараева прыбыла высокая партыйная дэлегацыя на чале з таварышам Фэйзічам, які над адкрытай труной гаварыў пра апошні і няскончаны твор вялікага фатографа і рупліўца. Ён згарэў і аддаў жыццё за мастацтва і ідэалы рабочага класу, і абавязак наступных пакаленняў – ніколі не забыць Пэтра Парджыка і ўсіх вядомых і невядомых герояў, якія на Суцесцы і Нярэтве, Козары і Раманіі* паклалі свае жыцці ў падмурак нашай сацыялістычнай садружнасці.

Пасля Фэйзіча выступілі Парджыкавы сябры, мастацкія крытыкі і прафесары, а пасля пад гукі Інтэрнацыяналу ягонае цела было апушчана ў магілу.

Гэтая смерць, між тым, амаль не была згаданая ў газетах і ў тэлевізіі, бо цяжка было б знайсці месца на яшчэ адну жалобу побач з тою вялікай, дый выглядала б, бадай, падазрона, калі б Парджыкаваму сыходу былі прысвечаны занадта моцныя словы смутку. Але прэміі за пажыццёвыя дасягненні ў мастацкай фатаграфіі надалі ягонае імя, якое яна будзе насіць і пасля падзення камунізму і распаду Югаславіі. У пэўным сэнсе гэта было і справядліва, бо Парджык аднолькава шанаваў усіх уладароў, усе дзяржавы і палітычныя сістэмы, дык гэтак сама ставіўся б і да тых, да каго яму не пашчасціла дажыць.

Пасля пахавання было вырашана выдзеліць удаве вернага і апошняга асістэнта вялікага маэстра аднаразовую грашовую дапамогу памерам сярэдняй югаслаўскай гадавой зарплаты.

У дзень пахавання Ціта, калі на вуліцы вылі сірэны і праз адчыненыя вокны чуліся тэлевізары з суседніх дамоў і гукі «Ленінскага маршу», Рэгіна і Дыяна сядзелі перад апячатаным і запакаваным у сінюю абгортачную паперу тэлевізарам. Бо маці, не зважаючы на пярэчанні дачкі, паклікала супрацоўніка гарадскіх службаў, каб той у адпаведнасці з мясцовымі звычаямі апячатаў тэлевізар на час жалобы ў доме. Яна зрабіла гэта, каб па горадзе не хадзілі чуткі, што Рэгіна Дэлавале ў хаце скача і спявае замест таго, каб смуткаваць па зяцю. Як бы яна ні была прывязана да тэлевізара і колькі б звычайна ні ігнаравала гарадскія і суседскія абгаворы, Рэгіна ніяк не хацела быць пазбаўленая ўсяго таго, што прыносіць у дом смутак. Апранутая ва ўсё чорнае і з хусткай на галаве, яна выходзіла на вуліцу, прымала ад знаёмых і незнаёмых спачуванні і соты раз пераказвала абставіны транспартнага здарэння, у якім загінуў Від. *Калі пачулі, што памёр Ціта, яны паспяшаліся дадому, да сваіх, кожны б на іх месцы так зрабіў, але ж вось, злая доля, не ведаеш, за якім паваротам цябе чакае магіла*, казала яна і ківала галавою, а таўстазадыя бабы на рыбным рынку цокалі языкамі і прапаноўвалі ёй свежых сепіяў, вось, толькі раніцай з мора, каб занесла дахаты цяжарнай дачцэ, нябозе, якая носіць ва ўлонні дзіця мёртвага чалавека.

З нейкай прычыны тое, што жанчына народзіць дзіця таму, каго ўжо больш няма, людзей неяк асабліва хвалявала, гэта было нешта накшталт цяляці з дзвюма галовамі, негра з галавою слана або нейкага падобнага цыркавога дзіва. Нараджэнне дзіцяці ад мёртвага бацькі для вуліцы было цікавейшае, чым нараджэнне мёртвага дзіцяці. І хоць нешта такое ў горадзе здаралася не ўпершыню, бывала й больш падобных выпадкаў за апошнія пяцьдзясят гадоў, наколькі вуліцы памятаюць і робяць навіну свежай, але відавочна такім самым цудам было б і тое, калі б такое здаралася штогод. Дзіця ў Дыяніным улонні – а да самога дня нараджэння не будзе вядома, што іх нават двое, – было для горада адначасна і байструком, і бязгрэшна зачатым малым Ісусам. Так было, хоць на гэта не існуе рацыянальных прычынаў і ніколі не існавала.

Дыяна не прабачыла маці, што тая прагаварылася пра яе цяжарнасць. Спачатку не хацела з ёй нават размаўляць, а пасля гаварыла, толькі калі мусіла або калі ёй ад залішняга маўчання ўсе гукі рабіліся занадта моцныя. Ёй не хацелася выходзіць з дому, на працы ёй далі тыдзень адпачынку з прычыны смерці ў сям'і, і не было нікога, каму б яна магла расказаць праўду пра Віда і пра тое, што засталося ад яго ў ёй і надалей расло. Яе адчуванні прытупіліся, яна трымалася толькі праз страх, каб зноў не патануць у дэпрэсіі або ў нейкай да сёння не вядомай роспачы. Таму яна сядзела цяпер у сваім фатэлі, слухала гукі вялікага бялградскага развітання, якія даносіў містраль разам з пахамі мора і соснаў, далёкім сабачым брэхам і крыкамі чаек, якія недзе глыбока ўнізе біліся за рыбіны вантробы і згнілыя целы жывёлін, якія невядома адкуль прыносіла мора. Побач з ёй сядзела Рэгіна, раз'юшана плетучы карункі, якімі яна абшые святочны белы абрус, бо дачка паводзіць сябе як тупая карова, усё маўчыць ды цягаецца ад фатэля да прыбіральні і назад. Канчаецца Цітава пахаванне, а яна так нічога й не бачыла.

Так яна пляла аж да позняга надвячорка, калі, не прамовіўшы ні слова, выйшла з дому, пастукала ў акно суседцы Тэрэзе і сказала ёй, што ёй цяжка і што ёй нехта патрэбны. А тады па Тэрэзіным тэлевізары глядзела, як прэзідэнт Замбіі Кенэт Кавунда вялізнай насоўкай, прывязанай да мезенца, выцірае слёзы над белай мармуровай дамавінай. Гэты чорны асілак з хустачкай велічынёю з рэстаранны абрус абудзіў у суседках нечаканую тэлевізійную тугу. Яны глядзелі на экран, быццам там паказвалі серыял пра сямейную трагедыю з амерыканскага поўдня; павярнуліся адна да адной, калі Кавунда дзясяты раз схаваў твар у насоўцы, у яго дрыжалі плечы, нібыта праз іх бяжыць галопам статак антылоп, паглядзелі адна адной у вочы і яшчэ глыбей – у зрэнкі, і ў адзін момант горка заплакалі. *Эх, бедны чалавек, такі доўгі шлях прайшоў, каб сустрэцца з мёртвым сябрам.*

Дыяна яшчэ нейкі час сядзела перад апячатаным тэлевізарам, пакуль урэшце не страціла цярпенне. Узяла нажніцы, сарвала пячаткі, разрэзала сінюю паперу, уключыла стары «Амбасадар» вытворчасці нішскай «Электроннай індустрыі» і заспела момант, калі каканьскі

гарняк, вылезшы з шахты, прызнаваўся ў тым, што Маршал для яго быў святлом, зямлёю, вадою і паветрам, якім ён дыхае, і дзве слязы пакідалі за сабой на закурэлым твары чысты белы след. Яна ўладкавалася ў фатэлі, падагнула пад сябе ногі і адчула сябе шчаслівай, бо вярталася ў супольнасць тужлівых людзей, што ў любым выпадку прыемней за бязладную самоту, якая ўзнікала з усяго, пра што яна толькі магла падумаць. Яна шкадавала Віда, як шкадуюць бадзяжных сабак, міма якіх мы праходзім дажджлівымі днямі, усведамляючы, што ашчаслівілі б іх на ўсё жыццё, калі б толькі ўзялі з сабою. Яна магла б быць ягонай мадонай, і ўсё было б прыгожа і проста для абаіх; яны засталіся б разам да канца, і Від ніколі б ёй не здрадзіў. Бо калі ён чакаў яе дваццаць гадоў, дык астатніх дваццаць або сорак успрымаў бы як узнагароду і вышэйшую волю, наканаваны Богам лёс, які пацвярджае, што трываласць у жарсці мае сэнс. Усе яе будучыя праблемы, думала яна, вырашаў бы ён, бо кожная з іх прасцейшая за тую, з якой усё пачалося і якая палягала ў тым, што яна яго не кахала і ніколі не магла пакахаць. Яна магла б рабіць, што ёй захочацца, здраджваць яму, быць сцервай, жыць сваім асобным жыццём, а яму пакінуць клопат аб усім, што ў іх ёсць супольнага або што можна лічыць цаною такога жыцця. Ён рабіў бы ўсё і ніколі б не запярэчыў. Так ёй здавалася цяпер, калі Віда ўжо не было, і яна ад гэтага адчувала палёгку.

Генеральны сакратар італьянскай кампартыі сказаў, што сусветны рабочы рух страціў аднаго з сваіх найвялікшых правадыроў і празорцаў: *Сёння нічога не можа запоўніць нашы спустошаныя душы!* Словы пра спустошаныя душы асабліва кранулі Дыяну. Яна дастала з рукава камяк папяровай хустачкі і абцерла нос.

Калі ў апошнія месяцы цяжарнасці, пасля таго як ужо даўно было запозна рабіць аборт, яна думала пра момант зачацця, да яе ўвесь час вярталіся ўспаміны з двух пахаванняў, аднаго жывога і другога тэлевізійнага. Ніяк інакш ёй не ўдавалася пачаць гісторыю свайго дзіцяці, з якім яна правядзе рэшту жыцця і больш ніколі не будзе свабодная. Час, калі лекар сказаў ёй, што яна цяжарная, здаваўся ёй нейкім невыразным, а акт паміж ёю і Відам, калі сышліся біялагічныя прычыны таго, што яна прыпісвала пазнейшым падзе-

ям, быў у Дыянінай памяці зусім неверагодным. Яна прыгадвала, як Від павярнуўся да яе спінай, надзяваючы прэзерватыў, ён заўсёды так рабіў, нібыта гэта быў самы непрыстойны момант у сэксе, яна выразна бачыла, як выступалі ў паўзмроку яго пазванкі. Яна бачыла момант перад тым, як ён у яе ўвойдзе, калі яна, як і кожнага разу, хапала яго за чэлес. Ён глыбока ўздыхаў, а яна насамрэч правярала, ці добра ён надзеў прэзерватыў, ці не спрабуе яе падмануць, каб нібыта выпадкова выліць у яе сваё семя. Прэзерватыў заўсёды быў надзеты добра, дык як жа тады здарылася тое, што здарылася? Для Дыяны гэта была таямніца, тое, што назаўсёды застанецца без адказу, і калі Мірна праз дваццаць гадоў спытаецца ў яе, дзе былі зачатыя яны з братам, Дыяна запнецца, прыдумляючы нейкую хлусню, бо ніякай праўды, як здавалася ёй, насамрэч і не было.

У тое лета адбывалася алімпіяда ў Маскве, і яна цэлымі днямі сядзела перад тэлевізарам, паглынала неверагодную колькасць чыпсаў і глядзела абсалютна ўсе жывыя трансляцыі і рэпартажы з найдзіўнейшых спаборніцтваў, уключаючы скачкі з перашкодамі і хакей на траве. Яна беспаспяхова заўзела за хакейную зборную Індыі, у якой усе гульцы мелі прозвішча Сінгх, таму Дыяна думала, што яны належаць нейкай вялікай і шчаслівай сям'і, у якой столькі братоў і сваякоў, што адны адных асабліва й не ведаюць, сустрэнуцца на вуліцы і пройдуць міма як чужыя людзі, і ніхто не абцяжарыць іншага сваімі праблемамі. Гэта адзіны спосаб мець шчаслівую сям'ю, думала яна. Пад адным дахам сотні людзей, а аб'ядноўвае іх толькі тое, што ўсе гуляюць у хакей на траве. У яе пацелі далоні, пакуль сям'я Сінгх спрабавала прабіць гранітную абарону зборнай Пакістана, і яна амаль не заўважала, як у яе кожны дзень усё больш расце жывот, а на твары ў шчылінах першых маршчынаў узнікаюць сальныя коркі, якія неўзабаве цалкам зменяць Дыяніну фізіяномію і ўсяго за некалькі месяцаў ператвораць яе з маладой і прыгожай жанчыны ў паштовую работніцу сярэдніх гадоў, якую наступным летам ужо не будуць пазнаваць заўсёдныя турысты. Тое, што яна будзе прыпісваць цяжарнасці і гарманальнаму парушэнню, насамрэч мела больш дачынення да чыпсаў і алімпіяды, якая адкладала Дыяніны дэпрэсіі і адганяла любую думку пра тое, што з жыццём нарэшце трэба нешта рабіць.

У спаборніцтвах па плаванні яна заўважыла Дар'яна Пэтрыча, шаснаццацігадовага славенца з тварам хлопчыка і целам мужчыны з яе мараў, і вырашыла, што, калі народзіцца сын, яна назаве яго Дарыян. Шмат гадоў пазней яна зразумела, што нават і гэта не зрабіла як след і ўставіла ў імя лішнюю літару, якая кірыліцай была напісаная ўверсе экрана, бо нехта ў савецкай тэлестудыі памылкова пераклаў Пэтрычава імя.

Бачачы, у што ператвараецца яе дачка, Рэгіна махнула рукою і больш не спрабавала адарваць яе ад тэлевізара. Час ад часу яна бурчала пра тое, што́ будзе, калі раённая інспекцыя выявіць, што яна сарвала з тэлевізара афіцыйную пячатку, раскрышыла чырвоную васковую пяціканцовую зорку, абражаючы гэтым і дзяржаву, і нябожчыка мужа. Дыяна ёй не адказвала, далей грызла чыпсы і глядзела чвэрцьфіналы гандбольнага турніру, і старая сыходзіла ў кухню ці да суседак, якім расказвала, што яе дачка ўжо звар'яцела ад таго, што ёй не хапае мужыка, і як яна баіцца, каб з ёй не здарылася нешта страшнае. Але вядома ж, нічога яна не баялася, проста ёй было патрэбнае нешта, каб быць у цэнтры ўвагі, і гэта было большае і важнейшае за старэчыя хваробы і нізкія пенсіі – за ўсё тое, пра што гаварылі яе сяброўкі.

Аднак выглядае, што выдумляючы, яна наклікала бяду. Праз два дні пасля заканчэння алімпіяды Дыяна ў ванне поўнай гарачай вады спрабавала перарэзаць сабе жылы. Зусім голая яна прыбегла ў кухню, моцна сціскаючы левае запясце, з якога лілася цёмна-чырвоная кроў, і Рэгіна ледзь не страціла прытомнасць, як ад выгляду крыві, гэтак і ад таго, што пад надзьмутым даччыным жыватом не ўбачыла густых космаў. Свежавыгалены ўзгорак з бэзавым каньёнам блішчаў, як гарадскія вежы на жнівеньскім сонцы.

Гэта быў апошні Дыянін нервовы выпад, які быў старанна схаваны, бо нават найбліжэйшым суседкам Рэгіна не сказала нічога. Разрэз зашылі ў хуткай дапамозе, дзе Дыяна атрымала і накіраванне да псіхіятра. Яна да яго не пайшла, бо і так не ведала, што пра сябе сказаць, тым больш незнаёмаму.

З пачаткам восені яна зусім супакоілася і ўжо нават не сядзела цэлымі днямі перад тэлевізарам. Яна мірылася з лёсам і чакала на-

раджэння дзіцяці, здолеўшы сябе пераканаць, што тады і жыццё павернецца так, што яна будзе адчуваць сябе як сярод Сінгхаў, якія не абавязаныя лічыцца адно з адным. Яна непакоілася толькі, калі раз на некалькі тыдняў заходзіў нехта з Відавых братоў і пытаўся, можа ёй што трэба, нагадваючы сваім візітам пра тое, каму яна клялася ў пажыццёвай вернасці, але і гэта будзе здарацца ўсё радзей і радзей, па меры таго, як дні жалобы будуць мінаць і яны пачнуць разумець, якое жаночае няшчасце напаткала іхняга Віда. Яны зусім аддаліліся ад дому Дэлавале, калі Дыяна на прапанову аднаго з іх назваць дзіця Від або Віда сказала, што пра гэта не можа быць і гаворкі, бо гэтае імя для яе брыдкае і ў мужчынскай, і ў жаночай форме, а яшчэ больш таму, што яно ўсё жыццё нагадвала б пра нябожчыка і магло б сурочыць ейнае дзіця, і дай Божа, каб яно не паўтарыла бацькавага лёсу.

Пасля гэтага шасцёра Кралевых больш ніколі не пераступалі іхняга парогу, і толькі Нусрэта часам тэлефанавала, пыталася, як яна сябе адчувае, ці не хочацца ёй чаго і ці не паслаць ёй апельсінаў з іхняга саду. Дыяна, аднак, не мела ніякіх асаблівых жаданняў, у ёй не абудзілася, як гэта звычайна бывае, прага да нейкай пэўнай ежы ці хоць бы да нейкай садавіны, па чым кабеты маглі б варажыць, якім дзіця будзе ў жыцці. Калі цяжарная прагне трускалак, то напэўна народзіць дзяўчынку, а калі хлопчыка, дык ён будзе мець па ўсім целе шмат радзімак, у яго будзе белая скура і жаночыя рухі; калі ёй хочацца лімонаў і апельсінаў, яна народзіць сына, які будзе душа кампаніі, заўсёды гатовы да весялосці і жартаў, і ўсё яму ў жыцці будзе давацца лёгка, або дачку, чыя прыгажосць будзе яе суперніцам невыносная; а калі цяжарная прагне чырвонага мяса, яна народзіць хваравітае дзіця, якое нічым не будзе вылучацца сярод іншых, не будзе адоранае ніякімі асаблівымі талентамі ці прыгажосцю, але не будзе цярпець ад ніякіх сурокаў... І гэтак было добра вядома, што́ значыць кожнае жаданне цяжарнай, і як добразычліўцы, гэтак і ўсе іншыя толькі чакалі, што яна скажа, і кідаліся выконваць яе жаданні, якімі б яны ні былі і што б ні значылі, упэўненыя ў тым, што яны – пасланцы лёсу, які ўжо недзе запісаны і не можа змяніцца. Аднак Дыяна была загадкай. І хоць яна ела звыш усялякай меры, ёй было ўсё роўна што есці. Калі Нусрэта пыталася ў яе:

а можа, апельсінчыкаў, дачушка? яна толькі ўсміхалася і соты раз казала, што не.

Яна нарадзіла дваццаць першага снежня. Найперш лёгка і хутка на свет выйшла Мірна, а тады доктар Жыжыч ускрыкнуў: *Яшчэ адно!*

Дыяна крычала не толькі ад болю, але й ад таго, што, няхай і змірыўшыся нарадзіць мёртваму Віду дзіця, ніколі не думала пра блізнятаў. Дарыяну спатрэбілася значна болей часу, ён нібыта акапаўся ў матчыным улонні, кіпцікамі ўчапіўся за матку і ніяк не хацеў выходзіць.

Ён нарадзіўся ў той момант, калі радыё перадавала дваццаць чатыры ганаровыя залпы з дванаццаці гарматаў у сталіцы краіны Бялградзе і дванаццаць залпаў з шасці гарматаў у сталіцах сацыялістычных рэспублік, якімі быў адзначаны Дзень Арміі ў памяць пра дату, калі за трыццаць дзевяць гадоў да таго ў баснійскім мястэчку Руда таварыш Ціта заснаваў Першую пралетарскую брыгаду. Дыктар нагадаў, што гэты дзень мы ўпершыню сустракаем без нашага найвялікшага сына і слаўнага палкаводца, і Дыяна ўрэшце магла ўздыхнуць з палёгкай.

Па шпіталі разляцелася чутка пра нараджэнне блізнятаў, хлопчыка і дзяўчынкі, што таксама мусіла быць нейкім знакам, які трэба было ўмець прачытаць, каб зразумець, якую вестку спрабуе данесці лёс праз гэтых маленькіх сваіх пасланцоў, кандацьераў новай эпохі, перад якою ўсе адчувалі страх і таму хацелі ўсяляк задобрыць.

Ну, цяпер я спакойная, шапнула Рэгіна праз мураваны плот суседцы Эмілії, якая ў гэты момант вырывала з мёрзлае зямлі абвялыя сцяблінкі наготак, каб з іх увесну зноў нешта не вырасла. Усеяны бародаўкамі твар кісла ўсміхнуўся: *Ну, вось нарэшце і ты супакоілася!* Спускаючыся па прыступках, яна чула, як Эмілія мармыча: *Эх, мая ты Гіна, мая ты Гіна*... Яна паўтарала: *мая ты Гіна*, пасля кожнай вырванай сцяблінкі, а павялых наготак было шмат, таму яна паўтарала сваю формулу, нават калі Рэгіна была ўжо далёка і не магла яе чуць.

Яна вымаўляла яе цэлых сорак хвілінаў, а тады лягла паміж наготак, пільнуючы, каб ніводнай не прымяць, і памерла.

XI

У дваццаць пяць гадоў Дыяна першы раз уцякла з дому. Калі гэта наагул можна назваць уцёкамі і калі ў такім узросце, якія б ні былі абставіны, чалавек сам не гаспадар свайго жыцця.

Яна спакавала рэчы, калі Рэгіны не было дома, і пакінула на стале запіску, у якой напісала, што адыходзіць з тым, каго кахае, і што гатова ахвяраваць усім, каб быць з ім, і вось якраз гэта і робіць. Торбы і валізы яна прапхнула праз акенца ў прыбіральні, каб суседзі не ўбачылі, як яна выходзіць, і каб чутка пра гэта не дайшла да маці, перш чым тая вернецца дадому. Дыяна выйшла з хаты, нібыта ідзе ў сад, падабрала рэчы, якія змялі цэлую градку з маладой цыбуляй, і перакінула іх цераз каменны плот на вуліцу, дзе ўжо чакала таксоўка.

На жаль, гэта быў першы і апошні рамантычны эпізод Дыяніных уцёкаў. Усё, што будзе адбывацца наступныя дзевяць месяцаў, будзе больш нагадваць модныя ў тыя гады змрочныя французскія фільмы, а не ўцёкі з дому і гісторыю кахання, якой яна яе сабе ўяўляла.

Седзячы ў пачакальні аўтавакзала і гледзячы праз шкляныя дзверы на купальшчыкаў у басейне, які паводле нейкай бязглуздай архітэктурнай задумы быў збудаваны менавіта тут, Дыяна думала, як лёгка быць адважнай, і дакарала сябе за тое, што не ведала гэтага раней. Моцная туга па нечым збівае чалавека з тропу, асабліва калі тужыш па тым, чаго лёгка дасягнуць, але з умовай, што мусіш ад нечага адмовіцца. Вось, напрыклад, тыя, хто зараз некуды паедзе, з тугою глядзяць на тых, хто купаецца. А купальшчыкі глядзяць на падарожнікаў і тужаць па падарожжах. Дыяна была ўпэўненая, што ўзнялася вышэй за тых падарожнікаў і купальшчыкаў. Яна ехала ў горад, у якім ніколі не была, да чалавека, якога кахала, хоць амаль нічога пра яго не ведала. Але і гэта яе не хвалявала. Каханне – не злачынства, каб залежаць ад нейкіх картатэк, дзе запісаныя звесткі і факты, якія так ці іначай вызначаюць становішча чалавека. Пака-

хаеш – і ўсё, думала яна, і ніхто, а тым болей Рэгіна, не можа ёй сказаць, што яна не мае рацыі.

Яна выехала з перона, умытага сонцам, з гораду, чыё балючае жнівеньскае ззянне – адна з прычынаў таго, што турысты ўспамінаюць яго ўсё сваё жыццё, пабачыўшы яго толькі аднойчы, і толькі адна хмарка прыцямняла радасць ад'езду. На шафцы для абутку яна забыла свае сонечныя акуляры.

Праз восем гадзін аўтобус праз імглу і глыбокі снег уязджаў у Сараева. Некалькі разоў кіроўца выганяў мужчынаў з аўтобуса на холад. У майках з кароткімі рукавамі і паўбосыя яны штурхалі аўтобус праз сумёты, праклінаючы і метэаролагаў, і Боснію, край з першага погляду блізкі да мора, а насамрэч памылкова закінуты аж на Паўночны полюс. Яшчэ з вечара ў навінах па тэлевізары казалі, што Югаславія сустрэне дзень залітая сонцам і што гэта добрая нагода скарыстацца чарамі позняга лета, выправіцца на мора, рэкі, азёры і асвяжыцца пасля яшчэ аднаго напружанага працоўнага дня. Менавіта так казаў Камэнка Каціч, найслаўнейшы знаўца капрызаў надвор'я, пакуль на экране мільгалі карцінкі пустых адрыятычных пляжаў з рэдкімі купальшчыкамі і купальшчыцамі тыповага для канца шасцідзясятых выгляду.

Вось ён, з даўгаватымі валасамі, якія падаюць яму на вочы, з ба́камі ў выглядзе баявых сякераў, падобны на кагось паміж гастарбайтэрам і вулічным рэвалюцыянерам, а яна з вышчыпанымі бровамі, ад якіх засталіся толькі тонкія месячыкі над вачыма, і гумовай шапачкай, што хавае ад мора халодны перманент, выглядала як усходнееўрапейская сястра Брыжыт Бардо. Бачачы, як яны смяюцца на камеру поўныя аптымізму і веры ў лепшую будучыню, Дыяна мусіла верыць Камэнкавым словам.

Калі аўтобус, праехаўшы праз Хаджычы і Тарчын, патануў у свінцова-шэрай падушцы сараеўскай імглы, яна ляскала зубамі ад холаду ў сваёй тонкай кашульцы, бо ўсе джэмперы і адзінае зімовае паліто былі ў багажы. Яе спалохала тое, што яна ўбачыла перад сабою: цені шматпавярховікаў, доўгі рад казармаў, навабранцы на варце, вуліцы, па якіх бацькі вязуць дзяцей на санках, высокія тонкія мінарэты, якія бянтэжаць кожнага, хто бачыць іх упершыню і не ве-

дае, як сябе паводзіць, праходзячы міма іх, – ці трэба рабіць нешта большае, чым ты робіш або не робіш пад касцельнымі званіцамі.

Магчыма, такія думкі яе не мучылі б, калі б прагноз надвор'я так не разышоўся з рэальнасцю і ёй не здалося, што яна апынулася па-за прасторай, пра якую казаў Камэнка Каціч, далёка ад краіны, у якой яна адчувала сябе абароненай. У Сараеве не было Югаславіі, хоць у тэлевізары і ў газетах заўсёды казалі, што гэты горад – гэта «Югаславія ў мініяцюры».

Гэты ідэалагічны падман, можа, і не заўважалі тыя, хто познім летам прыязджае з сонечнага поўдня, Дыяна не разумела, у чым яго сэнс, і думала пра яго так, як было характэрна для духу тых гадоў. Калі Сараева – гэта «Югаславія ў мініяцюры», калі пры патрэбе так называлі і ўсю Боснію, чаму ж тады Югаславія нават у найсмялейшай цэкоўскай метафары ніколі не зрабілася ні «вялікім Сараевам», ні «вялікай Босніяй»? Таму што ідэалагічныя метафары не паважаюць прынцыпаў фармальнай логікі ці таму што гэтак скляпаная метафара не мела б дастаткова прывабнага зместу?

Няважна, у чым тут насамрэч справа. Калі б ідэя пра вялікае ў малым магла перавярнуцца ў ідэю пра малое ў вялікім, наша гісторыя выглядала б інакш, і тыя, хто некалі будзе яе вывучаць, успрымалі б нас больш нармальнымі. Але пра гэта Дыяна за ўсё сваё жыццё не задумалася ні на пяць хвілін.

Калі яна выйшла з аўтобуса, яе сустрэў холад, якога яна ніколі ў жыцці не адчувала, і цяжкі смурод вугальнага дыму, да якога яна так ніколі й не прызвычаіцца і які будзе памятаць усё жыццё, як галоўнае ўражанне ад сваіх сараеўскіх месяцаў. Гэты пах будзе вяртаць Дыяну ў гэты горад і ў часы яе першага сыходу з дому як беспамылковае прадвесце або сімптом дрэннага настрою. Яна спрабавала прабіцца праз натоўп да кандуктара, які выдаваў багаж, каб як найхутчэй надзець паліто, але іншыя былі мацнейшыя і спрытнейшыя, і да яе чарга дайшла сярод апошніх.

Эх, што ж ты, дзеўка, так загалілася, заўважыў вусач у сіняй спецоўцы з надпісам «Цэнтратранс». *А колькі ж у цябе торбаў, божа ж ты мой*, дзівіўся ён, падаючы ёй чацвёртую, а яна пальцам паказвала яму яшчэ і на вялікую валізу.

Дыяна ледзь сабрала ўсё гэта з перона і занесла ў брудную вакзальную карчму, адганяючы ад сябе зграю цыганятаў, якія выпрошвалі грошы. Яна звалілася на рыпучае драўлянае крэсла і адчыніла валізу, з якой вываліліся і рассыпаліся па бруднай падлозе напханыя ў яе рэчы. З цяжкасцю выцягнула паліто і спрабавала ўсё астатняе запхнуць назад у валізу і зноў яе зачыніць. З кутоў карчмы на яе моўчкі глядзелі налітыя крывёю вочы вакзальных п'янюгаў. Яны відавочна не былі прызвычаеныя да такіх падарожніц. Раскудлачаная, у летняй сукенцы і ў цяжкім суконным паліце, яна ўсселася на валізу і скакала на ёй, пакуль не падышла афіцыянтка і не сказала: *Чакай, малая, куды ты ўзлезла!* Сваімі тоўстымі ручышчамі яна сціснула валізу, замкі ляснулі, і зноў усё было на сваім месцы. Афіцыянтка ўсміхнулася і сказала: *усё будзе добра!* Дыяна падумала, божа, да каго ж яна падобная, калі незнаёмая жанчына ёй гэта кажа.

Яна замовіла сок і чакала, пакуль па яе прыйдзе Габрыел. Хоць аўтобус паводле раскладу спазніўся на сорак хвілін, яго яшчэ не было.

Рэгіна, вярнуўшыся дадому, проста страціла галаву. Прачытаўшы Дыяніну запіску, яна пабегла да Бартала Чурліна, які ў тым 1969 годзе адзіны з суседзяў меў тэлефон, бо працаваў у мясцовай радзе. Ён быў халасцяк, лагодны і ціхі, таму да яго хадзілі як у тэлефонную будку. *Уцякла курва, звані ў міліцыю!* закрычала яна яшчэ з двара. Бартал хапаў яе за рукі, спрабаваў супакоіць, каб яна растлумачыла, што здарылася, а Рэгіна вырывалася, нібы ў яе ўсяліўся д'ябал ці быццам гаспадар задумаў супраць яе нешта злое. *Яна яшчэ мне высцыць усё малако, што павысмоктвала ў мяне з цыцак!* крычала яна, на што чалавек проста здаўся, *на табе тэлефон!* і стаў каля дзвярэй, нібы гатовы пры першых знаках небяспекі ўцячы з роднага дому.

Рэгіна затэлефанавала ў міліцыю, расказала, што яе дачка ўцякла з дому ці, можа, яе нехта выкраў, а калі голас на другім канцы спытаўся, колькі гадоў дзіцяці, яна сказала – сямнаццаць! Ёй сказалі, каб пачакала тры дні і тады патэлефанавала зноў, бо калі дачка за гэты час не аб'явіцца, а хутчэй за ўсё аб'явіцца, дык тады толькі можна будзе абвясціць вышук. На гэта маці трошкі паплакала, трошкі памацюкалася, але ўрэшце сказала, што праз тры дні затэлефануе зноў.

Бартал слухаў, лупіў вочы і ўздымаў ад здзіўлення бровы, і калі Рэгіна паклала слухаўку, толькі спытаўся: *А з якіх часоў Дыяне сямнаццаць гадоў?* Яна на яго нават не паглядзела і выбегла з дому, крыкнуўшы: *Што там тая міліцыя ведае, колькі гэтай курве гадоў!*

Увесь дзень яна шукала па хаце Дыяніных слядоў, перакопвала ўсе шафы і шуфляды, раз'юшаная тым, што не ведае, з кім і куды яна ўцякла. Спярша яна думала, што дачка хаваецца недзе ў горадзе, дома ў некага з сваіх каханкаў, якіх у Рэгініным уяўленні налічваліся сотні. Адных яна ведала па імені, другіх памятала толькі па тым, што яны абарочваліся за Дыянай на вуліцы, кідалі нейкую заўвагу, а яна распусна круціла задніцай і адказвала словамі, якія пераконвалі маці ў тым, што яна з усімі імі спала. Рэгіна насіла ў галаве цэлы каталог нягоднікаў, прайдзісветаў і выродкаў, трыперных маракоў, блядуноў, разбойнікаў і маўклівых мусульманаў, што панаехалі з Гацка і Трэбіня, сыноў зруйнаваных шляхецкіх родаў, у якіх сіфіліс перадаецца з пакалення ў пакаленне, брудных работнікаў з жылай таўсцейшай за тэлефонны кабель, які работнікі паўгода ўжо як кладуць у траншэю перад яе домам і ўсё зазіраюць Дыяне пад спадніцу, партовых зводнікаў і гермафрадытаў, якія ў заржавелых сартавальных вагонах завальваюць і мужыкоў і баб, хворых на нервы студэнтаў і маладых удаўцоў, святароў з празрыстай скурай, якія потнымі ружовымі пальцамі абмацваюць кудзеркі сямігадовых анёлаў, турэцкіх дальнабойшчыкаў, якія за сто дынараў суюць свае абрэзаныя жылы ў вусны кожнай, якая толькі захоча, настаўнікаў матэматыкі ў акулярах без дыёптрыяў, састарэлых даўнаў, з чыіх азадкаў тырчаць агуркі, ненасытных старых, якім папраўдзе даўно ўжо месца ў магіле...

У яе ў галаве існаваў цэлы сусвет мужчынаў, маляўнічы, як Гадараў Парыж, адзінай мэтай якіх было на кожным кроку пырснуць сваім семем – і па магчымасці ў ейнае дзіця. Яна ненавідзела іх усёй сілаю свайго вялікага сэрца, і тую нянавісць кожнаму, хто казаў ёй, што яна перабольшвае, што ненармальна родную дачку называць курвай, а ўсякага, хто на яе паглядзіць, маньякам, тлумачыла як найвышэйшую і найсвятлейшую праяву матчынай любові. Як толькі заходзіла гаворка пра сэкс, яна адразу адчувала сябе вялікай заступ-

ніцай, хоць да той, за каго яна заступалася, яна не мела пачуццяў, істотна адрозных ад яе стаўлення да Дыяніных сапраўдных і ўяўных мужчынаў. Гэтае дзяўчо нагадвала ёй пра яе ўласнае няшчасце ў жыцці і таму яно мусіла быць пакаранае. Прынамсі ў снах.

Яна сніла, як знаходзіць яе ў парках і на партовых кранах, з самцамі, якія пыхцяць, шчыруючы на яе целе, і некаторых Рэгіна ў сваіх снах пазнавала, але бывалі і незнаёмыя, выдуманыя людзі, пачвары з галовамі і целамі розных жывёлін, монстры з васьмю рукамі й нагамі, калматыя ваўкалакі і гіганцкія спруты, якія шчыпалі Дыяну за сцёгны, пакідаючы на іх сляды, але замест крыві з ран цякло нешта жоўтае і слізкае.

Яна зрывала іх са свайго дзіцяці з шалёнаю лютасцю, кідала ў мора, а то і далей. Яны разбіваліся аб скалы далёкіх астравоў або з дзікім выццём адляталі ў неба. А тады яна пачынала ў кожным сваім сне біць Дыяну. Біла яе нагамі і кулакамі, але тая не азывалася ні гукам, удары адскоквалі ад яе, як ад надзіманага матраца. Гэта ўшчэнт знясільвала Рэгіну, будзіла ў ёй роспач, яна пачынала плакаць і прачыналася ўся мокрая.

Неўзабаве яна зразумела, што яе дачка хаваецца не ў горадзе, гэта не мела б ніякага сэнсу, – што яна ўцякла некуды далёка. Але як далёка? У іншы горад ці ў іншую краіну, або села з нейкім мараком на карабель, і хто ведае, на якім канцы зямной кулі ступіць зноў на зямлю? Яна пабегла ў гасцёўню, і, вядома ж, у шуфлядзе пад тэлевізарам Дыянінага пашпарта не было. За тры дні, перш чым міліцыя пачне расследаванне, абвесціць вышук, яе карабель даўно пройдзе Атранцкую пратоку* і згубіцца сярод акул і піратаў.

Таму Рэгіна вырашыла зноў патэлефанаваць у міліцыю. Але Бартала не было дома або, можа, ён не хацеў адчыняць, і яна пабегла проста ў пастарунак.

У мяне скралі дзіця! закрычала яна на дзяжурнага. *Унука ці ўнучку?* спытаўся чарнявы міліцыянт з нізкім ілбом і зрослымі бровамі.

Якога ўнука, маё дзіця! З мяне выпала! адказала яна і памахала рукамі ад жывата і ніжэй, быццам сапраўды дзіця з яе выпала, а яна не заўважыла, перабіраючы на рыбным рынку вугроў і кефаляў, і нехта яго сцягнуў.

Баба, ты што вярзеш, якое малое дзіця? нахмурыўся міліцыянт. *Якая я табе баба, тупы асёл!* кінула яна міліцыянту ў твар.

Ён адхіснуўся і апусціў руку, нібы каб узяць дубінку. *Думай, як гаворыш са службовай асобай!*

Яна трошку адступіла і спыталася: *А хіба з маці так можна? Што б твая маці сказала, калі б цябе пачула?*

Міліцыянт пачухаў лоб пазногцем мезенца, відаць, ён заўсёды так рабіў, калі не меў што сказаць; можа ў бабы і праўда малое дзіця, хто гэтых жанчын ведае, адной даў бы трыццаць, а ёй ужо семдзесят, а на гэтую падумаў бы, што ёй ужо за шэсцьдзесят, а ёй можа толькі сорак.

Ён дастаў з шуфляды журнал запісаў, разгарнуў яго пасярэдзіне і папляваў на хімічны аловак: *Імя, пол і дата нараджэння дзіцяці, дзень і гадзіна знікнення, асобы, якія падазраюцца ва ўдзеле ў злачынным дзеянні!* адбарабаніў ён адным духам, а Рэгіна села і пачала выдумляць усё, што, на яе думку, будзе добра гучаць для міліцэйскага вуха. І што ёй ужо прыходзілі ананімныя лісты і папярэджанні, і што за дачкою сачылі падазроныя тыпы, па якіх было відаць, што яны нетутэйшыя, і што яна чула пра аднаго, што прыехаў з Аўстраліі, а бацька ў яго быў усташаўскі мяснік з Попава поля, дык можа прыехаў помсціць. А якая лепшая помста, чым выкрадаць нашых дзяцей, каб пазней разменьваць іх на злачынцаў, якія сядзяць па турмах, можа якраз на таго Міленку Хркача, які летась падкінуў бомбу ў той бялградскі кінатэатр і якога цяпер судзяць...

Дзяжурны запісваў па парадку ўсё, што казала яму Рэгіна. *Добра, грамадзянка, праверым!* спыніў ён яе ў нейкі момант. Рэгіна хацела яшчэ нешта дадаць, але міліцыянт ужо бег па калідоры, і яна не магла яго дагнаць.

Яна пайшла дадому, думаючы, што нічога з гэтага не выйдзе, народную міліцыю не цікавяць звычайныя людзі, а толькі партыйцы і іхнія дзеці, але не прайшло і гадзіны, як у дзверы пагрукалі двое ў цывільным.

Грамадзянка Рэгіна Дэлавале? запытаўся старэйшы, раскрыўшы і закрыўшы ў яе перад носам службовае пасведчанне. *Мы маем распараджэнне вас затрымаць!* Рэгіна паспрабавала зачыніць дзверы,

але другі госць паспеў паставіць нагу на парог, схапіў яе за каўнер, гузікі зацынькалі па плітках калідорнай падлогі. *Табе, баба, лепш не супраціўляцца!* сказаў галоўны, але яна ўжо ўся кіпела, уся яе злосць сабралася ў роце, толькі што яна не ведала, што ім сказаць і што наагул можна сказаць людзям, якія замест таго, каб шукаць згубленых дзяцей, затрымліваюць іхнюю маці. І таму яна проста плюнула ў твар чалавеку, які яе трымаў.

Наступнае, што яна адчула, быў рэзкі бляск уваччу і ў галаве, быццам маланка ўдарыла ёй у кончык носа, і ўмомант яе рукі былі ў кайданках.

Вядома ж, усе суседзі стаялі ў вокнах і на ганках, калі Рэгіну Дэлавале з крывавым носам і жалезам на руках вялі па каменных сходах да службовага фіята-1300.

Перш чым яны назаўтра даведаюцца яе версію гісторыі, суседзі будуць глыбока ўпэўненыя, што Рэгіна заляцела па палітычнай лініі. Або на рынку аблаяла Ціта і партыю, або ў яе дома знайшлі нейкія паперы, або насамрэч жывы яе брат, стары ўсташа, і яна хавала яго на гарышчы, дзе той рыхтаваў дыверсіі. Вырашылі пайсці да бабы Тэры Калабрэжавай, глухой і сляпой удавы аўстравугорскага палкоўніка, якой было ўжо амаль сто гадоў і якая пра кожную сям'ю ў горадзе мела найпаўнейшую і даволі надзейную інфармацыю. Вакол яе ложка сабралася чалавек пятнаццаць, як кабетаў, так і мужчынаў, каб даведацца пра ўсіх усташаў сярод Дэлавале і Сікірычаў – такое было ў Рэгіны дзявочае прозвішча, але Тэра не магла прыгадаць ніводнага жывога здрадніка радзімы з усяго Рэгінінага роду. Жывых бацькоў і дзядзькоў у яе ўжо няма, браты таксама памерлі, апрача аднаго, што жыве ў Трыесце, але той па-за падазрэннем. Што да нябожчыка Івы Дэлавале, то ў яго ў родзе былі два-тры падазроныя, нейкія далёкія сваякі, але яна не чула, каб хоць адзін з іх пражыў вайну.

І ад яе ўжо толку ніякага, сказаў Міле Мілун, расчараваны, як і астатнія, бо яны так і не знайшлі сапраўдных прычын, чаму Рэгіну забралі. Гісторыі пра ўсташаў і дыверсантаў былі ў модзе ўжо некалькі гадоў, але ніхто яшчэ не бачыў ні жывога ўсташу, ні яго супольнікаў, і ўсе трымцелі ад хвалявання перад першай сустрэчай.

Рэгіну папераменна дапытвалі два інспектары. Першы суцяшаў, кажучы, што і ў яго такая самая клапатлівая маці, а другі пагражаў васьмю гадамі катаргі – дакладна на столькі гадоў яна амаладзіла сваю дачку.

Хто і для чаго цябе на гэта падбіў? З кім ты размаўляла перад тым, як прыйшла ў аддзяленне міліцыі? Хто яшчэ ведае, што твая дачка пайшла з дому?

Ён паўтараў тыя самыя пытанні, а яна адказвала то адно, то другое; скажа трошкі праўды, а пасля зноў вяртаецца да сваіх выдумак, у якіх, прынамсі для міліцыі, не было ніякага сэнсу.

Так яе прасавалі аж да раніцы, калі прыйшоў начальнік аддзялення і сказаў: *Адпусціце вы гэтую бабу, хіба не бачыце, што яна вар'ятка!* Яна вярнулася дадому зламаная і бездапаможная. Сабраўшыся з думкамі, яна зразумела, які мае перад сабою выбар: або махнуць на сябе і сваё жыццё рукой, або знайсці Дыяну любымі даступнымі ёй сродкамі. Яна і так ужо занадта асарамацілася перад усім горадам, каб цяпер адступіцца.

Габрыел з'явіўся праз тры гадзіны пасля прыезду аўтобуса, калі Дыяна пачала ўжо страчваць надзею, цэдзячы чацверты сок у вакзальнай забягалаўцы ў горадзе, у якім не ведала ніводнага адрасу і ніводнага тэлефоннага нумару, апрача ягонага. Некалькі разоў яна хадзіла да тэлефоннай будкі, але ён не адказваў.

Эх, дзеўка, такія яны, мужыкі! казала са шкадаваннем афіцыянтка, а з краю барнай стойкі шчэрылі зубы чацвёра фіялетавых алкашоў. У Дыяны прамоклі туфлікі, як толькі яна ступіла на перон, спачатку ёй было холадна, а пасля пачалі невыносна свярбець пальцы на нагах. Калі яна церла іх адзін аб адзін, сверб ператвараўся ў боль, і тады ўжо ўсё свярбела ад болю. Яна адчувала такое ўпершыню; можа, падхапіла якую інфекцыю, грыбок, паганую скурную хваробу? Яна ўяўляла, як выглядаюць яе пальцы, якога яны колеру, а можа на іх пачала ўжо аблазіць скура. Не вытрымаўшы, яна зняла туфлікі і шкарпэткі, пальцы выглядалі цалкам нармальнымі, толькі трошкі пасінелыя, з чорным брудам пад пазногцямі, але надалей свярбелі і балелі.

І якраз калі яна іх расчухвала і асцярожна, каб не бачыла афіцыянтка і алкашы, нюхала далоні, увайшоў Габрыел. За ім, шырока

ўсміхаючыся, стаялі хлопец і дзеўка. Яна хуценька нацягнула ўсё яшчэ мокрыя шкарпэткі і туфлікі і кінулася яму ў абдымкі.

О, здароў, Дыя! сказаў ён, быццам зусім не спазніўся. І праўда, здарылася непаразуменне, бо ён думаў, што яна прыедзе аўтобусам з Будвы, які быў на дзве гадзіны пазней і толькі што заехаў на вакзал. Яны спалохаліся, калі пабачылі, што Дыяна з яго не выйшла, а яна вось дзе – чакае іх у вакзальным буфеце!

Гэта мой сяброк Муса! А гэта Гога, ягоная дзяўчына! Муса выглядаў значна маладзейшым за Габрыела, доўгавалосы бландзін з мілым безбародым тварыкам, якога яшчэ ніколі не датыкалася лязо брытвы. Ён выглядаў, як недавучаны гімназіст з міжваенных абвестак аб росшуку камуністаў. А яна была брыдзенькая таўстушка і відавочна старалася быць падобнай на Джэніс Джоплін. Што ёй, праўду кажучы, і ўдавалася. У шырокіх клёшах, краі якіх валачыліся па снезе і пад якімі зусім не было відаць чаравікаў, Гога як на сараеўскія ўмовы выглядала дзівам. Яны не паспелі адысці ад вакзала на сто метраў, як з усіх бакоў пачалі сыпацца заўвагі на яе адрас. *Памыйся, дзеўка!* крычаў ім таксіст з шэрага опель-рэкорда, мабыць помсцячы за тое, што яны не згадзіліся, каб ён падвёз іх у горад. *Ой, глядзі-глядзі, якая!* сказаў адзін цыганёнак другому. *Во, прыехалі амерыканскія цёлкі!* задуменна, але даволі гучна вымавіў лысаваты вусач ля ўваходу ў кебабніцу «Трыпалі».

Але з таго, што трое яе сараеўскіх сяброў рабілі выгляд, быццам нічога не чуюць, Дыяна зразумела, што нешта такое ў гэтых мясцінах звычайная справа і ад падобных рэплік у міжземнаморскім горадзе тутэйшыя адрозніваюцца толькі мерай адкрытасці і тыпам абразы. Аднак ёй здавалася, што з такім спосабам камунікацыі ў яе не будзе ніякіх праблем.

Трамвай давёз іх да Башчаршыі*, а адтуль яны з усім Дыяніным багажом пачалі ўздым на гару, які заняў больш за паўгадзіны, па амаль вертыкальных вуліцах і завулках. Праз кожныя пяць метраў яна паслізгвалася і падала, Габрыел са смехам яе паднімаў, торбы разляталіся ва ўсе бакі, пот цёк па тварах, а Дыяна ніяк не магла зразумець, як гэтыя трое могуць быць такія вясёлыя і разняволеныя. Быццам з імі не адбываецца таго самага, што і з ёй, быццам

гэты пад'ём іх забаўляе. Ад моманту свайго прыезду яна не сказала яшчэ і дзесяці фразаў, але ўжо зразумела: што б яна ім зараз ні сказала, гэта не адпавядала б пачуццю, якое яна з імі раздзяляла б. Мокрая, брудная і стомленая, як сабака, яна ўвайшла ў Габрыелаў дом і скінула туфлікі.

Хадзі-тка сюды, паклікаў ён яе да акна. *Глянь, дзеля гэтага я кожны дзень лезу на гэтую гару!* Недзе глыбока ўнізе, глыбей за Дуброўнік, калі глядзець на яго з Срджа*, у снезе і смогу ляжаў горад. Міргалі святлом вокны шматпавярховікаў і малых дамкоў, сінела на даху аднаго будынка эмблема славенскай тэлевізійнай індустрыі, напалову зялёныя напалову белыя стаялі таполі, а гарызонт з усіх бакоў быў на ўзроўні акна, каля якога яна стаяла. *Вельмі прыгожа,* схлусіла яна, разумеючы, аднак, што для некага гэтая карціна можа стаць найпрыгажэйшай і найважнейшай у свеце, але толькі для таго, хто глядзеў на яе ад нараджэння і аднойчы застаўся без яе.

Трошачкі ракіі, каб сагрэцца, Муса прынёс з кухні бутэльку. У куце палыхала і прыпякала вугальная печка. Ад яе ішоў той самы пах, які ахінаў увесь горад. Значыць, гэтым пахам сараеўцы плацяць за розніцу паміж марозам і цеплынёй у сваіх хатах. Дыяна сядзела на тапчане, падагнуўшы пад сябе ногі, як недзе некалі бачыла; ракія пахла медычным спіртам, ёй пачынала мутнець у галаве, і яна адчула, што тоне, прытулілася да Габрыелавага пляча, а пасля легла яму на калені.

Яе агарнуў сон, і яна больш нічога не чула, апрача ціхай і далёкай размовы, у якой знаёмыя словы вымаўляліся на нейкі дзіўны манер і гучалі, быццам іх вымаўляюць людзі, якія не перастаюць жартаваць. У гэтай гаворцы рэдка трапляюцца галосныя, збольшага яны застаюцца ў горле суразмоўцы, але тыя, што чуюцца, бываюць доўгія і бясконца расцягнутыя. Імі пацвярджаецца блізкасць паміж людзьмі, бо кожны няблізкі чуе ў іх насмешку і здзек.

З Габрыелам яна пазнаёмілася мінулай восенню. Ён прыехаў у горад як турыстычны гід з групай аўстрыйскіх пенсіянераў, якія найперш хацелі бачыць месца, дзе забілі эрцгерцага Франца Фердынанда, а пасля культурна-гістарычныя славутасці найпрыгажэйшага гораду на югаслаўскім узбярэжжы Адрыятыкі. Але дзеля таго,

што кіроўца аўтобуса «Боснатурс» у тую ноч трапіў у шпіталь з прабадзеннем сляпой кішкі, Габрыел мусіў быць ім і гідам, і кіроўцам. Ён вадзіў аўтобус першы раз пасля войска і першы раз на такую доўгую дыстанцыю. Усё выйшла добра, акрамя таго, што яму невядома як удалося прапусціць уезд у Дуброўнік. Замест каб вярнуцца на магістраль, ён спрабаваў, манеўруючы аўтобусам на вузкіх вулачках, знайсці кароткую дарогу, пакуль не захрас акурат перад уваходам у Дыянін дом у канцы вуліцы, якая заканчвалася сходамі.

Маці з дачкою чулі з кухні гук звар'яцелага матора, які даносіўся акурат з-за сцяны, пасля напалоханыя мужчынскія і жаночыя галасы, нямецкія зычныя і баснійскую лаянку. Выйшаўшы на вуліцу, яны пабачылі і пачулі, як аўтобус скрабе каменны рог іхняга дома. Рэгіна спынілася, як укапаная, і раззявіўшы рот утаропілася на бляшаную гаргарыну, якіх яшчэ ніхто не бачыў на гэтай вуліцы, дзе рэдка праязджаў і малы аўтамабіль. Тузануўшы некалькі разоў назад і наперад, усё больш абдзіраючы сцяну, Габрыел выключыў матор і выйшаў з аўтобуса. Хоць і худы, ён ледзь пралез паміж дзвярмі і сцяною. Не звяртаючы ўвагі на дзвюх жанчын, якія стаялі за некалькі крокаў і старэйшая з якіх ужо склала рукі як для малітвы, ён мітусіўся нібы хамяк у клетцы і спрабаваў знайсці нейкае рашэнне.

Дыяне ён здаўся смешным – барадаты, даўгавалосы, у непрыгожым пакамечаным адзенні з надпісам «Боснатурс» на кішэні. Бадай, у яго быў бы не менш дзіўны выгляд, нават калі б яна пабачыла яго ў нармальных абставінах. Ён зазірнуў назад у аўтобус і нешта сказаў, старыя ўскочылі і рынулі да выхаду. Першыя трое, худыя, яшчэ неяк вылезлі вонкі, але тады дайшла чарга да адной трохі таўсцейшай пані, якой ніяк не ўдавалася праціснуцца ў вузкую шчыліну, ад чаго яе ахапіла паніка, і яна пачала напінацца яшчэ мацней, пакуль канчаткова не захрасла паміж аўтобусам і сцяной, не могучы пасунуцца ні ўзад, ні ўперад. Кабета пачала вішчаць і клікаць на дапамогу, а тым часам вакол сабраліся ўсе суседзі. Шакаваныя, як і Рэгіна, яны, вылупіўшы вочы, глядзелі на дзіва-аўтобус. Толькі калі Габрыел пачаў запіхваць тоўстую пані назад у салон, бо выцягнуць яе вонкі не атрымалася, Бартал прамовіў: *Хлопча, хлоп-*

ча, папхні троху лявей, лявей, тааак, добра, тааак... Бабу вярнулі ў аўтобус, але гэта ўзняло яшчэ большую паніку: усе, і мужчыны, і кабеты, кінуліся да дзвярэй – адны, мабыць, таму што лічылі сябе худзейшымі за іншых, другія таму, што іх страх быў мацнейшы за розум, і яны падумалі, што гэты аўтобус пасярод Югаславіі, краіны камуністаў і партызанаў і тых, што забілі прастоланаследніка, станецца іхнім Тытанікам. Яны лезлі адны праз адных, мільгалі локці і калені, дамы драпалі пазногцямі шыбы, і гледачам заставалася вырашаць самім, што яны глядзяць – камедыю ці трагедыю, і што рабіць – смяяцца ці прыйсці на дапамогу. Габрыел спрабаваў вярнуць да розуму ашалелых старых, умольваў іх супакоіцца і пхаў нагой назад у аўтобус тых, што спрабавалі вынесці з яго свае тоўстыя трыбухі, пакуль урэшце не выбухнуў: *А йдзіце вы ўсе на сто хуёў!* Ён злосна махнуў рукой і пайшоў прэч ад аўтобуса. Куды ісці, ён яўна не ведаў, таму, пачаўшы спускацца па сходах, неўзабаве павярнуў назад і зноў стаў ля аўтобуса.

Дыяне падумалася, што больш дзіўнага і сімпатычнага чалавека яна не бачыла ніколі ў жыцці. Ні яе, ні іншых гледачоў ужо амаль не хваляваў лёс аўстрыйскіх пенсіянераў. Яны выглядалі ўжо не як сапраўдныя людзі, а хутчэй як персанажы нейкага фільма ці цыркавыя артысты, якія раптам вырашылі паказаць сваё выступленне перад нашымі дамамі. Усе моўчкі глядзелі, як тыя штурхаюцца, крычаць і плачуць, падаюць на сядзенні і тузаюць адно аднаго. Яны маглі б і памірaць, і задыхацца ў душагубным газе, і гнісці ад баявых атрутных рэчываў – было б усё адно.

Пакуль Бартал не выклікаў міліцыю, каб тая паспрабавала вырашыць праблему, з аўтобуса здолела выбрацца сем аўстрыйцаў. Мясцовыя напаілі іх вадой і віном, павыносілі ў двор зэдлікі, абменьваліся павывучванымі нямецкімі словамі, аж пакуль і самі замежнікі не адвярнулі позіркі ад сваіх палонных братоў і сёстраў па няшчасці і не зрадніліся ўсмешкамі са свабоднымі людзьмі. Калі яны ўспаміналі пра сяброў, то рабілі гэта без асаблівага разумення сітуацыі, у якой самі яшчэ зусім нядаўна былі, і звярталіся да іх са словамі суцяшэння і супакаення, якім відавочна самі не верылі.

А Габрыел усё хадзіў сюды-туды і мацюкаўся, упэўнены, што

ў гэты момант прападае ягоная кар'ера турыстычнага гіда, і яшчэ добра, калі не давядзецца з сваёй кішэні плаціць за рамонт аўтобуса. Ён хадзіў міма Дыяны, і яна паварочвала галаву то ўлева, то ўправа, зачараваная ягоным з'яўленнем. Ён выглядаў недарэчна, як Тарзан у Нью-Ёрку, вырваны з свайго натуральнага асяроддзя. Рэгіна, вядома, заўважыла яе позірк, і ён вельмі ёй не спадабаўся.

Міліцыя спярша склала пратакол, а пасля пачалася доўгая нарада пра тое, што рабіць далей. Ім удалося выцягнуць з аўтобуса яшчэ дзвюх худзейшых бабак, прыехала і машына хуткай дапамогі, бо ў адной кабеты пачаўся сардэчны прыпадак, людзі збегліся з усяго кварталу. Міліцыя беспаспяхова спрабавала рассеяць натоўп, людзі праштурхоўваліся на пазіцыі, з якіх было б лепей відаць, што адбываецца ў аўтобусе. Нейкія дзеці ўзлезлі на навакольныя стрэхі, Барталу загадаў ім злезці, каб не паламалі дахоўку, а тады прыехаў эвакуатар аварыйнай службы. Пад авацыі публікі кіроўца ўлез у аўтобус і спрабаваў выцягнуць яго з пасткі, але нічога не мог зрабіць і толькі разбіў левую пярэднюю фару ды яшчэ раз драпнуў бокам аб Рэгініну сцяну. Кожны раз, як бляха скрэбла па камені, Габрыел крывіў грымасы, нібы яму вадзілі лязом па пазногцях.

Хочаце, прынясу вам ракіі? звярнулася да яго Дыяна. *Што я хачу, дык гэта пісталет, каб стрэліць сабе ў галаву!* адказаў ён, не спускаючы позірк з свайго аўтобуса, які паступова ператвараўся ў ржавую абадраную бляшанку.

Усё ж ракія была б лепшая, не здавалася яна. Габрыел урэшце першы раз паглядзеў на яе. Яна была не такая ўжо прыгожая, але ў тым, як яна да яго звярталася і як на яго глядзела, была нейкая інтымнасць, якая ў жанчын звычайна ўзнікае толькі пасля месяцаў старанняў і заляцанняў, калі наагул узнікае.

Э, дзеўка, ты ўратавала мне жыццё, сказаў ён, калі сербануў з чаркі, Дыяна засмяялася, нібыта пачула нешта вельмі дасціпнае, і схапіла яго за руку. Гэты дотык быў крыху залішне смелы.

Аўтобус з палоннымі аўстрыйскімі пенсіянерамі заставаўся там усю ноч. Людзі разышліся па дамах, дзевяцярых уратаваных турыстаў размясцілі ў гатэлі, а Габрыел, як сапраўдны капітан, вырашыў дачакацца раніцы на сходах, каб няшчасныя старыя

бачылі, што ён не махнуў на іх рукою. Калі Рэгіна ўжо каля дзявятай гадзіны заснула, Дыяна выслізнула з дому з талеркай фасолі і кавалкам хлеба і правяла ноч побач з Габрыелам на тых самых сходах. Сходы былі вузкія, яны датыкаліся бакамі, дый размова цякла хутчэй і цяплей, чым бывае паміж жанчынай і мужчынам, якія толькі што пазнаёміліся. Яны размаўлялі пра ўсё на свеце, толькі не пра саміх сябе.

Ён распавядаў смешныя гісторыі, дзе галоўнымі персанажамі былі бацька Мія і яго картачны кампаньён Жуча, які вызначаўся незвычайным талентам: з'еўшы дзве талеркі фасолі, ён праз гадзіну мог ад пачатку да канца адпярдзець песню «Як пайшоў я на Бэнтбашу». Пра пусканне ветру Габрыел расказваў весела і без ніякага сораму ды звыклых выбачэнняў, нібыта гэта было якраз тое, пра што заўсёды расказваюць дзяўчыне пры знаёмстве. Ну якую ж дзяўчыну не замілуюць тлумачэнні, як бяруцца нізкія ноты і што трэба зрабіць, каб з тоўстай кішкі выйшла верхняе до, якое, па Габрыелавых словах, гэты інструмент выдае значна чысцей, чым кларнет і саксафон. Аднак вельмі важна, каб у фасолі не было залішне заправы і каб яе варылі з сухім, а не з сырым мясам. Ад заправы і сырога мяса пярдзеж страчвае меладычнасць і набірае смуроду.

Пасля ён расказваў пра Хурэма, другога бацькавага сябра, які меў мянушку Каціная Галава. Чаму Каціная Галава? А таму, што ў яго галоўка пры эрэкцыі велічынёю з каціную галаву, так што не лезе ў слоік з павідлам. Пабачыўшы такое, жанчыны ўцякаюць з усіх ног.

Ад пачутых гісторый у Дыяны круцілася ў галаве, і яны, вядома ж, былі б ёй гідкія, калі б гучалі з іншых вуснаў і расказваліся іначай. Але ж Габрыел, дзякуючы ім, не толькі не выклікаў агіды, а наадварот – рабіўся яшчэ больш прывабным.

На світанні Дыяна ўжо была гатовая пайсці з гэтым чалавекам на край свету, упэўненая, што жыццё з ім, адрознівалася б ад усяго, што яна спазнала з іншымі мужчынамі. Іншыя прыходзілі як прынцы і сыходзілі як апошнія нягоднікі: спачатку закаханыя ў яе мацней за ўсё на свеце, яны потым казалі, што пакідаюць яе, бо яна для іх занадта добрая – яны проста яе не вартыя. Яшчэ ніколі не здаралася, каб нейкі мужчына кідаў Дыяну, кажучы, што яна дурная карова,

кожны адыходзіў, цвердзячы, што ён крэтын і будзе шкадаваць усё жыццё. А той, што цяпер сядзеў з ёю побач і весела малаціў, як ягонага бацьку Мію збілі курвы ў нейкім добайскім бардэлі, таму што ён забыўся ўзяць з сабой кашалёк, а справу, за якую трэба плаціць, ужо справіў, – гэты пэўна ўжо ніякі не прынц і не знікне з яе жыцця, як дэзерцір.

Габрыел, са свайго боку, быў рады сустрэць жанчыну, якая можа слухаць пра тое, як Жуча пярдзіць, і пры гэтым не лічыць сваім абавязкам крывіць у адказ гідлівыя міны, а смяецца, як смяяўся б любы нармальны чалавек. Яму не падабалася, што жанчыны ў сваёй большасці паводзяць сябе так, нібыта ніколі ў жыцці не пярдзяць, а толькі дзьмуць у дзьмухаўцы і распускаюць вакол сябе пах ружаў. Калі яны хлусяць у гэтым, дык напэўна хлусяць і ва ўсім астатнім.

Раніцай на спецыяльным аўтамабілі прыбыла ратаўнічая брыгада з гарадскога транспартнага прадпрыемства, і з дапамогай лябёдкі ды сталёвага троса аўтобус сараеўскага «Боснатурсу» быў вызвалены з пасткі. Выратаваныя турысты ў той самы дзень адляцелі самалётам у Вену, папярэдне паабяцаўшы, што ім больш ніколі нават у галаву не прыйдзе паехаць у Югаславію. Дырэктар агенцтва Мэха Абучына заявіў Габрыелу, каб той не паказваўся яму на вочы і назаўжды развітаўся з думкай знайсці хоць якую працу хоць у якім югаслаўскім турыстычным агенцтве – хай лепш ідзе працаваць асенізатарам, бо ні з якой іншай прафесіі не пражыве! Габрыел паслаў Меху ў сраку і бразнуў тэлефоннай трубкай.

Супакойся, Гаўра, калі ласка, абдымала яго Дыяна. *Дзе я табе супакоюся, ябаць яго канём, прыб'ю, калі злаўлю!* крычаў ён, і ўся пошта глядзела, з якім такім дзікуном абдымаецца малая Дэлавале.

Наступных дзесяць дзён яны правялі, качаючыся па зацішных затоках і ў Відавым доме. Рэч у тым, што Дыяна папрасіла Віда, каб ён здаў пакой чалавеку з Сараева, які трапіў у аварыю; грошай у яго цяпер няма, але яна гарантуе, што ён іх вышле, як толькі вернецца дадому.

А хто ён табе? спытаўся Від.

Ды ніхто. Чалавек, якому патрэбная дапамога, а ў гэтым горадзе ў яго нікога няма, з дакорам адказала яна.

Першыя дні яны стараліся, каб Від не заўважыў, што паміж імі нешта ўзнікла, але аднойчы, вярнуўшыся ў пятніцу раней з працы, ён заспеў іх на гарачым пасярод кухні. Яна стаяла, нахіленая цераз стол з рассыпанымі па ім макрэлінамі, якіх перад гэтым скрэбла, – з нажом у руцэ і з рыбінай лускавінкай у куточку вуснаў, – а ён, увесь спацелы, з тварам тыгра ўтыкаўся ў яе раскалыханую белую задніцу.

Від нібыта ўрос у зямлю, не ведаючы, ні што сказаць, ні што зрабіць, перш чым уцячы.

Макрэлі, значыць? дурнавата запытаўся ён. Дыяна, сціскаючы нож, перавяла на яго замглёныя вочы, падобная на карову, што збіраецца сама сябе зарэзаць. А мужчына ў яе ззаду з заплюшчанымі вачыма працаваў далей, нічога не чуючы і наагул не заўважыўшы, што нехта ўвайшоў.

Макрэлі, так? паўтарыў Від, але Дыяна нічога яму не адказала. Хоць напэўна ж чула. Павінна была чуць.

Гэта быў без сумневу той момант, калі Від больш за ўсё наблізіўся да жадання назаўсёды забыць пра Дыяну і адступіцца ад таго, што будзе цягнуцца яшчэ адзінаццаць гадоў, аж пакуль яна ўрэшце не стане ягонай. Можа, ён тады і пакінуў бы яе, калі б знайшоў сілу выкінуць сараеўца з свайго дому. Але ён не ведаў, як гэта зрабіць, як не ведаў бы і ў менш далікатнай сітуацыі, тым больш што адразу знайшоў для кватаранта апраўданне. Чалавек ён быў сімпатычны і дасціпны, нікога не падмануў, нічога не схлусіў і, магчыма, нават не падазраваў, у што ўблытаўся. Было б глупствам сказаць яму зараз, што ён не можа тут заставацца. За што яго было праганяць? За тое, што ён на Відавым кухонным стале габлюе дзяўчыну, якая відавочна яму падабаецца? Сказаць, каб за гэта ён выбіраўся з хаты, было б недарэчна.

Два наступныя дні Габрыел спрабаваў прычакаць нагоду, каб пагаварыць з Відам сам-насам і ўсё яму растлумачыць, але той упарта яго пазбягаў, усё больш адчуваючы сорам.

Проста забіцца, як мне непрыемна, але я яе кахаю! сказаў яму сараевец, калі яны выпадкова на хвіліну засталіся ўдвох.

Ну ясна, адказаў Від з камяком у горле, з якога словы выходзілі, як зярняткі рысу з трахеі дзіцяці, якое імі падавілася.

Ужо толькі тым, што яна асабліва не паказвалася ў горадзе з сваім новым каханкам, Дыяна здолела схаваць яго ад Рэгіны. Маці, вядома ж, падазравала, што паміж ёю і тым баснійцам нешта было, але гэта было толькі адно з некалькіх дзясяткаў падазрэнняў той самай або й яшчэ большай інтэнсіўнасці, так што ёй і ў галаву не прыйшло, што Дыяна ўцякла ў Сараева і што ў Відавым доме адбылося нешта такое, што, калі можна мераць такія рэчы кубаметрамі і вышынёю рэгістру, перасягала яе папярэднія аферы. Але Рэгіна ўсё ж пайшла да Віда, ведаючы, што пра знікненне яе дачкі з ужо вядомых прычынаў ён мог ведаць найболей, і ўпэўненая, што ён скажа ёй усё, спадзеючыся, што гэта дапаможа найкарацейшай дарогай дабрацца да Дыянінага сэрца.

Я ведаю, штó яна для цябе значыць, пачала Рэгіна, *ты ж ведаеш, што такое матчына сэрца, нішто яго не можа падмануць. Дыяна – маё дзіця, мае косткі, мая кроў*, і яна абедзвюма рукамі схапілася за левую цыцку, каб ён бачыў, што такое сэрца. *Я б і сама хацела, каб яна была з табой, я ведаю, які б ты быў да яе добры. Хоць бы раз на яе скоса паглядзеў, дык і то не, праўда? Вось, бачыш, маці ўсё ведае! Але ў яе ўсяліўся д'ябал, дык яна не ведае, што для яе добра. Такія яны, жанчыны, Віда, як тыя матылькі, што лятуць на лямпачку і абпаляць крылы, а пасля ўсе кажуць – во, курва! А мая Дыяна не курва. Яна нешта іншае, у яе во такое сэрца, але яна не ведае дзе яно ў яе. І гэта ёй сама горш. Бо жанчына, мой ты Віда, не з адной жылы зроблена. Шмат у яе жылаў, розных. А Дыяна жанчына. Яна не дзіця, ужо ж я ведаю. І сэрца ў яе, мілы мой Божа, не адзіная жыла. Ёсць і яшчэ, толькі што тыя іншыя жылы да ліха вядуць і ліха шукаюць. Свярбяць жылы, бо хочуць мужыка, шукаюць ліха, а з ёй цяпер якраз ліха робіцца. Але яна пра гэта не ведае! Я разарвуся напалам, хай мне галава, як кавун, трэсне, калі я ёй зараз не дапамагу. А як жа ёй, Божа ж ты мой, дапамагчы? Я ж удава, няма ў мяне нікога хто б дапамог, хто б руку працягнуў. Іначай было б, калі б яе бацька быў жывы. Дочкі не могуць без бацькі, мой ты Віда! Толькі мужчынская рука кожную жылу на месца паставіць. Каб думала галавой і адчувала сэрцам, а не так, даруй мне Божа, каб і адно і другое – задніцай! Як тут яшчэ скажаш. Дык я б цябе папрасіла, мой ты Віда, дзіця маё,*

анёл ты матчын, каб ты мне дапамог і сказаў, калі нешта ведаеш. А я ведаю, што ты ведаеш і што сэрца тваё цябе да маёй Дыі цягне. Дзе яна цяпер, скажы мне, Віда?

Глядзеў ён на тую бабу і ведаў, што яна на нюх яго не пераносіць. Іншых мужчынаў, што круціліся вакол яе дачкі, яна ненавідзела, а яго і ненавідзела, і пагарджала ім, як жанчыны, што не маюць сэрца, каб шкадаваць, пагарджаюць адрынутымі мужчынамі. Ён мог бы ёй сказаць, дзе цяпер Дыяна, ён здагадваўся, што яна ў Сараеве і што каханне да доўгавалосага кіроўцы яе яшчэ не адпусціла. Ён гэта ведаў і па тым, што яна ўсе гэтыя месяцы гнала яго ад сябе і пазбягала, як і заўсёды, калі была ў некага моцна закаханая. Можа б ён нават мог зрабіць так, каб Дыяна ніколі не даведалася, што ён яе выдаў: не казаць Рэгіне, штó ён думае, а неяк ускосна прыгадаць ёй той дзень, калі перад яе домам захрас той аўтобус і калі Дыяна сустрэла раніцу на сходах за кампанію з баснійцам.

Але думка, што ён гэтым дапаможа бабе, чыя фантазія была яму агіднейшая нават за стол з макрэлямі, прымусіла яго толькі пацяснуць плячыма, кіўнуць галавою і прамовіць нейкія старэчыя словы суцяшэння і пакоры.

Яна абавязкова вернецца, сказаў ён, *я адчуваю, паверце мне.* Рэгіна яму, вядома ж, не паверыла, але не падала знаку і пагладзіла яго па шчацэ. *Аднойчы ты будзеш маім зяцем!* сказала яна, а Від пачырванеў і апусціў вочы, але зараз жа ўзняў галаву, бо спалохаўся, каб гэтая баба не падумала, што ён зараз заплача. Вядома ж, плакаць ён зусім не збіраўся, проста яму было млосна, і ён ніяк не мог дачакацца, калі ж яна ўрэшце пойдзе.

Яна памахала яму з цемры, спускаючыся праз сад, дзе не было чуваць цвыркуноў, хоць ноч была спякотная, горш за ўсе летнія. Прырода вывернулася навыварат, а поры года пачалі мяняцца месцамі, як у той дзіцячай гульні, дзе прыбіраюць адно крэсла і нехта заўсёды выпадае. Пераможца застаецца сядзець апошнім. Ці запануе вечнае лета, або заўсёды будзе зіма – яшчэ не вядома. Але апошнім часам пачалі гаварыць пра тое, чаму поры года цяпер не такія, як былі раней: міндалі зацвітуць у снежні, і за Каляды іх памарозіць мароз, горы над морам пакрыюцца беллю ў траўні, а праз два дні запануе

сахарская спёка... Старэйшыя людзі бачаць у гэтым руку Люцыпара, калі ён спускаецца на зямлю, дык усё або высыхае, або вымярзае, а маладзейшыя і больш адукаваныя лічаць, што ва ўсім вінаватыя ядзерныя выпрабаванні на атоле Бікіні і ў пустыні Нэвада. Але ўсе пагаджаюцца на тым, што гэтак доўга працягвацца не можа. Або свет схамянецца, або прыйдзе судны дзень.

У бялградскай «Палітыцы» адзін савецкі метэаролаг заявіў: «Калі амерыканцы не перастануць узрываць бомбы, планета Зямля ў цяперашнім выглядзе не дажыве да 2000 года». Замест таго, каб напалохацца, чытацкая аўдыторыя, мяркуючы з лістоў у рэдакцыю, супакоілася. «Да пачатку XXI стагоддзя ўжо будуць існаваць калоніі людзей на планеце Венера. Тыя, хто перажыве катастрофу, пакінуць Зямлю як вялізны сметнік», – пісаў Аляксей Навадзін, футурыст-аматар з Сомбара.

Ужо была мінула поўнач, калі Дыяна прачнулася недзе ў Сараеве з галавою ў Габрыела на каленях. Ён не варушыўся, каб яе не разбудзіць. Ад таго моманту, як Гога і Муса пайшлі, ён сядзеў у цемры, курыў і раздумваў, ці гэта менавіта тое, чаго ён хацеў. Каб у яго пасялілася ягоная прыморская дзяўчына і пераставіла ягонае жыццё з адных рэек на іншыя. Ва ўсялякім разе гэта лепш, чым каб яно зноў сышло з рэек, але не настолькі добра, каб ён цяпер не быў крыху напалоханы. Ён і праўда месяцамі запрашаў Дыяну ў Сараева, але рабіў гэта таму, што яна не пераставала наракаць на маці і расказваць яму жахлівыя штодзённыя эпізоды, у якія ён да канца не верыў – якая б маці ставілася так да свайго дзіцяці, да таго ж дзяўчыны? Але ўжо сталася звычкай, што заўсёды пасля таго, як яна перакажа яму свой дзень па тэлефоне, ён запрашаў яе да сябе. Ён так запрашаў і іншых і ведаў, што яны не прыедуць. У такіх запрашэнняў няма сваёй назвы, але ўсе пра іх ведаюць і ўсім ясна, што гэта робіцца для таго, каб аблегчыць душу таму, каго запрашаеш. Хто б мог падумаць, што гэтае запрашэнне і насамрэч будзе ўспрынята як запрашэнне?

Не думала так і Дыяна, пакуль за тры тыдні да таго не сказала: *Добра, я еду, будзем жыць разам і будзем шчаслівыя!* Гэта гучала як фраза, перапісаная з любоўнага рамана.

У Габрыела і ў галаве не было падумаць пра тое, што ён казаў,

або спытацца ў сябе, хоча ён сам ці не хоча тое, што прапаноўваў. Ён проста не ведаў, што з ёй рабіць, і адразу ўсё, звязанае з Дыянай, зрабілася праблемай. Ад таго, што яна тут будзе жыць і ён ужо не будзе ў сваім доме сам і не зможа трымацца сваіх звычак, накшталт сцання ва ўмывальнік, якое раптам зрабілася для яго вельмі важным, і да праблемы з тым фактам, што яна будзе хадзіць па вуліцах гэтага гораду, зусім не такога, як ён ёй апісаў, і не зможа тут жыць тым жыццём, да якога звыкла. Ён адчуваў сябе поўным ідыётам, і ў галаву яму прыходзілі толькі розныя глупствы. Ён быў напалоханы.

Ты прачнулася, сказаў ён, калі яму ў цемры падалося, што яна расплюшчыла вочы. *У мяне ўсё баліць*, прастагнала яна, *думаю, што ў мяне гарачка... Што ў цябе?.. Тэмпература. Я захварэла... Ды ну. Чаго б ты захварэла. Спала, а цяпер прачнулася. Запаліць святло?* спытаўся ён і апусціў яе галаву на тапчан. Дыяна закрыла далонямі вочы, чакаючы бляску маланкі.

Усё будзе добра, павер мне, сказаў ён, пакуль яна цікавала за ім праз шчыліны між пальцаў. Гэта гучала непераканаўча. Яна села і прыклала далонь да лба. *Гарачы*, сказала яна. Ён узяў яе за руку і дакрануўся вуснамі да шчакі: яна дрыжала, як толькі што разбуджаны кажан. І нічога болей. Прынамсі, гэта б магло яе суцешыць.

Да раніцы Габрыел нагаварыў Дыяне ўсё тое, пра што не сказаў ні слова ад моманту іхняга знаёмства. Ні разу не згадаў ні бацьку Мію, ні пердуна Жучу, але, нібы апанаваны дзіўным псіхічным расстройствам, казаў усё найгоршае, што мог пра самога сябе прыгадаць. Яна спачатку адмахвалася і спрабавала яго перапыніць, а пасля толькі круціла ў руках пустую чарку ад ракіі і збірала яе мокрым дном зярняткі вугальнага пылу з фанернай паверхні стала; слухала яго і думала, куды ж падзелася Гаўрына бестурботнасць і ці наагул была тая ноч, калі яна пацалавала яго ў вуха, пакуль ён разважаў уголас, з якімі словамі родныя і святары на могілках будуць развітвацца з падарожнікамі аўтобуса «Тытанік». Перад ёй цяпер быў нехта іншы, хто толькі выглядаў як ён, але кожная рысачка ягонага твару казала нешта адваротнае і азначала нешта іншае. Гэткі насаты і доўгавалосы, з казлінай бародкай, валасы якой тырчалі ў розныя бакі, раней ён

выглядаў як Дон Кіхот. А цяпер выглядаў дакладна як той чорны птах, якім перааапраналіся сярэднявечныя чумныя знахары.

Гаўно я, а не чалавек, увесь час кажу пра нешта, што яно прыгожае і цудоўнае, а яно ніхуя. Як толькі пазнаеш мяне бліжэй, пабачыш сама. Толькі і думаю, куды мне ўцячы. Дзе б я ні быў і што б ні рабіў, заўжды тое самае. Пакуль ёсць што выпіць і закусіць, я добры, але як толькі трэба нешта рабіць, мне няма ахвоты. Забі мяне – не магу! Ведаеш, што я толькі ў жыцці не рабіў, у сэнсе, на якіх працах не працаваў? Мы пазнаёміліся, калі я быў гідам, і гэта была найлепшая праца. Я ў дзяцінстве вывучыў нямецкую, бо ў мяне баба была немка, дык я вадзіў розных старых па горадзе і не дай бог, каб нехта праверыў, што я ім казаў. І што гэтая мячэць старэйшая за егіпецкія піраміды, і што ў гэтым гатэлі спыняўся Гітлер, калі быў у Кладні, і што гэтая вада па народных вераваннях лечыць сямейна. Ты вып'еш, а вылечыцца твой дзядзька ў Гановэры або цётка ў Чыкага. Факт: мне было добра, пакуль я гэта рабіў, бо тыя бабусі раззяўляліся на мяне, нібыта чакалі, што ім у рот заляціць «Саюз-5», і ўсе мне верылі, а мне было напляваць. Я мог ім заліваць колькі хачу і думаць – во аслы старыя, бляхамуха, трэба было б іх пахаваць, пакуль яшчэ ходзяць, каб далакопы не мучыліся цягаць труны. Разумееш, Дыя? Вось які я, а не такі, як ты думаеш. Цяпер во працую ў Нацыянальным тэатры сталяром. Забіваю цвікі – вось і ўся праца. Ведаеш, калі цвік тырчыць з другога боку, дык майстар яго падаб'е, каб нехта не напароўся? Ну а мне няма ахвоты. Мне пляваць, калі трэці вястун у «Гамлеце» напорацца на цвік пасярод спектаклю. Або мне яшчэ будзе і ў кайф, калі напорацца, хто яго ведае. Я мусіў табе ўсё гэта сказаць раней, але я і цябе абдурыў, як дуру кожнага. А цяпер мне шкада. Ай, ну яго ўсё нахуй.

Ён гаварыў і пасёрбваў ракію з бутэлькі, пакуль яго не пачаў зморваць сон. *Я застануся тут, а ты ідзі ў спальню. Знайдзі там нейкую коўдру і падушку. Прабач, Дыя.*

Яна згасіла святло, узяла валізу з калідора і адны за аднымі адчыніла ўсе дзверы, пакуль не знайшла спальню. На сцяне над голым шлюбным ложкам вісела вялікае драўлянае распяцце з ашчэраным Хрыстом, які замест вачэй меў два сінія паўкаштоўныя камяні

і выглядаў так жудасна, што яна мусіла яго зняць. Яна засуне яго пад ложак і верне раніцай, перш чым прачнецца Габрыел. На сцяне застаўся чорны пыльны след крыжа, і Дыяне падалося, што гэтае распяцце ніхто не кранаў з месца як найменей гадоў дваццаць. У вялікай дубовай шафе яна знайшла паскладаныя ў некалькі акуратных стосаў сотні прасцінаў, навалочак і чахлоў на коўдру. Яна здзівілася іх цвёрдасці. Бялізна была так моцна накрухмаленая, што выглядала як кардонная. Яна пахла вільгаццю, пылам і нафталінам. Дыяна неяк абцягнула ложак прасціною, падрыхтавала падушку і коўдру, дастала з валізы начную кашулю і пайшла шукаць лазенку. Яна знайшла яе ў канцы калідора, за шостымі дзвярмі. У цемры яна не здолела вызначыць прызначэнне астатніх пяці пакояў, а святло запальваць не хацела, бо баялася ўбачыць нешта падобнае да ашчэранага Ісуса.

Дыяну шакавала, магчыма, не толькі тое, што Збаўца з Габрыелавай спальні меў твар як з фільму жахаў, але і тое, што, уяўляючы сабе Сараева і загадзя прызвычайваючыся да думкі пра жыццё ў гэтым горадзе, яна чакала ўбачыць Рэгініных туркаў, мусульманаў, пра якіх нічога не ведала, саладжавыя позіркі і вітанні – як у Відавай маці Нусрэты, пра якую яна спачатку думала, што тая так робіць, бо жадае бачыць яе сваёй нявесткай, але пасля зразумела, што цётка Нусрэта гэтак вітаецца з кожным, бо ўпэўненая, што чулая ўсмешка, адрасаваная ўсім і ўсяму, – гэта знак прыстойнасці і добрага выхавання. Такімі ўсмешкамі аблягчаеш іншым тое, што хочаш, каб яны аблягчылі табе. Нусрэта не перастала ўсміхацца, хоць ужо доўга жыла сярод людзей, якія ніколі не адказвалі ёй узаемнасцю, бо ў іх такога звычаю няма. Але Арыент у душы не разлічвае на жыццё ад сёння да заўтра. Фанатызм ісламу палягае ў тым, што выконваеш належнае, не спадзеючыся адплаты, і ўсё гэта дзеля той далёкай будучыні, якая, магчыма, не месціцца ў нейкім канкрэтным часе, калі ўрэшце нехта табе адкажа.

І сам Габрыел, нягледзячы на ягонае імя і на тое, што ён пражагнаўся і ўкленчыў, калі яна завяла яго ў катэдральны касцёл, якраз здаваўся Дыяне чалавекам з легенды з мячэцямі, баклавою* і колерамі Лоўрэнса Арабійскага, які разам з тэлеперадачамі з удзе-

лам Заіма Імамавіча, Нады Мамулы і Рэйхана Дэмірджыча* быў найдакладнейшым увасабленнем уяўнага Сараева.

Распяцце з страшным Хрыстом не ўпісвалася ў арыентальны свет, але яно нічым не нагадвала і тую хрысціянскую святасць і пазалоту, да якіх яна прызвычаілася ў сваім горадзе. Гэтак разбілася першая ілюзія наконт прывабнасці авантураў з невядомым. Ашчэраны Хрыстос з застылымі сінімі вачыма застанецца, пасля смуроду вугальнага дыму, яе другім глыбокім сараеўскім успамінам.

Лазенка была вялікім ледзяным памяшканнем з старасвецкай ваннай і ўнітазам, размаляваным ружовымі і блакітнымі пляцістымі ружамі. Са сцен пластамі лушчылася тлустая жаўтаватая фарба, у бойлеры не было цёплай вады. А халодная была такая ледзяная, што Дыяна адхапіла далонь, бо ёй падалося, што з крана ліецца вар. Яна стаяла пасярод лазенкі, бачыла сваё дыханне, быццам была на вуліцы, а не ў доме, і не ведала, што рабіць. Яна ніколі ў жыцці яшчэ не клалася ў пасцель такая брудная.

Яна выскачыла са сну, нібыта яе вываліў на зямлю смеццявоз гарадскіх камунальных службаў, шалёна білася сэрца, і ў першы момант яна не магла зразумець дзе яна. Калі ачомалася, нацягнула яшчэ мокрыя туфлікі і пайшла па рэшту рэчаў. Раскрыла пасярод пакоя валізу і кожную торбу, перабрала ўсе рэчы, якія можна на сябе надзець. Вярнула распяцце на месца – Хрыстос і ўдзень не выглядаў лагаднейшым – і пайшла ў лазенку, але перадумала – напэўна, цёплай вады ўсё роўна няма. Яна надзела на сябе ўсё найцяплейшае і пайшла шукаць Габрыела. Аднак яго не было, а з таго, што не было ні чаравікаў, ні курткі, яна зразумела, што ён некуды пайшоў. Яна зноў паглядзела праз акно на заснежаны горад, і ён здаўся ёй меншым, чым учора. Дзень быў сонечны, без імглы і аблокаў. Чуўся шум у вадасцёках. Снег хутка растане. Можа яно так і мае тут быць гэтай парою, панура падумала яна. Не паспела яна сесці, як пачула ключ у дзвярах.

Дыяааа, паглядзі хто прыйшоооооў! азваўся Габрыел дзіцячым голасам, *паглядзі што я табе прынёооос!* Ён паставіў на стол палатняную торбу поўную гарачых сараеўскіх самунаў*, а з кішэні курткі выцягнуў два ягурты.

Калі б праз трыццаць гадоў у Дыяны нехта спытаўся, калі яна ў жыцці ела найлепш, яна прыгадала б той дзень і свой першы самун. Вядома ж, хлеб хлебу няроўны, але не настолькі, каб яны розніліся імёнамі, а не толькі колерам і гатункам мукі. І самун быў хлебам, але заслужыў асобнае імя.

Усё, што Дыяна палюбіць у гэтым горадзе, яна будзе распазнаваць выключна паводле смаку. Іншыя органы пачуццяў будуць памятаць толькі грэблівасць і агіду, затое паднябенне будзе з настальгіяй прыгадваць дзевяць сараеўскіх месяцаў.

Ледзь не паплаціўшыся за тое, што ў міліцыі яна схлусіла пра Дыяніны гады, і не даведаўшыся нічога ад Віда, Рэгіна села на аўтобус і паехала ў Нікшыч* да Ніколы Раданіча, былога партызанскага палкоўніка, які адседзеў пятнаццаць гадоў за забойства цесця і цешчы. На адрыятычным узбярэжжы і ў Чарнагорыі ён здабыў сабе славу чалавека, які вырашае выпадкі, што не ў стане вырашыць міліцыя, знаходзіць скрадзенае сямейнае золата, расшуквае даўжнікоў, што хаваюцца ў Італіі, ловіць і ў разе патрэбы ліквідуе вядомых і невядомых забойцаў і гвалтаўнікоў. Легенды пра Палкоўніка ўжо даўно дайшлі да вушэй міліцыі і удбы*, але ў тым 1969 годзе яны яшчэ не ўмешваліся ў ягонае жыццё. Можа, мелі з ім нейкую дамову, а можа, ён і для дзяржавы выконваў нейкую брудную працу.

Па сутнасці Палкоўнік быў першым і адзіным у Югаславіі прыватным дэтэктывам. Толькі што на дзвярах яго дома не было шыльды з назвай фірмы і ён не даваў інтэрв'ю газетам і тэлевізіі.

Яго тэлефонны нумар Рэгіна здабыла ў Іўкі Карабагданушы, рэстараннай спявачкі і, па чутках, курвы, якой нейкі албанец плюхнуў кіслатой у твар, помсцячы гаспадару рэстарана за тое, што той ашукваў яго ў картах. Палкоўнік знайшоў албанца ў Мілане, а Іўцы прывёз ягоны пашпарт і абодва вухі, спакаваныя ў скрыначцы ад упрыгожанняў. *Вось, паглядзі, калі не верыш,* адчыніла яе Іўка і сунула Рэгіне пад нос, *я й не пыталася, што ён яму яшчэ зрабіў. Мне гэтага дастаткова*, сказала Іўка Карабагдануша, хаваючы абпаленую палову твару пад пасмамі вялікага бялявага парыка.

Двух зморшчаных вухаў, якія пахлі алтарным ладанам, было да-

статкова, каб супакоіць Рэгіну і ўпэўніць, што і яе выпадак Палкоўнік паспяхова вырашыць.

Калі яна яму пазваніла, адазваўся жаночы голас і сказаў, што ў таварыша Раданіча першы свабодны тэрмін сёння а дзясятай вечара, а наступны толькі праз два тыдні. Пасля выявіцца, што гэта была хлусня і што Палкоўнікава сакратарка заўсёды кажа тое самае, каб людзі з усіх канцоў краіны беглі на аўтобусы і цягнікі, зачараваныя ім, нават яшчэ яго не пабачыўшы. Людзі найбольш цэняць тых, у каго няма часу.

Таксісту ў зялёным «масквічы» Рэгіна сказала, каб ехаў на Савы Кавачавіча адзінаццаць. *А ты, баба, напрасткі да Палкоўніка!* адразу пачаў ён, *і якая бяда цябе да яго нясе?.. – Няважна*, рэзка адказала яна. *Ха, табе лепш відаць важна ці няважна, але табе было б лепш, калі б важна. Улічы, што толькі каб ён паглядзеў на цябе, каштуе мільён. Каб ты была дзеўка, было б і дзешавей, або можна было б і чым іншым заплаціць, а так я й не ведаю*, пажартаваў таксіст, відавочна раззлаваны тым, што яна не захацела сказаць яму, якая бяда яе прыціснула.

Яна пазваніла на браме ў мураваны дом з малымі акенцамі, які выглядаў як бункер. Прыбеглі два злыя кудлатыя сабакі і раз'юшана забрахалі праз плот, а пасля паказаўся і ён. У старым вайсковым шынялі, накінутым на плечы, у высокіх афіцэрскіх ботах, у якія былі запраўленыя нейкія шырокія галіфэ, у расшпіленай белай кашулі, высокі і самавіты ён ішоў да брамы, і Рэгіна падумала, што прыгажэйшага чалавека яна ў сваім жыцці не бачыла. Ён адагнаў сабак і пусціў яе ў двор. Яна адразу назвала сябе. *Палкоўнік*, адказаў ён, не падаўшы рукі. Праз змрочны калідор яны прайшлі ў пакой з вялікім канцылярскім сталом і высокім драўляным фатэлем з двума выразанымі на спінцы арламі.

Ён сеў і паказаў ёй рукою на круглы фартэпіянны зэдлік з другога боку стала. Адзіным святлом у памяшканні была малая саракаватная начная лямпа, павернутая ад яго так, што Палкоўнікаў твар увесь час размовы заставаўся ў поўнай цемры.

Яна расказала яму свой выпадак, збольшага кажучы праўду. *І ў вас сапраўды няма ніякага следу, і вы не ведаеце, хто б мог ведаць*

болей? спытаўся ён, а пасля запісаў імёны ўсіх Дыяніных сяброў і сябровак, кожнага, з кім яна бачылася і да каго хадзіла, каго толькі Рэгіна магла прыгадаць.

Тое, што вы самі нічога не знайшлі, павышае цану пытання, сказаў ён. *Апрача таго, вы не сказалі, чаго ад мяне хочаце. Я не ведаю, што я мог бы яшчэ зрабіць, акрамя таго, што даведаюся, дзе вашая дачка... А хіба вы не маглі б зрабіць так, каб яна вярнулася да мяне?.. Як? Я не гасподзь Бог. Вы нават не ведаеце, з кім яна цяпер. Можа, я мог бы яго запалохаць або, калі гэта нейкі злачынец, перадаць яго органам парадку ці нешта такое, але што калі не?.. Дык вы расследуйце... Значыць, хочаце, каб я даведаўся, дзе вашая дачка, хто ў яе жаніх і ці чыстыя ў яго рукі, і калі не – будзем дзейнічаць адпаведна? Калі вы хочаце гэтага, дык усё пытанне будзе каштаваць вам каля паўтара мільёна дынараў, у старых дынарах, а калі толькі даведацца, дзе ваша малая, гэта было б сто пяцьдзясят тысяч. Але калі вы вырашыце гэтак, то далей ужо будзеце самі, бо я займаюся толькі канкрэтна дамоўленымі справамі. Дык вось і кажыце, чаго хочаце, і я гэтак адпрацую. Ніякіх далейшых патрабаванняў прымаць не буду... Добра, я заплачу за ўсё... Але я не гарантую, што малая вернецца. Гарантую толькі, што вы будзеце пра яго і пра яе ведаць усё. А больш за тое толькі ў выпадку, калі нешта на яго накапаю. І яшчэ! Палову грошай дасцё мне на працягу сямі дзён, а другую палову – калі праца будзе зроблена,* закончыў Палкоўнік.

Ён устаў, і гэта быў знак, што сустрэча скончаная і больш пытанняў няма.

Ужо назаўтра Рэгіна дала абвестку, што ў Куне, на паўвостраве Пэлешац, за паўтара мільёна дынараў тэрмінова прадаецца дом з алівоўнікам. Дзеля таго, што прапанова была шалёна добрая, бо адзін толькі дом каштаваў як найменей тры мільёны, адразу знайшоўся пакупнік з гатоўкай, і так з прычыны першых Дыяніх уцёкаў з дому быў страчаны летнік Дэлавале, які сем пакаленняў перадаваўся ад бацькоў да дзяцей і які нікому нават у часы найстрашнейшай галечы не прыходзіла ў галаву прадаць.

Палкоўнік прыслаў з Нікшыча кур'ера па задатак, і Рэгіне засталося толькі чакаць, нервавацца і шукаць новых прычынаў, чаму яе

дачка ўцякла з дому, але кожная з іх урэшце зводзілася да хворага роду Дэлавале, які даўно ўжо, яшчэ да таго, як яна пабралася з Івам, трэба было выкараніць і гэтак уратаваць свет ад невылечнага дэфекту, які толькі павялічваўся з пакалення ў пакаленне. Дарэмна яна спрабавала ўратаваць тое, што ў Дыяне было ад яе і што яна ўзяла ад Сікірычаў, бо, мяркуючы па ўсім, гэтага не было ў ёй. Яна ўся ў тату, бо мярзотнік заўсёды мацнейшы за сумленнага чалавека, гэтак сама як злы мацнейшы за добрага і заганны – за праведнага. Вось так і прападзе ўвесь свет, калі кожны добры род будзе загублены нейкімі Дэлавале, і на ўсім зямным шары не застанецца ніводнай маці, якая не нарадзіла б заганнага дзіцяці.

Тым часам, як Палкоўнік лічыў грошы і рыхтаваўся да росшукаў, Габрыел здолеў намовіць Дыяну пайсці з ім у тэатр. Ён не хацеў пакідаць яе дома адну, бо яна баялася ўсяго на свеце, казала, што пад гарою дзядзькавых кніг, якімі завалены адзін пакой, напэўна гніе чыйсьці труп, бо адтуль так моцна смярдзіць; здымала са сцяны распяцце, патрабавала, каб у калідоры ўсю ноч гарэла святло, і зазірала ў пакоі, куды ён сам ніколі не заходзіў. У горадзе яна не ведала што рабіць і адчувала сябе яшчэ большым чужынцам, чым усе тыя немцы і аўстрыйцы, якіх Габрыел вадзіў як гід. Ён бы й сёння пакінуў яе на захаванне Мусу і Гозе, але яны падклалі яму свінню і махнулі да некага на дзень народзінаў недзе на Яхарыну*. Але так можа й лепш, чым паказваць малой далмацінцы Сараева, не ведаючы, што ёй паказаць.

Ён пакінуў Дыяну чакаць у Тэатральнай кавярні, пакуль будзе рыхтаваць дэкарацыі, а пазней, а палове восьмай, возьме яе на спектакль. Яна піла ору, газаваны апельсінавы сок, прадукцыю марыборскага завода безалкагольных напояў «Таліс», якім айчынная індустрыя канкуравала з кока-колай, амерыканскім чорным дзівам, што ад мінулага года прадавалася па Югаславіі, першай сацыялістычнай краіне, дзе пілі кока-колу. Гэты факт напаўняў людзей гонарам, і ніхто, хто паважаў сябе, не піў ні оры, ні другога славенскага вынаходніцтва – кокты.

Аднак Дыяне было ўсё роўна. Яна сядзела за сталом адна, а ў куце кавярні нейкая кампанія, па ўсім відаць, студэнты з поўдня, спявалі на некалькі галасоў далмацінскую песню...

Габрыел насіў пратыкаблі з канца ў канец сцэны і соп так, быццам зараз выпусціць дух, пакуль у Мэхі Пэзэра не лопнула цярпенне і ён не зароў на яго: *Слухай ты, конь, будзеш і далей мне так пыхцець, я сабе пайду дадому, а ты тут сам трахайся і з дырэктарам, і з рэжысёрам! Я і так на бальнічным, а ты замест каб сказаць дзякуй, што я прыйшоў, строіш тут дурня. Чаго ты хацеў? Граць на сцэне? Гэтага ты хацеў? Дык ідзі грай, але дай мне спакойна жыць.*

Габрыел апусціў свой канец пратыкабля, *пачакай, я табе нешта скажу!* спрабаваў ён супакоіць Мэху, але той бразнуў сваім канцом аб падлогу так, што рэхам адгукнуўся ўвесь тэатр, *што ты мне нахер скажаш?*

Падобна, што я ажаніўся. Не хацеў, але падобна, што так выйшла, адказаў ён.

Як гэта? здзівіўся Мэха Пэзэр, які быў жанаты ўжо пяцьдзясят з лішнім гадоў і з дзевяці ягоных дзяцей двое былі ўжо на пенсіі, хоць самому не было яшчэ і сямідзесяці.

Так выходзіць. Дзеўка пасялілася ў мяне... Якая дзеўка?.. Адна з мора... Такую не ведаю. А чаму ж ты яе пусціў?.. Э, бачыш, у гэтым і засада. Я яе не пускаў, а сам паклікаў... Добра, і што цяпер? Ты паклікаў, яна прыехала, куды ўжо лепей! Цяпер можаце рабіць дзяцей... Ну, не зусім так... А як жа?.. Я якраз не думаў, што яна прыедзе... Эх, дык і я не думаў, што мая Фазіла выйдзе за Пэзэра, калі я ў яе спытаўся, а бачыш – выйшла, і я цяпер мучуся! засмяяўся Мэха, ужо палагаднеўшы, хоць і рабіў выгляд, што нічога не разумее.

Мэха, дружа, не магу я жаніцца, ледзь не плакаў Габрыел.

А што так? Ці, можа, ты па мужыках? Калі так, дык лепш трымайся ад мяне далей. І давай ужо, паднімай гэтую гламазду, а то Гамлету не будзе дзе мацаць Афелію.

На гэтым і скончылася Габрыелава споведзь, але ўжо заўтра паўтэатра будзе ведаць пра яго няўдалае любоўнае здарэнне. Мэха, вядома ж, усё вельмі добра зразумеў і расказаў каму трэба, шкадуючы няшчаснага хлапца, што толькі ўзняла рэпутацыю Габрыела ў акторскім свеце, які непрыхавана цешыўся ўласнымі і чужымі трагічнымі каханнямі, разбітымі шлюбамі, удаванымі нервовымі зломамі і іншымі эмацыйнымі прычынамі для алкагалізацыі.

Той факт, што ён як работнік сцэны і памочнік дэкаратара перажыў нешта такое, што лічыцца знакам прыналежнасці да вышэйшай касты, будзе прычынай таго, што Віктар Барыла, рэжысёр «Гамлета», дасць яму эпізадычную ролю другога вестуна, калі стары Ёзэф Чэрны трапіць у шпіталь з інсультам. Так Габрыел прасунецца ў акторскай кар'еры, што з ягонага гледзішча будзе адзінае добрае наступства шалёнага дзевяцімесячнага шлюбу з Дыянай Дэлавале…

Яны селі ў сёмым радзе партэра на дзясятае і адзінаццатае месцы, якія заўсёды былі рэзерваваныя на выпадак, калі якая з партыйных ці дзяржаўных дэлегацый з недалучаных краінаў, якія штодня прыязджалі ў горад абгаворваць гешэфты са зброяй і нафтай, захоча па-за пратаколам наведаць тэатр. Але такога ніколі не здарылася, таму два найлепшыя месцы ў сёмым радзе належалі работнікам сцэны, аднак і яны не карысталіся гэтай магчымасцю, апрача выпадкаў, калі нехта з маладых знаходзіў дзяўчыну, якая дазваляла сябе зачараваць заляцаннем у тэатры.

«Гамлет» быў страшна нудны, зацягнуты і цалкам адпавядаў факту, што яго паставіў чалавек, які займаўся той самай працай дваццаць пяць гадоў назад, пад усташамі і нямецкай акупацыяй, будучы тады маладым, смелым і перспектыўным, а таму спектакль 1969 года меўся быць нейкай спробай ягонай ціхай рэабілітацыі пасля дваццаці пяці гадоў забароны на пастаноўкі ў Сараеве.

Як і любая іншая рэабілітацыя тых гадоў, гэтая таксама прадугледжвала акт пакаяння, глыбокага шкадавання і максімальнай стрыманасці, чаго Барыла прытрымліваўся так паспяхова, што спектакль было проста немагчыма глядзець, але, з другога боку, гэта не было прычынай, каб яго не пахвалілі газетныя крытыкі і каб ён не атрымаў запрашэння на розныя югаслаўскія і замежныя фестывалі. Ніхто, апроч удбашаў і таварышаў з Камісіі па ідэйнай працы Цэнтральнага камітэта, не памятаў пра Барыліну рэжысуру і грэшную маладосць ваенных гадоў з поўнымі заламі, дзе воплескамі на прэм'ерах кіраваў міністр веравызнання Незалежнай дзяржавы Харватыі* Міле Будак, як і не было ў «Гамлеце» 1969 года ніводнага актора, які ведаў бы, чаму маэстра зусім не ў настроі, чаму на рэпе-

тыцыях не вымавіў ні слова, а адзінай рэжысёрскай заўвагай было: *Цішэй, цішэй, ты не на дэманстрацыі!*

Праблема паміж тэатральным рэжысёрам і дзяржавай вырашалася на шкоду публіцы, якая нічога не разумела – чаму ёй раптам так нудна на спектаклі чалавека, якога авацыямі праводзілі і ў Заграбе, і ў Бялградзе і які насіў ганаровы тытул патрыярха югаслаўскага тэатра. Публіка не ведала таму, што ёй не было дадзена, а не таму, што не хацела ведаць, што вялікі Віктар Барыла прыехаў у Сараева выпраўляць тое, што выправіць было немагчыма – сваю мінуласць, а разам з тым і мінуласць гэтага горада. Але найгорш было, што ў гэтай дарэмнай спробе ён быў не адзін.

У Сараева з Заграба і Бялграда пераважна і прыязджалі каяцца ў грахах. Некаторыя, іх было меней, былі пакараныя за поўную адсутнасць таленту і, выпхнутыя з тэатраў заходняй і ўсходняй метраполіі, ехалі ў Боснію, а іншыя, накшталт Барылы, найбуйнейшыя постаці югаслаўскіх мастацтваў, ехалі ў Сараева выкупляць грахі, якія назбіраліся за часоў Антэ Павеліча*, Мілана Нэдзіча або Сталіна. Мала запомніцца такіх, хто выкупляў тыя грахі з усведамленнем уласнай творчай годнасці і рэпутацыі. Звычайна тут ставілі спектаклі наўслеп і гралі ў іх як перад пустым моргам ці мемарыяльнай усыпальняй, напоўненай страшнымі чарапамі закатаваных ахвяраў, а публіка заўсёды заставалася аднолькава збянтэжаная і ўсё больш упэўненая, што тая нуда выцякае з самой прыроды гэтага горада, а не з адмысловых матываў тых, хто ў яго прыехаў.

Але не будзем занадта строгія да Віктара Барылы! У адрозненне ад іншых ён прыехаў у Сараева не таму, што зазнаў нейкую ганьбу ў Заграбе ці Бялградзе. У гэтых гарадах ён быў шанаваны, ягоным імем называлі авангардныя тэатральныя стылі, ён выкладаў у мастацкіх акадэміях і быў аб'ектам найглыбейшых інтэлектуальных уздыханняў, а людзі з камітэта кланяліся яму да самай зямлі. Аднак пад старасць ён вырашыў выправіць непаразуменне з горадам, у які і не мусіў прыязджаць, бо акрамя дзвюх пастановак з часоў НДХ яго з Сараевам нічога не звязвала. Ён хацеў, перш чым памрэ, памірыцца і з гэтым горадам, што, мабыць, заслугоўвала нейкай пашаны. Як бы дарэмна гэта ні было.

Дыяна і Габрыел драмалі свае тры з паловай гадзіны, дакранаючыся адно да аднаго пад рытм доўгіх прынцавых маналогаў. *О, глядзі, галава Піры Тролы*, локцем штурхнуў ён Дыяну падчас Гамлетавай размовы з чэрапам. *Чыя галава?* яна не зразумела, што́ ён паказвае. *Піры Тролы, гарадскога прыдурка. У яго нікога не было, дык калі ён памёр, яго не закапалі, а парэзалі на патрэбы медыцынскага факультэта. Тэатр пад распіску пазычыў галаву. Я прапаноўваў уставіць імя Піры Тролы ў афішу ў спіс акцёраў, але мяне не паслухалі. Не ведаю чаму, бо ягоная галава на сцэне даўжэй, чым галовы тых, чые імёны стаяць у афішы.*

Дыяна да канца сцэны глядзела, вылупіўшы вочы, на той чэрап, які выглядаў як і любы іншы чэрап, але дзеля таго, што ён меў імя і прозвішча, быў страшнейшы за больш-менш прыстойнага выгляду ананімны труп у стане распаду. Ёй рабілася млосна ад думкі, што некалі гэта быў жывы чалавек, Габрыел яго ведаў і вось цяпер радуецца, што бачыць на сцэне, і яму нават у галаву не прыйдзе, што ён мае такі самы чэрап, з якога заўтра нехта можа садраць скуру і назваць тэатральным рэквізітам. *Вы і праўда ненармальныя*, сказала яна і пайшла ў прыбіральню. У цемры яна спатыкнулася аб ногі прыведзеных на прэм'еру гімназістаў.

У той вечар яны ўпершыню пасварыліся. Папраўдзе, Дыяна ніколі раней ні з кім, апроч маці, так сур'ёзна і рашуча не сварылася. Яна сказала яму, што і падумаць не магла, што існуюць такія адсталыя людзі.

Вось як бы табе было, калі б ты ведаў, што тваю галаву занясуць у тэатр?.. Ды похуй было б, вось як было б… А ты можаш хоць адну фразу сказаць без хуя і пізды?.. А ты можаш заткнуцца, або хочаш я табе ўляплю поўху так, каб ты пачула Пятую сімфонію!.. Габрыел!.. Што, дарагая? Ну? Што? крычаў ён ёй проста ў твар і махаў ручышчамі.

Я цябе не баюся, казала яна цішэй, *ты памыляешся, калі думаеш, што я цябе баюся. Толькі баязліўцы так крычаць. Ты баязлівец. Абасраўся ад страху, што я прыехала. Ну так, Габрыел, абасраўся ж? А нашто ты мяне клікаў! Бо прыгожа гучала, праўда? Хацеў паказацца фраерам, але на адлегласці. Сцыкун ты. Вось ты хто.*

Яна правакавала яго так, як бы гэта быў канец. Яна хацела зрабіць усё, каб толькі больш не чуць, як ёй зноў нехта скажа, што яе не варты. Але замест таго, каб канчаткова ашалець, Габрыел спыніўся, нешта прамямліў і расплакаўся як актор у дрэнным індыйскім фільме перад тым, як дзявочы хор заспявае оду Брахмапутры. І якая б яна ні была раз'юшаная і гатовая выбегчы з дому без дынара ў кішэні і без ніякага прытулку, Дыяна не ведала, што рабіць. Яна стаяла пасярод пакоя, сціснуўшы кулакі і шырока расставіўшы ногі, і дыхала цяжка, як бык, ад якога з арэны ўцёк тарэадор.

Такія сваркі паўтараліся як найменей раз на тыдзень з дробнымі варыяцыямі ў абра́зах і ў змесце, заўсёды вакол нейкай тэмы, якая адначасна датычыла і Габрыела, і горада, у якім яна апынулася. Дыяне здавалася, што ўсё дрэннае і брыдкае, з чым яна сутыкнулася ў Сараеве, жыве ў ягонай асобе, быццам ён заражаны ўсімі хваробамі, якія толькі можна падчапіць на гарадскіх вуліцах. Яна злавала, бо ён падмануў яе, завабіў прыгожымі словамі і шармам, які захоўваўся, толькі пакуль яна не перасялілася ў ягоны свет, а потым знік, як азёрная імгла сонечным ранкам. Яна нападала на Габрыела і выганяла з яго Сараева, бо яшчэ не была гатовая выгнаць з Сараева сябе.

Звычайна сваркі канчаліся тым, што ён пачынаў плакаць ці выбягаў з дому, пакідаючы яе на ўсю ноч адну, каб яна набіралася страху сярод пакояў, заваленых мэбляў і скручанымі дыванамі, кучамі нямецкіх кніг і даваенных газет, усімі тымі парэшткамі жыцця, якія, як і чэрап Піры Тролы, былі так непрыстойна выстаўленыя на агульны агляд.

Пра жыццё гэтага дома і пра Габрыелавага дзядзьку Бруна Экерта і цётку Фаніку яна даведалася зусім мала, гэта была адна з рэдкіх тэмаў – фактычна адзіная, – якія Габрыел не абгаворваў ва ўсіх дэталях, а неяк выкручваўся і пераскокваў на гісторыі, якія, на Дыяніну думку, часцяком бывалі і болей балючыя і страшнейшыя за дзядзькаву.

Карацей кажучы, яна ведала, што ў 1945 годзе Бруна Экерта асудзілі на смерць за супрацоўніцтва з акупантамі – якое канкрэтна, Габрыел не хацеў казаць, але смяротнае пакаранне было замене-

нае на дваццаць гадоў турмы з канфіскацыяй усёй маёмасці, якую праз нейкую адміністрацыйную памылку так ніколі й не правялі, і не адмянілі, так што дом і належаў і не належаў Габрыелу. Цётка Фаніка праз пяць гадоў чакання скончыла самагубствам, выпіўшы эсенцыі, і ад 1951 года да таго моманту, калі шэсць гадоў назад у гэты дом пасяліўся Габрыел, ніхто ў ім не жыў і нават у яго не заходзіў. Бруна Экерт павесіўся ў зэніцкай турме дваццаць восьмага траўня 1966 года, за два дні да таго, як яго меліся выпусціць на свабоду.

Гэта ўсё, што яна здолела выцягнуць з Габрыела. Пра астатняе ён маўчаў і чырванеў, быццам няўмела спрабуе схаваць нейкую невылечную сямейную хваробу. Пакідаючы яе сярод ночы адну ў мёртвым доме дваіх самагубцаў, Габрыел караў Дыяну самай страшнаю карай.

Калі яны не сварыліся і не былі дома, то ўвесь час – апроч гулянак у Гогі і Мусы, якія звычайна зацягваліся на ўсю ноч пад музыку Джэніс Джоплін і Боба Дылана і пад афганскі гашыш – Габрыел і Дыяна бавілі ў Нацыянальным тэатры. За чатыры з паловай месяцы яны па некалькі разоў перагледзелі ўсе драмы, оперы і балеты. «Падазроную асобу» Браніслава Нушыча нават сем разоў. Пазбягалі толькі Барылавага «Гамлета», які тым часам давалі два разы на тыдзень, хоць публікі бывала ўсё меней пасля таго, як там пабывалі адна за адной усе поўныя і няпоўныя сярэднія школы і школьныя экскурсіі з Тузлы і Зэніцы, якія паводле дырэктывы рэспубліканскага сакратара па навуцы, асвеце і культуры мусілі наведаць менавіта гэты спектакль. Калі Габрыел пачаў замест хворага Чэрнага граць другога вестуна, Дыяна заставалася чакаць яго ў Тэатральнай кавярні.

Паходы ў тэатр былі і для яе, і для яго найлепшым спосабам прабавіць вечар. Дыяна не мусіла хадзіць ад адной сараеўскай кавярні да другой і ад кожнага, хто заўважыць, што яна не мясцовая, чуць, што чалавек нідзе на свеце не пагуляе так, як у Сараеве, бо нідзе няма такіх людзей, а Габрыел не мусіў калаціцца ў страху ад яе позіркаў і заўвагаў, пад якімі абрынаўся ягоны горад.

Апрача таго, кожны раз, як ён некуды з ёй выпраўляўся, здаралася розная дурата, якой яму ніколі раней не даводзілася пражыць.

Або на вачах у Дыяны людзі ні з пушчы ні з поля парэжуцца нажамі, або афіцыянт у «Морыч хане» спатыкнецца аб парог і менавіта Дыяне выліе на галаву талерку бэгавай чорбы*, або станецца так, што да іх, як у легендзе, якую пераказвалі ўсе, але якую сам ніхто ў жыцці не пражыў, пасярод Башчаршыі падыдзе астрыжаны дагала бугай і намовіць Габрыела за пяць соцень купіць цагліну. З кожным новым днём рэчаіснасць пацвярджала Дыяніны нованабытыя забабоны, і не было іншага выйсця, як схавацца ў тэатры.

Калі б Сараева было такім горадам, якім яна яго бачыць і якім ён кожны дзень з ёй здараецца, тут ніхто б не жыў, думаў Габрыел, змірыўшыся з фактам, што ў свеце няма месца, якое ён мог бы раздзяліць з Дыянай і якое ставілася б да іх аднолькава.

А тады здарылася тая няшчасная пятніца і прэм'ера оперы «Нікола Шубіч Зрынскі»*. Хто ведае, каму і чаму стрэліла ў галаву паставіць у Сараеве, гэтым бастыёне «брацтва-адзінства» і камуністычнай прававернасці, харвацкую нацыянальную оперу, у якой галоўны герой гіне ў гераічнай барацьбе супраць туркаў, але па горадзе ішла пагалоска, што гэта робіцца на дырэктыву найвышэйшага партыйнага кіраўніцтва ў рамках шырэйшай акцыі заваявання сімпатыі народных масаў у заходняй Герцагавіне, якая больш за дваццаць гадоў жыла пад своеасаблівым паліцэйскім наглядам з кляймом масавага супрацоўніцтва з усташамі ў часе Другой сусветнай вайны. Не могуць дзеці быць вінаватыя за тое, што рабілі бацькі і дзяды, гучаў найнавейшы партыйны лозунг, але таксама казалі, што тады гэтую оперу трэба было б ставіць у Лішціцы або ў Любушку, бо якое дачыненне да ўсташаў мае Сараева і чаму крыўду мусіць выпраўляць гісторыя пра нейкага харвацкага магната, які біўся з туркамі.

Не тое каб сараеўцы неяк асабліва сумавалі па Атаманскай імперыі і султанавых часах, пра іх ужо ніхто не памятаў, але празмернае цкаванне і абражанне туркаў людзям ніколі не падабалася, яны інстынктыўна адчувалі, што ўсе тыя народныя песні і казкі, у якіх Ёва і Іва гінуць ад рук нейкага Сулеймана, неяк ускосна датычаць і кожнага баснійца, які носіць турэцкае імя. Прынамсі ён не мае права на свае гераічныя легенды, бо не змагаўся супраць асманскага ярма, пра якое ў школе вучаць, што яно цягнулася пяць стагоддзяў,

хоць каляндар кажа, што гаворка ідзе пра чатырыста гадоў, гэта да сёння можа і мінула пяць стагоддзяў ад прыходу туркаў у Боснію, а колькі часу іх тут ужо няма! Столькі, што толькі брук памятае, як па ім некалі ступала турэцкая нага. Вунь на могілках пасярод горада адчынілі публічную прыбіральню, каб народ ведаў, што і мёртвыя не маюць між сабою роўнасці. Ніколі не будзе смярдзець на каталіцкіх і праваслаўных могілках, хоць на іх ляжаць людзі, якія памерлі ў адзін час з тымі, хто цяпер купаецца ў гаўне.

Мяшчане на рынку ціха наракалі, мусульманскія крамнікі, якія доўга маўчалі, пачалі асцярожна выбіраць словы, гаворачы з каталіцкімі і праваслаўнымі суседзямі, бо адчувалі, што опера – справа сур'ёзная, за якую можна і галаву страціць, і на катаргу трапіць, хоць ні адны, ні другія, ні трэція ніколі ў жыцці не пераступалі парога Нацыянальнага тэатра.

Але крамнікі-каталікі, якіх было мала – траплялiся часам сярод гадзіншчыкаў, шаўцоў і краўцоў, – дальбог рыхтаваліся ўпершыню пайсці ў оперу. І не хавалі гэтага, а з парогаў крамак дамаўляліся, што вось ужо заўтра збіраюцца купіць білеты на прэм'еру.

Пакеплівалі або думалі сур'ёзна, ніхто не ведаў дый не пытаўся, бо лепш маўчаць пра такія рэчы, калі й сам не хочаш, каб у цябе пра іх пыталіся. Але цалкам магчыма, што нехта з іх напраўду купіў білеты і выправіўся ў той вечар на оперу Івана Зайца «Нікола Шубіч Зрынскі».

Ужо каля паловы сёмай перад Нацыянальным тэатрам сабраўся вялікі натоўп. Наколькі адны выглядалі сапраўды як наведнікі оперы – высокія дзядкі з вусамі чыгуначнікаў пад руку з сівымі бабулькамі, якія толькі што дасталі галаву з-пад цырульніцкіх сушылак, і іх фрызуры сінелі ад фарбы «Эхатон», як успененая марская хваля, нагэтулькі большасць прысутных не надта і выглядалі на тое, што ідуць у тэатр.

Галавастыя тыпы з гузаватымі лбамі хмурыліся, як адмоўныя героі партызанскіх фільмаў, і ўвесь час прачэсвалі позіркам натоўп, нібыта ў іх замест вачэй былі камеры і цяпер якраз здымаўся нейкі фільм. Наехала і студэнтаў з правінцыі ў залатаных цёмна-сініх і чорных гарнітурах, якія ў Какні і Добаі купляюць раз у жыцці і на-

дзяваюць на пахаванні і вяселлі. Яны трымаліся разам некалькімі групамі і кідалі ў бок гузаватых галоваў позіркі поўныя задзірлівай упартасці. Можна было пабачыць тут і бядоту з Сараеўскага Поля і Ступа ў абляпаных граззю галёшах, і іліяшскіх малочніц, і пару старых жанчын у задрыпаных і завэдзганых касцюмчыках, з перамазанымі касметыкай тварамі і з капелюшамі на галаве. У адной на шыі быў велікаваты срэбны крыж, час ад часу ён хаваўся пад блузку, і яна кожны раз рупатліва яго даставала.

Атмасфера, прынамсі з перспектывы нетутэйшага чалавека, была як у нейкім фільме Дэ Сіка, але кожны, хто тут нарадзіўся ці меў пра гэты горад нейкае ўяўленне, ведаў, што гэта месца, ад якога варта трымацца чым далей. А менавіта, адчувалася нейкая небяспека, знаёмая табе, нават калі ты ніколі ў жыцці яе не зведаў і не маеш уяўлення, што яна з сабою нясе. А бальшыня сабранага натоўпу не мела досведу такой небяспекі, бо пакуль нешта такое здарыцца, пройдзе і дзесяць, і пятнаццаць, і дваццаць гадоў. Хоць старэйшыя людзі – і на рынку, і ў горадзе – добра ведалі, што такіх рэчаў заўсёды можна чакаць, як землятрусу, пажараў ці вялікага снегу. Іх немагчыма пазбегнуць, але варта быць ад іх чым далей, бо ясна, што будуць пацярпелыя, што знойдуцца дурныя галовы і яшчэ дурнейшыя сэрцы, распусцяцца языкі і рукі і здарыцца тое, што яшчэ гадамі будзе трымаць горад у страху і ўпэўненасці, што няма на свеце мярзоцця горшага за нас, бо мы спакойнае жыццё цэнім менш, чым пяць хвілін шаленства.

І тады, вядома ж, здарылася тое, што можна было прадбачыць і пра што мусіў ведаць той, хто вырашыў, што опера «Нікола Шубіч Зрынскі» будзе пастаўлена ў Сараеве. Купка студэнтаў, чалавек сем ці можа восем, сталі колам, абняліся і голасна заспявалі арыю «У бой, у бой!» Яны ўклалі ў галасы ўсю сваю моц, дый былі не без слыху, толькі што ў Зайцаву рамантычна-патрыятычную песню яны ўклалі нейкую сваю ноту, у якой чулася горнае водгулле Ўлашыча, Звезды і Ўраніцы*, выццё ваўкоў і крык чалавека, які недзе на другім канцы гары падае ў прорву. У іхніх галасах не чулася сэўдалійскай тугі сараеўскіх вуліц*, у іх было нешта мацнейшае, цвярдзейшае і больш небяспечнае. Адчай гор і нядоля сёлаў, з якіх яны прыйшлі:

сёлаў, што выразаліся або самі выразалі. А хутчэй за ўсё і адно і другое! Разня ў нас заўсёды прабачаецца, але не забываецца. І кожнае прабачэнне мае дакладна пазначаны тэрмін дзейнасці. Некаму прабачаецца на дзесяць, некаму на пяцьдзясят і на сто гадоў, але ніхто не памятае, каб нешта, хоць бы адно злачынства, сапраўднае або выдуманае, было прабачана на ўсе часы.

Калі б нейкі спецыяліст у тым 1969 годзе мог сапраўды пачуць, як гэтыя дзеці гор перад Нацыянальным тэатрам у Сараеве спяваюць «У бой, у бой!», ён сказаў бы, што гэтая Зайцава арыя ніколі не гучала прыгажэй. Замест правінцыйнай імітацыі еўрапейскага ўзору дзевятнаццатага стагоддзя пачуўся народны голас. Першабытны балканскі фальклор, які заслужыў свайго Бэлу Бартака, але не дачакаўся яго. Але хто б слухаў студэнтаў, якія вырашылі загінуць, і пры гэтым займаўся б музыказнаўчымі развагамі. Праз некалькі секундаў натоўп пачаў адступацца ад кола спевакоў, і неўзабаве за пяцьдзясят метраў вакол іх нікога ўжо не было, і тады, калі ўсё было чыста, гузагаловыя пахмурныя тыпы, іх было з тры дзясяткі, рушылі на спевакоў, абступілі іх і проста праглынулі.

Людзі прысягалі, што нават не бачылі, як і куды іх адвялі, і ім можна верыць, бо яны наўмысна стараліся нічога не бачыць, але ўжо праз два дні ў бялградскай газеце «Вячэрнія навіны» выйшаў артыкул пра «нацыяналістычны інцыдэнт перад Нацыянальным тэатрам у Сараеве». Але народу газета была непатрэбная, бо ўсе ўжо ўсё ведалі. Сама прэм'ера прайшла без эксцэсаў, воплескі працягваліся акурат столькі, каб ні ў кога не выклікаць падазрэння.

Падчас інцыдэнту Габрыел рыхтаваў сцэну, а Дыяна ў тэатральным буфеце размаўляла з Катарынай Кацар, маладой і перспектыўнай балерынай, якой яна часам скардзілася на свае сараеўскія нягоды і знаходзіла ў яе разуменне, бо і для Каты – праўда, з нейкіх іншых прычын, пра якія ў прыстойнай кампаніі не гавораць, – гэта быў не наймілейшы горад на свеце. Ніхто з іх траіх аж да канца паказу не меў уяўлення пра тое, што адбывалася перад тэатрам.

Назаўтра а дзявятай гадзіне раніцы перад Габрыелавым домам спыніўся чорны «сітраэн», з яго выйшлі двое інспектараў у цывільным і адвялі яго на інфармацыйную размову ў Службу

дзяржаўнай бяспекі. А менавіта ў будынак тайнай паліцыі, якая займалася выпадкамі контррэвалюцыйнай і варожай дзейнасці. Дыяна хацела пайсці з ім. *Грамадзянка, вас ніхто не запрашаў, калі вас запросяць, прыйдзем і па вас!* сказаў, як адрэзаў, мажны бялявы тып.

Яна засталася дома і чакала, пакуль зусім не страціла цярплівасць і не пайшла шукаць некага, з кім можна было б прабавіць час, пакуль Габрыел не вернецца. Яна пазваніла Гозе і Мусу, але яны не адказвалі, і яна пайшла да Катарыны і расказала ёй, што адбылося. Кату гэта зусім не здзівіла, быццам яна і чакала, што тут пачнуць адбывацца такія рэчы, і яна пайшла з Дыянай, каб разам чакаць Габрыела дома.

Не маю ўяўлення, што было перад тэатрам, сказаў ён інспектару Еру Відошавічу, чорнаму прылізанаму тыпу са сталінскімі вусамі, перш чым той паспеў пра нешта спытацца. *Адкуль ты ведаеш, што мы цябе дзеля гэтага выклікалі?* паглядзеў той спадылба, адначасна нешта запісваючы. *Не ведаю, але так думаю. А дзеля чаго ж яшчэ?* сказаў Габрыел. Ён усё яшчэ асабліва не хваляваўся. *Каб пагаварыць, як грамадзяне гавораць са службамі. Сумленныя грамадзяне. Тыя, каму няма чаго хаваць. Ці не так? Нашто прыстойнаму чалавеку хвалявацца, калі мы выклікаем? Гэта тое самае, калі б я хваляваўся, што калі я прыйду ў тэатр, мяне заб'юць з гэтага, як ён завецца, фальшывага пісталета. Дык вось, каток, пісталет можа быць і сапраўдны. Гэта ведаем і ты, і я*, манерыўся Ера, нібы граў Давіда Штрбца* з старой камедыі Кочыча.

Які пісталет? Не даганяю, разгубіўся Габрыел. *Не разумею. Трэба казаць – не разумею. У тэатры працуеш, а гаворыш як нейкі лайдак. Глядзі, каб не пачуў таварыш Барыла. Ці ён пан Барыла? Скажы мне, Барыла – таварыш або пан? Каб я ведаў, як мне яго называць, калі ён зойдзе да мяне на каву. Ведаем, што ён цябе ўзяў акторам. Другі вястун, га? І менавіта цябе! Маўляў, сталяр, але таленавіты! Ну вядома, на акторскіх факультэтах не ведаюць, што робяць, але славуты рэжысёр ведае, так?*

Габрыел падумаў, што яго прывялі сюды, каб распытаць, чаму Барыла ўзяў яго ў спектакль, і гэта яго раззлавала: *Я і не прасіў, каб ён мяне ўзяў. Узяў, бо ніводзін актор не згадзіўся б на такую дробную*

ролю… Ну дык і я пра тое. І таму ўзяў цябе. Ведае чалавек, сказаў Ера ранейшым тонам. *Дык чаму вы яго не выклікалі і не спыталіся?.. Ах ты яшчэ будзеш мяшацца ў маю працу? Ведаеш, я не раіў бы, бо як толькі нехта пачынае мяшацца ў маю працу, у мяне пачынае торгацца вось гэты бок твару. Ведаеш, я ў сорак дзявятым атрымаў сюды ўсташскую кулю, калі ганяў бандытаў па Герцагавіне. Ніякіх сур'ёзных наступстваў не засталося, акрамя таго, што я вар'яцею, калі нехта мяшаецца мне ў працу ці калі не дай божа пачынае выраблящца на вось гэтым крэсле. Тады, дарагі ты мой і паважаны Габрыеле, я бываю сярдзіты. А калі я сярдзіты, тады магу вось гэтымі рукамі ўзяць тваю галаву і трошкі ўдарыць ёю аб гэтую касу. Чыста каб супакоіцца. Азірніся і паглядзі на яе, яна ў цябе за спінай. Ану азірніся, калі табе загадваюць, і паглядзі на касу! Дык вось, і тады я луплю тваёй галавою аб касу, пакуль не ачомаюся і пакуль не пройдзе тое маё наступства. Але бывае, што гэта доўжыцца крыху болей, і тады, халера, усё залежыць ад таго, наколькі цвёрдая ў цябе галава. Калі крыху цвярдзейшая, застанешся жывы, але будзеш хадзіць як дурань і не ведаць, што ў тваёй галаве было да таго. А калі мякчэйшая, тады даруй Божа і дзяржаве, і партыі, і інспектару Еру Відашавічу! Твая галава, Габрыеле, наколькі нам вядома, не баснійская. Тваё імя Габрыел Экерт – я табе адразу магу сказаць – азначае, што галава ў цябе мяккая, так што лепш і не правяраць. Так жа ж? Бо Экерт – не баснійскае прозвішча. А швабскае. Пардон, нямецкае! Думаю, ты не абразіўся, праўда ж? Мы ведаем твайго бацьку Мію, трохі весялейшы чалавек, праўда? Але вось ты мне скажы, ці ў твайго старога не было нейкага брата?*

Пачуўшы гэтае пытанне, Габрыел замяўся, запнуўся, і за адно імгненне з невінаватага чалавека, які апынуўся тут праз памылку, ператварыўся ў злачынца, які хавае сваё злачынства. Няважна, што́ ён учыніў і ці наагул нешта ўчыніў, дзеля чаго мусіў бы баяцца міліцыі. Віна выкрываецца не ў бязвіннага, а ў вінаватага, і тое пасля таго, як яго такім абвясцілі і як ён пачаў сябе такім адчуваць. Як толькі адчуеш сябе вінаватым, адразу пачынаеш і паводзіць сябе як вінаваты. І таму няма лепшай міліцыі, чым камуністычная, бо з ёю ніколі не здараецца так, каб яна праз уваходныя дзверы прывяла

бязвіннага чалавека. Вінаватыя ўсе, толькі што адных пакараюць, а іншым будзе прабачана. А з гэтага месца ўжо лёгка каго заўгодна паслаць за краты, бо няма такога чалавека, які хоць аднойчы не сказаў бы нешта такое, за што можна атрымаць пяць гадоў турмы. А калі б і знайшоўся такі праведнік, дык і ён напэўна чуў, як нехта нешта такое сказаў, і не данёс на яго.

Ну што? Язык праглынуў? Эх, чаго мне толькі не даводзіцца бачыць на гэтай працы! Увойдзе чалавек у кабінет, цэлы, здаровы, нармальны, а яшчэ і актор. Прыстойна павітаецца, спытае пра здароўе, бачыш – чалавек сам сябе паважае. Дый ёсць за што паважаць. Не жарты – нават калі шэпчаш на сцэне, дык аж у задніх радах чуваць. А тады раптам – нібы ў яго гром ляснуў. Ты, можа, хворы? Можа, табе вады з цукрам прынесці? Не хочаш? Дык тады якога, так сказаць, хуя ты маўчыш?

Габрыел глыбока ўздыхнуў і загаварыў, не чакаючы пакуль Ера пракаментуе і гэты ўздых: *Так, быў у мяне дзядзька. Памёр у турме. Я яго ніколі не бачыў… І не сорамна! Нават ніколі не наведаў! Калі ён і быў вінаваты перад дзяржавай і народам, нават калі краў і забіваў – як жа гэта, каб яго родная сям'я адраклася*, працягваў інспектар.

Ён не забіваў! абурыўся Габрыел. Ера раптам зрабіўся сур'ёзны і хмуры, з левага боку лба нечакана з'явілася ямка, пад скурай не хапала кавалка косці, і было відаць, як пульсуюць мазгі. Ён нахіліўся праз стол, амаль твар у твар з Габрыелам, нібы хацеў накінуцца на яго або ляснуць яго па твары: *А як жа ты, паночку, ведаеш, што Бруна Экерт не забіваў? Зараз ты мне ўсё па парадку выкладзеш, хто табе гэта сказаў, каб мы яго трошкі распыталі пра здароўе… Ніхто мне не сказаў,* прашаптаў Габрыел.

У яго дрыжалі калені і торгаліся ўсе мускулы на твары. Ён чакаў удару і хацеў, каб гэта адбылося чым раней, каб Ера Відошавіч зраўняў яго з зямлёй і каб сталася так, як мае стацца, толькі каб усё чым хутчэй скончылася.

Ага! Дык скажы мне так, каб я зразумеў! Каб не думаў сам сабе, што гэты чалавек тут вярзе, ці мне ўжо вароны мазгі выдзеўблі, ці ён поўны ідыёт. Дык сказаў бы мне адразу, што ўсташы не рэзалі

і не забівалі, не было Ясэнаўца, не засталося пасля іх больш за мільён забітых людзей. Людзей або сербаў з яўрэямі. О, пардон, перапрашаю, пардон! Вы ж кажаце – жыдамі, ці не так? Жыдамі! Жыдам і сабакам уваход забаронены! Так жа ж кажуць, фюрэр ты сабачы, або мы і гэта самі выдумалі? Ну, сука, ці так кажуць?* зароў Ера Відошавіч, і Габрыел скурчыўся, як мог, утаропіўшы позірк у востры край чорнага канцылярскага стала.

Ён ліхаманкава думаў, што цяпер трэба зрабіць. Прамаўчаць або нешта сказаць? Калі прамаўчаць, то гэты затаўчэ яго да смерці за тое, што правакуе, а калі сказаць, што заўсёды кажа яўрэі, а не жыды, то пры чым тут што з чым, дык і будзе выглядаць, што ён сапраўды выбрабляецца.

Але ў той момант у кабінет уляцеў немалады тоўсты чалавечак у шэрым гарнітуры: *Што тут такое, Ера, што здарылася, хадзі сюды, давай, давай, адпачні трошкі, давай, Фазіла прынесла чавапы*…*

І перш чым Габрыел паспеў падняць галаву, малы таўстун ужо сядзеў на Відошавічавым месцы, а Ера знік з кабінета.

Не звяртай увагі, чалавеча, ён ненармальны. Яшчэ каго заб'е калінебудзь. Я яму кажу, Ера, чалавеча, ідзі ты на пенсію, адпачывай, даглядай свой пчальнік, не для цябе гэтая праца. Дурань, у яго стажу больш, чым гадоў жыцця. Калі залічыць партызанку і тое, што дзесяць гадоў ганяў усташаў па Герцагавіне. А ён не хоча на пенсію! Ты мне лепш скажы, хлопча, ці ты ўчора што бачыў перад тэатрам, і мы за дзесяць хвілін усё скончым. Ух, курва, які ж я некультурны чалавек, я ж нават не прадставіўся, а трэба і па службовых правілах, і па людскіх звычаях. Марцін Барняк, інспектар устаў і працягнуў яму руку. Рука была маленькая, амаль дзіцячая, уся нейкая круглая, з заручальным пярсцёнкам, надзетым вельмі даўно, калі палец быў танчэйшы. Габрыел прыняў гэтую руку як найвялікшы дар, які ён толькі мог атрымаць.

Нічога я не бачыў. Я рыхтаваў дэкарацыі. У тэатр увайшоў а чацвёртай гадзіне, калі перад тэатрам нікога не было… Цудоўна. Мы і самі гэта ведалі, але такая ў нас працэдура. Мусіш узяць паказанні, хоць і табе, і таму, у каго пытаешся, ясна, што гэта глупства. Але

ж, халера, такое службовае правіла. А ці табе пасля нехта казаў, штó тыя хлопцы перад тэатрам спявалі? Я проста так пытаюся, чыста з цікаўнасці… Песню «У бой, у бой». З оперы… Ведаю, ведаю, глядзеў я «Зрынскага», калі быў у Заграбе. Схаджу паглядзець і тут, пабачым, чый «Зрынскі» лепшы, наш ці заграбскі. Ага, значыць, моладзь спявала, каб паспрабаваць галасы. А як ты думаеш, проста як чалавек, чаму яны спявалі менавіта гэтую песню, а не нейкую іншую – спытаўся Барняк, які і дзеля дурнаватай усмешкі, якая не сыходзіла ў яго з твару, і дзеля таго, як ён задаваў пытанні, нагадваў Габрыелу нейкага нуднага дзядзьку, які ў тваім дзяцінстве раз на год, звычайна на дзень народзінаў, прыязджае ў госці, дорыць табе пластмасавы паравозік і не пакідае цябе ў спакоі, пакуль не пойдзе. Садзіць цябе на калені, шчыпае за шчокі, пытаецца, каго ты больш любіш – яго ці тату, і ці ёсць у цябе сяброўка.

Факт не ведаю, чаму спявалі менавіта «У бой, у бой», адказаў Габрыел.

Ну так, што ж я пытаюся такія глупствы. Адкуль жа табе ведаць! Барняк разгублена пачухаў плех.

А як бы ты пракаментаваў тую песню, калі б быў перад тэатрам?.. Як? Ніяк, што тут каментаваць. Людзі спяваюць тое, што прыйшлі пачуць у оперы. Думаю, што гэта нармальна, сказаў Габрыел, і яму прыгадалася Дыяна і тое, што яна засталася дома адна і што напэўна шалее, што яго няма, ці шнарыць па пакоях, у якія нельга заходзіць.

Нармальна, н-а-р-м-а-л-ь-н-а! вымавіў Барняк, нібы запісваючы па літары. *Ладна, калі табе нармальна, дык і мне таксама*, і выйшаў з кабінета.

Паўгадзіны Габрыел сядзеў на сваім месцы і не варушыўся, каб зноў нешта не сапсаваць, пакуль не вернецца інспектар Ера. Але замест яго з'явіўся нейкі тып у форме. Габрыел ускочыў. *Павярнуцца і рукі за спіну!* рыкнуў міліцыянт.

Праз тры хвіліны Габрыел ужо быў у пакоі без вокнаў, між сценаў, пафарбаваных тлустай зялёнай фарбай, з кайданкамі, якія яму не здымуць з рук аж да заўтра, калі ў непрацоўную нядзелю паставяць перад судом за дробныя правапарушэнні і асудзяць на

шэсцьдзесят сутак турмы за тое, што падтрымліваў спяванне песень нацыяналістычнага зместу перад Нацыянальным тэатрам у Сараеве і выказваў шкадаванне, што сам не мог далучыцца да спевакоў.

Так Габрыел пацярпеў праз «Зрынскага», і яшчэ якраз у той год, калі ён першы раз пашкадаваў, што нарадзіўся ў гэтай задрыпоніі, а не ў Амерыцы, адкуль і да Сараева ўжо данесліся першыя чуткі пра фестываль на прыватнай ферме нейкага Макса Ясгура ў мясцовасці, што звалася Вудсток, дзе цэлае пакаленне заваявала права адмовіцца ад навязанай яму бацькамі гісторыі, дзяржавы, сцяга, закону і ўсяго таго, з чым далей было немагчыма жыць. І Габрыел на нейкі момант паверыў, што яго абароніць той Вудсток, ужо толькі таму, што ён пра яго чуў і што ў Гогі і Мусы напіваўся пад песні, якія там спяваліся. А з арыяй «У бой, у бой» яны мелі агульнага ніяк не больш, чым ён са сваім дзядзькам Брунам.

Ягоная надзея згасла так, як гаснуць усе надзеі і спадзяванні на тое, што ты можаш існаваць па-за светам і людзьмі і што міма цябе пройдуць усе нягоды, якія распачаліся яшчэ да таго, як ты нарадзіўся, і да таго, як нехта ці нешта, апроч тых нягодаў, спадзяваліся, што ты некалі з'явішся на свет. Пакуль Габрыел тырчаў у зялёнай камеры, усе ягоныя праблемы звяліся да адной. Дакладней да дзвюх: пасцаць і пасраць. Адна і другая сіла схапілі яго так, што пра астатнія ён перастаў і думаць.

Дыяна правяла ноч у кампаніі з Катарынай Кацар, не здолеўшы прамовіць і трох словаў або падумаць пра сябе з Габрыелам. Ката расказала ёй усё сваё жыццё, поўнае мёртвых цётак і сурокаў, якія нейкі галіцыйскі ксёндз дзвесце гадоў таму наслаў на род Кацараў і праз якія кожны мужчынскі прадстаўнік роду кахаў мужчын. З часам сурокі паглыбіліся, і жанчыны ў Кацараў пачалі кахаць жанчын. Ад гэтага праклятцця пакутавалі яе прадзед, дзед і бацька і ўсе пяць бацькавых сёстраў, якія адна за адной пазабіваліся ў Вене дзеля нейкіх акторак і балерынак. Раз на два гады нейкая з іх совала галаву ў духоўку і пускала газ, і даводзілася ехаць з Сараева на пахаванне.

Пра тое, ці пашыралася галіцыйскае праклятцце і на яе, Ката не сказала нічога. Але Дыяна асцярожна адхілялася кожны раз, як тая, распаленая апавяданнем, хапала яе за руку. Дыяна смяяла-

ся і плакала над неверагоднымі споведзямі сараеўскай балерыны, у якіх пэўна ж былі і выдумкі, і нейкая дзіўнаватая безразважнасць, якія прымушалі дзяўчыну няспынна гаварыць так, што словы ў яе абганялі думкі і яна пералятала з аднаго часу ў нейкі іншы і ўжо не ведала, ні дзе яна, ні ад чыёй асобы гаворыць.

Часам яна на момант спынялася, глядзела ў столь, нібыта спалоханая, што тая зараз абрынецца, і замест каб працягнуць нясканчаную гісторыю, пачынала нейкую новую. Пра маскоўскую балетную школу і пра тое, як у яе ў васямнаццаць гадоў прапала менструацыя, але гэта яе не хвалюе, бо яна ведае, што менструацыя вернецца, калі яна аднойчы зломіць нагу, у тым самым месяцы, калі скончыцца яе танцавальная кар'ера. Коні і балерыны ломяць ногі толькі адзін раз, з той розніцай, што каня прыстрэльваюць, а балерыне даюць пенсійку, каб было з чым дажыць маладосць. Ката ведае, што зломіць нагу, не раз яна сніла той самы сон і дакладна ведае, дзе гэта здарыцца. Але не ведае калі. А гэта і не так важна: што згубіш на мосціку, знойдзеш на кладачцы. Белую лебедзь заменіць менструацыя.

Пад шостую гадзіну яна ўклала яе ў ложак пад распяццем, і Ката заснула на паўслове. Дыяна вярнулася ў гасцёўню, легла на тапчан, трошкі паглядзела на агонь, які палаў у старасвецкай печцы, пакуль у яе не заплюшчыліся вочы. А восьмай перад домам спыніўся міліцэйскі аўтамабіль, і той самы міліцыянт, які забраў Габрыела, прабудзіў Дыяну званком і ўручыў ёй выклік на інфармацыйную размову ў Службе дзяржаўнай бяспекі, куды яна мусіла прыйсці ў панядзелак а дзясятай. Яна спыталася ў яго, дзе яе хлопец, ён адказаў, што не ведае, але ўпэўнены, што ў надзейным месцы.

Толькі днём пазней Дыяна даведалася, што Габрыел асуджаны на шэсцьдзесят сутак і ўтрымліваецца ў цэнтральнай турме, называнай Міляцка паводле маленькай гарадской рачулкі, у якую зліваецца ўся сараеўская каналізацыя, таму яна смярдзіць і ўзімку. У міліцыі Дыяне задавалі звычайныя пытанні пра чалавека, з якім яна жыла, дзе і як з ім пазнаёмілася, ці казаў ён ёй, што рабіў ягоны дзядзька за часоў Другой сусветнай вайны і што яна пра гэта думае. З кім яны сябруюць, з кім бачацца, пра што размаўляюць і якія гля-

дзяць фільмы. А калі інспектар спытаўся ў яе, калі яны першы раз кахаліся, яна адказала, што гэта яго не датычыць, на што той толькі ўсміхнуўся і перайшоў да іншай тэмы.

Заходзьце час ад часу, сказаў ён на развітанне, *асабліва, калі заўважыце нешта падазронае. Вы мусіце развіваць у сабе культуру бяспекі. Самі бачылі, да чаго даводзіць культура ў тэатры.*

Пабачыўшы Габрыела першы раз збітага і астрыжанага дагала, *я мусіў падпісаць паперу, што стрыгуся па сваёй волі, кажуць, што гэта дзеля вошай,* Дыяна ўмомант забылася пра тое, што адбывалася паміж імі ад таго дня, як яна ў яго пасялілася, і вырашыла, што будзе падтрымліваць свайго мужчыну, што б далей ні адбывалася, бо яму сказалі, што гэта не канец і што рыхтуецца крымінальнае абвінавачанне паводле артыкула 114 Крымінальнага кодэкса – за контррэвалюцыйную дзейнасць і парушэнне канстытуцыйнага ладу СФРЮ. Яна была гатовая на ўсё і наступныя два месяцы не вагалася ніводнага імгнення, для яе не было нічога важнейшага за тое, каб яе Габрыел выйшаў на свабоду і каб яго сустрэў спакой і сямейная згода.

Той час, хоць і было цяжка і хоць тыя нешматлікія людзі, якіх яна ведала, уключна з Гогай і Мусам, паказалі сябе з найгоршага боку, быў часам найвялікшага Дыянінага кахання ў жыцці. Найвялікшага аж да трагічна позняга з'яўлення Марка Радзіцы. Яна кахала Габрыела таму, што ён пакутаваў і што яна тыя пакуты запісала сабе як нейкі эмацыйны доўг. Кахала яшчэ і таму, што яго не было побач, таму яна магла ўяўляць сабе яго такім, якім ён ніколі не быў, як Жану д'Арк у тым нямым фільме, з аголенай галавой і з позіркам поўным болю, пазбаўленым усяго мужчынскага.

Цэлымі днямі яна тэлефанавала Гозе і Мусу, спадзеючыся праз іх знайсці нейкую працу, бо грошай у доме не было, а ў тэатры і чуць не хацелі пра тое, каб аддаць ёй Габрыелаў заробак. Тыя двое ёй не адказвалі і не адчынялі дзвярэй, калі яна званіла. Яна ведала, што яны дома і не хочуць яе пускаць. На пятым паверсе дома на вуліцы караля Томіслава гарэла святло і нават з вуліцы чуўся Дыланаў голас. Яна не здавалася, бо проста не ведала, да каго, апроч іх, магла б звярнуцца па дапамогу. Пасля цэлага тыдня, праведзенага ў беспа-

спяховых спробах, і пасля таго, як трэці раз пазычыла грошы ў Катарыны, яна села на лаву насупраць іх дома. Раней ці пазней нехта з іх мусіў выйсці. Не прайшло і дзесяці хвілінаў, як з'явілася Гога.

Але перш чым Дыяна паспела нешта сказаць, дзяўчына выпаліла: *Не ўрубаюся, чаго ты ад нас хочаш! Пакінь нас у спакоі! Я, блядзь, не ведаю, хто ты такая, ня ведаю, якую ён там хуйню ўпароў, што трапіў за краты! Ён у нас не пытаўся, калі рабіў тое, што рабіў, дык нехуй нас уцягваць у вашыя справы. І па-сяброўску я б табе раіла больш не цягацца вакол нашага дома. Тваё шчасце, што выйшла я. Муса б табе пізду вывернуў, калі б цябе ўбачыў! Лепш яму не трапляйся! Чэтнікі ягонаму дзеду скуру жыўцом са спіны дзерлі, дык яму ўсе тыя вашыя штукі са спевамі не даспадобы. Дык вось, а цяпер ідзі сабе з богам і не вітайся, калі сустрэнеш мяне на вуліцы.*

Не прамовіўшы ні слова, Дыяна на месцы павярнулася кругом, як салдат у чаплінаўскім фільме, і пайшла, скінуўшы з плеч адзін жыццёвы клопат.

Распяцце яна і надалей увечары здымала са сцяны, а раніцай вешала назад. Габрыел сто разоў казаў ёй, каб не вешала; калі яно ёй не падабаецца, дык і не трэба, бо ў гэтым доме і так усё расстаўлена і размешчана выпадкова, а яму не хочацца брацца за працу, якой ніколі не будзе канца, таму ён і жыве ў гармідары, атрыманым у спадчыну ад нябожчыцы цёткі. Але яна яго не слухала і ўпарта вяртала распяцце на сцяну. Гэта быў нейкі рытуал, да якога яна прывязалася і які рабіў яе жыццё лягчэйшым. Калі б яна ў першы дзень пераставіла з аднаго на другое месца вядро з вугалем, дык яна б паўтарала гэта кожны дзень, а дзеля таго што тады, змораная дарогай, яна спалохалася ашчэранага Хрыста, рытуалам сталася яго здыманне і вешанне. І так, рыхтуючы распяцце да начнога спачыну, упэўненая, што не засталося нікога, хто дапамог бы ёй знайсці працу, Дыяна раптам падумала, ці не схадзіць заўтра ў касцёл, усё там расказаць і папрасіць святара, каб знайшоў ёй нейкую працу. Яна папраўдзе не ведала, чаму б нехта ў касцёле спачуваў Габрыелавым пакутам, дый адкуль ёй было ведаць, калі яна расла сярод атэістаў і бязбожнікаў і з усіх суседзяў толькі дзве старыя бабы хадзілі на імшу. А калі на некага трэба было накапаць нешта асабліва гнюс-

нае, звычайна знаходзілі нейкага дзядзьку, які быў святаром і ўцёк з усташамі ў Аргенціну. Так што Дыяна падумала, што ў касцёле знайшлося б месца і для дзядзькавых грахоў Габрыелавай душы.

Айцец Антун быў высокі танклявы маладзён, можа яшчэ і маладзейшы за Дыяну. Ён сустрэў яе ў дварыплябаніі, апрануты ў чорную сутану, з каўняром, які яму ціснуў, і таму ён увесь час адцягваў яго ўказальным пальцам, як гэта робяць людзі нязвычныя насіць гальштук.

Ты тут паўгода жывеш і ні разу не прыйшла ў касцёл, чакала, пакуль цябе бяда прывядзе. Эх, ну добра хоць так. Шмат хто вяртаўся да маці-царквы, бо бяда прымусіла. Але паміж вяртацца і вярнуцца доўгі шлях! І ўсё роўна большасць яго пройдуць і вернуцца да веры ў Госпада. А той твой гаротнік, з якім ты жывеш невянчаная, ці ён хадзіў у касцёл? Не ведаеш! Ну, ясна, калі сама не хадзіла, адкуль будзеш ведаць пра яго. Ну нічога. Найбольшы касцёл – гэта людское сэрца. У сэрцы вера, а не ў сценах. Сцены сёння ёсць, а заўтра няма. Ты хацела б, каб касцёл табе дапамог у нейкіх штодзённых справах. Трэба ж з нечага і жыць, гэта ясна. Але як табе касцёл дапаможа, калі ён і сам сабе не можа дапамагчы? Людзі кажуць – Бог дасць! Бог і дасць, але не можа ён даць столькі, колькі людзі забяруць! Вось так, даражэнькая. Не магу я цябе прагнаць з парога, а праўду кажучы, не ведаю, як табе і дапамагчы. Ну вось, можаш у нас атрымаць тое, што застаецца ад абеду. Як мы ямо, так і ты будзеш есці. Ні больш, ні менш. Але баюся, што гэтага табе не будзе досыць. Мусіш і таму свайму гаротніку дапамагчы. Ён твой, хоць і жывяце вы, даруй мне Божа, як нейкія сабакі. Зайдзіце хоць бы ў мясцовую раду і там абвянчайцеся, калі ўжо не хочаце перад Богам. Слухай, можа ты магла б прыбіраць лесвіцы ў Семінарыі? Магу спытацца, калі табе не сорамна працаваць. Але ж ні за якую прыстойную працу не мусіла б хрышчонаму чалавеку быць сорамна. Ты не сказала, ці ты прыняла нейкі з святых сакраментаў? Ох, Божа мой, у якім жа ж гэта мы свеце жывем! Хадзем зараз жа, а я пасля распытаюся наконт працы.

Айцец Антун, і праўда, распытаўся, што Дыяна ніколі яму не забудзе. Хоць было б перабольшаннем казаць, што яна будзе памятаць пра яго з удзячнасцю. Яна прыбірала лесвіцы ў Семінарыі кожны

другі дзень аж да канца свайго побыту ў Сараеве. Плацілі ёй мала, значна менш, чым плацілі б афіцыйна нанятай прыбіральшчыцы, але прынамсі плацілі своечасова; кожную другую пятніцу а пятай гадзіне вечара яна стукала ў дзверы кабінета брата міраніна Бранкі Зідарыча, эканома і інтэнданта Семінарыі, і ён перадаваў ёй канверт з грашыма і развітваўся заўсёды аднолькавымі словамі: *Памагай табе Бог і глядзі, на што траціш!*

Можа ў кім і абудзілася б вера праз тое, што ён знайшоў у касцёле дапамогу, якую не мог знайсці больш нідзе, але ў Дыяніным выпадку такое было немагчыма. З той самай абыякавасцю, з якой яна слухала поўныя прыніжэння і пагарды словы айца Антуна, яна праходзіла міма распяццяў, пабожных абразоў і каплічак, маладых багасловаў з запаленымі вачыма і прафесараў у рызах, якія азіраліся ёй у след з бацькоўскімі ўсмешкамі.

Яна была ўдзячная толькі ашчэранаму Хрысту з сінімі вачамі, які падáў ёй выратавальную ідэю і які будзе галоўным героем яе кашмараў пасля таго, як яна пакіне гэты горад. Яна будзе сніць, як ён вядзе яе назад у Сараева, і ёй не ўдаецца ад яго ўцячы.

Як палкоўнік Нікола Раданіч вёў сваё расследаванне, з кім размаўляў і хто яму сказаў, што Дыяна ўцякла ў Сараева (напэўна ж не Від, бо ён да Віда і не прыходзіў), застанецца таямніцай ягонай працы дэтэктыва, але ў дзень вызвалення Габрыела з турмы Палкоўнік з'явіўся ў Сараеве. Ён спыніўся ў гатэлі «Еўропа», сказаў адміністратару, што застанецца на тры дні і каб той нікому, хто яго мог бы шукаць, праз тэлефон ці як заўгодна інакш, не казаў, што ён тут начуе. Адміністратару Халіду Лізду такія пажаданні, вядома ж, здаліся падазронымі, ён затэлефанаваў куды трэба, але яму, мабыць, нешта праверыўшы, адказалі, каб усё зрабіў так, як загадаў Палкоўнік. Лізда зрабіў выснову, што мае ў пакоі 112 нейкую вялікую птушку, і патрабаваў ад пакаёвак, каб ставіліся да госця з падвойнай увагай. Калі ў іншых пакоях ёсць па два ручнікі, дык у стодванаццатым мусіць быць чатыры, калі новае мыла кладуць праз дзень, дык тут новае мусіць быць кожны дзень, і калі астатнія пакоі прыбіраюцца толькі раніцай, дык гэты мусіць і раніцай, і ўвечары. Усё паводле пратакола для гасцей, якіх прысылаюць ЦК і Прэзідыюм.

Але Палкоўніку, калі ён увечары вярнуўся і пабачыў запраўленую пасцель, такое абыходжанне замест таго, каб дагадзіць, здалося сумнеўным. Хто ведае, у кім і ў чым ён сумняваўся і каму што быў вінаваты, але менавіта гэта стала прычынай змены плану, і замест таго, каб прысвяціць справе Дыяны Дэлавале і яе каханка тры дні, ён пастанавіў вырашыць яе адразу. Па поўначы ён нечакана з'явіўся ля дзвярэй Габрыелавага дома, па-міліцэйску рашуча пагрукаў і закрычаў: *Адчыняй! Міліцыя!*

Габрыел ускочыў з ложка, стаў пры вушаку ў пакоі і затросся, як у эпілептычным прыпадку. Гэткі худы, на дваццаць кілаграмаў лягчэйшы, чым да турмы – а і тады ён не быў асабліва тоўсты, ён выглядаў як вар'ят, якога прыйшлі забраць на сеанс лячэння электрашокам. І тут Дыяну прарвала: яна не аддасць яго, хай бы яе і забілі або іх абаіх паслалі на катаргу. *Адчыняй, або праломім дзверы!* крычаў Палкоўнік. Яна пабегла ў кухню і схапіла іржавую мясніцкую сякерку, якая вісела пад буфетам некранутая, можа, ад часоў Мюнхенскай змовы. *Не трэба, Дыя, малю цябе!* тросся Габрыел. Палкоўнік навальваўся на дзверы, з-пад вушака пасыпаліся кавалкі тынку. Яна стала ля дзвярэй і ўзняла сякерку, гатовая раскалоць галаву таму, хто пераступіць парог. Можа, гэтая карціна, якая прадвяшчала нешта горшае ад найгоршага, прымусіла Габрыела ачомацца і прыйсці да розуму, ён падбег да дзвярэй, забраў у Дыяны сякерку і адчыніў.

Глядзі-тка, чысты Вінэту! Чалавеча, і на каго ты з гэным тамагаўкам? Ці не на народную міліцыю? прамовіў Палкоўнік з падкрэсленым чарнагорскім акцэнтам, мабыць, разлічваючы на агульнае меркаванне, што з чарнагорскай міліцыяй лепш не жартаваць.

Што вам ад яго трэба? закрычала Дыяна. *Дык тут кабета за правадыра? А, герой? Ідзі апраніся, што стаіш у піжаме як нейкая баба!.. Не дазволю, каб вы яго забралі!* заступіла Габрыела Дыяна.

Ну ладна. Тады можам тут усё на месцы і залагодзіць, сказаў Палкоўнік і дастаў кольт.

Дыяна разявіла рот, яна была ў шоку, бо бачыла рэвальвер першы раз у жыцці, ён выглядаў большым, чым у фільмах, і дагэтуль ёй яшчэ ні разу не прыйшла ў галаву думка, што Габрыела маглі б

забіць. Сякера выпала ў яго з рук. Дыяна пачала плакаць, замёршы за паўметра ад чалавека з каўбойскім пісталетам; яна плакала голасна і несуцешна, як Папялушка, калі засталася дома адна.

Ну вось, цяпер ты сапраўдная дзяўчына. Ану марш наперад! выгнаў ён іх у гасцёўню і пасадзіў побач на тапчан. Пасля стаў, задумаўся і паглядзеў у акно: *Эх, прыгожы горад, пашанцавала таму, хто яго бачыў. Хіба ж у такім горадзе разбураюць сацыялізм? Каб ты яго разбураў у Нікшычы, я яшчэ зразумеў бы! Можа і дапамог бы, як сусед суседу дапамагае, калі колюць барана. Але бурыць сацыялізм тут! Дальбог, гэта ўжо занадта. У Нікшычы ты атрымаў бы кулю ў лоб і гатова, а ў Босніі людзі іншыя. Мякчэйшыя. Дык мусяць мяне запрашаць, каб я з такімі разбіраўся.*

Габрыел адчуў, як яму робіцца цёпла і мокра вакол пахвіны, цеплыня гэтая пашыралася і апускалася, і праз момант ён ужо сядзеў на мокрым. Дыяна енчыла і спрабавала нешта сказаць, але словы яе не слухаліся.

Можа, хочаш таблетку, палкоўнік дастаў з кішэні бутэлечку, *сам і вып'еш? Не будзеш мучыцца. Дзесяць хвілін, і сэрца спыняецца. Або можа цябе застрэліць. Ёсць тут нейкая прыбіральня ці ванна, там найлепей. Я не люблю так, каб засраць людзям усю хату. Я страляю выключна ў галаву, дык мазгоў і крыві бывае столькі, што і за месяц не адмыеш, а я бачу, што дзяўчына да працы не надта здатная, умее адно вішчаць і румзаць. Таму я люблю ўсё рабіць у ванне. Сядзеш у ванну, як бы памыцца, заплюшчыш вочы, і гатова. Лягчэй, чым калі б ты быў мусульманін і цябе б цырульнік абрэзаў. Хадзем адразу, каб да вячэры ўсё скончыць! Дый у дзеўкі тваёй, напэўна, ёсць свае справы, дык каб яе не затрымліваць,* торкаў ён Габрыела кольтам у плячо.

Ты не з міліцыі, сказала Дыяна. *Хіба гэта важна. Праверыш хто я, калі скончу працу,* разважліва адказаў Палкоўнік. *Калі ласка, не забівайце яго,* яна ўмольна склала рукі, *ён не той, хто вы думаеце... Я, даражэнькая, не думаю, я працую. Калі б я ў сваім жыцці думаў, ніколі б не дасягнуў таго, чаго дасягнуў... Не забівайце яго!.. А чаму? Паспрабуй мне сказаць чаму? Ты кінула старую маці, каб тая загнулася ад гора і хвалявання, і ўцякла з ворагам народа. Бачыш, дзеўка,*

я б забіў яго, нават калі б і не меў такога задання. Таму што ў маёй дурной галаве не ўкладаецца, як нехта можа сваёй маці зрабіць тое, што зрабіла ты... Я не хацела... Што ты не хацела, курва партовая! зароў Палкоўнік так, што дом затросся. *Не забівайце яго,* галасіла яна. *Цяпер слухай мяне,* сцішыў голас Палкоўнік, ходзячы з аднаго краю пакоя ў другі, *даю табе дваццаць чатыры гадзіны, каб ты знікла з Сараева. Збірай свае манаткі і валі туды, адкуль прыйшла. Я магу праверыць, ці ёсць шанцы захаваць гэтаму твайму жыццё, але нічога не гарантую! Ну а калі ты мяне не паслухаеш і калі я цябе заўтра тут знайду, дык я яму на месцы выпушчу мазгі, а ты дзеўка пойдзеш роўнай дарогай за краты, адкуль выйдзеш старэйшая, чым твая старая. І не надумай яму тэлефанаваць, бо мы адразу пра гэта даведаемся! І каб, не дай божа, больш ніколі нідзе з ім не спрабавала сустрэцца! У Сараева не прыязджай, а і ён, дальбог, на мора яшчэ няхутка збярэцца. Вось, дзеўка, што я табе зараз магу запрапанаваць, а што рабіць з табой, хлопча, будзе вырашаць Саюзны сакратарыят.*

Быў поўдзень халаднаватага травеньскага дня, калі Дыяна з таго самага перона, на які прыехала за дзевяць месяцаў да таго, з той самай валізай і пяццю торбамі выехала дадому. Габрыела яна пакінула без пацалунку, упэўненая, што за ўсім гэтым хаваецца нейкі падман, што нехта ўсё гэта сніць, а яна – персанаж з нечага кашмару.

Яна ніколі больш яго не бачыла і не распытвала пра яго, а праз Сараева праязджала яшчэ толькі раз цягніком на Бялград. Яна ведала, што Габрыела не забілі, і з часам зразумела, што добра зрабіў той, хто іх разлучыў, кім бы ён ні быў і чыю б вар'яцкую задуму ні выконваў.

Дваццаць першага лютага 1975 года Дыяна трымала ў руках бялградскую «Палітыку», чакаючы ў рэстаране «У Вука» хлопца, з якім тады ўцякала. Але яна перагарнула старонку з некралогамі, бо была ўсё яшчэ даволі маладая, каб чытаць імёны памерлых. Яна прагартала «Палітыку» і не пабачыла знаёмага твару, хоць напэўна яго пазнала б. «Дзевятнаццатага лютага перастала біцца геройскае сэрца палкоўніка Ніколы Раданіча, кавалера Партызанскага медаля 1941 года і ордэна Героя сацыялістычнай працы. Трагічна загінуў

пры выкананні службовага задання, вечная яму слава і хвала – калегі і сябры па працы», – было напісана пад фатаздымкам. Дыянін бялградскі эпізод быў менш важны за той некралог і за ўсё тое, што яму папярэднічала.

Кожны год з надыходам восені яна выязджала з дому, пакінуўшы маці запіску, што знайшла каханне свайго жыцця і больш ніколі не вернецца, але вярталася праз тры дні ці праз тры месяцы; працягласць уцёкаў была няважная, бо Рэгіна ведала, што Дыяна заўсёды вернецца, таму і няма патрэбы звяртацца да Палкоўніка і прадаваць алівоўнікі і вінаграднікі. Вечнае каханне – з'ява каляндарная і жыве не даўжэй за адну пару года. Так завялося ў родзе Дэлавале, так бывае паўсюль, дзе ёсць мужчыны і жанчыны здольныя закахацца насмерць.

У басейне каля аўтобуснага вакзала першыя купальшчыкі падстаўлялі сонцу бледную зімовую скуру. У Сараеве, як толькі прыйдзе вясна, жанчыны выносяць на вуліцу дываны, рассцілаюць іх на асфальце, становяцца на калені і аддрайваюць наросты за зіму бруд. Калі пад'язджае аўтамабіль, яны адбягаюць на ходнік і доўга праклінаюць кіроўцу, які пераехаў іх цяжкую працу. Паміж гэтымі жанчынамі і людзьмі ў басейне Дыяна не бачыла розніцы. Кожны выносіць на свет божы тое, што яму найважнейшае, калі прыгрэе сонца і прыродныя цыклы пачнуць новае кола. Ейны цыкл палягаў у вяртанні да таго, ад чаго яна не магла ўцячы, як бы далёка і доўга ні бегла. Першыя ўцёкі яшчэ неслі ў сабе надзею і веру, ці яна проста яшчэ не ведала таго, што будзе адчуваць аж да матчынай смерці. Была патрэбная сіла мацнейшая за каханне, каб вырваць карэнне, якое прывязвала яе да Рэгіны. А яна такой сілы ў сабе не мела і не ўмела знайсці яе па-за сабою.

Вяртанне дачкі Рэгіна сустрэла, удаючы поўную абыякавасць. Яна дапамагла Дыяне занесці рэчы ў хату, прабурчала, што ў хаце ўсё сапсавалася, развалілася і зруйнавалася, пакуль яе не было, паказала ёй новую пральную машыну, якая, у адрозненне ад папярэдняй, усё робіць сама і не трэба кожныя паўгадзіны запускаць яе зноў. Вядома ж, яна не сказала, што купіла яе таму, што Палкоўнік знізіў цану пошукаў на дзвесце тысяч дынараў. Яна не згадала ні сло-

вам, што прадала Вілу Дэлавале. Але не таму, што хацела б гэта схаваць. Пральная машына была важнейшая. У гэтым Рэгіна нічым не рознілася ад большасці югаславак, якія пераход з паўаўтаматычных машын для мыцця бялізны на машыны з убудаваным праграмным прыстасаваннем успрынялі як найбольшае грамадскае дасягненне пасля Другой сусветнай вайны.

Тое, што Вілы Дэлавале больш няма, Дыяна даведаецца сама, калі праз два месяцы будзе з Відам падарожнічаць па Пэлешцы, дзе ён на просьбу аднаго вінароба з Цаўтата будзе дамаўляцца пра закуп восеньскага ўраджаю вінаграду, і калі ўвечары яны заедуць пераначаваць у сямейным летніку, а іх там сустрэне новы замок на дзвярах і збіты каменны надпіс.

Пра тое, што яна рабіла і дзе была дзевяць месяцаў, Рэгіна ў дачкі ні разу не спыталася, а сама Дыяна пра гэта гаварыць не жадала. Ёй падалося падазроным што маці ведае пра Сараева; часам у размовах яна казала пра час да і пасля яе вяртання з Сараева. Але сумнеў гэты не знаходзіў тлумачэння, дый Дыяна не ведала, што з ім рабіць, таму ён памалу згас. Калі яна і падазравала нейкую Рэгініну ролю ў гэтай гісторыі, што насамрэч было малаверагодна, яна не мела прычынаў з ёй разбірацца, тым больш у першыя два-тры дні пасля вяртання, пакуль маці была яшчэ зусім стрыманая і, насуперак свайму характару, не лезла ў ейнае жыццё і нават не каментавала, калі з ёй на вуліцы віталіся нейкія мужчыны.

Рэгініны паводзіны рэзка перамяніліся і вярнуліся ў старую каляіну пасля смерці дзядзькі Лукі, апошняга і наймаладзейшага яе брата, які праз тыдзень пасля Дыяны вярнуўся з Трыеста, дзе жыў апошнія шаснаццаць гадоў, каб памерці на роднай зямлі, у сваім горадзе. Яго вынеслі на насілках з шпітальнага аўтамабіля і занеслі ў дом. З ім прыехала і медычная сястра, італьянка Патрыцыя. Яго паклалі ў гасцявым пакоі ў ложак, у якім гадамі ніхто не ляжаў, у пакоі тым ніколі ніякіх гасцей і не бывала і гасцявым ён зваўся толькі ўмоўна. Лука смяяўся і жартаваў са сваёй хваробы, Рэгіна абдымала яго і мітусілася вакол такая маладая і прыгожая, якой Дыяна яе не памятала.

Упершыню за доўгі час яна не пазбягала маці ў доме, а сядзела

пры ложку дзядзькі Лукі і радавалася. Так было і тым суботнім вечарам. Калі б у доме Дэлавале апынуліся раптам і найпахмурнейшы сугней, і найгоршае хадзячае няшчасце, дык і яны разам з маці, дачкой і трыестаўскай медсястрою лопаліся б ад смеху побач з чалавекам, які нібыта ўсё сваё жыццё пражыў толькі дзеля апошняга дня, калі ён напоўніць радасцю цэлы свет. Каля поўначы Рэгіна і Дыяна пайшлі спаць, а з першым промнем сонца дзядзька Лука быў мёртвы.

Усе гарадскія курвы прыйшлі на пахаванне, сказала Рэгіна, *быццам і ён Дэлавале! А можа так і ёсць, чорт ведае, хто вас усіх прывёў на гэты свет.* Тады Дыяна зразумела, што спакою ў доме прыйшоў канец. Варта было толькі здарыцца нечаму, што сваёй важнасцю перасягнула ейнае вяртанне. І такім здарэннем выпадкова стала смерць дзядзькі Лукі. Хоць і праўда, што на пахаванне прыйшлі курвы, што яны плакалі і засыпалі кветкамі магілу ягонай светлай душы. Ніхто гэтаму не здзівіўся, нават святар, які спраўляў абрад, не бачыў у гэтым нічога, што парушала б урачысты момант пераходу Лукі з зямнога жыцця ў жыццё вечнае: *Ёсць у Госпада шалі, на якіх ён узважыць усе нябожчыкавы грахі, а мы можам толькі даручыць яму нашага брата Луку Сікірыча. Ён зрабіў нам весялейшым быццё ў гэтым удоллі слёз, і не было між нас тых, каго б ён хоць аднойчы не рассмяшыў сваёй чыстай радасцю і незлаблівасцю.*

X

Пятага сакавіка 1953 года лютавала наймацнейшая той зімою бура. Яна ўзнялася нечакана і не ў пару, недзе каля дзясятай гадзіны раніцы, пазрывала прасціны, што сушыліся перад дамамі, насіла іх па-над дахамі праз вуліцы і плошчы, кідала далёка ў мора, кружыла высока ў паветры, быццам і не бура гэта, а нейкая невядомая і небывалая віхура, што прыляцела з поўначы і ўсходу, каб вырваць і разбурыць усё, што трапіцца на дарозе. Жанчыны выходзілі з дамоў і, як шалёныя, бегалі па горадзе, спрабуючы лавіць прасціны, але наўрад ці злавілі хоць адну, а калі і злавілі, бура і яе вырывала з рук, узносіла ў неба і кідала ў мора. Калі б нейкая жанчына заўпарцілася і мацней ухапілася за сваю прасціну, і яе занесла б у неба. На шчасце, гэта не такі горад, якіх нямала было на ўсходзе Польшчы і ў Расеі, і людзі тут, якімі б яны ні былі вар'ятамі, усё ж трымаюцца зямлі, інакш сакавіцкая бура раскідала б іх па небе так, што сам Бог пасля не мог бы іх разабраць і раздзяліць паводле веры і няверы і паводле цяжкасці грахоў. Яны ўцякалі ў дамы і між каменных муроў чакалі, калі бура сунімецца.

Рэгіна была дома адна. Рана раніцай яна выправіла Дыяну ў школу, калі яшчэ ніхто не ведаў, якая збіраецца непагадзь. Яна пайшла лёгка апранутая паводле ўчорашняга надвор'я, і хоць Рэгіна сказала ёй на ўсялякі выпадак надзець плашч, яна не захацела. Маўляў, дзеці з яе смяюцца, кажуць, што гэта плашч нябожчыка таты, што праўда, але Рэгіна ўсе вочы выплакала, пакуль яго падлапіла і падкараціла. Дыяне ён, і праўда, трошкі зашырокі і трэба тройчы падгарнуць рукавы, але што там ужо звужваць і караціць, быццам гэта не плашч, а бальная сукенка, і не дзіцяці, а дзеўцы на выданні. Але ж не! – ёй, бач ты, плашч зашырокі, дзеці з яе смяюцца! Быццам гэта ўжо так важна, што смяюцца. Смейся і ты з іх, сто разоў казала ёй маці, на што малая пачынала лупіць кулакамі па стале, крычаць і рваць валасы. Не

рві валасы, сказала яна раз, не рві валасы, сказала другі, не рві валасы, апошні раз табе кажу, – сказала яна Дыяне, пасля як тая цэлую зіму ўпарцілася з прычыны плашча. Не надзявала яго і ў дождж ці здымала адразу, як выходзіла з хаты і закідвала праз плот у сад. Рэгіна яе лупцавала, калі тая прыходзіла са школы прастуджаная, з тэмпературай. Аднойчы падхопіць запаленне лёгкіх, і хто тады будзе вадзіць яе па лекарах, дрыжаць над ёй уначы, бо ў горадзе няма лекаў і людзі паміраюць ад запалення лёгкіх больш, чым ад чаго іншага.

Аднак нічога не дапамагала, ні ласкавыя словы, ні лупцоўка, ні тое, што палову навучальнага года яна праляжала хворая ў ложку. З гэтым маці яшчэ неяк давала рады, але калі малая пачала рваць валасы і цэлыя пасмы лёталі па кухні, Рэгіна наблізілася да мяжы нервовага зрыву. Дзяўчынка паводзіла сябе так, як робяць дарослыя жанчыны, калі пасварацца з мужам і той іх выкіне з хаты, – тады яны як шалёныя бегаюць па двары і рвуць на сабе валасы; яны можа з радасцю і забілі б сябе, ды не ведаюць чым і як і страх у іх большы за істэрыю. Або яшчэ так робяць курвы, калі маракі ўцякуць, не заплаціўшы. Яны пачынаюць рваць на сабе валасы на вачах ва ўсяго свету, быццам усе вакол мусяць узняць паўстанне, бо курвам не заплачана за еблю, і быццам іхнія пізды – грамадская маёмасць, пра якую мы ўсе разам павінны дбаць, кшталту тых аўтастрадаў, фабрык ці адміністрацыйных будынкаў; быццам партыя іхнія пізды экспрапрыявала і нацыяналізавала, і цяпер кожнага, хто не вораг камунізму, павінна турбаваць, ці плацяць англійскія маракі нашым курвам за еблю! Вось так якраз Дыяна рвала на сабе валасы, калі маці наказвала ёй надзець плашч, а калі хто з яе будзе смяяцца, дык хай і яна з таго пасмяецца.

Не рві валасы, апошні раз табе кажу! сказала яна, на што малая паглядзела ёй проста ў вочы, схапіла правай рукой пасму і адным рыўком вырвала яе, нібы ёй сам Люцыпар даў столькі сілы.

Добра, спакойна адказала Рэгіна і накіравалася ў склеп. Сярод параскіданых Івавых прыладаў, заблытаных ярусных сетак і вялікіх вудаў для лоўлі чахоні, яна знайшла бляшанку з амерыканскім клеем. Іва прывёз яе з аднаго са сваіх апошніх даваенных плаванняў. Гэты клей быў дзівам, якога нашы людзі яшчэ не бачылі. Не было больш

патрэбы ні ў гваздах, ні ў цвіках: клей клеіў усё. Яна адчыніла блясшанку мулярскім шпатэлем і падчапіла ім камяк жоўтай смалістай масы. Клей капаў за ёй па ўсёй хаце, але Рэгіну гэта не хвалявала. Яна вырашыла навучыць гэтае дзіця розуму, чаго б гэта ні каштавала. Хай ужо зусім не жыве, калі не хоча жыць прыстойна.

Дыяна тым часам ужо супакоілася і капалася ў школьнай торбе, думаючы, што маці ўрэшце адчапілася і пайшла па сваіх справах, а яна спакойна пойдзе сабе ў школу без плашча.

У апошні момант яна ўбачыла, як Рэгіна замахваецца, паспрабавала ўхіліцца і была здзіўленая, калі на галаву ёй замест удару звалілася нешта мяккае і вільготнае. *А цяпер рві колькі хочаш, бестыя!* крыкнула маці. Дыяна схапілася за галаву, і рука адразу прыклеілася. Умомант яе ахапіў моцны страх, яна машынальна ўзялася за галаву і другой рукой, і тая таксама прыліпла.

Яна вяла яе так па вуліцы з рукамі на галаве, як ваеннапалоннага. Насамрэч хутчэй несла яе, цягнучы за каўнер, чым Дыяна ішла сама. Дзяўчынка не ведала, што маці такое нарабіла, і крычала больш жывёльным, чым чалавечым голасам. Яна адчувала, як яе далоні зрастаюцца з галавою. Ператваралася ў бездапаможную пачвару без уласнае волі і сілы, цалкам падпарадкаваную маці і яе волі. Рукі не былі прыклееныя да галавы, але раслі з яе і ўрасталі ў плечы. Усё абярнулася жахам, якога няма нават у снах, і не ведала яна, як і чаму і што гэта ў маці за моц, што можа яе перамясіць і ператварыць у нешта дагэтуль нябачанае.

Што ж гэта, божа мой мілы! пляснуў рукамі цырульнік Шыма, калі Рэгіна ўцягнула Дыяну ў ягоную цырульню. *Совала галаву куды не трэба, вось што,* спакойна адказала маці. Цырульнік асцярожна падышоў, быццам баючыся, што Дыяна яго ўкусіць, агледзеў яе з усіх бакоў, стараючыся не дакранацца: *Дык ты прывяла яе да мяне, га? Але ж гэта не мая парафія. Я людзей стрыгу і галю, а тут не ведаю, што трэба рабіць,* цягнуў і прыкідаўся ён. У крэсле з намыленым тварам сядзеў і агаломшана пазіраў Коста Найданавіч, школьны дырэктар, адзін з тых, каго гады, пражытыя з пакаленнямі гарадскіх дзяцей, навучылі нічому ўжо не здзіўляцца. Калі б людзі пачалі хадзіць па марской вадзе, ці калі б у салдатаў і міліцыянтаў на

спіне выраслі крылы, ці калі б дзеці пачалі ездзіць у школу верхам на свіннях, дырэктар Коста ні кроплі не здзівіўся б. Ці прынамсі ўдаваў бы, што зусім не здзіўлены, будучы ўпэўненым, што толькі так можна захаваць аўтарытэт сярод вучняў і іхніх бацькоў. Але ўбачыўшы заплаканую і ўспуджаную Дыяну з рукамі на галаве, нават ён не мог рабіць выгляд, што бачыць нешта можа і не зусім адпаведнае добраму выхаванню і прыкладным паводзінам, але ва ўсякім разе нешта яму вядомае і знаёмае. У першы момант ён наагул не пазнаў, што гэта вучаніца ягонай школы.

Шыма, дзеля ўсяго святога, дапамажы дзіцяці. Я сам пагалюся, сабраўся з духам дырэктар Коста, узяў брытву і пачаў галіцца. Ён спяшаўся ў школу, бо там збіралася пасяджэнне педагагічнай рады з нагоды дня старту школьнай эстафеты, якая разам з Эстафетай маладосці* будзе перададзеная таварышу Ціта на яго дзень народзінаў. Коста, як і ўсякі стары кавалер, не любіў спазняцца, а яшчэ і трошкі баяўся, каб яго хто ў чым не папракнуў, калі з эстафетай нешта пойдзе не паводле плану. Ён быў не мясцовы, у горад прыехаў з Нявесіня і, як кожны прыезджы, крыху больш ва ўсім сумняваўся.

І пакуль ён спехам галіўся, спраўна абыходзячы нос і вушы, пакуль выбягаў з цырульні, не забыўшыся заплаціць хоць бы за мыла, калі ўжо пагаліўся сам, цырульнік спрабаваў медычным спіртам адклеіць Дыяніны рукі. Але ў яго нічога не выходзіла, а тут яшчэ малой пачала пячы скура на галаве, ды так, што яна выла як карабель, што ўваходзіць у порт, хоць ужо і хрыпла, але ўсё яшчэ дастаткова рэзка, каб людзі з вуліцы пачалі заходзіць у цырульню зірнуць, што тут адбываецца. Увайшоўшы, яны казалі толькі *ох, божа мілы!* або *беднае дзіця, што ж вы робіце!* і, павярнуўшыся, выходзілі.

Гэта Рэгіну вельмі нервавала, і яна запатрабавала зачыніць цырульню на ключ, пра што Шыма не хацеў нават чуць. Як ты сярод белага дня зачыніш гарадскую цырульню: каб людзі пачалі абурацца ці раззлаваліся і пайшлі да канкурэнтаў? У яго і так ужо былі немалыя праблемы ад таго дня, калі гэты трэбіньскі сракаліз Хурэм адчыніў у горадзе трэцюю цырульню, хоць гэтых дзвюх, Шымавай і Андрыевай, было больш чым дастаткова, а ў горадзе за ўсю яго тысячагадовую гісторыю ніколі не было аж трох цырульняў.

І так людзі заходзілі і выходзілі, аж пакуль не з'явіўся Рока Ронсан, механік і карабельны машыніст, які жыў паверхам вышэй і напэўна пачуў Дыяніны крыкі. *Зараз я прынясу нешта такое, што здыме любы клей,* сказаў Ронсан і вярнуўся з бутэлькай, у якой плюхаўся разбаўляльнік ці нешта падобнае.

Праз паўгадзіны пакутаў і чакання Дыяна зноў займела рукі, але на галаве замест валасоў яна ўбачыла ў люстэрку нейкі агідны заблытаны каўтун, падобны да пакулля, якім дзядзька Лука абцірае матор у лодцы.

І што цяпер? спытаўся Шыма. *Эх, малая, баюся, што ты цяпер пабудзеш трохі лысая, як я!* засмяяўся Рока Ронсан.

Дыяна страціла волю і сілу супраціўляцца і скарылася лёсу і цырульнікавым рукам. Найперш Шыма найбольшымі нажніцамі зрэзаў камяк валасоў і клею, пасля ўзяў машынку і паволі падчысціў тое, што засталося ад валасоў. Раз-пораз ён змазваў зубцы машынкі, разглядаў вынік працы ў люстэрку і працягваў справу, задаволены, што нарэшце зноў мог рабіць тое, чаму вучыўся і што належыць рабіць кожнаму цырульніку. Бо Шыма быў упэўнены, што толькі да яго людзі прыходзяць з рознай дурнёй і што палову працоўнага веку ён правёў, займаючыся людскімі глупствамі, а не фрызурамі. А дальбог той век цягнецца ўжо доўга, бо ён у гэтай цырульні працаваў ад 1925 года, спачатку як вучань у нябожчыка Карла Каракуны, пасля як ягоны работнік, а пасля майстар захварэў і пакінуў яму і цырульню, і ўсё што ў ёй, толькі каб ён да смерці яго даглядаў. І даглядаў ён майстра лепш, чым роднага бацьку, і плакаў па ім на пахаванні больш, чым па бацьку.

Састрыгшы з Дыянінай галавы апошнія валасінкі, ён весела пляснуў дзяўчынку па патыліцы: *вось, цяпер ты сапраўдны хлопчык!* сказаў ён, абмахнуў мяцёлкай лысую галаву і намазаў скуру дзіцячым крэмам. *Дзядзя Шыма частуе цябе Нівэай! Звычайна за крэм плаціцца асобна*, спрабаваў ён неяк развесяліць дзіця.

Яна сядзела нерухома і збянтэжана глядзела ў люстэрка, дзе бачыла некага, хто быў хоць і падобны да яе, але гэта была не яна і не магла быць яна, у таго некага былі вялікія страшныя вочы і два чорныя паўмесяцы броваў, а над імі чырвона-шэрая скура, як на гало-

вах у цыганятаў і малых рахітычных баснійцаў, якіх кожнага лета грузавікамі прывозяць у Вілу Магнолія, каб яны там адпачылі і каб ім, як сказала настаўніца, наша мора і здаровае паветра прачысцілі кроў і ўмацавалі косці.

Гэта вашы таварышы, тлумачыла яна перад класам, *якія разам з вамі будуць будаваць сацыялізм і дабрабыт нашай радзімы!*

Вучні слухалі, быццам яна кажа найбольшыя на свеце глупствы ці спрабуе схлусіць ім нешта такое, у што нават дзіця ў калысцы не паверыла б. Хлопчыкі на задніх партах хіхікалі, бо як тут паверыць, што ў настаўніцы ўсе дома, калі яна ўпэўнівае іх, што няма розніцы паміж баснійскімі малпянятамі з сінімі вадзяністымі вачамі і вялізнымі лысымі галовамі і імі, нармальнымі дзецьмі, якія жывуць тут, маюць валасы і гавораць, як людзі. Хутчэй бы яны паверылі, калі б настаўніца сказала, што каза, якая шчыпле лісцё з міндальнага дрэва за школай, гэта насамрэч слон, чым згадзіліся б, што яны такія самыя, як баснійцы. Брыдкія, бародаўчатыя і брудныя, колькі б яны ні купаліся ў моры.

Ціта аднолькава любіць і іх, і вас! выкарыстала настаўніца апошні аргумент, які не быў асабліва пераканаўчы, але смяяцца з яго не наважыліся нават найсмялейшыя ў класе.

Дыяна цяпер бачыла ў люстэрку менавіта аднаго з такіх баснійцаў, які рабіў усё тое, што і яна, – міргне, зморшчыць нос, разявіць рот, закусіць губу. Ёй было сорамна, бо яна бачыла малога баснійца, якім была яна сама. Гэты сорам быў большы за нянавісць да маці, за жах ад прыклееных рук, за боязь цемры, за злосць, што з яе ў школе смяюцца, за смутак і шкадаванне і за ўсё іншае, што яна думала і адчувала. На свеце больш не існавала нічога, за што яна была б мацнейшая і чаму магла б супраціўляцца. Як толькі яна выйдзе на вуліцу, яна гэта добра ведала, усе будуць глядзець на яе так, як глядзяць на тых слабакроўных і крохкакостых жывёлінак, якіх прывозяць у панскія вілы, дзе некалі нараджалася гісторыя і культура гэтага горада. Тую культуру партызаны прынізілі найстрашнейшым чынам, выразна паказваючы гараджанам, што ім важнейшыя рахітычныя звераняты з імглы турэцкіх мястэчак, чым міжземнаморская традыцыя і добрапрыстойнасць старадаўніх муроў. Быццам пусцілі

свіней рохкаць у летніх вілах нашай арыстакратыі! Дыяна не ведала сутнасці гэтага прыніжэння, але добра адчувала яго сэнс. Яна ішла за маці з пахіленай галавою, вецер абвяваў ёй скуру, нагадваючы, што яна голая і асуджаная быць некім іншым.

У школу яна прыйшла ў шапцы, насунутай на лоб, а калі настаўніца наказала зняць шапку, як яна можа быць такой некультурнай і сядзець у класе ў шапцы, Дыяна расплакалася, уткнулася тварам у далоні, такая бедная і бездапаможная, што з задняй парты зноў пачалі хіхікаць, а Ўлаха Андрыіч, выдатнік з першай парты, сказаў: *Таварыш настаўніца, яна не здыме, бо Шыма астрыг яе налыса!* На што цэлы клас выбухнуў смехам, але настаўніца не зразумела, пра што гаворка, хто такі Шыма і што здарылася, а падумала, што Ўлаха выстаўляецца перад іншымі, што ён звычайна і рабіў, схапіла яго за пасму над вухам так, што той войкнуў, і паставіла ў кут.

А ты давай здымай шапку! строга крыкнула яна, гордая тым, што ў класе запанавала магільная ціша. Дыяна не адказвала, хаваючы твар і спаўзаючы пад парту. Настаўніца падышла цвёрдым крокам – ух як ёй сёння ўсё добра ўдаецца! – і схапіла шапку. Дыяна рукамі прыкрыла галаву, малыя далонькі не маглі схаваць увесь сорам, і застыла, як статуя. Настаўніца збянтэжылася, ёй не ставала словаў, страшна было замаўчаць перад трыма дзясяткамі жывых вуснаў, а пасля горка раскаялася. Так рэдка ёй удавалася сцвердзіць свой аўтарытэт, і тут раптам здараецца нешта такое. Яна прысела каля Дыянінай парты; слёзы капалі на чорную драўляную падлогу. *Прабач, дзетка,* шапнула яна. А тады ўстала, двойчы пляснула ў далоні: *Усе на двор, урок фізкультуры!* Усе ўмомант забыліся пра лысую забаву, *ураааааааа!* – раўлі хіхатуны з задніх партаў, і клас апусцеў з хуткасцю пажарнай станцыі, калі недзе ўспыхне пажар. Засталося толькі іх трое: настаўніца, Дыяна і Ўлаха, які працягваў упарціцца. Пакараны, дык пакараны! *Андрыіч, марш на двор!*

Яна спыталася ў Дыяны, што здарылася, ці яе за нешта пакаралі дома або недзе набралася вошай, але дзяўчынка нічога не сказала. *Не трэба, таварыш настаўніца! Не трэба, таварыш настаўніца!* адказвала яна на ўсе пытанні.

Дык вось, ад таго дня не мінула, можа, і двух тыдняў, як Дыяна

зноў пайшла ў школу без плашча. І яшчэ ў такі дзень! Рэгіна ўжо й не ведала, што рабіць і як яе прывесці да розуму. Дзесяць дзён дома быў мір, дачка ні ў чым не ўпіралася і не ўпарцілася, а тады зноў усё пачалося спачатку. Сорамна падумаць, а тым болей сказаць, але яна была гатовая біць яе качалкай, пакуль не выб'е з яе ўпартага д'ябла. Калі д'ябла наагул можна было выгнаць і калі ён не засеў занадта глыбока. Забіла б яе, толькі б зрабіць з яе прыстойную жанчыну, шалела Рэгіна, пакуль бура за акном усё мацнела. Надзімаліся дахі ў дамах, рыпелі бэлькі на гарышчы, знікла крона старой шаўкоўніцы, якую яна заўсёды бачыла ў акне за дамамі ў бок горада. Вось як лёгка чалавек застаецца сам, падумала яна. Не можаш выйсці з дому, да некага дазвацца, бура знясе цябе, як толькі высунеш нос. І так з кожным. Толькі што нехта сядзіць дома са сваімі, а яна сама-самюткая, і калі б нават зараз памерла, ніхто не ведаў бы і нікога гэта не хвалявала б. Кожны дом у горадзе – гэта востраў. Ёсць астравы заселеныя і незаселеныя, як Брач і Шкой*. На шкоях няма жывой душы, а на брачах жывуць людзі. І толькі яна на такім востраве, які ні брач, ні шкой, і жыве на самоце, хоць па самоце не тужыць. А калі ёй ніхто не патрэбны, тады наадварот вакол яе збіраюцца ўсе, пашкадавала Рэгіна сама сябе. І пацяклі б у яе слёзы, каб быў побач нехта, хто прыме тыя слёзы сабе на душу. Ёй яшчэ й пяцідзесяці няма, мае малое дзіця, а наперадзе – толькі смерць.

Яна дастала насоўку з шуфлядкі, прапахлай крухмалам і лавандай, і ўздыхнула. *Божа, як жа мне цяжка,* сказала яна, быццам нехта мог яе пачуць.

У небе ў нейкі момант заблiскалі маланкі, з-за гор ужо чуліся грымоты, хоць небакрай далёка ў моры быў заліты сонцам і здавалася, што там і ветру няма. Той, хто не быў тады засяроджаны на сабе і сваіх сапраўдных і выдуманых бедах, мусіў адчуваць страх. У прыродзе ўсё было навыварат, і тое пятае сакавіка будзе помніцца і пераказвацца як дзень, калі лютавала бура, якая і не была бурай, і несла дождж з тых краёў свету, з якіх дождж ніколі не прыходзіць. А можа было і не так, бо хмары адвеку прыходзяць з усіх нябесных бакоў, а вятры веюць, дзе толькі могуць, але проста пятага сакавіка

1953-га мусіла запомніцца нечым, чаго ніколі раней не было. Свет мусіў нешта прыдумаць.

Рэгіне падалося, што нехта грукае ў дзверы. Напэўна, недзе расчыніліся аканіцы і цяпер імі бразгае вецер. Праз якую хвіліну зноў пачуліся тыя самыя гукі. Значыць, гэта не бура, а калі не, то што? Па такім надвор'і па вуліцы не гуляюць, а калі нейкая бяда некага выгнала з хаты і паслала да яе дзвярэй, дык такому лепш не адчыняць. Хай ідзе да каго іншага. Да Бартала, ён добры чалавек. І яшчэ мае сувязі там, дзе трэба. Яе агортваў страх, яна не ведала ад чаго, але адчувала, быццам вакол глыбокая ноч, а яна недзе ў гарах. І ўсё ж цікаўнасць прымусіла яе на дыбачках падысці да дзвярэй, яна спынілася, гатовая да хуткага адступлення, калі нехта ўломіцца ў дом. І тады зноў нехта пагрукаў. Мужчынскі кулак, не было ніякага сумневу.

Адчыняй, жанчына божая, я ведаю, што ты дома! Лука спрабаваў перакрычаць вецер, і ўрэшце яна яго пачула. *Ты звар'яцеў! Ведаеш, як я напалохалася!* сказала яна, а ён забег у дом мокры, ускудлачаны і распрануты.

Гулялі мы ў карты, а той Шпіра і кажа – давай паслухаем навіны Радыё Лондан! Ага, як прайграе́ш, дык табе навіны слухаць, а што ж мы не слухалі, калі ты выйграваў, кажу яму я. Уключае ён радыё, і ведаеш, што там? Э, не ведаеш, адкуль табе ведаць, калі ты слухаеш толькі Радыё Загораб. Перадаюць, што памёр Сталін! Ты толькі падумай – памёр Сталін! Кажуць – навіна з неафіцыйных крыніцаў, але Прэзідыум Вярхоўнага Савета рыхтуе камюніке. Значыць – памёр! казаў ён, не пераводзячы духу, быццам баючыся, што яна яго перапыніць, скажа, што гэта няпраўда, што ён усё выдумляе, што Радыё Лондан хлусіць, як і ўсе, і адзінае пытанне ў тым, дзе ты жывеш і да чыёй хлусні прызвычаіўся. Лука прызвычаіўся да навінаў з Лондана, а не з Загораба, Бялграда ці Масквы – пакуль Масква яшчэ была актуальная. Ён ненавідзеў Сталіна яшчэ да рэзалюцыі Інфармбюро*, тады, калі за дрэннае слова пра яго можна было заплаціць галавою.

Але і Лука асабліва не сачыў за тым, што кажа, і гарадскія шпіёны не ўспрымалі яго сур'ёзна. Ён малоў языком, а Рэгіна яму казала – маўчы, каб які чорт не пачуў, знікнеш уночы, усе праз цябе наму-

чымся… Казала яму, каб не забываўся, як скончыў у вар'ятні Бэпа, іх старэйшы брат, і ці ведае ён, што магло б здарыцца, калі да тых, хто не ведае, дайшла б вестка, што сярэдні брат Джавані не з'ехаў у Аўстралію, адкуль не адгукаецца, а змяніў імя на Ёван і пайшоў у чэтнікі Дражы Міхаілавіча на Раўну Гору, а там, як кажуць, рэзаў і забіваў. Хай толькі з'явіцца чутка пра гэта, і ўсім адразу будзе ясна, з якіх ён пазіцый крытыкуе таварыша Сталіна, і не спатрэбіцца ні суд, ні пракурор. Пасля Рэзалюцыі, калі здавалася, што Лука ўрэшце дамогся свайго, ён хадзіў па горадзе і кожнаму партызану і камуністу рэзаў проста ў вочы, што даўно ведаў, хто такі Сталін, пакуль яго іншыя хвалілі, узносілі да нябёсаў і ставілі вышэй за Ціта. І кожнаму слова ў слова паўтараў, якімі эпітэтамі яны ўшаноўвалі Сталіна.

Людзям гэта не падабалася. І тады або нехта данёс, што ён занадта ўсім дакучае, ці можа ён нейкаму гарадскому ознашу ці удбашу* нагадаў, калі і дзе той хваліў Сталіна, але аднойчы раніцай па Луку прыйшлі і забралі на допыт.

Адзін за адным мяняліся следчыя, за дзевяць гадзін, колькі цягнуўся допыт, іх змянілася сем-восем, і кожны пытаўся толькі пра адно: *Чаму ты, таварыш Сікірыч, да лета 1948 года нападаў на Сталіна* і з якіх пазіцый ты гэта рабіў?*

Кожнаму следчаму ён упарта адказваў, што заўсёды выступае з пазіцыяў здаровага розуму і што яму няясна, на якіх пазіцыях да Рэзалюцыі былі іншыя. Аж пакуль ён не сказаў тое самае нейкаму славенцу без рукі, якога ён ня ведаў, хоць і бачыў у горадзе і ніколі б не мог яго забыцца або з некім зблытаць. З зачасанай чорнай шавялюрай і густымі нерасчасанымі вусамі той славенец выглядаў як нейкі член ЦК ВКП(б) з грузінскім, армянскім або іншым каўказскім прозвішчам, якія, без сумневу, будуць асуджаныя на смерць за здраду і шпіянаж на карысць Гітлера і Чэрчыля, але і тады, перад расстрэльнай камандай, паклянуцца ў вернасці Сталіну. У горадзе пасля вайны напладзілася і асела шмат самых розных твараў і тыпаў, якія былі надзвычай падобныя да персанажаў з раманаў Максіма Горкага і Мікалая Астроўскага ці рабілі ўсё, каб быць да іх падобнымі, як нармальныя людзі часам хочуць быць падобныя

да Джэймса Сцюарта*, але ніхто, як той бязрукі вусач, не быў так дакладна падобны да сваіх узораў. Настолькі, што здавалася, што ён да іх падобны больш, чым яны самі да сябе.

Дык што, таварыш Сікірыч, пачаў славенец пасля таго, як Лука адбарабаніў яму свой адказ пра пазіцыі здаровага розуму, *значыць, ты ведаў, што Сталін дурань і здраднік, калі іншыя пра гэта не здагадваліся. А я, бачыш, за таварыша Сталіна страціў руку. Для мяне было гонарам разам з героямі Чырвонай Арміі вызваляць Бялград, і я верыў, што ён аднекуль глядзіць на мяне. Вялікі правадыр сусветнага пралетарыяту! Я нават не пікнуў, калі застаўся без рукі. Мне было сорамна перад Сталіным! А ты ў гэтым часе лазіў жанчынам пад спадніцы, паклёпнічаў на яго і думаў, што мы ўсе ідыёты. І цяпер табе не сорамна. Я з табой, Сікірыч, не знаёмы, але ведаю, што ты гніда і што трэба было цябе растаптаць ботам і не азірнуцца. Думаеш, ты выкруціўся? Не выкруціўся! Думаеш, твая ўзяла? Не, і ніколі не возьме! Такое гаўно нехта мусіць змыць! Ніхто табе не даваў права абражаць Сталіна!*

Усмешка застыла ў Лукі на вуснах. Ён ужо пашкадаваў, што не паслухаўся ўнутранага голасу, які казаў яму трымацца далей ад гэтага чалавека і спрабаваць быць для яго нябачным, як ён гэта рабіў, сустрэўшы яго на вуліцы.

Мы любілі яго. Мы ўсе! Яго любіў кожны сумленны грамадзянін Югаславіі, кожны антыфашыст, кожны чалавек у гэтым горадзе, калі толькі ён не здраднік радзімы, усташа, чэтнік ці белагвардзеец. Або такая гніда, як ты, Сікірыч! Як твая галава не разумее, што́ ты робіш, калі абгаворваеш прыстойных людзей, антыфашыстаў і партызанаў, якім такая навалач, як ты, нявартая і боты чысціць? Ды ты нявартый, нават каб нам боты чысціць. А наважваешся казаць, што ты супраць Сталіна! Стралялі мы кожнага, хто хоць слова вымавіў бы супраць яго. Кожны прыстойны чалавек націснуў бы на курок. І цяпер будзем страляць тых, хто да Сталінавай здрады быў супраць яго!

Гэта вар'ят, падумаў Лука і пачаў раздумваць, як паклікаць каго-небудзь на дапамогу, бо гэты ідыёт сапраўды мог бы дастаць пісталет і шлёпнуць яго, як сабаку.

Калі б мы саступілі такім, як ты, мы плюнулі б на змаганне супраць фашызму, на мёртвых таварышаў ад Гранады да Ўладзівастока, на Козару і Нярэтву, на мёртвых матак і дзяцей, плюнулі б на нашу маладосць. Але мы гэтага не зробім, Сікірыч! Не зробім дзеля саміх сябе. Не дапусцім, каб мы былі рабамі, а ты быў святы. Ці ты, навалач такая, думаеш, што Адольф Гітлер прайграў бы вайну, калі б не было Сталіна і слаўнай Чырвонай Арміі? А хто тады разбіў бы немцаў? Амерыканцы, можа, ці англічане, тая жменька, што наважылася выступіць супраць фашыстаў? Адзінае, што яны рабілі, гэта кідалі атамныя бомбы і палілі безабаронныя гарады. Такое, хлопча, было іх змаганне супраць Гітлера, а тым часам Чырвоная Армія гінула. І мы гінулі пад тым самым сцягам! І ніхто іншы. Бачыш гэтую руку? Ёю я перарэжу табе горла, а перад тым насяру табе ў рот і прымушу лізаць мне задніцу, калі да мяне дойдуць чуткі, што ты некалі яшчэ некаму сказаў, што ты супраць Сталіна, ці калі пачую, што ты яшчэ хоць раз вымавіш гэтае імя. А цяпер вымятайся адсюль і глядзі, каб я цябе больш ніколі не бачыў.

Лука тады зразумеў, што гэта не тая краіна, у якой ён хацеў бы сустрэць старасць, і што людзі, міма якіх ён праходзіць па вуліцы, не вартыя ягонага страху. У яго пыталіся, ці яму што баліць, чаму ён хмурыцца, хоць дагэтуль ніколі гэтага не рабіў, можа ў яго нехта памёр, а ён толькі думаў, як было б добра, каб яго больш ніхто не пазнаваў. Бо сапраўды, славенец казаў праўду. Сталіна любілі ўсе, і нават сёння, калі яго не любяць, Луку не могуць дараваць, што ён строіў з яго жарты. Іхні Бог упаў з неба, як метэор, больш яго няма і ніхто яму не моліцца. Але злачынства бязбожнасці ад гэтага ніяк не зрабілася меншым. Калі яму гэтага і не кажуць, то напэўна ж так думаюць. Дый як ім думаць інакш?

На свеце існуе няшмат прычынаў, з якіх разумны і добры чалавек пагодзіцца наплявaць сам на сябе, і ўжо напэўна такой прычынай не будзе тое, што нехта быў супраць Сталіна, і выявілася, што ён меў рацыю. Жарты на адрас Сталіна яны маглі яму дараваць, але не даруюць прыгадванне пра іх саміх. Калі ўсе навокал захапляюцца забойцам, патрэбная вялікая мужнасць, каб стаць пасярод плошчы і казаць людзям, што яны памыляюцца, але будзе дурасцю пасля

таго, як захапленне знікне, нагадваць ім, што яны пакланяліся забойцу. Яны заб'юць цябе з усёй жарсцю адмаўлення, якая заўсёды большая за сапраўдную любоў ці нянавісць, бо насамрэч ёсць іх сумай. Учорашняя любоў да дыктатара плюс сённяшняя нянавісць у суме даюць наймагутнейшую чалавечую жарсць, перад якой не выстаіць ніякая фізічная ці духоўная сіла. Не існуе ніякага маральнага інстытута ці інстытуцыі, Царквы ці Партыі, якія заступілі б дарогу дурням, што сёння нагадвалі б некаму, што яны і ўчора былі супраць Сталіна. І гэта таму, што за Сталіна было ўсё чалавечае і нечалавечае. Дурні, якія гэтага не разумеюць, асуджаныя на тое, каб неба звалілася ім на галаву.

Хоць праўда, што калі б не гінула Чырвоная Армія, Гітлер выйграў бы вайну, Амерыка і Англія былі б толькі прыемнай аздобай, элегантным гуманістычным упрыгожаннем пры мільёнах забітых Сталінавых салдатаў.

Калі Радыё Лондан паведаміла пра Сталінаву смерць, Лука пакінуў карты і сяброў-карцёжнікаў; ён нават не надзеў паліто, бо яму гэта ў такой сітуацыі здавалася непатрэбным, што́ яму бура і ўраган, калі Сталіна больш няма! Ён пайшоў да сястры, бо яна была адзіная, перад кім ён мог свабодна радавацца і пры гэтым яму не забаліць страўнік і яго не схопіць адчай ад таго, што будзе радавацца яна. Зрэшты, ёй было ўсё роўна. Што са Сталіным, што без Сталіна, яе жыццё ішло сваім парадкам.

Памёр і больш яго няма, сказала яна, *а ты зараз заробіш запаленне лёгкіх.*

Лука шукаў у буфеце за каструлямі і талеркамі бутэльку з ракіяй. Рэгіна заўсёды хавала яе ў іншым месцы, каб менш пілі, апроч таго яе нервавала, калі мужчыны, толькі ўвайшоўшы ў дом, адразу шукалі, дзе схаваная ракія.

Слухай, ну дальбог, дай мне ўжо тую бутэльку, Сталін жа ж памёр! сказаў ён, не знайшоўшы яе і пад умывальнікам. Яму была патрэбная ракія, каб самога сябе пераканаць, што Іосіфа Вісарыёнавіча больш няма.

Пад вечар, каля пятай гадзіны бура раптам перастала, усе адразу павыходзілі з дамоў, моўчкі разглядалі паламаныя галіны шаўкоўніц

і смакоўніц, мыском ботаў штурхалі сарваныя са стрэхаў абломкі дахоўкі. Асцярожна, быццам гэта бомбы, якія могуць выбухнуць.

Хоць большая частка горада засталася без электрычнасці і мала было такіх, хто мог чуць навіны на Радыё Лондан, усе ведалі, што памёр Сталін. Але пра гэта не гаварылася. Калі нехта хацеў праверыць, ці ведае сусед, то проста касавурыў вочы і рабіў грымасу. На гэта быў такі самы адказ. Грымаса, некім ужытая першы раз, перадавалася з твару на твар, так што ўрэшце ўвесь горад носам і вачыма задаваў пытанне і даваў адказ пра Сталінаву смерць. Няма такога парыжскага майстра пантамімы, які б навучыў адначасова столькі людзей рабіць тыя самыя рухі. Здарылася гэта пасля вялікай буры пятага сакавіка 1953 года, працягвалася цэлы надвячорак, а пасля грымаса згубілася, знікла назаўсёды ці да смерці нейкага новага Сталіна. Пакуль Радыё Загораб і Радыё Бялград не перадалі навіну, падкрэсліўшы, кім і чым для народаў сацыялістычнай Югаславіі быў Сталін, людзі не наважваліся пра гэта загаварыць. Дый хто б пасля ўсяго мог наперад ведаць, як трэба ставіцца да Сталінавай смерці. Лепш спачатку паслухаць, што скажуць Ціта і Партыя, а пасля ўжо спакойна пасылаць Сталіна да ўсіх д'яблаў.

Як толькі сунялася бура, настаўніца адпусціла вучняў дадому. Яны засталіся ў школе на тры-чатыры гадзіны даўжэй, але лепш так, чым заўтра пачнуць прыходзіць раз'юшаныя бацькі. Дыяна нацягнула на галаву шапку і пабегла дамоў, упэўненая, што маці не паверыць, калі яна скажа, што іх затрымала настаўніца. Яна хацела вярнуцца хутчэй і таму, што дзеці, як толькі выходзілі са школы, пачыналі з яе здзекавацца. У школьным двары нехта адзін зрываў з яе галавы шапку, а астатнія пачыналі ёю перакідвацца, яна бегала ад аднаго да другога, але шапка была ўжо ў іншым баку; у гульню ўключалася ўся школа, і не было рады, пакуль не з'яўляўся нехта з настаўнікаў, усе разбягаліся, і яна ўрэшце дабіралася да сваёй шапкі. Другой у яе не было, і яна ведала, што калі шапку скрадуць, маці будзе ўсё роўна – яна скажа: дык і ты ў іх скрадзі! Гадзінамі яна бегала па двары, як муха без галавы, у жаху ад адной толькі думкі, што будзе рабіць без шапкі, пакуль у яе адрастуць валасы. Натуральна, яе ўпартасць толькі падахвочвала дзяцей, і гульня з Лысай

Дэлаваліхай здабыла ў школе выключную папулярнасць. Нават большую, чым улюбёная забава – злавіць ката, кінуць яго ў мора і шпурляць у яго камянямі, калі ён будзе спрабаваць вылезці з вады.

Калі яна прыйшла дадому, дзядзька Лука быў ужо п'яны як гразь. Ён спяваў нейкую рускую песню і цягнуў Рэгіну за край спадніцы, каб тая да яго далучылася. Яна гатавала і біла яго па пальцах калатоўкай; дзядзька Лука войкаў і казаў, што для рэвалюцыі не шкада ніякіх ахвяраў, спяваў далей, зноў цягнуў яе і атрымліваў па пальцах, войкаў і смяяўся. Рэгіна падсмейвалася, спрабавала строга крыкнуць, каб ён супакоіўся, але і ёй гэтыя выдуры былі прыемныя. У Дыяны яна ні пра што не спыталася. *Яшчэ трошкі, і будзе абед,* сказала яна, *або вячэра, хто яго ведае ў такі шалёны дзень*. І зноў хвастанула Луку па пальцах.

Дыяна любіла яго, як любілі й іншыя, але дзядзька для яе быў тым, чым не маглі быць ні бацька ні маці. Калі ў яе пыталіся, кім яна будзе, калі вырасце, яна адказвала – дзядзькам Лукам! І тады ўсе пераглядваліся і ўсім бывала няёмка, бо дзядзька Лука меў адну хібу. Ніхто яго ёю не папракаў, але ўсе заўсёды мелі яе на ўвазе, а была яна ў тым, што ён ніколі ў жыцці нічога не рабіў і не меў ні тытулу, ні прафесіі. Гімназію ён скончыў на выдатна, казалі, што яму Бог даў талент да матэматыкі, і трэба было вучыцца далей, але пачалася вайна, і ўся навука скончылася. Але ж калі б вайны й не было, малаверагодна, каб ён некалі скончыў універсітэт, бо ёсць у жыцці шмат цікавейшых справаў, чым быць сур'ёзным і паважаным чалавекам. З гімназійным атэстатам ён, вядома ж, мог знайсці працу, але нашто тырчаць цэлымі днямі ў адвакацкай канторы, мясцовай адміністрацыі ці нейкім яшчэ горшым месцы і марнаваць жыццё, калі можна гуляць у карты ці ў шахматы, размаўляць з дзецьмі ці са старымі і радаваць людзей, якіх жыццё выбіла з каляіны і якія, калі б не ён, ніколі ўжо і не ўсміхнуліся б? Для яго не было нічога лепшага і прыгажэйшага, чым бачыць, як нехта яму засмяецца.

Калі нарадзілася Дыяна, ён два месяцы стаяў над яе калыскай, строіў грымасы і крыўляўся, і дарэмна жанчыны тлумачылі яму, што дзіцятка не бачыць і дзядзькавы жарты яму не смешныя. Ён не паверыў у бабскія байкі, дый не паверыў бы, нават калі б гэта сказаў

і самы разумны чалавек на свеце, бо немагчыма, каб пад гэтым небам быў чалавек, няхай двух дзён ці двухсот гадоў ад роду, які не засмяяўся б. І калі двухмесячнае немаўля ўрэшце яму ўсміхнулася, у Лукі паліліся слёзы ад шчасця. Ён узяў Дыяну на рукі, *дзіцятка маё дарагое, рыбанька мая мілая, кветачка мая прыгожая,* плакаў ён, і ўсім было дзіўна, што і яна не заплакала. Бо яна адразу скуголіла, як толькі іншыя бралі яе на рукі і нешта ёй казалі, замест таго, каб проста маўчаць і дыхаць.

І так, замест таго, каб працаваць, Лука цэлымі днямі ганяў паветра. Праўда, тое самае рабілі і многія іншыя ягоныя аднагодкі. Калі нехта ў вайну не далучыўся да ўсташаў ці партызанаў, а недзе хаваўся, падрабляў дакументы, падманваў дзяржаву і людзей, дык найчасцей і пасля вайны не надрываўся ў пошуках працы. Такія, напэўна, разлічвалі, што кожны здольны падмануць войска, каб не ахвяраваць сабой за бацькаўшчыну, здолее падмануць і само жыццё. У горадзе такімі маладзёнамі пагарджалі, а часта і адкрыта ненавідзелі. Нярэдкія былі даносы ўсташаўскай паліцыі, а пазней і партызанскім уладам, што ў нейкім склепе хаваецца вайсковы ўхіліст ці што варта было б праверыць нечыя паперы аб няздатнасці да вайсковай службы. Дэзерціраў у народзе паважалі менш за падпольшчыкаў ці прыхільнікаў ворага. Стукачы за часам абодвух рэжымаў былі тыя самыя і ніяк не цярпелі ад таго, што мяняліся ўлады і дзяржавы, як цярпеў той, пра каго даведваліся, што ён каралеўскім уладам здаў нейкага ўсташу ці данёс усташам на камуністычнага падпольшчыка. Не лічылася злачынствам прыцягнуць да адказнасці кожнага, хто ўратаваў сваю задніцу з пашчы гістарычнай неабходнасці, бо тады як моладзь сцякала крывёю ў Сталінградзе* і бараніла харвацкія межы на Дрыне*, вызваляла Бялград і трымала Срэмскі фронт*, закладаючы падмурак новай Югаславіі, а старыя баяліся, што застануцца галоднымі ці што брытанцы і немцы ў выніку авіяналёту зраўняюць горад з зямлёй, бесклапотнае ігнараванне вайсковага абавязку ўспрымалася найгоршай абразай.

Адзіны, каму гэта прабачалася, быў Лука. Людзям быў патрэбны весялун. Але ўсё роўна было непрыемна чуць, калі Дыяна яшчэ зусім малой дзяўчынкай казала, што, як вырасце, будзе дзядзькам Лукам.

Каля восьмай гадзіны ён вырашыў пайсці адзначаць Сталінаву смерць разам з усімі, хто гэта святкуе. Рэгіна дарэмна стрымлівала яго, казала, што ўжо позна і што ён зашмат выпіў, а калі хоча яшчэ – вось яму новая бутэлька і чорт яго бяры, толькі хай сядзіць дома. А ён хацеў быць з людзьмі, ракія прымусіла яго забыцца, што́ тоіцца ў іхняй радасці і чаму яны радаваліся раней. Ён выйшаў з дому, і Рэгіна ледзь нацягнула яму Іваў палітон, бо ён адбіваўся і казаў, што яго ў сэрцы грэе гарачая печ рэвалюцыі.

Нічога з таго, што адбывалася далей, ён раніцай прыпомніць не мог. Ён прачнуўся ў канаве пры дарозе, што вяла да горных сёлаў, збіты, з паламанымі косткамі і абмазаны гаўном. Той, хто яго біў, стараўся як найболей знявечыць яму твар. З расквашаным носам, з якога тырчалі косць і храсток, з паламанымі скулавымі косткамі і з набрынялымі вачыма – такога Луку Сікірыча было немагчыма пазнаць. Яго завезлі ў гарадскі шпіталь, дзе лекары зашылі ўсё, што можна было зашыць, управілі косці, якія можна было ўправіць, і сказалі, што цяпер застаецца толькі чакаць. Калі ён перажыве гэты і наступны дзень, дык можа і выкараскаецца. *Прапаў за Сталіна!* шапталі ў горадзе, людзі заклапочана ківалі галовамі – як дзьмухаўцовы луг пад ветрам, – і ўсім было шкада. А каму не шкада – ківалі яшчэ мацней.

Пакуль Лука ляжаў у шпіталі, ён быў упэўнены, што ўсё гэта зладзіў следчы славенец і што яго збілі удбашы. Праз некалькі месяцаў ён зразумее, што гэта мог быць любы, каму ён нагадваў, як той хваліў некалі Сталіна, ці хто ведаў, што і яму ў Лукі ёсць што нагадаць. Спатрэбілася тры тыдні, каб ён, хістаючыся, устаў з ложка з тварам, не падобным на свой ранейшы. І праблема была не так у шнарах, як у тым, што змяніўся сам выраз твару. Замест вясёлага і маладжавага трыццацігодка, які перад дзяўчатамі ў Мэткавічы і Мостары мог прыкідацца гімназістам, з люстэрка на яго глядзеў чалавек сярэдніх гадоў з мутнымі невыразнымі вачыма, занадта высокім ілбом і сплюснутым носам. На той галаве ад усяго жывога засталіся толькі два крыху адтапыраныя вухі. Але і яны нікому не здаваліся смешнымі.

Аднак Луку да смерці напалохала нешта іншае. У люстэрку ён бачыў твар старэйшага брата Бэпы, які, вярнуўшыся з вайны,

звар'яцеў і памёр у сараеўскай вар'ятні Ягамір. Ён ніколі не быў да яго падобны, казалі, што Бэпа, калі параўноўваць яго з братамі і Рэгінай, быццам быў ад іншых бацькі і маці. Лука падумаў, што гэта знак, што і ён гэтак скончыць, калі застанецца тут, у гэтым гнілым горадзе і ў гэтай шалёнай краіне.

І так ён вырашыў уцячы з Югаславіі. Пашпарт ён прасіць не збіраўся, бо ўсё роўна не атрымаў бы, а толькі б выклікаў падазрэнне, і вырашыў уцякаць так, як і ўцякаюць праз дзяржаўныя межы – разам з ваўкамі і мядзведзямі, разбойнікамі, злачынцамі, прамыслоўцамі і курвамі, прайдзісветамі, што бягуць ад закону, і роўна гэткімі ж прайдзісветамі, упэўненымі, што бягуць зарабіць капітал. Няважна, да каго яго потым залічаць, бо як толькі ты эмігруеш, ты так ці інакш вешаеш сабе на карак грахі ўсіх, хто неяк і некалі зрабіў тое самае.

Месяц збіраў ён сілу і грошы. У горадзе дзівіліся, што Лука зрабіўся сур'ёзным, а можа яно й добра, нельга ж усё жыццё жыць адным смехам! Варта некалі і задумацца над жыццём; віно не любіць, калі ім боўтаюць, а галавой варта баўтануць, навучалі яго пенсіянеры, гуляючы па Парпарэле*. Праз партовых курваў Лука пазнаёміўся з нейкім амерыканскім мараком, яго звалі Олівэр Рыд, ён ніколі не забыўся гэтага імя, і той марак запрапанаваў яму працу, якая палягала ў наступным: трэба тры скрыні, якія ён мае на караблі, завезці ў Ябланіцу* і перадаць нейкаму чалавеку. Той чалавек дасць яму грошы, якія Лука мае перадаць Рыду, і ўся праца!

Што ў скрынях? спытаўся ён у амерыканца. *Гэта не твая праблема,* адказаў той. *Ну, калі не мая праблема, дык нічога не выйдзе,* лагодна сказаў Лука, больш думаючы пра тое, як Рэнаце, наймаладзейшай і найлепш захаванай курве запусціць руку пад спадніцу, а тая, ухмыляючыся, памалу адсоўвалася ад яго.

Ганарар тры тысячы долараў, сказаў Олівэр, ведаючы, што такія грошы Лука ніколі ў жыцці не бачыў. За тры тысячы долараў пасля вайны можна было купіць усё, чаго дзяржава не нацыяналізавала: дамы, вінаграднікі, палі, – і яшчэ засталося б.

Я не ў такой сітуацыі, каб пагадзіцца. І не ведаю, якая б мусіла быць сітуацыя, каб я пагадзіўся на такую прапанову, сказаў Лука.

І, не могучы Рэнаце запусціць руку паміж ног, схапіў яе за цыцку, на што яна ўляпіла яму поўху. *Хлопча, асцярожна, гэта каштуе грошай!* усміхнуўся амерыканец. *Добра, магу запрапанаваць табе чатыры тысячы, але гэта апошняя цана.*

Лука паглядзеў на яго, не верачы: *Чатыры тысячы долараў! Я яшчэ менш у такой сітуацыі, каб страціць галаву за чатыры тысячы долараў. Скажы, што ў скрынях, тады дамовімся. Але ведай, калі там зброя або нейкая прапаганда, дык на мяне не разлічвай.*

Які б ён ні быў абыякавы да Ціта і Партыі, Луку і ў галаву не прыходзіла пераносіць улёткі і зброю нейкім чэтнікам і ўсташам толькі таму, што амерыканцы думаюць, што самі сябе надурылі, дапамагаючы партызанам. Зрэшты, ён і не верыў, што надурылі. Або прынамсі не надурылі нас, бо калі б у 1945-м прыйшоў нехта іншы замест камуністаў, тут недалічыліся б не людзей, а цэлых народаў, і хто ведае, калі б тая вайна скончылася.

І не зброя, і не прапаганда, сказаў амерыканец, *а лекі, пеніцылін, каб дзеці не паміралі ад звычайнай прастуды і камуністы не карысталіся гэтым у прапагандысцкіх мэтах,* перайшоў на сур'ёзны тон Олівэр, перш чым згадаў камуністаў.

І таму ты вырашыў займацца кантрабандай пеніцыліну. Мушу прызнаць, што ты малайчына. Добра, давай, я згодны! Завязу гэта ў Ябланіцу і вазьму твае чатыры тысячы долараў. Але Лукава працягнутая рука павісла ў паветры. *Тры тысячы, бо я сказаў табе, што́ ты павязеш,* сказаў амерыканец.

Нічога не выйдзе! устаў Лука абражаны, вырашыўшы, што больш не пагодзіцца і на чатыры. Доўга Рыд цягаў яго па верфі, не хацеў адпускаць, тлумачыў, што ў Сан-Пэдры ў яго жонка і хворае дзіця і што ён мусіць гэтым займацца, *дык і завязі яму свой пеніцылін!* хіба ж яму не шкада людзей, якіх бы ён мог уратаваць і хіба ён не задумваўся, якое жыццё мог бы мець за чатыры тысячы долараў… А пра тры тысячы ён сказаў толькі таму, што думаў, што людзі ў Югаславіі любяць таргавацца, і зараз гатовы выбачацца і на каленях прасіць яго, каб згадзіўся.

Пакуль ён у пазычаным грузавічку Плывецкага клубу «Дэльфін», канфіскаванай у вайну дзіравай італьянскай ламачыне, ехаў у бок

Трэбіня і далей на Мостар і Ябланіцу, Луку не былі ясныя дзве рэчы, і ён напружана над імі раздумваў. Па-першае: чаму марак абраў для гэтай працы менавіта яго? Па-другое: чаму той думае, што Лука прывязе грошы, калі ён можна проста згубіцца ў невядомым напрамку з усімі доларамі ў кішэні і даганяй ветру ў полі?

На шляху яго не спыніла ніякая праверка, дарогі былі пустыя, навокал былі відаць спаленыя сёлы, у зялёнай Нярэтве ляжаў мост, які падарваў Ціта, каб уратаваць параненых, у пыле качаліся стрыжаныя баснійскія дзеці, малыя кашчавыя конікі выцягвалі з канавы бярвёны, а селянін у вайсковай гімнасцёрцы няшчадна хвастаў іх бізуном, мяснік вёў на зарэз двух баранчыкаў, жанчыны ў шараварах, з хусткамі на галовах, склаўшы рукі, глядзелі, як грузавічок праязджае міма, спадзеючыся, што гэта знак таго, што нешта робіцца, каб нам усім было лепей, і што калі ўжо не людзі, то міласэрны Алах накорміць і напоіць гэтую ўдзячную і прыгожую зямельку. Грузавічок злучаў між сабою дзве далі, у якіх ім ніколі не выпала пабываць, але яны верылі, што ў тых далях вырашаюцца ўсе важныя рэчы, а таму важныя і людзі, якія па тых далях ездзяць. У тыя месяцы анёлы ўсіх трох вераў кожны сонечны дзень луналі з аднаго ў другі канец небакраю.

У Ябланіцы ў дамоўленым месцы, у кавярні «У Эдхэма Піўца», яго сустрэў вельмі тоўсты маладзён з лагодным тварам і неверагодна прыгожымі вачамі, падобнымі на сабачыя, якім верыш, нават калі яны хлусяць. Маладзён сказаў, што завуць яго Орхан Вэліч, але Лука яму на ўсялякі выпадак не паверыў. Зайшоўшы за кавярню, яны абмяняліся таварам. Орхан праверыў змесціва скрыняў, Лука пералічыў дзесяць тысяч долараў.

Чаму ты гэта робіш? не вытрымаўшы, спытаў ён на развітанне. Орхан усміхнуўся, *калі б я сказаў табе – таму, што я добры чалавек, ты б паверыў?* павярнуўся і пайшоў, перавальваючыся, па алеі таполяў, на якіх віселі ўперамежку чорныя і зялёныя абвесткі аб смерці.

Лука не мог зварухнуцца і не зводзіў з яго вачэй, пакуль ён не знік між таполямі. Чалавека з сабачымі вачыма ён прыгадаў і ў дзень сваёй вялікай перадсмяротнай весялосці. *Калі б ён быў сабакам, то напэўна меў бы лёгкае жыццё. А дзеля таго, што быў ча-*

лавек, дык напэўна яго і забілі, як сабаку, сказаў ён, а Рэгіна, Дыяна і медсястра Патрыцыя, якая зусім не разумела па-харвацку, хапаліся за жываты ад смеху. Тады, вясною 1969-га, Лука Сікірыч, падводзячы рахункі, падумаў, што ў жыцці ён толькі ў адным быў у страце. Людзі смяяліся і тады, калі ён казаў нешта сур'ёзнае або смутнае. Але ён аб гэтым не шкадаваў і смяяўся разам з імі над невядомай магілай пекнавокага Орхана Вэліча.

Калі ён аддаваў амерыканцу шэсць тысяч долараў, той скакаў ад шчасця і кідаўся яго абдымаць і цалаваць. Лука так нічога і не зразумеў. І добра, што не зразумеў, бо ў Ябланіцы ён перадаў Вэлічу фальшывы пеніцылін, які ў яго адкупіла сараеўскае падполле пасля таго, як у апошні момант у яго правалілася здзелка з албанцамі і не засталося іншага выбару, апроч як паскідаць скрыні ў мора ці паспрабаваць нешта амаль немагчымае. Найперш трэба было знайсці некага, хто завязе Орхану Вэлічу фальшывы пеніцылін, што з перспектывы амерыканскага карабля на якары ў дуброўніцкім порце здавалася немагчымым. Пасля трэба было, каб Орхан аддаў грошы і пры гэтым не забіў кур'ера, бо калі б забіў, то ні перад кім бы за гэта не адказваў, а ў яго засталіся б дзесяць тысяч долараў, якія ён мог бы пасля схаваць і ад сваіх. І ўрэшце: той, каму Вэліч усё ж аддасць грошы, мусіў быць настолькі сумленным, каб яшчэ іх і прывезці. Калі ён запрапанаваў Луку тры, а пасля і чатыры тысячы долараў ганарару, ён быў цалкам упэўнены, што ўсё праваліцца. Ён спрабаваў дамовіцца з шалёнай верай піянераў з Дзікага Захаду, якія не здаваліся, пакуль заставаўся хоць найменшы шанец на поспех. Праўда, Олівэр Рыд нічым не рызыкаваў, калі толькі не жыццём невядомага чалавека, якому лёс наканаваў заплаціць па чужым рахунку.

І так да наступнай зімы па ўсёй Босніі паміралі людзі, лечаныя фальшывым пеніцылінам, да канца спадзеючыся выздаравець, бо пілі амерыканскія лекі. Можа яны засталіся б жывыя, калі б не было Лукі Сікірыча, як і ён, можа, не застаўся б жывы, калі б не падаўся Орхану Вэлічу сімпатычным; ён увогуле не выглядаў ні кантрабандыстам, ні крымінальнікам – калі Орхан глядзеў на яго, ягоныя вочы адпачывалі.

У апошнюю ноч перад уцёкамі ў Італію Лука Сікірыч сабраў у закінутай верфі ўсіх партовых курваў. Елася і пілося да раніцы, а ці рабілася нешта яшчэ, даведацца цяжка, але гэта было малаверагодна. Лука быў адзіным мужчынам сярод іх трыццаці, а з жанчынамі ў яго выходзіла ня надта. Раз на год ён клаўся на нейкую, каб праверыць, ці што не змянілася, або, каб паказаць, як добра ён умее з курвамі, на вачах у іншых мужчынаў запускаў якой-небудзь руку пад спадніцу. І гэта было ўсё. На развітанне ён даў кожнай столькі грошай, каб яны цэлы месяц не мусілі нічога рабіць і жылі пакаралеўску, і адышоў. Можа хто іншы тады падумаў бы, што Лука Сікірыч вар'ят, але курвы ўсе да апошняй былі ўпэўненыя, што ён анёл. Праз шаснаццаць гадоў на ягонае пахаванне прыйшлі ўсе, хто яшчэ быў жывы. Прыйшлі і маладзейшыя, дзеля пашаны да старых добрых часоў, у якіх ім жыць не давялося. Было суцяшэннем ведаць, што былі некалі такія часы і такія людзі або анёлы, якія давалі курвам грошы, пілі і курылі з імі і нічога не прасілі ўзамен.

А сёмай раніцы, яшчэ п'яны, ён прыйшоў развітацца з Рэгінай і Дыянай. Малая толькі што ўстала і рыхтавалася да школы, а сястра сядзела каля печы і абірала фасолю.

Я ад'язджаю, і можа мы больш ніколі не пабачымся, сказаў ён. *Не вярзі лухты, калі п'яны!* спакойна адказала Рэгіна. Ён падхапіў Дыяну на рукі. *Дыя, душа мая…*, пачаў ён і не ведаў, што казаць далей. *Трымайся, душа мая!* сказаў ён, пакінуў на стале тысячу долараў і пайшоў.

Ён не сказаў ні з богам, ні да пабачэння, і Рэгіна ўздыхнула: загубіць яго тая праклятая ракія. Толькі калі палушчыла фасолю і ўстала, яна ўбачыла на стале грошы і ледзь не страціла прытомнасць. Яна добра ведала, колькі вартая тысяча долараў. Столькі нябожчык Іва не зарабіў бы і за паўгода плавання. Яе ахапіла паніка, яна выбегла з дому шукаць брата, але была дастаткова разумная, каб нікому не казаць пра долары, бо калі б сказала, Луку злавілі б яшчэ да таго, як ён дабярэцца да мяжы ў Горыцы*. *Вешацца пайшоў, гора ж ты маё!* загаласіла яна ў двары і ўзняла суседзяў на пошукі. Зазірнулі на кожнае гарышча, шукалі па схаваных затоках і парках, і, не знайшоўшы, праз два дні паведамілі пра знікненне ў міліцыю.

Праз месяц прыйшла паштоўка з Мілана, у якой пісалася: *Я жывы і здаровы. Не вярзу лухты, калі п'яны. І трымаюся, як душа мая. Ваш Сцепа Бобэк!*

Ён баяўся, каб не наклікаць на іх бяды, і таму падпісаўся імем папулярнага футбаліста, аднаго з тых, што летась на Алімпіядзе ў Фінляндыі перамаглі рускіх. Ён ведаў, што абедзве зразумеюць, хто ім піша, і будуць радыя прачытаць тое, што ён напісаў. За некалькі месяцаў ён патраціў усе свае долары, жывучы па міланскіх гатэлях і знаючыся з дзіўнымі людзьмі, якіх бяда прывяла сюды з усіх канцоў свету. Былі тут расейскія графы і прафесары матэматыкі, якія ў 1918-м прыехалі ў палітонах з зашытымі ў іх сотнямі дукатаў, з поўнымі кішэнямі дыяментаў і з тугою, якая ўмомант развеяла ўсё іхняе багацце, так што яны жабравалі па вуліцах і капаліся ў сметніцах. Былі і збеглыя члены Камінтэрна, якія ў трыццаць нейкім годзе ледзь уратавалі шкуру, уцёкшы ад Сталіна, і ўжо дваццаць гадоў хаваліся і ад Мусаліні, і ад італьянскіх партызанаў і камуністаў, і ад саміх сябе, бо апроч рэвалюцыі больш нічога не ўмелі рабіць. Было ў Мілане заграбскае і бялградскае панства, якое ўцякло ў 1941-м ад немцаў, нэдзічаўцаў, усташаў і ваенных мабілізацый ці ў 1945-м ад камуністаў і іхняй помсты. Былі і самыя розныя яўрэі: нямецкія, польскія, заграбскія, венгерскія, румынскія і самыя вясёлыя – баснійскія, якія ўвесь час з некага пакеплівалі, расказвалі непрыстойныя жарты і анекдоты, і толькі калі заставаліся на самоце ў нейкім закутку чыгуначнага вакзалу ці бараку калектыўнага пражывання, тужліва размаўлялі на нейкай дзіўнай мове, якая і была і не была іспанскай, а пасля спявалі жаласлівыя баснійскія песні, якія прыемна слухаць, але пасля якіх не хочацца жыць. Была ў Мілане і розная чэтніцкая навалач, якая цягалася па дзвюх-трох корчмах, утрымліваных італьянцамі з прозвішчамі, што канчаліся на «іч», дзе разбіралася па костачках уся сусветная палітыка і разважалася, куды хіліць кароль Пэтар*, *прайдзісвет, а не кароль, ябаць яго ў румяную дупу!* – іх ахапляла дэпрэсія, бо яны разумелі, што Пэтар не хіліць нікуды, і яны напіваліся як звяры і раўлі так, што трэслася неба над Італіяй, дык і паліцыя абыходзіла іх далёкай дарогай. Але Лука мог пасядзець і з імі, частаваў іх пітвом і далёкімі намёкамі

спрабаваў ім растлумачыць, што ўсе мы браты, бо гаворым на адной мове, на што тыя ківалі галовамі, згаджаючыся; але пасля ён казаў ім, што і баснійцы мухамеданцы нашы браты, і нават камуністы нам браты. *Добры ты чалавек, але кончаны дурань,* глядзелі яны на яго са спачуваннем, упэўненыя, што аднойчы паплаціцца ён галавою, бо любіць гаварыць людзям тое, чаго яны не хочуць чуць. Ягоныя словы добра гучаць у царкве і на смяротным ложы, але ў жыцці гэта не можа быць праўдай. Калі б такая праўда існавала, увесь свет пасля гэтай вайны гарэў бы ў пекле. Была ў Мілане і ўсташаўская бядота. Спехам міналі яны фасады дамоў, быццам прадалі некаму ўласныя цені і саромеліся, каб людзі гэтага не заўважылі. У іх былі вочы дзікіх аленяў, усе яны прадстаўляліся інжынерамі, заграбскімі шляхцічамі ці траўніцкімі бэгамі. А насамрэч нічым такім не былі. Ім трэба было за нешта трымацца, з чаго злітаваліся б навакольныя людзі. Але яны з горыччу разумелі, што якраз з іх не злітуецца ніхто, бо страшнейшых і гнюснейшых за іх грэшнікаў няма. Колькі б Лука ў вайну ні бачыў, кім і чым былі ўсташы ў Дуброўніку і ў ваколіцах, ён не мог паверыць, што гэта тыя самыя людзі. Вочы свінні ці чалавека, які шукае па горадзе сербаў і яўрэяў, каб наталіцца крывёю, тыя вочы ніколі не ператворацца ў вочы лані, думаў ён і прапаноўваў ім дапамогу. Але яны ўцякалі ад яго, думаючы, што ён правакатар, удбашаўскі агент, што ён на месцы прастрэліць ім мазгі ці напхае ў грузавікі і завязе ў Югаславію, дзе на іх спусцяць сербскіх і яўрэйскіх сабак. Былі ў Мілане і два-тры каталіцкія святары, нашы людзі, прысланыя з Рыма, якія збіралі тых рахманавокіх гаротнікаў, хавалі іх па кляштарах і здабывалі ім дакументы на пераезд у заморскія краіны. І з імі Лука таксама спрабаваў уступіць у кантакт. Тыя пакорліва яму ўсміхаліся і гугнявымі біскупскімі галасамі бласлаўлялі той момант, калі Лука знікне з іхніх вачэй.

Нямала розных людзей было ў тым 1953 годзе ў Мілане. Калі б нехта іх здымаў, гэта быў бы адзін з найсмутнейшых фільмаў. Столькі людзей, якія не маюць нічога, апрача таго, што носяць у сэрцы і галаве, якія не маюць месца, на якім маглі б стаць і сказаць – цяпер я тут!

Пакуль не растраціў долары, Лука не адчуваў, што належыць

да свету тых людзей, і яго не мучыла думка, што ён далёка ад месца, дзе ў яго быў дом. Ён слухаў настальгічныя гісторыі пра гарады і бацькаўшчыны, Хэлм, Кракаў, Вукавар, Прагу, Пешт, Варшаву, Чарнопаль, Біталу, Заграб, Бялград, Спліт, Сараева, Скоп'е, Капрыўніцу, Субоціцу, Траўнік, Вену, Баня Луку, Адэсу, Мостар, Талін, Бухарэст і Дуброўнік. Слухаў плач па сваім горадзе і дзівіўся, што не адчуваў па ім тугі. Той чалавек, яго звалі Морыц Фэрара, уцёк з горада ў 1943 годзе, ратуючы жыццё ад суседзяў, якім дзяржаўныя законы далі нагоду лічыць сваім усё, што было ягонае, улучна з Морыцавым жыццём. Мінула дзесяць гадоў, і Морыц быў гатовы ўсё ім прабачыць, толькі каб яны дазволілі яму вярнуцца і паводзілі сябе так, нібы нічога не здарылася. Але ён ведаў, што гэта немагчыма, бо ён не той, каму дадзена прабачаць, гэта *яму* мусілі прабачыць ягоныя суседзі, бо гэта *праз яго* яны апынуліся ў такім становішчы, што прагналі яго, а пасля ўся сусветная гісторыя перакулілася. Былі прынятыя новыя законы, якія абвясцілі старыя законы злачыннымі, а тых, хто іх праводзіў у жыццё, а значыць, Морыцавых суседзяў, – злачынцамі. Быццам тыя людзі калі-небудзь прымалі нейкія законы ці ім супраціўляліся. Калі б не ён, яны не жылі б цяпер у страху, і калі б нават прабачылі яму ўсё іншае, гэты страх прабачыць не маглі. Морыц Фэрара памрэ ад хваробы, у якой няма імя, а найбольш дакладна яе можна было б апісаць як пухліна душы. У ім будзе расці яго родны кут, пакуль не выцягне з яго ўсе жыццёвыя сокі, размякчыць яму косці і ўрэшце заб'е яго; у Мілане ці ў якім іншым горадзе.

Лука верыў, што ён на гэтую хваробу не захварэе ніколі. Ён выехаў з амаль няважных прычынаў у параўнанні з прычынамі Морыца Фэрары. Проста ён быў не такі, як тыя, сярод каго ён жыў, не мог змяніцца ці саманадзейна падумаў, што яго можа абысці стараною тое глупства, з якога разліліся рэкі крыві і праз якое ўсе пасля адчувалі сябе вінаватымі.

Вось жа, існавала нешта, што было яму важнейшае за родны кут, і таму было лагічна, што на настальгію па тым куце ён ніколі не захварэе. Можа і не захварэў бы ці тая хвароба адклалася б на даўжэйшы тэрмін, калі б ён не быў такім марнатраўцам ці меў

больш долараў. Аднак і ў той дзень, калі ён упершыню падумаў, што лепш захаваць грошы на пасля, замест каб у першай-лепшай карчме накарміць кучу гаротнікаў, Лука быў ужо блізка да разумення, што і Мілан – не той горад, у якім ён хацеў бы пражыць сваё жыццё. А калі ён трымаў у руках першыя зароблены ліры, зняўшыся статыстам у фільме пра жабракоў, якія бегаюць за сонечнымі промнямі і ў канцы ўзносяцца ў неба, ён ужо мог зразумець і бязмежную тугу Морыца Фэрары, і вакзальную гісторыю яўрэйскіх вар'ятаў з Хэлма, і прычыны, з якіх расійскія дваране за дваццаць гадоў растрацілі свае дукаты і дыяменты, замест каб укласці іх у нешта і жыць такім самым жыццём, якім жылі ў Маскве і Петраградзе. Як толькі ты не можаш вярнуцца туды, адкуль прыйшоў, ты пачынаеш жыць у вакзальнай чакальні; усё ў цябе часовае і няма ў цябе прычыны нічога пачынаць і планаваць, бо ты чакаеш свой цягнік і няма больш нічога важнага, апрача чакання і пустых размоваў з іншымі чакальнікамі. Той цягнік не прыйдзе ніколі, і пра гэта ведае кожны, хто яго калі-небудзь чакаў, але ж пра гэта не думаеш, пакуль не растраціш апошні дукат, дыямент і долар.

Па сканчэнні міланскага года, калі ён ужо жыў жыццём еўрапейскай вакзальнай галоты і спяваў тужлівыя любоўныя песні свайго краю, Лука вырашыў перасяліцца ў Трыест. Яго адгаворвалі і папярэджвалі, што той горад напалову ў Югаславіі, па ім шнараць Цітавы агенты, часта адбываюцца выкраданні і забойствы – на што італьянцы і амерыканцы збольшага глядзяць скрозь пальцы. З ім магло б здарыцца і так, што ён засне ў Трыесце, а прачнецца ў зэніцкай турме. Дый мала шанцаў, што ён знойдзе ў Трыесце працу. Мясцовыя там жывуць горш, і там шмат аптантаў з Істры*, якія на югаслаўскіх эмігрантаў, як на славянаў, глядзяць скоса…

Але нічога не магло яго пераканаць. Яго нават крыху і вабіла тое, чым яго палохалі. Трыест быў бліжэй. Няважна да чаго, але быў бліжэй, і ўжо гэтым быў больш ягоны. Ён паехаў туды з неазмрочаным адчуваннем, што жыццё можа і павінна быць радасцю, весялосцю і гультайствам, і толькі змрочныя асобы, цяжкія і сабе і іншым, сур'ёзна плануюць кожны наступны крок і турбуюцца, што ім не будзе з чаго жыць. Дык і не дзіва, што ўрэшце яно так і здараецца: яны

прападаюць і паміраюць з голаду. Калі чалавек ніколі не думае пра беднасць, дык вельмі верагодна, што ніколі і не збяднее, быў упэўнены Лука Сікірыч, і ягоны выпадак сведчыць, што ён меў рацыю.

Ужо ў першы дзень у Трыесце ён сустрэў і удбашаў, і тых, хто ад іх хаваўся. У адной карчме, нібыта непрыкметныя, пілі югаслаўскія шпіёны, сакрэтныя агенты і забойцы, а ў другой, за некалькі соцень метраў, збіраліся гэткія ж непрыкметныя ваенныя беглякі, валацугі, падатковыя інспектары і судовыя выканаўцы зніклых дзяржаваў, унтэр-афіцэры квіслінгаўскіх войскаў, а найбольш было тых, хто проста зрабіў памылковую стаўку. Яны рабілі гэта занадта публічна і таму пасля паразы на таталізатары гісторыі падмазалі пяты. Тыя з першай карчмы пра тых з другой казалі, што гэта бандыты, якім трэба скруціць карак, а ў другой карчме пра заўсёднікаў першай таксама казалі, што гэта бандыты, якім скруцяць карак англічане, амерыканцы і ўвесь свабодны свет, як толькі яны збяруцца з думкамі і зразумеюць, што Ціта ў 1945-м усіх іх надурыў. Словы «свабодны свет» сярод несвабодных ужываліся больш як імя і прозвішча казачнага героя, чым як палітычны тэрмін ці літаратурная метафара. Калі яны вымаўлялі «свабодны свет», здавалася, што гэтыя людзі выразна бачаць форму носа, колер вачэй і высокі лоб свайго ўяўнага прынца.

Ні адны, ні другія, ні выганяльнікі, ні выгнаннікі, нікуды асабліва не спяшаліся. Шпіёнам і агентам іх шэфы, відаць, далі неабмежаваныя тэрміны на выкананне іх заданняў, і ім было выгадней расцягнуць іх, чым атрымаць новыя, а іхнія ахвяры тым часам і надалей спадзяваліся, што з дня на дзень Саюзнікі скінуць Ціта і камуністаў і яны вернуцца дадому. Праўда, заўсёды здаралася нешта такое, што адкладала амерыканскую акцыю ў Югаславіі. Спачатку занадта рэзкае абвастрэнне дачыненняў з рускімі, бо Гары Трумэн быў не такі мудры, як яго папярэднік. Пасля тая няшчасная вайна ў Карэі, праз якую нельга было рушыць на Югаславію… Дый Сталінава смерць здарылася не ў найлепшую пару…

Лука адразу пачаў ходзіць і ў адну, і ў другую карчму. Усім казаў і хто ён, і адкуль, і чаму ўцёк з Югаславіі. І ўсе, вядома, былі ўпэўненыя, што ён хлусіць. Сярод агентаў зарадзіўся ціхі сумнеў, што насам-

рэч ён высокі афіцэр і што яго прыслалі з Бялграду на інспекцыю, тым часам як уцекачы былі перакананыя, што Лука – удбашаўскі агент і што яго паслалі з суседняй карчмы, каб ён інфільтраваўся ў іх шэрагі і выведаў чым найболей канфідэнцыйнай інфармацыі. Аднак і аднаму, і другому боку было незразумела, чаму ён не задаваў ніякіх пытанняў і не заводзіў размоваў на палітычныя тэмы, а расказваў анекдоты, выдурняўся, выдумваў розныя падколкі і жартам хаваў ад афіцыянтаў штопар.

Ён кончаны вар'ят! сказаў Рашка Прыбаяц, званы Шайкача, галоўны ў агенцкай карчме. *Не дурны, але і не зусім здаровы,* заўважыў Хусрэф-бег Урумліч, самы самавіты з усіх беглякоў, даваенны камуніст, а ў вайну ўсташаўскі начальнік у Яні. *Можа, яго трошкі папалохаць?* запрапанаваў Лойза Бохіньц, самы малады і амбітны сярод шпіёнаў. *Я б яго павучыў розуму, адбіць яму ныркі, кінуць у канаву, і пабачым, як ён вылечыцца!* разважаў маёр Рудольф Зоўка, адзіны ўсташаўскі афіцэр у бягляцкай карчме. *Кінь дурня ў спакоі,* адмахнуўся Шайкача. *Дурняў Бог беражэ,* сказаў Хусрэф-бег.

Але неўзабаве Лука Сікірыч заўважыў, што ў абедзвюх корчмах ніхто ніколі не смяецца і не радуецца, гэтых людзей немагчыма развесяліць ці прынамсі навесці на тое, каб яны расказалі нешта, што не мае дачынення да вайны і палітыкі. Ён зразумеў, што побыт сярод іх схіляе яго да дэпрэсіі і што ён не мае з імі нічога агульнага, апрача мовы, на якой яны гавораць. Усё іншае яму добра знаёмае, але чужое і агіднае, як могуць быць агіднымі і чужымі толькі свае. Так ён перастаў прыходзіць і ў агенцкую, і ў бягляцкую карчму, і ягонага знікнення ніхто не заўважыў.

Ён уладкаваўся працаваць прадаўцом сыру на гарадскім рынку. Працаваў на нейкага старога селяніна, паходжаннем славенца, які на італьянскім Красе трымаў казіную ферму і быў ужо на мяжы банкруцтва, бо перапрадаўцы яго падманвалі, бралі сыр і больш ніколі не паказваліся. Дый сам ён меў дзіўнаваты характар тых горцаў, якія, доўга жывучы ў адзіноце, становяцца недаверлівымі параноікамі і сумняваюцца нават у людзях, якіх убачаць на суседняй гары, а не тое што ў прадаўцах на рынку.

У цябе гадзіннік, прыгожы. Колькі яму гадоў? спытаўся ён у Лукі

пасля таго, як дзве гадзіны яго ацэньваў, і той ужо хацеў ісці і паглядзеў на гадзіннік, каб знайсці зачэпку, што спяшаецца. *Сто гадоў. Можа і болей,* адказаў ён. *Напэўна, вельмі дарагі?* цікавіўся далей селянін. *Не ведаю. Мне дарагі, бо дастаўся ад дзеда,* сказаў Лука. *А ты любіў дзеда?* дакучаў стары.

Луку было няясна, чаго ён хоча, ён пачаў ёрзаць і нервавацца. *Любіў. Нашто б я захоўваў гадзіннік, калі б не любіў. Даўно ўжо прадаў бы.*

Стары заззяў, скочыў з крэсла і працягнуў яму руку. Лука, не ўстаючы, збянтэжана паціснуў яе. *Дамовіліся,* радасна прамовіў селянін, *я табе дам сыр, а ты мне пакінеш гадзіннік як заклад, што не падманеш мяне! Вярну, калі прынясеш мне грошы за сыр.* Лука моўчкі дастаў гадзіннік з кішэні і працягнуў яго старому.

Ён зрабіў гэта не таму, што яму было так важна атрымаць гэтую працу; яму проста спадабалася гэтая гісторыя, ён абавязкова яе яшчэ некаму ў жыцці раскажа; апрача таго, нашто расчароўваць старога, які так узрадаваўся сваёй цудоўнай ідэі.

Праца з сырам была, кажучы праўду, першай працай у Лукавым жыцці. Але замест таго, каб яна стала нейкім пакутлівым абавязкам, выявілася, што хадзіць штодня на рынак было амаль тое самае, што хадзіць у карчму, толькі што на рынак прыходзяць цікавейшыя людзі.

Прадаўцы прыходзілі на рынак а пятай гадзіне раніцы, каб заняць прылаўкі і чым хутчэй распрадаць свой тавар, а Лука прыходзіў а дзявятай, расстаўляў паходны столік, выкладаў на ім сыры, колькі ўлазіла, і пачынаў сваё шоў. Ён выкрыкваў назвы ўсіх гатункаў сыру, якія некалі чуў, ці расказваў па-харвацку жарты і анекдоты пра вядомых палкаводцаў і дыктатараў, так што італьянскія бабулькі спыняліся і глядзелі на яго як на дзявяты цуд свету.

А Напалеон, даражэнькія мае, Напалеон не любіў ні паесці, ні выпіць. Можа, меў хворы страўнік, можа, хварэў на нервы, ці, можа, пашкадаваў яму Бог ферментаў і кіслот, каб лёгка ператраўляць ежу. Сапраўдную прычыну гісторыя не зафіксавала, а дзеля адсутнасці жывых сведкаў, найпрасцей будзе сказаць, што Напалеон ніколі як след не абедаў і не вячэраў. Замест таго, каб есці, ён заваёўваў свет.

Замест таго, каб піць, Напалеон ваяваў. Дык, даражэнькія мае, ці быў Напалеон вялікім чалавекам? Вось, панічка, скажыце вы: ці было б вам прыемна, калі б ваш паважаны муж, замест каб з'есці за абедам гэтыя цудоўныя скумбрыі, што вы купілі, узяў пісталет і пачаў страляць па вуліцы, пазабіваў бы суседзяў і пайшоў заваёўваць свет?

Пані ўсміхалася, узнімала бровы і паціскала плячыма. Ці то таму, што яго не разумела, хоць бальшыня жыхароў Трыеста ведала славенскую або харвацкую, ці то проста думала, што на такія пытанні не трэба адказваць, каб не забіраць у пытальніка час на працяг гісторыі.

Вядома ж, вам было б непрыемна! Вы падсмажыце яму скумбрыі, замяшаеце марынад, накорміце і напоіце, а пасля, паабедаўшы, пойдзеце ўдваіх трошкі прылегчы і будзеце слухаць, як чайкі б'юцца за рыбіны галовы, нюхаць, як пахнуць сосны, і думаць, якое жыццё цудоўнае. А Напалеону яно зусім не здавалася цудоўным! Напалеон быў няшчасны, не мог ні паесці, ні выпіць, а ўсё, што ён меў ад жыцця, вымяралася мільёнамі гектараў чужой зямлі і мільёнамі жыццяў яго салдатаў. Напалеон не быў вялікім чалавекам! выкрыкваў ён у канцы, высока паднімаючы ўказальны палец і трымаючы яго нейкі час у паветры, а пасля ўжо цішэй і спакайней дадаваў: *Даражэнькія мае, гэты сыр выдатны, я ем яго кожны вечар і мне яшчэ не надакучыла, калі ласка, купляйце!*

Людзі, што збіраліся вакол Лукі, як зачараваныя, куплялі ягоныя сыры, і ўжо да дзясятай гадзіны ўсё было распрадана. Неўзабаве пачало здарацца так, што частка публікі заставалася без сыру, і ён мусіў выбачацца перад жанчынамі і забаўляць іх новымі гісторыямі. Па-італьянску ён ужо гаварыў, як па-свойму, але гастранамічныя жарты і анекдоты пра палкаводцаў і дыктатараў заўсёды расказваў па-харвацку. Так яму здавалася больш дарэчным, дый не ўсякая мова надаецца на розныя глупствы.

Скончыўшы працу на рынку, ён ішоў да старога і аддаваў яму грошы. Той даставаў гадзіннік з драўлянай шкатулкі і клаў яго перад Лукам, ішоў па новыя кошыкі з сырамі, і калі Лука іх браў, стары зноў забіраў гадзіннік, замыкаў яго ў шкатулцы і заўсёды паўтараў тыя самыя словы: *Ты мне ліры, я табе гадзіннік.*

Так яны працавалі разам год, казіны статак вырас удвая, стары наняў на ферму пяць новых работнікаў, каб вырабіць столькі сыру, колькі трэба было Луку, але гадзіннік заўсёды вяртаўся ў шкатулку. У гэтым не было нічога дрэннага ці проста Лука не бачыў у гэтым нічога дрэннага. Было смешна і ў нейкім сэнсе нават міла, як мілымі бываюць дзіцячыя казкі, у якіх звар'яцелыя каралі, пустэльнікі і чарадзеі робяць нешта такое, чаго ніхто на свеце не разумее, але ў канцы гэта ратуе свет.

Ці ты мне ўсё яшчэ не верыш? спытаўся ён у старога, калі той наняў пікап, бо попыт на сыр быў ужо занадта вялікі, каб насіць яго ў кашах.

Стары пачырванеў, апусціў позірк і, быццам вучань, які не ведае адказу, пачаў адскрабаць пазногцем трэску са стала. *Няважна, мне сапраўды няважна!* Лука пашкадаваў, што зрабіў старому няёмка. *Я табе веру. І верыў ужо пасля таго, як ты першы раз мяне не падмануў. Я хацеў вярнуць табе гадзіннік, а тады падумаў, што нешта пойдзе не так, калі вярну. Я думаў не тое, што ты мяне падманеш, а што здарыцца нешта іншае – пачнецца эпідэмія нейкай хваробы і загубіць увесь статак, ударыць гром і праб'е мне сэрца. І так кожны раз. Я вярнуў бы табе гадзіннік, мне самому страшна, што я яго забіраю, скрозь зямлю праваліўся б ад сораму, але чым больш мне сорамна, тым больш я баюся, што здарыцца нешта дрэннае.*

І так гадзіннік застаўся ў старога. Лука не забраў яго ні тады, калі адкрыў у Трыесце першую краму і прадаваў сыры з усёй Італіі і Францыі, ні тады, калі такія самыя крамы адкрыў у Балоньі і Мілане. Сярод найслаўнейшых сыроў Еўропы пачэснае месца заўсёды займаў казіны сыр з Красу, «Сыр з гісторыяй», разам з якім кожны пакупнік атрымліваў кніжачку, якую паводле Лукавых апавяданняў склаў адзін трыесцкі журналіст. Кніга расказвала пра тое, колькі зла ўчынілі свету людзі, якія не мелі асалоды ад ежы.

Лука Сікірыч зарабіў вялікія грошы і зноў жыў жыццём, у якім нічога не мусіў рабіць, але прынамсі раз на тыдзень ездзіў на Крас. Стары клаў гадзіннік на стол, Лука даставаў грошы, хатняя памочніца прыносіла два кашы з сырам, усё мусіла выглядаць, як першы раз. Аднак усё адно адчувалася, што гэта гульня,

якая прадаўжае жыццё і нагадвае пра прыгожыя часы, чыю прыгажосць людзі ўсведамляюць толькі тады, калі тыя часы незваротна прамінуць. *Мяне ўсё гэта забівае,* паскардзіўся ён старому. Той замаўчаў і адчуў сябе так, як калі яго падманвалі прадаўцы, бралі сыр і знікалі, толькі што цяпер яму не было ўжо на каго злаваць і ніхто ўжо не мог зразумець, у чым быў падман і што мучыць гэтых дваіх, якія, займаючыся ўсё жыццё толькі тым, чым хацелі займацца, падышлі да канца. І канец не рабіў іх шчаслівымі.

Летам 1968 года старому споўнілася восемдзесят пяць, а Луку Сікірычу ў парыжскай клініцы для хворых на рак сказалі, што яму засталося жыць яшчэ тры месяцы. Ён хадзіў па вуліцах, на якіх дзеці гулялі ў вайну. Перакульвалі аўтамабілі, разбівалі вітрыны, вырывалі гранітныя кубікі з бруку і кідаліся імі ў паліцыю, выкрыкваючы рэвалюцыйныя лозунгі. Паліцыянты пускалі слезацечны газ і махалі дубінкамі, і шмат хто з іх са скрываўленай галавою скончыў у шпіталі. Ім было забаронена страляць у дзяцей. Забаранілі бацькі, супраць якіх і была ўзнятая рэвалюцыя. Дурнаватыя жандарскія галовы не маглі гэтага зразумець, пакуль санітаркі залечвалі ім раны, а не зразумелі б і разумнейшыя за іх, калі б не было кніг, фільмаў і асабліва філасофскіх трактатаў, якія зробяць з 1968-га важную палітычную падзею, важнейшую за ўсе вызваленчыя войны, што вяліся ў французскіх калоніях у Афрыцы, а можа і за вайну ў В'етнаме, дзе ў імя тых самых ідэалаў, супраць якіх паўсталі дзеці Еўропы, забівалі тысячы і мільёны пераважна безыменных касавокіх прыматаў. Ніколі не будзе дадзена адказу на пытанне, як рэвалюцыя, у якой контррэвалюцыянерам было забаронена страляць, магла зрабіцца такой важнай гістарычнай падзеяй, але яе канчатковы сэнс будзе вядомы, калі дзеці з парыжскіх вуліц праз дзесяць-пятнаццаць гадоў вырастуць копіямі сваіх бацькоў.

Як у дакументальным фільме школьнай тэлепраграмы мільгалі матросы з Кранштату, штурмавалі Аўрору і Зімовы палац, Роза і Карл выступалі з палымянымі прамовамі і ўцякалі ад раз'юшаных ветэранаў 1914-га, Мао клікаў на Вялікі марш, Чырвоныя Кхмеры ператваралі храмы ў школы, дзе вучні вучылі настаўнікаў, Сталін казаў Не Ціта, Ціта казаў Не Сталіну, а замест Максіма Горка-

га дзецьмі кіраваў брыдкі чалавечак у акулярах. Розніца паміж ім і Горкім была насамрэч розніцай паміж забавай і сапраўднай рэвалюцыяй. Тая рэвалюцыя была крывавая і магутная, і не дзіва, што людзі захапляліся Максімавымі вусамі і ягонымі змрочнымі і недасціпнымі раманамі, а забава была брыдкая і вартая жалю, бо нават дзеці, якімі б захопленымі і раззлаванымі яны ні былі, не разлічвалі, што іхняя вулічная гульня здолее змяніць свет. Яны хацелі толькі перажыць рамантычныя імгненні, якіх былі пазбаўленыя, бо нарадзіліся занадта позна. І ў дадатак да ўсяго, на Захадзе, які не зазнаў чырвонай рэвалюцыі! Гэта быў час прагі да Ўсходу, еўрапейскага і азіяцкага, прагі да гісторыі, якая выглядае такой прывабнай, калі здараецца з іншымі, а яшчэ больш прывабнай, калі ператвараецца ў тэатр ці вулічную гульню.

Гледзячы, як яны нападаюць на дэголевых жандараў і на аперэтачную ўладу мудрага генерала, Лука ведаў, што неўзабаве яны прыйдуць дадому, спацелыя, з мутнымі ад слезацечнага газу галовамі, а крыху пазней, стаўшы дарослымі, з настальгіяй будуць прыгадваць дні, калі парыжскія вуліцы былі падобныя да перадавога дзіцячага садка ленінскага тыпу. У гэтым, мабыць, найважнейшая розніца паміж рэвалюцыяй і гульнёй на рэвалюцыйныя тэмы. Калі рэвалюцыі ніхто асабліва не прыгадвае з цеплынёю ў сэрцы, нават тыя, хто іх ніколі не выракаўся, як той славенец, што падчас наступу Чырвонай арміі страціў руку, рэвалюцыйныя забавы помняцца як найлепшыя імгненні чалавецтва.

Памятны медаль з вайны з часам страчвае сваю вартасць, затое памятныя медалі з 1968 года і запрашэнні на чырвоную забаву будуць пасля паказваць унукам, а тыя будуць здзіўляцца, у якіх жа кансерватыўных монстраў ператварыліся з таго часу іхнія дзяды.

Едучы цягніком у Трыест, ён спрабаваў змірыцца з думкай пра набліжэнне канца. Замест адчаю і смяротнага страху, якія адчуваў бы хтось іншы, Луку мучылі толькі сумневы. Колькі б ён ні пераконваў сябе, што памрэ, нешта ў ім казала, што гэта немагчыма. Смерць – гэта кіношная ілюзія, у якую людзі могуць верыць або не верыць, толькі што ў кіно лепш не ісці, калі не можаш уявіць сабе, што гэтыя хутказменныя карцінкі – гэта жыццё, а памерці

мусіш так ці іначай. Лука хацеў асэнсаваць гэта, бо ён не кальмар і не начны матылёк! Але нічога не выходзіла. Ідэя аб знікненні супярэчыла здаровому розуму, карцінкам, што мільгалі за вагонным акном, пахам людзей, якія выходзілі і заходзілі на станцыях, іхнім галасам і крыкам, таму, як яны глядзелі на яго без смутку і страху, абыякавыя да таго, ці ўбачаць яго яшчэ калі-небудзь. Не можа ўсё гэта знікнуць проста так: праз тры месяцы, праз дзевяноста дзён, праз дзве тысячы гадзін, калі ён цяпер тут і вакол столькі існага, і ён сам частка гэтай існасці, нічым не менш за ручку на дзвярах купэ, за муху на брудна-сіняй фіранцы, за італьянскага кандуктара, што пытаецца ў яго, як яму ўдалося жывым выбрацца з Парыжа, за старую скураную кандуктарскую торбу, якую ён насіў яшчэ за часоў Мусаліні, ён ці ягоны калега, які ўжо даўно на пенсіі; на пенсіі ці на трыесцкіх могілках сярод гандляроў і марскіх капітанаў.

Лука не хоча быць там пахаваны як яшчэ адзін чужынец, над чыім невядомым лёсам будуць смуткаваць летуценныя закаханыя пары. Яго пахаваюць у родным горадзе, сярод знаёмых, дзе нехта некаму можа быць сваяк ці вораг і дзе нічога ні да чаго не абыякавае. Жыць на другім канцы свету ці хоць бы за тысячу кіламетраў ад роднага горада бывае добра і нават карысна, але спачываць у чужой зямлі – гэта нядоля. Кожны чалавек мусіць быць пахаваны там, дзе народжаны ці дзе навучыўся гаварыць і адкуль вырашыў з'ехаць. Як толькі ён адчуе, што прыйшоў канец, ён зробіць усё, каб яго перакінулі праз мяжу, хай для гэтага й давядзецца падкупіць мытнікаў і паліцыю, і каб прывезлі дадому да сястры – каб там сустрэць тое, у што ён не можа паверыць і з чым якраз з гэтай прычыны можа лёгка змірыцца.

Замест трох месяцаў, як яму абяцалі, ён пражыў больш за год. Без вялікіх боляў і пакутаў, худнеючы з дня на дзень і больш палохаючы іншых, чым сябе, Лука дажываў, трымаючыся за штодзённыя рытуалы. Ён і надалей раз на тыдзень ездзіў да старога на Крас, даставаў грошы, глядзеў на гадзіннік і выносіў ад яго два кашы з сырам. Да таго дня, калі ўжо не меў сілы іх падняць.

Францэ, здаецца настаў час вярнуць гадзіннік, сказаў ён. Стары расплакаўся, маліў яго, каб нікуды не ехаў, каб застаўся яшчэ

на трохі, што гэта ўсё ад адлігі. Бо як настае адліга, чалавек страчвае сілу, колькі б яму ні было гадоў і на што б ён ні хварэў. Лука суцяшаў яго, спрабаваў смяшыць, але гэта не дапамагала – тое, што трымалася восемдзесят пяць гадоў, распалася ў яго ўваччу за некалькі хвілін. Знікла грубасць, якою селянін так ганарыўся, бо яна ратавала яго ад голаду, людзей і войнаў, калі ён паміж лініяў фронту прабіраўся са сваімі козамі, не адступаючы і тады, калі на Сочы* і Монтэ Малеты* летам 1916-га гінулі дзеці двух пасвараных каралёў і калі трэба было сачыць, каб жывёліны не скублі крывавай травы і не прызвычаіліся да смаку чалавечага мяса, бо шукалі б пасля толькі такую траву і адвучыць іх ад гэтай дрэннай звычкі было б немагчыма. Ад звычкі, якая з малпы зрабіла чалавека, ад таго смаку крыві, які ўсякую жывую істоту ператварае ў драпежніка. Тады ён зразумеў, што кроўю і мясам не кормяцца толькі тыя стварэнні, якія воляю шчаслівага лёсу іх ніколі не ўчуюць, але калі войны будуць цягнуцца далей і калі на малых горных рачулках загіне яшчэ які-небудзь народ, тады больш не застанецца істотаў, якія скублі б толькі траву і лісце; авечкі будуць забіваць і забівацца, і з іх малака больш не будуць рабіць сыр. Чалавек мусіць быць цвёрды і грубы, каб не страціць розум сярод мёртвых палкоў і дывізіяў і каб разам з козамі, жаручы трупы тых, хто верыў сваім каралям, не зжэрці самога сябе.

Нават у часе найстрашнейшых бітваў Першай сусветнай ён не пакінуў Крас. Не прыйшло яму ў галаву з'ехаць адтуль і праз трыццаць гадоў, калі было невядома, з якога боку пройдзе мяжа італьянскай і Цітавай дзяржавы і калі яго палохалі, што камуністы забяруць у яго козаў. Нашто камуністам ягоныя козы? Штурмаваць з імі Берлін і Пешт, ліквідаваць буржуазію і бурыць цэрквы? У такіх справах ні ад козаў, ні ад казапасаў карысці няма. Таму ўсё роўна, з якога боку пройдзе мяжа і якога колеру будуць сцягі. Нельга верыць ні аднаму, ні другому каралю, іх справы датычаць чалавека толькі пакуль ідзе вайна. І трэба сачыць, каб жывёліны не скублі запэцканага чалавечымі мазгамі лісця і крывавай травы.

Такая была ў старога вера, а дзеля таго, што яна рознілася ад веры, прыхільнікамі якой былі іншыя, ён трымаўся далей ад людзей. Аж

пакуль аднойчы да яго не прыйшоў гэты смешны далмацінец, узяў сыр і пакінуў у заклад свой гадзіннік і гэтым назаўсёды прывязаў яго да сябе. Ён прадаваў сыры так, як ніколі нічога не прадавалася, і выдумляў нешта, чаго ў тых сырах не было, а можа й было, але ніхто раней пра гэта не ведаў. Можа й сыр – гэта не толькі сыр, думаў стары і быў шчаслівы, што і за межамі казінага свету існуе нешта, за што чалавек мусіць змагацца. Калі б не Лука Сікірыч, ён сам да гэтага не дайшоў бы. І тое, што цяпер ён хацеў забраць свой гадзіннік і знікнуць назаўсёды, старому здавалася горшым, чым калі б нейкі вялікі гром, якога няма на небе, пабіў у адзін момант усіх яго тысячу дзвесце козаў. Думка пра сваю ўласную смерць здавалася яму значна лягчэйшай. Не можа чалавек быць такой размазнёй, каб румзаць па тым, што яго больш не будзе.

Урэшце Лука мусіў пакінуць гадзіннік старому і паабяцаць, што прыйдзе зноў. Вымавіць гэтую хлусню яму было няцяжка. Стары яго збянтэжыў і спалохаў, бо мог яго ніяк не ўдавалася рассмяшыць, падмануць у ім дзіцёнка і перавесці праз раку, каб ён пераканаўся, што і з другога боку ўсяго толькі бераг і не трэба хвалявацца, што мусіш туды перайсці. На развітанне стары выйшаў з дому, чаго раней не рабіў, бо заўсёды ішоў па сваіх справах, як толькі замкне шкатулку. Ён махаў з каменнага парога, пакуль Лукаў аўтамабіль не павярнуў за пагорак.

У той самы дзень Лука спланаваў сваё апошняе падарожжа. Патэлефанаваў югаслаўскаму паслу ў Рым, каб распытацца пра свой статус. Праз дзве гадзіны той паведаміў, што супраць яго няма ніякага ордэру, не было і нейкіх іншых асаблівых прычынаў, дзеля якіх Лука Сікірыч мусіў бы баяцца вяртання дадому. Нават запрапанаваў яму югаслаўскі пашпарт, каб пераканаць, што ў краіне супраць яго не вядзецца ніякай справы.

За апошнія пятнаццаць гадоў шмат чаго змянілася, сказаў пасол. Лука нічога не адказаў, хоць яму карцела сказаць, што рэчы мяняюцца і за пятнаццаць дзён, а не тое што за пятнаццаць гадоў, і не было яшчэ такога часу і такой дзяржавы, каб яе пасол не сказаў, што сёння лепей, больш свабоды і законы разумнейшыя, чым пятнаццаць гадоў таму. Праблема толькі, што свабода ніколі так не

павялічваецца, а жорсткасць законаў так не змяншаецца, каб чалавек не мусіў распытваць, ці ён усё яшчэ вінаваты ў нечым перад тымі, ад каго некалі ўцёк.

Апрача таго, Лука не зусім паверыў паслу. Ён вырашыў на ўсялякі выпадак падкупіць мытнікаў, паслаць у Бялград падарункавыя наборы сыру для Маршалата* і па кругу пармезану велічынёю з кола ад трактара мясцовай радзе ў Дуброўніку і гарадскому камітэту партыі. Калі ўсе прымуць свае сыры, гэта будзе знак, што сапраўды на яго ніхто не злуецца, наіўна верыў ён і днямі чакаў афіцыйна падпісаных паведамленняў аб атрыманні падарункаў. Яны прыйшлі праз два дні пасля таго, як ён перастаў уставаць з ложка.

Ён ехаў у карэце хуткай дапамогі, забаўляючы сястру Патрыцыю, бестурботны, шчаслівы і сапраўды ўпэўнены, што сырамі купіў сабе свабоду. Мытнікі не хацелі браць грошы і не разумелі, чаму ён іх прапануе, аднак не адну гадзіну пратрымалі яго на мяжы, шукаючы, перад якой службай гэтыя падарожнікі так правінавацілася, што цяпер спрабуюць іх падкупіць. Але і кіроўца, і Патрыцыя, і італьянскі грамадзянін Лука Сікірыч былі бязвінныя, як немаўляты. Да самага распаду югаслаўскай дзяржавы на памежным пераходзе каля Опічыны з пакалення ў пакаленне мытнікаў будзе перадавацца гісторыя пра хворага чалавека, які прапанаваў вялікія грошы, каб патрапіць у Югаславію, хоць усе дакументы былі ў парадку і ніводная паліцыя гэтага свету яго не шукала. Можа і сёння нейкі дзед паціху, каб ніхто не пачуў, расказвае ўнукам, якая ж гэта была дзяржава, што людзі золатам былі гатовыя заплаціць нават за тое, што ім прапаноўвалася задарма і належала паводле ўсіх законаў.

Лука памёр у сне, стомлены і шчаслівы, бо правёў з роднымі цудоўны дзень. Патрыцыі не давялося закрываць яму вочы. Яна паклала яму руку назад на падушку і дастала з кішэні паперку, якую ён ёй даў, калі яны выпраўляліся ў дарогу.

Калі я памру пасярод ночы, пайдзі да маёй сястры і пабудзі яе. Сон у яе лёгкі, і як толькі ты ўвойдзеш у пакой, яна ўжо не будзе спаць. Калі не, значыць, яна памерла раней за мяне, і наш план прапаў. Ну але гэта малаверагодна, таму перш ты нахіліся да яе і заспявай O tu che in seno agli angeli. Гэта была яе ўлюбёная песня, і ёй будзе

прыемна, што я пра гэта памятаў. Але глядзі, каб не было занадта сур'ёзна. Можаш махаць рукамі, трошкі затанчыць, каб было весялей. І не трэба доўга, каб яна не раззлавалася і не прагнала цябе. Пасля зноў нахіліся і скажы: Лука памёр. Скажы менавіта так, не па-італьянску, бо яна можа зрабіць выгляд, што не разумее. Давай, паўтарай за мною: Лу-ка па-мёр, Лу-ка па-мёр! Добра, але я табе яшчэ напішу, каб ты не забылася, як вымаўляць.

Перш чым увайсці ў Рэгінін пакой яна яшчэ раз паглядзела на паперку, пасля набрала дыханне і гучна заспявала, як прасіў Лука. Можа і не гучала яна, як Марыё Ланца, але *O tu che in seno agli angeli* ўсё роўна ніхто на свеце, апрача яго, ніколі не праспяваў як трэба, пад патрэскванне зайгранай грамафоннай кружэлкі на хуткасці семдзесят восем абаротаў, у духу апошняй эры, калі артысты былі не людзі, а лялькі на нітках сусвету, і таму Марыё Ланца, Энрыка Каруза, Рудольф Валентына і Чарлі Чаплін па сутнасці нічым не розніліся. Лука Сікірыч быў Чаплінам у жыцці тых, каго ён забаўляў, і гэтым ён даказаў, што анёлы нямога фільма і механічнага грамафона сваім знікненнем пакінулі свет без нечага важнейшага за тэхналагічны прагрэс і патрэбу, каб карцінка была праўдзівейшая за рэальнасць.

Але ў 1969-м было ўжо запозна тужыць па анёлах. Медычная сястра Патрыцыя праспявала іх песню так добра, як магла, пад харэаграфію, бачаную ў нейкім фільме Фрэда Астэра, якая можа і не адпавядала таму, чаго жадаў бы Марыё Ланца, але развесяліла б кожнага, каму ўся мінуласць аднолькава мілая і дарагая і каму неістотныя неадпаведнасці паміж дзесяцігоддзямі. Для дваццацітрохгадовай Патрыцыі Фрэд і Марыё былі аднолькава далёкімі постацямі, яна не ведала пра іх нічога, апрача таго што яны належаць свету яе цётак і дзядзькоў, у якім было прынята ўсякую сваю сімпатыю выказваць слязьмі. Яны плакалі падчас тэлевізійных камедый, плакалі, як толькі чулі па радыё ўлюбёную песню, дастаткова было сказаць «Вердзі», каб усе мужчынскія і жаночыя прадстаўнікі роду пачыналі даставаць з кішэняў насовачкі. Яны плакалі нават тады, калі нехта згадваў назву крэму для ботаў, які ўжываўся трыццаць гадоў таму.

Яна ніколі не разумела тых слёз і таго, чаму яны плачуць, калі ім не сумна, і што гэта за туга, ад якой больш прыемнасці, чым ад ней-

кага шчасця. Яны рабіліся нервовыя і бурклівыя, усе гэтыя дзядзькі і цёткі, калі заходзіла гаворка пра нешта дагэтуль жывое, па чым, як думала Патрыцыя, некалі таксама будуць плакаць.

Калі галоўны лекар Фанэлі сабраў усіх сёстраў і спытаўся, хто з іх умее спяваць, і калі азваліся тры, якіх ён пасля завёў у свой кабінет на галасавую спробу, Патрыцыя падумала, што стары здзяцінеў, бо такое нярэдка здараецца з людзьмі ягонага пакалення. Можа яму захацелася, як тым цёткам і дзядзькам, спевамі ўваскрэсіць маладосць, але як толькі ён выбраў яе, склаў рукі і прамовіў: *о, як гэта прыгожа!* яна сур'ёзна занепакоілася, што за гэтым хаваюцца нейкія бессаромныя намеры. *Наш шматгадовы пацыент, пан Сікірыч, наагул цудоўны чалавек, гандляр сырам, і якім сырам! Я, каторы аб'ехаў Францыю і Галандыю і ведаю, што такое сыр, клянуся сваім гонарам, што такога выбару сыроў я не бачыў нідзе. Дык вось, карцынома пана Сікірыча ў тэрмінальнай фазе, і я сказаў яму – Лука, мы сябры, не хачу табе хлусіць, а ён мне адказаў – дарагі мой Фанэлі, што ж гэта за сяброўства, у якім не хлусяць; голую праўду кажуць толькі падаткавікам і жанчыне, якую не кахаюць! Ну добра, не буду пра гэта, вы маладая, вас гэта не цікавіць, дый непрыгожа пераказваць інтымныя споведзі, хоць мне й хацелася б, бо, ведаеце, Лука вельмі дасціпны чалавек, але ладна, справа не ў гэтым, а ў тым, што ён жадае памерці ў сваім горадзе, на другім баку Адрыятыкі, і папрасіў, каб я выбраў яго суправаджаць сястру, якая прыгожа спявае. Ён не сказаў мне, нашто яму спявачка, але я не сумняваюся, што тут гаворка пра нешта вельмі дарэчнае. Вы, Патрыцыя, для гэтага ідэальная! Ведаеце сваю працу, прыгожая і прыгожа спяваеце. А гэта не проста праца, а нешта важнейшае за працу. Пабачыце! Луку вы не забудзеце ніколі.*

У Патрыцыі падкасіліся калені ад страху. Яна была ўпэўненая, што апошняе жаданне паміраючага пацыента было эратычнага характару. Напэўна ж яна яму патрэбная не на тое, каб ён перад смерцю расплакаўся, а як не гэта – дык нашто яму маладая і прыгожая спявачка? Яна не наважылася сказаць Фанэлі «не», але была гатовая страціць працу, калі толькі хворы, якога яна будзе суправаджаць, пяройдзе мяжу. Якую мяжу? А тую, якую яна сама вызначыць.

Два дні раздумвала яна, дзе б тая мяжа мусіла быць, і чым больш думала, тым больш расла яе разгубленасць. Спярша яна цвёрда вырашыла, што не дазволіць гэтаму чалавеку да сябе дакрануцца. Яна задаволіць яго ва ўсім, што не патрабуе дотыкаў. Можа, ён жадае, каб яна пад нейкую непрыстойную песеньку выканала перадсмяротны стрыптыз. Ці згаджацца на такое? Вядома ж, не. Паміж раздзяваннем за грошы і сэксам за грошы розніцы няма. Так што ніякага стрыптызу! Неверагодна, як прымітыўныя людзі застаюцца прымітыўнымі і ў хвіліну смерці.

Але што, калі гэты чалавек ёй спадабаецца? Калі гэта нейкі сімпатычны і мілы тып, менавіта такі, пра якога яна марыць? Калі ён такі, што яна ў яго й закахалася б, калі б сустрэла ў іншых абставінах і ў больш шчаслівых гульнях лёсу? Чаму б перад такім не раздзецца? Таму што гэта пытанне прынцыпаў, ад якіх нельга адмовіцца. Так, але трымаючыся такіх прынцыпаў часцей пра нешта пашкадуеш, чым калі не трымацца ніякіх. Яна вырашыла, што раздзенецца, калі выявіцца, што Лука яе тып мужчыны. Але што калі ён захоча нечага большага? Калі захоча большага, тады гэта дакладна не яе тып. Паводле яе правілаў гэта так, але правілы фактычна тое самае, што і прынцыпы. Гэтыя два словы блізкія паводле значэння, толькі гучаць крыху іначай, дык калі дзеля прынцыпаў можна пашкадаваць, яна пашкадуе і дзеля правілаў. Урэшце яна вырашыла дзейнічаць паводле сітуацыі, але ад гэтага яе страх перад знаёмствам з Лукам Сікірычам быў нічым не меншы. Няўжо я цяпер курва? пыталася яна, збіраючы падарожную торбу.

Паўгадзіны супольнага падарожжа было дастаткова, каб Патрыцыя зразумела, што гэты мужчынскі шкілет з нездаровым шэра-ружовым колерам скуры, якая ад хваробы зрабілася тонкай, як папяросная папера, з тварам, на якім жывымі былі толькі вочы і шнары, а ўсё астатняе было як у дасведчанага мерцвяка, – што гэта і ёсць яе тып мужчыны. Ён мог выглядаць і інакш, быць яшчэ мярцвейшы, з адкрытымі гнойнымі ранамі і пролежнямі, мог смярдзець і мець галаву брантазаўра і драўляныя вешакі замест рук, але Лука ўсё роўна заставаўся б тым самым, каго яна жадала, думаючы, што такія мужчыны існуюць толькі ў яе фантазіях. Дзе яшчэ знойдуцца

смешныя прынцы, якія ўсе прычыны для шчасця знаходзяць у сваіх прынцэсах і няма ў іх у думках нічога іншага, як іх забаўляць?

Яна вырашыла згадзіцца на ўсё, што ён будзе ад яе хацець, і была расчараваная, калі зразумела, што яе выбралі для нечага, што мае стацца толькі тады, калі Лука ўжо будзе мёртвы. Гадамі гэта будзе ёй балець і гадамі яе жаданнем будзе сустрэць некага, каму яна магла б расказаць, як яна жадала раздзецца і спяваць перад мужчынам сваіх мараў, пазнаёміўшыся з ім у апошнія дні ягонага жыцця. І той, каму гэта не падасца дзіўным, той і будзе яе мужам. І ні ў якім разе яна не выйдзе за некага, хто не зразумее яе гісторыю кахання ці падумае, што яна маральна сапсаваная і ёю валодаюць цёмныя жарсці. Патрыцыіны жарсці былі нагэтулькі ж бязвінныя, наколькі бязвінны быў Лука Сікірыч.

Яна спявала ягонае апошняе жаданне, а за акном пачынала днець, на рынку пахмельныя хлопцы з аднаго краю на другі перацягвалі пустыя скрыні, у адкрытае мора выплывалі малыя драўляныя баркі, будзіўся птушыны і кашэчы свет, а жанчына ў начной кашулі скурчылася пры сцяне ў галовах ложка, быццам няўпэўненая, ці яна гэта не сніць. Слёзы паліліся ў яе яшчэ да таго, як Патрыцыя сказала: *Лука памёр.* Яна зразумела, што́ здарылася, а можа проста была падобная да Патрыцыіных дзядзькоў і цётак.

Так Рэгіна засталася без апошняга брата.

IX

Таварышка, калі ў цябе памерла дзіця? трухаў за ёй крываногі чалавечак. Яму магло быць шэсцьдзесят, але было б не дзіва, калі б было і трыццаць. У вар'ятаў і гаротнікаў, якім Бог даў розум пяцігадовага дзіцяці, заўсёды цяжка вызначыць, колькі каторама гадоў. Час у іх цячэ не так, як у нас: у адных хутчэй, у другіх павальней, але ніколі так, як у людзей, якія лічаць сябе нармальнымі. У гэтым і ёсць найбольшая розніца паміж разумнымі і вар'ятамі. Калі яна ўвогуле не адзіная цалкам надзейная.

Таварышка, ад чаго ў цябе памерла дзіця? не здаваўся чалавечак, а калі яна паварочвалася, каб яго прагнаць, уцякаў, хаваўся за дрэва і вяртаўся, калі яна ішла далей, ён бег за два крокі ззаду і задаваў новае пытанне: *Таварышка, ці табе сумна на сэрцы? Ты ж яго пад сэрцам насіла, а цяпер там пуста.* Яна схапіла камень і кінула ў яго, каб напалохаць. Ён адскочыў і скавытнуў, як сабака, якому наступілі на хвост, хоць камень праляцеў не менш як за тры метры ад яго.

Таварышка, вазьмі мяне, я табе буду добрым дзіцем. Мяне не маці нарадзіла, мяне вайна прынесла. Вазьмі мяне, я ваенны трафей, прапаноўваў ён сябе.

Рэгіна спрабавала яго ігнараваць; на шчасце, дарога на Ягамір была пустая, і ніхто не бачыў жанчыны ў чорным і лысага малпяняці, што бегла за ёю, бо той нехта напэўна б засмяяўся, кінуў бы нейкую заўвагу ці схапіў бы чалавечка ды набіў, упэўнены, што бароніць нармальнага ад вар'ята.

Чалавечак адстаў, толькі калі яны дайшлі да брамы вар'ятні, старога аўстра-венгерскага будынка ў засені дубоў, пасаджаных даўно з думкай, што вочы вар'ятаў будуць адпачываць і супакойвацца ў іх густых зялёных кронах, якія між тым ператварыліся ў джунглі, гэткія ж дзікія і бязладныя, як і іхнія душы.

Я сюды не пайду, тут вар'яты. І ты вар'ятка! ён выглядаў спа-

лоханым і расчараваным. Верагодна, ён там ужо бываў ці, можа, дома яго палохалі, што завязуць у вар'ятню, калі не будзе сябе добра паводзіць.

У парку стаялі ці паволі рухаліся мужчыны ў шэрых піжамах. На некаторых паўзверх былі падраныя партызанскія шынялі; адзін быў падперазаны афіцэрскім рэменем, якім відавочна ганарыўся, бо зацягнуў яго, як толькі мог, і пахаджаў сюды-туды, як гусак. Калі яна прайшла праз браму, усе ўтаропіліся ў яе. Ніхто не спрабаваў падысці, кожны глядзеў са свайго месца, у якім у гэты момант быў, няважна, за пяцьдзясят метраў ці ўсяго за пяць. Самыя далёкія, можа, зайздросцілі тым, хто стаяў бліжэй, але не рабілі нічога, каб палепшыць сваё становішча. Рэгіна адчувала сябе няёмка перад сотняй вялікіх ціхіх вачэй. Тым больш, што сярод іх, напэўна, былі вочы ейнага Бэпы.

У Сараева яна прыехала на запрашэнне доктара Хофмана; ён паведаміў, што Бэпа Сікірыч ужо шэсць дзён адмаўляецца ад ежы і, магчыма, зменіць сваё рашэнне больш ніколі не есці, калі да яго прыедзе сястра, якую ён не бачыў ад таго часу, як у снежні 1945-га яго прывезлі з тузланскай казармы спачатку ў псіхіятрычнае аддзяленне тамтэйшага гарадскога шпіталя, а яшчэ праз тры тыдні ў сараеўскі Ягамір, найстарэйшую клініку гэтага роду ў Босніі, заснаваную за часоў панавання Франца-Іосіфа, калі і Франц Хофман як малады лекар прыехаў сюды з Вены. Рэгіна не наведвала брата, бо баялася ўбачыць яго звар'яцелага, яна наагул баялася вар'ятні, бо ёй здавалася, што ў такім месцы яна і сама страціць розум. Калі нейкія хваробы бываюць заразныя, дык заразная і страта розуму. Дарэмна ў кнігах пішуць іначай. Чума і халера пераносяцца з цела на цела, як пылок пераносіцца з кветкі на кветку, калі дзьме спрыяльны вецер, калі добрая тэмпература паветра і калі цела ўжо аслабленае і адчувальнае да вірусаў і бактэрый. А вар'яцтва пераносіцца жахлівай логікай сілы стыхіяў. Розум слабы перад усім, што незразумелае, бо розум – выключэнне, а не касмічнае правіла. Шлях да вар'яцтва – гэта шлях вяртання да логікі скалаў і камянёў, амёбаў, папараці і ўсяго жывога па-за чалавекам. Яна ішла па парку, перакананая, што чума памалу авалодвае ёю, але ў яе не было выбару. Яна не магла проста так дазволіць, каб Бэпа памёр ад голаду.

Перад уваходам на зэдліку сядзеў малады хлапец у сінім працоўным адзенні. Вялікім паляўнічым нажом ён вастрыў алоўкі і складаў іх у металічную скрыначку. Пабачыўшы Рэгіну, устаў. Яна адступіла, заўважыўшы нож, але хлопец усміхнуўся: *Не бойцеся. Я тут працую. Мяне завуць Хамдзія.* Ён перакінуў нож у левую руку, а правую падаў ёй. Ён быў высокі, за два метры, і далонь у яго была вялікая, як вясло, цёплая і мяккая. *Доктар Хофман вас чакае. Тры разы пытаўся ў мяне, ці вы прыехалі. Ведаеце – стары чалавек, венская школа.* Гэты напэўна іх б'е, падумала Рэгіна. А калі прыедуць родныя, прыкідаецца ветлівым, каб не наскардзіліся.

Ён вёў яе змрочнымі калідорамі без вокнаў, у кожным гарэла толькі па адной лямпачцы, са сценаў лупілася і вялікімі лістамі ападала фарба. Ці ж за гэта змагаўся мой Бэпа, падумала яна.

У нас ёсць хворыя, якія тут ужо больш за пяцьдзясят гадоў, але найбольш партызанаў, пачаў Хамдзія голасам турыстычнага гіда. Рэгіне падумалася, што ў гэтым месцы ў кожнага чытаюць думкі.

Ёсць два палкоўнікі, некалькі маёраў, капітаны, ротныя камандзіры, палітрукі і адзін народны герой. Бальшыня з іх прайшлі Суцэску і Нярэтву. Чатыры гады хаваліся па лясах, а тады за першыя тры месяцы свабоды не вытрымалі нервы. Рассыпаліся так, што ніхто іх ужо не збярэ. Страшна гэта, пані.

Яна здзівілася, што Хамдзія заве яе пані. Гэта не было забаронена, але гэта быў знак, і знак небяспечны. Пані і пане кажуць, толькі калі пагражаюць або рыхтуюць змову. Што калі яны хочуць Бэпу атруціць і надумалі ўцягнуць у гэта і яе.

Дальбог, некалі я адчуваю сябе вінаватым перад гэтымі людзьмі. Доктар Хофман мне кажа, што гэта нядобра, але што рабіць. Так ёсць, і кропка. Як жа мне быць невінаватым, калі я адзіны нармальны паміж імі, а яны ж змагаліся за гэтую краіну. Я не змагаўся, бо яшчэ хадзіў у школу, і вось цяпер я нібыта здаровы, а яны нібыта хворыя. Эх, пані, калі б вы засталіся тут крыху даўжэй, вы зразумелі б, што насамрэч цяжка сказаць, хто вар'ят, а хто нармальны, казаў ён, калі яны ўжо трэці раз пераходзілі з аднаго калідора ў другі, праходзячы праз лабірынты і катакомбы, у якіх яшчэ нікога не сустрэлі.

Ай не зважайце на мяне, гавару абы-што, махнуў рукой Хамдзія, калі заўважыў, як Рэгіна глядзіць на яго.

Франц Хофман быў добра захаваны сямідзесяціпяцігадовы мужчына з кучаравымі сівымі валасамі, з вусамі, у якіх кожны волас тырчаў у свой бок так, што здавалася, нібы іх наўмысна разлахмачваюць. Ён быў падобны да сербскага паэта Лазу Косціча з той адзінай фатаграфіі, якую можна было бачыць ва ўсіх школьных чытанках і энцыклапедыях яшчэ за часоў каралеўства Югаславіі. Ён ускочыў, калі яны ўвайшлі ў пакойчык, і пацалаваў Рэгіне руку. Гэта яшчэ больш яе спалохала. Ужо не менш як пятнаццаць гадоў ніхто так не аддаваў пашану яе полу.

Сядайце, калі ласка, сядайце! Хамдзія, дзетка, завары пані каву, замітусіўся стары, быццам пасля доўгіх гадоў чакання да яго зноў прыйшлі госці. *Як вы даехалі?* Рэгіна кіўнула – добра, але не магла гэтага вымавіць. Ёй здавалася – што б яна ні сказала, выйдзе дрэнна і толькі будзе ёй і Бэпу на шкоду. Якую шкоду – яна не ведала дый не магла ведаць у такім месцы, сярод такіх людзей.

Так, гэта далёка, страшна далёка. Я не быў у Дуброўніку ад дваццаць трэцяга. Прыгожы горад, асабліва калі пабываеш у ім малады і пасля ўспамінаеш, і не ведаеш, што было прыгажэйшае – горад ці твая мінулая маладосць. Хофман спрабаваў супакоіць жанчыну і ўзняць ёй настрой, бо верыў, што яна ў сваіх руках трымае ягонае жыццё. Але замест таго, каб сказаць нешта прыгожае, у яго выйшла блытана і дурнавата, тады ён засмяяўся і хлопнуў сябе кончыкамі пальцаў па лбе. Але і гэта нічога не змяніла. Яна сядзела, склаўшы рукі на каленях, і глядзела на яго, быццам ёй быў няясны сэнс яго існавання на свеце.

Ноч пасля таго, як пацыент Бэпа Сікірыч упершыню адмовіўся ад ежы і заявіў, што за сваё жыццё ён з'еў усё, што можна было з'есці, і не збіраецца далей есці косці сваіх мёртвых таварышаў, замяшаныя ў хлеб – бо ворагі народа і спекулянты эканомяць на муцэ, доктар Хофман правёў без сну, ён круціўся ў ложку і думаў, што можа здарыцца, калі ў яго памрэ ад голаду палкоўнік Цітавай арміі, іспанскі змагар і рэвалюцыянер. Як ён пераканае Удбу, Озну і хто ведае каго яшчэ, што ён не вінаваты ў ягонай смерці. Не паспее ён і слова сказаць, як яго выведуць да сцяны шпіталя, у якім ён працуе ўжо пяцьдзясят два гады, і расстраляюць. І яму яшчэ пашанцуе,

калі перад расстрэлам яго не будуць катаваць. Пасля таго, як і на другі дзень пацыент адмовіўся ад ежы і адмаўляўся наступныя тры дні, Франц Хофман напісаў тастамент. А сваёй Тыджы, з якой жыве ад 1907 года, калі яны павянчаліся ў саборы Святога Стэфана ў Вене і яна перайшла ў каталіцкую веру і назвалася Маргарэтай – пра што ніхто ў Сараеве нічога не ведаў і ўсе далей звалі яе Тыджа, – сказаў, што адчувае сябе нібы прыціснутым да сцяны, і рэальна, і метафарычна. І што гэтым разам не мае шанцаў выкруціцца. Тыджа нешта прамармытала і энергічна заездзіла драўлянай качалкай па цесце, якое рабілася тонкае, як папера, але, у адрозненне ад ягонага жыцця, ніколі не прадзіравіцца. Усе гэтыя гады ён пільнаваў, калі Тыджа зробіць памылку і будзе вымушаная замясіць нанава дзіравае цеста, пакуль не зразумеў, што такая памылка немагчымая.

Яны мяне заб'юць, душа мая, спрабаваў ён растлумачыць ёй, што гэтым разам усё сур'ёзна. *Эх, мой Францы, хто пра што, а ты ўсё пра тое, што нехта цябе заб'е. І так ужо дваццаць гадоў. Спярша цябе хацеў забіць Гітлер, бо ты ездзіў да Фройда ў Вену і цябе з ягонымі кнігамі бачылі па кавярнях, пасля цябе хацелі забіць усташы, калі ты не паказаў ім паперы, дзе пішацца, якой веры каторы з тваіх хворых, пасля цябе хацелі забіць партызаны, бо ты немец і з усташамі ды немцамі хадзіў на каляднyя і байрамскія гулянкі. Эх, каб я толькі ведала, хто ж цябе цяпер хоча забіць! Але прашу цябе, і не кажы! Лягчэй будзе спаць. Калі ж ты ўрэшце ўжо набярэшся розуму? Ну хто цябе можа забіць? І хто вар'ятам будзе замяняць розум, калі цябе не будзе? Людзі ж не дурныя. Моляць бога, каб ты чым даўжэй пажыў. Калі ты памрэш, па вуліцах пачнуць хадзіць вар'яты, і ні на чорта вам тады будзе ўсё, і сацыялізм, і Труманавы яйкі*,* казала Тыджа, і ён зразумеў, што няма такога слова, якім ён пераканаў бы яе, што яго жыццё залежыць ад жыцця Бэпы Сікірыча.

Яму крыху палягчэла, калі пасля тэлефоннай размовы Рэгіна пагадзілася прыехаць і пагаварыць з братам. Ён думаў, што яна не прыедзе, што не можа быць, каб гэтая жанчына перамагла ў сабе прычыны, з якіх не наведвала брата. Пра тыя прычыны ён нічога не ведаў, дый яны яго асабліва не цікавілі. У родных, якія не наведваюць сваіх хворых, прычыны заўсёды тыя самыя і не адрозніваюцца

істотна ад прычынаў тых, што кожны тыдзень прыязджаюць у адведкі і пытаюцца, калі ж іхнія блізкія нарэшце выздаравеюць. Не маюць розуму ні адны, ні другія. Першыя – бо думаюць, што іхнія бацькі і сыны ўжо мёртвыя. Але ж не, яны яшчэ як жывыя! Бог ведае, колькі яшчэ будуць жыць, і часта ім бывае вельмі важна, каб нехта іх наведаў. А тыя, што прыходзяць адведаць, не маюць розуму, бо думаюць, што з дня на дзень у іхніх сыноў і бацькаў праясніцца ў галаве. Нібыта галовы тыя запоўненыя вадою і варта толькі пачакаць, пакуль глей асядзе на дно. Але тое, што Рэгіна ўсё ж паабяцала прыехаць, было першым добрым знакам у доўгай чарадзе дрэнных, якія збіраліся апошнія некалькі дзён, апускаючы магільную пліту над чалом доктара Хофмана.

Увайшоў Хамдзія з кавай. На трох медных тацах стаялі тры малыя джэзвы, кожная з накрыўкай, на якой, як на вяршыні мінарэта з паштоўкі, былі паўмесяц і зорка. Філіжанкі былі распісаныя залатымі раслінными арнаментамі, а ў кожнай мініяцюрнай цукарніцы ляжала па два кубікі цукру. *Даваенная ювелірная праца,* горда сказаў Хофман, нібыта выкаваў джэзвы сваімі рукамі. *Цукар мне прысылае сястра з Вены. Яго і там нялёгка знайсці, але ёй неяк удаецца. Я дык не магу піць каву без кавалачка цукру,* працягваў ён і для прыкладу памачыў кубік у каву. Буры колер заліў цукровую бель. Шкада! падумала яна, бачачы, як крышталі растаюць і знікаюць. Саладосць на паднябенні здавалася ёй не вартай знішчэння прыгажосці акуратнага кубіка, працы венскіх майстроў ці беласвецкіх кантрабандыстаў – большай рэдкасці і цуду, чым антычныя статуі, кафедральныя саборы, каменныя аркі дворыка францішканскага кляштара і ўсё тое, што створана рукой чалавека і перажыло вайну. Абодва свае кубікі яна абмакнула і ўмомант укінула срэбнай лыжачкай, каб яны не знікалі доўга, а прапалі адразу.

Ці ён пазна́е мяне? спыталася Рэгіна. *Вядома ж, пазнае. Ён нікога не забыўся. Пра людзей ён думае тое самае, што, як мне здаецца, думаў, калі быў здаровы. Толькі крыху інакш пачаў ставіцца да сябе і да жыцця,* сказаў Хофман і захваляваўся, каб яна не падумала, што ён яе папракае за тое, што не прыязджала, *але ён жыве ў іншым свеце, на іншай планеце, на нейкім Сатурне, бо так яму лягчэй. Мне зда-*

ецца, яму лягчэй, хоць я пра гэта ведаю столькі, колькі і вы. Іначай кажучы – нічога! ён спрабаваў зрабіць гэтую жанчыну супольніцай, спадзеючыся, што гэта дапамагло б ёй адкрыцца, каб яна нешта зрабіла і намовіла брата пачаць есці. І хоць яна была ў чорным, здавалася, што ёй яшчэ няма сарака, і, прынамсі ўваччу доктара Хофмана, яна была вельмі прыгожая. З белым тварам правільных рысаў, што рэдкасць для міжземнаморкі, яна была падобная да адной акторкі з нямога фільма Фрыца Ланга. Ён не мог прыпомніць ні назвы фільма, ні прозвішча акторкі, але ўвесь свет круціўся вакол яе і дзеля яе мужчыны сачылі, каб не трапіць пад кулю і вярнуцца жывымі з кожнай вайны.

Хочаце яго ўбачыць? спытаўся ён, калі Рэгіна дапіла апошні глыток. Яна паціснула плячыма і паглядзела ў падлогу. *Нічога не бойцеся, я пайду з вамі,* падбадзёрыў Хамдзія. *А чаго ёй баяцца, бог ты мой!* супакоіў Хофман з удаванай строгасцю.

Бэпа быў у пакоі адзін. Ён сядзеў на вайсковым ложку і глядзеў на сценку, дзе віселі дзве фатаграфіі: Уладзімір Ільіч Ленін выступае перад рабочымі і Трыумфальная арка ў Парыжы.

Ты прыйшла! здзівіўся ён. *Хамдзія, гэта мая сястра, адзіная сястра! Эх, што ж я дурны кажу, вы ж напэўна ўжо пазнаёміліся,* сказаў ён і абняў яе. *Я пайду, каб вам не замінаць,* сказаў хлопец.

Рэгіну ахапіла нечаканае шчасце, што Бэпа быў не такі, якім яна яго сабе ўяўляла. Усе гэтыя гады яна адводзіла позірк, калі сустракала на вуліцы дэбільнае дзіця ці некага з чатырох гарадскіх дзівакоў. У кожным перакрыўленым абліччы, у вельмі п'яных людзях ці ў прадаўцах на рынку, калі яны шалеюць ад гневу, што іх падмануў пакупнік, Рэгіна бачыла свайго брата. Ашчэраныя твары, збрыджаныя нянавісцю і страхам, былі найбліжэй да ўяўлянага ёю вобразу вар'яцтва.

Апошні раз яна бачыла яго здаровага, калі пасля вызвалення Бялграда ён атрымаў тры дні адпачынку. Тады па ім нічога не было заўважна, ніякіх слядоў вайны. Ён нават не быў стомлены; выглядаў так, нібы вяртаецца са штогадовага адпачынку, загарэлы і мускулісты, прыгажэйшы, чым раней. Ён шмат смяяўся, усё яго цікавіла, хадзіў па доме і глядзеў, што трэба будзе паправіць і падла-

таць, калі скончыцца вайна. *Яшчэ пару месяцаў, і я буду дома,* сказаў ён на развітанне, а Рэгіна кожны вечар думала толькі адно: каб толькі не трапіла ў яго апошняя куля, каб не загінуў ён у апошняй бітве, каб яе Бэпа не стаў тым салдатам з апавядання, які гіне таму, што нейкі генерал на тры секунды даўжэй падпісваў замірэнне, бо ў ягоным прозвішчы было сямнаццаць літар замест сямі, бо ў пяры скончылася чарніла. Ці таму што кур'ер запіў у сельскай карчме і позна давёз вестку пра заканчэнне вайны.

Калі паведамілі, што Бэпа ў шпіталі, бо ў яго не вытрымалі нервы, яна думала, што гэта не можа быць нешта сур'ёзнае. Калі ён жывы і здаровы і нічога яму не баліць, дык урэшце ўсё будзе добра. Душа ўсё ж не адкрытая рана, каб праз яе выцекла ўся кроў. Усе вар'яты ў Рэгініным жыцці былі такімі ад нараджэння ці проста хацелі такімі быць. А Бэпа нарадзіўся як самы нармальны чалавек пад ясным небам.

Але пасля таго, як яго перавялі ў сараеўскую вар'ятню і ёй прывезлі ягоны рэвальвер, вайсковы білет і ўзнагароды, яна зразумела, што адбываецца нешта дрэннае. Толькі ў мёртвых адбіраюць зброю і ўзнагароды і толькі тады ў сёстраў пытаюцца, ці патрэбная ім дапамога. Войска павінна клапаціцца пра сем'і палеглых таварышаў, а яе Бэпа не загінуў, з ім здарылася нешта іншае. Яна не ведала што, але напэўна нешта страшнае, калі яго праводзяць з пасмяротнымі ўшанаваннямі.

Так яна складала сваю гісторыю пра вар'яцтва і нармальнасць, якая, магчыма, не мела нічога агульнага з тым, што пішуць у кнігах, але была праўдзівая. Праўда – гэта ўсё, у што чалавек верыць. Таму праўда і тое, што вар'яцтва больш заразнае за чуму і халеру.

Гэта смерць без магілы, зрабіла яна выснову пасля таго, як днямі думала і перадумвала, ці ехаць да Бэпы ў Ягамір. Вар'яцтва заразнае, зразумела яна, калі яе жыццё пачало мяняцца толькі таму, што яна ведала, дзе яе брат. А мянялася яно так, што ўтварылася розніца паміж тым, што яна бачыць і чуе, і тым, што ёсць насамрэч. Можа і тое, што з ёй адбываецца і што засталося, калі памёр Іва, не такое, якім яно ёсць, а такое, якім яно не ёсць. Паміж «ёсць» і «не ёсць» розніца ў рашэнні, каб нешта было ці не было.

Яна глядзела на Дыяну, сваю маленькую дачушку, і пыталася, ці праблема ў тым імí, якое яна носіць, або ў жыцці, якое ў ёй зачалося. І яна не любіла яе той любоўю, якой задумвала любіць, калі была цяжарная ці калі ад іншых матак чула, што значыць мець дзіця.

Мне сказалі, што ты не ясі, пачала яна, як толькі яны селі на ложак.

Як малая? Вельмі шкада, што я не бачыў яе, зрабіў ён выгляд, што не чуе.

Добра. Расце з кожным днём, сказала яна першае, што ёй прыйшло ў галаву.

Калі пойдзе ў Іву, будзе вялікая. Вышэйшая за цябе на галаву, а можа і вышэйшая за сваіх дзядзькоў. Вось так. Мы перараслі сваіх бацькаў і матак, а яны былі вышэйшыя за баб і дзядоў. Праз трыста гадоў мужчыны будуць, як кіпарысы, а жанчыны – як таполі. Будуць дзівіцца, як мы ў такіх хатках жылі. Будуць з нас смяяцца, а нам будзе ўсё роўна, бо нас ужо не будзе, казаў ён, ломячы пальцы, пакуль суставы не перасталі пахрусткаць. Тады ён спыніўся.

Бэпа, чаму ты не ясі? зноў спыталася Рэгіна.

Мала карысці ад таго, што мы пакідаем дзецям. Нашым дзецям і будучым пакаленням. Колькі б мы ні думалі, што пакідаем ім шмат, колькі б ні ахвяравалі сабой, для іх гэта нічога не будзе значыць. Маленькі свет, у які не можаш усяліцца. Гэта тое самае, як калі б мы ўсё, што маем, атрымалі ў спадчыну ад мурашоў. У Амерыцы ёсць мурашнікі ў сто разоў большыя, чым у нас, але зноў жа не такія, каб у іх маглі жыць людзі, махаў ён рукамі, пазначаў памеры мурашнікаў, паміж вялікім і ўказальным пальцамі пакідаў прастору для мураша, далонню паказваў розніцу паміж вялікімі і малымі.

Ты так памрэш ад голаду, перапыніла Рэгіна, калі ў яго ўжо не было чаго сказаць і паказаць.

Нам здаецца, што камунізм – гэта нешта вялікае і вечнае. Для нас так, бо ў нас такія меркі, але не для нашых дзяцей і дзяцей нашых дзяцей. Малыя не могуць разумець вялікіх, як і мы не разумеем іх. Толькі ведаем, што для іх камунізм будзе занадта дробны. Яны возьмуць чырвоны сцяг двума пальцамі, вось так, за тры крокі пройдуць Расію, бо і яна будзе ім замалая, значна меншая за Пэлешац.

Толькі паглядзіш, як растуць дзеці, і ўбачыш, што няма сэнсу мераць свет меркай, якая большая за тваё жыццё. Я гэта зразумеў! ускрыкнуў ён і падняў палец над галавой. Гэта быў жэст строгага настаўніка, спроба пажартаваць.

Бэпа, схапіла яна яго за руку, *што з табой, мой Бэпа?* і заплакала.

Усё табе не так! грэбліва адхінуўся ён ад сястры, *як ты можаш такое пытацца і плакаць? Калі хочаш плакаць, дык пытайся нешта іншае!* Яна хутка падцерла слёзы рукавом: *Вось, ужо не плачу. Што з табой, скажы мне?* спрабавала яна ўсміхнуцца.

Вось, так ужо лепей! А то я адчуваю сябе, нібы яблык скраўшы. Са мной нічога. Кожнай раніцы доктар Хофман прыносіць мне «Палітыку» і «Аслабаджэнне», дык я бачу, што і са светам нічога. Вось, падпісана замірэнне паміж Індыяй і Пакістанам. Ваявалі за Кашмір, а мне нешта ўсё здаецца, што той Кашмір гэта іхняя Боснія. Уяўляю, што там шмат авечак, зялёных гор са снежнымі вяршынямі. Інакш чаму б яны ваявалі. Адзінае не разумею, што такое адбываецца з Берлінам. Сталін не дае англічанам уехаць у горад чыгункай і шашой, дык англічане больш за тысячу разоў на дзень узнімаюць і садзяць самалёты. Быццам бы рускі не мог збіць тыя іхнія самалёты. Мне ўсё здаецца, што саюзнікі ўпарцяцца.*

Ён паказваў, як самалёты ўзлятаюць і садзяцца, і ў яго выходзіла вельмі добра, рукі ягоныя нібы ператвараліся ў крылы вялікіх грузавых самалётаў.

І ты ўпарцішся! сказала яна.

Чаму ты так думаеш? засмуціўся ён.

Таму што не ясі, Бэпа. Ты памрэш, як не будзеш есці.

Божа ж мой, ты са мной гаворыш, як з дзіцём. Памрэш, як не будзеш есці, памрэш, як не будзеш есці. Напэўна, ты і Дыяне так кажаш? Думаеш, што я дзіця, калі я ў псіхіятрыі?.. Не думаю. Толькі думаю, што ты ўпарцішся… Гэта табе, напэўна, Хамдзія сказаў. Добры, прастадушны хлопец. Хофман бы такіх дурасцяў не казаў. Не ведае хлапчына, што такое жыццё… І адзін і другі клапоцяцца аб табе. Ты памрэш… Вядома, памру. Усе памруць, ядуць яны або не. Усё роўна памруць… Чаму ты не ясі?.. Ты б не паверыла, калі б я сказаў. Калі б я наогул мог табе сказаць. А я не магу! Гэта спра-

ва паміж мной і рухам. Калі аднойчы далучышся, назад дарогі няма. Але мне не шкада ніводнага дня. Толькі шкада мне Іспаніі, шкада Гранады. Ніколі больш Іспанія не будзе такой, як мы марылі. Нашым дзецям яна будзе замалая, і яны адкінуць яе, як цацку. Мы апошнія ведалі, якая яна прыгожая. І якая вялікая.

Ты будзеш есці?.. Рэгіна, ты ўпартая, як асёл. Раней ты такая не была… Ці яшчэ калі-небудзь будзеш есці?

Зноў плачаш! Можа ў цябе з нервамі не ў парадку? Асцярожней, з гэтага ўсё пачынаецца. Спытайся ў Хофмана, калі мне не верыш. Не, я не дзіця, не трэба мяне мучыць. Ці ж ты мне дапаможаш? Няма мне дапамогі. Я свой хлеб ужо з'еў, і больш мне не трэба.

Рэгіна ўскочыла, схапілася далонню за падбароддзе, якое некантралявана дрыжала, і выбегла з Бэпавага пакоя проста ў абдымкі Хамдзіі. Ён без словаў правёў яе калідорамі, поўнымі гулкага рэха, у якім стогны гучалі як рыпенне шафаў, якія нехта перасоўвае з канца ў канец пустой гасцёўні.

Ён паставіў перад ёй шклянку з падсалоджанай вадою. Доктар Хофман позіркам паказаў на шафу, Хамдзія дастаў бутэльку ракіі і дзве чаркі. Рэгіна ўсімі сіламі спрабавала ўтрымаць твар, каб не разляцеўся на кавалкі. *Выпіце, пані, лепшага леку мы, на жаль, не прыдумалі!*

Ён выпіў да апошняй кроплі ракію, якую наліў яму Хамдзія, абтросся, як калматы сабака, што вылезе з возера, і на ягоным целе натапырыўся кожны валасок, больш ад страху, чым ад чаго іншага, бо ён зразумеў, што Бэпа Сікірыч не адступіцца ад свайго. Цяпер яму выбіраць: або чакаць, пакуль яго паставяць да сцяны, або выканаць прысуд самому.

Яму прыйшло ў галаву ўпырснуць сабе морфію; няма прыгажэйшай смерці, чым ад морфію, калі наогул смерць можа быць прыгожая. Чым ён быў старэйшы, тым больш яму хацелася жыць і тым менш было прычынаў памерці. Некалі ён быў гатовы памерці за кайзера і караля і так страшна раз'юшыўся на тых, хто забіў прынца каля Лацінскага моста, што на другі дзень запісаўся добраахвотнікам на выпадак, калі Вена вырашыць пакараць Сербію вайною, але тая ягоная заява, на шчасце, недзе загубілася, і ніхто не прызваў яго ў вой-

ска, калі вайна была насамрэч абвешчана. Магчыма, яны палічылі, што ад доктара для вар'ятаў на фронце не будзе ніякай карысці або што ён нават і нашкодзіў бы баявому духу палка. Салдат не думае пра душу, як і афіцэр пра тое, ці здаровыя псіхічна ў яго байцы, бо калі б пра такія рэчы думалі, ніхто ніколі не ваяваў бы.

Але ж не толькі сараеўскі замах паслужыў Францу Хофману натхненнем у ягонай гатовасці памерці за высокія ідэалы! Праз чатыры гады, калі імперыя адышла да д'ябла, а Боснію апанавалі голад і бядота, і кожны, хто меў швабскае імя і прозвішча, глядзеў, як бы сабраць свае манаткі і выехаць у Вену, ён ударыў кулаком аб стол: *Нельга ў цяжкую хвіліну кінуць народ, які прыняў цябе і карміў!* Ён павярнуўся і, не развітаўшыся, пакінуў сход, які ў сваёй віле ля вытоку Босны склікаў прафесар Эрнст Эрліх, дырэктар Ландэсбанка на пенсіі, і дзе прымалася пастанова пра ліст, што ў гэтыя найцяжэйшыя для народа і кароны дні меўся быць пасланы ў Вену з просьбай-ляментам не забывацца пра сваіх сыноў і дачок, якія апынуліся ў гэтай турэцкай правінцыі. Бальшыню людзей з Эрліхавай вілы ён больш ніколі не бачыў, а з тымі, хто застаўся ў Сараеве, амаль не вітаўся.

З Аўстрыяй і аўстрыякамі, як і са сваімі нямецкімі каранямі, ён больш не хацеў мець нічога агульнага. Ствараласяся новая дзяржава, вялікае каралеўства паўднёвых славянаў, у якім Хофман вырашыў быць славянінам паводле свайго ўласнага выбару. Праз некалькі дзён пасля таго, як сербскія вайсковыя аддзелы ўвайшлі ў Сараева, ён гераічна ўвайшоў у аддзел метрыкацыі і ад змрочнага афіцэра ў шайкачы* запатрабаваў, каб той тут жа на месцы славянізаваў яму імя і прозвішча. Але дзеля таго, што афіцэр быў паўпісьменны ці проста нядбайны, ён толькі ўпісаў у кнігу кірыліцай «Франц Хофман». Так ён зрабіўся югаславам толькі напалову, а напалову застаўся тым, кім быў. Аднак яму гэта не замінала: *Калі нашаму каралю Пэтру Аб'яднальніку спатрэбіцца добры воін, можаце мяне заўсёды знайсці ў санаторыі для псіхічна хворых на Ягаміры!* выкрыкнуў ён афіцэру проста ў твар. Ён думаў, што так яно і трэба і што крык – гэта сербіянскі народны звычай, бо ўсе сербіянцы*, якіх ён бачыў апошнія дні, крычалі, надрываючы жылы. Хофман не звязваў гэта з тым фактам, што кожны з іх быў у форме і што

цывільнага сербіянца ён ніколі ў жыцці не бачыў, бо да вайны тыя не часта пераходзілі Дрыну* і выключна рэдка дабіраліся да Сараева. Або, магчыма, ён тых людзей і бачыў, але не ведаў, што гэта сербіянцы. Яму неяк думалася, што яны мусяць быць вельмі адрозныя, больш агрэсіўныя за баснійцаў.

Каму ты мазгі дурыш, падла, хочаш, каб я табе вушы бантам завязаў, га? адказаў яму афіцэр яшчэ гучней. Хофман выбег з кабінета, не зразумеўшы, чаму афіцэр на яго раззлаваўся.

Гэта былі цудоўныя часы; душа не сціскалася ад тугі і было столькі рэчаў, якім можна было радавацца і дзеля якіх было варта быць адважным. Пасля не засталося ніводнай. Ці таму, што ён пастарэў, ці таму, што часы раптоўна перамяніліся, часта пытаўся сам у сябе Франц Хофман.

А найгоршыя часы, часы душэўных хваляванняў, дэпрэсіі і дыслексіі, пачаліся для яго дваццаць восьмага лютага 1933-га. Ён сядзеў у кавярні гатэля «Еўропа», за акном падаў снег, у куце піяніст граў Моцарта, блізіўся поўдзень, сталыя наведнікі ўжо збіраліся дадому на абед, калі Хофман разгарнуў бялградскую «Палітыку» і на трэцяй старонцы прачытаў загаловак: «Райхстаг згарэў датла! Канцлер Гітлер абвінаваціў камуністаў і сацыял-дэмакратаў!» Бывалі і горшыя навіны, якія ён чытаў у газетах, але ніводная ніколі не ўстрывожыла яго так, як гэтая. Цяжкі камень, накшталт таго, якім у кадцы прыціскаюць кіслую капусту, лёг яму на страўнік. Ён хацеў уздыхнуць, але яму не хапіла паветра. Гэта паніка, падумаў ён, жаночая істэрыя ці арытмія. Ён праверыў пульс, сэрца білася моцна і рэгулярна. Ён склаў газету і некалькі хвілін глядзеў у сцяну. *Ці вам добра?* спытаўся афіцыянт Руда. Трошкі супакоіўшыся, ён зноў адгарнуў трэцюю старонку, і здарылася тая самая рэакцыя. Як толькі ён прыйшоў дадому, ён сказаў Тыджы, каб рыхтавала валізы, заўтра яны едуць у Апатыю на адпачынак, бо ён ужо пачынае вар'яцець ад працы і ад хворых. У Апатыі яны прабылі тры тыдні, ён не чытаў газет, не слухаў навінаў; яны гулялі ўздоўж мора і кожны вечар хадзілі на канцэрты, слухалі шлягеры, Штраўса маладзейшага і старэйшага, рускія рамансы ў выкананні ансамбля «Ноўгарад»… Але Хофман ніяк не мог прыйсці да ладу.

Вярнуўшыся ў санаторый, ён сказаў галоўнаму лекару Джуру Сандзічу, што, відаць, псіхічна захварэў і папрасіўся адпусціць яго ў Вену да доктара Фройда. Джура на гэта ад душы рассмяяўся і, мажны і тоўсты, пачырванеў, як памідор. Ён любіў Франца, хоць яго трошкі раздражнялі ягоныя навінкі і ўсе тыя дурасці, якія ён павычытваў з венскай і лонданскай прэсы, дзе з псіхіятрыі рабілі філасофію. Як быццам псіхічна хворыя, даруй мне божа, разумнейшыя за здаровых, і таму здаровыя мусяць знайсці спосаб іх перамудрыць. Галоўны лекар Джура быў добры і велікадушны чалавек і насамрэч пражываў пакуты сваіх пацыентаў нават болей, чым гэта калі-небудзь рабіў Хофман, але быў перакананы, што лепшага леку ад цяжкіх псіхічных станаў за ледзяную ваду і электрашок проста няма. *Галаву, мой Франя, трэба ладненька пабоўтаць, і можа тады ўсё ў ёй уляжацца на сваё месца. А можа і не ўляжацца. А ад тых казак і варажбы, пра якія пішуць твае шарлатаны, ніякай карысці не будзе,* тлумачыў ён Хофману, калі той у захапленні прыбягаў на Ягамір, прачытаўшы нейкі вялікі артыкул пра псіхааналіз.

Яшчэ некалькі разоў спрабаваў ён пераканаць галоўнага лекара Джуру ў перавагах сучасных метадаў лячэння псіхічных хваробаў, але той рэгулярна яго высмейваў ці рабіў выгляд, што злуецца. Пагражаў, што, маўляў, звольніць яго і напіша рапарт у міністэрства ў Бялград. Але ж калі Хофман прыйшоў да яго з гісторыяй, што і сам псіхічна захварэў і можа стаць пацыентам у ягоным санаторыі, калі Джура не пусціць яго да Фройда ў Вену, шэф не мог стрымаць смех. Ён думаў, што атрымае мазгавы ўдар, лёгкія ў яго лопаліся і ўжо калола ў сэрцы і жываце. Ніхто яму ніколі з такой сур'ёзнасцю не казаў у твар такую дурату. Быццам Франц малое дзіця і выдумляе, што захварэў, каб толькі яго пусцілі да таго яўрэйскага лайдака. Ну вядома ж, ён яго пусціць! Хай маладзён пазабавіцца. Нічога дрэннага ад гэтага не будзе, а і лепш, калі твае падначаленыя задаволеныя, тым больш Хофман, якому ён пакіне клініку, калі пойдзе на пенсію.

Колькі ты, гарэза, будзеш у Вене? спытаўся галоўны лекар, трымаючыся за жывот. *Месяц, калі можна,* сказаў Хофман, засаромеўшыся. Шэф быў на пятнаццаць гадоў за яго старэйшы, але паводзіў сябе, нібы быў яму дзедам.

Даю табе тры месяцы, але каб мне вярнуўся здаровы! І каб не надумаў пасля дакучаць мне тым, што той дурань увапхне табе ў галаву, бо тады замкну цябе ў ізалятары і шокам павыбіваю з галавы ўвесь твой псіхааналіз. Асцярожна са мной, Франя, мой бацька спаў з ваўкамі на Ўлашычу, дык і я не лепшы! У нас, сялянаў, няма ніякіх цюцюцю!*

Тое, што няма цюцюцю, Хофман зразумее ўжо значна пазней. Джура як бы пусціў яго ў Вену да Фройда не толькі таму, што ён добры чалавек і што яго пазабавіла хлусня ці тое, што ён лічыў хлуснёй, але яшчэ і разлічваў на тое, што ад тых навінак можа й не будзе ўжо такой вялікай шкоды. А можа будзе і карысць, калі пасля ў Сараеве і па цэлым Каралеўстве будуць казаць, што гэта ён, доктар Джура Сандзіч, упусціў Зігмундаў дух у ягамірскую клініку. Калі гэта нейкая дурата, у чым ён упэўнены, дык той дух хутка адляціць у цёмныя лясы, а калі нейкі д'ябал у тым псіхааналізе ўсё ж ёсць – у што Джура і ў гэтым выпадку не блытаўся б, – тады ягонае імя застанецца ўпісанае залатымі літарамі ў аналы баснійскага псіхічнага здароўя, перад ягамірскім санаторыем будзе тырчаць яго нахмураны бюст, якім ён ужо загадзя ганарыцца, не зважаючы, што тая яго бронзавая галава будзе несапраўдная і што новым пакаленням псіхічна хворых будуць казаць, што яны мелі шчасце, бо не трапілі ў рукі гэтаму змрочнаму тыпу. Наколькі ў жыцці ён пазбягае сур'ёзных позаў і аднолькава прыкідаецца клоўнам і мядзведзем, калі смяецца і жартуе як з хворымі, так і з сваімі начальнікамі і падначаленымі, настолькі сваю пасмяротную ролю галоўны лекар Джура лічыць вельмі сур'ёзнай і пахмурнай.

Але калі б не гэта і калі б ён на сто працэнтаў быў пераканаы, што Фройд поўны ідыёт, ён усё роўна пусціў бы Хофмана. Без вялікай патрэбы і прычынаў нельга перашкаджаць іншым у тым, што іх радуе. Галоўны лекар Джура не верыць у Бога, але верыць, што нешта такое было б недаравальным грэхам.

Сем дзён страціў Франц, чакаючы, пакуль Фройд яго прыме. Ён пачаў ужо думаць, што доктар яго пазбягае, і баяўся, што сваю фобію, прычыненую газетным загалоўкам за дваццаць восьмага лютага, будзе змушаны лячыць сам ці, можа, павінен будзе звыкнуцца

з фактам, што ён раптам зрабіўся баязліўцам і адчуў, што ніводзін ідэал для яго не варты больш за жыццё.

І праўда, у тыя дні ён не мог прыпомніць такога ідэалу, які быў бы нечага варты. Можа, гэта таксама нейкі арыентальны ўплыў, думаў ён, бадзяючыся па вуліцах горада, які некалі быў ягоным. Можа, гады жыцця ў мусульманскім горадзе і ў мусульманскім асяроддзі ператварылі яго ў яшчэ аднаго малога ходжу ці духаншчыка, у чалавека, які не хоча глядзець далей за сваю мячэць і сваю крамку. Але як магчыма, каб такое здарылася з чыстым швабам, народжаным далёка ад Босніі, ісламу і ўсяго таго, што арыентальных славянаў робіць такімі пасіўнымі і апантанымі толькі сваімі дробнымі чалавечымі ўцехамі? Усё ж, напэўна, гэта быў нейкі дзіўны неўроз, хвароба душы ў самым шырокім сэнсе слова, пра якую доктар Фройд напэўна мог бы нешта сказаць.

На восьмы дзень, убачыўшы, як Фройд заходзіць у будынак, дзе ў яго быў незарэгістраваны кабінет, Хофман пабег за ім: *доктар, доктар!* Але Фройд не азіраўся, можа, глыбока задумаўся ці рабіў выгляд, што не чуе. Хофман спыніў яго на сходах у той момант, калі Фройд ступіў на чацвёртую прыступку. Той здзіўлена паглядзеў на яго, спрабуючы прыгадаць, ці знае гэтага чалавека, а Хофману той позірк з вышыні, бо сам ён стаяў на першай прыступцы, быў нечым накшталт пасвячэння. Ён адчуваў тое самае, што адчувала б любая дэвотка з Каралёвай Суцескі* з татуіроўкай крыжа на руцэ, калі б яе пасярод Рыму прыняў Папа.

Ён пачаў мармытаць нешта без складу і ладу, сказаў, што прыехаў з Босніі, але вучыўся ў Вене і сам карэнны венец, але ўжо шмат гадоў працуе ў сараеўскай псіхіятрычнай лячэбніцы, і просіць доктара прысвяціць яму трошкі свайго каштоўнага часу, каб накіраваць, параіць, а можа і дапамагчы ў вырашэнні адной дзіўнай псіхічнай праблемы.

Фройд, напэўна, не ведаў, што рабіць: ці ўцячы, ці, можа, прагнаць назолу, ці ўсё ж з ім пагаварыць. Зацікаўленне рознымі псіхічнымі станамі, якія вызначаюць асобу, ніякім чынам не тоеснае зацікаўленню вулічнымі дзівакамі і назоламі. А гэты выглядае менавіта так. Такіх цяжка прагнаць ці адбіцца ад іх. Яны і чапляюцца, бо адчуваюць, што ты не здольны іх абразіць.

Хофман расказаў доктару Фройду, што з ім здарылася. Той слухаў яго нерухома, не мяняючы выразу твару. Выглядаў ён напружана, як той, каго з вясны пачынае мучыць ulcus duodeni і цэлымі днямі боль не пакідае яго ў спакоі. Калі Хофман скончыў, Фройд па-ранейшаму маўчаў. Можа, таму, што яму не было зададзена пытанне, а Хофман ніяк не мог прыдумаць, пра што ж у яго па сутнасці запытацца. Ён нерваваўся, як студэнт, які здагадваецца, што прафесар нечага ад яго чакае, але не наважваецца загаварыць, каб не ляпнуць якога глупства.

Вы яўрэй? ціха спытаўся Фройд.

Не, я аўстрыец і каталік, адказаў Хофман і адразу зразумеў, што сказаў нешта недарэчнае. Як быццам яўрэй не можа быць аўстрыйцам.

Але Фройд гэтага нават не заўважыў. *Вы ўпэўнены? Можа ў вас усё ж нейкая бабуля была яўрэйка? Ці нейкі далейшы продак?* настойваў ён.

Не, праўда, у маім родзе яўрэяў няма. Мае продкі за часоў Марыі-Тэрэзіі прыехалі ў Вену з Швабіі. Яны былі лютэране і перайшлі ў каталіцызм. Але чаму вам гэта важна? Хофман адчуваў сябе ўсё больш няўтульна.

Калі вы не яўрэй, а яшчэ, відавочна, і не камуніст, дык я не ведаю, чаму вас так асабіста закранула спаленне Райхстага. І не ведаю, чаму вы думаеце, што я магу мець адказы на вашы пытанні.

Доктар Фройд пайшоў далей па сходах, і размова на гэтым скончылася.

Франц Хофман пакінуў Вену глыбока расчараваны. Ён і далей верыў у Доктараву геніяльнасць, але крыўды яму не дараваў. Фройд пакінуў яго самотным на свеце, так што ён ужо больш ніколі не знойдзе нікога, каму даверыў бы свае страхі і слабасці. Пасля таго, як ён у юнацтве страціў Ісуса Хрыста, страта Зігмунда Фройда сталася для Хофмана стратай апошняй повязі з боствам, тым, што існуе па-за чалавекам і служыць апорай ягонай адвазе. Было гэта і апошняе развітанне з родным горадам.

Перш чым саступіць з адзінай прыступкі, на якую ён узышоў, ён ужо забыўся пра ўяўную псіхічную хваробу і прыняў тое, што

зусім нядаўна яму здавалася абсалютна ганебным. Так, ён зрабіўся баязліўцам і цяпер баяўся ўсяго, як баяцца старыя і людзі безабаронныя, без багатай сям'і і пэўнай бацькаўшчыны.

У Вене ён застаўся яшчэ толькі на два дні, абышоў некалькі кнігарняў, нейкі час пастаяў перад родным домам, зазіраючы ў вокны, за якімі цяпер жылі нейкія невядомыя людзі.

Галоўны лекар Джура здзівіўся Хофманаву заўчаснаму вяртанню, але і не распытваў, і не жартаваў з яго. Ён ніколі не спытаўся ў яго, што́ з ім здарылася ў Вене, і такім чынам гісторыя пра Хофманаву псіхічную хваробу, якой мог дапамагчы толькі Зігмунд Фройд, была забытая.

Месяцы і гады пасля газетнай навіны, якая яго перамяніла, былі часткай агульнай змовы страху. Ішла крывавая вайна ў Эфіопіі, Ліга нацыяў насмяялася з імператара Селасіе, генералы-пучысты з Канарскіх астравоў накіраваліся на задушэнне іспанскай рэспублікі, Гітлер далучыў Аўстрыю, Вена зрабілася нямецкім горадам, пісалі пра законы, паводле якіх абмяжоўваліся правы нямецкіх яўрэяў, у бялградскай Скупшчыне ад прадстаўнікоў усіх трох славянскіх плямёнаў можна было пачуць, што такія самыя ці падобныя законы трэба было б прыняць і ў нас…

Франц Хофман чытаў усё гэта, у ім расла гара свінцовых літар, якія не давалі яму думаць пра нешта іншае, апрача таго, што ён бачыў у газетах. Ён перастаў з Таварыствам аматараў гор хадзіць на Трэбэвіч, Яхарыну і Трэскавіцу, адхіляў запрашэнні на нядзельныя вечары за картамі ў карчме «Ў двух валоў». Так што неўзабаве апрача сваіх пацыентаў, галоўнага лекара Джуры і сваёй жонкі Тыджы, ён больш не меў з кім бавіць час. Няспешнасць арыентальнага жыцця, якая гадамі была яму раней так прыемная і ў якой ён канчаткова патапіў свае венскія прынцыпы, ператваралася ў дэпрэсію, якую ён адчуваў у сабе і назіраў вакол.

Летам 1939 года галоўны лекар Джура выйшаў на законную пенсію. Ягамір ён пакінуў у слязах пасля таго, як некалькі разоў слаў каралеўскаму рэгенту Паўлу і прэм'ерам каралеўскіх урадаў лісты з просьбаю ў парадку выключэння падоўжыць яму працоўны ўзрост, бо ягоны досвед патрэбны гэтай клініцы, яе персаналу

і, што найгалаўнейшае, – пацыентам. Хофман дадаваў свой подпіс пад кожным Джуравым лістом і ўсведамляў, што ад гэтага не будзе ніякай карысці. Але так ён прынамсі захавае няшчаснаму шэфу веру ў лаяльнасць і сяброўства.

На апошнім лісце, адасланым за тры дні да таго, як з Бялграда прыйшла пастанова аб звальненні на пенсію, падпісаліся ўсе. Ад качагара і вартаўніка, кухарак, санітараў і лекараў аж да тых хворых, што былі здольныя падпісацца. Усё было дарэмна. На гэты незвычайны заклік ніколі не прыйшло адказу.

Два месяцы галоўны лекар Джура як пенсіянер прыходзіў у сваю клініку, а пасля з першымі асеннімі дажджамі прапаў. Хофман не бачыў яго і на нядзельных сустрэчах за кавай у гатэлі «Еўропа».

Ранняй восенню 1940-га ён даведаўся ад некага з Джуравых родных, што за тры месяцы перад тым лекар памёр і што яго пахавалі як сапраўднага бедняка, бо паводле нябожчыкавага жадання нікому не было паведамлена, што ён памёр, не было пра гэта напісана і ў газетах. Пахаваны ён быў на праваслаўных могілках у Мрканіч Градзе. Пасля вайны Хофман ездзіў шукаць Джураву магілу, бо лічыў, што клініка мусіла б паставіць свайму шматгадоваму шэфу годны надмагільны помнік. Але магілы не было, а дзеля таго, што згарэлі кнігі памерлых і Джуравы родныя разбегліся па свеце, больш не было і тых, хто ведаў бы, дзе ляжыць чалавек, які патаемна марыў пра свой бронзавы бюст, дзеля якога ён быў гатовы пусціць у сваю клініку і псіхааналіз.

Пасля Джуравага адыходу ў Хофмана больш не засталося начальнікаў. У Сараеве нікога асабліва й не цікавіла, што ён робіць з псіхічна хворымі, а Міністэрства здароўя традыцыйна не адказвала на допісы з Ягаміра, бо там яшчэ ад Джуравых часоў лічылі, што ў сараеўскай псіхлячэбніцы няма вялікай розніцы паміж лекарамі і пацыентамі.

Але свабода рабіць што яму зажадаецца і ні перад кім за гэта не быць адказным толькі абудзіла Хофманавы страхі. Лягчэй быць найніжэйшым у грамадскай іерархіі, чым апынуцца наагул па-за ўсякай іерархіяй. Ён зразумеў гэта ў апошнія дні Каралеўства, калі ўсё Сараева закалыхалася і ўзрушылася, бо кожны пайшоў за тымі,

на каго быў падобны. Камуністы за камуністамі, праваслаўныя за праваслаўнымі, мусульмане за мусульманамі, каталікі за каталікамі. І толькі сараеўскія яўрэі пастараліся застацца з усімі адначасна, каб ніхто не абразіўся ці чаго не падумаў. Ён глядзеў на няшчасных спалоханых яўрэяў, як яны падмяргваюць камуністам, ахвяруюць на каталіцкую беднату і размаўляюць з мусульманскімі гаспадарамі на рынку пра добрыя старыя асманскія часы, і ведаў, што яны абралі найгоршы спосаб абароны ад таго, што насоўвалася. З цалкам асабістых і эгаістычных меркаванняў яўрэі ўласнай крывёю ўтваралі адзіную повязь паміж групамі, якія пайшлі кожная ў свой бок. Яны былі рошчынай у пабудове, якой пагражала разбурэнне, і ўрэшце мусілі за празмерную асцярожнасць заплаціць сваімі галовамі. Яны апынуліся па-за іерархіяй, якая стварылася ў горадзе ў першыя дні красавіка 1941-га і па-за якой, апрача іх, былі яшчэ толькі доктар Хофман і ягоныя хворыя.

Усташаўскаму сотніку летам 1942-га ён з непрыхаванай агідай адмовіўся перадаць спіс хворых, дзе было запісанае іх веравызнанне.

Як бы ён ні баяўся за сваю скуру і колькі б яму ні здавалася, пасля поўдня 28 лютага 1933 года, што гісторыя змовілася супраць яго і некалькіх да яго падобных, ён не мог задаволіць сотнікава патрабаванне. Сярод хворых быў усяго дзясятак праваслаўных, а адзіная яўрэйка – Сара Нолан, хворая на сіндром Даўна, памерла ў красавіку 1941-га, так што не было б надта вялікай шкоды, калі б Хофман здаў спіс сваіх пацыентаў. Калі б усташы паспрабавалі вывезці праваслаўных, ён патэлефанаваў бы доктару Саву Бэсаравічу, каб той замовіў за іх слоўца, і, напэўна, з імі нічога не здарылася б. Аднак Хофман не мог пагадзіцца, каб да псіхічна хворых ставіліся інакш, чым як проста да хворых, бо тады ўсё страчвала б сэнс. Усё, што ён рабіў на Ягаміры столькі гадоў. І факт, што яго з Вены паслалі ў Сараева, выглядаў бы як пакаранне і пажыццёвая катарга. Можа, нехта і думаў, што ён пасланы ў турэцкую правінцыю ў знак пакарання, а можа нехта лічыў дрэнным лекарам, бо калі б быў добрым, аўстрыйскі імператар не паслаў бы яго так далёка, але сам Франц Хофман не адчуваў сябе ні пакараным, ні горшым за сваіх калегаў.

Калі мы маем справу з чалавечай душою, медыцына пераваж-

на блукае ўпоцемку, і тут мы недалёка адышлі ад знахарства, казаў ён калегам. Колькі б намі нейкія будучыя псіхолагі і псіхіятры ні пагарджалі, колькі б ні смяяліся з нас – калі не будзе нас, не будзе і іх. Ён адчуваў гонар за гэтыя словы, лічыў іх мудрымі, быццам іх вымавіў нехта іншы. Калі б ён саступіў сотнікавым пагрозам, дык і ў гэтых словаў больш не было б сэнсу.

Але ўжо назаўтра ён накіраваўся проста ў гарадскую ўправу, а адтуль у нямецкую камендатуру.

Усташам ён сказаў, што ён і яго людзі шчаслівыя, што гістарычнае Сараева, старая харвацкая Верхняя Баснія, нарэшце сталі часткай Незалежнай дзяржавы Харватыі, у чыю старадаўнюю пляцёнку ўтканыя векавыя жаданні гэтага народа*, якія цяпер з Божага бласлаўлення ажыццёўленыя пад кіраўніцтвам правадыра доктара Павэліча. Калі ж псіхіятрычная лячэбніца на Ягаміры, якую ён залежна ад нагоды называў па-рознаму – санаторыем, клінікай або лячэбніцай, – можа якім заўгодна чынам дапамагчы росквіту і абароне адзінай нашай бацькаўшчыны, ён, доктар Хофман будзе глыбока абражаны, калі не атрымае наконт гэтага ніякіх указанняў.

Намесніку каменданта ўсіх нямецкіх вайсковых адзінак, дыслакаваных у Сярэдняй Босніі, мімаходзь кажучы, даволі бескультурнаму баварцу, падчас дзесяціхвіліннага прыёму Хофман сказаў, што адчувае сябе немцам і заўсёды сябе такім адчуваў і што быў бы шчаслівы, калі б вайсковыя і цывільныя прадстаўнікі Трэцяга Райху мелі на ўвазе, што ў гэтым горадзе жывуць і такія, як ён, і што яны дзесяцігоддзямі спрабуюць цывілізаваць гэтую дзікую краіну.

Ні харвацкі, ні нямецкі бок не былі ў залішнім захапленні ад гэтак выказанай лаяльнасці. Верагодна, ім было ясна, што чалавек, які выступае з такімі заявамі, не можа мець зусім чыстае сумленне. Але яны нічога не правяралі, іх наагул ніякім чынам не зацікавіла справа шэфа псіхлячэбніцы. Ягамір стаіць на краі горада, а яшчэ і з таго боку, куды нікому не па дарозе і адкуль маглі з'явіцца толькі чэтніцкія ці партызанскія бунтаўнікі. Але і яны не ведалі б, куды ісці далей ад вар'ятні, так што Франц Хофман быў пакінуты самому сабе і сваім страхам.

Сотнік больш ніколі не паказаўся, і было ясна, што спіс хворых

ён не патрабаваў на нечы загад, а вёў індывідуальнае паляванне на якога-небудзь яўрэя, якога мог бы злавіць і пасля хваліцца па марыіндворскіх корчмах.

Але як толькі вайна наблізілася да канца і ўжо чакаўся дзень, калі ў горад увойдуць партызаны, Франц Хофман прыгадаў учынены грэх. Ён да смяротнага поту спалохаўся, што камуністы ў захопленай дакументацыі знойдуць пратаколы ягоных візітаў да ўсташаўскіх і нямецкіх уладаў. У абодвух месцах сядзелі сакратаркі, якія нешта запісвалі, таму ён быў упэўнены, што ў нейкіх паперах будзе і ягонае імя. Ён цяжка мог сабе ўявіць, што гэта быў толькі падман. І немцы, і ўсташы стараліся ўпэўніць настырнага псіхіятра, які хваліў Павэліча і Гітлера, што ён прыйшоў у важнае месца і што яму там надаецца бюракратычная ўвага.

На другі дзень пасля вызвалення горада, ужо сёмага красавіка 1945-га, Франц Хофман замовіў на Башчаршыі пашыць два сцягі: югаслаўскі і савецкі. Ён дорага заплаціў краўцу Хакію Чэнгічу за тэрміновую замову і за тое, што краўцу давялося слаць чалядніка ў Крэшава, бо ў горадзе не было чырвонай тканіны. Ужо восьмага красавіка на ягамірскай псіхіятрычнай лячэбніцы луналі сцягі пераможцаў, а Хофман яшчэ доўгія месяцы дрыжаў у сваім пакоі ад страху.

Яму зрабілася лягчэй, калі пачалі прывозіць хворых партызанаў і партызанак. Тых, што не мелі ніякіх чыноў, дастаўлялі ў карэтах хуткай дапамогі ці на вайсковых джыпах, а таварышы з чынамі прыязджалі ў суправаджэнні афіцэра Озны, які адводзіў доктара ўбок і папярэджваў, што прозвішча маёра Хорвата ці палкоўніка Шакавіча трэба трымаць у строгай таямніцы. Апроч таго, Хофман павінен быў забяспечыць ім спецыяльны дагляд, не забываючыся пра чын, які яны здабылі ў змаганні з акупантамі і мясцовымі здраднікамі, бо тое, што яны крануліся розумам, не значыць, што іх заслугі ў народна-вызваленчай вайне і сацыялістычнай рэвалюцыі забытыя. Пад пагрозай найстражэйшага пакарання было забаронена лячыць іх электрашокам ці мучыць нейкім іншым спосабам. На развітанне ознавец прыстрашыў, што будзе рэгулярна цікавіцца станам кожнага адпаведнага таварыша.

Але ад таго дня, калі першыя псіхічна хворыя афіцэры прыбылі

на Ягамір, мінула ўжо амаль чатыры гады, а пра іх стан так ніхто і не пацікавіўся нават па тэлефоне. Хворых партызанаў не наведвалі і іх родныя, так што сястра Бэпы Сікірыча не была тут выключэннем.

Тым не менш доктар Хофман не адважваўся парушыць нічога з таго, што яму было загадана ў дачыненні да партызанаў. Дый не было ў яго асаблівых прычын нешта парушаць. Тры іх дзясяткі – з якіх дзевятнаццаць мелі вайсковыя чыны – можна было падзяліць на некалькі групаў. Да першай належалі агрэсіўныя хворыя, якія на кожным кроку бачылі ворага і не ваявалі, толькі калі спалі. У сваёй барацьбе яны ратавалі таварыша Ціта і Саву Кавачавіча, фарсіравалі Нярэтву і пераходзілі Суцеску, штодня мянялі імёны і ідэнтычнасць і паводзілі сябе аднолькава, без прыкметаў індывідуальнасці.

У другой групе былі ціхія і спакойныя. Двое не прамовілі ні слова ад таго дня, як паступілі на Ягамір, і нічога, апрача маўчання, не сведчыла пра іх псіхічную хваробу, таму яны з радасцю ўдзельнічалі ў вясновых прыборках парку, хадзілі па ваду і секлі дровы. Напачатку Хофман забараняў ім працаваць, баючыся, каб яго не абвінавацілі, што ён прыніжае іх чорнай працай, асабліва маёра Сэіда Рэджу, але пасля зразумеў, што ні маёр, ні Іван Рукляч, другі маўчун, на шчасце без чыну, не мелі іншай радасці, акрамя прыбірання ў парку і хаджэння па ваду. Апроч таго, Хофман і не верыў, што гэтыя двое псіхічна хворыя. Была б яго воля, ён паслаў бы іх дадому. Чалавек можа жыць і быць карысным грамадству, нават калі маўчыць. Рэджа і Рукляч былі гэтаму жывымі доказамі. Часам у летнюю спёку пад канец працоўнага дня доктар сядаў з Рэджам на лаву пад густымі кронамі, прапаноўваў яму цыгарэту, і яны курылі разам у цішы і спакоі, не раўнуючы прыяцелі, паміж якімі ўсё ўжо сказана. Хофману не хацелася ісці дадому, бо ён ведаў, што праліе сем патоў, пакуль дойдзе да Кошаўскай гары, дзе ён жыў. А пад старымі дубамі было так прыемна, амаль халаднавата, – які нармальны чалавек палезе адтуль на сонца. Калі яго нешта мучыла ці напружвалі страхі і ён два-тры разы ўздыхаў, Рэджа абдымаў яго за плечы і ўсміхаўся шырокай і самаўпэўненай усмешкай з плакатаў, якія клікалі на будаўніцтва чыгункі Брчка-Банавічы*. Хто наважыўся б тады сказаць, што маёр Сэід Рэджа псіхічна хворы?

Зусім іншыя, чым ён і Іван Рукліч, былі ягамірскія дэпрэсанты і самагубцы – гэта была ўжо трэцяя група, іх было шэсць-сем чалавек. За імі трэба было сачыць цэлымі днямі і трымаць у ізалятары, каб яны не знайшлі чаго-небудзь, што дапамагло б ім павесіцца ці перарэзаць сабе жылы. Гэтыя любілі размаўляць. Асабліва з Хамдзіям, бо доктара Хофмана яны пазбягалі. Пазбягалі таму, што ён быў вярхоўным аўтарытэтам, гэткім Ціта іхняй вар'ятні, таму, што быў швабам і адпаведна трымаўся, і таму, што быў сярэдняга росту, а для іх, пераважна чарнагорцаў, усіх да аднаго вышэйшых за метр дзевяноста, гэта было відавочным знакам непаўнавартасці. А вось Хамдзія ім імпанаваў, яны звалі яго Турэцкім Ўладыкам і не бунтаваліся, калі ён замыкаў іх у пакоях. Ён увасабляў для іх тую прымальную ўладу, якой можна падпарадкоўвацца, нават калі ты змагар і рэвалюцыянер. Калі б не было Хамдзіі, Хофман наўрад ці мог бы даць рады дэпрэсіўнай частцы сваёй партызанскай роты.

Былі яшчэ і такія, хто без перапынку плакаў, такія, хто ўвесь час пераказваў гісторыю смерці сваіх сыноў і дачок, якіх насамрэч не было, і, урэшце, былі трое страчаных цалкам. Гэтыя не ведалі ні хто яны, ні што яны, яны забыліся пра вайну і сваё змаганне, пра Югаславію і камунізм, яны былі, паводле Хамдзіевага вызначэння, зусім «ціхія розумам». Нікому не заміналі, ні ў чым не былі карысныя. А дальбог, нічому і не дзівіліся.

Бэпу Сікірыча лічылі дэпрэсантам і патэнцыйным самагубцам, хоць насамрэч ён не быў прыгнечаны і не выяўляў схільнасці да суіцыду. Але так было арганізаванае жыццё на Ягаміры: калі ты не агрэсіўны, то цябе залічваюць у дэпрэсіўныя. Тое, што ты насамрэч ніколі не быў у дэпрэсіі, наогул няважна, бо ўсё круціцца вакол арганізацыі жыцця, а не вакол таго, якая ў цябе хвароба.

Разам з дзвюма сотнямі цывільных хворых, сярод якіх не ўсе, зрэшты, былі цалкам цывільныя, бо ў сваёй клініцы Хофман меў дваіх, што страцілі розум у Першай сусветнай вайне, і аднаго дамабранскага падафіцэра*, якога прывялі ў 1944 годзе, тыя трыццаць партызанаў утваралі неверагодна складаную грамадскую структуру, аб функцыянаванні якой ягамірскі персанал мусіў клапаціцца штодня. І таму Хофманава праца мела мала агульнага з меды-

цынай і лячэннем. Ён мог спакойна забыцца пра большасць таго, чаму навучыўся на факультэце, і пакласціся на досвед, пераняты ад галоўнага лекара Джуры. Псіхааналітычныя артыкулы і кнігі, якія ён ніколі не пераставаў набываць і вывучаць, ні ў чым яму не прыдаваліся, нягледзячы на тое, што вучэнне доктара Фройда пасля вайны трыумфальна ўвайшло ў бялградскія і заграбскія псіхіятрычныя салоны. Але ён, прачытаўшы і ведаючы больш за іншых, не меў свайго салона, як не меў і вялікіх магчымасцяў пагаварыць на сваю ўлюбёную тэму. Часам, звычайна ў жніўні, ён браў вольны тыдзень, клаў сваю Тыджу ў халадок пад слівай у двары і трошкі гуляў з ёй у псіхааналіз, спрабаваў яе загіпнатызаваць, задаваў ёй дзіўныя пытанні і рабіў дурня і з сябе, і з Зігмунда Фройда. Што праўда, пачынаў ён цалкам сур'ёзна, але пасля разумеў, наколькі ўсё гэта не мае сэнсу, калі робіцца пад слівай ды з роднаю жонкай. І колькі б такія гульні ні весялілі і яго, і Тыджу, у глыбіні Хофманавай душы расло ўсведамленне, што ён дарэмна змарнаваў свой век, бо не займаецца ні тым, што рабіў галоўны лекар Джура – выключна рэдка прапісваючы электрашок ці акунанне ў ледзяную ваду, – ні тым, у што верыць і што ўжо заўтра як найважнейшы псіхіятрычны метад будзе ўжываць увесь свет. Пры гэтым яго ўвогуле не суцяшаў факт, што ён верыў у псіхааналіз яшчэ да таго, як іншыя пра яго даведаліся. Ён меў свой Ягамір, сваю маленькую дзяржаву, якой кіраваў, у якой хаваўся ад усіх паўстанняў і войнаў і якая нікога не хвалявала, бо нікому і не замінала.

Выпіце ракіі. Няма лепшага леку за моцную гарэлку! угаворваў ён Рэгіну, якая не магла супакоіцца пасля сустрэчы з братам. Хамдзія стаяў у дзвярах і чакаў, пакуль доктар Хофман нешта прыдумае. Ён быў гатовы на ўсё. І на тое, каб гвалтам карміць збунтаванага палкоўніка, калі шэф палічыць, што няма іншага рашэння.

Выпіце, пані, прашу вас! даймаў ён. Рэгіна ўзняла вочы і праз слёзы замест аднаго ўбачыла двух старых. Ён падаў ёй насовачку, яна пахла ружамі. Гэта быў пах спакою, сямейнага ладу і нечага, што незваротна знікла ва ўсіх тых войнах разам з душою ейнага Бэпы. Калі яна яшчэ хоць момант пра гэта падумае, то зноў заплача, і хто ведае колькі часу пройдзе, пакуль скончацца слёзы. Яна моцна вы-

смаркалася. Гэты гук быў брыдкі і сараматны, але прынамсі яна магла быць упэўненая, што больш не заплача. Першы раз яе ўздых не перапыніўся ўсхліпам. Гэта не мае ніякага сэнсу, падумала яна, ні ўсхліпы, ні ікаўка. *Шаноўная пані, выпіце ракіі,* дакучаў Хофман. *Не хачу, ад ракіі ў мяне пачнецца ікаўка,* схлусіла яна.

Яна сядзела яшчэ нейкі час з тым старым і ягоным памочнікам, і выглядала, быццам тут ні ў каго няма ніякіх іншых справаў. Гэтыя двое Бэпу не дапамогуць, бо не могуць і не ведаюць як. Пра тое, што́ такога здараецца з людзьмі, што яны звар'яцеюць, яны ведаюць столькі ж, колькі яна. Поўня, адліга, кашмарныя сны, страхі, адарваныя чалавечыя галовы, прывіды, цмокі, чэрці і д'яблы, здрады і падманы, бяссонне, боль, які невядома адкуль паходзіць… Усё гэта дорага Бэпу каштавала. Яна добра ведае, як ведае кожны, але людзі робяць выгляд, што за гэтым стаіць нешта іншае і што ў чалавечай душы хаваецца нейкая таямніца. Насамрэч таямніцы няма, але цяжка прымірыцца з тым, што аднолькава мала бракуе нармальным, каб звар'яцець, і вар'ятам, каб быць нармальнымі. Ёй хацелася чым найхутчэй адсюль выбрацца і забыцца пра брата, якому няма ратунку, але як гэта зрабіць, калі гэты стары нечага ад яе чакае.

Ведаеце, што цяпер будзе? спытаўся Хофман. *Ваш брат будзе галадаваць яшчэ тыдні два, пасля ўпадзе ў кому, мы будзем сілкаваць яго інфузіяй, і калі ён ачуняе, усё пачнецца спачатку. Пакуль ён не памрэ.* Ён склаў рукі, нібы загарнуўшы кнігу. Яна не адказала. Узяла паліто, і Хамдзія правёў яе да брамы.

Не хочаце яго яшчэ раз пабачыць? спытаўся доктар на развітанне. Яна ўсміхнулася яму і пажадала шчасця ў жыцці.

Аднак Хамдзію яна бачыла не апошні раз. Праз дзве гадзіны ён бег за ёй па чыгуначным пероне, праз момант меўся адысці цягнік на Мостар. *Пані, пачакайце!* крычаў ён. Рэгіна ўжо ступіла на вагонную прыступку, калі ён схапіў яе за руку і сказаў: *Ён памёр. Калі ласка, хадзіце са мною! Богам малю, не ад'язджайце.*

Яна была спакойная і не расплакалася; яны выйшлі на дарогу перад вакзалам, калі раптам Хамдзія спыніўся, прыхіліўся да сцяны, і яго пачало вантаваць. Рэгіна падумала, што ён напіўся, і ёй было непрыемна, што людзі праходзяць міма і бачаць яе ў такой кампаніі.

Яна была ў жалобе па мужу, толькі што ў яе памёр брат, а гэтага маладзёна ванітуе. Было б так добра зараз сысці, бо яна ўсё адно нічога не можа выправіць.

Як ён памёр? спыталася яна ў Хамдзіі, калі ён крыху ачомаўся. *Інфаркт. Ужо трэці за апошні год. Я казаў яму, каб бярогся, але ён мяне не слухаў… Вы мне пра гэта не сказалі*, здзівілася яна. *Што не сказаў?.. Што ў Бэпы было хворае сэрца!* раз'юшылася яна, нарэшце займеўшы нагоду некага абвінаваціць у тым, што здарылася з яе братам.

Пані, прабачце, памёр доктар Хофман, а не ваш брат!

Неўзабаве выявіцца, што Рэгініна затрыманне не мела ніякага сэнсу. Хамдзія проста страціў галаву, магчыма, ён і сам пасля гадоў службы ў Франца Хофмана зрабіўся крыху параноікам і таму думаў, што гэтая жанчына, якая апошняя бачыла доктара жывым, будзе патрэбная, каб засведчыць, што яго ніхто не забіў. Або ў яго ў галаве было нешта іншае, гэтага ўжо ён не ведаў і сам, таму, ачуняўшы, ён пачаў выбачацца, бо яна прапусціла ўсе сённяшнія цягнікі. Урэшце ён завёў Рэгіну да сваіх бацькоў на Бістрык, каб яна ў іх пераначавала, а сам пайшоў на Ягамір, куды ўжо прыехалі з морга па доктара ва цела і дзе ўжо з'явіўся доктар Ніка Сршэн, які часова пераняў абавязкі шэфа клінікі. Міліцыі не было, і ніхто не пытаўся ў Хамдзіі пра смерць Франца Хофмана. Ён не мог у гэта паверыць. Некага ж мусіла цікавіць, як і чаму памёр чалавек. Калі б у Хамдзіі спыталіся, ён сказаў бы праўду: ён памёр са страху, што партызанскі палкоўнік адмаўляецца ад ежы і што яго, як начальніка, абвінавацяць у палкоўнікавай смерці!

Ахоплены жахам і агідай, замест каб пайсці дадому на Бістрык, ён застаўся ў Гарадской кавярні, дзе да зары піў з невядомымі людзьмі і кляў свет, у якім магчыма, каб такі чалавек сканаў, як сабака, толькі таму, што ў гэтай краіне ніхто нікому не верыць.

Так Хамдзія шукаў справядлівасці, і ён будзе шукаць яе да канца жыцця, з кожным днём робячыся ўсё большым дурнем, бо мала было такіх, хто разумеў, што гэта значыць, калі п'яны чалавек кажа, што Хофман быў першы пасля Фройда. А можа і лепшы за Фройда, бо Фройд толькі аналізаваў людзей, як нейкіх мікробаў, а Хоф-

ман зберагаў у іх тыя рэшткі розуму, якія ў іх пасля ўсяго засталіся. Неўзабаве з яго ўжо будзе смяяцца ўвесь горад, а новы шэф выганіць яго з працы за тое, што не мае адукацыі і шмат п'е. Скончыць ён як адзін з тых вар'ятаў, якім не пашчасціла, каб нейкі Хофман прыняў іх у сваю клініку, таму яны днямі бадзяюцца на вуліцах, а ночы бавяць па гарадскіх падвалах.

Рэгіна заначавала ў Фуада і Бэгзады, ціхіх і спакойных людзей, якія ні пра што не пыталіся, і яна была радая, што не павінна нічога расказваць пра сябе. Яны пасадзілі яе на тапчан, частавалі хурмашыцамі* і баклавою, пыталіся, якое надвор'е ў Дуброўніку, што там гэтай парою цвіце і што спее. Фуад з усімі падрабязнасцямі расказваў, як варыцца слівавае варэнне і чаго трэба асцерагацца, каб слівы не закіслі. Бэгзада ківала і часам дапаўняла мужа. А тады расказвала, як было, калі немцы адступалі з Сараева, і як смутна было на іх глядзець, а чатыры гады да таго прыйшлі яны такія маладыя, прыгожыя і бялявыя, поўныя сілы і адвагі, і думалася, што яны застануцца на сто гадоў. Калі ж рускія гналі Гітлеравы дывізіі праз Украіну і Польшчу, кожны немец у Босніі – дый дзе заўгодна ў свеце – старэў і слабеў. І ўрэшце ўвесь народ можна было здаваць у старцоўскі дом, падвяла рысу Бэгзада. Тады сужэнцы крыху памаўчалі, і кожны з іх ведаў, пра што думае другі. Абое згаджаліся думкамі і цешылі незнаёмку цішынёю.

Эх, бедны доктар! Жыццё аддаў за Ягамір, сказаў урэшце Хамдзіін бацька, але потым змоўк, каб жанчына, што прыйшла да іх у госці, не падумала, што і яна павінна нешта казаць пра нябожчыка доктара Франю, а пасля прызнацца, чаму і да каго прыехала на Ягамір. Пра нешта такое не пытаюцца, бо гэта адна з такіх бедаў, пра якія не гавораць, а маўчаць, так што хто ведае – той ведае, а хто не ведае – той не чалавек, бо не разумее, што і з ім магло стацца такое самае.

Хай бароніць яго літасцівы Бог, сказала Хамдзііна маці. Рэгіна маўчала і піла ружавы сок, які пах, як Хофманава насовачка. *А і вам нялёгка,* дадаў Фуад, мяркуючы па жалобным уборы, што гэтыя словы маюць сэнс і не будуць зразуметыя няправільна.

Калі раніцай яны расставаліся, Бэгзада расцалавала яе, як сястру ці найлепшую сяброўку. Пра ноч на Бістрыку Рэгіна хутка забу-

дзецца і пра тых людзей больш не ўспомніць, калі ёй у жыцці будзе цяжка. А можа і дарма. Нічым яе не абцяжарыўшы, яны нічым не маглі ёй запомніцца. Калі б такіх было болей, жыццё было б лягчэйшае і прыгажэйшае. І цягнулася б карацей, бо ўсё было б забытае.

Праз месяц з Сараева прыйшла тэлеграма, у якой доктар Ніка Сршэн паведамляў сям'і, што пацыент Бэпа Сікірыч памёр натуральнай смерцю ў аддзяленні рэанімацыі Клінікі ўнутраных хваробаў на Кошаве, куды быў прывезены дзевяць дзён перад тым у каматозным стане. Цела таварыша Сікірыча, палкоўніка ЮНА, забралі адпаведныя службы сараеўскага гарнізона, адказныя за яго перавоз у родны горад. Смерць палкоўніка – страта не толькі для ягоных блізкіх, але і для ўсяго нашага сацыялістычнага грамадства, якое засталося без аднаго са сваіх правідцаў і рупліўцаў. Рэгіна задумалася, што магло б значыць слова руплівец.

Бэпа быў пахаваны ў той самай сямейнай магільні, дзе ўжо два гады ляжаў Іва Дэлавале. Побач на двух бетонных стэлажах апынуліся двое мужчын, якія не мелі ў жыцці нічога агульнага, настолькі нічога, што не маглі адзін аднаму быць і ворагамі. Бэпа ляжаў у масіўнай труне з арэхавага дрэва з выразанай пяціканцовай зоркай наверсе, а Іва ў іржавай бляшанцы з карцінкай вясёлай мурынкі з вялізнымі грудзьмі.

VIII

Навіна пра тое, што ў сваім маёнтку на Флорыдзе памёр Альфонс Капонэ, найвялікшы гангстар у газетнай гісторыі і адна з найгалоўнейшых зорак кіначасопісаў, была апублікаваная ў нас з трохмесячным спазненнем, прычым толькі ў бялградскай «Палітыцы», над коміксам з Мікі Маўсам. Капонэ памёр у канцы студзеня, а Іва Дэлавале якраз выпраўляўся ў сваё апошняе падарожжа ў бляшанай скрынцы ад бразільскай кавы «Сантас», складзенай на дне марацкага куфра Мілы Мілідрага. Калі карабель выплываў з порта, вялікая італьянская сям'я смуткавала па сваім хросным бацьку, а той раніцай, калі ён уваходзіў у Груж*, бялградская газета апублікавала навіну пра смерць Капонэ.

Гэтае супадзенне пацвярджае, наколькі ў тым 1947 годзе Амерыка была далёка ад Югаславіі. Калі б яна была бліжэй, Рэгіна пра мужаву смерць даведалася б раней, адразу пасля Новага года, калі ён застаўся ляжаць на падлозе ў нейкім чыкагскім ба́ры; усе думалі, што ён вусмерць п'яны, а ён проста быў мёртвы. Хто аплаціў крэмацыю і хто ссыпаў попел у бляшанку з-пад кавы, гэтага Рэгіне не мог сказаць і Міла Мілідраг. З Івам Дэлавале ён знаёмы не быў, а гісторыю пра ягоную смерць пачуў ад чалавека, які перадаў яму бляшанку разам з адрасам, папрасіўшы, каб па вяртанні ў краіну ён завёз яе нябожчыкавай жонцы. Мілідраг забыўся, як таго чалавека звалі, і дарэмна Рэгіна спрабавала яшчэ нешта ад яго дачуцца. Або той чалавек з Котару прыкідаўся дурнейшым, чым быў, бо хацеў ад яе нешта схаваць, або й сапраўды не меў уяўлення. Але тое, як яна даведалася пра Іваву смерць, і тое, што ў бляшанцы мог быць і нехта іншы ці нават проста попел, які нехта выграб з сваёй печы, абудзіла ў Рэгіне сумнеў. Дый наўрад ці магло быць інакш. Ніхто не паслаў ёй пасведчанне аб смерці, Міла Мілідраг не перадаў ёй Івавы асабістыя рэчы, і не было абсалютна нічога, што надавала

б верагоднасці бляшанцы з тварам усмешлівай мурынкі. Яна засунула яе пад умывальнік побач з вядром на смецце і вырашыла нікому нічога не казаць, перш чым даведаецца ўсю праўду. Калі б выявілася, што Іва жывы, а яе нейкі марак проста надурыў, па горадзе разышлася б гісторыя, якая хадзіла б за ёй да самай смерці. Жанчына апранулася ў чорнае, арганізавала пахаванне, прывяла святароў і закапа́ла бляшанку з-пад бразільскай кавы, а муж пасля вяртаецца жывы і здаровы!

Калі б у момант смерці Іва Дэлавале ў ягоным кашальку не ляжала дзесяць долараў, усё было б іначай. Ці калі б Міла Мілідраг быў чалавек болей прыстойны, калі б ён баяўся Бога і верыў, што той, хто крадзе ў мёртвых, скончыць у пекле. У такім выпадку жыццё Рэгіны, і яе дачкі, якой у момант бацькавай смерці было тры гады, склалася б інакш і не здарылася б шмат з таго, што здарылася. Можна сказаць, што адна адзіная банкнота вырашыла і скіравала іх лёс.

Чалавека, чыё імя Мілідраг забыўся, звалі Пэтар Погнар, і ён быў упаўнаважаным нейкага харвацкага таварыства ў Чыкага, якое пераважна апекавалася памерлымі. Акрамя бляшанкі з попелам, ён перадаў мараку нябожчыкаў кашалёк, у якім побач з дзесяццю долярамі ляжалі фатаграфія трохмесячнай Дыяны, югаслаўскі вайсковы білет і шэсць-сем даведак аб рэгістрацыі месца жыхарства на імя Івы Дэлавале. Ён перадаў таксама рабочую кепку і дзве насоўкі, якія Погнарава жонка папярэдне вымыла, каб не сарамаціць нябожчыка, а таксама латунны крыжык, пэўна ж, без ніякай вартасці.

Усе гэтыя рэчы былі Рэгіне знаёмыя: насоўкі яна купіла ў Чапліне, кепку ён насіў замест марацкай фуражкі, крыжык належаў Іваву брату Радавану, які загінуў як аўстрыйскі жаўнер на рацэ Сочы ў 1915-м. Калі б хоць адзін з гэтых прадметаў дайшоў да Рэгіны, яна ведала б, што яе Іва мёртвы, доўга і шчыра яго аплаквала б і ніколі нічога не пачала б правяраць. Але Мілідраг, дастаўшы з кашалька дзесяць долараў, кінуў усе рэчы ў Атлантычны акіян, упэўнены, што толькі так можа схаваць сваё злачынства. Ён выкінуў бы і бляшанку з попелам, але спадзяваўся на нейкі знак удзячнасці, калі перадасць яе ўдаве. Калі ж ён не дачакаўся ніякай удзячнасці ад Рэгіны, бо тая выправадзіла яго з парога горш, чым нейкага паштара, то

і пашкадаваў, што не высыпаў попел у мора. І не было ў яго ніякага дакору сумлення, што ён скраў у мёртвага грошы.

Рэгіна напісала карабельнай кампаніі, з якой плаваў Іва, але адказу не атрымала. Пасля паведаміла пра знікненне мужа міліцыі, паслала ліст у югаслаўскае пасольства ў Вашынгтоне, распытвала ў эмігранцкіх таварыствах, падала абвесткі ў газетах і на радыё. Імя Івы Дэлавале дыктар прамаўляў кожную пятніцу ў начной перадачы для тых, хто страціў у вайну сваіх родных. Сярод тысяч тых, хто не вярнуўся і чые целы не былі знойдзеныя, а належалі яны да розных войскаў і апошні раз іх бачылі ў самых дзіўных месцах – ад Дахаў, Сталінграда, Берліна, Масквы, Вены, Зіданага Моста, Жалезнага, Трыеста, Удынэ, Благоеўграда, Бухарэста да Суцескі, Фочы, Званіміравай вуліцы ў Заграбе, Благая, Віса, Біякава і Эш-Шата, – апынуўся і Іва Дэлавале, карабельны механік, апошняя пэўная інфармацыя пра якога была тая, што ўвосень 1944 года ён выйшаў з порта Бары на амерыканскім вайсковым караблі *Iron Star* у складзе экіпажа маракоў, якія на даручэнне ўлады свабоднай Югаславіі меліся пераняць рэшткі каралеўскага гандлёвага флоту, якія ўжо тры гады стаялі на якары ў амерыканскіх партах.

Кожную пятніцу Рэгіна слухала перадачу па радыё і чакала, ці не адгукнецца хто-небудзь. Яна запамінала імёны зніклых і неўзабаве ведала ўжо дзве сотні тых, што ўвесь час паўтараліся, бо ніякіх вестак пра іх не даходзіла. Магчыма, і іх родныя запомнілі Івава імя, і цяпер яны былі між сабою знаёмыя і блізкія, хоць ніколі не бачыліся. Як дзеці памятаюць імёны футбалістаў і могуць напамяць пералічыць склад каманды, якая ў наступным годзе паедзе на лонданскую Алімпіяду, гэтак жонкі і дочкі зніклых салдатаў і маракоў могуць пералічыць тых, чыё імёны кожную пятніцу чытаюцца па радыё і будуць чытацца гадамі, пакуль ёсць жывыя, якія не ведаюць, дзе іх мёртвыя.

Я ведаю, Іва жывы, жлукціць з неграмі і мацае курваў. Сраў ён на наш камунізм! сказаў Лука, каб яе суцешыць. Рэгіна схапіла са стала бутыль, і калі б брат не паспеў спрытна зачыніць за сабой дзверы, трапіла б яму ў галаву. Дыяна завыла, як карабельная сірэна, па барадзе ў яе сцякаў вараны ў малацэ шпінат. Вочы ледзь не вылазілі з арбіт, так што яна выглядала, як нейкае дзіўнае стварэн-

не. Афрыканская малпачка, якую ў заапарку ўкусіла шалёная ліса. Рэгіна ўзяла дачку на рукі і моцна яе абняла, больш каб не бачыць яе іншай, як з матчынай ласкі. Зялёная слізь размазалася па белай блузцы, разбітае шкло хрусцела пад кожным крокам; маці спрабавала прыгадаць словы якой-небудзь калыханкі, але не магла ад крыку і віску. Яна зацягнула «Сладку малу Марыяну», спрабуючы перакрычаць дачку. Асаблівага музычнага таленту яна не мела, а чым галасней спявала, тым гучней выла Дыяна, таму кожны, хто іх чуў, мог палічыць, што Рэгіну з тугі па мужу пачынае пакідаць розум. Вокны былі расчыненыя, а тое, што гучыць з суседскіх вокнаў, слухаецца ўважлівей, чым Радыё Лондан.

Днямі яна была ў адчаі і роспачы. Кожны раз, выкідаючы ў смецце лупіны ад бульбы і рыбіны косці, яна бачыла бляшанку з усмешліваю мурынкай. Тады яна думала, што яе муж мёртвы, і яе ўмомант ахапляла туга. Праз пяць хвілін яна прыгадвала Мілу Мілідрага і ягоны тупаваты твар: так не выглядае вястун няшчасця. Той, хто прыносіць такія весткі, павінен глядзецца іначай ці прынамсі мець на сабе нейкую строгую ўніформу. Нельга паверыць, каб жыццё забіралі з дому прайдзісветы, абадранцы і жулікі. А Міла Мілідраг, і сляпому было відаць, быў і адно, і другое і трэцяе. І хоць яна не верыла ў Бога, Рэгіна адчувала, што душы ў Сусвеце ўсё ж падабраныя паводле нейкага правіла, у якое не ўкладаўся ні котарскі марак, ні бляшаная скрынка.

Яна чула, што ў Боцы Котарскай родныя і сваякі жэняцца між сабою і не зважаюць, калі муж і жонка маюць таго самага дзядзьку ці таго самага дзеда, і таму там нараджаюцца дзеці з дзвюма галовамі і поўна дарослых мужчын з розумам трохгадовага дзіцяці. Яна прыгадвала ўсё, што калі-небудзь чула пра бокаўцаў, і была ўсё больш перакананая, што Міла Мілідраг усё выдумаў пра смерць ейнага Івы, спадзеючыся атрымаць за сумную вестку нейкую ўзнагароду. Калі б марак быў з Корчулы, Хвара, Спліта ці Герцагавіны, Рэгіна хапалася б за іншыя гісторыі і легенды, бо нешта знойдзецца пра любы край, але ж гэты быў бокавец, і таму яна ўсіх бокаўцаў зненавідзела. Ёй гэта было патрэбна, каб не паверыць, што ў бляшанцы з-пад кавы спачывае ейнае каханне.

У дванаццатую пятніцу дыктар абвясціў, што з Амерыкі прыйшла вестка пра марака Іву Дэлавале, таму яго родных просяць пазваніць на тэлефонны нумар радыёстанцыі Загараба, Бялграда ці Сараева, дзе можна атрымаць больш падрабязную інфармацыю. Рэгіна не помніла сябе ад радасці; здарылася тое, на што яна наўрад ці магла спадзявацца, бо за апошнія тры месяцы, як яна пачала слухаць перадачу, толькі два разы прыйшлі весткі пра зніклых. І яшчэ: дыктар сказаў не «нябожчык Іва Дэлавале», а толькі «Іва Дэлавале». З гэтага яна зрабіла выснову, што ён жывы, забыўшыся, што слова «нябожчык» у перадачы не вымаўлялася ніколі. Яно было амаль забароненае, бо столькі людзей сядзелі каля радыёапарата з надзеяй, што ніколі яго не пачуюць. Калі б яны пачулі пра некага з тых, чые імёны ведалі напамяць, што ён нябожчык, іх мог ахапіць адчай, і яны здаліся б, а пасля вялікай вайны нельга было здавацца, пакуль усе не даведаюцца пра свае магілы. Рэгіна лётала па хаце як безгаловая, уключала і выключала святло, абдымала Дыяну, казала *наш тата адазваўся! наш тата*, а дзіця толькі коратка пішчала, адбіваючыся ад усіх прапановаў і заклікаў да ўсяго, што не звязана са сном.

Як толькі развіднела, яна ўзяла Дыяну на рукі і пайшла на пошту, села на каменную агароджу перад будынкам і чакала, пакуль адчыняцца акенцы. Дзіця спала на плячы і было цяжкае, як мёртвае цела; да шостай гадзіны ў яе ўжо здранцвелі і рукі, і ногі і яна падумала, што, можа, лепш было пакінуць Дыяну дома. Але хто б, як не яна, тады непакоіўся, ці не задушыцца малая падушкай, ці не ўпадзе з ложка, ці не прабудзіцца нечакана і ці не будзе ў страху кідацца па пустым доме. Калі б яна не нарадзіла яе так позна, можа, яна спакойна яе пакідала б і менш хвалявалася б, але ў сорак, магчыма, ужо пачынаюць слабець мацярынскія інстынкты; жанчына больш не ведае, што натуральна, што можна і чаго нельга рабіць дзіцяці. *У старых парадзіх псуецца малако,* сказала Зайка Муіч, калі яна прыйшла нараджаць, *таму ты знайдзі сабе маладую мамку, каб дзіця не было залатушнае*. Пасля яна глядзела на свае грудзі як на вёдры, у якія надаілі малака і забыліся ці завялі даярку ў лес, зарэзалі і кінулі ў яму. Чорныя карцінкі з чорнага часу; быў

1944 год, Італія пала, усташы шалелі, чэтнікі спускаліся ў горад, пра партызанаў што толькі не гаварылі, а Рэгіна нараджала ў свой апошні жаночы момант, у найгоршую часіну для таго, каб дараваць свету новае жыццё. І ўсё выйшла добра, вайну ўдалося перажыць. Але тады звар'яцеў Бэпа, а пасля нібы з'явіўшыся з ягонай хворай галавы, у дзверы пастукаў Міла Мілідраг.

Здавалася, што паміж двума няшчасцямі існуе ясная сувязь і што не было тых пятнаццаці месяцаў, што прайшлі ад першай да другой страшнай навіны. Першая была праўдай, а другая – хлуснёй. Але гэта такая хлусня, якую нічога не можа выправіць і ў якую будуць верыць, нават калі яна раскрыецца. Рэгіна ніколі не забудзе тых начэй, калі яна не спала і то развітвалася з сваім мужам і аплаквала ўсякую ягоную пяшчоту, то злавалася на вестуна, і тая злосць умомант пераносілася на Іву, які не азываецца ўжо больш за два гады. Ведае яна – сувязь слабая, маркі дарагія, лісты не даходзяць, у марскіх бітвах і бурах тонуць караблі з поштай.

Але іншым жанчынам мужы азываюцца з мора. Калі б ён хоць раз даслаў вестачку, яна ведала б, што котарац хлусіць, насадзіла б яму тую бляшанку на галаву, бо ейны Іва пісаў ёй, што жывы і ўсё ў яго добра, дык не можа быць, што ён проста ўзяў ды памёр.

А можа, Іва ёй дзесяць разоў пісаў, слаў пасылкі і лісты праз людзей, але да яе выпадкова нічога не дайшло? Можа, ён і цяпер хвалюецца за яе гэтак сама, як яна хвалюецца за яго, непакоіцца, ці жывая, ці здаровая? Калі не за яе, дык за дзіця. Кожны бацька сама меней дзесяць разоў на дзень падумае, як там ягонае дзіця. Калі ўжо ў маці ўваччу ўзнікаюць страшныя карціны, і яна бяжыць у пакой, каб паглядзець, ці спіць яе дзіцятка або ўжо нежывое, дык што ж бацьку, які не бачыў яго столькі часу? Іву значна горш, чым ёй.

З страўніка ўзнімалася млосць. Яе ахапляла туга, яна плакала, думала, што́ з ім магло здарыцца, пасля верыла ў бляшанку пад умывальнікам і развітвалася з сваім каханнем, без якога жыццё не мела сэнсу. Так міналі ночы, і таму ў той момант, калі прыйшоў начальнік пошты, ёй здавалася, што час не змые котарцаву хлусню.

Паштар Віта спярша спрабаваў дазваніцца да радыёстанцыі ў Заграбе. Не менш як разоў дваццаць ён павярнуў дыск на чорным

канцылярскім тэлефоне, які стаяў тут яшчэ ад габсбургскіх часоў, але ў трубцы было маўчанне ці чуўся шум і трэск, у якім нельга было разабраць чалавечага голасу. Тады ён пазваніў у Сараева, але на радыёстанцыі ніхто не паднімаў трубку. *Чортава Боснія,* прамармытаў ён і паспрабаваў яшчэ раз. Тады затэлефанаваў на Радыё Бялград. *Ёсць сувязь,* падаў ён трубку Рэгіне.

Алё, алё, алё, крычала яна, хоць добра чула жаночы голас на другім канцы дроту. Але яна не ведала як пачаць і што казаць.

Мой муж Іва Дэлавале…, паспрабавала яна скласці пытанне.

Па інфармацыі, якую мы атрымалі з Чыкага, таварыш Іва Дэлавале, былы марак Гандлёвага флоту Федэратыўнай Народнай Рэспублікі Югаславіі, памёр першага студзеня ў вышэйзгаданым горадзе. Яго цела спалена, а попел перададзен амерыканскай грамадзянцы Дыяне Вічэдэмоні, якая аплаціла ўсе выдаткі, адрапартаваў жаночы голас, *прыміце нашы спачуванні і ўсяго найлепшага!* скончыў голас, і сувязь абарвалася.

Рэгіна стаяла з трубкай у руцэ, ківала галавой, паўтарала *так, так, так…* яшчэ доўга пасля таго, як скончылася сувязь. *Дзякую вам і да пабачэння,* сказала яна, калі ніякіх сумневаў больш не было.

Паштар Віта з цікаўнасцю чакаў, што будзе адбывацца, калі Івава ўдава заплача і пачне галасіць, бо так бывае, калі жанчына распытвае пра мужа па тэлефоне. Часы такія, што цяпер прыходзяць толькі тэлеграмы смерці. Аднак яна ўсміхнулася, значыць, Іва не памёр.

Колькі я вам вінаватая? спыталася яна.

За добрыя навіны нікалькі, адказаў ён і адсунуў грошы праз прылавак. *Дай Бог больш такіх навінаў, я за кожную плаціў бы з сваёй кішэні*, сказаў ён, не змяніўшы свайго рашэння.

Эх, якая ж ты шчаслівая, думаў ён, калі яна выходзіла, нават не ведаеш, якая ты шчаслівая. Толькі ў няшчасці чалавек ведае, як яму, і ніколі болей. Глядзеў Віта Анаф на свой тэлефон, і было яму радасна ад думкі пра гэтую жанчыну.

Яна, аднак, зрабіла ўсё, каб стрымаць слёзы і каб нічога цяжкага і брыдкага не было відаць на яе твары, упэўненая, што паштар быў бы задаволены, калі б даведаўся праўду: і што Іва мёртвы, і што белградчанка паклала трубку да таго, як яна паспела нешта спытацца…

У такіх рэчах знаходзяць задавальненне ўсе, нават калі робяць выгляд, што ім шкада, нават калі гатовыя табе дапамагчы.

Калі яна выйшла з пошты, у галаву ёй прыйшло нешта, што ўмомант засланіла прычыны для тугі і адчаю. Хто тая жанчына, якая «аплаціла ўсе выдаткі»? Малаверагодна, што тут гаворка пра нейкую добрую душу, пра нейкую багачку, якая праводзіць на той свет людзей, у якіх у Амерыцы нікога няма. Можа яна і паверыла б у такое, – больш ад жадання паверыць і ад кахання, якое важнейшае за праўду, – калі б толькі тую жанчыну не звалі Дыяна! Калі б белградчанка вымавіла нейкае іншае імя, калі б машыністка на Радыё Бялград запісала яго памылкова ці калі б сувязь была горшая і Рэгіна замест Дыяны пачула б нешта іншае, тады, можа, яе лёс павярнуўся б па-іншаму. Яна ўсё жыццё насіла б жалобу па Іву, трымала б яго фатаграфію ў каралеўскай марской уніформе на начным століку, не дажыла б да дзевяноста сямі, а памерла б, калі б на тое прыйшоў час, прыміраная з людзьмі й сваёй доляй. У ёй не нарадзілася б вялікая жыццёвая злосць, якая не будзе даваць яе сэрцу спыніцца. Але цяпер усе яе пяшчоты і страхі ператварыліся ў злосць, як віно ў воцат.

Ідучы дадому, яна абдумвала, як дакапацца да Дыяны Вічэдэмоні і да разгадкі, кім была Іву гэтая жанчына. Хоць яна была ўжо ўпэўненая, што ведае адказ. Калі за месяц да Рэгініных родаў Іва нечакана з'явіўся ў іх доме пасярод ночы, яна спалохалася, бо ўвесь горад быў аблеплены абвесткамі аб ягоным пошуку. А яна думала, што ён ужо ў бяспечным месцы – на Вісе*, у Англіі ці дзе там яшчэ могуць быць Цітавы маракі.

Ці ты хоць думаеш пра гэтае дзіця? дакарала яна яго, пакуль яе вочы прасняліся ад сну.

Мы доўга не пабачымся, сказаў ён і лёг да яе, не распранаючыся, абняў ззаду і гладзіў жывот.

Табе будуць цвікі пад пазногці заганяць, калі зловяць, сказала яна, уладкоўваючыся ўтульней у ягоных абдымках.

Застанься так, спыніў ён яе, калі яна хацела павярнуцца, каб бачыць ягоны твар. *Яшчэ гэты раз*, сказаў ён, і яна ўсміхнулася.

Ён заўсёды кажа тое самае, яшчэ гэты раз, яшчэ гэты раз, няважна, разам яны кожную ноч ці ён прыйшоў у яе ложак пасля месяцаў

і гадоў разлукі. Іва любіць, калі яна ляжыць да яго спінай і туліцца да яго, тады яны так спяць і займаюцца сваёй справай. Рэгіне гэта дзіўна; хоць яна не ведае, як абдымаюцца і спяць іншыя. Але ёй здаецца, што гэта трошкі непрыстойна і што жанчыны на такое не згаджаюцца, нават калі мужчыны хочуць. А мужчынам мала што прыйдзе ў галаву. Мужчына адначасна і дзіця, і д'ябал. Тое, што мужчыну заманулася б рабіць у ложку, жаночы розум не можа сабе ўявіць. Лёгка Іву з ёй, але іншыя жанчыны не такія. Тым больш, калі кожную нядзелю ходзяць у касцёл. Не сядае на лаву задніца, якая ўсю ноч церлася аб мужчынскую штуку і прыладжвалася на ёй, як і на малельную лавачку не апускаюцца калені, якія кленчылі перад ім. Ёй таксама было нялёгка, калі ён першы раз схіліў ёй галаву ніжэй і сказаў, каб яна ўкленчыла перад ложкам і пацалавала тое, што вуснамі не цалуюць. Каб такое рабілі жанчыны, якія кожную нядзелю ходзяць на імшу! Не, Рэгіна ў гэта не верыла. І замінала ёй тое, што яна ведала, дзе Іва вучыцца ўсяму, на што гатовая жанчына, і ўсёй той распусце, якая можа рабіцца ў ложку. Калі ён расказваў, у якіх партах прыставаў іх карабель, перад Рэгінінымі вачыма паўставалі ўсе касавокія і доўгавалосыя, белыя і чорныя і тыя, што выглядаюць, як малпы і маюць сплюснутыя насы і вялікія вусны, і незразумела, як такія могуць падабацца мужчыну. Яна была пераканаваная, што ўсе яны перад Івам разводзілі ногі, кленчылі, выпіналі свае вялікія цёмныя задніцы, завабліваліяго ў сябе і праглыналі, як зямля праглынае крата. А што яшчэ маракі робяць у партах, калі не ходзяць да курваў? Ён ніколі пра іх не згадваў, але хіба хоць адзін мужчына расказвае жонцы пра такія рэчы? Рэгіна не адчувала рэўнасці і не баялася хваробаў, якія прыходзілі ў горад з далёкіх краёў і пра якія гаварылася напаўголаса, бо кожная марачка баялася, каб муж не прывёз і ёй ганарэю з Сінгапура ці трыпер з чорнай Афрыкі, таму яны не надта ўпіваліся зларадствам з тых гаротніц, пра якіх казалі, што муж прывёз ім у падарунак з цёплых мораў нейкую гнюсь, якую не вылечыць ніводзін заграбскі і бялградскі лекар. Рэгіну мучыла іншае: калі б Іва ні прыходзіў з мора, яна баялася першай ночы, якую праводзіла з ім у ложку. Баялася і другой, і трэцяй, і чацвёртай, бо хто ведае, калі яму прыйдзе ў галаву і колькі

спатрэбіцца часу, каб наважыцца папрасіць у яе тое, чаму яго навучылі партовыя курвы. Ці зможа яна адолець сорам? Ці будзе ведаць і ці ўвогуле зразумее, што трэба рабіць? Тыя жанчыны вучацца кожны дзень і кожную ноч таму, што жонкі маракоў павінны ўмець адразу, як толькі мужы вернуцца з мора. У іх сабраныя веды пра ўсё, што мужчына можа пажадаць. Пра кожнае жаданне кожнага мужчыны ў свеце. А дзеля таго, што людзі розныя, у іх розныя і жаданні. Мурын не пажадае таго самага, што наш чалавек, думала Рэгіна, і напэўна ж ёсць розніца паміж японцам і амерыканцам. Як у іх розняцца вочы і твары, гэтак яны розняцца і ў тых частках цела, якія бачаць толькі курвы. Яна пра гэта нічога не ведае, а яны ведаюць усё. Як ведаюць і тое, што мужчыны – гэта ненасытныя дзеці, якія жадаюць і тое, што прызначана не ім, а некаму іншаму. І курвы ім гэта даюць. Усё, што яны ім даюць, маракі пасля чакаюць ад сваіх жонак.

З якой бы пагардай яна ні ставілася да іх ці прынамсі як бы ні спрабавала думаць пра іх тое, што думаў увесь горад, да партовых курваў яна адчувала павагу. Як да лекараў, адвакатаў і фокуснікаў, людзей, якія валодаюць ведамі, без якіх свет не прапаў бы, але ўсё ж ён на іх трымаецца. І яна баялася, калі Іва вяртаўся з мора, – ці зможа яна зрабіць тое, што могуць яны.

Калі яна першы раз узяла яго ў рот і адчула салоны смак таго, пра што, як яна думала, бальшыня жанчын не ведае, яна верыла, што ён салоны ад Афрыкі і Сінгапура. Яна адчула на языку карыцу і мускатны арэх, прысмакі распусты, якім не месца ў ніводнай страве.

У тую апошнюю ноч, калі ён абдымаў яе і далонню праслухваў жыццё свайго дзіцяці, Іва не жадаў нічога з таго, чаму яго навучыў свет. Ён ляжаў апрануты, але яна адчувала яго праз шоўк і сукно. Яна адчула б, нават калі б паміж імі быў мур, і моцна жадала, каб ён раздзеўся і зрабіў з ёй усё, што яму захочацца. І тое, чаго не магла паказаць яму ніводная курва, і тое, на што не створанае жаночае цела, і тое, што яе забіла б. Рэгіна магла ўсё і ўсяго хацела, закаханая тою ноччу каханнем большым за горад і гарадскія муры, большым за святога заступніка, большым за вайну і ўсе арміі, большым за тых, хто зараз павесіў бы ейнага Іву, калі б толькі даведаўся, што ён

тут. Яна так ганарылася і адчувала сябе самай споўненай жанчынай ад тых часоў, як існуе свет, бо яе муж рызыкаваў жыццём, толькі каб прыйсці да яе і забрацца да яе ў ложак. Калі раней яна сумнявалася ў Іву і думала тое, што думаюць усе жанчыны – што яна неістотная рэч у ягоным жыцці і што яна тут выпадкова і на яе месцы магла б цяпер быць і нейкая іншая, – цяпер яна была перакананая ў сваёй абранасці, у тым, што яна створаная для яго і што ён ніколі не замяніў бы яе ні на якую іншую. Яна паварушылася ў ягоных абдымках, прыладжваючыся і круцячыся, як курва, узяла ў руку ягоную цвёрдасць, але засаромелася, бо якраз тады ён спытаўся: *Будзе дзяўчынка, так?*

Цыганкі сказалі, хутка адхапіла яна руку, спадзеючыся, што своечасова.

Дыяна, сказаў ён, *прыгожая імя, Дыяна.*

Яна нічога не адказала яму, але потым спалохалася, што народзіць хлопчыка. Гэта была б яе здрада. На шчасце, у іх нарадзілася Дыяна.

Вяртаючыся з пошты з дзіцём на руках, яна перабірала ў думках кожнае імгненне той апошняй ночы. У ёй мяшаліся сорам і гнеў, ёй было гідкае ўсё, што яна зрабіла дзеля яго ў жыцці. Усё, да чаго ён падманам яе падштурхнуў. Яна адчувала, як ёй пячэ і паліць яго мужчынства, жадаючы зрабіць яе яшчэ больш няшчаснай. На канцы языка быў балючы прышчык. Быццам яна наелася зялёнага інжыру. Іваў смак быў такі блізкі, што ёй здавалася – дастаткова толькі трошкі прыспешыць крок ці выкрыкнуць яго імя, і ён узнікне перад ёю, голы, ліпкі і валасаты. Іва Дэлавале! Яна спытаецца ў яго, хто яму тая Дыяна Вічэдэмоні, і што б ён ні адказаў, яна зробіць тое самае: парэжа яго на кавалачкі, прыпаліць яму раны распаленымі сасновымі трэскамі, будзе ка́паць яму на машну гарачай смалою і заліваць яе ў брудную дзірку, гэтую лютаўскую міндальную кветку, да якой было забаронена дакранацца. Ён ніколі ёй не дазваляў. І цяпер яна ведала чаму! Каб яна не падумала, што ён, акрамя як з курвамі, робіць нешта і з таварышамі на караблі!

Ён не вытрымаў бы такога падазрэння, распаўся б, як стары карабельны матор, перастаў бы быць мужчынам. Дастаткова, каб толькі аднойчы яна пазнала ў ім Гезу Мадзяра, якому гарадскія хлапцы

адсеклі вуха, пазначыўшы яго так, каб увесь горад ведаў, што да яго лепш не набліжацца, бо яго заспелі, як пад вялікім дамкратам у верфі адзін мурын, амерыканскі марак, заганяў яму хуй у задніцу. Мурына малацілі цэлую раніцу, пакуль ад яго не застаўся крывавы камяк і невядома было, ці гэта чалавек, ці гэта нехта побач з іржавымі карабельнымі кантэйнерамі, сярод бруду, каламазі і нафты кінуў згнілую валовую здыхліну. А Гезу Мадзяра не білі, а паслалі малога Джыву, пяцігадовага сына цырульніка Карла Каракуны, каб ён прынёс ад таты брытву. Малы не ведаў, нашто ім брытва, але прынёс. *Дзядзя Мата прасіў*, сказаў ён бацьку, а той, дурань, і не падумаў, што́ дзіця можа зрабіць з брытвай, і даў яму, *скажы дзядзю Мату, каб адразу вярнуў*. Хлопчык быў рады, што можа быць карысным, ён думаў, што гэтым ён залічаецца ў свет дарослых. Праўда, яго трошкі збянтэжыла, калі ён убачыў, што дзядзя Мата трымае дзядзю Гезу Мадзяра за ногі, а Але Певач барцоўскім захопам сціскае яму галаву. *Дай сюды, малы!* сказаў Іванка, заграбскі студэнт і найлепшы ў горадзе плывец, узяў брытву, прыхапіў Гезу за вуха і адным рухам яго адсек, Мадзяр пачаў лямантаваць, а Іванка сунуў яму вуха ў рот: *Жары, підар сраны, жары, калі не зжарэш, адрэжу табе хуй! Усё адно ён табе не патрэбны!*

Так Геза Мадзяр з'еў уласнае вуха. Джыва глядзеў на ўсё гэта, не прамаўляючы ні слова, нямеў, камянеў і спасцігаў навуку, што́ бывае з не такімі, як усе, і што трэба рабіць з чалавекам, чые мары і жаданні розняцца ад жаданняў людзей, якія яго трымаюць.

Ён ведаў, што Геза Мадзяр не такі, як іншыя ў горадзе, але не быў упэўнены, што ведае, чым ён не такі. Тым, што ён тоўсты і друзлы, тым, што, вітаючыся, усміхаецца кожнаму, тым, што размаўляе з гандляркамі і ходзіць па рынку так, быццам камяні выслізнуць у яго з-пад ног і трэба глядзець асцярожна, як на які стаць, або ён розніцца ад іншых толькі тым, што ён адзін, а іх вунь колькі?

Нічога тут Джыву не было ясна, але ён папрасіў Іванку вярнуць брытву, бо тата заб'е, калі ён не прынясе яе назад. *Плюнь на яго, тады дам!* загадаў студэнт.

І так малы Джыва плюнуў на Гезу Мадзяра, у якога з галавы свістала кроў. *Скажы яму ябаць цябе ў дупу гнойную!* і Джыва сказаў

гэта, каб толькі атрымаць брытву. Яна была ў крыві, і па дарозе ён абцёр яе аб нагавіцы, але адразу падумаў, што атрымае за гэта ад маці, і хацеў сцерці кроў, але як сцерці тое, што ўжо ўпэцканае, і ўрэшце парэзаў палец. Адкрыўся тонкі чырвоны парэз, які не балеў, але як толькі ён сціснуў кулак, парэз пашырыўся, пацякла кроў, і яму забалела. Ён заплакаў бы, але плакаць было нельга, дый не было каму. Яму было важна толькі вярнуць брытву.

Дык вось, Іва баяўся, каб Рэгіна не ўбачыла ў ім нешта, што было ў Гезу Мадзяру, і таму ён адскокваў у ложку, калі яна выпадкова дакраналася да ягонай міндальнай кветкі. *Ты чаго, я не хацела!* казала яна, засаромеўшыся, каб ён выпадкова не падумаў, што яна наўмысна лезла туды пальцамі. Не так лёгка знайсці мяжу паміж мужчынскім жаданнем, адным з тых, якім яго вучылі курвы, і забароненымі часткамі цела. Тымі, якія розняць нармальных мужчын ад аднавухіх вырадкаў, якія ёсць у кожным далмацінскім горадзе.

Затое яе міндальная кветка, як ён яе і назваў, калі адной такой ноччу ўвесь гладкі, напружаны і бэзавы хацеў увайсці ў яе, забароненым месцам не была. Ён так вырашыў. А не можа быць, каб тыя часткі цела, якія маюць і мужчыны і жанчыны, у яго былі цветам гонару, а ў яе міндальнай кветкай, якую трэба раскрыць.

Усё, што ў Рэгіны круцілася ў галаве, узмацняючы з кожным крокам яе нянавісць, датычыла толькі начэй, праведзеных з Івам. Увесь свет умясціўся ў ложку, і яна нават не думала пра тое, што́ паміж імі адбывалася ўдзень і па-за ложкам. Прычыны для помсты, якія зробяцца найважнейшымі ў яе жыцці, датычылі адчування, што Іва спаў не з ёй, а з нейкай іншай жанчынай, якую ўяўляў сабе і таму не хацеў, каб яна паварочвалася ў ложку да яго тварам. Курвам ён плаціў грашыма, а ёй проста хлусіў. Усё астатняе было неістотнае, і ён не адрозніваў яе ад сотняў, а можа і тысячаў жанчын, якіх спазнаў па ўсіх партах свету. Ён кахаў толькі адну, і таму хацеў назваць дачку ейным імем.

Яна пасадзіла Дыяну на кушэтку, узяла паперу і аловак і напісала: «Са смуткам у сэрцы паведамляем, што ў Амерыцы памёр Іва (Эторэ) Дэлавале. Пахаванне адбудзецца заўтра, у аўторак, у сямейнай магільні Лоўры Сікірыча. Смуткуюць: жонка Рэгіна і дачка Дыяна».

Пасля падумала і найперш закрэсліла «са смуткам у сэрцы», а пасля замест слова «смуткуюць» напісала «хаваюць». Пасля выкрасліла і імя дачкі. Узяла паперу і бляшанку з усмешлівай мурынкай і пайшла ў пахавальную кантору.

Толькі выйшаўшы з дому, яна ўспомніла, што пакінула Дыяну, спынілася на імгненне і пайшла па сходах далей. Тады яна ўпершыню пакінула Дыяну ў доме адну. Пахавальнікі спярша не хацелі браць бляшанку, але яна ім прыгразіла, што зараз яе адчыніць і высыпле попел на падлогу, і хай тады сабе разбіраюцца. Яна таксама адхіліла ідэю пашукаць у горадзе лепшую урну, напрыклад такую керамічную аптэкарскую, у якіх захоўваюцца прэпараты для лекаў.

Не, пахаваю яго такім, якім мне яго прыслалі! рэзка адказала яна, і людзям у чорным не прыйшло ў галаву ёй пярэчыць.

Пахаванне было нядоўгае, без прамоўцаў і святароў. Лука прынёс вянок, суседзі зазіралі ў адкрытую магільню, спрабуючы праверыць, у якім стане прадзед Лоўра, які памёр у восемсот нейкім, і астатнія нябожчыкі, якія пайшлі за ім, але мала што маглі пабачыць, бо ў магільні было змрочна і не адчувалася ніякага асаблівага паху. Пахла каменем і вільгаццю, дакладна так, як пахнуць затопленыя склепы дамоў, разбураных у вайну. Пахавальнік у чорным прынёс бляшанку з Івавым попелам, прыкрытую чорнай хусткай. *К чорту гэтую анучу!* крыкнула на яго ўдава, *здымі гэта!* Яна падышла і сарвала хустку, як у тым фокусе з зайцам і капелюшом. Пачуўся спалоханы ўздых. Нават Луку было непрыемна, хоць ён не надаваў вялікага значэння пасмяротным ушанаванням і грэбаваў людзьмі, якія любілі хадзіць на пахаванні. Але яшчэ не бывала, каб некага хавалі ў іржавай бляшанцы з-пад кавы.

Яна звар'яцела, шапталіся старыя бабы ў хустках, выходзячы з могілак. *І Бога не пабаіцца!* ужо ўголас абураліся яны, калі Рэгіна больш не магла іх чуць.

Знайшла час усцацца, гадаўка! крыкнула яна на Дыяну і пляснула па шчацэ. Дзіця заскуголіла, і маці пляснула яшчэ раз. *Што з табой, жанчына божая?* падбег Лука і вырваў у яе малую. Апынуўшыся ў надзейных руках, Дыяна пачала выць на ўвесь голас. Дзядзька падняў яе на рукі, *дзядзя табе дасць цукру*, супакойваў ён дзяўчынку,

спрабуючы дагнаць Рэгіну, якая раз'юшана шыбавала наперад. Ён трухаў за ёй да самага дому і чым больш прыспешваў крок, тым і яна ішла ўсё шпарчэй, трымаючы тры-чатыры метры дыстанцыі.

Яна ніколі не расказала яму ўсёй праўды, чаму сябе так паводзіла, а Лука асабліва й не пытаўся. Сястра была старэйшая за яго на сямнаццаць гадоў. Ад яго маленства яна ставілася да Лукі памацярынску, па сутнасці, яна яму ў значнай меры і замяніла маці, калі тая ў 1927 годзе памерла ад сэрца. Яна рэдка крычала на яго і не злавалася на ягоныя выбрыкі, а бараніла яго ад старэйшых братоў, якія, калі яму было трынаццаць, хацелі нават выгнаць яго з хаты, калі ён на Пілах учыніў скандал з брытанскім консулам і да іх дадому прыходзіла паліцыя.

Тое, што Рэгіна раз'юшылася, што без прычыны ўдарыла дзіця і што не праліла па Іву ні слязы, Луку было дзіўна. Ён адчуваў, што за гэтым нешта хаваецца і што яна яму растлумачыць і скажа роўна столькі, колькі яму трэба ведаць. *У яго была нейкая курва ў Чыкага*, сказала яна ў той самы вечар. *Ты ўпэўненая?* спытаўся ён замест каб сказаць, што нейкую бабу мае кожны ці амаль кожны марак і што дзеля гэтага не варта так пераймацца. Рэгіна толькі паглядзела на яго і нічога не адказала. Дыяна сядзела на гаршку побач з умывальнікам і не наважвалася сказаць, што ёй не хочацца ні сікаць, ні какаць. Яна маўчала і зіркала то на маці, то на дзядзьку, пакуль Лука не зразумеў, што дзіця ўжо гадзіну сядзіць на начной пасудзіне і не падае голасу. Ён пляснуў у далоні, *ці мы скончылі, браце Сакраце?* спытаўся ён, згроб Дыяну і перакуліў яе дагары нагамі, каб праверыць. На белай дзіцячай попцы вымалёўваўся дасканала правільны і яркі чырвоны круг ад краёў гаршка. *Нічога не было?* нібы строга спытаўся ён, нюхаючы Дыяніну заднічку. Яна смяялася, як шалёная, забыўшыся пра страх.

Ці мы скончылі, браце Сакраце? пытаўся Лука штодня па пяць-шэсць разоў, абціраў Дыяне заднічку, пераадзяваў яе, калі яна загуляецца і абсікаецца, вадзіў яе за сабой у горад, ад кавярні да кавярні. А яна гадзінамі ціха сядзела, пакуль дзядзя гуляў у карты. Такое было правіла. Калі дзядзя гуляе ў карты, павінны быць цішыня і спакой. Каб і яе і яго іншыя дзядзі не прагналі.

Сядзі і не варушыся і думай, каб мне прыйшлі найлепшыя карты. Калі будзеш добра думаць, тады прыйдуць, казаў ён, і яна добра думала. І хоць дзядзька не казаў, як гэта робіцца, яна складала ў галаве самыя стракатыя камбінацыі дам, каралёў і валетаў. І заўсёды па адным тузе з сэрцам, бо гэта была карта, якую дзядзька любіў найбольш.

І хоць карцінка ў Дыянінай галаве не супадала з той, якую Лука меў на руках, бо калі б супадала, ён прайграваў бы грошы, пачаўся доўгі сезон ягоных карцёжных выйгрышаў, які працягнецца аж пакуль Дыяна не пойдзе ў школу.

Напачатку ён думаў, што гэта ўсё выпадковасць, але неўзабаве пачаў верыць у Дыяніны звышнатуральныя здольнасці. Або думаў, што яны з пляменніцай належаць адно аднаму паводле нейкага найвышэйшага касмічнага закона. І Лука не быў Дыяне толькі дзядзькам, і яна не была яму толькі пляменніцай. І з гэтага іхняга супольніцтва лагічна нараджаліся поспехі ў азартных гульнях. Пакуль яна сядзела ў куце, ламала пальцы, моршчыла лоб і добра думала, ён перамагаў. А калі заставалася дома, бо прастудзілася ці маці абуралася, што ён увесь час цягае яе за сабою, карта не йшла і ён пачынаў прайграваць.

Неўзабаве і іншыя пачалі звязваць яе прысутнасць з яго перамогамі і сказалі, каб ён малую больш не прыводзіў. Хто ж бачыў такое, каб на карты хадзілі з дзецьмі! Ён пытаўся ў іх, што ж яны за мужыкі і карцёжнікі, калі баяцца чатырохгадовай дзяўчынкі. Калі яна можа перамагчы іх, дык лепш хай кінуць карты ды бяруцца за матыкі. Урэшце дамовіліся, што Дыяна можа прысутнічаць, але не заўсёды, а толькі на тыдні, а ў суботу і нядзелю будуць гуляць без яе.

І так павялося, што Лука, як кожны працоўны чалавек, у будныя дні зарабляў, а ў выходныя траціў зароблены ці ўвогуле не хадзіў на карты, а пускаўся з малой у прыгоды. Яны сядалі ў ба́рку і веславалі – яна замест вясла грэбла вялікаю калатоўкай – да нейкай выспачкі і цэлы дзень гулялі там у рабінзона. Ён лавіў вудай рыбу, распальваў вогнішча, ударaючы крэменем па камені, пасля яны пяклі злоўленае і разважалі, колькі яны ўжо тут гадоў і калі апошні раз бачылі ўдалечыні карабель. Звычайна тых гадоў было за дваць-

цаць, а карабель бачылі сем гадоў таму. Дыяну захапляла, што ў гэтай гульні на ўсім свеце няма нікога, апроч іх дваіх, дый Луку было прыемна ўсведамляць, што ён застаўся сам з гэтым дзіцём і больш не павінен шукаць сабе месца сярод людзей, якія даўно ўжо здзічэлі.

Здзічэлі яны неўзабаве пасля таго, як голая міс Сімпсан з Эдвардам загарала на іхніх пляжах, а ён глядзеў на яе, думаючы, якая ж прыгожая гэтая прынцэса і якім шчаслівым было б яе каралеўства. Гэта быў апошні абразок рамантычнага і вясёлага свету – таго, што існаваў да вынаходства гукавых фільмаў. Калі міс Сімпсан і Эдвард ад'ехалі назаўсёды, па гарадах і дзяржавах пачалі шырыцца выбухі, пачуўся грукат камянёў і бразгат нажоў, па горадзе прайшлі маршам італьянскія салдаты з курынымі задніцамі на касках, мужчыны пайшлі на вайну, жанчыны пяклі праснакі на доўгую дарогу, і было сорамна заставацца ў баку ад гэтай шалёнай бойні.

Аднак яму сорам быў бліжэйшы і мілейшы, чым жыць жыццём адважных і тых, хто лёгка паміраў. За тым, што адбывалася, ён не бачыў ні вялікай палітыкі і нічога такога, што нармальнаму чалавеку адразу не было б ясна; яго не цікавіла ні Нямеччына, ні Харватыя, ні барацьба супраць фашызму. Можа Сталін яму і быў мілейшы за Гітлера, а Чэрчыль за Мусаліні, і можа ён сімпатызаваў Ціту, бо ягоны брат Бэпа быў у партызанах, але Луку было важней упэўніць горад у сваёй прастадушнасці. Строячы з сябе клоўна і блазна, які ніякаму мужчыну не супернік і ні ад якой жанчыны не патрабуе кахання, ён насамрэч жадаў застацца недалучаны да ўсяго, чаму іншыя сэрцам ці праз няшчасце належалі. Разам з тым, ён не пераставаў усведамляць таго, што ён робіць і наколькі цяжка схіліць цэлы горад на сваю карысць, а пасля ўвесь час трымаць яго ў гэткай упэўненасці. Нічога не змянілася і з канцом вайны, бо тады прыйшлі героі і мсціўцы, і іх гэтак сама трэба было пераконваць, што ён не стаіць ім упоперак дарогі і няварты іхняга гневу. А ў 1947 годзе і некалькі наступных гадоў той гнеў быў страшны, часамі здавалася, што і страшнейшы за ваенны.

Гульня ў рабінзона, калі дарослы чалавек у яе паверыць, а Лука ў яе верыў без ніякіх праблем, была адным з найлепшых спосабаў адпачыць ад усякага гневу.

Апроч картаў і рабінзона, была і яшчэ адна прыгода. Кожны месяц яны ездзілі ў Куну, на летнік Дэлавале, дзе Лука абразаў вінаграднік, ці збіраў спелы вінаград, ці дамаўляўся ў сяле наконт збору маслінаў. Пасля смерці Івы, калі летнік перайшоў Рэгіне, Лука бавіў сябе думкай перасяліцца ў Куну, абкопваць вінаграднік, садзіць масліны і так пражыць жыццё. Але гэтыя летуценні жылі нядоўга. На сур'ёзныя планы ён не меў ні волі, ні розуму і бавіўся імі, толькі пакуль яны не выходзілі за межы каралеўства мараў, пасля чаго пасылаў іх на ўсе чатыры бакі, абы куды далей ад сябе. Бо хто будзе цэлае жыццё абкопваць вінаграднікі, садзіць масліны і баяцца перанаспоры, адлігі і буры, штормаў і ветраў ды грыпу, які напэўна напаў бы ў той момант, калі нешта трэба было б абкопваць ці абразаць. Калі чалавек такое плануе, то разлічвае на жонку і дзяцей, а для яго жонка і дзеці былі дадатковай крыніцай клопатаў, ускладненняў і яшчэ болей сур'ёзных планаў, у якіх не было радасці. На дваццаць пятым годзе жыцця ён верыў, што мець дзяцей ніколі не будзе, і быў амаль пераканаы, што ніколі не ажэніцца. Два-тры гады да таго яго яшчэ мучыла, што ён ні разу не пераспаў з жанчынай, а ўсе, з кім ён хадзіў у школу, ужо былі пераспаўшы ці так прынамсі казалі. Калі б у горадзе засталася хоць адна курва, ён напэўна назбіраў бы грошай і пайшоў бы да яе зняць з вачэй змрок – як тады казалі. Але гэта былі 1944–1945 гады, калі ўсе курвы паўцякалі ад паміранння і нараджэння дзяржаваў. Пасля гэтае хаценне ў Лукі знікла ці ён зразумеў, што ад уступлення ў мужчынскі свет было б болей шкоды, а не карысці. Сэкс і мужчынска-жаночае каханне падобныя да опіюму: аднойчы пакаштуеш і будзеш вымушаны займацца гэтым усё жыццё. А ўсё, што для чалавека з'яўляецца абавязкам, быць прыемным не можа.

Прыязджаючы з Дыянай на летнік Дэлавале, ён зноў паміж жыццём і гульнёй выбіраў гульню. Ён адчуваў сябе п'яным багатыром і заможным спадкаемцам і ў такім духу трымаў сябе з сялянамі: частаваў іх у сельскай карчме віном і прапаноўваў свой масліннік, каб яны заплацілі за збор маслінаў у ім так танна, што ўрэшце яны сапраўды верылі, што грошай у яго хоць заваліся. Яму было прыемна, што яны так думаюць і ставяцца да Дыяны як да прынцэсы.

Яна не дзіця, хамло ты невыспітаннае, яна дама! рыкнуў ён на

карчмара, які сказаў, што для дзяцей у іх піць нічога няма. *І каб прынёс ёй шклянку вады! Асноўная дыстынкцыя паміж табой і ёю ў тым, што дама ведае: вада – найздаравейшае пітво на свеце.*

Карчмар пакульгаў на кухню, а над галавой у яго ўзняўся рой пытальнікаў, як у Дыснееўскім коміксе пра Мікі Маўса. Ён не ведаў, што значыць слова «дыстынкцыя», і не разумеў, з чаго б раптам вада была найздаравейшым пітвом на свеце, але заўвага, што ён «неваспітанны» яго занепакоіла. Ён ведаў, што значыць гэтае нетутэйшае слова, але яго такім яшчэ ніхто ніколі не называў. Ён чуў гэтае слова па радыё ў крымінальных радыёпастаноўках пра забойцаў і паліцыянтаў, трансляваных з Бялграда. Чуў яго ад міністраў, што выступалі з прамовамі на ўрачыстых адкрыццях працоўных акцый. *Нашай маладзёжы не бракавала добрага васпітання і тады, калі яна атакавала бункеры!* усклікаў таварыш Борыс Кідрыч. Ужо з гэтага карчмар мог зрабіць выснову, што гэты чалавек яго абразіў. Ён прынёс Луку ягонае віно, а Дыяне ваду і вярнуўся на кухню, каб быць ад іх чым далей. Свет вывернуўся навыварат, не было ніякага сумневу, але яго мучыла пытанне – хто гэты чалавек гэтай дзяўчынцы. Напэўна ж не бацька; мабыць, тут нешта такое, чаго раней не бывала. Трэба будзе распытацца ў сяле. *А ты што вылупілася?* прыкрыкнуў ён на старую Тэру, якая абірала бульбу, схапіў шапку і праз заднія дзверы выйшаў з карчмы.

Ці ведаеш ты, што твой тата памёр? спытаўся Лука ў дзяўчынкі. *Ведаю,* сказала яна, гледзячы недзе пад стол. *А ці ведаеш ты, што такое быць мёртвым?* пытаўся ён далей. *Ён не вернецца, а маці злая на мяне,* адказала яна. *Не злая, чаго ёй быць злою… Злая, злая, я ведаю… Не злая, проста ёй нялёгка.*

Дыяна паціснула плячыма. Выходзіла тое на тое: ці маці злая, ці ёй нялёгка. Паміж гэтымі рэчамі і так няма розніцы. *А мне лёгка,* сказала яна і ўсміхнулася. *І мне лёгка,* сказаў дзядзька і строга трэснуў шклянкай аб драўляны стол, *нам лёгка!.. І заўсёды так будзе?* настойвала дзяўчынка. *Ну а як яшчэ, як жа яшчэ! Каму сёння лёгка, таму будзе лёгка заўсёды. Такое правіла, і так вырашана ў Ялце!* развёў ён рукамі, быццам гэта нешта само сабой зразумелае.

А што такое Ялта? спыталася яна.

Эх, бачыш, гэта ўжо іншая гісторыя, і я думаю, што цяпер не час для яе, адмахнуўся ён, як ад пчалы, ведаючы, што гэта прымусіць яе пытацца далей.

Раскажы, раскажы, што такое Ялта? упрошвала яна.

Але каб слухала ўважліва і ўсё запомніла, і каб магла сказаць, калі ў цябе будуць пытацца, прыкінуўся ён строгім.

Буду слухаць, усё буду слухаць, уладкавалася яна на крэсле, як Ліндберг перад палётам*.

Ну дык вось, пачаў ён, *Ялта – гэта такі склеп, а насамрэч адрына, у якой сустрэліся тры дзядзі, а насамрэч бадзягі… Не,* перапыніла яна, *я не хачу ніякіх насамрэч. Што такое бадзягі?.. Э, цяжка будзе без насамрэч. Але паспрабуем. Сустрэліся яны ўтрох у той адрыне, а ў кожнага чароўны камень. Гэта камень, які выглядае, як звычайны, але ён незвычайны, бо праз яго ўсё відаць, як праз шкло, але не шкло гэта, а камень. І не пытайся ў мяне больш пра той камень, бо я й сам не ведаю. Калі б ведаў, я б яго ўжо знайшоў. З тым каменем можаш усё. Вызначыць, колькі будзе доўжыцца ноч, а колькі дзень, або як будуць хадзіць людзі – на руках ці на нагах і ці будуць дамы будавацца ад страхі ці ад падмурку. Дык вось, праблема ўзнікла таму, што такі камень быў ва ўсіх трох, і яны мусілі дамовіцца, як усё будзе. А не так, што адзін прадоўжыць дзень да шаснаццаці гадзін, а другі скароціць яго да пяці, а трэці скажа, што наогул ніякага дня не будзе. Мусіць быць парадак, каб людзі ведалі, як ім – добра ці дрэнна,* тлумачыў ён.

Дзяўчынка нахмурылася. Яна не разумела, чаму аднаму дзядзю хацець, каб у дні было шаснаццаць гадзін, а другому, каб пяць. *А ці тыя чароўныя камяні зусім аднолькавыя?* спыталася яна.

Мушу сказаць, што так. Толькі трошкі розных колераў, але ўсё астатняе тое самае, сказаў Лука. *І аднолькава моцныя?* спыталася Дыяна. *Малайчынка! Гэта было найгоршае, усе тры камяні былі аднолькава моцныя. Дык вось, і тады яны ўтрох селі ў той Ялце і не выходзілі адтуль тры дні і тры ночы… А колькі цягнуліся ў іх дні і ночы?* спыталася малая, і ён разгубіўся. Ён не ведаў, што ёй сказаць: хто з траіх вырашыў даўжыню дня і ночы ў Ялце?

Добрае пытанне, добрае пытанне, спрабаваў ён выкруціцца, *але яны ў той Ялце і зачыніліся, каб не бачыць калі дзень, а калі ноч,*

і дазволілі сонцу ўзыходзіць і заходзіць, як яму захочацца, пакуль тыя тры камяні не дамовяцца. А дамовіліся яны так, што адзін сказаў двум другім – вы найпрыгажэйшыя, другі – а вы найразумнейшыя, а трэці сказаў – а вы, значыць, наймацнейшыя. І дзеля таго, што іх было трое і кожны хваліў двух другіх, хутка было ўжо невядома, хто з іх найпрыгажэйшы, а хто найразумнейшы ці наймацнейшы. І так яны вырашылі, што падзеляць Свет на тры аднолькавыя часткі, і кожны будзе вырашаць у сваёй частцы. Таму ў Амерыцы ноч, калі ў нас дзень, і таму нейкія людзі багатыя, а іншыя бедныя. Усё гэта тыя трое вырашылі ў Ялце, сказаў ён расчараваны, што прапала ягоная казка.

Проста ў нейкую хвіліну яна саслізнула некуды не туды і ператварылася ў нешта, чаго ён не хацеў ёй расказваць і чаго сам не разумеў.

У Ялце вырашана, што маці будзе злая і ёй будзе цяжка? спыталася Дыяна якраз у той момант, калі ў дзвярах з'явіўся карчмар.

Ён глядзеў на іх з пагардай у куточках вуснаў і ківаў галавою. *Усё ведаю,* сказаў ён, *цяпер мне ўсё ясна! Усё мне ясна!* паўтараў ён і выціраў анучай нябачны пыл са сталоў. *Хадзем адсюль,* шапнуў Лука Дыяне, *ідзіце-ідзіце з Богам!* пачуў яго карчмар, *не трэба мне тваіх грошай! Але да мяне каб болей не прыходзіў! Будзе лепей для цябе, стары кныр!*

Моўчкі яны ішлі да летніка, дзядзьку было сорамна, бо ён не выглядаў перад дзяўчынкай смелым абаронцам, а яна былая радая, што яны ўцяклі. Напэўна, гэта быў адзін з тых траіх з Ялты, зрабіла яна выснову. Толькі дзядзька не хоча ёй пра гэта казаць, але яна не будзе ў яго пытацца, каб ён ёй не схлусіў ці каб не ўбачыў таго, што бачыць яна: дзядзька баіцца таго чалавека. Ну і хай баіцца, яны двое будуць баяцца разам. Дыяна будзе баяцца яшчэ болей, толькі каб яму было лягчэй. А Луку мучыла пытанне – што такога мог карчмар прачуць пра яго, што вярнуўся гэткі. І ад каго ён чуў тое, што чуў. Адказу ён так ніколі й не даведаўся, але ў ніводную карчму ў Куне з дзяўчынкай больш не заходзіў. І так яно засталося ўжо назаўсёды, да іх апошняга супольнага падарожжа.

Гэта было адзінае непрыемнае здарэнне ў Лукавых і Дыяніных

прыгодах. Усё астатняе было пяшчотай і шчасцем, як для яе, так і для яго. У вар'яцкія гады яны былі адно аднаму анёлы-ахоўнікі. Ён уратаваў яе ад шалёнай Рэгінінай апантанасці іншай Дыянай. Дзяўчынка стала вяршыняй адной хлусні, але ўратавала Луку ад гадоў партызанскай помсты, любові і нянавісці да Сталіна і ўсяго іншага, што, можа, каштавала б яму жыцця, калі б ён не гуляў з ёй у рабінзона, не меў свайго карцёжнага анёла і не ездзіў бы з ёю ў Куну. Яны баранілі б адно аднаго і далей, калі б Дыяна не пайшла ў школу і Рэгіна менавіта тады не вырашыла ўзяць яе жыццё ў свае рукі. Пакуль Дыяну трэба было карміць і пераапранаць, вучыць першым словам і ствараць карцінкі бясхмарнага дзяцінства, яна пакідала дзіця на Луку, але ў той момант, калі малая мелася пайсці да іншых дзяцей і апынуцца перад вачыма ўсяго горада, Рэгіна вырвала яе з братавых абдымкаў. Досыць таго, што ён сам, на сорам сям'і, не такі, як усе нармальныя людзі. Яна не дазволіць, каб ён замясіў і сфармаваў малую паводле сваіх мерак. Зрэшты, кім Лука быў бы ў жаночым целе? Курвачкай, якая будзе ўсім усміхацца і быць кожнаму на радасць і дурасць. Калі мужчына яшчэ можа быць такім, то жанчына ўжо ніяк не! А тым болей жанчына ад крыві Дэлавале, якая ўжо ў сабе носіць зло.

Пасля першых вераснёўскіх дзён 1951 года Рэгіна больш ніколі не пускала Дыяну з дзядзькам на карты ці ў рабінзоны. Будны быў дзень ці нядзеля – усё адно: яна прымушала яе сядзець каля печы і вучыцца, на тым самым драўляным крэсле, на якім сама потым сустрэне старасць і якое з усімі іншымі рэчамі згарыць у ваенным пажары 1991-га. Луку яна сказала, каб не чапаў ёй дзіця і не рабіў шкоды, калі ўжо ад яго не можа быць ніякай карысці. Ён адступіўся, часткова таму, што давяраў старэйшай сястры, а часткова таму, што не ведаў, як можа каму-небудзь дапамагчы, апроч самога сябе. Да самых сваіх уцёкаў у Італію ён спакойна і амаль без словаў глядзеў, як маці выхоўвае дзіця, і забываўся на абяцанні, якія даваў Дыяне, і на таемнае братэрства, якое з ёю ўтварыў. Гэта быў адзіны ягоны грэх, але і пра яго ніхто не памятаў.

Пра Дыяну Вічэдэмоні Рэгіна распытвала яшчэ поўных дзесяць гадоў пасля таго, як пахавала ржавую бляшанку з надпісам «Сан-

тас» і тварам усмешлівай мурынкі. Пісала ўласнікам караблёў, на якіх Іва плаваў ад трыццатых гадоў, прасіла, каб даслалі ёй спісы маракоў, хлусіла, што шукае брата, з якім мусіць раздзяліць вялікую спадчыну; абяцала грошы, калі яго знойдзе, выдумляла рахункі ў швейцарскіх банках, падпісвалася як графіня Рэджына Дэлла Валле, хадзіла да прафесара Свіціча, каб ён перакладаў яе лісты на італьянскую, французскую, нямецкую і англійскую, замовіла пячатку з сваім імем і бланкі з манаграмай, пакуль не растраціла ўсё сямейнае золата і не распрадала вінаграднікі на Пэлешцы. Апантанасць незнаёмай жанчынай, адзінай асобай, якая магла пагасіць Рэгінін жыццёвы гнеў, ва ўсіх сэнсах каштавала ёй занадта дорага. Апрача сямейнай спадчыны, чыя вартасць заўсёды лепш ацэньваецца ўспамінамі, чым ваганнем цэнаў на золата на сусветнай біржы, Рэгіна пусціла з малатка і ўсё іншае – што ёй належала і што не належала. Дыяна Вічэдэмоні зрабілася яе адзінай думкай, цэнтрам космасу, чорным сонцам у геліяцэнтрычным успрыманні свету. Вакол таго імя круціцца ўсё, што ёсць і чаго няма, вакол свае восі і вакол Дыяны. З гравітацыйнага поля таго чорнага сонца не вырвецца ніхто. І нічога з таго, што Рэгіна чуе, бачыць, нюхае, мацае ці адчувае як заўгодна інакш. Праз цэлых паўстагоддзя праз Дыяну Вічэдэмоні распадзецца сям'я і разгорнецца новы ланцуг няшчасцяў, у які з Рэгінінай смерцю ўцягнуцца людзі, якія датуль не мелі да яе ніякага дачынення. Геліяцэнтрычныя сістэмы няшчасцяў абнаўляюцца цыклічна. Яны – адзіная жывая гісторыя, якая не згасае, а пераносіцца з пакалення на пакаленне, з эпохі на эпоху. Яны будуць існаваць і праз сотні гадоў. Як для вялікага сусвету Гітлерава злачынства застаецца жывое і ад яго пакутуюць дзеці, народжаныя пасля падзення Трэцяга Райху, так і для малых сусвецікаў, сямейных мікракосмаў і любоўных повязяў застаецца несмяротным тое дробнае, з гледзішча гістарычнай навукі зусім неістотнае, злачынства.

Часам ёй прыходзілі адказы ад кампаній «Ллойд» і «Джордж Ронсан і сыны», у якіх Рэгіну накіроўвалі ў югаслаўскія пасольствы ў Лондане і Вашынгтоне. Так дайшоў да яе і ліст Самуэля Ф. Клейна, даваеннага трыесцкага карабельніка, які ў 1951 годзе жыў у Хайфе. Ён пісаў, што нічога не ведае пра лёс сваіх чатырох караблёў,

што ўся дакументацыя згарэла ў чорнакашульніцкіх падпалах яшчэ ў 1938 годзе і што яму шкада, што пані не можа знайсці свайго брата, аднак яму дзіўна, што яна шукае яго толькі дзеля спадчыны. «Я б вам параіў пашукаць яго з нейкіх лепшых і больш высакародных меркаванняў. Тады, дасць Бог, вы яго знойдзеце!» Яна пусціла слязу над гэтымі словамі і пашкадавала чалавека, якога лёс змусіў так гаварыць. Тут не можа быць нічога іншага, апрача лёсу, думала яна: у некага смерць забярэ ўсіх, каго яны любілі і хто ніколі не ўчыніў ніякага зла. Не ведала яна, што Самуэль Ф. Клейн мог расказаць ёй хоць бы частку праўды пра Іву, калі б яна толькі спыталася ў яго напрасткі, а не прасіла даслаць спіс маракоў з карабля «Леоніка». А можа і Клейн зразумеў бы, хто яму піша, калі б яна падпісалася сваім сапраўдным прозвішчам. А можа, ён здагадаўся й пра гэта і таму параіў пашукаць лепшыя і больш высакародныя прычыны для сваіх пошукаў. Немагчыма сцвярджаць напэўна, але не выключана, што Самуэль Ф. Клейн у нейкіх больш шчаслівых абставінах, калі б яе гнеў быў хоць крыху цішэйшы і бліжэйшы да розуму, уратаваў бы Рэгіну Дэлавале. Можа дастаткова было толькі, каб яна ведала, хто насамрэч быў Самуэль Ф. Клейн.

VII

Зімой 1942 года Самуэль Ф. Клейн быў зняволены на гарышчы банялуцкай гімназіі. Насамрэч ніхто яго не знявольваў, але ён не наважваўся адтуль выйсці, бо быў з тых Абрагамавых сыноў, пра якіх казалі, што іх можна пазнаць па носе. І хоць Клейна выдаваў не толькі арліны насяра, канец якога ледзь не датыкаўся падбароддзя; увесь ён выглядаў, быццам з яго малявалі нацыстоўскія карыкатуры: малы і згорблены, з курынымі грудзьмі, з крывымі, як з бочкі злез, нагамі, драбнавокі, з калматымі чорнымі бровамі і валасамі, якія няспынна засальваліся, не дапамагалі ніякія шампуні і памады, якія ён у старыя добрыя часы замаўляў з Лондана і Парыжа. Калі б ён спусціўся з гімназійнага гарышча, ён не дайшоў бы і да Госпадскай вуліцы, як яго ўжо загрэблі б калі не ўсташы, то свядомыя грамадзяне, якіх у Баня Луцы было роўна столькі, колькі бывае ў нармальныя часы і ў нармальных дзяржавах, дзе не дзейнічаюць расавыя законы. Тыя самыя людзі, якія гарадской скуралупні здаюць валачашчых сабак, пасля нараджэння вялікага нямецкага райху і ўсіх іншых райхаў будуць здаваў жыдоў і цыганоў.

Так разважаў Клейн, лежачы на пыльнай кушэтцы і гуляючы з вялікім школьным глобусам. Яго мучыў адзін успамін: у 1919 годзе ён сядзеў на Сушаку ў адвакацкай канторы стрыечнага брата Хугі, калі Хуга, акрылены тым, што нарэшце ўсталявалася нейкая ўлада і пачалося нармальнае жыццё, патэлефанаваў мясцоваму начальніку і звярнуў ягоную ўвагу на патрэбу заснавання гарадской скуралупні, бо валачашчыя сабакі за гады вайны і безуладдзя размножыліся настолькі, што пагражаюць эпідэміямі заразных хваробаў. Самуэль не толькі не абурыўся, а нават згадзіўся з кузэнам і быў шчыра здзіўлены адсутнасцю начальнікавага інтарэсу да гэтай праблемы і тым грубым спосабам, якім ён абарваў тэлефонную сувязь з найвіднейшым сушацкім адвакатам. А ці насамрэч

сабакі ім заміналі, ці былі яны агрэсіўныя і ці кузэнаў раздражняў іх начны брэх? Колькі б Самуэль Ф. Клейн ні стараўся прыдумаць на гэтыя пытанні станоўчыя адказы, ён не мог прыпомніць ні аднаго-адзінага непрыемнага досведу кантактаў з сушацкімі сабакамі. Шалудзівыя і згаладалыя, яны саступалі людзям дарогу і ўцякалі, убачыўшы чалавека за пяцьдзясят метраў. Яны выглядалі істотна расчараванымі ўсім родам двухногіх. Сушацкія сабакі, думаў Клейн, дасягнулі трэцяй эвалюцыйнай фазы: дзікія прапродкі і прыручаныя продкі саступілі месца скораным сабачым сучаснікам. Істотам поўным страху, трывогі і філасофскай меланхоліі. Застаўшыся на самоце, яны ляжалі на гурбах смецця і жмурыліся пад сонцам. Апроч кантактаў паміж сабою, гэта была іх адзіная камунікацыя з вонкавым светам. Толькі ад сонца ім не гразіла ніякае зло.

Дык чаму ж тады і кузэну Хугу, і яму заміналі тыя сабакі? Ён зразумеў, што яны ім і не заміналі, а проста яны сваё ўзбуджэнне народзінамі новай дзяржавы ператварылі ў патрэбу расплаты з валачашчымі сабакамі. Гэта быў адзін са шматлікіх гігіенічных імператываў. А ў дні стварэння дзяржавы чалавек жыве імператывамі. Калі б яны не былі ўзбуджаныя дзяржавай, дык хутчэй за ўсё прыйшлі б да высновы, што публічнай гігіене з іншых бакоў пагражае значна большая небяспека, чым з боку сабачага. Ці зусім не разважалі б аб публічнай гігіене. Падобныя правілы дзейнічаюць і цяпер, і праз іх ён не можа злезці з гарышча. Розніца толькі ў тым, што патрэбу ў скуралупні замяніла патрэба ў лагерах, а вынішчэнне валачашчых сабак у сучасным свеце ператворана ў вынішчэнне жыдоў, цыганоў і праваслаўных. Гэта значыць, людзей. Чалавек – не тое самае, што сабака, але ўзбуджэнне, якое ўзнікае, калі нараджаюцца райхі або дзяржавы, не прызнае розніцы паміж людзьмі і сабакамі.

Тое, пра што Клейн разважаў найчасцей і не знаходзіў адказу, зводзілася да пытання, ці быў бы і ён свядомым і сумленным грамадзянінам новай дзяржавы і здаваў бы непародзістых двухногіх, калі б выпадкова не быў сынам Абрагамавым? Ён не разумеў, як людзі ўмомант ператвараюцца ў дзікіх звяроў, і пераконваў сябе, што з ім такое не магло б здарыцца ніколі. А тады прыгадваў 1919 год, значок з партрэтам караля Пэтра Першага Вызваліцеля, тужлівыя позіркі

ў бок Рыекі, калі прадчувалася, што яна адыдзе да Італіі, і палёгку, якую ён адчуў, калі кузэн Хуга вырашыў унесці іх супольны ўклад у нараджэнне дзяржавы. Яго не суцяшала, што з ідэі скуралупні ўрэшце нічога не выйшла, бо абодва яны напэўна пашкадавалі б, калі б убачылі, як людзі ловяць сабакаў. Той факт, што дзеля дзяржавы ён зрабіў ці адчуў нешта, што інакш не зрабіў і не адчуў бы, быў неабвержны. Патрыятызм разліваўся, як мёд са срэбнай лыжкі, і патрабаваў крыві, з якою мог бы змяшацца. Сабачай ці чалавечай, гэта ўжо залежала хутчэй ад прыроды новананароджанай дзяржавы, чым ад душаў, з якіх гэты патрыятызм сачыўся. З 1919-га дзяржава пакідала грамадзянам свабоду ў выбары ахвяры, і Самуэль з Хугам выбралі тады валачашчых сабак, але з 1941-га яна вызначыла ў сваіх законах дакладна, чыёй крыві патрабуе. І гэта было напісана на кожным вулічным рагу, на кожнай дошцы з абвесткамі, на гербе і на сцягу. Пра гэта казалі вайсковыя і паліцэйскія ўніформы, іх колеры і крой, чарапы са скрыжаванымі касцямі і гераічныя песні элітных частак. Патрыятызм – гэта мёд і кроў. Жывы свет дзеліцца на патрыётаў і істоты, чыя кроў мае быць прынесеная ў ахвяру. Месяца побыту на гімназійным гарышчы было дастаткова, каб Самуэль Ф. Клейн даў зарок ніколі больш не любіць ніводнай дзяржавы.

У Баня Луку ён прыехаў увосень 1941-га з сяла Штывар каля Прнявара, едучы ў возе Хусніі Хаджаліча пад сенам, на якое ў яго была алергія. Разоў дзесяць за два дні ён думаў, што задушыцца, але яшчэ горшым было тое, што Хуснія, увогуле чалавек душэўны, ніяк не разумеў, што такое алергія. Ён ратаваў Клейнаву галаву, рызыкуючы сваёй, абодвух на месцы прыкончылі б, калі б знайшлі жыда пад сенам. Ён быў глыбока расчараваны паводзінамі чалавека, якога ратаваў: *Сена цябе душыць, кажаш. Ну так, як жа не будзе душыць, калі ты з горада. Добра, што толькі душыць. Дзіўна, што яшчэ не муляе і не коле. Забі мяне гром, калі я ў вас нешта разумею. За табой ганяюцца ўсташы, ганяецца паліцыя, цэлая дзяржава супраць цябе ўзнялася, эй! ні больш ні менш цэлая дзяржава, а табе, чым уратаваць родную задніцу, важней паказаць Хамдзію, што ты рос у шаўках і аксамітах, дык табе маё сена замінае. А што, я не хацеў бы валяцца ў шаўках і аксамітах? Але я, пане мой, у каровіным гноі*

грэўся! І думаў, што лепшага і не бывае. Пакуль не прыехаў у горад і пакуль ты мне не сказаў, што табе замінае маё сена. Алах міласцівы не ачомаўся б, калі б такое ўбачыў. Але, на шчасце, не ўбачыць. Ён даўно ўжо на ўсё гэта махнуў рукой.

Дарэмна Клейн спрабаваў растлумачыць селяніну прыроду сваёй хваробы. Што гэта за хвароба, якая не перадаецца ад чалавека да чалавека і якая здараецца толькі ад сена? У некага ад сена, а ў іншых ад мукі, кветак ці трускалак. Няма такой хваробы, і кропка!

Ведаеш, як у нас у Босніі завецца твая хвароба? спытаўся ён. *Распуста завецца! Але на яе хварэеш, калі ты дзіця, яшчэ не чулі, каб яна прыстала да старога пердуна. Не дай Бог! А ведаеш, якімі лекамі распуста лечыцца? Розгай і бізуном і лазовым дубцом – ды па срацы! Некаму трэба больш, некаму менш, але ад распусты вылечваюцца ўсе. А табе ўжо, баюся, запозна.*

Слухаючы яго, Клейн не ведаў, смяяцца ці плакаць, але ва ўсякім разе яму было шкада, што ён у такім дрэнным святле паказаўся чалавеку, які ратуе яму жыццё. На развітанне ён хацеў даць яму два франц-іосіфаўскія дукаты, але Хуснія адмовіўся: *Рука б у мяне адсохла, калі б узяў,* сказаў ён і знік у ночы. Больш за золата ён ацаніў бы тое, калі б добры Алах уладзіў свет так, каб людзі не ганілі ягонае сена.

Школьны вартаўнік Франя размясціў Клейна на гарышчы, каб ён пасядзеў там пяць-шэсць дзён, пакуль не прыйдзе сувязны, які перакіне яго ў італьянскую акупацыйную зону*. Да таго часу ён будзе яго карміць і песціць, птушынага малака не пашкадуе, але каб ён не дай Бог не высунуў носа з гарышча ці ўдзень, пакуль вучні ў школе, не спусціў ног з кушэткі, бо столі тонкія і нехта яго пачуе. Так што ўдзень нельга будзе ні пасцаць, ні пасраць. Калі прыпрэ, хай робіць у штаны! А калі не паслухаецца і ўсташы яго знойдуць, Франя зробіць выгляд, што яго не ведае, а яшчэ і плюне ды пне ў задніцу. Але калі будзе разумны і будзе ўсё рабіць як дамоўлена, дык ніхто яго ніколі не знойдзе. Так і дамовіліся. Кожны вечар вартаўнік прыносіў яму ежу і свежую газету, а кожнай раніцы выносіў поўны начны посуд. *Эх, дальбог я яшчэ не бачыў, каб нехта столькі сраў і сцаў, як ты!* сказаў ён яму на трэці дзень.

Клейн пачырванеў і пачаў выбачацца, але пазней зразумеў, што Франя якраз любіць пагаварыць пра сранне, сцанне і пярдзенне. Мабыць, быў у яго такі псіхічны дэфект, але пра гэтыя тры рэчы ён мог падрабязна разважаць гадзінамі, з тысяччу розных аспектаў, і вельмі ўзрадаваўся, калі Клейн гэта зразумеў і пачаў дзяліцца з ім сваім досведам.

Яны сядзелі на кушэтцы ў поўным змроку і гадзінамі пераказвалі адзін аднаму свае і чужыя прыбіральныя гісторыі. Франю найбольш захапіла, калі Клейн расказаў яму пра нейкага француза, пра якога ў дваццаць нейкім годзе пісаў заграбскі «Ютарні ліст», што ён, маўляў, мог адпярдзець цэлую Марсельезу, не сфальшывіўшы ні ноткі.

Кажаш, нідзе не сфальшывіў! Абсалютны слых! паміраў ад смеху Франя. *І людзі купляюць білеты, каб яго паслухаць! І жанчыны ходзяць на канцэрты! І ў капелюшах? І бяруць з сабой зашчапкі зашчапляць носікі. Ведаеш, што я табе скажу! Гэта вялікі чалавек. Калі толькі ты яго не выдумаў. А калі выдумаў, дык ты вялікі чалавек. Маці божая, лепшай гісторыі я ў жыцці не чуў. А ці жывы яшчэ той маэстра Пердуньё? Ну так, адкуль табе ведаць. А калі й жывы, дык нялёгка яму. Цяпер як швабу на вуха зайграе Марсельезу, дык можа і галаву страціць,* занепакоіўся ён лёсам парыжскага музыканта.

Нагаварыўшыся ўдосыць з вартаўніком, Самуэль Ф. Клейн заставаўся сам і чытаў газету, дзе шукаў навінаў пра свет, у якім няма вайны. Такіх навінаў было мала, іх заўсёды бывала мала, але гэтага не заўважаеш, пакуль вайна не прыйдзе ў твой двор. І без сусветнай вайны на ўсіх старонках усіх на свеце газет толькі і пісалася, што пра сённяшнія і будучыя войны. Толькі што раней ён чытаў газеты без трывогі і адчування, што тое, пра што ў іх пішацца, датычыць яго асабіста. Калі часам яго ахапляў душэўны неспакой, што адбывалася выключна рэдка, адзін або два разы за паўгода, і ён адчуваў, што ўсе няшчасці ў свеце звязаныя між сабою і кожнае можа раней ці пазней пастукаць у твае дзверы, ён проста пераставаў чытаць газеты. Чакаў, калі пройдзе неспакой, а калі гэта здаралася, спакойна і засяроджана вяртаўся да неспакою ў свеце. Але цяпер усё было інакш. Не было такіх навінаў, якіх бы ён не ўспрымаў вельмі асабіста.

Газета зрабілася яго інтымным дзённікам за той дзень. Нехта іншы яшчэ з вечара ведаў, як ты сёння будзеш сябе адчуваць.

Так прайшло дзесяць дзён, а сувязны, які меўся перакінуць Клейна ў Італію, так і не з'яўляўся. *Здаралася такое і раней,* суцяшаў яго Франя. Беспаспяхова, бо Самуэль ужо быў на мяжы нервовага зрыву. Ён або скочыць з даху гімназіі, або пойдзе сам, і хай яго ловяць, хай робяць з ім што хочуць. Ён не можа больш тут заставацца. *Зрабі ласку, пане!* злаваўся вартаўнік, *скачы сабе, і хай цябе сякуць на кавалкі, хай рэжуць, але нашто ты тады да мяне прыходзіў? Думаеш, я для сваёй прыемнасці трымаю на гарышчы праваслаўных і жыдоў? Думаеш, нехта трымае куры і козы, а дурны Франя ўзяў цябе паіць і гадаваць. У нейкім сэнсе гэта і так, толькі што ты не нясеш яек і не даеш малака, а цяпер хочаш яшчэ сам здацца ўсташам. Ведаеш, што б я зрабіў, калі б ты быў курыцай? Адсек бы табе галаву! Я цябе карміў, я цябе і засяку! Але ты не курыца, таму я магу табе толькі сказаць, што ты проста зрабіў з мяне дурня,* сказаў Франя і, не развітваючыся, злез з гарышча.

Той ноччу ён не прынёс яму ні ежы, ні пітва, таму Клейн, мучаны голадам і смагай, мусіў добра падумаць і пра свой страўнік, і пра свае нервы. Такое жыццё не мае сэнсу, і калі палова свету хоча цябе прыкончыць, разумней за ўсё будзе сапраўды сказаць – добра, вось вам мая галава, калі ўжо яна вам так патрэбная! Мне ад яе вялікай карысці няма. Калі зробіш так, ніхто не будзе мець права цябе папракнуць, ні тыя, хто апынуўся ў такім самым становішчы, ні Бог, калі ён ёсць. Клейн быў гатовы скончыць свае пакуты і, як казаў Хуснія, змірыўся з лёсам. Род ягоны асуджаны на знікненне, і там, дзе яго завуць жыдоўскім, і тут, дзе завуць яўрэйскім*, і ў кожным пункце зямнога шару, дзе яго завуць тысячамі іншых імёнаў, дык няма ніякага сэнсу і спосабу, каб ён, Самуэль Ф. Клейн, гэтаму супраціўляўся.

Калі яўрэі мусяць знікнуць і калі на гэтым стаіць свет, то з якіх прычынаў ён, адзін самотны яўрэй, павінен быць выключэннем з агульнага правіла? Патрабаваць гэтага было б тое самае, што патрабаваць, каб толькі цябе не датычыў закон зямнога прыцягання. Лёгка хадзіць па паверхні вады, калі ты каталіцкі святы і сотні мільёнаў вераць, што ты сапраўды ходзіш па вадзе, але як рабіць

тое самае, калі ніхто ў гэта не верыць? Ён можа толькі шкадаваць, што нарадзіўся сярод сыноў Абрагамавых так позна, у той самы час, калі вырашана, што іх больш не павінна быць. Калі б ягоныя продкі за апошнія дзве тысячы гадоў жаніліся і множыліся ў кожным пакаленні толькі на месяц раней, ён жыў бы ў шчаслівейшыя часы, у сямнаццатым ці васямнаццатым стагоддзі ці нават яшчэ раней, меў бы сваю крамку і сваю сінагогу і памёр бы як чалавек. Ад чумы, халеры ці пранцаў, а не бедаваў бы ад нечага, у чым ён не вінаваты і чаго не заслужыў.

Сваё яўрэйства, як і кожную іншую прыналежнасць, ён успрымаў як невырашальную арыфметычную задачу. Напэўна, ёсць людзі, у якіх укладваецца ў галаве, што значыць быць яўрэем, каталіком, мусульманінам ці будыстам. Гэта людзі, якія заслугоўваюць выдатнай адзнакі ў арыфметыцы. Яны ўмеюць вылічыць адрозненні ў вазе, вышыні і глыбіні паветра. Але Клейн у такіх рэчах быў арыфметык дрэнны. Калі б яўрэйства было нечым такім, што можна вымераць у рэгістравых тонах ці ў грашовых адзінках, ён лёгка даў бы гэтаму рады і напэўна не апынуўся б на гарышчы банялуцкай гімназіі. Так, ён святкаваў Хануку і Пэйсах, але хіба гэта прычына, каб ён і ўвесь Абрагамаў род знік з твару зямлі? Ён піў алкаголь, працаваў у шабат і не даваў ахвяраванняў на яўрэйскіх сіротаў, і цяпер Бог карае яго, але чаму ён карае з ім заадно і тых, хто не зграшыў супраць ніводнага зямнога і нябеснага правіла?

Нічога з гэтага не ўкладвалася ў яго ў галаве, але ў ноч посту, да якога яго змусіў вартаўнік, Клейн усё ж прыйшоў да важнай высновы. Паміж двума засмучэннямі, ягоным і яго кармільца і паільца, важнейшае і мацнейшае другое, і ў адпаведнасці з ім трэба і дзейнічаць. Не можа быць і гаворкі, каб скочыць з даху і тым нашкодзіць Франю. Яго пачало мучыць сумленне, і ён адчуў сябе вінаватым. Адчуванне віны ў чалавеку тым мацнейшае, чым менш нагоды быць вінаватым прапануюць яму жыццёвыя абставіны.

Ён ледзь дачакаўся раніцы і гадзіны, калі Франя прыйдзе па гаршчок. Той увайшоў змрочны і злы. *Я мушу табе нешта сказаць,* схапіў ён Франю за рукаў, але той вырваўся. *Я мушу табе нешта сказаць,* не адставаў ён, *калі ласка, сядзь!*

Вартаўнік сеў на кушэтку, трымаючы на каленях посуд з Клейнавым гавенцам як нейкі ўрачысты кубак, які ён мае ўручыць пераможцам еўрапейскага чэмпіянату ў жаночым гандболе. Але пахмурнасць не сыходзіла ў яго з твару. Клейн раздумваў, ці папрасіць яго паставіць гаршчок на падлогу, каб ім не смярдзела пад носам, але баяўся, што гэта можа раззлаваць Франю, і ён зноў пойдзе і трэба будзе чакаць яго да вечара, таму ўрэшце вырашыў пакуль што не звяртаць на гаўно ўвагі.

Прабач, нервы ў мяне не вытрымалі. Не зраблю я таго, чаго б не зрабілі курыца і каза, сказаў ён.

Зноў дурыш мне галаву? спытаўся Франя ледзяным голасам. Яму не спадабалася згадка пра жывёлу.

Я памыліўся, сказаў Клейн.

Ясна, што памыліўся. Ты мяне моцна пакрыўдзіў! сказаў Франя ўжо спакайней і ўрачыста ўзняў кубак, нібы падкрэсліваючы свае словы.

Ад той раніцы паміж гэтымі дваімі людзьмі больш не было ніякіх непаразуменняў. Клейн ніколі не згадваў пра сувязнога для перакіду на італьянскую тэрыторыю, а Франя толькі зрэдку, раз ці два на тыдзень, канстатаваў, што ніхто не прыходзіць і дрэнна, што не прыходзіць, як бывае дрэнна, калі не ў час пойдзе снег, ці бывае хмарна, калі чакаеш яснага неба. Ён прыносіў ежу і ваду, выносіў гаўно і мачу і жыў у рытме ўсходаў і захадаў сонца, як прадпісваюць святыя кнігі ўсіх монатэістычных рэлігіяў і як жылося ў даўнія часы, калі чалавек сачыў за зменамі дня і пораў года. А Клейн жыў, як курыца. Удзень тырчаў на кушэтцы, перасядаючы з адной паловы задніцы на другую, драмаў і чакаў, пакуль вылупяцца кураняты, а ўначы спаў ці ў апраметным змроку шукаў па гарышчы рэчы, якія маглі б яго зацікавіць. Ён навобмацак пазнаваў старыя школьныя журналы малодшых і старэйшых класаў і складаў іх каля кушэткі, каб заўтра было што чытаць. Ад газет ён на нейкі час адмовіўся, зразумеўшы, што ад іх яму робіцца горш. І глобус яму ўжо абрыд. Ён ведаў на памяць кожную дзяржаву, горад і горную сістэму, а карту Аўстра-Венгерскай манархіі вывучыў так грунтоўна, што ад Браціславы да Вішаграду не было сяла ці вёсачкі, у якіх ён не пабываў бы ў сваім уяўленні.

Вывучыўшы ўсё пра мясціны, ён пачаў вывучаць людзей. Адзін за адным праходзілі перад ім колішнія гімназісты, Клейн сачыў за імі з года ў год і на падставе школьных адзнакаў рабіў высновы пра душэўныя крызісы і закаханасці, пра тэмпераменты і характары, пра тое, што адбывалася з тымі людзьмі пасля атрымання атэстата. Ці можна з таго, што ў некага ў першым класе гімназіі дрэнна ішла лаціна, зрабіць выснову, што ён апынецца сярод забойцаў? Або ў забойцы пайшлі выдатнікі? Ён развіў сістэму чытання лёсу з школьных адзнакаў, паводле якой ураўнаважаныя вучні, тыя, што ад пачатку да канца роўна вучацца на пяцёркі ці на двойкі – усё роўна, зрабіліся людзьмі, якія прыдадуцца любой дзяржаве. А вучні, чые адзнакі мяняюцца, зробяцца праведнікамі, якія не паддадуцца ніякаму злачынству. Удзень ён іх класіфікаваў, а ўначы па выніках сваёй статыстыкі ацэньваў прамінулы дзень. Калі пераважвалі неўраўнаважаныя, якія не зрабіліся забойцамі і не дапамагалі забойцам, дзень быў добры. А калі пераважвалі абсалютныя выдатнікі і зусім прапашчыя, ён ацэньваў дзень як дрэнны.

Клейн гуляўся і запамінаў назвы ўсіх дзяржаваў, гарадоў, горных вяршыняў, сёлаў, рэк, ручаёў і імёны ўсіх вучняў банялуцкай гімназіі ад яе заснавання і да 1934 года, якім быў датаваны апошні журнал. Ніводнае імя і назву ён не забудзе да сваёй смерці ў Хайфе ў 1967 годзе, як не забудзе і соцень тысяч іншых нагэтулькі ж бессэнсоўных фактаў, якія збіраў у сваёй галаве. Самуэль Ф. Клейн быў адным з тых людзей, чыёй дзіўнай і дзівакаватай памяці ўсе дзівіліся, хоць самі не мелі ад яе ніякай карысці, бо глыталі толькі бескарысныя рэчы і класіфікавалі іх яшчэ больш бескарысна. Ён быў не ў стане запомніць тры тэлефонныя нумары, але памятаў школьныя адзнакі людзей, пра якіх нічога іншага, апроч тых адзнакаў, не ведаў. Ён забываўся імёны сваіх караблёў, але памятаў назвы ўсіх рачулак і ручаінак, якія ўпадаюць у Дрыну.

Магчыма, ён памятаў таксама і імя Івавай жонкі і пазнаў яе ў графіні Рэджыне Дэлла Валле ў лісце з 1951 года.

Так за зменай аднолькавых ранішніх і вечаровых рытуалаў надышла вясна, а па Клейна так ніхто і не прыйшоў. Ён быў перакананы, што Франя ведае, што́ адбываецца і чаму не азываецца сувяз-

ны, проста не кажа яму, каб не хваляваць. Аднак вартаўнік ведаў роўна гэтулькі, колькі яго падапечны. У лісце, які Хуснія Хаджаліч перадаў яму разам з Клейнам, пісалася: хай чакае. Пантэра прыйдзе самае позняе за тыдзень. А калі не прыйдзе ў гэты тэрмін, хай чакае далей і клапоціцца аб таварышы, які яму даверaны. Але Пантэра не адгукаўся і не прыходзіў, не бачыў яго Франя і ў горадзе. Раней ён сустракаў яго ледзь не праз дзень, калі не на вуліцы, дык у тых дзвюхтрох гарадскіх корчмах, дзе гулялі ў барбут*; для канспірацыі Пантэра рабіў выгляд, што яго не ведае, хоць той за паўгода перадаў яму чатырнаццаць мужчын і адну жанчыну, як сараеўскіх і траўніцкіх яўрэяў, гэтак і камуністаў. Ён даваў яму грошы за пансіён на гарышчы, і яшчэ Франю заставалася на жыццё. Але тое, што ён даў яму за Клейна, ён патраціў за два тыдні і пасля выкручваўся як мог і ўмеў. Але найбольш Франю мучыла не гэта – дзе ёсць на адзін рот, знойдзецца і на два, – дый клопат з гарышчам не быў цяжкі; лягчэй цярпець чалавека, з кім ты ўжо добра знаёмы, чым некага новага. Дзеля нечага іншага не зводзіў ён вочы начамі, а калі й засынаў, на яго нападалі кашмары з нажом на горле. Тое, што ён не бачыў Пантэру, магло значыць толькі, што ўсташы яго раскрылі і затрымалі і цяпер яго мучаць, пакуль ён не прызнаецца і не раскажа пра ўсе свае справы. Хто ведае, што яны там яму робяць, думаў Франя, і ці вытрымае гэта Пантэра. Ён чалавек цвёрды і шалёна адважны, хто б у чыне маёра дамабранцаў займаўся перакідам яўрэяў і камуністаў то ў лес, то да італьянцаў. Пантэру гэтую працу рабіць лягчэй, чым каму іншаму, бо яго ўсташы не западозраць. Але яму патрабуецца і больш адвагі, паколькі любога іншага проста б павесілі, застрэлілі ці зарэзалі, а яго кроілі б на кавалачкі і варылі б у кіпучай вадзе. Доўга Франя быў упэўнены, што Пантэра схоплены і толькі пытанне некалькіх дзён, калі ўсташы пра ўсё даведаюцца. Але прайшло два месяцы, і ён вырашыў, што ніхто не вытрымаў бы такога доўгага катавання – або памёр бы, або выдаў бы ўсё, – дык напэўна ж з Пантэрам здарылася нешта іншае. Што б гэта магло быць, Франю не прыходзіла ў галаву, але спаў ён ужо спакойна.

Толькі праз некалькі гадоў пасля заканчэння вайны гімназійны вартаўнік Франя зразумее, з кім меў справу. У рукі яму трапіць

першае выданне манаграфіі «Народныя героі Югаславіі», дзе на сто дванаццатай старонцы пад імем Івана Скачыблыхі-Каменнага ён убачыць Пантэраў фотаздымак. «Да падгрмэцкіх партызанскіх атрадаў таварыш Каменны далучыўся зімою 1942 года».

Паводле ўспамінаў таварыша Мустафы Мулаліча-Олафа, было гэта так: «Сядзелі мы каля лагернага вогнішча, калі вартавы прывёў да нас нейкага здаравілу ў дамабранскай уніформе з мінамётам на плячы – цяжкім, нямецкім, які і трое ледзь паднімуць. Вось я, а вось мой падарунак, сказаў таварыш Каменны і апусціў мінамёт на зямлю. Таварышы не прамовілі ні слова. Глядзелі мы то на яго, то на мінамёт і не верылі сваім вачам. Ніхто не падумаў, што гэта правакатар, хоць мы не заўсёды былі ўпэўненыя ў таварышах, якія прыйшлі з дамабранцаў і далучыліся да народна-вызваленчага руху. Але ж чалавек, які пройдзе дваццаць з гакам кіламетраў з мінамётам на плячы, не можа быць правакатарам. Таварыш Каменны паказаў сябе ўжо падчас першай сутычкі з ворагам. Голымі рукамі ён схапіўся за распалены ствол нямецкага ручнога кулямёта і вырваў яго з рук разгубленага фашыста. Трэба было бачыць твары ворагаў, калі перад імі з'яўляўся Іван Скачыблыха-Каменны! Пра ягонае геройства ў падгрмэцкім краі расказваюць легенды, але я пацвярджаю: нельга апісаць словамі, які насамрэч быў таварыш Каменны. І словы гэтыя не выдумка! Калі ў апошнія дні вайны ён загінуў, прымусіўшы фашыстаў і іх мясцовых памагатых панічна ўцякаць праз Славенію, па ім плакала ўся Баснійская Краіна. Хай ягоная справа паслужыць натхненнем будучым пакаленням у барацьбе за сацыялізм і лепшае заўтра».

Вартаўнік Франя не мог паверыць сваім вачам, калі ў тым самым пакойчыку, у якім правёў усё сваё працоўнае жыццё, сярод мётлаў, анучаў і ржавых вёдраў чытаў жыццеапісанне таварыша Івана Скачыблыхі-Каменнага. На той час ужо адна вуліца ў прадмесці насіла яго імя, а ў гарадскім парку быў урачыста адкрыты яго бронзавы бюст. Праўда, Франя праходзіў міма тысячу разоў і пад заклапочаным ілбом і глыбакадумным позіркам не пазнаваў Пантэравага твару. Рэч не ў тым, што бюст таварыша Каменнага быў непадобны на Пантэру, больш таго, славуты скульптар верна перадаў прыгожы

мужчынскі твар, але надаў яму выраз і сур'ёзнасць, якіх Пантэра не меў у ніводзін момант свайго жыцця. Грубіяны сказалі б, што можа і меў: у моманты, калі сядзеў у прыбіральні. Толькі на бюстах відаць, што выраз твару – найлепшая маска, значна лепшая за фальшывыя вусы і бароды.

Чытаючы нататку з кнігі «Народныя героі Югаславіі», Франя западозрыў, што за Пантэравым геройствам хаваецца нешта мутнае і смярдзючае, нейкае гнілое гаўно. Ён агледзеў бюст і вырашыў, што таварыш Скачыблыха – вялікі ашуканец. Гэта стала б ясна і дурню, калі б ён параўнаў чалавека, што гуляў у барбут, з бронзавай галавою, у якой таіліся глыбокія думкі.

У чым палягала ашуканства, Франя даведаецца пад канец жыцця, калі падчас адной пенсіянерскай прагулянкі Фэрыд Коджаліч, былы выкладчык фізікі ў гімназіі і ўсташаўскі маёр – за што ён адседзеў пятнаццаць гадоў у Фочы і ў Зэніцы – пад строгай канспірацыяй раскажа, чаму дамабранскі маёр Іван Скачыблыха ўцёк да партызанаў. З той гісторыі Франя да слёз пасмяецца, хоць і выявіцца, што ён у ёй аказаўся аслом, а яна каштавала яму пакутаў, нягодаў і страху.

Гісторыя гэта такая: спачатку Пантэра месяцамі гуляў з ніжнімі афіцэрскімі чынамі і банялуцкімі лайдакамі ў барбут і выйграваў, а пасля на калядным прыёме ў Вялікага жупана*, у бакавой зале, куды мелі доступ толькі абраныя, навучыўся ў італьянскага вайсковага аташэ Фэрнанда Ноэ Марынэці асноўным правілам амерыканскага покера і ў той самы вечар прайграў свой месячны заробак. Яму ніяк не ўкладалася ў галаву, як і чаму ён прайграў, дык ён зусім закінуў барбут і пачаў штодня гуляць у покер. Гуляў і са знаўцамі, і з трэцяраднымі гульцамі, якіх навучыў гульні сам. Прайграваў і адным, і другім.

За тры месяцы Пантэравы покерскія даўгі перараслі заробкі трох дамабранскіх палкоў, і з той прычыны, што людзі, якім ён быў вінаваты, не былі ні дабрадушныя, ні схільныя дараваць – тым больш што ён іх гадамі абдзіраў у барбуце, – ён скраў мінамёт і ўцёк да партызанаў. Ён ведаў, што спаганяць карцёжныя даўгі будуць толькі тыя, хто пераможа ў вайне. Калі вайну выйграюць камуністы, ён нікому не будзе вінаваты, а калі прайграюць, пераможцы ўсё

адно іх пазабіваюць. Яму было важна ўратаваць сваю шкуру, і ён зрабіў самую лагічную ў свеце рэч, пры гэтым, натуральна, нікому не паведаміў, што на гарышчы банялуцкай гімназіі ў смяротнай небяспецы застаецца таварыш Самуэль Ф. Клейн. Можа ён гэта некаму і сказаў бы, калі б Клейн быў прыхільнікам народна-вызваленчага руху, а не проста жыдам і збанкрутаваным карабельнікам. Такім чынам ён мог рызыкаваць толькі тым, што таварышы даведаюцца, як ён браў вялікія грошы, ратуючы людзям жыццё.

Аднак роўна гэтак сама, як ён не прызнаўся партызанам у сваёй падпольнай дзейнасці, так і ўдзельнікам нелегальнай сеткі, якія з альтруістычных ці з матэрыяльных меркаванняў займаліся ратаваннем людзей, ён не паведаміў пра свой адыход. Пантэра адзіны ведаў, хто ўваходзіць у сетку. Іншыя ведалі толькі два канспіратыўныя імені: таго, хто за табой, і таго, хто перад табой, і з прычыны, што ён сапраўды геніяльна размеркаваў людзей, тою самаю працай, або місіяй, у сетцы займаліся прыхільнікі камуністаў, манахі, універсітэцкія прафесары і гуманісты разам з кар'ернымі кантрабандыстамі, усташаўскімі і чэтніцкімі галаварэзамі, індывідуальнымі забойцамі і рознымі нягоднікамі, якія зараблялі багацце на людской бядзе і няшчасці.

Нічога адзін пра аднаго ведаючы, і не ведаючы пра Пантэравы ўцёкі да партызанаў, падпольшчыкі рабілі далей сваю працу, і адной зорнай красавіцкай ноччу селянін Хуснія Хаджаліч прывёў да вартаўніка Франі Іву Дэлавале. Без суправаджальнага ліста і грошай на ежу, толькі перадаў яго, як пасылку на пошце, і дарэмна Франя стагнаў і хапаўся за галаву. Пад кучаю пыльных плакатаў пра туберкулёз, сіфіліс, халеру і акцыю «Мыйце рукі, адмыеце сумленне!» у куце гарышча была знойдзеная яшчэ адна кушэтка. Тады Франя дапоўніў правілы хатняга распарадку: *Удзень трымайце язык за зубамі, бо ўсё чуваць, а ўначы ўсё роўна ўсім похер!*

Ён быў злы, як сабака, і ўпэўнены, што яны ўсе трое падохнуць з голаду. І дай Божа, каб яшчэ не прывялі каго чацвёртага.

Па першым часе імя Самуэль Ф. Клейн нічога не казала Іву, хоць у 1933 і 1934 гадах ён чытаў яго на сцяне ў кают-кампаніі «Леонікі», бясспрэчна, самага прыгожага і камфартабельнага карабля з усіх, на

якіх плаваў. І ён не толькі памятаў гэтае імя, выпісанае гатычнымі літарамі чырвонага колеру, але падчас кожнага снядання, абеду й вячэры разглядаў над ім фатаграфію ўладальніка карабля і безліч разоў задаваўся пытаннем, кім жа мусіць быць гэты чалавек, які выставіў сваё імя і фатаграфію, каб маракі на яе плявалі, лаяліся апошнімі словамі і пракліналіі той дзень, калі ступілі на палубу ягонага карабля. А пракліналіі яго таму, што ўсё адно праклінаць некага мусілі, і калі баішся Бога, капітана і першага палубнага афіцэра, то накінешся на таго, чыю выяву ўбачыш першай. На аўстрыйскага імператара, югаслаўскага караля ці голую прыгажуню, прылепленую з унутранага боку куфра з інструментамі; лаяцца будзеш на твар са старой газеты, а калі і яго няма, бо на караблі мала партрэтаў, будзеш лаяцца на самога сябе за тое, што дома не ловіш ярусам рыбу, а абплываеш Вогненную Зямлю і моліш Бога, каб Ціхі акіян быў сапраўды ціхі, а не такі, якім ён ёсць па сваёй прыродзе. І так бывае заўсёды, на кожным караблі і ў кожным плаванні, і гэта ведаюць усе, хто калі-небудзь плаваў, хоць бы ў якасці пасажыра. Ён не мог паверыць, што ўладальнік «Леонікі» гэтага не ўсведамляе ці да такой ступені ганарыцца сваім імем і выглядам, што выстаўляе іх на марацкую роспач. Былі і такія, што плявалі ў яго на шчасце і на спакойнае мора; кожны вечар, замест малітвы за штыль, яны харкалі ў твар гэтаму тыпу ў высокім цыліндры з гальштукам-матыльком. Іва не лаяўся і не пляваўся, а займаўся спробамі зразумець ягоныя матывы. Той чалавек мусіў нечым розніцца ад іншых, нечым, што рабіла яго цікавым. Але мала чаго можна было даведацца з адной фатаграфіі. Жыўцом уладальніка «Леонікі» ніхто з экіпажа не бачыў і нічога пра яго не ведаў. Таямніца фатаграфіі не мела разгадкі, калі яна ўвогуле існавала і калі нехта яшчэ, апроч Івы Дэлавале, бачыў у ёй нешта іншае, акрамя мішэні для плявання і іконы для лаянкі і кляцьбы.

Калі «Леоніка» адплыла з ягонага жыцця і ён перасеў на больш брыдкія, іржавыя і небяспечныя судны, у якіх не было ні каюткампаніі, ні выяваў імператара, караля ці Ісуса, Іва часта прыгадваў Самуэля Ф. Клейна. Але ў постаці пыльнага чалавечка на гарышчы банялуцкай гімназіі, які шчыра ўзрадаваўся яму, бо цяпер не

мусіў цэлымі днямі заставацца сам-насам з сабой, не было абсалютна нічога, што нагадвала б пра запляваную фатаграфію са сцяны ў кают-кампаніі і напісанае гатычным шрыфтам імя. З трэснутымі глобусамі, партрэтамі скінутых валадароў і мапамі, дзе пазначаныя межы, якіх больш няма, ён утвараў гарманічную цэласць. Быццам і сам ён быў спісаны нейкай школьнай рэформай, але замест каб выкінуць яго на гарадскі сметнік, яго засунулі на гарышча. Ён быў сімпатычны і забаўны, калі гаварыў пра свае шматлікія хваробы ці рэцэпты пірагоў для розных рэлігійных, грамадскіх і сямейных святаў.

Эх, каб нехта ў мяне спытаўся, чаго мне больш за ўсё не хапае і па чым я буду тужыць, калі буду развітвацца з жыццём, я сказаў бы – торта, нічога іншага, толькі торта – па ўсім я ўжо перастаў тужыць, але па добрым захер-торце не перастану ніколі! казаў Клейн у першую супольную ноч, а Іва не быў упэўнены, ці ён яму жаліцца, ці сам з сябе жартуе. І такі сумнеў не пакіне Іву да канца іх знаёмства. Нават калі яны будуць ведаць адзін пра аднаго больш, чым найлепшыя сябры, ён не будзе ўпэўнены, калі Клейн насміхаецца з сябе, а калі жадае раздзяліць з ім свае тугу і адчай. Да самай раніцы ён пералічваў яму пірагі, якія еў у жыцці, прыгадваў кандытэрыі і гарады, а было іх шмат і мясціліся яны ва ўсіх кутках свету; ад бітальскіх і стамбульскіх баклаваў ён умомант пераходзіў на венскі кайзершмарн, а ад яго на піту з яблыкам, якую каштаваў, калі аднойчы – гэта было недзе ў 1921 ці 1922 годзе – ездзіў у Амерыку; расказваў і пра булачкі з начынкай, якія дзіцём еў у Субоціцы ў нейкага мадзяра, і пра розніцу паміж абрыкосавым і шыпшынавым джэмам – першы нібы створаны для начынкі ў булачках, а другі лепш смакуе ў больш рыхлых пірагах; гаварыў ён пра тое, што няма лепшага напою за бозу*, прынамсі калі трэба запіваць пірагі, а яшчэ пра прылепскія рахат-лукумы, бядняцкую халву баснійскіх мястэчак і пра яечны крэм, які любіш, пакуль ты яшчэ нечы ўнук – а як толькі дзядулі-бабулі паміраюць, дык прападае і жаданне яго есці…

Іва слухаў і патанаў у сне. Клейн гаварыў яшчэ доўга, нават калі разумеў, што ніхто яго не слухае. Ён ссумаваўся па размове аб пірагах, бо з Франем гаварыць пра гэта не выпадала.

Раніцай вартаўнік вынес начны посуд удвая паўнейшы, чым звычайна. *Так справа не пойдзе,* сказаў ён. Але і сам не ведаў, як яно пойдзе і што яму рабіць з людзьмі, даверанымі яму на захаванне. Калі ён пагадзіўся на гэтую працу, Франя верыў, што робіць добрую справу, і пры гэтым не на страту сабе, а яшчэ будзе хлеба і да хлеба з Пантэравых грошай. Але цяпер, калі больш не было ні грошай, ні Пантэры, добрая справа пачала страчваць сэнс. Усе працуюць сабе на карысць, і толькі ён сабе на шкоду; носіць па гімназіі чужое гаўно і чакае дня, калі яго высачаць усташы.

На дварэ ўжо была вясна, якой доўга чакалі ў мірныя гады; цвілі, зелянелі і пладзілі горы вакол горада, гуд і цвыркат заглушалі нямецкія грузавікі, войскі рыхтаваліся рушыць адно на адно, учорашніх гімназістаў рыхтаваліся слаць у Сталінград, з дынаміка на плошчы даносіліся прамовы Павэліча і песні пра харацтво бацькаўшчыны… Была пара дасканалай гармоніі, і толькі ў Франевым жыцці ўсё ішло наўскасяк. Надвячоркам з Врбаса чулася шаргія* і тужлівая гісторыя двух сяброў, Латыфа і Сулеймана*, якія – вось ужо сто пяцьдзясят гадоў – кожнай вясны пакідаюць Баня Луку і пытаюцца адзін у аднаго заўсёды тое самае: ці табе не шкада? Дзе ж чалавеку будзе не шкада пакінуць такую прыгажосць толькі таму, што ён ведае – нядоўга ёй красаваць? Хіба ж ты не жывеш толькі таму, што ведаеш – з перспектывы дубровы над Шэхітлукамі ты ўжо даўно нежывы? Лепш нарадзіцца жывёлай, радавацца ўсякаму вясновому дню і не мець уяўлення, што заўтра можа быць нешта іншае, зусім не прыгожае, дзеля чаго ты, можа, і пашкадуеш, што ты жывы.

Мусіце адсюль неадкладна выбірацца, яшчэ гэтай ноччу! Як можаце і ўмееце! Я вам больш не магу дапамагчы, дрыжаў Франя, *вось, прынёс вам, што меў,* і дастаў з кошыка хлеб, аполец сала і тры цыбуліны, *але ідзіце, ідзіце яшчэ да поўначы!*

Яны сядзелі кожны на сваёй кушэтцы, і ім было няясна, чаго вартаўнік насамрэч хоча. *Прыйшоў сувязны?* спытаўся Клейн. *Няма ніякага сувязнога, выкручвайцеся самі, толькі ідзіце! Дырэктар на заўтра прызначыў прыборку гарышча,* махаў ён рукамі, і з кожнага пальца ў яго вісела па адной павуціне. Іва падумаў – гэта ад аднаго павука ці іх было болей.

Але як мы пойдзем і куды? разгублена пытаўся Клейн. *Адкуль мне ведаць як! Неяк! Нагамі, крок за крокам, і некуды дойдзеце,* насядаў вартаўнік.

Іва глядзеў на яго, усміхаўся і не верыў ніводнаму слову. Якая прыборка гарышча! Калі ідзе вайна такія рэчы не робяцца. І які дырэктар будзе нагадваць школьнаму вартаўніку, што яму заўтра рабіць. Проста чалавек хоча ад іх пазбавіцца, таму і хлусіць. Але, зрэшты, няважна, праўда гэта ці не, бо калі гаспадар кажа, што хопіць гасцяваць, то сапраўды трэба ісці.

Дык нас заб'юць, сказаў Клейн амаль дзіцячым галаском. *Божа ты мой, ты ж сам хацеў скочыць з даху! Я цябе ледзь стрымаў, а цяпер ныеш, што цябе заб'юць. Ніхто цябе не заб'е, калі паберажэшся!*

Франя выклаў на стол тое, што падрыхтаваў ім на дарогу, і пляснуў далонню аб далонь, быццам паказваючы, што ён з імі больш не мае нічога агульнага. *Карацей, я тут буду за паўгадзіны да поўначы, каб вы былі гатовыя!* сказаў ён і знік.

Што гэта было? азваўся Клейн пасля дзесяці хвілін маўчання. Праз вокны ў даху прабівалася вячэрняя зара і чуўся голас муэдзіна. Быў месяц рамазан. *Я яго такім яшчэ не бачыў,* зноў сказаў ён, не дачакаўшыся ад Івы адказу, *можа, гэта ў яго да раніцы пройдзе.* Ён хацеў праверыць, што думае Камуніст. Ён быў упэўнены, што Іва – камуніст, бо той выглядаў, як тып з савецкіх плакатаў пра веснавую сяўбу. Клейну не хацелася пакідаць гарышча, а калі насамрэч чакаецца прыборка, дык ён збіраўся запрапанаваць, каб Франя на гэты час схаваў іх у падвале або ў якім іншым месцы, але каб не выкідаў прэч і не выганяў у свет. Зрэшты, ён толькі пачаў звыкацца з ідэяй, што правядзе рэшту жыцця на гімназійным гарышчы.

Не ведаю, ці ў яго пройдзе да заўтра, але сёння ўначы мы сыходзім. Прынамсі я іду, а ты як сабе хочаш! сказаў Іва, і Клейна абліў халодны пот. Ад думкі, што гэтай ноччу ён мусіць выйсці на вуліцу, яго ахапіў такі страх, якога ён у сваім перапалоханым жыцці яшчэ не адчуваў. Страх быў тым большы, што ён не датычыў прычынаў, якія прывялі яго ў гэтае месца. Ён забыўся і пра ўсташаў і іхнія нажы, пра шыбеніцы і пра сярэднявечныя катаванні, пра якія ён гімназістам чытаў у нейкай французскай манаграфіі з карцінкамі

і ад якіх адчуваў эратычнае ўзбуджэнне. Цяпер яму не было важна, што ён яўрэй у гэтым свеце, які пастанавіў, што яўрэяў больш не павінна быць, не хвалявала яго і тое, што ён не мае сілы ў нагах і здохне ад стомы, калі ўжо не ад кулі і не ад нажа. Клейн проста баяўся выйсці на вуліцу! Што б там ні адбывалася і хто б там ні быў. Ён не мог вынесці думкі, што над галавой у яго будзе шырокае неба, а не нізкі косы дах. Ён душыўся ад думкі пра тую шырыню і не ведаў, што з ім адбываецца.

Я не магу, шапнуў ён, ледзь не плачучы. *Не пакідай мяне, дзеля ўсяго святога,* праскуголіў ён. Іву было няясна, чаго гэты чалавек ад яго хоча. Ён тупа вылупіўся на яго і спрабаваў па нечым пабачыць, што гэты чалавечак жартуе. Ён думаў, ці шкада павукам знішчанай павуціны або ім усё адно.

Добра мяне паслухай, пачаў ён, *мне не хочацца тут паміраць, і я напэўна пайду. Я не маю ўяўлення, хлусіць гэты ёлуп пра прыборку ці не, але правяраць не буду. А што да цябе, дык ты сабе сам гаспадар, вырашай сам. Лепш, калі б ты пайшоў са мной, і як будзе аднаму, так і другому. Лягчэй, калі нас будзе двое. Не перапыняй мяне і не ламайся, як нявеста на вяселлі! У мяне такое не праходзіць, бо я такіх жартаў не разумею. Я марак, ясна? Я не гарадское дзіця, мяне жыццё не лашчыла і не песціла, я заўсёды мусіў думаць, як уратаваць шкуру, і было мноства значна горшых сітуацый, чым гэтая. Гэта я кажу не таму, каб цябе супакоіць, але былі і горшыя. Не ведаеш ты, што такое караблі і што такое мора!* злаваўся ён, а ў Клейна цяклі слёзы.

Ведаю я, што такое караблі, былі ў мяне караблі, усхліпнуў ён. Іву захацелася ўляпіць яму поўху, як малому дзіцяці, бо гэты брыдкі чалавечак і быў малым дзіцем, неразумным і распешчаным. Можа і меў нейкую лодачку і зваў яе караблём.

Я табе нешта раскажу, паспрабаваў Іва дапамагчы байкай, калі ўжо поўха падалася яму недарэчнай. *Я плаваў два гады на караблі, які звaўся «Леоніка»…*

Чалавечак заззяў і перастаў плакаць, зусім як дзіця, пачаўшы пачатак «Снягуркі». *Гэта быў найпрыгажэйшы карабель у маім жыцці, чысты, моцны і надзейны. Бальшыня гандлёвых суднаў – гэта ста-*

рызна і ламачча, у горшым стане, чым дабітыя траўлеры, бо гаспадары думаюць толькі, як зарабіць. Іх не хвалюе, што карабель цячэ з усіх бакоў, маторы развальваюцца…

Клейн ківаў галавою, склаўшы рукі на каленях, і нібы зусім забыўся пра страх.

А «Леоніка» была нешта іншае, карабель, як з нейкага фільма. Толькі вось карабельная каманда была не з фільма. Маракі – гнюсны народ. Я ў турме не сядзеў, але вязні ў турме такія. Зусім як маракі. Грызуцца між сабою і ненавідзяць адзін аднаго. Яны плаваюць, а галоўнае для іх – калі яны прыстануць. Замест таго, каб бавіць прыемна час на казачным караблі, на які яны больш ніколі не патрапяць, яны «Леоніку» ненавідзелі. Іх абражала, што яны не на ржавым ламаччы, дзе можна дазволіць сабе расслабіцца. Вядома ж, на такім караблі была сапраўдная кают-кампанія, як на лайнеры для багатых, усё было на сваім месцы, і мэбля ў стылі Людовіка Чатырнаццатага…

Чалавечак матнуў галавой, ён хацеў запярэчыць, што ніякі гэта быў не Людовік Чатырнаццаты…

Слухай, дай мне скончыць гісторыю, і тады скажаш, не даў Іва сябе перапыніць. А *на сцяне ў кают-кампаніі быў партрэт суднаўладальніка, дык усе лаяліся і плявалі на той партрэт. Ведаеш, я пра таго чалавека думаю ўсё жыццё і не магу вырашыць, ці ён найвялікшы дурань на свеце, ці святы, які хацеў паказаць, што людзі незадаволеныя, нават калі ім добра. Я таксама быў незадаволены, хоць мне было добра на «Леоніцы». Мусілі прайсці гады, каб я зразумеў, што мне было добра. Заўсёды так, калі нешта пройдзе, зразумееш, што табе было добра. Але, бачыш, нечаму я ад таго чалавека навучыўся. Ніколі не ведаеш, як ты насамрэч сябе адчуваеш. Ні тады, калі думаеш, што табе добра, ні калі думаеш, што дрэнна. Можа гэта якраз шчасце, што мы сёння адсюль пойдзем. Ты мяне нагул разумееш, ці я тут дарма ўсё гэта распісваў?*

Чалавечак дурнавата ўсміхаўся, і здавалася, што з падарожжа разам з ім нічога не выйдзе. *А ці памятаеш ты, як звалі ўладальніка «Леонікі»?* спытаўся Клейн. *Самуэль Ф. Клейн,* сказаў Іва, усё яшчэ нічога не падазраючы. *Так,* пачухаў чалавечак за вухам, *і быў ён не*

святы, а дурань. Бесталковы дурны жыд. А ты гэта ведаеш і шмат разоў гэта казаў.

Ён глядзеў на свайго марака, які нічога не разумеў. Хмурыўся, і невядома якія думкі раіліся ў яго ў галаве. Напэўна нешта ў сувязі з яўрэямі. Яму больш не ясна, з кім ён мае справу. Іва думаў, што ён Тое, а цяпер выходзіць, што ён не Тое, бо калі б быў Тое, як бы ён пра некага казаў, што той бесталковы дурны жыд.

Звалі яго Самуэль Ф. Клейн, прамямліў чалавечак задуменна, *а ці ты памятаеш, як завуць мяне?*

Іва Дэлавале ўжо й не ведаў, дзе сон, а дзе ява. Ад таго снежаньскага дня 1941-га, калі ён на тунцалавецкім судне «Олаф» выплыў з Флорыды, думаючы, што выпраўляецца з ваеннай місіяй дзеля выяўлення нямецкіх падводных лодак у Карыбах, з ім здараліся толькі дзівосы. Найперш перад Гаванай «Олаф» пачаў тануць. Без ніякай прычыны, пасярод штылю; за дзве гадзіны ён даверху напоўніўся вадою, і яны з яшчэ трыма амерыканцамі ледзь уратаваліся. Уладальнік «Олафа», белабароды журналіст, відавочна багаты і трошкі шалёны чалавек, лаяўся, што яго падманулі нейкія пуэртарыканцы і што Пуэрта-Рыка трэба было б патапіць або прынамсі спаліць, бо гэта толькі адзін з тых знакаў, што яны падтрымліваюць Гітлера, як падтрымлівалі і Франка. Гэты чалавек нічога не ведаў ні пра мора, ні пра караблі, бо каму нармальнаму прыйшло б у галаву ісці з тунцалавецкім суднам на нямецкія падлодкі, – але Іва зразумеў гэта запозна. У Гаване яны развіталіся, і кожны пайшоў сваёй дарогай. Белабароды – купляць новы карабель, двое маракоў – на пошукі курваў, а Іва, без долара ў кішэні, шукаў спосабу, як з Кубы дабрацца назад у Флорыду.

І так пасля двух дзён чакання ён сеў на крэйсер «Зэмзэм», які плыў пад сірыйскім сцягам і перавозіў яўрэйскіх уцекачоў з Іспаніі ў Злучаныя Штаты Амерыкі. Пасля двух месяцаў чакання, пакуль людзі атрымаюць амерыканскія візы, і пасля таго, як былі патрачаныя і так скупыя запасы ежы і апошнія грошы, капітан Сяргей Пракоп'еў вырашыў выплыць у бок Маямі, спадзеючыся, што берагавая варта прапусціць «Зэмзэм». Усё ж гаворка ішла амаль пра тысячу чалавек, літоўскіх, польскіх, украінскіх, румынскіх і нямецкіх яўрэяў, якім так ці іначай пагражала смяротная небяспека. Рэч

у тым, што амерыканцы не верылі ў гісторыі пра канцлагеры і ў тое, што немцы падчас свайго прасоўвання на ўсход учыняюць масавыя ліквідацыі тых людзей. Ну добра, відаць, што Гітлер не любіць яўрэяў і што іх вынішчэнне ён абвясціў адной з сваіх найважнейшых палітычных мэтаў, але палітычныя мэты гэта адно, а рэчаіснасць нешта іншае, думалі амерыканцы, упэўненыя, што нацыстоўская ідэалогія дзейнічае як рэклама асвяжальных напояў. Хто б напраўду верыў, што падсалоджаная газіроўка робіць людзей шчаслівейшымі і павышае патэнцыю, і хто б насамрэч падумаў, што ў Гітлера з яўрэямі так сур'ёзна. А калі і сур'ёзна, дык гэта значыць толькі, што ён ненармальны, бізнес ягоны прападзе, дзяржава разваліцца, а пакуль не развалілася, разумней будзе трымацца ад яго чым далей і не звязвацца занадта з людзьмі, якія з рэальных прычынаў або ад страху разбягаюцца хто куды.

Дарэмна Пракоп'еў, і сам напалову яўрэй, спрабаваў растлумачыць усё гэта Рычарду С. Элефанту, аташэ ў пытаннях іміграцыі ў гаванскім консульстве, бо Элефант адказваў аргументам, які быў мацнейшы за ўсё, што мог прыдумаць капітан: *У Амерыцы хапае сваіх жабракоў і сваіх яўрэяў! Не патрэбныя ёй яшчэ і еўрапейскія яўрэі і еўрапейскія жабракі.* Сяргей Пракоп'еў, вядома ж, не ведаў, што спрабуе рабіць якраз тое, што цяпер спрабуюць рабіць яшчэ сотні і тысячы такіх, як ён, і што ў гэты момант ад Басфора да Магрыба праз Партугалію і Іспанію і аж да берагоў абодвух амерыканскіх кантынентаў вялізная маса людзей знаходзіцца ў такой самай сітуацыі, што і ягоныя людзі.

Калі б ён гэта ведаў, ён ніколі не паплыў бы ў Флорыду і не паспадзяваўся б на абстрактны гуманізм берагавой варты, а намовіў бы людзей плыць да кубінскіх берагоў. Тыя, хто б выжыў сярод акулаў, разбегліся б па востраве, і хай іх пасля мясцовыя ўлады шукаюць і вяртаюць ва ўсходнюю Еўропу.

Іву Дэлавале ён прыняў на «Зэмзэм» таму, што яму і так не хапала паловы каманды, да таго ж той меў і нейкія паперы ад амерыканскага войска, якія, як здавалася поўнаму роспачы капітану, маглі б недзе прыдацца. Аднак перад амерыканскім берагам «Зэмзэм» спынілі тарпедныя катэры, а нейкі ганарысты старшыня паставіў

Пракоп'еву ультыматум, каб праз паўгадзіны яго там не было, бо ў адваротным выпадку ён загадае патапіць карабель. Капітан толькі рассмяяўся і адказаў амерыканцу, што ні яго, ні людзей, якіх ён перавозіць, смерцю не напалохаеш і хай сабе тарпедуе. Старшыня сумеўся і пасля перамоваў з вышэйшым камандаваннем прапанаваў Пракоп'еву стаць на якар там, дзе ён ёсць, пакуль у Вашынгтоне або ў нейкім іншым месцы вырашаць, што рабіць з «Зэмзэмам». *Ні ў якім разе!* адказаў ён, *мае пасажыры паміраюць з голаду! Або патапіце нас, або прапусціце, або накарміце.*

Старшыня не зрабіў нічога з гэтага, але зноў кантактаваў з вышэйшым камандаваннем, і ў выніку нечакана хутка прыплыла маторная лодка са знакам Чырвонага крыжа, і «Зэмзэм» атрымаў першую партыю хлеба і кансерваў. За сем дзён, колькі карабель будзе заставацца на тым самым месцы ў акружэнні пяці катэраў берагавой варты, Чырвоны крыж некалькі сот разоў даставіць ежу і лекі, уся складавая прастора на «Зэмзэму» будзе перапоўненая і давядзецца скрыні са знакам міжнароднай дапамогі складаць ужо на палубе. Чакалася рашэнне з Вашынгтона, але капітан добра ведаў, якім яно будзе. Ён слушна разумеў суцяшэнне бляшанкамі і яго прынцып і быў гатовы затапіць «Зэмзэм» разам з ежай, якой набралася на год плавання. Ён не бачыў сэнсу мучыць людзей, ганяючы іх па моры, калі ніводзін бераг не хоча іх прыняць.

Калі раніцай восьмага дня фанабэрысты старшыня паведаміў пра адмову, Сяргей Пракоп'еў сабраў на караблі сход прадстаўнікоў уцекачоў паводле краінаў, з якіх яны ўцякалі, і запрапанаваў калектыўнае самагубства. Хай гісторыя памятае яўрэйскі «Тытанік» у Карыбскім моры!

Людзі, вядома ж, былі шакаваныя, яны адхілілі ягоную ідэю і намаўлялі яго плысці назад у Еўропу. Пакуль яны туды даплывуць, вайна ўжо, напэўна, скончыцца, а Гітлер, вядома ж, будзе разбіты. Капітан не верыў ні ў хуткае заканчэнне вайны, ні ў Гітлераву паразу, але не пярэчыў рашэнню сходу. Нягледзячы на гэта за ім пачалі шпіёніць і сачыць за кожным ягоным рухам у страху, што ён патопіць «Зэмзэм».

Драма тысячы яўрэяў і іх капітана адбывалася адначасна з Іва-

вай асабістай драмай. Рэч у тым, што той факт ягонага ўдзелу ва ўхваленай амерыканскім войскам місіі замест таго, каб дапамагчы камандзе і пасажырам, як спадзяваўся Пракоп'еў, стаў фатальным для Івы Дэлавале, які трапіў менавіта на «Зэмзэм». Старшыня быў упэўнены, што Івавы паперы падробленыя, і паслаў іх як падазроныя вышэйшаму камандаванню, дзе ў іх таксама засумняваліся, але ніяк не маглі праверыць сапраўднасць дакументаў і паслалі іх некуды далей. Хто ведае, дакуль дайшлі Івавы паперы і колькі людзей трымала іх у руках, пакуль яны не згубіліся ў нейкай шуфлядзе, але ўрэшце выйшла так, што нібыта ён іх і не паказваў старшыні і больш не меў чым пасведчыць сваю асобу. Для амерыканцаў ён быў толькі адным з натоўпу еўрапейскіх небаракаў, якія бадзяліся па палубе «Зэмзэма» і якіх трэба было ўсяляк пазбягаць, бо сустрэча з імі можа быць фатальнай, як калі дажджлівым днём у гразі побач з дарогай убачыш малога прамоклага сабачку і зразумееш, што гэтая жывёлінка застанецца тут назаўсёды і аддасць Богу сваю маленькую душу, калі ты не возьмеш яе з сабой.

Дзеля пачуцця, якое абуджаецца ў такіх сітуацыях, важна асабліва не разглядацца навокал і быць абыякавым да няшчасцяў людзей і сабакаў.

Увесь час падарожжа ў Еўропу акіян быў незвычайна спакойны, і ўсе ўспрынялі гэта як добры знак. Атлантыка ніколі не бывае такая ціхая, нягледзячы на пару года, і як каманда, так і пасажыры паверылі, што тут не абышлося без шчаслівага лёсу. Шчасце ім усміхнулася, і пачалі разыходзіцца змрочныя хмары над іх галовамі. Можа і лепш, што іх не прыняла Амерыка, думалі яны, бо хто б з такіх далёкіх краёў вяртаўся дадому. А яны напэўна вернуцца, заўтра або праз тры месяцы. Сытыя і задаволеныя, яны радаваліся вяртанню ў Еўропу.

Надвячоркамі на палубе ладзіліся забавы. Малы аркестрык з гітар, скрыпак і гармонікаў граў танцы розных краінаў. Граліся полькі і мазуркі, над марской гладдзю плыў вальс, танга гучала як тужлівы піск мёртвага буксіра, па драўлянай палубе грымела балканская хора, у паветры дрыжалі гіпнатычныя рытмы дэрвішскіх танцаў, калі чалавек перастае адчуваць страх і боль і яму здаецца,

што ён ужо за адну пядзю ад Бога, дастаткова толькі працягнуць рукі і прыняць ягоныя абдымкі… Гралі і танчылі ўсё, але не чуліся жыдоўскія ці яўрэйскія, ашкеназскія ці сефардскія песні. Толькі аднойчы зайгралі старую клезмерскую «Дэр гімл лахт», але публіка ўзбунтавалася. Яны не хацелі чуць яўрэйскіх песняў, бо яны сумныя і ніхто іх не разумее і нядобра спяваць і граць нешта, што настолькі адрознівае цябе ад іншых. Трэба быць падобным да іншых, і калі б мы больш клапаціліся пра падобнасць, мы не трапілі б у такую сітуацыю, што нас можа не стаць. Неяк так казалі, і толькі двое на караблі ведалі, што праўда ў іншым і што яна мае мала агульнага з тым, якія спяваць песні.

Ведаў Іва, бо толькі ён не быў яўрэем. І ведаў капітан карабля, бо яму было ясна, куды яны плывуць. Але быў бы грэх псаваць гэтым людзям радасць і знявяраць іх у часы, калі ўсё роўна, у што яны вераць. Яны ніяк не маглі ўплываць на свой лёс і змяніць тое, што мае здарыцца, і было лепш, каб яны пасярод надзіва спакойнай Атлантыкі, у адзіным месцы, дзе яны маглі адчуваць сябе свабоднымі, жылі ў ілюзіі, што вайна падышла да канца і што іх будучае шчасце залежыць толькі ад таго, якія песні яны будуць спяваць.

За дзень да таго, як «Зэмзэм» мусіў даплыць да берагоў Партугаліі, капітан Сяргей Пракоп'еў паклікаў Іву на капітанскі мосцік і спытаўся, ці ўмее ён кіраваць караблём. Іва здзівіўся, але зразумеў, што́ азначае гэтае пытанне.

Калі са мной нешта здарыцца, ты возьмеш кіраванне «Зэмзэмам» на сябе, сказаў Пракоп'еў, *каманда ўжо ведае.*

Тады Іва бачыў яго апошні раз. Наступнай раніцай капітан выслізнуў з-пад увагі тых, хто за ім сачыў, і прапаў. Яго шукалі, клікалі, як дзіця, якое недзе згубілася; замяшанне трывала гадзіну, усе былі на нагах, ад гоману і сварак амаль не было чуваць уласных думак. Каманда пачакала, пакуль пасажыры крыху супакояцца, і тады паведаміла, што кіраванне караблём бярэ на сябе Іва Дэлавале. Стары капітан не пакінуў па сабе ніякага паведамлення або развітальнага ліста, ніхто не ведаў, як і куды ён прапаў.

Трэба было б неяк паведаміць сям'і, занепакоена сказаў дзевяно-

стагадовы Ізак Папа з Біталы і пацягнуў новага капітана за рукаў. Ніхто не ведаў, ці былі ў Сяргея Пракоп'ева родныя, пра яго наогул ніхто не ведаў нічога. Апрача таго, што нарадзіўся ён у Расіі і што маці ягоная звалася Сара і што зімовымі днямі яна няспынна пляла шкарпэткі. Калі спляла іх усім у хаце, пачала плесці і сабаку аўчару, што зваўся Атаман. Толькі гэта Сяргей Пракоп'еў расказваў пра сябе пасля таго, як годам раней у марсельскім порце прыняў «Зэмзэм» пад сваю каманду. І яшчэ казаў, што Атаман не супраціўляўся, як гэта можна было чакаць ад жывёлы, а насіў свае чырвоныя шкарпэткі, як толькі халадала або калі Сара думала, што халадае. Атаман не хацеў яе крыўдзіць, хоць і не бачыў у такім яе старанні ніякага сэнсу.

Мудры быў той сабака, дарма, што зваўся Атаман, казаў Сяргей Пракоп'еў.

Ноч перад уваходам у порт была цяжкая, як кавадла. Вільготная і парная, як ноч старога пры смерці. Ніхто на «Зэмзэме» не звёў вачэй, людзі моўчкі бадзяліся па палубе, глуха сутыкаліся цені над марскою чарнотай, з кожнай душы адлятала атлантычная мара пра спакой. Іва вырашыў абысці Лейшойш, Порту і Лісабон і прыстаць каля рыбацкага порта Фігуэра ды Фош. Ён разлічваў на эфект нечаканасці: пакуль партугальскія ўлады, мытня і паліцыя апамятаюцца, падарожнікі з «Зэмзэма» высадзяцца на бераг, і тады іх ужо будзе цяжка вярнуць на карабель і дэпартаваць. План ягоны быў скрайне наіўны, Іва напэўна сам рассмяяўся б у твар кожнаму капітану, якому прыйшло б у галаву нешта падобнае, але ў ночы вялікай задухі і замяшання, якое ўзнікла ва ўсіх галовах, ніводная ідэя не была занадта вар'яцкай, каб ад яе адмовіцца. Незадоўга перад світанкам Іва Дэлавале сабраў на капітанскім мосціку яўрэйскіх прадстаўнікоў, сказаў ім, што наблізілася расставанне, і папрасіў скласці спіс, паводле якога людзі будуць высаджвацца з «Зэмзэма».

Як толькі вы ступіце на партугальскую зямлю, наша падарожжа будзе закончанае. Ад таго моманту кожны адказвае сам за сябе. Раю вам не затрымлівацца ў порце. Бяжыце ад берагу што будзе моцы. Чым далей адыдзеце, тым менш будзе шанцаў, што вас зловіць паліцыя. Спадзяюся вы захавалі па якім дукаце або залатым пярс-

цёнку. Яны вам прыдаліся б. Жадаю вам шчасця, скончыў ён сваю першую і апошнюю капітанскую прамову. Людзі моўчкі разышліся: на небакраі мутна мігцелі агні нейкага горада.

Высаджванне цягнулася добрыя дзве гадзіны. Столькі спатрэбілася, каб малымі рыбацкімі лодкамі перавезці ўсіх на цвёрдую зямлю. Іва Дэлавале застаўся на «Зэмзэме» апошні, як таго патрабуе звычай.

Доўга і не без смутку развітваўся ён з гэтым дзіўным караблём, які плаваў пад святым сцягам і насіў імя міфічнага калодзежа сярод Аравійскай пустыні. Калі Абрагам прагнаў Хагар і яе сына Ісмаэля, Зэмзэм іх уратаваў і не даў памерці ад смагі. Імя гэтае, напісанае белай фарбай на ржавым баку, імя карабля, чыя гісторыя была Іву невядомая – можа, раней ён перавозіў опіюм, рабоў ці зброю – сапраўды ратавала людзей, якія на гэтым караблі плавалі. Ён верыў у гэта ў хвіліну, калі развітваўся з «Зэмзэмам».

Калі ягоная лодка прыставала да берага, раптам усчаўся страшны шторм. Здарылася гэта за нейкія трыццаць секундаў, падзьмула з акіяну, зарыпелі драўляныя докі і паляцелі стрэхі дамоў, цыраты, якімі была прыкрытая паўднёвая садавіна, чорныя кафтаны і капелюшы людзей, якія за год да таго наспех пакінулі свае дамы. Ляцелі бляшаныя бочкі з нафтай і драўляныя з віном, высока над морам узляталі і збаны з маслінавым алеем і пасля раптам спадалі ў бездань, ляцеў рыштунак рыбацкіх барак, ляцелі з віскам і крыкам рыбацкія дзеці, ляцелі валачашчыя сабакі і нейкія недастаткова хітрыя каты. У адно імгненне ўзляцеў цэлы свет, і цяжка было сумнявацца ў Божай задуме. Салдаты, якія са зброяй у руках сустракалі пасажыраў «Зэмзэма», пачалі жагнацца і, прытрымліваючы фуражкі на галовах, пабеглі шукаць сховішча. Яўрэі засталіся адны пасярод рыбацкага порту, сярод трэскату мачтаў і камлёў, дрэва жывога і нежывога, у жахлівым завыванні ветру, пра якое больш мог бы расказаў той, хто перажыў старазапаветную метэаралогію.

Салдаты і паліцыянты забыліся пра яўрэяў, бо яны ў такіх абставінах нікому не былі патрэбныя, ні генералу Кармону, ні ягонаму міністру фінансаў Алівэйру Салазару, ні іхняй новай дзяржаве Эштаду Нову, якая далёка ад сваёй імперскай славы, недзе

ў завуголлі Еўропы трапіла ў звычайную буру. Здагадваючыся пра яе сэнс, людзі ўцякалі супраць ветру і ва ўсе бакі, так што праз дзве гадзіны, калі непагадзь сунялася, у порце Фігуэйра ды Фош не засталося ніводнага пасажыра з «Зэмзэма». Не было і карабля, бо яго разнесла мора або ён проста знік, як і яго сапраўдны капітан. У саракавыя гады і такія рэчы былі магчымыя. Знікалі людзі, гарады, таварныя цягнікі і народы, дык чаму б не знік і нейкі карабель? У небе, з Шагалавымі местачкоўцамі.

Дарэмна салдаты бадзяліся па доку са стрэльбамі ў руках і дарэмна спрабавалі даўмецца, ці карабель з яўрэйскім народам сапраўды існаваў, або гэта быў нейкі прывід, яшчэ адзін фатымскі цуд, якім Божая маці папярэджвала іх аб нечым, чаго яны ніколі не зразумеюць.

У Сэтубале Іва Дэлавале пасля двух тыдняў хавання і начавання па падвалах пакінутых прыбярэжных дамоў як безбілетны пасажыр сеў на італьянскае гандлёвае судна «Дэ Амічыс». Тры дні і тры ночы не вылазіў з кантэйнера з апельсінамі, а тады, разлічваючы на тое, што яго ўжо не змогуць вярнуць, выйшаў на палубу і паведаміў пра сваё існаванне. Замест таго, каб замкнуць яго на ніжняй палубе, збіць або прынамсі прыставіць да кухара, каб абіраў бульбу, капітан Гардонэ і карабельная каманда качаліся ад смеху, гледзячы на чалавека, які тры дні наталяў голад і смагу недаспелымі апельсінамі, а пасля не маглі надзівіцца, што ён з Партугаліі ўцякае ў Італію. Ён сказаў ім, што едзе дадому, што доўга не бачыў жонку і яму ўжо ўсё роўна як далёка ці блізка ён ад лініяў фронту. Вайна паўсюль, яна захапіла ўвесь свет, дык і ўсё роўна – у Бразіліі ты ці ў Далмацыі. Гардонэ круціў галавой: ніяк не можа быць усё роўна, але калі ён так кахае сваю жонку, дык калі ласка, хай паглядзіць, што такое сапраўдная вайна. Апрача таго, што яго чорт падаткнуў выправіцца з сівабародым фантастам лавіць па Карыбах нямецкія субмарыны, Іва Дэлавале ўсур'ёз не бачыў вайны дый асабліва пра яе не думаў. Дакладней, думаў столькі, колькі й кожны сярэдні амерыканец, колькі й Дыяна, якая звычайна перад месячнымі або ў поўню пачынала баяцца японскага дэсанту на Чыкага. Але ад таго моманту, як старшыня Берагавой варты забраў у яго дакументы і як ён пачаў

рухацца ў кірунку супрацьлеглым таму, да якога імкнуўся, сам не ведаючы, ці яму ўсё гэта сніцца, ці адбываецца на яве, Іва і вайну пачаў разглядаць як яшчэ адну асабістую няўдачу. Як нешта, што сапсуе яму жыццёвыя планы, але не будзе яму каштаваць жыцця. У гэтым ён бачыў розніцу паміж сабой і яўрэямі з «Зэмзэма». Колькі б яму ні было шкада тых людзей, колькі ён б ні спачуваў і не быў гатовы ім дапамагчы, яны ўсё роўна былі для яго нейкімі марсіянамі. Другая сусветная вайна, прынамсі ў ягоным уяўленні, раздрабіла зямны шар на некалькі планетаў. Калі вайна пачыналася, Іва быў у Амерыцы і таму мог лічыць сябе амерыканцам.

Тое, што смешны чалавечак з гімназійнага гарышча быў тым самым Самуэлем Ф. Клейнам, фатаграфіяй са сцяны ў кают-кампаніі цудоўнай «Леонікі», было толькі яшчэ адным дзівам з тых, што з ім здарыліся, але першым, якое Іва ўспрыняў як знак лёсу.

Ты не бойся, я цябе мігам перакіну да мора, як мех з бульбай, сказаў ён Клейну і ледзь не гвалтам выцягнуў яго ў ноч. Клейн скуголіў, як нейкая жывёлінка, але перастаў упірацца. Гіпнатызаваны страхам, ён апынуўся пад шырокім зорным небам, на бруку, па якім разлівалася месячнае святло і які праз гэта быў нібы пасярэбраны. Гэтулькім срэбрам можна было б выкупіць усе душы гэтай зямлі.

Канкістадоры, шапнуў Клейн.

Што? азірнуўся Дэлавале.

Нічога, сказаў чалавечак, трухаючы на кончыках пальцаў, у страху і захапленні. Страх паходзіў ад гукаў, якія адбіваліся рэхам на вуліцах, выдаючы кожнае жывое стварэнне, а захапленне складалася з срэбра і ценяў, светлага бруку і змрочных тэрасаў, неба, якое было такое вялізнае і чорнае, што зоркі ззялі ў ім як тысячы сонцаў. Яму захацелася ўсё гэта растлумачыць свайму мараку, найперш адкрыццё што да сувязі паміж срэбрам, золатам і каштоўнымі камянямі і фактам, што людзям багацце даражэйшае за жыццё; а як бы яно не было даражэйшым, калі першаўзор такі прыгожы, вось ён і на небе, і на бруку, і ці знойдзецца наагул жывое стварэнне, якому свае косці і мяса будуць значыць нешта большае за гэты цуд? І яшчэ ён хацеў яму сказаць, якім чынам срэбра і золата ператвараюцца ў грошы, каштоўныя паперы і чэкі, у тое, што пазбаўлена ўсякай

прыгажосці і ўсё ж знаходзіць у ёй сваё пакрыццё. І яшчэ ён сказаў бы яму, што не было б нічога, калі б не было страху, і жывое стварэнне нічога не заўважае, пакуль добра не спалохаецца і ягонае жыццё не будзе вісець на валаску. Спяшаўся Клейн сваімі малымі крокамі і спрабаваў запомніць усё, што трэба будзе мараку расказаць, калі яны перажывуць гэтую ноч. Шмат усяго, а бальшыня забудзецца. У чым і няма вялікай бяды, бо калі лепш падумаць, гэта ўсё балбатня, а ён балбатун. Так людзі пра яго думаюць, і хай думаюць, бо гэта праўда. Затое варта яму паўтарыць: *Канкістадоры,* – і гэтага дастаткова. Нават зашмат, як на яго! Нічога ў жыцці ён не прыняў да канца, ні пра што не думаў так доўга, каб цяпер мог сказаць: вось пра гэта і гэта я думаю ўсё сваё жыццё і зразумеў тое і тое, а ад таго і таго такая і такая карысць! Няма ніякай карысці, думаў ён ідучы следам за Івам. Вось, калі б не гэты чалавек наперадзе, ён бы не ведаў, куды пайсці. А ён жа напэўна ведае. Не дай Божа, каб не ведаў!

Іва, вядома ж, не меў уяўлення, у які бок ім трэба было ісці. Вартаўнік Франя выкінуў іх з гімназіі без ніякіх інструкцыяў пра тое, дзе і калі праходзяць усташаўскія патрулі і якой дарогай найлягчэй выйсці з горада. *Калі вы людзі, вы мяне не выдасце,* сказаў ён і ўцёк у цемру. А далей хай самі.

Хадзілі яны так па вузкіх гандлярскіх вулках добрыя дзве гадзіны, і Клейн не заўважыў, што яны ходзяць кругамі і ўжо два разы прайшлі міма Хілмавага гасцявога дому. У Івы пацелі далоні, сэрца бухала ў грудзіну, ён адчуваў, што яго ахапляе паніка і што з кожным момантам яны ўсё далей ад выхаду з лабірынта. Ён праклінаў туркаў і іхнюю архітэктурную логіку, імператара Франца, які толькі ўбудаваў у яе свае вілы і дамы, крамы і замкнутыя аканіцы, якія нічым не адрозніваліся адны ад адных. Згубная гэтая арыентальная патрэба – не пакрыўдзіць суседа і збудаваць крамку ні на пядзю не вышэйшую за ягоную, каб яны не розніліся ні колерам, ні формай, і калі некаму некалі спатрэбіцца ўцякаць па гэтых вуліцах, ён будзе хадзіць кругамі, як белая мыш у клетцы біялагічнага кабінета.

Урэшце яны ўсё ж выбраліся з горада, нікога не сустрэўшы, што Іва залічыў у шчаслівыя знакі, а Клейн нават не заўважыў. Яны дайшлі да першых лясочкаў і лазнякоў уздоўж Врбасу, а тады

да адрыны, дзе, схаваўшыся ў сене, намерыліся пераседзець дзень. У сене чалавечак чхаў, кашляў, стагнаў і ўтвараў столькі шуму, што, як здавалася Іву, ён гэтым можа наслаць на іх тры нямецкія арміі і асабістую гвардыю Правадыра. Але нічога такога не здарылася. Ні ў першы дзень, ні ў наступныя тры месяцы, колькі доўжылася іх супольнае падарожжа. І дзе б яны ні хаваліся ў сене, дзе б ні хадзілі скошанымі лугамі, Клейн паўсюль чхаў, кашляў і наклікáў няшчасці. Урэшце Іва да гэтага прызвычаіўся і здолеў пераканаць сам сябе, што загінуць ці трапіць у рукі лютым войскам ім не наканавана.

І гэтак ішлі апусцелай баснійскай зямлёю двое незвычайных людзей, і вялікая шкода, што іх не здымала кінакамера. Наперадзе шыбаваў высокі, худы чалавек з выразным носам і прыгожым тварам, які ўжо зарос калючай барадою, а некалькі крокаў за ім трухаў малы і згорблены чалавечак. Высокі пераважна маўчаў, а малы падаваў голас за абодвух. Калі ён не чхаў і не стагнаў, то без перапынку балбатаў пра сэнс і бяссэнсіцу жыцця, пра хваробы, якія лётаюць у паветры і толькі пытанне часу, калі ты каторую ўдыхнеш, пра міжнародныя дачыненні, якія давялі да гэтай страшнай вайны, пра тое, што блізкасць цёплых мораў робіць людзей лепшымі, таму Салазар, Франка і Мусаліні ніколі не дараўняюцца да Гітлера, а Гітлер быў бы яшчэ горшы, калі б нарадзіўся ў Нарвегіі або Данії, пра Ўінстана Чэрчыля, які ёсць жывым доказам, што хваляванні і няшчасці робяць чалавека тоўстым – да вайны ён быў амаль што зграбны, а за апошні год ператварыўся ў свінню, ён не мог паверыць сваім вачам, калі ўбачыў фатаграфію Чэрчыля ў газеце, пра дзеда Пінту, які меўся стаць сараеўскім рабінам, але яўрэйская грамада яго не хацела, бо ён занадта спяшаўся і яны думалі, што ён і іх будзе падганяць, пра тэравію, найдаўжэйшую мухамеданскую малітву і пра злосных ходжаў, якія, як расказваў яму дзед, мучылі людзей частымі тэравіямі, пра тое, што ён наогул не ведае, што гэта за малітва, і дзед таксама не ўмеў патлумачыць, дык ён гадамі чакае нагоды, каб спытацца ў нейкага мусульманіна, што ж такое тая тэравія, пра праваслаўных, якія сапраўды перабольшваюць з сваімі літургіямі, з якіх кожная даўжэйшая за найдаўжэйшую каталіцкую і ісламскую малітву, пра сваіх, якія таксама любяць забарыкадавацца ў храме

і не выходзяць цэлы дзень, пра тое, што ён шчыра хацеў бы быць рэлігійны, але ў яго ніяк не выходзіць, бо рэлігійнасць патрабуе, каб чалавек быў наіўны, як дзіця, і сістэматычны, як старазапаветны мудрэц, а ён можа трохі й дзіця, але ад мудраца не мае нічога, пра нямецкія маторы, якія ён лічыць найлепшымі маторамі на свеце, без розніцы, ці яны стаяць на аўтамабілях, караблях або самалётах, так што калі Гітлер урэшце пераможа, гэта будзе дзякуючы перавазе ў маторах, пра тое, што бальшыня людзей думае, што нямецкая перавага – у духу Вагнэра і Гётэ, але гэта поўная дурасць, бо нямецкая перавага ў маторах, пасля балбатаў пра эфіопскага імператара Сэласіе, пра дзіды, якія ягоныя салдаты кідалі па італьянскіх самалётах, пра паветра ў пустыні, добрае пры астме ў адрозненне ад паветра ў джунглях, пра сваю алергію, якая ніяк не пяройдзе ў астму, хоць яму доктар Вэбэр з Граца казаў, што любая алергія ўрэшце пераходзіць у астму, пра тое, што афіцыйная медыцына ўсё яшчэ не прызнала існаванне алергіі і што ў ніводным медычным падручніку пра гэтую хваробу не знойдзеш ні слова, але ён добра ведае, што гэта хвароба будучыні і што некалі ўвесь свет будзе хварэць на алергію, пасля балбатаў пра палавыя хваробы і пра патрэбу будаваць грамадскія прыбіральні блізка да галоўных гарадскіх плошчаў, пра гомасэксуалаў і іх заганнасць і пра тое, наколькі ўсякая прыгажосць бессэнсоўная, але нашто ва ўсім шукаць нейкі сэнс?

Іва проста слухаў яго і пытаўся сам у сябе, ці гэты чалавек заўсёды быў такі, або гэтая балбатлівасць у яго ад нервознасці. Або ад страху. Кажуць, што ў смяротную часіну ў чалавека ўсё жыццё пройдзе перад вачыма і што ён яшчэ раз перажыве ўсе свае дні. Усё паўторыцца ў адну секунду, у імгненне вока, і семдзесят гадоў жыцця сярэдняй працягласці ўвойдуць у малы адцінак часу. Саб'юцца і спрэсуюцца, як сена, калі яго складаюць у пакі. Гэтак сама ў хвіліну смяротнага страху чалавек адчувае патрэбу выгаварыцца і паўтарыць усе словы, якія ён некалі вымавіў. Толькі што неяк доўга трымаецца Клейнаў страх. Апавядаў ён цікава, хоць урывіста, так што ягоныя апавяданні нельга было запомніць і не было чаму з іх навучыцца.

Да самага Біхачу Боснія выглядала пустым краем. Яны сустрэлі толькі двух-трох сялянаў, якія пры сустрэчы, мабыць дзеля іх

бародаў, больш спалохаліся іх дваіх, чым Іва і Клейн пабаяліся, як бы сяляне не здалі іх паліцыі ці не пасеклі сякерамі. Лягчэй было б рухацца ноччу, але не таму, што менш небяспечна, бо і ў гэтым нельга было быць абсалютна ўпэўненым, а таму, што ўдзень ім даводзілася глядзець на спаленыя хаты і сёлы, перакапаныя дарогі, мёртвае быдла, якое гніло па канавах, разбітыя вайсковыя грузавікі і раскіданую крывавую ўніформу. Выглядала, быццам так застанецца назаўсёды ці будзе яшчэ горш, і з гэтай зямлі больш не ўзыдзе нічога, апрача пустазелля і дзікіх яблыняў, чые парасткі павылазілі на кожным кроку, быццам нейкі вецер нанёс горы іх насення.

Але, наколькі Боснія ні была б мёртвай і збяднелай, тут ніяк нельга было застацца галодным. Кожная другая былінка была ядомая, праз кожныя пару кіламетраў былі закінутыя бульбянішчы, у панішчаных садах буялі, як дзікая тканка, плады, што спелі ня ў час, па-за ўсімі календарамі і прыроднымі зменамі, быццам і яны павар'яцелі ад таго, што іх ніхто не збіраў.

Баснійцы вераць, што прырода найлепш родзіць у гады найгоршай вайны, сказаў Клейн, калі яны ў сутонні на ўзвышэнні, з якога быў відаць увесь Біхач, збіралі пераспелыя ігрушы і адганялі восаў і дзікіх пчол.

Баснійцы вераць ва ўсё, адказаў Іва, *што б ні здарылася, заўсёды выйдзе, што яны ў гэта ўжо верылі. Я іх добра ведаю. Плаваў са мной адзін Хілма. Уяві сабе, марак са Зворніка*! У дваццаць гадоў першы раз намачыў пальцы ў моры, а ў дваццаць адзін ужо плаваў праз акіян. Дужы быў той Хілма, але не магло здарыцца нічога, пра што б ён ужо загадзя не ведаў. Калі ўзнімаўся шторм, а шторм у Ціхім акіяне – гэта нешта, што жывому чалавеку цяжка сабе ўявіць, Хілма мудра абвяшчаў, што яшчэ з вечара ведаў, што будзе непагадзь, бо яму цэлы дзень свярбеў безыменны палец, а калі табе свярбіць безыменны палец, гэта не значыць нічога іншага, як тое, што ў Ціхім акіяне збіраецца бура. Калі мора было ціхае, як алей, Хілма казаў – ну так, я ведаў, нездарма ж у мяне тры дні торгалася левае вока, а калі торгаецца левае вока, гэта значыць, што ветру са свечкай не знойдзеш. Усё, ну проста ўсё, што магло здарыцца з караблём і на караблі, Хілма тлумачыў сваімі чарамі і марамі. Мяне гэта*

трошкі нервавала, і я яму сказаў, што гэта лёгка, калі ўзнімецца шторм, а ён кажа, што яшчэ ўчора ведаў. Дык што ж ты ўчора нам не сказаў? Дык а вы не пыталіся. Вот будзеш ты ў мяне вісець на рэі, як наступны раз не скажаш, калі табе засвярбіць безыменны палец, сказаў я яму і ўжо радаваўся наперад і чакаў наступнага шторму, каб толькі напіцца Хілмавай крыві. Уяві сабе, я, марак, чакаю буры проста так, дзеля жарту. Вось што значыць маладосць! І ведаеш, што здарылася? Прайшлі тры тыдні, падыходзіць да мяне Хілма і кажа: дружа мой добры, свярбіць мне палец, як ніколі! Назаўтра мы ледзь не ўтапіліся. Была гэта наймацнейшая бура, якую я толькі зажыў на караблі. Блізка ад аўстралійскіх берагоў. Людзі плакалі, маліліся святому Антонію, і ніхто ўжо не спадзяваўся застацца жывым. А Хілма, бачыш, ведаў. Вось што такое баснец. Няма такога, у што б ён загадзя не верыў, яшчэ перш чым яно здарыцца. І якая ім з гэтага карысць! паказаў ён рукой на апаленае мёртвае сяло, быццам гэтая карціна найлепш пацвярджала тое, што ў баснійцаў няма розуму. Свой лёс яны ведалі наперад, а не зрабілі нічога, каб яго пазбегнуць.

Надвячоркам яны прылеглі на гарышчы адной з ацалелых хат. План быў у тым, каб адаспацца да поўначы, а тады ісці далей, абысці Біхач і рушыць далей да Кордуна. Іва знайшоў нейкія коўдры, з іх яны на голых дошках змайстравалі пасцелі і, наеўшыся ігрушаў як два мядзведзі, заснулі, як толькі паклаліся.

Клейн сніў свой стары сон, які не пакідаў яго ад тых дзён, калі ён малым хлопчыкам пайшоў у школу. У сне ён пасярод вуліцы згубіў левы чаравік, не ведае, як гэта сталася, і цяпер шукае. Некалі ён прачынаўся ад гэтага сну ў поце і слязах, засмучаны, што мусіць вярнуцца да бацькі і маці без чаравіка, але з гадамі ён да сну прызвычаіўся, успрымаў яго як штоночную забаву і адпачынак ад дзённых клопатаў. Ён шукаў згублены чаравік памалу, адкладаючы прабуджэнне і ведаючы, што не знойдзе яго, бо ніколі яго не знаходзіў, і хто ведае, што б сталася з ягоным сном, калі б чаравік аднойчы з'явіўся. Можа тады ён памёр бы, думаў ён, а можа і сапраўды памрэ, калі знойдзе яго ў сваім сне. Ён ведаў, прынамсі, калі спаў, што гэты сон яшчэ далёка.

І так, пакуль Клейн шукаў чаравік, у ягоны сон пачалі закрадацца скрыпкі. Гучала нейкая тужлівая баснійская песня, неўзабаве далучыўся і гармонік, а калі пачуўся бубен, Клейн зразумеў, што са сном нешта не ў парадку. Ён перастаў шукаць чаравік і спрабаваў прыгадаць, ці ў такіх абставінах і раней гучала нейкая песня або пошукі праходзілі ў цішыні. Ён не мог прыгадаць ніякіх гукаў. Ані цішыні. Грае ці не грае нешта ў снах? Ці ёсць у снах колеры і пахі?

Так ён і прачнуўся, якраз у той момант, калі грымнулі трубы. Натапырыўся кожны валасок у яго на руках, ён моцна зацiснуў краі коўдры і ўбачыў вылупленыя ад страху Івавы вочы. Хоць таго абудзілі ўжо першыя гукі скрыпкі, ён усё роўна не разумеў, што адбываецца.

Яны тупа глядзелі адзін на аднаго, а тым часам хрыплы мужчынскі голас спрабаваў перакрычаць трубы і гармонік. *З тога боку Плівы шоўк-трава ўзыходзіць,* спяваў ён, *і ўсякая чужына больтугу наводзіць,* заспяваў ён яшчэ гучней. Калі песня скончылася, нехта крыкнуў: *Грай Заграбскіх паненак.* Пачалі трубы, далучылася піліканне і мужчынскія падвіскванні, пасля загучаў цэлы хор, *а пад сцягам малады ўсташа, у зацятай бітве б'ецца, і ўсташскі сцяг віецца, за свабоду і за дом, харвацкі дом,* а Клейн дрыжаў, быццам нехта падлучыў да яго электраток. *Не, Самуэль, не,* шаптаў ён сабе ў бараду, *не, Самуэль, не,* паўтараў ён формулу, якая бараніла яго ад змроку, *не, Самуэль, не,* казала яму бабуля, калі ён памiраў ад дыфтэрыі, *не, Самуэль, не,* і калі ўпаў з плота і зламаў нагу, *не, Самуэль, не,* казаў ён першы раз самому сабе.

Яны ляглі каля вузкай шчыліны паміж страхой і падлогай, якая ў некалькіх месцах даходзіла да трыццаці сантыметраў і праз якую быў відаць двор перад домам і пасярод яго лагернае вогнішча. Паўтара дзясятка людзей у чорных уніформах паўколам сядзелі па-турэцку на голай зямлі. З другога боку вогнішча дванаццаць музыкантаў, неверагодна абарваных, выконвалі песню пра салодкую малую Марыяну. За іх спінамі стаялі двое чорных з аўтаматамі на грудзях. Трубы ззялі на агні і недарэчна выдзяляліся ў гэтым змрочным відовішчы. Калі б іх не было, тыя людзі былі б толькі ценямі – і тыя, што сядзелі, і музыканты, і нерухомая варта. Клей-

ну тое, што ён бачыць, здавалася яшчэ менш рэальным, чым яго-ны сон, а музыка, якая гучала з інструментаў, належала не так гэ-таму відовішчу, як вечным пошукам чаравіка. Быццам на мёртвую карцінку нехта прыляпіў гук, спадзеючыся, што ён яе ажывіць. Але заместа гэтага яна зрабілася яшчэ больш мёртвая.

Грай хутчэй! рыкнула нерухомая постаць каля агню, і аркестр зайграў хутчэй.

Спявай, спявай сакооооооле, шалай саколе, сіпла завыў голас.

Яшчэ хутчэй, няма ў нас часу! і яны зайгралі яшчэ хутчэй, кож-ны па-свойму, паводле магчымасцяў, а магчымасці ў кожнага былі розныя, як розны ў людзей бывае і страх, так што яны гучалі ўжо больш не як аркестр, а як музыканты, якія пачалі граць песню ў роз-ны час, нехта ўчора, а нехта дзесяць гадоў таму, і цяжка было спа-дзявацца, што яны некалі сыдуцца ў тоне і такце.

Стоооооой! Той, што ад пачатку даваў загады, устаў з зямлі і дастаў рэвальвер. Астатнія не зварухнуліся.

А зараз памалу заграйце Дунай шырокі, роўны Срэм, але каб гуча-ла, як у тэатры, без фальшу. Хто сфальшывіць, атрымае кулю ў лоб.

Настала ціша, відавочна ніхто не наважваўся пачаць першы, рукі дрыжалі на начным ветрыку. З паўночных краёў, з Панноніі і яшчэ далей, можа з Сібіры або з цёмных паўночных мораў надыходзіў подых, які ў нейкіх іншых абставінах у такую самую ноч крыху б расцверазіў бяседнікаў, замілаваных летняй лёгкасцю, змусіў бы іх на момант памаўчаць і адламаць з талеркі, размаляванай трыма чырвонымі ружамі, па драбочку сыру, пакласці яго ў рот і задумац-ца над соллю яго цела.

Дыверсія! крыкнуў чалавек з рэвальверам, і нехта засмяяўся. *Глянь, смык абасцаўся,* сказаў смяшлівы і паказаў пальцам на ста-рога са скрыпкай, у якога на калашыне сцякаў струмень. Яшчэ два струменьчыкі блішчалі на яго шчоках. Столькі слёз на адным твары бывае толькі ў нямых фільмах. Чорны ствол уткнуўся яму ў скронь.

Грай! Дунай шырокі, роўны Срэм, загадаў ён, *спачатку толькі ты, а пасля іншыя*. Стары прыставіў інструмент да барады, апусціў смык на струны і паглядзеў на чалавека з рэвальверам. Перад кру-глай адтулінай ствала рассунуліся наймякчэйшыя косці галавы.

Ён заплюшчыў вочы і пацягнуў смыком па струне. Пачуўся дрыготкі гук, нібы зарыпелі дзверы ў пакоі лялечнага дома, чалавек з рэвальверам папярхнуўся, *думаю, што ты зблытаў песню!* пачуўся стрэл, не надта моцны, быццам нехта мокрай кашуляй ляпнуў па камені ў рачулцы, галава выбухнула, пырскі мазгоў зашыпелі на вуголлі вогнішча, чалавек упаў на бок і застаўся так ляжаць.

У полымі можна было ясна бачыць пусты раскрыты чэрап, як дно бруднай місы ад супу. Зверху засталіся пасмы валасоў, а знізу, там дзе заканчваўся роўна акрэслены кратэр, нібы абрэзаны алмазным нажом, былі некранутыя жывыя чалавечыя вусны і чорныя вусы.

Ніхто не варухнуўся. Людзі ва ўніформах сядзелі, як дзеці, што глядзяць лялечны спектакль, і тыя, хто сядзіць ззаду, прыўзнімаюцца, каб лепей бачыць. Двое з аўтаматамі выглядаюць расчараванымі. З іх пазіцыі відовішча не надта цікавае. Тое цела з іх боку выглядае, як бы нехта ляжыць і спіць. Яны не могуць бачыць, што куля зрабіла з галавой, і не надта гэтым задаволеныя. Іва і Клейн бачаць усё нібы з галёркі, з каралеўскай ложы. На дне чэрапа віднеецца нейкая нарасць – ці частка тканкі прыліпла да косці, ці полымя ад вогнішча стварае такі цень, што ўзнікае нешта, чаго насамрэч няма.

Ніколі яшчэ Самуэль Ф. Клейн не адчуваў сябе так бяспечна, як тады; малы бог, чыя несмяротнасць не ставіцца пад пытанне, засаромлены, бо з усяго, што б ён цяпер мог або мусіў адчуваць, з усяго, што робіць чалавека чалавекам, ён адчувае толькі патрэбу прыбраць лішні кавалак тканкі ці пасунуць цела так, каб агонь не адкідаў крывыя цені і каб смерць была ідэальна круглым кавалкам парцаляны з нядзельнага абеднага стала. Адчуванне віны будзе мучыць яго да канца жыцця, ад усяго ён пазбавіцца і забудзецца пра свой страх і імгненні, калі яму здавалася, што душа распадаецца на тысячу тысяч промняў святла, якія нішто ўжо болей не складзе разам, але тое, што ён у забітым бачыць толькі эстэтычны факт, дно прыгожай парцалянавай пасудзіны для супу, не дасць яму спакою.

Ці я тады звар'яцеў? запытаецца ён у копцкага святара ў пяцьдзясят нейкім годзе ў Ерусаліме. Той пагладзіць яго па шчацэ, як хлопчыка, які прыйшоў на заняткі Закона Божага, і нічога не ад-

кажа. Бог ведае, што ён падумаў і ці наагул зразумеў гісторыю, той стары копт.

Не трэба, пане сотніку, у імя Ісуса! упаў на калені трубач. Рэвальвернік схапіў яго за вуха, хлопец войкнуў, *што ты сказаў, падла цыганская?* раз'юшыўся рэвальвернік, *не трэба, дзеля Алаха!* трубач няправільна зразумеў намёк, што таго тыпа раз'юшыла яшчэ больш, і ён пачаў цягнуць вуха. Ён спрабаваў яго вырваць, але не выходзіла, бо мочка ўвесь час выязджала ў яго паміж вялікім і ўказальным пальцам, вуха выслізгвала, як вугор, і не было той сілы, якая магла б за яго моцна ўхапіцца. Гэта смяшыла гледачоў, якія сядзелі па другі бок вогнішча.

Рэвальвернік не падумаў, што яны смяюцца з трубача, асабліва калі вуха ўжо пяты або шосты раз вызвалілася ад сотнікавых пальцаў і музыкант, закрыўшы вушы далонямі, пачаў галасіць і маліць на ўвесь голас. Але ён ужо больш не згадваў Бога ні адным, ні другім імем, а Правадыра, Незалежную дзяржаву Харватыю, сваё чыста каталіцкае паходжанне, пра якое ведаюць усе ў Пітомачы і канонік Зоўка ў Ноўскай, і што чыста выпадкова ён, хрышчоны харват, апынуўся ў цыганскім аркестры.

Той крык прымусіў сотніка на імгненне завагацца. Можа, цыган і не хлусіць і, можа, ён наогул не цыган. І не такі ўжо ён чарнявы, у яго ў сотні ёсць і чарнейшыя, і мала хто б, калі не па вопратцы, убачыў у гэтым крыкуне цыгана, але тады ён зразумеў, які быў бы сорам, калі б ён яго адпусціў. Калі скажа – так, ты не цыган, я памыліўся! дасць яму нагой пад задніцу і пашле яго дадому. Палова сотні падумала б, што сотнік Хайнрых слабак, а другая палова – што ён дурань, бо нейкі цыган здолеў пераканаць яго, што ён харват, а толькі сляпы не ўбачыць розніцы паміж цыганом і харватам, нават калі ў іх аднолькава цёмная скура. Нават калі ў цыгана блакітныя вочы.

Дык што ж ты не сказаў, каб цябе! Харваціна! А я думаў, што цыганюга. Ну нічога, зараз мы гэта праверым. Ану хадзі-тка сюды, сотнік Хайнрых наказаў трубачу ўстаць, *нахіліся тут, вось так, дай паглядзець пры агні на твой твар.*

Трубач устаў за паўметра ад агню і прыязна ўсміхнуўся, упэўнены ў сваім ратунку.

Добра, вось, ну як жа я мог так памыліцца, дзівіўся Хайнрых і ляпаў трубача па патыліцы, нібы лашчыць добрага паляўнічага сабаку, а тады раптам схапіў яго за валасы, рухам барцоўскага аса даў яму падножку, трубач ніцма бразнуўся на зямлю тварам проста ў жар. Хайнрых трымаў яго за валасы і пхаў ягоную галаву глыбей між згарэлых дубовых паленаў, трубач біў рукамі і нагамі, спрабуючы вырвацца. У магільнай цішы чуўся толькі тупат па траве і пыле. Быццам вялікі мядзведзь пераходзіць пыльны сельскі гасцінец.

Хайнрых абліваўся потам ад напружання, а можа яму й агонь прыпякаў руку. Некалькі разоў здавалася, што ён здасца і трубач выцягне галаву з жару, але тады сотнік аднекуль знаходзіў яшчэ крыху сілы і прыціскаў яго яшчэ мацней. Гэта тая сіла, пра якую чалавек не ведае, пакуль не апынецца ў смяротнай небяспецы або ў сітуацыі, калі трэба ратаваць сваіх блізкіх, або, што, можа, найвацнейшы матыў, калі мусіць даказаць сваю сілу перад масай людзей. Каб не здацца і не адступіць перад агнём і адчайнай валтузнёй ахвяры, сотніка Антуна Хайнрыха, мабыць, найбольш матывавала думка, што людзі з ягонай сотні, хоць бы адзін сярод іх, двое, сямёра або ўсе, адчуюць захапленне ягонай сілай, зразумеюць, якога чалавека яны насамрэч бачаць праз полымя лагернага вогнішча, пакуль ён пацее і мучыцца, але не здаецца. Бо сапраўдны ўсташа ніколі не здаецца, сапраўдны мужчына той, хто не баіцца ваўкоў і дзікіх звяроў, пякельнага агню, ворага і страху, сэрца, якое б'ецца ў грудзях і пытаецца: што ты робіш, няшчасны Антуне, у пекле будзеш гарэць за гэта! І хай сабе ў пекле, хай увесь свет праваліцца ў пекла, але перш трэба выканаць тое, па чым нашы дзеці і дзеці нашых дзяцей будуць нас памятаць і быць нам удзячныя, калі над нашымі магіламі будуць маліцца за бацькаўшчыну і мір.

Трымаўся Антун Хайнрых даўжэй, чым нехта мог бы падумаць. Трубачова цела валтузілася і ўпіралася цэлых дзесяць хвілін. Можа і болей. Або так толькі здавалася тым, хто глядзеў. Можа, ён пхаў галаву занадта глыбока, а можа трубачовым тварам загасіў жар, але цела было жывое якраз столькі, колькі спатрэбілася б часу, каб спячы бульбу. А калі яно канчаткова супакоілася, сотнік яшчэ трохі прытрымаў галаву, каб нехта не падумаў, што ён больш не можа яе

трымаць, і тады выцягнуў яе з вогнішча. Клейн заплюшчыў вочы.

Перш чым другі раз праспявалі пеўні, увесь цыганскі аркестр загінуў ад нажа, агню і кулі. Сотнік Хайнрых сваёю рукою забіў дзевяцярых, а гарманіста, хлопца, які граў на басэтлі, і другога трубача пакінуў вартавым. Яны выканалі працу без ніякай жарсці. Загадалі ўсім траім укленчыць і паляўнічымі нажамі перарэзалі ім горлы. Так, недзе а палове трэцяй, гулянка падышла да канца. Хлопцы паўставалі з зямлі, стогнучы ад боляў у каленях і цяжкага вайсковага жыцця, калі не маеш ні крэсла, ні ложка. Яны разаслалі шэрыя салдацкія коўдры і ўмомант пазасыналі сярод раскіданых інструментаў, за некалькі метраў ад мёртвых целаў. Сотнік Хайнрых нікога не пакінуў вартаваць. Або ад перанапружання і стомы забыўся пра гэта, або ведаў, што паблізу няма партызанаў.

Самуэль Ф. Клейн і Іва Дэлавале яшчэ доўга глядзелі з гарышча на двор, на людзей, якія храплі і гучна пярдзелі, стагналі ў сне і клікалі матак, перасяляліся з ваеннага ў мірны час і з сваіх дарослых мужчынскіх целаў у дзіцячыя душы. Было чуваць, як яны плачуць у сне, так як усе войскі плачуць, колькі існуе свет і войны, з тугою мужчын, калі яны апынуцца далёка ад жонак і матак, ад сваіх жыццяў і штодзённых цывільных пяшчотаў.

Калі б я быў салдат, шаптаў Клейн, *я зараз сышоў бы ўніз, дабраўся б да першай стрэльбы і ўсіх іх пазабіваў. Каб толькі я быў салдат,* паўтарыў ён, нібыта марыў пра гэта. Іва не адказаў. Язык у яго прысох да паднябення або ператварыўся ў гладкі камень, у слуп солі, які растае ў роце, ад чаго яго ўсё больш мучыла смага, і ён праклінаў сябе, дурную галаву, што не набраў у бутэлькі вады. Яму здавалася, што ён больш не мае чым гаварыць, што да раніцы памрэ ад смагі. Ён сціснуў Самуэля за плячо і пальцам паказаў яму, каб маўчаў. Яны не спалі да раніцы, глядзелі, як прачынаецца войска, як снедае, збірае рэчы і адыходзіць. Пасля глядзелі на загашанае вогнішча, на трубы, якія блішчалі на сонцы, і на мёртвых людзей. Толькі каля дзясятай гадзіны Іва паварушыўся. *Хадзем!* загадаў ён. Клейн абтрос пыл з нагавіц, спрабуючы паводзіць сябе, як бы нічога не здарылася. Ён мог хадзіць, думаць пра ўсё што хоча, быў спакойны і сабраны, адчуваў сябе, як і кожны дзень. Тыдні хаджэнняў

і бадзянняў загартавалі яго, і ён сам сабой ганарыўся. Ён прапускаў гэта ўсё праз свае думкі.

Нехта б мусіў гэтых людзей пахаваць, сказаў ён, калі яны выйшлі на двор.

Нехта б мусіў, згадзіўся Іва.

Але ў нас няма чым, сказаў Клейн.

А калі б і было, нам бы спатрэбілася тры дні, каб іх усіх пахаваць, сказаў Іва.

Можа і болей, сказаў Клейн.

Ім не хацелася ісці, не маглі яны проста так пайсці, гэта была адна з рэдкіх сітуацый, калі абодва яны ў той самы час адчувалі сябе аднолькава. Яны разгубіліся і не ведалі, што ў такой сітуацыі рабіць. Быццам такія сітуацыі наагул здараюцца і ёсць такія, хто ведаў бы, што рабіць.

Ці ведаеш ты якую малітву? спытаўся Клейн. *Ай, кінься ты,* адмахнуўся Іва. *А што тады рабіць?.. Не ведаю… Я не магу проста так пакінуць людзей,* і спыніўся, быццам раздумваючы, якіх людзей, *якія былі жывыя! Мы іх бачылі, як яны былі жывыя… Так, і праўда бачылі,* горка згадзіўся Іва.

І пайшоў да мёртвых, Клейн толькі глядзеў на яго. Іва схіліўся над першым, гэта быў той малы басэтліст, наймаладзейшы ў аркестры, дакрануўся яму да рукі і нешта шапнуў. Дакрануўся да другога, пасля да трэцяга і так да апошняга, са словамі, якіх Клейн не мог пачуць.

Што ты ім сказаў? спытаўся ён, калі яны былі ўжо за некалькі кіламетраў.

Фарталеза, Натал, Жуан Пэсоа, Сэржыпі, Эспірыту Санту, Нова Ігуасу, Віторыя, Сэлаціна, Сан Луіс, Курыціба, Сан Матэўс, Санта Крус Кабаралія. Вось што я ім сказаў, адказаў Іва, і з кожным словам адчуваў, як у яго ў горле збіраюцца слёзы.

Што гэта за малітва?.. Гэта не малітва. Гэта мясцовасці на ўзбярэжжы Бразіліі. Прыгожыя, адна прыгажэйшая за другую, сказаў Дэлавале і заплакаў.

Яны стаялі пад вялізнай вярбою, каля ручаінкі, якая была такая маленькая, што і дзіця магло яе пераступіць, але шумная, як мо-

гуць быць ручаінкі, з якіх чалавек яшчэ не напіўся вады, і абодва плакалі, кожны са сваёй тугі, па дванаццаці мёртвых цыганах. Па мадзярскім гуляшы ў стэпе позняй восенню трыццаць нейкага года, па балканскіх дыктатарах з малымі чорнымі вусікамі, пра чые візіты ў Парыж рэгулярна паведамляў бульварны друк, па расшытых вясельных ручніках, што луналі над Врбасам, пакуль малады і маладая ўцякалі ад дажджу, па шэсці, якое праводзіла сына гарадскога начальніка ў войска, пакуль п'яны кум заліваў ракіяй мурашнікі, па Каймакчаланскай і Мохачскай бітвах*, апяваных паразах і перамогах, замкнутых на сем замкоў у Каралеўскім Роял-банку ў Бухарэсце, па мёртвым харвацкім паэце ў іспанскай багадзельні, па Марыянскай Кангрэгацыі Паненак, якая ў 1937 годзе ў Крэкавай вуліцы, 7 у Сараеве адзначала юбілей, на які запрасілі граць цыганоў, бо яны былі таннейшыя за аркестр гатэля «Еўропа», па краме жалезных вырабаў «Руднік» і «Малым Металуме» ва ўласнасці Ісідара А. Алтарца, Клейнавага дзядзькі, пра якога ўжо год няма ніякіх вестак, па кнігарні «Арфэлін», уласнасці Мілуціна Д. Станоевіча, у бялградскай вуліцы Святога Савы, у якой у 1932 годзе Іва купіў Рэгіне альбом для запісаў «У маім сэрцы запісана, што яно табе аддана», а яна ведала, хто яго даслаў па пошце, хоць ён саромеўся падпісацца, па рускім эмігранце, які за год перад тым скочыў з Рэвеліна*, і яго пахавалі за агароджай могілак без імя і знаку, па чыстым соку з ружавых пялёсткаў, які прадаваўся на спліцкай набярэжнай у той дзень, калі прыйшла навіна, што забіты кароль Аляксандар, і жандармерыя на знак жалобы забараніла ружавы сок усім, апрача дзяцей да дванаццаці гадоў, па заграбскіх стракатых парасонах, якія прапускаюць кроплі дажджу, па марскіх ра́ках з пляжа ў Црыквэніцы з канца траўня 1912-га, дзе, заваліўшыся ў шэзлонгі і сузіраючы захад сонца, паміралі пражскія і браціслаўскія сухотнікі, па гандляры скурай Маіру Алкалаю, які найякаснейшым свіным боксам абабіў камандную кабіну карабля «Леоніка», па прафесійнай асацыяцыі ўладальнікаў кінематаграфічных майстэрняў Саўскай банавіны ў Варшаўскай вуліцы нумар 6 у Заграбе, якая праз Самуэля Ф. Клейна і яго карабельную кампанію замаўляла стужкі з найнавейшымі амерыканскімі фільмамі, але праз нейкі год іхняя справа прапала,

бо памёр Рудольф Валентына*, па саганах і джэзвах з базару каля Старога моста ў Мостары, якія Клейн купляў дзелавым партнёрам з Гамбурга і Остэндэ, па заграбскіх музыкантах, якія граюць па парыжскіх і лонданскіх вар'етэ, па сляпым прадаўцы латарэі з чыгуначнай станцыі ў Вінкаўцах, які паўтараў *белая мышка, дзецям зніжка!* а ў клетцы на століку з білетамі быў вялізны шэры пацук, па албанскім каралі, у чыім эскорце было трое лютых асманскіх аскераў, і іхняя лютасць у парыжскім вулічным натоўпе выклікала смех, бо кожнаму з іх было за восемдзесят, па вестунах, якія летам 1935-га па лівенскіх, дувенскіх і бугоенскіх вуліцах і завулках, б'ючы ў бубны, рэкламавалі чаравікі «Бата», «у якіх бедныя адчуваюць сябе, як каралі», па карабельных сірэнах, якія тужліва завывалі па мёртвым целе Сцяпана Радзіча* ў жніўні 1928-га, пакуль драўляныя дзверы дамскіх кабінак пастуквалі на гарачым ветры, а ахоўнікі ад нуды шукалі па пустых пляжах золата, па вусатых рэвалюцыянерах і змагарах супраць тытунёвай манаполіі, якіх жандары правялі ў ланцугах па Страдуне, а дзеці забягалі наперад і плявалі на іх, па старым гадзіннікавым майстру Ёзэфу Копэльману, Аляксандрава вуліца 55 у Сараеве, у якога Клейн купіў кішэнны гадзіннік з выгравіраванай манаграмай мексіканскага прынца і па доктару Грыгорыю Меркулаву з той самай вуліцы, нумар 71, да якога ён пайшоў, калі ў начлежным доме «Элеазар і сыны» ў Коніцы падхапіў мандавошак, па лодках, якія блукалі па малым карчульскім парточку, калі іх аднойчы ўначы нехта з помсты паадвязваў.

Наплакаліся Самуэль Ф. Клейн і Іва Дэлавале пад той вярбою кожны па сваіх успамінах, што мелі нейкую зразумелую іх душы сувязь з дванаццаццю мёртвымі цыганамі, і нічога адзін аднаму не сказалі. Братанне слязьмі, якое мацнейшае за братанне крывёю, бо заключаецца не ў выніку рашэння ці мужчынскага сяброўства, зблізіла іх і змяніла нешта ў тым, як яны адзін аднаго ўспрымалі.

Наступныя два месяцы, колькі ім спатрэбілася, каб увосень 1942 года дабрацца да мора, падарожнічаючы ўдзень і ўначы і затрымліваючыся на адным месцы часам і па пяць-шэсць дзён, бо з суседняй гары чулася страляніна, Іва расказваў Клейну гісторыю пра дзвюх жанчын на двух кантынентах. Пра адну, якая была яго-

ная, з якой ён ажаніўся і збіраўся пражыць жыццё, і пра другую, якую кахаў больш за ўсё на свеце і разам з якой стаў амерыканцам. Гэтая другая ведала, што ён жанаты недзе там у Еўропе, але тое месца здавалася ёй такім далёкім, што ніводная падзея, якая там адбывалася, не даходзіла да ейнага сэрца. Калі ён выпадкова азіраўся за прыгожай дамай на чыкагскай вуліцы, яна бывала раўнівая, але ў сувязі з Івавай жонкай не адчувала нічога. Або гэта яму толькі здаецца, думаў Клейн. Сваёй сапраўднай жонцы ён, вядома ж, пра амерыканку нічога не сказаў, бо яна яму, па яго ўласных словах, выдрала б вочы і больш не пусціла б у мора. Ёй, разважаў Іва, Амерыка значна бліжэйшая, чым амерыканцы Еўропа. Такія нашы людзі і нашы жанчыны. Хоць і жывуць на краі свету, у найглыбейшай з усіх правінцыяў, калі не лічыць рускія, але ўспрымаюць увесь свет як нешта блізкае, і тое, што здарыцца ў Чыкага, будзе аднолькавай ганьбай, як бы яно здарылася ў Чапліне.

Дык кахаеш ты яе ці не? спытаўся Клейн, каб Іва перастаў яго інтрыгаваць.

Я кахаю і адну, і другую, адказаў Іва, калі яны спускаліся па нейкай горнай сцежцы над Дэлніцамі, *але гэта недакладнае пытанне. Праблема ў тым, што я не ведаю, каторы кантынент мой. У прынцыпе я гэта ведаў, пакуль у мяне той грынга ў Флорыдзе не забраў амерыканскія паперы і я не павярнуў назад. І цяпер я, як рак, увесь час іду назад. Я сказаў сабе, окэй, стары, ты зрабіў, што зрабіў, уцёк ад жонкі і ад дому, будзеш амерыканец, памрэш як амерыканец, ніколі больш не адгукнешся ні ёй, ні сваім родным. Не па-людску гэта і не прыстойна, але так выйшла. Ніхто мне не вінаваты, што так выйшла, дый сам я не тое каб страшна вінаваты. І тады здарылася тое, што здарылася, яно вярнула мяне ў Еўропу як скрыню гнілых яблыкаў, цяпер я тут, і д'ябал ведае, ці яшчэ калі пабачу Амерыку. Вось як я ва ўсё гэта ўблытаўся. Але нейкі цуд, што я яшчэ ўвогуле жывы.*

У нейкім сэнсе гэта і сапраўды быў цуд. Бо на карабель «Дэ Амічыс», на які Іва Дэлавале сеў у Партугаліі як безбілетны пасажыр, каля Атранцкай пратокі напалі грэцкія піраты. Яны выбілі амаль усю каманду, уратаваліся толькі двое маракоў і Іва. Калі ён

даплыў да албанскага берага, яго там арыштавала італьянская вайсковая варта. Сем дзён яго трымалі ў турме, паілі рыцынавым алеем і патрабавалі, каб ён у нечым прызнаўся. Якога чакаць прызнання, яны не ведалі, але ён відавочна быў першы, каго яны здолелі злавіць на гэтым бойкім кантрабандным маршруце, і яны мелі амбіцыі павысіць Іву ў ранг сур'ёзнага крымінальніка. Ён, аднак, не меў уяўлення, ні дзе апынуўся, ні што ў гэтых краях возяць кантрабандысты, так што не мог сабе дапамагчы нават хлуснёй і мусіў цярпець лячэнне рыцынай, пакуль урэшце не атрымаў нагой пад задніцу. Пасля гэтага быў шлях праз албанскія і чарнагорскія горы і цясніны, сустрэчы з чэтнікамі і партызанамі, а таксама з лютымі сельскімі вартамі, што амаль каштавала яму жыцця, бо выявілася, што абаронцы сёлаў маюць менш праблемаў з выкрыццём ворагаў, чым любое балканскае войска. Ворага яны бачылі ў любым чужынцы, а Іва Дэлавале, мабыць, быў найдзівоснейшым тыпам, які калі-небудзь аб'явіўся ў сёлах пад Калашынам. Тым, што яго не ліквідавалі, ён можа падзякаваць толькі факту, што і гэтым разам зусім не разумеў, пра што ў яго пыталіся. Ён не ведаў Сэкулу Дрлевіча, не меў ніякага ўяўлення пра Паўла Джурышыча і мог, як апошні ідыёт, паціскаць плячамі, калі яго хітра намаўлялі прызнацца, хто з гэтых дваіх яму прыгажэйшы. Сялянам было ўсё роўна, чыю прыгажосць ён абярэ, яны зарэзалі б яго як святочнага парсюка і за аднаго, і за другога, але не маглі яго рэзаць, пакуль ён з аднолькава дурным неўразуменнем рэагуе на згадку як пра Сэкулу, так і пра Паўла. Прайшоўшы Чарнагорыю і перайшоўшы Дрыну каля Вішаграду, ён трапіў у рукі партызанам. Там яму было ўжо лягчэй, бо ён ведаў сёе-тое пра Маркса, Энгельса і Леніна і пра эксплуатацыю амерыканскага пралетарыяту. Ён схлусіў, што з Чыкага выправіўся на барацьбу супраць фашысцкіх акупантаў і за справядлівае грамадства, уразіў таварышаў веданнем замежных моваў, яны празвалі яго Вучылам, апранулі ў падраную ўніформу каралеўскага войска, насунулі на галаву цітаўку з пяціканцовай зоркай і паслалі на змаганне. На другі дзень пад Усціколінай яго ўзялі ў палон дамабранцы і даставілі ў Сараева, дзе перадалі немцам, бо ім падалося, што яны маюць справу з нейкім важным бандытам, занадта разумным і гаваркім для звы-

чайнага партызана. Немцы два дні яго дапытвалі, пасля вырашылі перакінуць у Славонскі Брод, а пасля і далей. Магчыма, у лагер. Але пад Добаем партызаны напалі на калону грузавікоў і вызвалілі яго. Ён спрытна схлусіў ім, што быў узяты ў палон па дарозе ў Дуброўнік, куды скіроўваўся на загад Вярхоўнага штаба, і запатрабаваў, каб яму тэрмінова далі магчымасць працягваць шлях. Яму пашэнціла, што ён меў справу з адным з найменш арганізаваных і найслабей звязаных з іншымі падраздзяленнем, дзе ніхто не ведаў, як наладзіць кантакт з найвышэйшым камандаваннем, каб праверыць Івавы словы, дый яны ў іх і не сумняваліся, бо і на іх ён зрабіў сур'ёзнае ўражанне, і яны надумалі перакінуць яго праз нелегальную сетку, а менавіта праз Івана Скачыблыху-Пантэру і ягоных людзей, у Дуброўнік. Першай і апошняй станцыяй на тым шляху было гарышча банялуцкай гімназіі.

Вось як бывае, павучальна зазначыў Клейн, *калі зашмат гуляеш з жыццём, тады і жыццё пачынае гуляць з табой.* Іву не было што яму сказаць. Самуэль меў рацыю. Але калі ўсё іншае вяло да шкоды і гібелі, дык тут ён прынамсі знайшоў сябра.

Як у нейкай рамантычнай камедыі на заранку гукавых фільмаў, яны абняліся і расцалаваліся на рыецкай набярэжнай, паабяцаўшы перажыць вайну і яшчэ раз некалі аўтамабілем праехаць ад Баня Лукі да мора. Яны будуць спыняцца ля кожнай карчмы, а пасля вайны корчмы будуць на кожным кроку. І будуць есці, піць ды гуляць да світання. На кожную карчму па адным світанні. Самуэль Ф. Клейн верыў у дамову, прынамсі да моманту, калі ўвайшоў у падвальную канцылярыю Эрвіна Штыгліца, які вырабіць яму фальшывыя дакументы на імя Густава Тэнгі, з якімі ён выедзе ў Лондан, а адтуль у Палестыну, а Іва Дэлавале ўжо тады ведаў, што Самуэля больш не ўбачыць. У каталогу сяброў Клейн зойме важнае месца, але як і іншыя, з кім ён хадзіў у школу, піў, плаваў або сустракаўся ў розных канцах і пачатках свету, і ён будзе чалавекам без адраса, згубленым у сусвеце твараў і галасоў. Сябар, які прападзе пасля першага развітання. З выпадковых сустрэчаў, а іншых у мужчынскім свеце быць не можа, Іва ніколі не стварыў нічога, што доўжылася б усё жыццё. Праўда, і сябры тут асабліва не стараліся, памылкова

мяркуючы, што чалавек не можа знікнуць проста так і што ён зноў выпадкова з'явіцца, пастукае ў дзверы ці сустрэнецца як выпадковы мінак у якім заўгодна горадзе на свеце. І ім бы тады здалося, што гэта ён, што яго прыгожая галава паказалася над масай людзей у чэраве гарадскога рынку, перад гарадской мячэццю падчас пятнічнай малітвы, ці ў канцы галоўнай гандлёвай вуліцы ў партовым горадзе, яны пабеглі б, каб яго паклікаць, але гэта быў не Іва, а нехта нават да яго не падобны. І якое б вялікае ні было расчараванне, большым было адчуванне нічым не азмрочанага сяброўства. Нікому з гэтых мужчынаў Іва не здрадзіў, перш чым знік з іхніх жыццяў.

Самуэль Ф. Клейн дзясятак разоў у розных месцах у Сірыі, Егіпце і Ізраілі бачыў Іваў прывід і быў заўсёды аднолькава ўпэўнены, што гэта ён. Апошні раз у Хайфе, за дзесяць дзён да смерці. Той нечакана з'явіўся з гары апельсінаў у рабочым адзенні і з нататнікам, у які нешта запісваў. Ён быў нікольк не старэйшы, чым у той дзень, калі яны развіталіся на рыецкай набярэжнай. Клейн спрабаваў да яго падысці, але пакуль зрабіў сваіх трыццаць крочкаў і прайшоў цэлыя дзесяць метраў, на што спатрэбілася некалькі хвілін, зніклі і апельсіны, і работнік, і не было больш нічога, апрача пляцоўкі будаўнічай фірмы, на якой чакалі краны, цягачы, бульдозеры і экскаватары, гатовыя будаваць дамы савецкай яўрэйскай беднаце недзе там, на просталінейнай пустыннай мяжы, за гарматны стрэл ад варожых войскаў або на адлегласці, на якую арабская бедната можа дакінуць каменем. Гэта было месца першай і апошняй галюцынацыі Самуэля Ф. Клейна. На тым месцы, калі верыць метафізічным ісцінам, назаўсёды застаўся помнік Іву Дэлавале, мараку з «Леонікі» і адважнаму чалавеку, які жыццё сябра цаніў як сваё, меў душу для ўсіх знаёмых і незнаёмых і заліў слязьмі магілу аднаго цыганскага аркестра.

Можа ўсё гэта і дазволіла Клейну пазнаць у імі Рэджыны Дэлла Валле, што значылася ў подпісе пад адным даволі бесцырымонным, але адначасна бюракратычным і надзвычай прыватным лістом, адно з двух Івавых каханняў. Можа ён горка падумаў, што такая жанчына яго не вартая, можа яго суцяшала вера, што Іва цяпер у Амерыцы з тым сваім лепшым каханнем, а можа ў яго ў думках было нешта

трэцяе, да чаго чалавечая фантазія не можа дадумацца, і таму яно застанецца таямніцай у дакументах публічнай і прыватнай гісторыі. Але неабвержным застаецца факт, што ягоны адказ быў занадта натхнёны і глыбокі, пазбаўлены блазнаўства і лекгадумнасці, каб можна было паверыць, што ён адрасуе яго некаму, пра каго нічога не ведае і хто яго па сутнасці і не датычыць.

«Я б вам параіў пашукаць яго з нейкіх лепшых і больш высакародных меркаванняў. Тады, дасць Бог, вы яго знойдзеце». Гэтак напісаў Самуэль Ф. Клейн Рэгіне Дэлавале, калі яна дзеля выдуманай спадчыны распытвала пра ўяўнага брата, каб даведацца праўду пра каханку свайго нябожчыка мужа.

За гэтай складанай формулай і заблытанымі прычынамі, якія да яе прывялі, хавалася хлусня, якая мелася замаскаваць сляпое жаданне помсты. У гэтым жаданні Рэгіна была дзіцем свайго часу. За безадказнае каханне, здрады і паклёпы народы помсцілі адны адным. Але замест сапраўдных прычынаў, якія правадыры ў цырыманіяле калектыўнай істэрыі адкрывалі ў душы свайго народа, для помсты яны выдумвалі хлусню. Адказ Самуэля Ф. Клейна таксама быў тыповы. У ім ён, хоць і бязбожнік, спасылаўся на Бога і ягоную волю. Гэта быў прыклад паэзіі пасля Асвенціма: дасць Бог тое, чаго не далі людзі, хоць вядома, што Бога сярод людзей больш няма.

Рэгініна выдумка пра пошукі брата таксама не была нечым незвычайным. Апрача Лукі, які ў тым 1951 годзе, калі яна пісала ў Хайфу, быў жывы і здаровы, і Бэпы, які за два гады да таго памёр у сараеўскай вар'ятні, у яе былі яшчэ тры браты: Ліна, Джузэпэ і Джавані. Усе трое былі ўжо нябожчыкі, Ліна ў Першую вайну памёр ад іспанкі, а пра лёс Джузэпэ і Джавані і пра прычыны, з якіх іх лёс асабліва сястры не датычыў, яшчэ можна было б пагаварыць. Магчыма. Але браты для Рэгіны не былі нейкім цудам, каб яна прымхліва берагла іх ад сурокаў. А дзе былі пяць, там яна магла выдумаць і шостага.

VI

Дванаццатага чэрвеня 1940 года ў Джавані Сікірыча на плошчы Канкорд у Парыжы нехта скраў кашалёк і студэнцкую залікоўку. Гэта здарылася надвячоркам, у часе, калі, як і цэлы апошні тыдзень, бальшыня кавярняў і крамаў былі зачыненыя. На вуліцах засталося мала людзей; за зачыненымі вокнамі і спушчанымі жалюзі ўсе чакалі часу, калі ў горад увойдуць немцы. Пераможца ў бітве пад Вэрдэнам, нацыянальны герой і віцэ-прэм'ер ва ўрадзе Поля Рэно, маршал Філіп Пэтэн за некалькі тыдняў да таго ахвяраваў бацькаўшчынай дзеля міру, упэўнены, што супраціў Гітлеравым войскам не мае сэнсу і не можа быць эфектыўным. Усведамляючы, што Францыя мае дастаткова ваенных перамогаў і за гэтую саступку не заплаціць гонарам, ён загадаў войску не бараніць горад. Тыя, хто не згадзіўся з Пэтэнам, ужо пакінулі Парыж і накіраваліся на поўдзень. Выехалі і людзі, якія расцанілі, што з расавых, ідэалагічных або палітычных прычынаў ім пагражае ад немцаў асабістая пагібель. Джавані цэлымі днямі глядзеў, як яны пакідаюць горад. Пра многіх ён ведаў і чаму яны едуць: студэнты і выкладчыкі яўрэйскага паходжання, рускія эмігранты – усе як адзін сацыялісты, камуністы, трацкісты, сацыял-дэмакраты, анархісты, члены дзясяткаў рэвалюцыйных арганізацыяў, якія яшчэ ад Кастрычніцкай рэвалюцыі знайшлі прытулак у Парыжы. А яшчэ ліберальнае мяшчанства, якое баялася нямецкага ўварвання як чорта рагатага або баялася яго прапарцыйна папярэдняму адчуванню перавагі над немцамі. Уцякалі мастакі, філосафы і пісьменнікі, эмігранты, якія ўжо аднойчы ад тых самых немцаў уцяклі, калі Гітлер у 1936 годзе пачаў пашыраць і акругляць нямецкую жыццёвую прастору. Урэшце яшчэ да канца зімовага семестра горад пакінулі студэнты з краінаў Усходняй Еўропы, сыны балгарскіх, румынскіх і венгерскіх міністраў і прамыслоўцаў, спадзеючыся, што ім пагражае меншая небяспека ў іх маленькіх

метраполіях, над якімі, паводле агульнага перакананння, не выбухне вялікае гістарычнае шаленства.

Парыж, а не Лондан – галоўная перашкода еўрапейскай еднасці пад Гітлерам, сказаў яму на развітанне Трайчэ Багоеў, студэнт жывапісу, які хваліўся, што бацька ў яго шэф балгарскай службы контрвыведкі, у што Джавані асабліва не верыў, бо такім радаводам, калі ён сапраўдны, ніхто нармальны не хваліўся б. Зрэшты, хіба не дзіўна, што фактычна ўсе тыя хлопцы з еўрапейскага ўсходу, балгары, румыны, грэкі і албанцы – сыны людзей з самымі шалёнымі біяграфіямі, шпіёнаў, чарадзеяў, царазабойцаў і фальшавальнікаў пячатак, і ніхто з іх не паходзіць са звычайнай сям'і, як кожны французскі, нідэрландскі ці швейцарскі студэнт у Парыжы?

Нейкая хлусня, якую немагчыма пацвердзіць або праверыць, суправаджала кожны іх крок, і Трайчэ тут не быў выключэннем. Даволі таленавіты партрэтыст, пазбаўлены аднак сапраўднай мастацкай адукацыі і без ніякага адчування эстэтычнай меры, гэты балгарын ствараў невыносны кіч і праз яго развіваў і аналізаваў тэорыі змовы і геастратэгічныя парадоксы. Ён маляваў Эйфелеву вежу, а над ёй тры чорныя дубовыя калоды, якія нябачная сіла трымае так, каб яны не звaліліся на горад. Калі сіла знікне, настане пекла, магчыма, у такой самай кічавай манеры.

Парыж – сімвал, які стаіць на дарозе ў Гітлера, і мне і ў галаву не прыйдзе страціць жыццё за сімвал, сказаў Трайчэ, выпіў апошнюю чарку, аплаціў рахунак, тройчы пацалаваўся з Джавані і сеў у мерседэс балгарскага пасольства, які давязе яго да Ліёна.

Праз паўгадзіны пасля гэтага на плошчы Канкорд Джавані заўважыў, што ў яго няма кашалька і залікоўкі. Ён вярнуўся той самай дарогай да карчмы, дзе яны сядзелі, але там было ўжо зачынена, металічныя жалюзі былі спушчаныя, а на дзвярах вісеў вялікі замок. Ён пару разоў ударыў кулаком у дзверы, спадзеючыся, што ўсярэдзіне яшчэ нехта ёсць і яго пачуе, але яму адгукнулася толькі металічнае рэха пустой залы.

Ён быў перакананы, што залікоўка і кашалёк выпалі ў яго, калі ён надзяваў пінжак і што заўтра ён знойдзе іх у афіцыянта. У кашальку грошай амаль не было, акурат на адзін білет падземкі,

а гэта нікому не спатрэбілася б красці. Ад залікоўкі злодзей таксама не меў бы карысці. А залікоўку Джавані мусіў знайсці, бо факультэты ўжо не працуюць, і ніхто не можа даць яму пасведчанне, што ён студэнт. Паміж студэнтам і беспрацоўным маладзёнам з Югаславіі ёсць пэўная розніца, тым больш падчас вайны і чаканай нямецкай акупацыі. У тую ноч ён дрэнна спаў, варочаўся ў ложку, слухаў цягнікі ўдалечыні і патанаў у чорныя думкі і ў паўсон, у якім не мог адрозніць тое, што яму здаецца, ад таго, што б магло быць сапраўднай пагрозай. Упершыню ў гэтым горадзе ён пачаў страчваць арыентацыю і не быў упэўнены, ці разумна зрабіў, што не ўцёк, калі ўсе яго намаўлялі. Або калі казалі яму, што не будзе годным сустрэць немцаў, а для таго, хто ў Парыжы нікога не мае, гэта не мела б і ніякага практычнага сэнсу. Але хіба было б больш годным пакінуць горад, які яго прыняў і зрабіў лепшым і больш адкрытым свету, падумаў ён і застаўся.

Ён ледзь дачакаўся, калі насценны гадзіннік праб'е сёмую гадзіну, апрануўся і выбег з хаты, каб паспець у кавярню да таго, як яна адчыніцца а восьмай. Людзей на вуліцы не было, але адусюль чуўся нейкі дзіўны гук, нібыта ўхаластую грукаціць стары ткацкі варштат. Гэты гук суправаджаў яго да плошчы Пігаль, і тады ён зразумеў, што гэта не ткацкі варштат або якая іншая прылада ці машына, а гук тысяч гумовых падэшваў, якія ў правільным рытме сутыкаюцца з асфальтам. Гэта былі доўгія шэрагі нямецкіх салдатаў, якія пешым крокам, не маршыруючы, ішлі да плошчы Этуаль.

Горла ў яго сціснулася ад страху, але як толькі праз некалькі імгненняў ён зразумеў, што гэтае відовішча не такое, як у кіначасопісах, дзе паказвалі берлінскія вайсковыя парады і ўваход у Прагу, немцы не ступаюць гучна і моцна, а хутчэй так, як людзі ідуць у тэатр, Джавані ахапіла новае адчуванне. У ім рос гнеў, асабліва калі ён убачыў дзвюх начных дам, якія праводзілі калону смехам і віскам, і адразу пасля – групкі чарнявых мужчынаў, па дзесяць і болей, відавочна, арабаў, алжырцаў, тунісцаў і мараканцаў, ва ўрачыстых чорных гарнітурах, з гальштукамі-матылямі, якія сустракалі і праводзілі нямецкае войска з высока ўзнятымі галовамі і годнасцю племянных правадыроў. Апрача гэтых людзей, на пустой

плошчы Пігаль не было нікога. Не было французаў. Джавані быў абураны – так што навярнуліся слёзы гневу – тою здрадай, якую ўчынілі толькі што гэтыя людзі, што прынеслі ў хрысціянскі Парыж сваю веру. Яшчэ нядаўна яны гулялі па Елісейскіх палях у фесках і цюрбанах або закруціўшыся ў свае бедуінскія просціны, і ніхто іх не чапаў, ніхто да іх не чапляўся, не выкрыкваў ім абразаў. А цяпер яны ў ціхім сваім захапленні сустракалі немцаў. У іх гонар яны купілі ўрачыстыя еўрапейскія гарнітуры і скінулі з галоваў фескі. Гэта быў момант іх збліжэння з Еўропай, рука, працягнутая іншай цывілізацыі, жэст, якім аб'ядноўваліся, зліваліся, перапляталіся сусветы. Яны чакалі Гітлера, каб скінуць фескі і цюрбаны, бо без яго Еўропа была нявартая такога ўчынку. Яны здрадзілі гораду, з якім не хацелі зрадніцца, думаў ён, далучыліся да таго, пра каго ведалі яшчэ менш, чым пра Парыж, але ён імпанаваў ім, бо прыйшоў, каб скарыць Парыж. Супольнасць у нянавісці і касмапалітызм дзікунства.

Ён ніколі не забудзе гэтых людзей, якія радаваліся акупацыі, як не забудзе зачыненых і зацемненых вокнаў, за якімі маўчаў і тужыў горад, які Джавані лічыў наймацнейшым і непераможным. Хто прыедзе ў Парыж і здолее ў ім застацца, той назаўсёды пазбавіцца ад таго, што прымусіла яго выехаць адтуль, адкуль ён выехаў. Ён верыў у гэта з таго самага дня, калі вырашыў, што паедзе ў Парыж вучыцца геалогіі, разарваўшы ўсе сувязі з домам і адрокшыся ад сямейнай спадчыны. Каб больш ніколі не ўбачыць і не пачуць сястру, братоў і ўсіх, з чыйго свету ён уцёк.

Ад арабаў, якія ззялі натхненнем, ён чуў, што ўсе нямецкія войскі збяруцца на пляцы Канкорд, і паспяшаўся туды, не так з цікаўнасці, як спадзеючыся, што перад Трыумфальнай аркай павінна нешта здарыцца. Французы мусяць бараніць гэтае месца; немагчыма сабе ўявіць, каб акупанты проста так прайшлі пад Напалеонавай аркай, без крыві і супраціву. Калі ўжо здрадзіў Урад, аддаючы гнілую Рэспубліку на міласць і няміласць Гітлераву дзікунству, усё ж знойдуцца французы, якія сваімі жыццямі і крывёю абароняць нацыянальны гонар. Няважна, колькі іх будзе, тры ці сто тры; колькі б іх ні было, яны не здолеюць спыніць войска, але аднойчы ля падножжа Трыумфальнай аркі будзе вісець медная таблічка з іх імёнамі. «Яны

баранілі Францыю, пакуль свет спаў сном праведніка», так будзе на ёй напісана, думаў Джавані, гатовы дадаць сваё імя да імёнаў будучых герояў.

Ён бег з усіх ног па Елісейскіх Палях і паспеў прыбегчы да аркі раней за вайсковы строй. Але там, апрача нямецкіх афіцэраў, якія раз-пораз паглядалі на свае гадзіннікі, і ісламскіх саноўнікаў з ахмедыямі і цюрбанамі на галовах каля самога манумента не было нікога. За пяцьдзясят метраў ад аркі стаялі двое хлапцоў і дзяўчына з доўгімі светлымі валасамі. Яна плакала, горка і несуцешна, быццам яна адна ў кіназалі і глядзіць нейкі вельмі смутны фільм, у якім Грэта Гарба памірае ў ложку з балдахінам, а тыя двое стаялі, сунуўшы рукі ў кішэні, і не спрабавалі яе суцешыць. Які-небудзь афіцэр мог бы падысці і спытацца, чаму яна плача ў такі дзень, думаў Джавані, і тады іх траіх затрымаюць. І гэта ўжо хоць нейкі пратэст. Аднак дзяўчына плакала, ніхто не падыходзіў, чуліся крокі тысяч салдацкіх ботаў, якія адначасова ўзнімаліся і апускаліся на асфальт. Без дысанансу, арытміі і пабочных гукаў, якія парушылі б той адзіны вялікі, да Напалеонавай аркі набліжалася нямецкае войска.

Апрача заплаканай дзяўчыны і яе сяброў, толькі Джавані Сікірыч успрыняў тое відовішча як удар у душу, у надзьмутыя мяхі ў грудзях, па якіх Гітлеравы войскі б'юць салдацкім ботам, як Івіца Бэк, заграбскі майстар дрыблінгу, пару гадоў перад тым біў па футбольным мячы на парыжскіх стадыёнах і пляцоўках. Ён любіў Івіцу Бэка, бо і той прыехаў больш-менш у адным часе з Джавані шукаць ратунку ў больш элегантным свеце.

Калі яна кінецца насустрач войску, кінуся і я! сціскаў ён спацелыя кулакі, гледзячы на сцягі з загнутымі крыжамі і на бясконцы строй за імі, але калі яны ўжо былі за пяцьдзясят метраў ад Трыумфальнай Аркі і за гэтулькі ж ад чацвярых гледачоў, яны раптам змянілі кірунак і замест таго, каб накіравацца пад арку, прайшлі збоку ад яе.

Такім чынам, пра што збольшага было замоўчана ў гістарычных кнігах і пра што не ведаў і Ўінстан Чэрчыль, калі пісаў свае мемуары, нямецкае камандаванне, магчыма, вырашыла не прыніжаць французаў або прынамсі не раздражняць іх без патрэбы, прызнаючы, што паміж імі і палякамі ці чэхамі існуе істотная розніца. Та-

кая самая розніца, якая існуе паміж Варшавай і Парыжам. У нейкім сэнсе нацысты глядзелі на гэты горад тымі самымі вачыма, што і Джавані Сікірыч.

Замест таго, каб сваім гераічным учынкам увайсці ў гісторыю і разам з незнаёмай дзяўчынай стаць часткай міфа, пра які будуць пісаць кнігі, ставіць у тэатрах спектаклі і здымаць фільмы, а іх імёнамі называць вуліцы й школы, Джавані дазволіў часткам вермахта прайсці каля Напалеонавай аркі і злы ад сораму, быццам нехта мог падумаць, што ён прыйшоў вітаць акупантаў, прапусціў урачыстае пастраенне і прамову нямецкага афіцэра, які абвясціў парыжанам, што яны прыйшлі не дзеля таго, каб скарыць Францыю, што ён і ягоныя войскі тут часова, у якасці абаронцаў еўрапейскай культуры ад варвараў. Джавані пайшоў у кавярню, дзе развітваўся з Трайчэ Багоевым, каб знайсці сваю залікоўку і кашалёк, але кавярня была зачыненая. Наступных пяць дзён ён будзе прыходзіць туды кожнай раніцы, і толькі на шосты дзень, калі ціхі пратэст супраць акупацыі больш не меў ніякага сэнсу, кавярня нарэшце запрацавала. Людзі чыталі газеты, сядзелі і размаўлялі, тыя самыя твары, тыя самыя афіцыянты і распарадчык залы. Аднак залікоўкі і кашалька не было. Відавочна, яны не выпалі ў яго з кішэні, калі ён надзяваў пінжак. Нехта іх скраў, хутчэй за ўсё Трайчэ, каб яму дзеля нечага напаскудзіць. Ён доўга думаў, нашто балгарыну ягоныя рэчы, і нічога іншага яму не прыходзіла ў галаву, апрача як, што гэта была дыверсія супраць таго, хто вырашыў застацца ў горадзе нягледзячы на прыход акупантаў. Трайчэ Багоеў, калі перажыве вайну, некалі будзе расказваць унукам пра свой геройскі ўчынак.

Самотны і абдураны гісторыяй і студэнцкім калегам, стаяў Джавані Сікірыч пасярод парыжскай авеню і не ведаў, куды падацца. У ім бушавала ўсё тое, што зрушвала і спыняла, матывавала і прыгнятала, запальвала і замарожвала ўсё ягонае пакаленне. Быў 1940 год, калі гарэла палова Еўропы, але вайна яшчэ не напоўніла людскія сэрцы і не накрыла сабою ўсе газетныя старонкі. У сакавіку падпісанае замірэнне паміж Фінляндыяй і Расіяй, праз некалькі месяцаў у папулярныя слоўнікі ўвайшоў наватвор «бліцкрыг», пяцігадовы тыбецец Лхама Тхондуп стаў трынаццатым Далай-ла-

мам з святым імем Тэнцзін Г'ямцхо, у Рыме адкрыты Palazzo della civiltà del lavoro, а аўстраліец Хаўард Флоры і немец Эрнст Хаін удасканалілі пеніцылін, і ў Злучаных Штатах пачалася яго масавая вытворчасць. Джавані разважаў, у які бок яму падацца.

Дакладна праз год, вясною 1941-га, яго старэйшы брат Джузэпэ Сікірыч фіктыўнай здзелкай споўніў жыццёвую мару і займеў уласную карчму. Палову жыцця ён працаваў афіцыянтам у вакзальных рэстаранах і корчмах уздоўж вузкакалейкі Дуброўнік-Мостар-Сараева, прайшоўшы Трэбіне, Коніц, Ябланіцу, Хаджычы, Блажуй і назад ад станцыі да станцыі, ад шынка да шынка, жывучы без дома і хатняга спакою, начуючы ў складах і на састаўленых карчомных сталах, паміж бочкамі з віном і ракіяй, мяхамі з мукой і пакункамі кантрабанднага тытуню.

За свой афіцыянцкі век Джузэпэ нацярпеўся больш, чым Напалеонаў адмірал за дзесяць войнаў: у 1929-м ён ад п'янага солунскага ветэрана атрымаў штыхом між рэбраў. На шчасце, пасля выпітай пляшкі ракіі той здолеў засадзіць штых толькі да паловы. Праз некалькі гадоў у масавай бойцы, якая выбухнула ў вакзальным шынку ў Коніцы пасля нейкага пахавання, яму ні за што ні пра што загналі нож у жывот; увосень 1934-га яго збіла жандармерыя, бо з кавярні чулася песня, а якраз была жалоба па каралю Аляксандру, пасля чаго ён тры дні адседзеў за кратамі; у красавіку 1941-га ў Чапліне унтэр-афіцэр каралеўскага войска прыставіў яму рэвальвер да скроні і рыкнуў: *Сяры, сволач здрадніцкая! Калі не абсерашся, размажу твае мазгі па падлозе!*

І што тут Джузэпэ заставалася рабіць: ён пяўся, аж яму жылы на лбе выскачылі, пачырванеў, як памідор, уся карчма смяялася і падахвочвала, нехта яго, але бальшыня унтэр-афіцэра, каб не чакаў столькі, а адразу страляў, бо загад не выкананы неадкладна. Гаўно, на шчасце, нарэшце палезла, і Джузэпэ і з гэтай бяды выбраўся жывы.

Але праз месяц удача яму нарэшце ўсміхнулася. Уладальнік найбольшай карчмы ў Гацку і ваколіцах Мілаш Давідавіч – у якога ён уладзіўся працаваць, калі пакінуў Чапліну, зразумеўшы, што ў мястэчку ніколі не забудуць, як афіцыянт насраў у штаны, дый га-

спадар не меў жадання яго затрымліваць, бо быў перакананы, што гэтак скампраметаваны афіцыянт будзе адпужваць кліентаў – адноўчы ўвечары запрасіў яго да сябе дадому, пасадзіў за стол, наліў сабе і Джузэпэ ракіі і сказаў: *Сітуацыя, выбачай за слова, гаўняная. Тут цяпер Харватыя, а я, выбачай, праваслаўны, і не будзем хлусіць, у гэтай дзяржаве для праваслаўных месца няма. Гэта ясна мне, ясна і табе. Гэты дом у мяне яшчэ ад дзеда, гэтая карчма таксама ад дзеда. У мяне б сэрца спынілася, калі б нехта мне дзедавіну спаліў, а я не доўбня, каб чакаць на дзедавіне, пакуль мяне зарэжуць усташы. Дык я сабе падумаў так: я перапісаў бы на цябе і дом, і карчму. Насамрэч, я б табе іх прадаў. Зробім дамову, дзе будзе напісана, што ты заплаціў мне тысячу дукатаў і што гэта ўсё тваё. Улада, спадзяюся, прызнае гэтую дамову, бо ты каталік. Але я таксама спадзяюся, што гэтая дзяржава доўга не пражыве. Як яна ўзнікла, гэтак і прападзе. Зашмат яна сабе нарабіла ворагаў, знойдзецца нямала такіх, хто б хацеў яе разбурыць. Ты, можа, думаеш іначай. Хай сабе! Кожны мае права думаць, што хоча. Я думаю так, а ты як сабе хочаш. Я б у гэта не ўлазіў. Дык вось, але глядзі які ў нас будзе супольны разлік: дамова будзе законная, пакуль будзе Харватыя. Калі Харватыі больш не будзе, дамова страціць сілу, бо тыя, хто прыйдзе, не прызнаюць гандаль на дукаты. Не прызнаюць гандаль, які быў гэтак праведзены. Тады ты мне вернеш дзедавіну, а я буду табе ўдзячны да гроба. Вазьму цябе назад афіцыянтам, калі не заробіш дастаткова, каб адчыніць сваю карчму. І ва ўсім буду табе дапамагаць. Калі не мая праўда і калі дзяржава гэтая мяне перажыве або калі мяне ўсё ж заб'юць, усё назаўсёды застанецца тваё. Толькі не дазволю, каб мне спалілі дзедавіну. Вось, я сваё слова сказаў, а ты цяпер скажы сваё.*

Джузэпэ ледзь стрымліваўся, каб не заскакаць ад шчасця і не расцалаваць гаспадара Мілаша ў абедзве шчакі і яшчэ раз. Вялікага напружання і намагання каштавала яму, каб заклапочана пацмокаць языком, кіўнуць галавою і павярнуць далоні ўгару, паказваючы тымі дзіўнымі жэстамі, у якія даўно ніхто не верыць, што бяда тут ня толькі Мілашава, а наша супольная, і ніхто не можа быць шчаслівы, пакуль у іншага жыццё пад пагрозай і тлеюць падмуркі яго дзедавіны.

У той самы вечар дамова была напісаная і падпісаная. Ужо назаўтра Мілаш Давідавіч з жонкай і дзецьмі пакінулі Гацка, а Джузэпэ Сікірыч, старэйшы Рэгінін брат, сямейны недарэка і сорам прыстойнага гарадскога роду, нарэшце зрабіўся гаспадаром. На сцяне, дзе да вайны вісела рэпрадукцыя Прэдзічавай «Косаўскай дзяўчыны»*, ён павесіў у залатой рамцы партрэт Антэ Павэліча ў адміральскім мундзіры, дзе той углядаецца ўдалечыню. Партрэт ён замовіў у Сараеве і занёс расфарбаваць да Пубы Вайса. Пуба з вялікім стараннем і асцярожнасцю падрумяніў Правадыру шчокі і надаў вачам сіняга нюансу. Зрабіць гэта было нялёгка, бо на чорнабелай фатаграфіі Павэлічавы вочы былі чарнейшыя за банавіцкі вугаль, і дарэмна Пуба Вайс запэўніваў замоўцу, што ніяк нельга Правадыру зрабіць сінія вочы. Джузэпэ настойваў на сініх, перакананы, што Пуба кажа так, бо ён яўрэй і што яму толькі дзеля гэтага няясна, чаму вочы Антэ Павэліча мусяць быць сінія, як Адрыятычнае мора і найчысцейшае летняе неба над Герцагавінай.

Але Джузэпэ будзе шкада, калі ўвосень таго самага года будзе зруйнаваная адзіная ў Гацку фотамайстэрня, а Пуба скончыць жыццё ў нейкай пячоры па дарозе ў Нявесіне. Той раніцай ён будзе сядзець у карчме сам, глядзець на партрэт Правадыра, румяныя шчокі маладой жнейкі і сінія вочы святога заступніка, апошнюю Пубаву працу, і спрабаваць зразумець, што ж такое робіцца з гэтым светам і што за д'ябал усяліўся ў людзей, каб загінуў чалавек, які здолеў зрабіць Правадыра прыгажэйшым, чым маглі сабе ўявіць тыя, што завялі Пубу ў пячору. Але думка Джузэпэ будзе кароткая. Ён адгоніць яе, кажучы сабе, што ён недастаткова разумны, каб разбірацца ў сусветнай палітыцы. Інакш сядзеў бы ў Заграбе, Берліне ці Лондане і вырашаў лёсы народаў. Ягоная мера – гэтая карчма, і ён не можа дазволіць сваёй думцы выпырхнуць за дзверы карчмы і паляцець далей, туды, дзе вырашаюцца вялікія справы. Апрача таго, што Бог яго не стварыў для гэтага, дык гэта яшчэ і непажадана. Бо лёгка можна загубіць галаву. Пуба Вайс не пакрыўдзіўся б на яго за тое, што ён беражэ сваю галаву. Не пакрыўдзіўся б і Джузэпэ, калі б выпадкова ўсё было наадварот і каб яго, не дай Божа, як яўрэя завялі ў пячору.

Да новага гаспадара жыхары Гацка, незалежна ад веры і статусу, ставіліся як да наіўнага боўдзілы. Лічылася, што карчма і належыць і не належыць яму, і ўсім, у тым ліку ўсташам, было ясна, чаму Мілаш Давідавіч перапісаў на афіцыянта сваю маёмасць. Пэўная нязгода існавала толькі наконт дукатаў. Бальшыня была той думкі, што ніякімі дукатамі тут і не пахла, але былі і такія, хто верыў, што серб ад'ехаў пабагацеўшы і што ў гэтага ёлупа напэўна і яшчэ якая тысяча засталася, калі ў яго знайшлася тысяча заплаціць Мілашу за дом і карчму. Адных няшчасны Джузэпэ запэўніваў, што дукаты атрымаў у спадчыну ад дзядзькі з Амерыкі і сумленна заплаціў за тое, што цяпер ягонае, а другіх, пераважна мясцовых усташаў, якія якраз у гэта верылі, спрабаваў пераканаць у нечым іншым. Ён і сам, праўду кажучы, не ведаў, у чым. Ён усміхаўся, махаў рукою, маляваў пальцам кругі над галавою, рабіў намёкі на адрас праваслаўных і васковай свечкі, якая доўга гарэла, але, як вядома, аднойчы дагарыць. Упарта намагаўся ён растлумачыць усташам, што насамрэч ён бядняк, а карчма і дом – гэта цуд. Прыблізна як стварэнне незалежнай дзяржавы. Яны не верылі, што б ён ім ні казаў, але ягоная хлусня неяк наклалася на атмасферу смутных часоў і нібыта ўсім была прымальнай. Тым, хто ішоў па зло, бо не ставіла іхнюю злосць пад пытанне, і тым, хто думаў добрае, бо яны верылі, што кожнае зло – дурасць накшталт Джузэпавай.

Першы год свайго гаспадарання ён пражыў раздзіраны дзвюма ўнутранымі сіламі. З раніцы, як толькі ўвойдзе ў карчму, ён адчуваў палымянае і бязмежнае шчасце, бо ён сам сабе гаспадар, а не чужы слуга, бядак і прыблуда. Гледзячы на чыстыя пустыя шклянкі і поўныя бутэлькі і бочкі, ён складаў рукі і хваліў Бога, дзе б той ні быў і як бы ні зваўся, і Правадыра, без якога і Божая воля не можа быць споўненая. Без яго надзвычайнага чыну Джузэпэ да канца жыцця застаўся б афіцыянтам і не ведаў бы нават, як прыемна мець вялікія гаспадаровы клопаты замест малых афіцыянтавых. Замест таго, каб замірацъ ад страху, калі забудзешся, ці сотнік Зоўка п'е лазовіцу або слівовіцу і ці гаспадар Хамзіч аплаціў свой месячны рахунак або трэба было яму нагадаць, цяпер цябе хвалюе, ці віно з Канаўлаў прыйдзе ў чацвер або ў панядзелак або ці лясныя бан-

ды напалі на воз з сырам, які меўся прыйсці з Траўніка, зарэзалі давозніка і забралі ўжо аплачаны тавар.

Калі чалавек сам сабе гаспадар, то ніводная страта, ніводная нястача ў касе для яго не завялікая. Так думаў і кожнай раніцы радаваўся Джузэпэ Сікірыч. Але калі на працягу дня праз карчму праходзілі розныя людзі і строілі розныя жарты на ягоны адрас, найчасцей у сувязі з тысяччу дукатаў, якімі ён заплаціў за сваё гаспадаранне, ён усё больш пахмурнеў, а вечар сустракаў ужо ў смяротным страху. Не можа быць так, як здаецца, бо ніколі такога не бывала, колькі свет стаіць і жывуць у ім людзі; не здабываецца так багацце і не можа быць, каб абсалютна нічым не плацілася за тое, што ты быў найгоршым, а цяпер найлепшы ў горадзе і наваколлі. А чым бы ён мог плаціць, як не дукатамі? Гэтае пытанне мучыла яго, пакуль ён не засынаў і ў сне не забываўся пра страшныя адказы. А раніцай прачынаўся шчаслівы, як дзіця, якому дадзена з кожным новым днём пачынаць жыццё спачатку.

У той самы дзень, калі Джузэпэ пераняў карчму, ён узяў на службу двух новых афіцыянтаў, бо Сава Экмэк, маўклівы маладзён, з якім Джузэпэ дзяліў працоўныя змены і які ў гаспадара Мілаша працаваў ад таго дня, калі той падабраў яго на вуліцы дзесяцігадовым сіратою, знік у тую самую раніцу, што і сям'я Давідавіча. Джузэпэ ўзяў двух першых-лепшых, што яму трапіліся. Нейкага Хаму Алічыча, абармота і дзівака з Фазлагічавай Кулы, і Ёсу Дамазэта, былога шэфа вакзальнага рэстарана ў Ябланіцы. Хама ніколі раней не працаваў афіцыянтам, а Ёса за паўгода да таго атрымаў мазгавы ўдар, таму цягаў левую нагу і слаба памятаў замовы. Але абодва адпавядалі адзінаму крытэрыю, які для Джузэпэ быў важны. У мястэчку іх паважалі яшчэ менш, чым яго, да таго ж ён верыў, што афіцыянты не павінны пераважаць яго розумам. І можна было сказаць, што яны не падманулі яго чаканняў; толькі яны двое з усіх людзей, хто калі зайшоў у карчму, былі абсалютна абыякавыя да пытання, ці сапраўды гаспадар Джузэпэ заплаціў гаспадару Мілашу тысячу дукатаў. Як бы дрэнна яны ні працавалі, а Хама быў яшчэ й горшы за Ёсу, так, што не праходзіла дня, каб у касе не з'явілася нястача, і Джузэпэ быў задаволены, бо адчуваў, што ягоныя людзі бачаць

у ім менавіта тое, што ён хацеў бачыць сам у сабе. Чалавека, які дасягнуў у жыцці поспеху і ад гэтага поспеху ніхто ні крышачкі не можа адняць. Пры гэтым трэба прызнаць, што ў яго добрае сэрца і што ў кожным чалавеку ён шукае толькі самае важнае: ці ён сумленны і прыстойны. Калі так, тады няма ніякіх праблем. Тады для гаспадара Джузэпэ такі чалавек аднолькава варты павагі, як той, чый румяны сінявокі партрэт ён кожнай раніцы абцірае рукавом, каб на ім не збіраўся пыл і бруд страшнага часу, у якім мы жывем.

Аднойчы раніцай летам 1942-га, калі Джузэпэ прыводзіў Правадыра да ладу на новы дзень, усяго за дваццаць кіламетраў, у адной вёсачцы каля Нявесіня Джавані тройчы перажагнаўся перад іконкай святога Панцеляймона, якая дзівам ацалела ў доме, дзе за дзень да таго згарэла ўсё астатняе, мёртвае і жывое.

У той момант браты былі найбліжэй адзін да аднаго за апошнія дзесяць гадоў; вядома ж, толькі з гледзішча геаграфічных адлегласцяў, бо ва ўсякім іншым сэнсе яны былі далейшыя адзін ад аднаго, чым згубленыя браты ў нейкай казцы, далейшыя нават чым людзі, якія аднойчы сустрэліся на момант і рассталіся назаўсёды. Яны ні разу не прыгадалі адзін пра аднаго ад таго часу, калі кожны сам па сабе і з сваіх прычын зразумеў, што сямейныя повязі значаць для іх мала або і зусім нічога і што чалавек застаецца сам, калі ён у нечым выключны. А выключныя ў родзе Сікірычаў былі і Джузэпэ, і Джавані: старэйшы брат вызначаўся млявасцю розуму, якую яшчэ называюць дурасцю, і сялянскай душою, якую ён на бацькоўскі жах атрымаў у спадчыну хто ведае ад якога прадзеда, тым часам як малодшы быў выключны тым, што пра бацьку і маці, братоў Луку і Бэпу, і асабліва пра сястру Рэгіну думаў дакладна тое, што ўсе яны думалі пра Джузэпуэ. Па сутнасці, з падобных прычынаў, якія старэйшага брата змусілі пайсці працаваць афіцыянтам у чыгуначных корчмах і ніколі не вярнуцца дадому, малодшы адмовіўся ад спадчыны і паехаў у Парыж. Ён верыў, што едзе назаўсёды, а так бы яно і было, калі б камандаванне нямецкага войска не прыняло рашэння правесці марш міма Напалеонавай аркі або калі б знайшлося хоць бы яшчэ некалькі парыжанаў, якія б з Джавані, заплаканай дзяўчынай і двума яе сябрамі баранілі горад. А так ён, да нядаўняга адступнік

ад усякай веры, скептык і бязбожнік, апынуўся ў герцагавінскай глухмені перад іконкай праваслаўнага святога, цвёрда ўпэўнены ў цудзе. Ён жагнаўся перад попелам нейчага дома, над асмаленымі целамі яго жыхароў, спаленай калыскай, у якой, магчыма, было немаўля, ад якога не засталося нічога, і над народам, які адзіны спрабаваў захаваць гонар, свой і еўрапейскі, і гонар тых людзей, якія за шчыльна замкнутымі брамамі і вокнамі па французскіх і іншых сталіцах і гарадах чакалі, пакуль вайна скончыцца сама па сабе.

Дзіўны быў шлях, які студэнта Джавані Сікірыча давёў да іконкі святога Панцеляймона. Год бадзяўся ён па акупаваным Парыжы і харчаваўся ў грамадскіх сталоўках, нават у яўрэйскай, якую астатнія гаротнікі пазбягалі ў страху, што нехта палічыць іх расавымі адкідамі. Ён трымаўся разам з тымі нешматлікімі замежнікамі, якія засталіся ў Парыжы і наважваліся казаць нешта супраць калабарацыянісцкіх уладаў. Бальшыня Джаваніевых знаёмых і былых сяброў бегла ад яго і ягоных словаў, як ад чумы. Людзі баяліся шпіёнаў і правакатараў або ім і ў галаву не прыходзіла ваяваць супраць вялікай нямецкай моцы. Выключэнне складалі некалькі сербскіх студэнтаў, дробных прамыслоўцаў, былых камуністаў і трацкістаў, пераважна з Бялграда і Босніі, што збіраліся ў карчме «Хіландар», якую ў паўднёвым прадмесці трымаў адзін грэк. У «Хіландары» былы сакратар каралеўскага пасольства ў Парыжы Ёакім Радак запрасіў Джавані паехаць з ім, калі той разлавана расказаў яму, як нацысты праходзілі міма плошчы Пігаль.

Куды? спытаўся Джавані.

Туды, дзе людзі больш цэняць гонар, чым падэшву на швабскім боце, з пафасам адказаў Радак.

Яшчэ ўчора Джавані рассмяяўся б такім словам, махнуў рукой і пайшоў сваёй дарогай. Але, магчыма, той факт, што ён не ведаў, што яму рабіць і куды падацца, паўплываў на тое, што ён зразумеў Радака сур'ёзна і што яму нават спадабаліся ягоныя словы.

Праз тры тыдні ён быў ужо на гары Еліцы, глыбока ў Сербіі, за ўсімі ўсходнімі межамі, да якіх дасягала ягоная свядомасць. Ён сядзеў за грубым дубовым сталом, твар у твар з палкоўнікам Драгалюбам Міхаілавічам, у хаце былі толькі яны двое, а над гарою ша-

лела летняя бура. Палкоўнік міргаў за круглымі акулярамі мірнага яўрэйскага гандляра і прыязна ўсміхаўся, калі Джавані падскокваў, бо недзе блізка грымеў гром. Усё жыццё ён панічна баяўся навальніцы, а цяпер, вось, дажыў да таго, што перад правадыром адзінага руху супраціву ў зняволенай Еўропе дрыжыць і абліваецца халодным потам. Замест таго, каб плюнуць і прагнаць баязліўца, як, на думку Джавані, зрабіў бы кожны салдат на свеце, палкоўнік спрабаваў яго супакоіць.

Кожны чалавек палохаецца. Толькі дурань нічога не баіцца. Нехта палохаецца павукоў, або каб не ўбрыкнуў конь, а вы, вось, баіцеся навальніцы, казаў ён. Пасля ён расказваў, як Парыж выглядаў у дваццаць нейкім годзе, калі ён як курсант вайсковай акадэміі быў там з экскурсіяй. Гаварыў пра сонца, якое неяк асабліва адбівалася ў аконных шыбах і разлівалася па ходніку, *пад нашымі нагамі, якія ўсё яшчэ не адвыклі ад вастраносых пасталоў і ніколі па тых вуліцах не будуць хадзіць з мерай у кроку.* Ён гаварыў пра гукі катрынкі і акардэона, якія нічым не менш манатонныя за гукі нашых гусляў, але гэтая іх манатоннасць культурная і высакародная.

Мы сваю крывавую гісторыю апяваем, нібы дровы пілуем, а французы з сваёй не менш крывавай гісторыі стварылі прыгажосць. Таму французы выжываюць ва ўсякай сваёй паразе, а мы з кожнай паразы выходзім усё большым гаўном, казаў пасярод летняй буры ў хаціне на гары Еліцы палкоўнік Драгалюб Міхаілавіч.

Джавані тады бачыў у ім бога. Першага ў жыцці. Або прынамсі анёла-заступніка. Калі Парыж быў ягоным Ерусалімам, дык дзядзька Дража быў тым, каго ў тым Ерусаліме не хапала. Калі б ён там быў, дык і Францыя не здалася б, і французы не баранілі б свой гонар драўлянымі жалюзі на вокнах. Сапсавалася нацыя, як псуюцца вяршкі.

Ужо назаўтра ён меў на сабе англійскую пяхотную ўніформу і фуражку з кукардай. Ён быў цяпер сярод соцень змагароў верных каралю і айчыне, якія паводле традыцыі з часоў, калі Сербія адраджалася на захад ад Дрыны, між сабою звaліся чэтнікамі. Палкоўніку спярша гэтае слова прыйшлося не даспадобы. Яму было патрэбнае войска, а не фальклор з гайдукамі, але неўзабаве ён зразумеў, што

няма ніякай карысці ад таго, чаму ён вучыўся ў акадэміі і штó ён да вайны, насуперак шапказакіданскаму культу ветэранаў Солуні, дзеля якога красавіцкая параза* і была такая страшная, спрабаваў праводзіць, куды б яго ні пасылалі служыць. Апрача таго, варта было ўжо толькі кінуць вокам на батальён, у якім апынуўся Джавані, каб разумны чалавек убачыў сапраўдную розніцу паміж чэтніцтвам і войскам.

Былі тут і непісьменныя шумадзійскія сяляне, якія ніколі не трымалі ў руках зброі, бо ў 1915 годзе няўзброеныя адступілі праз Албанію, а праз тры гады, гэткія ж няўзброеныя, штурмавалі ўжо пакінутыя швабамі пазіцыі. Былі афіцэры і унтэр-афіцэры запасу, якія, што праўда, прайшлі нейкае навучанне, але замест вайсковых навукаў, навучыліся толькі грубаму абыходжанню з слабейшымі за сябе. Была тут і дзятва з прыстойных бялградскіх сем'яў, кожны з іх прыбыў з двума валізамі, куды іхнія мамы напакавалі шаўковыя піжамы і споднюю бялізну. Быў і розны гарадскі зброд, кантрабандысты, махляры, а можа і забойцы, якія, уцякаючы ад жандармерыі, трапілі ў шэрагі змагароў за караля і айчыну. Было некалькі славенцаў і харватаў, жалю вартых ідэалістаў, якія верылі ў тую самую ідэю, якой трымаўся палкоўнік. У Югаславію, каралеўства раўнапраўных славянскіх плямёнаў, у адзіны народ, злучаны супольным паходжаннем і супольнай крывавай гісторыяй, у такую Югаславію, дзе будзе існаваць адзіная вера і адзіная надзея – на сябе і на сваё паходжанне – і дзе духоўная і палітычная апора не будзе шукацца ні ў Ватыкане, ні ў Нямеччыне, ні ў Расіі.

Аднак праблема была ў тым, што ў нешта такое не верыў ніхто, апрача Палкоўніка і тых некалькіх энтузіястаў. Нават тыя шумадзійскія сяляне і сербскія ўцекачы з усходняй Герцагавіны, якія толькі чакалі нагоды па-геройску загінуць, бо ім над іх спаленымі хатамі нічога іншага ў галаву не прыходзіла. Нават такія Палкоўнікаву веру не ўспрымалі сур'ёзна! Яны думалі, што тут гаворка пра ваенную стратэгію, а сапраўдная мэта ў нечым іншым. У чым? Гэта ведаюць мудрыя галовы ў Лондане, разумнікі вакол маладога караля Пэтра*.

Джавані ў такой кампаніі ў глыбіні сербскага краю адчуваў

сябе зусім страчаным. Ён не мог звыкнуцца з Палкоўнікавымі ўяўленнямі пра дзяржаву і народ, дый не хілілася ягонае сэрца да ніводнага з югаслаўскіх плямёнаў. Яму муляла прыніжэнне перад Напалеонаўскай аркай і тая мусульманская погань у чорных гарнітурах, якая беспакарана пройдзе праз гісторыю, бо не належыць ніводнаму з двух варожых бакоў, ні таму, які растаптаў Парыж, ні таму, які быў растаптаны.

Сяляне, якія ў ржавых бляшаных біклажках трымаюць ракію дошкавіцу і сварацца наконт таго, ці дапаможа рускі брату сербу або ці пашле англічанін дзядзьку Дражу танкі, былі ад Джавані гэткія ж далёкія, як і тыя, дзеля каго ён выракся сямейнай спадчыны і вырашыў зрабіцца парыжанінам. Гэтыя людзі, думаў ён, падобныя да ягоных братоў і суседзяў, толькі што бруднейшыя і вечна смярдзяць цыбуляй і быдлячым гноем і гатовыя ўмомант памерці, калі Палкоўнік скажа ім, што прыйшла пара паміраць. Іх смурод перастаў яму замінаць, калі ён зразумеў тое другое. Ёсць нейкае эратычнае ўзбуджэнне ў сустрэчы з людзьмі, якія не лічаць свае жыцці больш вартымі за свабоду, што б гэтае слова ні значыла. Кожны з іх – гэта адна малая геройская смерць, і як целы каханкаў пахнуць потам, так і героі з гары Еліца пахлі цыбуляй, гноем і ракіяй дошкавіцай. Гэта быў пах ахвяры за айчыну. Вялікія рэчы не пахнуць прыемна, зразумеў Джавані.

З атрадам паручніка Лазара Кабілавіча ён перайшоў Дрыну і праз Калінавік спусціўся ва ўсходнюю Герцагавіну. Дзядзька Дража паслаў іх не ваяваць, помсціць або рыхтаваць дыверсіі на чыгункі і дарогах, па якіх рухаліся італьянскія і нямецкія войскі. Місія Кабілавічавага атрада была важнейшая, можа і вырашальная для лёсу раўнагорскага руху: прапаганда і пашырэнне ідэі змагання супраць акупантаў сярод паўсталых сербскіх сялянаў і бандыцкіх групаў, якія намножыліся на тэрыторыі пад усташаўскай уладай і пры гэтым не былі ні пад камандаваннем Югаслаўскай каралеўскай арміі ў айчыне, ні ў падпарадкаванні Вярхоўнага штаба партызанскіх войскаў. Здабыць гэтых людзей Палкоўніку было важна з дзвюх прычынаў: дзеля мацнейшай пазіцыі ў магчымых перамовах з Цітам наконт аб'яднання пад супольным камандаван-

нем, а таксама каб з большымі аргументамі патрабаваць дапамогі ў англічанаў, да якіх ужо дайшлі чуткі, што чэтнікі не змагаюцца з немцамі, а займаюцца выключна акцыямі адплаты супраць мусульманскага і каталіцкага насельніцтва. Гэтыя чуткі былі праўдзівыя, што Палкоўніка сур'ёзна непакоіла, асабліва таму, што яму было цяжка пераканаць англічанаў, што ў акцыях адплаты ўдзельнічаюць атрады, якія застаюцца па-за ягоным кантролем.

Але па дарозе да Нявесіня, крайняга заходняга пункта, да якога дойдзе Кабілавічаў атрад, мэты місіі змяніліся. Праходзячы праз спаленыя і выразаныя сёлы, сустракаючы ўзброеных адчайнікаў, у якіх на шапках былі самыя розныя знакі, якія толькі можна было сабе ўявіць, паручнік Лазар, як і ўсе ягоныя трыццаць чалавек, прыйшоў да высновы, што паміж тым, што адбываецца ў Герцагавіне, і тым, як дзядзька Дража ўяўляе сабе будучую дзяржаву, няма нічога агульнага. За размовы пра адзіны народ розных плямёнаў і пра Югаславію як парламентарную манархію можна было страціць жыццё. Але Лазару было важней тое, што апрача жыцця быў бы страчаны і гонар. Немагчыма быць братам ворагу, немагчыма будаваць дом з тым, хто цябе зарэжа. Гэта час, калі чалавек мае толькі адзін выбар: або памерці або забіць свайго забойцу. Вечарам напярэдадні таго дня, калі Джавані Сікірыч тройчы пражагнаецца перад цудатворнай іконкай святога Панцеляймона, Лазар Кабілавіч паклікаў яго да сябе.

Ты добры чалавек, але не серб, сказаў ён, *а гэта не вайна з апавяданняў дзядзькі Дражы. Няма тут ні Югаславіі, ні караля Пэтра, ні братоў трох вераў. Гэта, сынку, пякельны кацёл, у ім варымся ўсе мы, а выйдуць з яго толькі адны. Або яны па нашых галовах, або мы па іхніх. Няма літасці, пакуль ідзе разня. Літасць, мой Джавані, прыходзіць з мірам. Тады будзем мы прабачаць, і нам будзе прабачана. Вось што я табе хацеў сказаць. А ты ўжо глядзі сам! У гэты мех я табе паклаў палову праснака, сала і сыру, колькі было. І рэвальвер, каб бараніцца, калі на цябе нападуць. Тут табе і цывільная вопратка. Нічога табе болей не буду казаць, а ты мне цяпер нічога не адказвай, а глядзі сам, як табе лепш. Кожная птушка шукае сваёй чарады, і добра, што яно так. Буду ведаць, што на*

другім баку ёсць нехта, пра каго я магу сказаць, што гэта чалавек. І застанешся ты мне як брат.

Джавані слухаў паручніка, і сэрца яму ўзнімалася пад горла. Ён адкрыў рот, каб нешта сказаць, але той схапіў яго за руку: *Маўчы, і не прадай гонар за дробны грош. Падумай да раніцы што і як, і ведай, што табе прабачана.*

У тую ноч Джавані Сікірыч спакойна спаў, не думаючы пра тое, што сказаў яму Лазар Кабілавіч. Раніцай яны расцалаваліся, вочы ў паручніка былі поўныя слёз. *Браце Ёване, твая кроў ад сёння мая кроў,* сказаў ён.

Так у дзень святога Панцеляймона пачалася пагібель аднаго парыжскага студэнта, самага разумнага і вытанчанага Рэгініна брата, які ад роднага горада – або далёкага невядомага продка – пераняў арыстакратычную пагарду да некультурнасці галоты і брыдкасці плебсу. Ад таго дня ўсе, хто пабачыць яго жывога, будуць зваць яго Ёванам.

Увосень таго 1942 года партызаны ўцякалі з Герцагавіны паточаныя здрадай, а Павэліч, спрабуючы здабыць мяжу на Дрыне, пакінуў паўднёвы камяністы бераг італьянскаму брызу – калі мора іхняе, хай тады самі б'юцца і за скалы – і так усташаўскія сілы без ніякага супраціву адступілі перад чэтнікамі і пакінулі мясцоваму, пераважна мусульманскаму насельніцтву клопат аб Хумскім краі. Пячоры, якія ўжо да паловы былі напоўненыя праваслаўнымі людзьмі, цяпер з ночы ў ноч папаўняліся мусульманамі і каталікамі з Попава Поля, а таксама майстрамі і рамеснікамі з чэшскімі, польскімі і аўстрыйскімі імёнамі і прозвішчамі, якія, мабыць, паводле логікі крыжа, лічыліся харватамі.

Усё гэта адбывалася хутка і нечакана. За ноч знікалі ўсташаўскія варты, гарадскія ўправы і перасоўныя палявыя суды, і калі чалавек раніцай прачынаўся, то мог пабачыць чэтнікаў з ужо ладна адрослымі бародамі, якія некуды гоняць жанчын у шараварах, старых і дзяцей, а часам і якога дарослага мужчыну, які, мабыць, занадта моцна спаў і не паспеў уцячы праз акно. Калі ты мусульманін або каталік, а кім жа ты тут яшчэ да ўчорашняга дня мог быць, ты ведаў, што так прыйдуць і па цябе. Іх адводзілі да пячоры, калі ней-

кая была паблізу, або да нейкай прорвы, калі сяло было на гары, або да нейкага завуголля, куды сяляне кідалі здохлую жывёлу. І тут пачынаўся рытуал.

Найперш выбіралі нейкага старога. Чэтніцкі афіцэр або правадыр групы, якога часта звалі ваяводам, загадваў старому скінуць шапку ці феску з галавы і ўкленчыць, пасля падыходзіў да яго са спіны. Галава ахвяры даставала яму роўна да пахвіны. Некаторыя прыціскалі сваю жылу і машну яму да патыліцы, каб адчуць страх старога турка, а іншыя проста хапалі за валасы, адцягвалі галаву назад і англійскім вайсковым нажом або кінжалам пераразалі шыю. Калі напярадзе была пячора ці прорва, тады першую ахвяру штурхалі нагой у спіну, і яна бязгучна знікала. Але калі пячоры не было, тады перад вачыма прысутных, тых, што забівалі, і тых, што будуць забітыя, пачыналася агонія. Вось жа, або сапраўды існуе нейкая тэхнічная розніца паміж тым, як зарэзаць свінню і зарэзаць чалавека, або правадыр групы быў як правіла найменш дасведчаны ў гэтай працы, але паміранне першай ахвяры звычайна цягнулася найдаўжэй. Стары качаўся па зямлі, абедзвюма рукамі спрабуючы спыніць кроў, доўга хрыпеў, душыўся і тупаў нагамі па пыле або ў нейкіх не так рэдкіх выпадках ускокваў і пачынаў бегчы, і чэтнікі мусілі адхіляцца, каб іх не абпырскалі чырвоныя струмені, рэзкія і моцныя, як з шланга, якім багатыя людзі паліваюць сад. Такі бег, аднак, быў нядоўгі. Ніколі не даўжэйшы за трыццаць метраў, калі чалавек падаў і заставаўся нерухома ляжаць. Такое паміранне было лягчэйшым, бо цягнулася карацей.

Калі была зарэзаная першая ахвяра, пачыналася галашэнне жанчын, плач, крыкі аб дапамозе і найдзіўнейшыя маленні, якія толькі можна было пачуць. Яны малілі ў імя Бога і ўсіх анёлаў, у імя суседства, сяброўства і таго, што нехта некаму ўратаваў жыццё трыццаць гадоў таму, або што нейкая з іх выкормлівала праваслаўнае дзіця, бо ў маці не было малака. Малілі шчыра, як ніколі да таго. Але ўсё было дарэмна, бо вочы людзей з нажамі ўжо былі поўныя крыві. Нельга сказаць з пэўнасцю, але, магчыма, ва ўсёй вайне і ва ўсёй Еўропе не было ахвяраў, якія б так малілі сваіх забойцаў. Можа і таму, што забойцы збольшага былі людзі, сярод якіх яны жылі і з якімі яны

віталіся, сустракаючыся на вуліцы. Нейкая з жанчын прыгадвала і тое, што ў яе прапрадзед пад прымусам патурэчыўся, але ў хаце заўсёды адзначалі Святога Міколу.

Але былі і такія, што не прасілі і малілі, а малую рэшту жыцця, што ім заставалася, скарысталі на чараванне, навядзенне сурокаў і праклёны, ад якіх стыла кроў у жылах, бо яны сягалі ў дзясятае калена і ў далёкую будучыню. Яны наклікалі хваробы, страх, сверб, паршу, начныя кашмары і ўсялякія няшчасці. Усё, што будзе здарацца з чэтнікамі, іх дзецьмі, дзецьмі іх дзяцей ад таго дня, можа патлумачыцца праклёнамі тых жанчын. Няма сэнсу разважаць пра справядлівасць і чалавечнасць або пра тое, што дзеці і ўнукі не вінаватыя за злачынствы бацькоў і дзядоў, бо тыя праклёны прамаўлялі жанчыны, якія меліся зараз памерці. Гісторыя сямейных і племянных праклёнаў старэйшая за тых, хто рэзаў і каго рэзалі, без розніцы, верыць хто ў яе або не. Яна рухае ўсім, і цалкам магчыма, што разня ва ўсходняй Герцагавіне той восені і зімы была спаўненнем нейкіх ранейшых праклёнаў, якімі праваслаўныя жанчыны да дзясятага калена праклялі сваіх мусульманскіх суседзяў. Нават калі тых праклёнаў і не было, усё адбывалася паводле іх логікі.

Мужчыны нажамі пішуць гісторыю, а жанчыны прыклікаюць яе словамі. Так было і гэтым разам, над кожнай пячорай, прорвай і падлавішчам.

Пасля таго, як мусульманскія жанчыны сваё адмоляць і выклянуць, а іх мужы, браты і бацькі, не прамовіўшы ні слова, а толькі дрыжучы і гледзячы ў зямлю, ператворацца ў статуі страху і сораму, ваявода выбера найслабейшага з сваіх чэтнікаў, скажам, таго, хто трапіў у атрад з думкай, што бацькаўшчына – гэта жытняе поле і сіняе мора, ухопіць яго за каўнер, адцягне яго да жанчыны, якая праклінала найгаласней, і суне яму ў руку нож, калі ён яго выпадкам не мае.

Гэта звычайна бывае і самым узрушальным момантам усяго відовішча, бо сустракаюцца дзве душы ў стане распадання, два жахі, якія, на першы погляд, не маюць нічога агульнага, але ў той самы момант развітваюцца з усім, чым яны былі да таго. Яна развітваецца з жыццём і шкадуе аб прамоўленых праклёнах ці аб тым, што была

найгаласнейшая і што за забойцу ёй абраны самы слабы і нерашучы з усіх забойцаў, які ў жыцці не зарэзаў і кураняці і нож у руках трымаць не ўмее, і таму яе пакуты будуць цяжэйшыя і даўжэйшыя. А ён разумее, што апынуўся на дарозе, з якой няма вяртання, што будзе рэзаць і забіваць і што больш ніколі сам для сябе не будзе тым, кім быў дагэтуль. Калі ён гэтага не зробіць, яго чакае пагарда і пазбаўленне спадчыны, сям'я ад яго адрачэцца, ён здрадзіць усяму, дзеля чаго народжаны на гэты свет, а можа і сам апынецца на месцы гэтай жанчыны і яго заб'юць родныя браты, каб паказаць, што даравання няма і не будзе да поўнага знішчэння, нашага або вашага.

І так яны нейкі час стаяць адно перад адным, жанчына і мужчына, а ўсё жывое вакол іх чакае, што адбудзецца, нехта ідзе ў заклад, а правадыр у душы палымяна жадае, каб і найслабейшы ягоны брат зрабіўся чалавекам. Гэтае чаканне заўсёды цягнецца доўга, няважна ці гэта некалькі секундаў або хвілінаў і якім чынам яно перапыняецца: так, што жанчына плюне свайму ворагу ў твар, спадзеючыся абудзіць у ім жывёлу, якая пад дзеяннем інстынкту хутка і лёгка выканае прысуд, або так, што чэтнік вырашыць спыніць уласную агонію і кінецца на яе, усадзіць ёй нож у грудзі або паспрабуе перарэзаць шыю. Гэта аднак цяжкая праца для таго, хто ніколі яе не рабіў, ці для таго, хто бачыць перад сабой чалавечыя вочы, жаночае цела, ноздры, якія ўдыхаюць і выдыхаюць паветра. Цяжкая, бо будучы забойца адчувае жыццё, якое існуе і якое не дае яму ніякай падставы яго абарваць.

Як толькі найслабейшы скрывавіць свой нож, відовішча ператвараецца ў оргію хору. Знікаюць галоўныя героі, людзі страчваюць свае імёны і твары. Кожны хапае сваю ахвяру як можа і ўмее, нейкія накінуцца на тых, каго прыгледзелі сабе ад пачатку, на дзіця, прыгожую дзяўчыну або на старога, паводле сваіх унутраных памкненняў і жарсцяў. Жарсць найчасцей не бывае ў чыстай нянавісці, а паходзіць з нечага, што неяк звязана з любоўнай жарсцю, з тым, ад чаго напінаецца мужчынская жыла. Бог яе выдумаў, каб яму самому не трэба было кожны раз зноў ствараць чалавека, а каб той гэта ўжо мог рабіць сам. А чалавек разгубіцца, забудзецца пра сваю меру і кірунак, якім ішоў, і замест таго, каб пладзіцца і размнажацца, па-

чынае забіваць. Тлумачэнне банальнае, але праўдзівае. Менш чым за паўгадзіны ўсе шыі парэзаны, сям-там адсечана і якая цыцка, вуха або нос, або па скале ўніз саслізнулі нечыя вочы ці машонка. Часам ваявода даруе жыццё найменшаму дзіцяці, і яно моўчкі збяжыць па схіле. Можа, Бог і гэта зладзіў паводле свайго намеру. Бо за кожнай разнёй мусіць застацца жывы вобраз у вачах забітых.

Так аднойчы раніцай зніклі ахоўнікі Павэлічавага партрэта і ў Гацку. Пайшлі і нічога не сказалі Джузэпэ Сікірычу, які любіў Правадыра найчысцейшым сэрцам. Нейкі момант было замяшанне, нехта парасчыняў усе хлявы і куратнікі, жывёла паразбягалася па вулках, па гасцінцы, а людзі замерлі і засталіся, дзе былі. Прыйшоў гаспадар Мілаш Давідавіч з шубарай на галаве, аперазаны цяжкімі патранташамі, сарваў партрэт з сцяны сваёй карчмы і трахнуў ім аб Джузэпаву галаву, як у нейкай старой нямой камедыі.

Гаспадар, не трэба, Хрыстом Богам малю! высунуўся тупы твар з драўлянай рамай замест валовага ярма.

Мілаш не даў яму зняць рамы з шыі аж да пячоры Духаўнячы, у зарасніку пад дарогай на Мостар. *Мы так не дамаўляліся,* паўтараў ён і біў яго цяжкім ботам у задніцу, а ў Джузэпэ цяклі слёзы, хоць ён і не ведаў, што яго чакае. Адчуваючы, што ягонаму гаспадаранню настаў канец, ён нават і не думаў пра тое, што́ магло адбывацца далей. Нічога не было такім страшным, як успамін пра гады, калі ён быў нікім і нічым.

Джузэпэ Сікірыч зрабіўся галоўным героем спектакля над Духаўнячай. Гаспадар Мілаш зарэзаў яго вялікім мясніцкім нажом. Зрабіў ён гэта прафесійна і па ўсіх правілах, таму гаротнік хутка і лёгка аддаў душу. Толькі трошкі павалтузіўся на каменні. Пасля Мілаш голымі рукамі зламаў яму шыю, разрэзаў скуру і жылы, адарваў галаву і кінуў яе ў пячору. Цела разам з лакаванымі дошчачкамі, якія некалі былі рамкай аднаго смешнага партрэта, пакінуў ляжаць пад нагамі тых, хто яшчэ чакаў сваёй чаргі.

Вестка пра Джузэпаву смерць дайшла да Рэгіны ў канцы 1945 года. Быў сонечны і неспадзявана прыемны дзень. Яна сядзела ў дварэ перад домам, калі з'явіўся сусед Бартал, абняў яе, *не ведаю, як табе сказаць,* уздыхнуў ён і працягнуў ёй паперу. *Ён супрацоўнічаў*

з акупантамі, думаў ён яе суцешыць, але тут жа прыкусіў язык, зразумеўшы, што́ сказаў.

Яна ўсміхнулася; гэта здаралася рэдка, і Бартал думаў, што ўсмешка будзе толькі ўступам і што зараз яна расплачацца. Яна падпісала паперу, ён хуценька склаў яе ў кішэню і паспяшаўся далей, дакараючы сябе за недарэчныя словы.

Словы гэтыя будуць мучыць яго да канца жыцця; было б добра з ёй гэта вырашыць, будзе думаць ён, але не будзе нагоды, дый не знойдзе Бартал у сабе адвагі. Часы будуць мяняцца, і ўсякія людскія пакуты, пад якім бы знакам яны ні адбалелі, атрымаюць сваё ціхае апраўданне, але Барталу будзе муляць тое, што ён Джузэпэ перад ягонай сястрой назваў супольнікам акупантаў. І так ён застанецца апошні, хто наогул будзе пра яго памятаць.

Усе іншыя, добрыя, злыя і абыякавыя, сястра і браты, службоўцы мясцовай рады і дзяржаўная статыстыка ахвяраў Другой сусветнай вайны забыліся пра Джузэпэ Сікірыча. Ягонае імя не засталося запісанае ні на камені, ні на паперы. Соль ягоных слёз засталася на герцагавінскіх скалах.

Джавані з Лазарам Кабілавічам двойчы прайшоў шлях помсты ўздоўж Дрыны і мястэчак, што выраслі на яе берагах. Ён бачыў, як па рацэ плывуць ахмедыі і фескі, і задумваўся, што ж такое з гэтымі людзьмі, што яны, бялявыя і сінявокія, пакрываюць галаву арабскімі ўборамі і вераць у Бога спосабам, які чужы для гэтай зямлі і толькі без патрэбы адрознівае іх ад суседзяў, да якіх яны ва ўсім іншым так падобныя. Ён нікога не забіў, ён заўсёды стаяў збоку як назіральнік. Трымаў рукі за спінай і пільна сачыў за відовішчам ці курыў цудоўны пасаўскі тытунь, пакуль ягоныя таварышы забівалі, вырывалі вочы і здзіралі жыўцом скуру з палонных партызанаў. Ахвяры думалі, што ён галоўны і што яго трэба маліць аб літасці, а Кабілавіч лічыў, што ў некага, найлепш каб у брата Ёвана, рукі засталіся чыстымі ад крыві, бо толькі так у іх будзе сведка, які ведае, чаму і ў імя якой справядлівасці яны рабілі тое, што рабілі. Ён засведчыць перад Богам і людзьмі, што не былі яны звярмі і забойцамі, а ратавалі свой народ і краіну. Яны заплацілі за гэта найвышэйшую цану, якую можа заплаціць жывы чалавек. Яны страцілі душэўны спакой, рука,

якая трымала нож, больш не здолее пагладзіць роднае дзіця, унука, камель слівы ў садзе каля хаты… Яны зрабіліся нелюдзямі між людзей, і зразумець іх могуць толькі тыя, хто рэзаў і забіваў з другога боку. Нянавісць, якую ён адчуваў да ўсташаў, калі пабачыў першыя спаленыя сёлы і разам з братам Ёванам пераж агнаўся перад цудатворнай іконкай святога Панцеляймона, перарасла ў Кабілавіча ў своеасаблівае разуменне, а пасля і ў сімпатыю. Яны па сутнасці робяць тое самае, што і ён, толькі што ў імя свайго народа і яго права на гэтую зямлю. Ім таксама, мабыць, нялёгка, і яны палохаюцца страшных сноў, якія ваяроў і ваяводаў суправаджаюць усё жыццё. Калі яны апынаюцца ў сёлах і мястэчках, праз якія прайшоў батальён Кабілавіча, усташы адчуваюць тое самае, што Лазар адчувае ў сёлах і мястэчках, праз якія пройдзе легіён Францэціча*. Вялікай розніцы тут няма.

Вінаватыя не людзі і народы, а час, які іх змусіў да гэтага зла – такое было апошняе Кабілавічава пераканан не. Магчыма, не толькі ягонае.

Доўжыўся гэты містычны досвед крыві і разні ад жа канца 1944-га, калі здарыўся цуд, павярнуліся нейкія касмічныя сілы або нешта сталася ў вонкавым свеце, тым, які амаль не датычыў баснійскіх гор і лясоў. Не засталося болей неабароненых або няспаленых сёлаў, больш не плылі па Дрыне ахмедыі і фескі. Здавалася, няма больш і ўсташаў. Аднак пачаліся крывавыя баі і ўцёкі, Джавані ўрэшце мусіў узяць у рукі зброю, некалькі разоў яны прайшлі праз Раманію* і назад, праз партызанскія пазіцыі і засады. Больш не было свабодных тэрыторыяў, праваслаўныя сёлы занялі камуністы, на вежах залуналі чырвоныя сцягі, і Лазар Кабілавіч разумеў, што вайна прайграная і што прыйшоў час як найдаражэй прадаць уласную шкуру. Яшчэ будзе песня, у якую ўвойдзе ягонае імя, суцяшаў сябе ён. Застанецца прынамсі адно жывое стварэнне пад небам, якое будзе ведаць, што ён, Лазар, пад злом рабіў дабро. Ён усклаў свае надзеі на брата Ёвана, які зрокся свайго імя, мяккіх далоняў вечнага вучня і казачнага горада Парыжа, надаўшы Лазаравай барацьбе вышэйшы сэнс і лад.

Лазар быў пераканан ы, што Джавані перажыве канец вайны

і рыхтаваную партызанамі адплату, хоць было невядома, у імя якога народа і дзеля якой вышэйшай справядлівасці партызаны збіраюцца помсціць. Джавані яны не крануць, бо ён не рэзаў, не забіваў і не належаў ніводнаму з бакоў, якія рэзалі і забівалі. Ён свабодны чалавек, анёл, які бачыў зло сваімі вачамі і трымаў рукі за спінай, каб не запэцкаць іх крывёю Божага стварэння. Ён чысты, такі, якім быў, калі нарадзіўся, ён гэты свет перавядзе праз раку дзесяць разоў шырэйшую за Дрыну, за якой ёсць нешта, у што трэба верыць і ў што Лазар Кабілавіч верыць усім сэрцам. У Хрыста і яго няшчасную маці, у Іосіфа, які быў цесляром і з-пад чыіх рук выйшлі і прыкла́ды гэтых стрэльбаў, у святога Панцеляймона і ўсе твары з царкоўных сценаў, чые замглёныя вочы падобныя на вочы людзей, якім толькі што перарэзалі горла і вантробы ў іх поўныя крыві. Светлай, як сонца, і цёмнай, як змрочная ноч над Маглічам.

Звар'яцелы ад пераменаў, якія насталі вакол, Лазар Кабілавіч кожнага дня ўсё больш і часцей блытаў зямны і нябесны свет, і здаралася, што ён у ранішняй малітве аднолькава шчыра звяртаецца і да Хрыста, і да Ёвана, чакаючы ад абодвух збавення, не ведаючы якога.

На каталіцкія Каляды 1944-га Кабілавічаў батальён, а насамрэч пятнаццаць чалавек, якія засталіся ў ім пасля ўсіх уцёкаў, трапіў у засаду пад Усціколінай. Бітва была нядоўгая. Праз дваццаць хвілінаў, напоўненых чэргамі партызанскіх ручных кулямётаў, у млыне, акружаным агнём, засталося яшчэ двое жывых. Лазар і Ёван.

Я застаюся, а ты, браце, ідзі здавайся, сказаў Кабілавіч і стрэліў сабе ў галаву перш, чым Джавані паспеў яму нешта адказаць.

Ён выйшаў з млына з высока паднятымі рукамі, барадаты прывід увесь у чорным з шубарай на галаве, такі, што яго не пазнаў бы ніхто з тых, хто яго ведаў. Яго завялі ў штаб да камісара Хурэма Алагі, які дапытаў яго і загадаў расстраляць.

Алагу найвышэйшае камандаванне прыцягне да адказнасці і на судзе ў Сараеве асудзіць на смерць за тое, што ён самавольна загубіў апошняга ацалелага чэтніка з сумнавядомай групы Кабілавіча, за чые злачынствы прынамсі ва ўсходняй Босніі не было горшых. Джавані Сікірыч мог расказаць тое, што назаўсёды застанецца таямніцай, бо

пасля Лазара не засталося ацалелых ахвяраў, якія маглі б сведчыць. Ад Сікірыча можна было б даведацца імёны астатніх галаварэзаў, чэтніцкіх дэзерціраў, якія, магчыма, далучыліся да народна-вызваленчага руху. Замест усяго гэтага Алага задаў палоннаму толькі дваты пытанні, ад якіх для гісторыі не будзе ніякай карысці. *Як цябе завуць?… Адкуль ты?.. Куды адляціць твая душа?*

Вестка пра лёс Джавані даходзіла да Рэгіны, Лукі і Бэпы ўрывіста, з розных бакоў і ў форме адкрытых пагрозаў. Найперш нехта паведаміў з партыйнага камітэта, што адзін з братоў Сікірычаў ліквідаваны як чэтніцкі злачынец, але Рэгіна ў гэта не паверыла, ведаючы, хто і які быў Джавані. Апрача таго, як і чаму ён бы паехаў з Парыжа да чэтнікаў? Тады ў бялградскай «Палітыцы» ў фельетоне на тэму Раўнагорскага руху было напісана, што ў Дражыным штабе было і некалькі славенцаў ды харватаў і сярод іншых імёнаў быў названы Джавані. Газетнае паведамленне ніхто ў горадзе не каментаваў або, што малаверагодна, такія каментары да Рэгіны не дайшлі. Людзі відавочна чакалі, што наконт ганьбы ў доме Дэлавале-Сікірычаў выкажацца мясцовы камітэт, а ў камітэце чакалі, што зверху прыйдзе нейкае ўказанне ці дырэктыва. Было далікатным пытаннем закрануць гонар сям'і, якая адначасна нарадзіла і партызанскага героя, таварыша Бэпу, пра чые подзвігі на Суцесцы і Нярэтве хадзілі легенды. Пасля з Трэбіня прыйшлі чуткі, што Джавані Сікірыч, званы Крывавым Ёванам, быў адным з найгоршых катаў мусульманскага элементу ад Гацка да Білэчы, і казалі, што ён разам з Лазарам Кабілавічам, якому і Дража Міхаілавіч не быў дастатковым аўтарытэтам, перастаў яму падпарадкоўвацца і на ўласную адказнасць і прыемнасць рэзаў і паліў па ўсёй Босніі.

Рэгіна ад такіх чутак уцякала як магла, а калі ў яе пыталіся пра брата, казала, што даўно не мае з ім ніякіх кантактаў, бо ён зрокся сям'і і спадчыны, але дакладна ведае, што Джавані ў Парыжы і што вяртацца адтуль не збіраецца. *Ён там, бо любіць мужчынскую штуку ў дупе,* казала яна, *ябецца з французамі і невядома што яшчэ робіць.*

І так кожны, хто б нешта спытаўся, уцякаў ад яе з усіх ног, ведаючы, што Рэгіна ў стане падрабязна распісаць тое, пра што

мужчынскія і жаночыя вусны не кажуць, а прыстойныя вушы не хочуць чуць.

Неўзабаве чуткі сціхлі, магчыма таму, што не было каму іх пацвердзіць, або таму, што пачалі казаць, нібыта бачылі Джавані ў Францыі. Сустрэў яго кіроўца нашага консула і пагаварыў з ім. Багаты і паважаны чалавек, гандлюе зямлёй і дамамі і ўжо памалу забываецца гаварыць па-нашаму. Гэта быў доказ мацнейшы за любы іншы, мацнейшы і за гарадскую злосць. Уражаныя тым, што нехта народжаны сярод іх забыўся словы матчынай мовы, людзі забыліся і тое, пра што пісалася ў газетах. Або паверылі, што існаваў яшчэ адзін Джавані Сікірыч, які меў менш розуму і шчасця і быў не з гэтага горада.

V

Шостага траўня 1937 года цэпелін «Гіндэнбург», названы паводле слаўнага маршала, які чатырма гадамі раней перадаў уладу Гітлеру, загарэўся падчас прызямлення ў Лэйкхэрсту ў амерыканскім штаце Нью-Джэрзі. Загінулі трыццаць тры з дзевяноста сямі пасажыраў, і трагедыя найвялікшага і найслаўнейшага цэпеліна ў гісторыі будзе ўдарнай навіною ва ўсіх кіначасопісах таго лета.

Гэта было падзенне нябеснага «Тытаніка», якое, нягледзячы на ўсе рамантычныя канатацыі, уздзейнічала на публіку ў кінатэатрах злавесней за разгаранне грамадзянскай вайны ў Іспаніі, бітвы за Гвадалахару і Малагу, японскія напады на Шанхай і нават за футурыстычныя прадказанні, што праз дзесяць гадоў, найпазней да 1955 года, бальшыня еўрапеек зробяцца ахвярамі аблысення, выкліканага частымі перманентнымі завіўкамі. Катастрофа цэпеліна, пасля якой былі спыненыя ўсе эксперыменты на гэтым відзе лятальных апаратаў, для наведнікаў, а асабліва наведніц летніх кіназалаў была асаблівым узрушэннем, бо ўсе толькі й марылі, што аднойчы таксама паляцяць цэпелінам. Карцінкі з салонаў з стылёвай мэбляй, у якіх каралі і каралевы, бароны, лорды, багатае еўрапейскае панства і авантурысты пілі шампанскае і смяяліся з жартаў, якія ніколі не дойдуць да вушэй звычайных людзей, паўтараліся на працягу некалькіх летніх сезонаў, дражнілі ўяўленне і прымушалі ўздыхаць усё адрыятычнае ўзбярэжжа.

Гледачы не заўважалі, што ім паказвалі заўсёды тыя самыя здымкі з тымі самымі тварамі і келіхамі, бо да наступнага лета забывалася тое, што бачылася ў кіначасопісах, а памяталася толькі захапленне шыкоўнымі заламі, якія вісяць у паветры, крыштальнымі люстрамі і струннымі квартэтамі, якія за некалькі тысяч футаў над зямлёю мяняюць уяўленне пра свет. Калі праўда, што тыя салоны ляцяць і што такое самае жыццё, толькі значна прыгажэйшае і ба-

гацейшае, магчымае і ў паветры, над акіянамі і горамі, тады для чалавека больш не існуе граніц, клопаты трацяць сэнс, а смерць перастае быць непазбежнай. Трэба толькі сесці ў цэпелін, сабраць багацце, якім будзе аплачаны палёт, і на крылах прагрэсу адляцець з каралямі і каралевамі. З тымі, што будуць першымі ўратаваныя ад кожнай магчымай аварыі.

«Гіндэнбург» быў велічны не толькі таму, што падаваўся ў кіначасопісах як найбольшы і наймагутнейшы цэпелін, але і таму, што яго імя было цяжкае, як свінец, масіўнае, як Рурскія сталеліцейныя заводы, з якіх дзень і ноч шугае полымя наймацнейшай індустрыі свету; гэтае імя было нібы ўбітае ў зямлю, гучнейшае і званчэйшае за ўсе іншыя імёны; так не зваўся і сам Бог. Але тады зноў жа той самы цяжкі «Гіндэнбург» уздымаўся між аблокаў, лягчэйшы за фольгу ад шакаладкі, якую разгладжвае дзіцячая рука. Як пёрка, адляцела ў неба найцяжэйшае слова, якое наведнікі летніх кіназалаў калі-небудзь чулі!

Калі прыйшла навіна, што «Гіндэнбург» упаў і што з ім у дым і прах адышлі ўсмешлівыя твары і рукі, што трымалі келіхі з шампанскім, гледачы былі ўражаныя да глыбіні душы. Яны былі нібы дзеці, якія прачнуліся і ўбачылі, што ператварыліся ў дарослых няшчасных людзей.

Рэгіна выбегла заплаканая з кінатэатра «Космас», не дачакаўшыся фільма «Гертрудзін грэх», нямецкай любоўнай драмы ў снежных Альпах, пра якую гаварыў увесь горад. Кадры з Лэйкхэрста для яе былі невыносныя. Людзі ў цыліндрах і з арыстакратычнымі кійкамі ў руках глядзелі з прыстойнай адлегласці, як гіне «Гіндэнбург», і здавалася, што яны нудзяцца. Яна бачыла іх спіны, як яны паскорана рухаюцца ў занадта павольным рытме рухомых карцінак, і амерыканскае неба, у якое валіць брыдкі чорны дым. А ў тым дыме былыя людзі і іх былыя багацці, слава і надзея эпохі. Частка яе жыцця адыходзіла ў неба, бо яна верыла ў магчымасць таго лятучага свету і ў тое, што гэта яе будучыня, як сёння нечая сучаснасць. Заўсёды так, думала яна, тое, што сёння могуць мець багатыя, заўтра зможа ўвесь свет. Толькі трэба быць дастаткова цярплівым і чакаць, і ўсё стане на сваё месца. Гарады ўзлятуць між аблокаў, разам з гарадской

бядотай і тымі, хто не мае на хлеб, у нейкіх яшчэ большых цэпелінах, і ўрэшце цэлы свет зробіцца свабодны, пакіне Зямлю і паляціць прасторай шырэйшай за неба. Яна ўяўляла сабе такі сцэнар, гледзячы кіначасопісы, і не звяртала ўвагі на размовы, што трыццаць два гады – гэта зашмат для незамужняй жанчыны і што самы час скочыць у апошні цягнік. Яна бачыла цэпелін і была спакойная; можна было і пачакаць, пакуль «Гіндэнбург» не ўпаў.

І тады настаў канец. У першы момант яна разгублена глядзела на экран, дыктар усхвалявана гаварыў пра людзей, якія ператвараюцца ў жывыя паходні. Смерць прыйшла хутка, перш чым няшчасныя паспелі памянуць Бога. На гэтыя словы Лука кісла ўсміхнуўся і штурхнуў яе локцем. Ён не адчуваў усяго таго жаху, яго нервавала тое, што казаў голас за кадрам, ён паглядзеў на сястру і штурхнуў яе яшчэ раз, ці яна чуе?; толькі сядзіць з прачыненымі вуснамі і тупа глядзіць перад сабою, быццам загіпнатызаваная ці быццам усе глупствы, якія прамаўляе той голас, Рэгіна бачыць на ўласныя вочы. *Але й дыму!* шапнуў ён, калі ў кадры яшчэ раз з'явіўся вялікі чорны воблак, а Рэгіна ўскочыла з свайго месца і пачала прабірацца да выхад.

Яна наступала людзям на ногі, нейкая пані піскнула, як мыш, бо яна стала ёй на мазоль, муж пані аблаяў яе, згадаўшы бога і дзеву Марыю, заварушыліся рады ў залі, усе ўтаропіліся ў дзяўчыну, якая, голасна рыдаючы, бегла да выхаду. Луку нічога не было зразумела. Упершыню Рэгіна зрабіла нешта, чаго ён не мог растлумачыць. Ад таго моманту, прынамсі яму так здалося, пачалося яе непаразуменне са светам.

Але верагодней, што непаразуменне пачалося за шэсць гадоў да таго, калі Луку яшчэ не споўнілася дзевяці і сястра закахалася ў Арыса Бэрбэр'яна, навасадскага студэнта права, якога багаты бацька паслаў на Адрыятыку лячыцца марскім паветрам ад сухотаў, на якія Арыс насамрэч і не хварэў. Але хварэў на нешта іншае, што падштурхнула яго падкупіць лекараў і за грошы, на якія можна было б купіць дом у цэнтры гораду, выклапатаць у доктара Мушыцкага даведку аб сухотах, у якой драматычна згадваліся дзве адкрытыя каверны і максімум паўгода жыцця.

За ўсе лекі белага свету для вашага сына не будзе лепшага за

марское паветра, сухое і цёплае, поўнае лекавых соляў і водараў, якія вецер прынясе з сушы і мора. Не магу вам даць гарантыі, што ў моры Арыс знойдзе ратунак, не ведаю, ці для яго не запозна і як будзе паводзіць сябе хвароба. Туберкулёзы бываюць розныя, як розныя бываюць і людзі, якія на іх хварэюць, і кожны паводзіць сябе парознаму. Мы можам толькі спадзявацца, што Арысаў належыць да тых, якія аднясуць адрыятычныя вятры, стараўся доктар Сімяон Мушыцкі распісаць усё як найпрыгажэй старому Бэрбэр'яну, а той плакаў, як малое дзіця, пасярод кабінета перад медсёстрамі, якія яго супакойвалі, і Арысам, які пакашліваў у насовачку.

Але было невядома, з чаго ён плача больш: таму што яму найлепшы ў Каралеўстве доктар сказаў, што ў яго памрэ адзіны сын, ці таму, што на гэтым скончыцца гісторыя яго найстарэйшай у Ваяводзіне адвакацкай канторы, якую заснаваў ягоны дзед Аляксей, калі з Ерэвану, прайшоўшы навучанне ў Берліне, прыехаў у Імперыю.

Ёван Бэрбэр'ян быў выдатным адвакатам і дабрадзеем усіх беднякоў. Ён браў дорага з тых, якія перад усім горадам ганарыліся, што Бэрбэр'ян вядзе іх юрыдычныя справы, але бясплатна бараніў кожнага бедняка і гаротніка, з якімі судзілася дзяржава або нейкі багаты гаспадар. Але разам з тым гэты сардэчны чалавек быў неверагодна жорсткім бацькам. Сыну ён забараняў усё, што, на яго думку, магло збіць яго з шляху, які быў яму вызначаны ў момант зачацця.

Арысу было два гады, калі ён упершыню прывёў яго да сябе ў кантору, *каб дзіця своечасова вучылася і своечасова палюбіла працу, якой будзе займацца ўсё сваё жыццё,* і дарэмна маці Савэта казала, што яшчэ зарана і што лепш бы Арыс ішоў гуляць з іншымі дзецьмі. *Мяне мой бацька Сакрат прывёў у кантору, калі мне было два гады. Трэцяе слова, якое я вывучыў пасля «мама» і «тата», было «закон». Бацьку ягоны бацька Аляксей прывёў сюды калі яму было два, і першае слова, якое ён ведаў, было «права»,* адказваў Ёван, і маці здавалася.

Па першым часе ён пускаў хлопчыка гуляць пад чорным пісьмовым сталом, пакуль ён вёў размовы з кліентамі. Як толькі людзі не здзіўляліся, калі пасярод размовы з-пад стала вылазіў бялявы хлоп-

чык і казаў, што хоча сікаць або какаць. Тады славуты Бэрбэр'ян званіў у званок, прыбягаў пан Янаш, згорблены сівы памочнік, браў Арыса за руку і вёў у прыбіральню. Які б цяжкі і драматычны ні быў выпадак, дзеля якога звярталіся да адваката, а прыходзілі і людзі, чыіх сыноў і братоў трэба было ратаваць ад смяротнага пакарання, кожнаму з'яўленне дзіцяці падавалася добрым знакам. А калі Бэрбэр'ян тлумачыў прычыну, чаму хлопчык цэлымі днямі не выходзіць з канторы, яны яшчэ больш верылі ў ягоны прафесіяналізм. Тым больш, што ім самім не прыходзіла ў галаву сваіх дзяцей рыхтаваць такім чынам да будучай працы. Гэты чалавек крыху вар'ят і ненармальна, штó ён робіць з дзіцем, але ж ён адвакат!

Калі Арысу споўнілася чатыры, бацька пачаў задаваць яму просценькія задачкі, каб праверыць сынавы разумовыя здольнасці, разважлівасць і адчуванне справядлівасці.

Хто больш вінаваты, п'яніца Лаза, які абакраў касу вяслярскага клубу, або касір Стэва, які пакінуў касу незамкнёнай?.. Курыцы гаспадара Ёзікі цэлы год лазілі праз плот да суседкі Мілкі, а яна ўвесь час казала гаспадару Ёзіку пра гэтую праблему, пакуль урэшце не скруціла галаву ягонаму пеўню. Але зрабіла гэта не ў сваім, а ў чужым двары, хто вінаваты?.. Двое пакалолі адзін аднаго віламі, памерлі адзін і другі, і жонка таго, хто пачаў першы, патрабуе кампенсацыі. Ці яна мае рацыю і што мусіць зрабіць жонка другога?.. Ішлі дажджы, заліло склеп, і прапала ўсё віно гаспадара Іштвана, і цяпер з ім судзяцца карчмары, якія загадзя заплацілі за віно. Ён бы вярнуў ім грошы, але яны не хочуць браць, бо ім нанесена шкода большая за цану віна. Што мае вырашыць суд?

Распытваў Ёван Бэрбэр'ян хлопчыка, і той адказваў, пакуль яго гэта забаўляла, і збольшага ўсе адказы былі правільныя. Але дзіцячая ўвага не затрымліваецца доўга на нечым адным. Хвілін праз дзесяць Арысу надакучвалі бацькавы роспыты, яму хацелася гуляць, і ён з чыстага свавольства пачынаў наўмысна даваць няправільныя адказы, але Ёван не спыняўся, як бы зрабіў кожны іншы, а задаваў усё новыя і новыя пытанні з цярплівасцю старога сельскага каня, якога немагчыма раззлаваць і прымусіць скінуць і сядло і няўклюднага конніка. Рэдка здаралася, каб ён наагул зра-

зумеў, што малы наўмысна адказвае няправільна, бо да ягонага розуму не даходзіла, што на гэтым свеце існуе нехта, хай сабе і зусім малое дзіця, хто б на пытанні праўды і крыўды адказваў несур'ёзна.

Неўзабаве Арыс пачаў адказваць няправільна ўжо на першае пастаўленае пытанне, і тады Ёван Бэрбэр'ян увёў сістэму ўзнагародаў за правільныя адказы. Пяць дакладных адказаў – сітро, дзесяць дакладных – цукровая вата, пятнаццаць – марозіва, а пяцьдзясят дакладных адказаў – паход у цырк. Гэткім чынам ён засяродзіў сынаву ўвагу, або дакладней было б сказаць – купіў яе, упэўнены, што гандаль заўсёды мае сілу. Ён меў сілу цэлых пяць гадоў, калі зноў была парушана ідылія Адвакацкай канторы Бэрбэр'ян і ўпершыню дайшло да адкрытага канфлікту паміж бацькам і сынам. Ёван вярнуўся дадому ўвесь разбіты, бо Арыс сказаў яму, што ён стары тоўсты асёл. Савэта суцяшала яго, але яе суцяшэнне было ня больш шчырым, чым нядзельная споведзь курвы Мэліты. Маці было ясна, штó адбываецца паміж двума мужчынамі і штó малы вырашыў учыніць вялікаму, але даўно ўжо пакінула спробы растлумачыць гэта свайму мужу.

А здарылася вось што: Арыс доўгі час, раз або нават два-тры разы на тыдзень, выконваў норму па пяцьдзясят дакладных адказаў, і гэтулькі разоў Ёван мусіў вадзіць яго ў цырк. Калі раптам у Новым Садзе не гасцявала нейкая трупа, яны ехалі цягніком у Субаціцу, Сомбар, Бачку Паланку або нават у Вукавар ці Бялград – туды, дзе быў цырк. Начавалі ў гатэлі і назаўтра раніцай вярталіся дадому. Так цырк апрача адвакатуры зрабіўся адзінай справай, якую Арыс бачыў і пра якую нешта ведаў. Імёны ўсіх сланоў, якія тымі гадамі ступілі на зямлю Каралеўства, львоў, тыграў, коней, грымучых змеяў і белых мышэй, якія знаходзяць выхад з лабірынту, з якога б не выйшаў чалавек – усіх іх ён ведаў лепей, чым уладальнік цырку. Ён таксама навучыўся адрозніваць львоў, у якіх на ўсялякі выпадак павырываныя зубы, ад тых, якія сапраўды маглі б адгрызці галаву, калі дрэсіроўшчык суне яе ім паміж сківіцаў. Ён зрабіўся спецыялістам па акрабатычных фігурах і фокусніцкіх штуках, а ў сем гадоў ужо прафесійна разважаў, да якой школы належыць каторы клоўн – рускай або французскай.

Розніца паміж дзвюма гэтымі школамі была для Арыса фактам першараднай важнасці, а французаў і рускіх ён успрымаў як два смяротна пасвараныя народы, якія рана ці позна на полі бою цаною соцень тысяч мёртвых вырашаць, чые клоўны будуць уладарыць светам. Аднекуль, магчыма, ад цыркачоў, ён даведаўся, дзе лепш прымаюць французаў, а дзе рускіх. Каляровымі алоўкамі ён абводзіў гарады на геаграфічнай карце: сінім тыя, у якіх больш цэняць рускіх клоўнаў, чырвонай – больш прыхільныя французскім, а зялёным абвёў Берлін, Бялград і Бухарэст, бо там публіка сустракала ўсіх клоўнаў з аднолькавым захапленнем.

Бацьку Арысавы веды не заміналі, наадварот, ён ганарыўся сынавай добрай памяццю, бо яна выключна важная для сапраўднага адваката. Аж пакуль аднойчы сын не паведаміў яму, што хоча быць дрэсіроўшчыкам катоў, бо яшчэ нікому, апрача славутага расіяніна Яўгенія Мілінскага, не ўдалося прымусіць ката выканаць хоць якую каманду.

Стары быў адначасна і спалоханы і абражаны. Ягоны родны сын паміж правам і цыркам выбраў цырк! І не слоноў або львоў, якім дзівіцца кожны навасадскі падшыванец, а звычайных катоў! Нешта з гэтым дзіцем не ў парадку, і трэба гэта чым раней выправіць, падумаў ён і сказаў Арысу, што ён ужо вялікі і занадта дарослы для цырку, дык цяпер хай сам выбера, якой надалей будзе ўзнагарода за пяцьдзясят правільных адказаў. Арыс спрабаваў змагацца, але не дапамагала. *Ты ўжо вялікі, амаль дарослы чалавек,* хлусіў бацька, а ў хлопчыку расла гнеўная пагарда, пачуццё, якім назаўсёды будуць пазначаныя іх дачыненні.

Зразумеўшы, што нічога тут не дапаможа і што бацька не саступіць, ён і сказаў, што той – стары тоўсты асёл. Гэтую абразу ён абдумаў з халодным разлікам, цалкам усведамляючы, што гэтым страшна параніць і прынізіць бацьку. Рэч у тым, што Ёван Бэрбэр'ян ніколі не лаяўся і нават сур'ёзна не павышаў голас – калі толькі не ў судовай залі, дзе і чакаецца пэўная тэатралізацыя, без якой не могуць быць належна пададзеныя аргументы і доказы, якія б засталіся ў памяці ў суддзяў. Ціхія і манатонныя адвакаты нудныя як прысяжным, так і публіцы, а суддзя прапусціць міма вушэй палову з таго, што яны сказалі.

Калі Арыс крыкнуў на старога, ён ударыў яго ў тое месца, якое ў пана Ёвана лічылася самым стабільным і трывалым. Куды б ён ні пайшоў, ён усюды меў добрую рэпутацыю, у ягонай прысутнасці нельга было вымавіць грубага слова, і аднолькавую павагу ён выклікаў і ў добрых, і ў злых – і ў вытанчаных арыстакратаў, і ў прымітыўных турэмных вартаўнікоў, і ў забойцаў, зняволеных у найцямнейшых сутарэннях каралеўскіх казематаў. Нават адміністратары і афіцыянты ў гатэлях і рэстаранах тых гарадоў, якіх не дасягалі чуткі пра слаўнага адваката, ставіліся да яго з нейкай асаблівай павагай. У той павазе не было і кроплі страху. Тое, што ён – стары тоўсты асёл, было першай абразай, якую ён пачуў ад часоў юнацтва.

Аднак было дастаткова выспацца за ноч, і раніцай ён ужо з'явіўся з некранутай аўрай, лагодны і па-ваяводзінску марудлівы, нястрымны, як англійскія ўзброеныя сілы.

Ну што, прыдумаў, чаго каштуюць пяцьдзясят правільных адказаў? У хлопчыка пад сталом ад хвалявання дрыжалі калені. Ён мог паўтарыць, што бацька – стары тоўсты асёл, або плакаць і раўці, што яго нічога апрача цырку не цікавіць і што ён хоча быць дрэсіроўшчыкам катоў, і што хай ён яго за тысячу дынараў прадасць цыркачам, ён будзе прачынацца штораніцы а чацвертай, карміць коней, мыць сланоў і выносіць звярынае гаўно! І ўсё жыццё будзе яму ўдзячны. Але колькі б ён яго ні абражаў, бацька застанецца шаноўным панам адвакатам з вуліцы Каталіцкай Порты, 8, і для яго, і для ўсяго свету. І колькі б ён ні ўгаворваў бацьку прадаць яго цыркачам, ён гэтага не зробіць, не адрачэцца ад свайго спадкаемцы, малога фараона.

Грошы, шапнуў Арыс; бацька наконт грошай быў скупы, і малы спадзяваўся, што ён не згодзіцца. А калі не згодзіцца, тады аргумент за цырк зробіцца мацнейшы, проста неаспрэчны.

Колькі? спытаўся ён.

Пяцьдзясят адказаў, дзясятая частка твайго заробку, адказаў хлопчык з адчуваннем, што да яго вяртаецца сіла. Упершыню ў жыцці па ягоных жылах цякла моц, якая рухае светам і робіць багатых людзей шчаслівымі і падахвочвае іх рабіцца яшчэ багацейшымі.

Ёван Бэрбэр'ян праглынуў камяк, паглядзеў на столь: над люстрай павук сплёў сетку, трэба было сказаць прыбіральшчыцам, што нельга прыбіраць і падмятаць як кот хвастом. Ён апусціў позірк на сына, той, не міргаючы, глядзеў перад сабой, дакладна так, як ён вучыў яго глядзець на суддзю і прысяжных, калі прамовіш галоўны аргумент, ні разу не міргнуць, стварыць у людзей ілюзію, што ты нічога не хаваеш, у вачах тваіх голая праўда, і калі хочуць, яны могуць узяць яе ў рукі, павярнуць адным і другім бокам, добра праверыць, што гэта не фальсіфікат; менавіта так Арыс бароніць сваю першую працоўную прапанову, робіць гэта добра, не міргае ўжо паўхвіліны, глядзіць на бацьку, як факір на грымучую змяю, моцны малы, нешта з яго будзе, важна толькі выбіць яму з галавы гэты цырк.

Дамоўлена, сказаў ён і працягнуў хлопчыку руку. Арыс падаў руку, але не быў упэўнены, перамог ці безнадзейна прайграў. Ён атрымаў тое, чаго не чакаў, а страціў тое, што было яму найважнейшае. Ці ёсць у сусвеце нешта больш велічнае, чым дрэсура катоў, і ці ёсць больш выключны чалавек, чым той, які валадарыць кашэчым светам?

Ёван Бэрбэр'ян пасля гэтага задаваў сыну цяжэйшыя пытанні, але ніколі такія, для адказу на якія патрэбныя веды з юрыдычных кніг і часопісаў. Ён гуляў сумленна, як англійскія джэнтльмены гуляюць у крыкет і пола, але пачаў сур'ёзна старацца захаваць свае грошы, і рабіў ён гэта як бы перад ім было не дзіця і як бы гэты хлопчык не быў яго сынам. Ён знаходзіў прыклады з судовай практыкі, якія ўвайшлі ў легенду, прысуды і апраўданні, якія праславілі вялікіх суддзяў, і ператвараў іх у пытанні, на якія Арыс адказваў.

Ужо ў адзінаццаць гадоў ён умеў па некалькі гадзінаў абгрунтоўваць сваю пазіцыю, лагічна яе бараніць і ўводзіць бацьку ў лабірынты, з якіх не было выхаду. Момант перамогі прыходзіў, калі бацька больш не ведаў што сказаць або пачынаў запінацца. На першае запінанне супернік паднімаў руку ў паветра, як баксёрскі суддзя, і гэта быў класічны накаўт, без падліку. У сярэднім Арысу даставалася палова бацькавага месячнага заробку. Грошы ён складаў у скрынку ад абутку, якую хаваў пад ложкам, бо не ведаў, на што іх патраціць. Пасля таго, як адменены цырк, у Арыса апрача школы і канторы мала чаго засталося. Маці будзіла яго кожнай

раніцы а шостай. Ён снедаў з бацькам, стары пры гэтым чытаў газеты і каментаваў падзеі ў свеце. Рост цэнаў на дыяменты на лонданскай біржы прадвяшчаў надыход дрэнных часоў, у Нямеччыне пахла вайсковым пераваротам, адны за аднымі ўспыхвалі рабочыя страйкі і вулічныя бойкі паміж чорнымі і чырвонымі, старога Бэрбэр'яна непакоіла, як буйныя прамыслоўцы не разумеюць, што гуляюць з бомбай, якая можа выбухнуць кожную хвіліну. А *калі выбухне, тады справядлівасць будуць вяршыць не суды, а расстрэльныя каманды,* казаў ён як найменей раз на тыдзень.

Пасля снядання яны ішлі ў кантору, *на працу прыходзь раней нават калі думаеш, што няма чаго там рабіць, гэта дапамагае засяродзіцца,* а ў сем сорак прыходзіў стары Янаш і праводзіў Арыса ў школу. Сустракаў ён яго і пасля заняткаў, і яны вярталіся ў кантору, а праз гадзіну-дзве пачынаўся перапынак на абед. Па абедзе бацька і сын зноў былі на працы да восьмай або дзявятай вечара, і тады трэба было рабіць хатнія заданні. Такі быў у хлопчыка дзённы рытм аж да заканчэння гімназіі, і нічога тут не магло змяніцца. Як Ёван Бэрбэр'ян хадзіў на працу нават калі быў хворы, так і ягоны сын усе дзіцячыя хваробы прахварэў у адвакацкай канторы, прыхіліўшыся лбом да халоднай аконнай шыбы.

Каб уладзіць сына на юрыдычны факультэт у Бялградзе, славуты адвакат мусіў выкарыстаць свае сувязі і знаёмствы. З просьбамі і подкупамі ён дайшоў аж да ад'ютанта прынца Паўла Караджорджавіча, але нічога не выходзіла. Рэч у тым, што ў гімназіі Арыс з цяжкасцю пераходзіў з класа ў клас, меў адны двойкі, а пяцёркі толькі з лацінскай мовы і гісторыі. Такога студэнта на прэстыжным факультэце мець не хацелі, магчыма яму яшчэ дадаткова шкодзіў бацькаў аўтарытэт. Было вялікай справай, а для некага можа і найбольшым кар'ерным поспехам, праваліць Бэрбэр'янавага сына.

Калі яго прымуць, я пасяку сваю кафедру сякерай, накладу тры кучы на ваш гонар і на вашы дактараты, і больш мяне гэты факультэт і гэты горад не ўбачаць, зароў прафесар Матушэўскі, калі прыйшла просьба з каралеўскай канцылярыі. Стары кракаўскі леў не мог сабе ўявіць, каб на факультэт, дзе людзей вучаць праву і справядлівасці, прымалі студэнтаў супраць закону і парадку.

Але Арыс урэшце ўсё ж быў прыняты, а Гжэгаж Матушэўскі быў выпраўлены міністэрскім указам на пенсію. За асаблівыя заслугі ў гады Першай сусветнай вайны ён быў ушанаваны Караджорджавай зоркай. У «Палітыцы» пра гэта быў апублікаваны артыкул з фатаграфіяй, на якой прынц Павал вешае зорку прафесару на грудзі і гэтак «славаю несмяротнага вянчае чалавека, які ўмеў калі трэба зброяй, а калі трэба пяром, чарнілам і юрыдычнымі ведамі бараніць і будаваць айчыну». На твары Гжэгажа Матушэўскага была відна крывая ўсмешка, быццам прынц прабіў яму не толькі штрыфель пазычанага фрака, але і смочку на грудзях.

Гадамі менавіта гэтую фатаграфію з «Палітыкі» прыдворны фатограф Пэтар Парджык паказваў сваім вучням як прыклад дрэннай працы. *Твар чалавека воку нябачны, дзевяць дзясятых секунды ён паказвае сапраўдны настрой, а адну дзясятую хлусіць. Добры майстар ведае, калі ён трапіў не ў тую дзясятую секунды,* казаў ім ён.

Першыя месяцы ў Бялградзе былі для Арыса адкрыццём новага свету. Дні і ночы праводзіў ён у корчмах, трацячы багацце, зароблена на пытаннях пра тое, што справядліва а што не. Да Калядаў ён ужо здабыў рэпутацыю найшчадрэйшага кліента ў доўгай п'янай гісторыі Скадарліі*, бо ягоны рахунак за дзень, як правіла, быў большы, чым патрацілі ўсе астатнія наведнікі разам. Ён частаваў кожнага, хто сядаў за ягоны стол, а ў моманты асаблівага натхнення або калі паблізу была нейкая прыгожая маладая дама, разбіваў адзін за адным крышталёвыя келіхі. Афіцыянт прыносіў яму па дзесяць новых на срэбнай тацы. Урэшце Арыс хапаў шкло рукамі і тлумачыў розніцу паміж шклом і крышталём. Шклом можна парэзацца, а крышталь – як дыямент, тонкі і пяшчотны, калі яго трымаюць рукі арыстакрата. Дзяўчаты, дзеля якіх ён гэта рабіў, уцякалі ад яго з усіх ног. Або бачылі ў Арысу пыхлівага прайдзісвета, або некага, хто вырашыў сябе забіць і таму хоча перад гэтым патраціць усё, што мае. А ні адно, ні другое, прынамсі ў тыя часы, не было добрай рэкамендацыяй для залётніка.

Перад канцом першага семестру Арыс зразумеў, што з ягонай навукі нічога не будзе. На лекцыях, калі ён не спазняўся на іх прыйсці, ён пераважна драмаў, мучыўся пахмеллем і супакойваў

страўнік, які рваўся вонкі, а тое, чаму яго спрабавалі навучыць прафесары, яму і так было нецікава. І то з дзвюх прычынаў. Ён мусіў тут вывучаць асновы пасля таго, як яшчэ хлопчыкам прайшоў з бацькам не толькі асноўны, але і дадатковы матэрыял. Ён ведаў, як судзяць і судзяцца, дык нашто яму ведаць тое, як да гэтага даходзіць? Але другая прычына, з якой яму навука не йшла ў галаву, была важнейшая. Ён бачыў за сабой васямнаццаць гадоў пакутаў, якіх, пакуль яны доўжыліся, не ўсведамляў. Калі ён і далей пойдзе шляхам, на які скіраваў яго бацька, пакуты будуць працягвацца ўсё жыццё. Не ведаючы, чаго ён насамрэч хоча, бо ні ў чым, апрача корчмаў на Скадарліі, не бачыў прыемнасці, Арыс шукаў спосаб вызваліцца ад бацькі. Дзеля таго, што нічога апрача смерці не магло перашкодзіць Ёвану Бэрбэр'яну перадаць сваю адвакацкую кантору сыну, Арыс вырашыў прыдумаць сабе сухоты. Спярша ён планаваў сапраўды паспрабаваць заразіцца, але адмовіўся ад гэтай задумы, калі яму сказалі, што гэта не так проста. Туберкулёз не да ўсякага прыстане, і хто ведае колькі б давялося чакаць, пакуль хвароба прагрэсуе настолькі, што вызваліць яго ад навукі. Ён не меў часу, бо блізіліся экзамены, і калі ён іх не здасць, бацька зразумее, што́ адбываецца і дзе сын бавіць у Бялградзе дні і ночы.

Доктару Мушыцкаму Арыс даў за фальшывы дыягназ усе грошы, якія ў яго заставаліся. І яно было таго вартае, бо доктар так добра адыграў сваю ролю, што старому Бэрбэр'яну не спатрэбілася нават тлумачыць, што часта хвароба прагрэсуе незаўважна, і хворы нават не ведае, што ён хворы, і ў здаровых яшчэ ўчора людзей пачынаюць адкрывацца каверны. Ён толькі камячыў паперу, на якой быў напісаны смяротны прысуд, па нерухомым твары цяклі слёзы, а Сімяон Мушыцкі адчуваў моцную патрэбу яго суцяшаць, як у такіх выпадках суцяшаюць бацькоў, у якіх паміраюць адзіныя сыны. Але дзеля таго, што гэта супярэчыла б д'ябальскай здзелцы, якую ён заключыў з маладзёнам, доктар маўчаў і ўздыхаў. На кожнае непрамоўленае слова суцяшэння адзін уздых.

Так Мушыцкі зарабіў найбольшыя грошы ў сваім жыцці, а Ёван Бэрбэр'ян страціў прычыны жыць. У панядзелак ён выслаў Арыса на мора, а ўжо ў сераду злёг у хваробны ложак, з якога ён ужо ніколі

не ўстане. Савэта цэлыя тры гады яго мыла, карміла і пераварочвала з аднаго боку на другі і ўпала ў роспач, калі ён памёр. Яна кахала яго, якім бы ён ні быў з іншымі, а сына ніколі не дакарала, хоць і ведала, што сухоты свае ён выдумаў і што гэтая выдумка Ёвана забіла. Калі ўжо яна не магла змяніць абставіны, закрычаць на мужа, сказаць, што ён наклікае на дом няшчасце, дык прынамсі прымала абодвух такімі, як яны былі, і шкадавала іх той пяшчотай, якую людзі звычайна называюць любоўю, хоць жанчын, якія ў такой любові жывуць, называюць пакутніцамі.

Ранняй вясною 1931 года Арыс Бэрбэр'ян прыехаў у Дуброўнік. Кватэру ён наняў у Міны Элез, старой дзеўкі, якая жыла за два дамы ад Сікірычаў. Міна трымала на ніжнім паверсе майстэрню для цыравання жаночых панчох і плісіравання спадніц. Рэгіна часта заходзіла да яе, калі ў хаце набіралася панчохаў, але часцей проста так, паглядзець модныя часопісы, якія кожны тыдзень дасылаў Міне пляменнік з Мюнхена, або проста пагаварыць з некім, хто яе разумее. Тым часам як іншыя дакучалі – чаго яна чакае? чаму не выходзіць замуж? час жа мінае! – Міне ўсё было ясна, яна толькі ківала галавою, казала, *эх, мая ты дарагая, ведаю я як яно,* і далей цыравала панчоху, пакуль Рэгіна выкладала свае няўдачы з мужчынамі, якія ёй падабаліся, або з іншымі – а з такімі было яшчэ цяжэй – якім падабалася яна.

Хто ведае, наколькі Міна яе сапраўды слухала і што з усяго таго чула, але гісторыі тыя былі такія тыповыя, нібы перапісаныя з дзявочага альбому або раману Мір-Ям*. Рэгініны праблемы толькі ў адным адрозніваліся ад праблемаў іншых дзяўчат. Ці быў гэта страх, ці залішняя гордасць, сказаць цяжка, але яна не наважвалася адштурхнуцца, скочыць і нырнуць першы раз. Або скала была занадта высокая, або мора пад ёй занадта плыткае, або заглыбокае; яна стаяла наверсе, падыходзячы да краю і зноў адступаючы, а пасля, больш дзеля сябе, чым дзеля іншых, знаходзіла і выдумляла ўсё, што яе не задавальняла ў тых, дзеля каго яна мусіла скочыць. Каталог мужчынскіх недахопаў быў як карцінка, надрукаваная ў сто тысяч асобнікаў, якую насіла ля сэрца ўсё Рэгініна пакаленне, вядома, жаночая яго частка, і яшчэ некалькі пакаленняў да яго. Тое, што трапіла

ў той каталог, ня варта ні вымавіць, ні напісаць, бо ў гэта больш ніхто б не паверыў і ўсю справу прыпісаў бы злосці і пустадумнасці таго, хто пра гэта расказвае. Людзі пагарджаюць банальнасцямі і не вераць, што пад нябесным скляпеннем існуе нешта, што б адпавядала агульным меркам, таму такія рэчы звычайна не кажуць і цэлая вялікая частка чалавечай гісторыі не трапляе ў кнігі. Тая частка, якую можна апісаць і растлумачыць толькі банальнасцямі, пазней утварае шэрую пляму ў любой гістарыяграфіі, на першы погляд ненаселеную і нязведаную тэрыторыю, містычны абрыс, прасторавае скрыўленне сусвету або нешта такое, што навукоўцы прыдумляюць ад пачатку стагоддзя, каб вярнуць рэчаіснасці тую нязвыкласць, якая існавала, калі Бог яшчэ з поўнай бясспрэчнасцю быў тут. Таму варта толькі агульна пазначыць Рэгініну праблему і нічога далей пра яе не казаць.

Міне была прыемная яе кампанія, Рэгініны штодзённыя нараканні, манатоннасць жальбы і плачу, напоўненая мужчынскімі імёнамі, вымаўленымі так, як бы гаворка была не пра рэальных людзей, а пра святых, у якіх ніхто больш не верыць, але гэта не прычына, каб не складаць на іх віну за штормы і штормікі, расчыненыя аканіцы, якія б'юцца аб каменныя сцены, і прасціны, якія раптоўны паўночны вецер зрывае з вяровак, і пытанне толькі ў тым, ці ён аднясе іх у мора, ці ператворыць іх у ветразі, якія ўздымуць гэты пракляты горад, знясуць яго і паселяць сярод патанулых караблёў.

Такія думкі раіліся ў Мінінай галаве, кожная з іх аздобленая, размаляваная, ілюстраваная сотнямі карцінак. Ад тых карцінак любы, апрача Міны, калі б яны яму не дай божа з'явіліся ў галаве, адразу б звар'яцеў. А для яе яны былі нармальныя і штодзённыя.

Прасціны і цмокі, бачаныя некалі на рыбным рынку гіганцкія васьміногі, якіх здымалі чэшскія фатографы і пра якія Горад ужо назаўтра забыўся, мурашнік у згаслым каміне панскай вілы, ператворанай у музей, гаршкі з аксаміткамі на акне Бэгавіны* і мужчыны ў фесках, якія праходзяць пад акном, бруянне рачулкі Буны* і летні гул з дэрвішскай тэкіі*, заліты сонцам Вележ* мірным летнім днём, на чый верх абрынулася бура і б'е па ім громам і маланкамі, Алахавы каменаломні, сардзінкі, якія расплюшчваюць і заплюшч-

ваюць вочы, чакаючы, пакуль спрытны нож здзярэ ім са спінаў луску, соль, у якой заснуць іх апошнія рыбіны думкі, пакуты голых засоленых рыбіных спінаў, іх грэшныя душы, хрысціянскія святыя, злоўленыя рыбнымі сеткамі, распяцці з сасновых галін, падушкі, што праветрываюцца ў вясновым акне таго, хто ўчора памёр, мора чорнае, як дзёгаць, і пах лаванды ў кішэнях мужчынскіх пінжакоў, капітанская фуражка высока на буфеце ў доме, дзе шмат дзяцей, першамайскія вогнішчы, жандары з аголенымі шаблямі і Аўрам па мянушцы Ленін, які дастае з штаноў хуй і дражніць ім жандараў, гандон на далоні галандскага марака і ягоныя пальцы, якія доўга і брыдка смярдзяць гумай – што яе спалохае і яна ўцячэ, пясчынкі пад пазногцямі ног, маторныя лодкі, у якіх замежнікаў возяць на Локрум, баркі на вёслах, у якіх старых паляўнічых сабакаў завозяць на пусты востраў, дзе няма ні ежы, ні вады, забыты на двары напарстак, да паловы запоўнены першым восеньскім дажджом, тры гнілыя струкі ражкоў у куце склепу – неяк зімою на пачатку стагоддзя, хворыя на адзёр цыганяты, якія бегаюць за гарадскімі дзецьмі, каб іх заразіць, пухірыкі, напоўненыя лімфай, гнойныя раны на баках худога баснійскага каня, нагружанага кадкамі з траўніцкім сырам, раскрыты парасон, што ўпаў у мора і адносіцца цячэннем удалечыню; гэта толькі нейкія з карцінак, якія кожнае імгненне мільгаюць у Міны ў галаве. Тым часам як іншыя людзі думаюць словамі мовы, якую яны першай вывучылі, яна думае карцінкамі, і гэтым яна асаблівая. Міну жанчыны лічаць ненармальнай, але не наважваюцца сказаць уголас, што яна вар'ятка. Яны не кажуць пра яе карцінкі мужчынам, лепш каб тыя нічога пра яе не ведалі і не чапляліся. Таму што без Міны нельга. Міна адзіная ў горадзе цыруе панчохі і плісіруе спадніцы – а мода на плісіраваныя спадніцы трымаецца ўжо дзесяць гадоў і хто ведае, колькі яшчэ пратрымаецца. Можа ніколі і не пройдзе: моду выдумалі багатыя і нічым не занятыя людзі, якім не ў галаве, што плісіраваныя рэчы доўга і цяжка прасуюцца – пяць мужчынскіх кашуляў лягчэй адпрасаваць, чым адну спадніцу! Але хто сам сябе паважае і мае што паказаць, той падпарадкуецца парыжскім дыктатам і будзе хваліць Бога за тое, што ён стварыў Міну. Апрача таго, яна тую працу робіць добра.

Праўда, з іншымі яе не параўнаеш, бо яна адзіная, але і гэта ўжо пра нешта гаворыць. Калі б цыраванне панчохаў было лёгкай справай, жанчыны б цыравалі іх самі, а калі б усе маглі плісіраваць спадніцы, дык напэўна плісіровачных майстэрняў было б столькі, колькі й цырульняў і фрызерскіх салонаў, і не залежалі б усе ад гэтай адной Мінінай.

Эх, мая ты дарагая, ведаю я як яно, казала Міна, зачыняючы майстэрню, як яна рабіла кожны раз папаўдні, і ішла на пошту атрымаць модныя часопісы або бандэролі з спецыяльнымі ніткамі, якія таксама прыходзілі з Мюнхена. Пасля ішла ў гарадскі акварыюм, у чыіх вадзяных казематах адбывалі зняволенне глыбакаводныя рыбы, да якіх яна адчувала нейкую пяшчоту ад таго дня, калі ўпершыню ўбачыла іх пятнаццаць гадоў перад тым. З тых часоў яна штодня наведвала рыб, апрача панядзелкаў, калі акварыюм быў зачынены. Яна размаўляла з імі, выслухоўвала іхнюю тугу, суцяшала іх і ўносіла трошкі святла і свабоды ў іх убогія жыцці. Калі яна ў нешта і верыла, Міна верыла ў тое, што Бог даручыў ёй быць рыбіным спаведнікам. Яны спавядаліся ёй у сваіх няшчасцях, а не грахах, бо рыбы не грашаць.

Рэгіна правяла яе да сходаў, якія спускаліся ў горад. *Ведаю я як яно,* сказала Міна трэці раз у той дзень. Рэгіна пайшла дадому паглядзець, ці Лука вярнуўся са школы. Той самы рытуал паўтараўся кожны будны дзень, але сёння ён будзе вызначальным для лёсу абедзвюх жанчын. Калі Міна на пошце чакала, пакуль паштар Віта знойдзе ў шэрых джутавых мяхах яе бандэролі, у дзвярах з'явіўся незнаёмец у дарагім шэрым гарнітуры з дзвюма скуранымі валізамі ў руках. Плячом ён прытрымліваў дзверы, спрабуючы праціснуцца ўсярэдзіну, але ўвесь час чапляўся за вушакі то з аднаго, то з другога боку. Напэўна ён бы разабраўся, паставіў валізы на зямлю, адчыніў насцеж цяжкія дзверы і проста б увайшоў, калі б усе позіркі не ўпіраліся ў яго.

Міне, паштару Віту і дзвюм нічым не занятым гарадскім дамам толькі што з'явіўся сам Рудольф Валентына! Пяць гадоў таму ўсе жанчыны яго ўжо адплакалі, а мужчыны рабілі выгляд, што ім усё роўна, або ім камень упаў з сэрца, бо ён, найпрыгажэйшы мужчы-

на свету, нават з адлегласці некалькіх тысячаў кіламетраў раздзімаў у іх полымя жывой рэўнасці. Ягонае поўнае імя, Радольфа Альфонса Гілельма ды Валентына д'Антанюола, для гарадскога пробашча, таксама мужчыны, было адназначным доказам, што яны мелі справу з д'яблам. Няўжо ж хрышчоная душа можа так звацца? І ў нядзельным казанні пасля таго, як горад цэлых сем дзён аплакваў Валентына, ён папярэдзіў мужчын, каб тыя пасачылі за сваімі жонкамі, сёстрамі і дочкамі, бо сатана ў іхніх сэрцах пасеяў сваё семя. З кожнай слязы, якую яны пусцяць па гэтым амерыканскім аферысту, узыдуць д'яблавы парасткі. І як парасткі з'ядаюць клубні, з якіх растуць, так што ад бульбін нічога не застаецца, так нічога не застанецца ад паганых жаночых сэрцаў. Так і ніяк іначай, дык хай мужы будуць пільныя! На гэта жаночы неф у касцёле на знак пратэсту ўстаў з лаваў і ўсе яны, апрача некалькіх баб, выйшлі прэч. Кажуць, што ў тую нядзелю ў кафедральным касцёле чулася і сакавітая лаянка. Прамовіў яе голас, які не належаў нікому з прысутных.

Для вернікаў гэта было недвухсэнсоўным доказам таго, што правялебны мае рацыю і што Рудольф Валентына сатана. А сатана ніколі не памірае, а толькі мяняе месца і час з'яўлення. Ён з'яўляецца нам у розных абліччах, найчасцей супрацьлеглым ягонай сапраўднай прыродзе. Дабрыня і нявіннасць, як і выразная фізічная прыгажосць – гэта заўсёды папярэджанне вернаму статку, таму лепш любому чужынцу з'яўляцца перад імі злым і брыдкім.

Убачыўшы незнаёмца, які спрабуе з валізамі ўвайсці ў дзверы пошты, і пазнаўшы ў ім аплаканага, але так яшчэ і не забытага актора з часоў, калі фільмы глядзелі толькі вачыма, усе чацвёра прысутных, нават і паштар Віта, на імгненне падумалі, што сатана ўвайшоў у іх горад замест таго, каб вярнуцца ў Амерыку. Цяжка ведаць, каму і дзеля чаго было прыемна, каб было так, і ці Віта таксама адчуў у сабе нейкую з жаночых прычын для шчасця, але яны сапраўды глядзелі на яго аднолькава і іх здзіўленне ад адной пары вачэй да другой нічым не рознілася. Міна ачомалася найхутчэй, падбегла да дзвярэй і насцеж іх расчыніла. Незнаёмец кіўнуў галавой і ўсміхнуўся. Ён падышоў да стойкі – незанятыя дамы адскочылі на пару метраў кожная ў свой бок – устаў перад паштаром Вітам,

глыбока ўздыхнуў, а паштар здзіўлена глядзеў і чакаў, якой жа мовай загаворыць чужынец.

Добры дзень і выбачайце, калі дакучаю нечым не звязаным з поштай, але я не ведаю, да каго мне звярнуцца. Я быў у цырульні, і яны паслалі мяне сюды. Дык вось, я шукаю кватэру! Не на дзень-два, а як найменей на шэсць месяцаў. Вось, дык калі можаце да некага мяне накіраваць, я быў бы вам вельмі ўдзячны, сказаў чужынец раптам па-сербску.

Віта збянтэжана глядзеў на чалавека: можа, яго паслалі з Каралеўскага двара. Можа, гэта нейкі прынц, але напэўна не Караджорджавіч; Караджорджавічы выглядаюць іначай, не такія элегантныя. Хоць і гэта не выключана, прынамсі паводле целаскладу: і Караджорджавічы зграбныя і высокія. Худыя і моцныя. А гэты, гляньце – тонкі, як дубец, а на руках мог бы перанесці па тры мяхі цэменту! Узяў бы яго Віта да сябе, карысна знацца з такімі людзьмі, кім бы яны ні былі і адкуль бы ні прыехалі, але не дай Божа паказаць яму свой дом! Гэта было б тое самае, як паспрабаваць пасяліць яго ў сабачай будцы або ў куратніку. Вось шкада, але так яму і трэба, калі пра чужое дабро ён заўсёды больш клапаціўся, чым пра сваё. Калі б ён быў інакшы, калі б думаў пра сябе, калі б марыў пра нешта іншае, а не пра тое, каб усё жыццё быць паштаром і паштовым службоўцам, ён збудаваў бы дом, у якім прымаў бы такіх людзей, і ўсё б тады ішло лепей. З кім ты – такі й ты сам, недарма кажа народ! Але цяпер усё, прапусціў нагоду, шкада, ах, шкада, думаў ён, качаючы галавой, і падаваўся незнаёмцу разумова адсталым. *Хадзіце да мяне,* прамовіла Міна. На імгненне ўсе былі агаломшаныя. *Але ж ты…,* пачала і запнулася адна з дзвюх дам. І Міне было неяк дзіўна чуць свой голас. У той самы момант усе чацвёра ўсміхнуліся. Яны адчувалі сябе як арыстакраты, што выпадкова сабраліся перад прыбіральняй на цэпеліне «Гіндэнбург». Нехта там ёсць. Сядзіць на ўнітазе з слановай косці і гуляе з залатым ланцугом спускавога бачка, а ўсім хочацца сікаць.

Яна завяла яго ў свой дом, у кватэру на другім паверсе, у які яна не зайшла ні разу ад таго дня, калі памерла яе сястра. Пэтка была на дзесяць гадоў старэйшая за Міну, яна таксама ніколі не выйшла

замуж, дый не патрэбны быў ёй ніхто іншы, бо яна мела сястру. Пэтчына смерць была адзінай сапраўды страшнай падзеяй у Мініным жыцці. Яна проста легла паспаць па абедзе, як рабіла заўсёды, і больш не прачнулася. Калі б было інакш, калі б Пэтка хварэла, калі б хоць нейкім знакам папярэдзіла пра свой адыход, сястры было б лягчэй. А так гэта была тая карцінка, якая блытае думкі і з'яўляецца неспадзявана. Калі здаецца, што ўсё добра і паўсюль мір, ёй раптам блісне ўваччу Пэтчын белы твар і паўрастуленыя вусны, з якіх вісіць тонкая нітачка сліны, танчэйшая за найтанчэйшы валасок, а на канцы маленькі шарык, які цягне нітачку ўніз і вось-вось сарвецца. Яна не памятае, ці гэтак урэшце і сталася, ці нітачка абарвалася, яна ўжо сапраўды нічога не памятае, бо ў наступны момант яна закрычала і выбегла з пакою і з Пэтчынай кватэры. І ўпала з каменных сходаў, што вялі на двор. Яна не ведае, чаго тады хацела, паклікаць на дапамогу, уцячы ад смерці, якая збіралася схапіць і яе? Або не хацела нічога, а таму і ўпала і месяц праляжала ў шпіталі, дзе дактары сказалі, што яна ўжо больш ніколі не будзе хадзіць. Яны заўсёды так кажуць. Што дактары ведаюць пра хаджэнне! Нічога не ведаюць. Яны не маглі ёй сказаць, ад чаго памерла Пэтка. Можа, ёй нашкодзіў з'ялчэлы алей? Або тое, што ў мангольду скончыўся тэрмін прыдатнасці? Мангольд трэба ёсці пакуль ён малады, перш чым ён згоркне і ў ім назбіраецца атрута. Хто ведае, якія атруты заб'юць чалавека, у чым і як яны назбіраюцца! Калі б людзі ўмелі берагчыся, яны ніколі б не паміралі. Смерць – гэта не натуральная справа, як натуральна мяняюцца вясна, лета, восень і зіма, а ўсе паміраюць ад нейкай хваробы. А ўсякая хвароба – ад нейкай атруты. І Пэтка памерла ад нейкай атруты. Міна гэта ведала, і ніхто ёй не мусіў казаць, што гэта так. Чалавек – беднае няшчаснае стварэнне, чалавек – гэта кот, які не ўмее ўцячы з трамвайных рэек. І невядома, што яго забівае! Калі б мы гэта ведалі, мы былі б анёламі! Ім шкодзяць тыя самыя атруты, што і людзям, але анёлы ведаюць, што́ атрутна, і бягуць ад яго чым далей. Чым больш атруты ў свеце, тым менш анёлы берагуць людзей. Няма калі і як, бо мусяць берагчы сябе. І добра, што так, бо калі б анёлы больш думалі пра людзей, чым пра сябе, неўзабаве і яны б пазнікалі. Як знікла Пэтка, і як табе, калі

ты старэеш, здаецца, што знікаюць усе, з кім ты жыў. А паміраеш ты, калі застаешся зусім адзін. Міна ўпэўненая, што гэта так. Яна не верыць у Бога і святых, бо не ведае, якім бы мусіў быць Бог і які сэнс у святых, апрача таго, каб яны цярпелі вечныя пакуты. Святых магла выдумаць толькі хворая фантазія! Але ў анёлаў Міна верыць! Анёлы ёсць, і іх бачыць кожны. Дзеці і дарослыя, вернікі і нявернікі, разумныя і тыя, хто зусім без розуму. Толькі што людзі не паспяваюць пазнаць, што гэта менавіта анёлы, і думаюць, што бачылі нешта іншае. Ні ў людзей, ні ў анёлаў няма часу. Таму трэба шкадаваць і адных, і другіх. Амаль так, як рыбаў. Пэтка, магчыма, была Мініным анёлам. А можа і не. Можа ўсё ж яна была ёй толькі сястрою. Хто ж будзе ведаць. Прайшоў час, шмат чаго забылася. І адкуль бы чалавек наогул ведаў, што нехта яму старэйшая сястра? Народзішся, і табе гэта скажуць! Але мала што дзецям кажуць, а яны пасля вырастуць і вераць.

Мучылася Міна і больш ніколі не заходзіла ў Пэтчыну кватэру. Цэлыя два гады. Каб не пабачыць зноў тую карціну, або нейкую іншую яшчэ страшнейшую.

А цяпер яна ўсё ж адмыкае тыя дзверы, а за спінай у яе стаіць Рудольф Валентына. Ну, праўду кажучы, нехта як дзве кроплі да яго падобны, Міна ж не дурная, каб верыць у ксяндзоўскія казкі! І адкуль бы Рудольф Валентына ведаў нашу мову. Ён дыхае ў яе за спінай, быццам і ён спалоханы.

Такі прыгожы, прашаптала Міна, прыклала ўказальны палец да вуснаў і паказала на столь. *Што з табой?* збянтэжылася Рэгіна. Яшчэ ніколі сяброўка не загаворвала першая і ніколі не здаралася так, што, калі Рэгіна прыйдзе, тая будзе проста сядзець сярод панчохаў, якія трэба цыраваць, нічога не рабіць, а толькі лупіць вочы, як тыя яшчаркі, што ўлетку з тэрасы пралезуць у халаднаватую спальню і глядзяць на тых, хто прылёг паспаць папаўдні, позіркам вельмі старых людзей, калі тыя спыняцца перад нечым прыгожым, што ляжыць у пыле на дарозе.

Такі прыгожы, мая ты дарагая! Не можаш сабе ўявіць, працягвала Міна. *Ты пра каго?* спыталася Рэгіна. Можа, Міна звар'яцела ад доўгай адзіноты; прыціснулі гады, якіх больш, чым можна сабе

ўявіць, калі ты дзяўчына і табе дваццаць шэсць, а ты ведаеш, што і гэта ўжо шмат, зашмат з увагі на тое, чаго ты не пачала рабіць, а мусіла б. Тым больш зашмат з увагі на тое, што ўжо прайшло і ні на волас не пасунула цябе далей ад таго дня, як ты перастала быць дзіця. Міна старая чарапаха, дробная галоўка ўсміхаецца, вылезшы з завялікага панцыра, і ты думаеш, гэта дзюба пасярод яе твару ці ўсё ж нос; што маюць чарапахі – дзюбу ці нос?; але ніхто не ведае, бо нікому няма справы. Занадта старая на ўсё, Міна павольна пераходзіць з аднаго боку на другі. Нешта, што сёння палохае Рэгіну з таго другога боку, спалохала б кожнага, хто ведае і любіць Міну. Такіх мала, і Рэгіна між імі першая. Так яна думае. Або думала. Калі Міна састарыцца, яна будзе аб ёй клапаціцца і заменіць ёй Таго, якога яна ніколі не сустрэла. Людзі пераважна жэняцца і выходзяць замуж з думкамі пра старасць, уласную нямогласць і смерць. Уяўляюць сабе, як той другі будзе іх даглядаць, карміць курыным булёнам і пасоліць зямлю, якая іх накрые. Іншых прычын няма. Толькі гэтая. А тады ты задумваешся ці гэта эгаістычна, калі кожны і кожная думаюць, што памруць першыя. А той і тая будуць тады не спаць начамі і перабіраць чорнае адзенне ў шафах. Мужчынскае жалобнае адзенне заўсёды складзенае пад жаночым, бо такі ўжо гэты наш свет. Мужчыну трэба дагаджаць. Аднак праўда, што ён часта памірае першы. Інакш быць не можа, смерць забірае паводле свайго, а не людскога выбару, і прайграюць тыя, хто застаецца паміраць самотны. Міна не памрэ самотная! Рэгіна даўно гэта вырашыла, але цяпер вагалася. Міна вар'яцее, а з вар'яцтвам маладая сяброўка не хоча мець справы. Вар'яцтва гэта ганьба, і ніхто не вар'яцее выпадкова. У кожнага вар'ята ёсць дробнае жаданне звар'яцець. Па сваёй волі не паміраюць, але вар'яцеюць заўсёды па сваёй волі. Рэгіна ўпэўненая ў гэтым ранняй вясной 1931-га. І часта пра гэта думае. Пра вар'яцтва і вар'ятаў. Пра Бэпу Озрэціча, які мармыча старыя турэцкія лаянкі, нікога не пазнае, не абернецца і нават не здрыганецца, калі дзятва выкрыквае яго імя. І смярдзіць гаўном і мачой. Не можа быць, каб ён сам гэтага не хацеў. Некалі ён быў капітанам карабля, меў сям'ю і шэры каменны герб над уваходам у дом. Найперш ён малатком збіў герб, а пасля пачаў смярдзець гаўном і ма-

чою. Так ён захацеў, так яму і трэба, і нармальна, што больш няма ў яго ні родных, ні сваякоў.

Міна, ты мяне палохаеш, каб ты толькі ведала, як ты мяне палохаеш. Каб пасля не казала, што не ведаеш, што са мной было, сур'ёзна прыгразіла Рэгіна. *Памятаеш, як Рудольф Валентына цалуе пустынную ружу, працягвае яе той дзяўчыне з малым роцікам, але ружа ў яе выпадае ў мора, а ён на яе глядзіць, і канец. І мы не ведаем, што было далей. Дык вось, дзеўка ты мая, ён цяпер наверсе, але не на небе, а там, у кватэры нябожчыцы Пэткі. Сёння раніцай пайшла я на пошту, і якраз калі Віта шукаў мае бандэролі, раптам заходзіць ён. У руках дзве валізы і кажа, што шукае кватэру. Ня ведаю, што са мной было. Я сказала, што ў мяне ёсць пустая кватэра. Я не звар'яцела. Ідзі нагару і паглядзі.*

Рэгіна раз'юшана ўстала, крэсла зарыпела на каменнай падлозе майстэрні. Яна рушыла па сходах, вырашыўшы, што як найменей пяць дзён не зойдзе да Міны, калі пабачыць, што наверсе нікога і нічога няма. Але на сярэдзіне сходаў яе агарнуў страх. А што калі наверсе ўсё ж нехта ёсць? Не, не можа быць, каб быў! Міна гуляе з яе нервамі, ведаючы, што Рэгіна якраз да такіх рэчаў адчувальная. Яна ўсё прабачыць, але гавары з ёй сур'ёзна або прынамсі сур'ёзна маўчы. Левай, слабейшай рукою яна схапілася за ручку. Дзверы Пэтчынай кватэры не былі замкнутыя. Міна сапраўды свіснула розумам, калі праз два гады іх адамкнула. У гасцёўні не было нікога. Пахла пылам. Могілкі пчол, мурашак і іншай хатняй жамяры. Фатэлі прыкрыты белымі просцінамі, дыван напалову з'ела моль, толькі яна выжыве ў магіле. У спальні над шлюбным ложкам вісіць фатаграфія бацькі і маці, рыпіць драўляная падлога. У кухні сухое пустыннае павета, ужо даўно ніхто не адкрываў кран. Ну так, нікога няма, праўда, засталіся яшчэ толькі адны дзверы. Як у казцы пра Баш-Чэліка*! Ці там былі сёмыя ці дзявятыя дзверы? Тут толькі чацвертыя або пятыя, залежна ад якіх пачнеш лічыць.

Рэгіна схапіла і тую ручку і моцна штурхнула дзверы, яна была злая, і трэба было гэта ўсім паказаць, хай дзверы бразнуць аб сцяну. І бразнулі. А перад ёй з'явіўся абсалютна голы мужчына. Яна не бачыла ягонага твару, толькі вочы. А вочы былі вялізныя і поўныя змроку.

Яна рэзка апусціла позірк, нібыта баючыся, што тыя вочы яе сурочаць. А ўнізе ў яго вісела, а пасля двойчы падскочыла тая штука. Яна бачыла яе толькі на карцінках, але ўжывую яна выглядала інакш. Як гумовая дзіцячая цацка, якая разгортваецца і скручваецца сама па сабе. Як каўбаса з свіной крыві, тоўстая і тлустая, з сінімі шышкаватымі жыламі і буйной галавою.

Яна закрычала: *Мінаааа, Мінаааааа, божачкі!* і паспяшалася ўніз па сходах.

Нейкім цудам, а можа гэта было і нармальна, яна не скацілася, як Міна, калі ў яе памерла сястра, хоць яна была ніколькі не менш уражаная. Сэрца білася, як шалёнае, страх праглынуў яе і ўціснуў у маленькую шапачку жолуда. Ёй здавалася, што яна не можа рухаць рукамі, хоць махала імі, як вятрак, і што ногі ў яе не могуць зрушыцца з месца, хоць яна збегла наніз хутчэй за сусветных рэкардсменаў у доўгай гісторыі спартовага бегу.

Яна стаяла перад Мінай, перарывіста дыхала і не магла нічога сказаць. Тое, што яна збіралася сказаць, ужо глытала наступная думка і сказ, а іх новая, і зноў новая, так што яна маўчала, дыхала і дрыжала, як верабей у куце пакою, з якога ўсю раніцу хацеў уцячы, а калі яго ўрэшце выпускаюць з акна, ён не можа ўзляцець.

Я ж табе казала! Міна ўзяла першую панчоху таго дня. *Мая ты дарагая, ну чысты Рудольф Валентына. Радольфа Альфонса Гілельма ды Валентына д'Антанюола. Ён ёй ружу, а ружа падае ў мора! Эх, чортава дзеўка. А ўсё толькі каб ён яе пацалаваў!*

Наступных пяць дзён Рэгіна сапраўды не заходзіла да Міны. Мала таго, яна наагул не высунула носа з дому. Баялася, каб іх не сустрэць. Яе або яго, ёй было ўсё роўна. Мабыць, яна б не пазнала яго апранутага, але ён бы яе пазнаў! Можа, падышоў бы да яе, выбачыўся за сваю галізну або спытаўся, што гэта за манера ўваходзіць у чужую лазенку без стуку. Або пачаў бы тыя тлустыя і брудныя мужчынскія размовы, горды тым, што яна бачыла яго ва ўсёй яго велічы. Мужчыны гэта любяць, яна не ведае, адкуль яна гэта ведае, але напэўна ж любяць. І што ён цяпер наагул думае, і што сказаў Міне, і што Міна яму адказала? Пэўна ж не «мая ты дарагая».

У той момант, калі яна зразумела, што не ведае, якімі словамі

Міна звяртаецца да мужчынаў, што кажа ім замест «мая ты дарагая», а нешта ж ім напэўна кажа, бо не можа быць, каб яна з імі яшчэ больш маўчала або не мела патрэбы ў ніякіх словах-паразітах, Рэгіну ахапіла рэўнасць. Найперш яе мучыла не тое, што яна з ім, а тое, што ён з ёю. Яны былі найлепшымі сяброўкамі, не праходзіла дня, каб яны не бачыліся, а цяпер, вось, мінае ўжо пяты, як яе няма, а Міне гэта можа і не ў галаве. Дый як, калі яна напэўна цяпер трымае ў руцэ тую тоўстую тлустую штуку і не ведае, гадаўка старая, куды яе ўставіць!

Ці ёй хоць прыйдзе ў галаву, што я хворая, думала Рэгіна. А што калі я памерла? Або залезла на гарышча, закінула вяроўку за бэльку і з пятлёй на шыі вагаюся, ці застацца мне на гэтым свеце? Або мяне ўкусіла аса, я ўся распухла, і няма нікога, хто б прынёс мне лёду, каб суняць ацёк? Урэшце, я магла б скаціцца па сходах, як яна сама, бо нейкія рэчы ў жыцці паўтараюцца. Калі ты аднойчы ўчыніў вялікае зло, учыніш яго і другі раз. Калі ты аднойчы выклікала на сябе вялікае няшчасце, то зробіш гэта зноў. Так думала Рэгіна, стоячы пры верху сходаў, якія вялі ў горад, і прыглядаючыся, як бы спатыкнуцца, зламаць шыю і ўпасці на душу вераломнай сяброўцы. Яна гэтага не зрабіла. Можа й зрабіла б, толькі каб знайшоўся нехта, хто яе штурхне, столькі злосці і адчаю сабралася ў ёй ад таго, што Міна засталася адна з Радольфам Альфонсам Гільельмі ды Валентына Д'Антанюола, чыя вялізная мужчынская штука, падобная на біч Божы ў вачах грэшніка, усё больш расла і ператваралася ў абеліск, які, замест таго, каб расці з зямлі, падае ў яе бок і ледзь не дакранаецца да дробнай жаночай істоткі, якая, дрыжучы, поўзае ля Кальварыі. Некалі Рэгіне гэта будзе падавацца смешным. Смешнымі будуць ёй уласныя пакуты, і будзе яна па іх сумаваць, бо ў такім выглядзе яны ўжо больш ніколі не паўторацца.

На шосты дзень яна ўзяла з шуфляды дзве пары старых падраных панчохаў, якія трэба было ўжо не цыраваць, а выкінуць, вырашыўшы прынізіць Міну. Не будзе ў яе ні пра што пытацца, а проста кіне ёй пад нос панчохі. Цыруй, старая векавуха! цыруй, сухапіздзіна няшчасная! Вось што яна прыдумала, так яна ёй скажа, каб ведала, дзе яе месца, або хоць на імгненне зразумела, што яна

страціла, калі пусціла да сябе гэтага маладога д'ябла, а яе выкінула з дому і разбіла сяброўства важнейшае за жыццё. Яна зайшла ў майстэрню. Міна плісіравала чорную спадніцу, адну з дваццаці для хору, які паедзе ў Бялград на святкаванне дня народзінаў караля.

Дзе ж ты, дарагая мая, была ўсе гэтыя дні? Мы ўжо пачалі хваляваца. Яны пачалі хвалявацца! Рэгіна паглядзела навокал, што б тут можна было разбіць, можа, трэснуць кулаком па аконнай шыбе? Не, гэта было б занадта! І яна з усёй сілы пнула нагой стары збан, імітацыю кітайскай вазы, куплены некалі даўно ў Трыесце, у які рэдкія кліенты-мужчыны ставілі кійкі і парасоны. Збан адляцеў у другі канец пакою і разбіўся ў друз.

Сухапіздзіна праклятая! крыкнула яна, і ў Міны выпала з рук спадніца.

Гэта быў бы сапраўды эфектны канец аднаго сяброўства і пачатак вялікай жыццёвай рэўнасці, калі б Рэгіна трошкі не перабольшыла або калі б збан не быў такой кепскай працы, з цяжкай абпаленай гліны, масіўны, як гаршкі, у якіх перад гатэлем «Асторыя» растуць афрыканскія пальмы. Калі яна паспрабавала выбегчы з майстэрні, ёй забалела нага, такім болем, якога яна яшчэ ніколі не адчувала, і яна ўмомант зразумела, што не выйдзе адсюль. Яе заліў сорам, бо яна так па-дурному страчвае ўсё тое, што назапасіла за гэтыя пяць дзён. Яна паспрабавала яшчэ раз стаць на нагу, і ёй затуманілася ў галаве. Яна адчула, што патанае ў вялікіх паках бавоўны, якія некалі даўно, у першы месяц вялікай вайны, выгружалі з англійскага карабля, які прыйшоў з Егіпту і не мог плыць далей. Яна падумала, што, можа, памірае, і ёй зрабілася крыху лягчэй.

Апошняе, што яна бачыла, былі Мініны ногі, белыя, як сапсаваны авечы сыр, з сіне-бэзавымі жылкамі, якія лопаюцца адна за адной. Як толькі лопне апошняя, гэтая старая жанчына памрэ. Яна падумала пра рэльеф правільных сініх жылак, і патанула ў змрок.

А тады яна пабачыла над сабой ягоны твар. Дакладней, адчула, як яго рука прыбірае ёй валасы з твару. Ён зрабіў гэта асцярожна, каб не дакрануцца да скуры. Яна расплюшчыла і адразу заплюшчыла вочы, робячы выгляд, што спіць, што яе няма. Мёртвая, але нейкім цудам дыхае. Так не магло цягнуцца доўга, бо як толькі прыгажун

пачаў пляскаць яе па шчоках, што ён напэўна бачыў у фільмах пра рускіх графіняў, яна канчаткова зрабілася відушчай, прастрэліла яго вачыма дзікага Гаяваты і спрабавала прыдумаць лаянку, якою паслала б яго туды, куды ўжо выправіла сяброўку. Але з усіх брыдкіх словаў Рэгіне прыходзіла ў галаву толькі адно, якое яна не наважвалася вымавіць, бо правалілася б скрозь зямлю. Між вуснаў у яе было слова, якое ў той дзень, у лазенцы нябожчыцы Пэткі з лаянкі ператварылася ў жывую пакуту.

Была нядзеля, калі Арыс Бэрбэр'ян на сваіх руках нёс Рэгіну Сікірыч у гарадскі шпіталь. Яна абняла яго за шыю, Міна ішла за імі і раз-пораз прытрымлівала ёй хворую нагу, быццам гэта нечаму дапаможа, а ён гераічна нёс найвялікшы цяжар, які яму ў жыцці давялося паднімаць. Ні разу не апусціў яе, каб адпачыць, ні разу не азваўся гукам, ні разу ў яго не задрыжалі рукі. Яны спускаліся па сходах у горад, і іх бачылі ўсе, хто трэба.

Тым надвячоркам жонкі зрабіліся асабліва сцярвозныя да сваіх мужоў, маладыя дзяўчаты зачыняліся ў сваіх пакоях, накрываліся з галавой пярынаю і горка плакалі, спадзеючыся задыхнуцца. У той вечар ніводзін муж у дамах уздоўж дарогі, якая вяла ад дома Сікірычаў да шпіталя, не атрымаў вячэры. У тую ноч не было зачата ніводнага дзіцяці. Мужчынская палова гораду разгубілася ў здзіўленні. І толькі тыя, хто хавае ў сабе ганебнае семя педэрастыі, ведалі з чым маюць справу. А жаночая палова гораду адчула ў сабе супольную і ніколі не прамоўленую прычыну для рэўнасці і нянавісці, якія ад таго дня і да смерці будуць суправаджаць Рэгінін цень.

Ужо даўно не будзе жывых жаночых клубоў, якія з вокнаў і балконаў млелі па тым, каб Арыс Бэрбэр'ян і іх гэтак насіў, але рэўнасць і нянавісць будуць жыць надалей.

Тры костачкі трэснулі, сказаў доктар Мікуліч, *хутчэй за ўсё застанешся кульгавая*. Рэгіна паціснула плячыма і адвярнулася. Яна не ведала, што дактары заўсёды так кажуць. Арыс зноў апусціў руку ёй на валасы, гэтым разам каб дакрануцца да яе і суцешыць. Ён усё яшчэ не адчуваў да яе нічога канкрэтнага. Як часта бывае ў занадта прыгожых мужчынаў, нашых малых местачковых Апалонаў, так і ён

быў пазбаўлены дару або ўмення ўбачыць сябе вачыма супрацьлеглага полу і адчуць, як ягоная аўра сустракаецца з іншай аўрай.

Але пройдзе ўсяго тры дні, і Арыс у тым самым шпіталі ўпершыню пранікне за Рэгініны патаемныя вусны і трапіць туды, дзе да таго ніводнага мужчыны яшчэ не бывала. Здарылася гэта ўвечары, калі дзяжурны доктар, стары Джуліё Дэвэра, па звычцы спаў у пральні, а санітар Хамза Бэгая падлічваў дынары, якія атрымаў ад Арыса, і прыслухоўваўся да гукаў, якія даходзілі з-за сцяны. Яму здавалася, што ён чуе скуголенне выжлы, якая трапіла ў лісіную пастку, або плач маладой Рызванбэгавічны, якая спараніла дзіця і страціла розум. Хамзу, які не быў дасведчаны ў мужчынска-жаночых справах, палохала тое, што ён чуў, яго грызла сумленне, ён быў пераканаы, што праз гэта страціць працу, а можа і трапіць за краты. У тую ноч ён быў адзіны, хто пакутаваў.

Рэгіна не засталася кульгавая, яна хадзіла нармальна ўжо праз тры тыдні, а дактары зноў думалі, што маюць справу з цудам. Дробныя косці найпавольней залечваюцца і найчасцей крыва зрастаюцца. Але вось, у яе зрасліся дачасна, кожная на сваім месцы і ў тым парадку, як вызначыў Бог. Збан, які яна разбіла нагою, прынёс ёй першае сапраўднае каханне. А тады яна прайшлася па горадзе з чужынцам пад руку і так пацвердзіла тое, што ўсе ўжо і так ведалі. І хоць жанчына, якая ідзе пад руку з невянчаным мужчынам, не абавязкова лічыцца жанчынай лёгкіх паводзінаў, Рэгіна адразу зрабілася курвай. Прычына была ў Арысавай прыгажосці. Бабы прыгадалі пробашчавы словы пра жалобу па Рудольфу Валентына, а жанчыны, якія зрабілі скандал, пакінуўшы імшу, у міжчасе ўвайшлі ў гады, напоўненыя незадавальненнем і нянавісцю да саміх сябе, таму былі да Рэгіны яшчэ больш жорсткія. Яна ва ўсім гэтым бачыла толькі гульню, у якой загадзя адчувала сябе пераможцай. Яе не хвалявалі дакорлівыя цмоканні языкамі, якія чуліся з цемры вінных пагробаў, не праймалася яна і тады, калі жанчыны, сустрэўшы іх разам, дэманстратыўна пераходзілі на другі бок вуліцы.

Задрала хвост, сучка, сказаў брат Домінка Мілюш, тройчы пражагнаўся і працёр зубчыкам часнаку клямку кляшторнай брамы. На ўсялякі выпадак, калі за яе возьмецца нехта, чыя рука даты-

калася Рэгіны, хоць бы выпадкова ідучы міма. Брат Домінка нейкім метафізычным нюхам адчуваў, што неўзабаве д'ябал прыйдзе па сваё, крыжы ўткнуцца ў зямлю дагары нагамі, у людзей раты вывернуцца навыварат, а бялкі вачэй напоўняцца крывёю і цемрай. Агулам кажучы, ён казаў праўду. Тое самае адчувалі мільёны еўрапейцаў, але, як Абрагамавы сыны не ведалі, з якога боку грозіць небяспека, так і ён не пазнаваў сапраўднага твару нячыстага. Гісторыкі пасля будуць сцвярджаць, што гэты твар было відаць на кожным кроку, але брат Домінка як дзіця свайго часу бачыў яго ў каханні прыстойнай гарадской дзяўчыны і нездарова прыгожага чужынца. Ён абмазваў клямку часнаком і чытаў малітвы, якія меў на сэрцы. Супраць голаду, чумы і нячыстага, супраць тых, хто нічога не разумее, супраць хрышчаных і няхрышчаных душ, якія свядома або несвядома апынуліся на д'яблавым шляху. Ён заўсёды маліўся супраць нечага, глыбока верачы, што Ўсявышні і сам ведае, каго надзяліць сваёй ласкай, але, магчыма, забываецца, каго трэба паслаць у найглыбейшыя пякельныя каморы, каб гэты свет быў уратаваны.

Цэлых дзевяць месяцаў – столькі манах абмазваў клямку – у маладых багасловаў далоні, складзеныя для малітвы Хрыстовай, пахлі часнаком. Ад вясны і да зімы таго 1931 года цягнуўся сезон плыткага і млявага сузірання. Выявілася, што ў касцельным рытуале пах часнаку можа нашкодзіць больш, чым можа дапамагчы водар фіміяму. Магчыма, Госпад наш забыўся б пра сваіх дзяцей, не чуючы галасоў іхніх сэрцаў, калі б каханне працягнулася даўжэй і калі б Арыс Бэрбэр'ян не знік з гораду так раптоўна, як у ім з'явіўся. Пасля таго і сучка апусціла свой хвосцік, а вочы ў яе напоўніліся слязьмі.

Чаму Арыс уцёк ад Рэгіны? На гэтае пытанне яна ніколі не знойдзе адказу, а пакуль будзе яго шукаць, яно будзе вызначаць яе жыццё і вадзіць яе туды, куды, калі б не было яго, яна, магчыма, ніколі б не пайшла. Пасля першай шпітальнай ночы, якую яны правялі разам, яны зрабіліся адно для аднаго ўсім тым, чым толькі могуць быць адно аднаму каханкі. Яна знайшла чалавека свайго жыцця, з якім будзе нараджаць дзяцей і збудуе дом на беразе мора, далёка ад суседзяў і злых галасоў з-за сценаў, чалавека, з якім будзе сядзець у альтанцы пад вінаграднымі лозамі, слухаць пчаліны гуд над гронкамі, якія

лопаюцца пад вераснёўскім сонцам, і глядзець на ветразі ў адкрытым моры, пад якімі плаваюць пражскія прамыслоўцы; яна знайшла чалавека, з якім будзе бавіць час, пакуль заходзіць сонца, і з якім яна сустрэне смяротную часіну, у адным ложку, у той самы момант, трымаючыся за руку пад фатаграфіяй з вяселля, якая застанецца ўнукам і якія забяруць яе з сабою ў іншыя гарады і краіны.

Арыс умомант забыўся пра бацьку і пра зямлю, пад якую сабраўся легчы, адвакацкую кантору, якая ўжо пакрывалася пылам, а пад яе дзвярмі расла гара запрашэнняў на дыпламатычныя балі, пажарныя забавы і таварыскія вечарыны, на сход крыміналістаў у Апатыі, віншаванняў з нагоды забытых гадавінаў і судовых рашэнняў, якія ўратавалі забойцаў ад смерці. Ці ён пакахаў Рэгіну, ці яна яму проста дапамагла аддаліцца ад сваёй мінуласці і ўцячы ад учыненага ім падману, на гэтае пытанне Арыс не меў адказу дый сур'ёзна пра яго не думаў. Зрэшты, у Арыса не было сумневаў. Каханне – гэта ўсё, што не нагадвае пра абыякавасць, няшчасце і нянавісць.

Але першы крок, які ён зрабіў ёй насустрач, быў для яго і апошнім. Ён бы згадзіўся так жыць да канца жыцця, за пяцьдзясят метраў ад яе дома, прымаючы яе кожную ноч у свой ложак і прачынаючыся адзін, бо яна а пятай бегла дадому, каб там не заўважылі, што яе няма. Яго палохала ўсё, што было большае за гэта. Або ён не мог вытрымаць рытм, у якім Рэгіна планавала будучае жыццё.

Наступнай вясною яны пажэняцца, яшчэ праз год у іх народзіцца першае дзіця. А тады ўжо трэба думаць пра пабудову дома! Або можа было б лепей адразу ўсё кінуць і паехаць з гораду? Амерыка? Можа, Італія? Кажуць, што Новая Зеландыя – рай на зямлі; хоць яна і далёка, недзе пасярод акіяну. А і добра быць чым далей. Там, куды не дабяруцца тыя, ад каго ўцякаеш. А можа, Заграб або Новы Сад? Гэта прасцей. Звіць гняздо сярод свайго народу і звычаяў, якія табе не чужыя.

Ён цярпліва адхіляў Рэгініны ідэі і прапановы. У кожнай ён знаходзіў слабое месца або фабрычны дэфект, а яна ўсміхалася і казала: *ага, я пра гэта нават не падумала,* але не праходзіла і паўгадзіны, а ў яе ў галаве было ўжо нешта новае, нейкая ідылія, у якой ён адразу знаходзіў нейкую хібу. Замест таго, каб падумаць,

што насамрэч Арыс проста яе не хоча, што б зразумела кожная разумная жанчына, Рэгіна ўяўляла, што нешта з ёй не ў парадку. Яна няўдала плануе, выдумляе смешныя рэчы і ўжо даўно зусім страціла б галаву, калі б не ён. На шчасце, Арыс нагэтулькі ж і разумны, наколькі прыгожы, і заўсёды кажа ёй чаму нядобра тое, што яна прыдумала. Але апрача гэтага ён яшчэ і добры, дазваляе ёй і далей выдумваць, планаваць і фантазіраваць. Іншы б ёй навязаў сваю волю, але ён гэтага не робіць! Ён чакае, пакуль яна знойдзе нешта, што прынясе ім шчасце і будзе разумным! У тым самападманлівым чаканні міналі месяцы, пакуль Арыс не зразумеў, што з адной пасткі трапіў у другую. Рэгініны планы шчасця былі падобныя да бацькавых пытанняў пра тое, што такое справядлівасць. Блізіўся час новых уцёкаў.

Міна цыравала панчохі, плісіравала спадніцы і рабіла выгляд, што нічога не заўважае і не разумее. Мужчына, які пасяліўся ў дом страху і смутку, вызваліў яе ад Пэтчынай смерці. Яна адчыняла любыя дзверы, праходзіла праз пакоі, заходзіла і ў той, дзе абарвалася тонкая нітка сліны з шарыкам на канцы, яна выціралa пыл і перастаўляла рэчы, якім было наканавана ніколі больш не скрануцца з месца, на якое паставіла іх мёртвая рука анёла. У дні без задушлівай адлігі, калі паветра было як празрыстая вада, а зоркі складваліся ў малюнкі дзіцячага шчасця, Міна ўсміхалася сама сабе. Яна гаспадарыла над лёсам і страхам, нема разводзіла рукі і павучальна ківала галавою, быццам нехта на яе глядзеў. Смешнымі здаваліся тыя дні, месяцы і гадзіны, калі яна пазбягала пустога дома. Але вяртання няма – было і не паўтарылася! Ты раб сваіх відзяжоў і застанешся ім назаўсёды. Калі выйдзеш з рабства – што магчыма, калі маеш шмат удачы і прыхільнасць анёлаў – у няволі застануцца тыя гады, якія ты страціла. Яна адчувала гэта пагоднымі днямі, калі прыбірала ў Арысавых пакоях і ўзнімала аблокі пылу, якія памяталі Пэтчын эпітэлій, яе валасы і пазногці. Сонечны прамень найлепш вымалёўваецца ў воблаку пылу. Толькі тады ты ясна яго бачыш з усімі гранямі, калі ён востра адбіваецца ў крышталёвым люстэрку дзявочага псішэ*.

Чаму гэты прадмет мэблі завецца амаль аднолькава, як і чала-

вечая душа-псіхея ў паданнях тых, што не верылі ў Бога? Таму, што дзявочыя псішэ ў старых гарадскіх кватэрах – гэта кенатафы маладых душаў. Тут Пэтка ўпрыгожвалася, часалася і фарбавалася для кахання, якое так ніколі і не прыйшло. Псішэ – гэта месца дзявочай надзеі, а надзея – гэта найбольшае, што мае душа. Душа без надзеі – гэта душа старой жанчыны. Старасць прыходзіць рана, значна раней, чым мужчыны перастаюць азірацца за табою. Старасць прыходзіць тады, калі збудуеш вакол сябе муры, праз якія не можа прайсці каханне. Пэтка збудавала іх рана, а Міна ўзяла прыклад з старэйшай сястры. Яны засталіся старымі дзеўкамі, што лічыцца другім найбольшым сорамам у гэтым горадзе. Першым было б, калі б людзі абвясцілі іх курвамі. Або яшчэ горш – бываюць і такія выпадкі – калі б іх называлі і старымі дзеўкамі, і курвамі. У гэтым выпадку не было б ціхага шкадавання, па якім людзі адрозніваюць жанчын без кахання ад жанчын, якія ў каханні перабольшваюць. Перамена, якую Арыс прынёс у Мініна жыццё, была накшталт спазненай рэвалюцыі, але яна спарадзіла нейкае ціхае шчасце. Прынамсі яснымі і сонечнымі днямі і начамі, калі дасканала сыходзіліся зоркі. Тады яна набіралася смеласці рабіць тое, чаго не наважвалася раней. Яна гаварыла з Пэтчыным ценем, гучна смяялася свайму страху, выцірала пыл, які пад яе рукою ператвараўся ў шэрую авечую воўну. А тады яна кранала нейкую з ягоных рэчаў, і яе сэрца пачынала шалёна біцца. Памазок для галення, брытву з дзержаком з слановай косці, пояс з арлінай галавою на месцы спражкі, гладкую і цвёрдую скуру яго чаравікаў. У лакаванай чорнай паверхні яна бачыла свой твар, маршчыністага брыдкага гнома, які бязгучна смяецца. А тады палохалася, што Арыс можа нечакана вярнуцца. Яна скакала па паркеце, не ведаючы куды бегчы. Яе папераменна залівалі хвалі гарачыні і ледзянога поту. Усё, што мужчына пакідаў па сабе, было такое прывабнае і небяспечнае. Яна знайшла чырвоную гумовую клізму, адчула ў горле жменю арэхаў і не магла дыхаць. Бедны, калі б ён ёй толькі сказаў, яна б згатавала яму гарбаты для такіх рэчаў! Але яна хутка прагнала непатрэбную думку. Яна сціснула клізму безыменным пальцам, зашыпела паветра і запахла рамонкам, некалькі драбочкаў пылу падляцелі да неба. Яна выбегла з пакоя і замкнула

дзверы. Калі ён раптам прыйдзе, яна яму скажа, што спалохалася. Яна лягла на ягоны ложак, падушка ўвабрала ў сябе лаванду ягоных валасоў, сэрца вырывалася з грудзей, як дзесяць галернікаў, што скачуць з карабля, які тоне. Некалькі секундаў яна не ведала, што рабіць, пасля пабегла ў лазенку і напаўдарозе абсікалася.

Цудоўна жыць з таямніцай. Нехта б сказаў, што яна занадта позна гэта зразумела, але яна не бачыла ў гэтым праблемы. Так яно й лепей, жыць у каханні, калі свайго кахання ты больш не мусіш ні патрабаваць, ні выяўляць. І калі нічога ад яго не чакаеш, а менш за ўсё, каб атрымаць на яго адказ. Яна была шчаслівая, што ён і Рэгіна кахаюць адно аднаго, і верыла, што так будзе заўсёды. Баялася толькі, што яны яе пакінуць, паедуць у Амерыку і Аўстралію, усё роўна куды, і яна застанецца адна. Рэгіна здзівілася, калі Міна ёй сказала, што гэта глупства, што няма шчасця ў чужой старане. Гэта быў першы раз, калі яна нешта пракаментавала і знайшла нейкую хібу ў тым, што прыдумала Рэгіна. Раней яна б згадзілася, калі б нават Рэгіне прыйшло ў галаву прыляпіць сабе лебядзіныя крылы і ўзляцець з вяршыні Срджа. І яна мусіла ёй гэта сказаць, хоць ёй і запякло ў сэрцы, бо яна не магла згадзіцца, каб гэтыя двое паехалі, каб Арыс забраў свае малыя страшныя прадметы, а падушка перастала б пахнуць ягонымі валасамі. Яна патанала ў сон, калі з Пэтчынай кватэры чула рыпенне ложка, калі чуліся далёкія крыкі, у якіх яна ніколі не пазнала б іх дзённыя галасы. Але цяпер яна іх пазнавала, і ёй здавалася, быццам яны належаць ёй. Ёй ніяк не хацелася іх страціць.

За месяц да Арысавых уцёкаў Міна зразумела, што́ адбудзецца. Ведала яна і чаму так будзе. Сляпая ад кахання і жарсці, Рэгіна ўсё мацней тулілася да яго. І бывала сляпая і глухая да ўсё больш відавочных знакаў Арысавага адступлення.

Эх, мая ты дарагая, калі б ты даражыла сваім шчасцем, ты б раскрыла чацвёра вачэй і чацвёра вушэй, вырашыла Міна і ўхапіла нагоду, каб ёй гэта сказаць.

Замест таго, каб яе зразумець або прынамсі нешта западозрыць, Рэгіна толькі ўсміхнулася. Яна ўсміхалася ад шчасця, усяму, што ёй казалі або замоўчвалі, і была закаханая так, як у чалавечых істотаў

здараецца выключна рэдка. Як самец багамола. Ён з поўным даверам і з чыстым сэрцам ідзе на смерць, перакананы, што няма нічога лепшага за гэта. Калі здараецца такое каханне, людзі, як правіла, застаюцца жывыя, але нешта ў іх усё ж памірае. Кожная будучая закаханасць у іх будзе поўніцца сумневам, а кожную будучую паразу – калі яна наогул магчымая ў сумневе – яны пераносяць цяжэй. З паразы яны выходзяць інакшымі, але бясспрэчна горшымі і больш няшчаснымі, чым былі. Яны палюбяць іншыя колеры, ім перастануць падабацца ўлюбёныя стравы, ва ўсім, у чым былі добрыя, яны зробяцца дрэннымі, спрактыкуюцца ў планаванні няшчасцяў, зробяцца злачынцамі.

Міна больш не хадзіла па Арысавых пакоях і дарэмна спрабавала змірыцца з тым, што набліжалася. Яна глядзела, як ён заклапочана і без развітання выходзіць з дома, і ёй рабілася лягчэй, калі ён усё ж вяртаўся. Яна ўсё цяжэй пераносіла Рэгініны візіты. Яе пачала нерваваць яе няспынная балбатня, яна прапускала петлі на панчохах, іголка калола ёй у кончыкі пальцаў або трапляла пад пазногці.

Ён ад цябе пойдзе, закрычала яна аднойчы ў суботу ў канцы верасня, і *не вернецца, бо ты каза. Ты каза, каб ты ведала, каза ты гэткая.* Яна паўтарала гэта, бо іншай абразы не магла прыдумаць, а ўсё, чаго яна хацела, было сказаць Рэгіне найбрыдчэйшыя словы на свеце. Упершыню яна зайздросціла Рэгінінай маладосці. Як бы ёй ні забалела, Арыс не будзе ў яе апошні, а ў яе ён першы і апошні ў жыцці, хоць яна ніколі да яго не дакранулася.

Рэгіна першы раз замаўчала, скамянела і з разяўленым ротам глядзела на жанчыну, якая зноў вар'яцее. Так пачалося і так мае скончыцца. Яна Рудольфа Валентына прывяла, яна яго і адвядзе. Рэгіна выбегла з майстэрні, як толькі сіла вярнулася ёй у ногі, і чула за сабой *каза, каза, каза*…, адштурхнула Луку, які раскрыў рот, каб нешта ёй сказаць, і замкнулася ў сваім пакоі на два павароты ключа. Страх праглынуў увесь рэальны свет, а калі праз некалькі гадзінаў яна прачнулася, то спярша падумала, што яна цяжка хворая і не зможа ўстаць з ложка. Не зможа вымавіць слова і паклікаць некага на дапамогу. Пасля ўспомніла, што замкнула за сабой дзверы і што мусіць устаць, калі не хоча памерці ў адзіноце.

Рэгіна больш не паспела падумаць пра Мінін выбрык, бо на кухонным стале яе чакаў ягоны ліст. Яна раскрыла яго і прачытала. З кожным наступным сказам яна забывала папярэдні. А ліст быў доўгі, дзесяць старонак дробным почыркам. Відаць, ён доўга яго рыхтаваў. Ён напісаў яго не раптоўна і напэўна ўжо не вернецца. У кожным радку ён пісаў, што кахае яе, і ў кожным было па адным «але», якое тлумачыла, чаму ён яе пакідае. Рэгіна па два разы перачытвала першую частку сказу, а другую толькі адзін і тады ўсё забывала. Прачытаўшы апошні радок дзясятай старонкі, яна зразумела толькі тое, што засталася адна.

Арыс гуляў па спліцкай набярэжнай і глядзеў на чэшскую цыркачку, якая жанглявала кеглямі, якраз калі Рэгіна шпурляла праз акно апошнія талеркі, якія знайшла ў буфеце. Ён ехаў з прыгажуняй Янай у Рыеку, калі Рэгіна тэатральна спрабавала павесіцца на вяроўцы, з якой сарвала і кінула ў пыл яшчэ вільготныя навалочкі. Яна бегла выдраць Міне вочы, а за ёй гналіся ўсе суседзі, калі Арыс першы раз пацалаваў Яну. Рэгіна плюнула пад дзверы яе майстэрні і праз вітрыну паглядзела Міне ў вочы, і так скончылася іхняе знаёмства і сяброўства, калі ён іншай жанчыне казаў, што яе кахае, а тая смяялася ў адказ, як турыст прадаўцу драўляных вослікаў. Яна абяцала сабе, што больш ніколі не паглядзіць ні на воднага мужчыну, а ў той момант ён падумаў, што Яна магла б быць той жанчынай, з якой ён хоча пражыць усё сваё жыццё. Яна зачынілася ў доме і месяц не выходзіла, а ён кожнай раніцы прачынаўся ў іншым горадзе. Трыест, Бальцана, Балонья, Мілан, Турын, Фларэнцыя, Рым, Неапаль; ён купляў паштоўкі, якія не было каму пасылаць, а яна чакала пакаянны ліст – яна прабачыць яму ўсё і будзе яму рабыняй да канца жыцця. Арыс за дзень да Вялікадня 1932-га правёў шалёную ноч у ложку з Янай і яе сяброўкай Каралінай, глытальніцай нажоў, і зразумеў, што ягоная любая кахае і жанчын, а не толькі яго, але гэта яму ніводнага імгнення не замінала. Рэгіна мясіла цеста на арэхавы пірог і горка плакала, калі ў дом увайшоў поп Стэван Бояніч, перажагнаўся і сказаў: *Хрыстос уваскрэсе. Сёння ці праз два тыдні. Не сумуй, дзіця, няма прычынаў*. Перад Новым 1933 годам Арыс і Яна ўпершыню пасварыліся, хоць і самі не ведалі дзеля чаго,

Паліцыянт у цывільным пастукаў у акно кухні, а Рэгіна пацяснула плячыма, калі ён сказаў ёй, што Міна мёртвая і яны не ўпэўненыя, ці яна забіла сябе сама, ці яе нехта забіў – з перарэзаным горлам ляжала яна на ложку, падушка на якім ужо не пахла лавандай. *Я на пахаванне старой курвы не пайду!* крыкнула яна і бразнула дзвярмі, а ў Лукі з носа пайшла кроў. *Паглядзі на яго, ён кулаком мог бы забіць ільва,* дзівілася Яна з Мусаліні, які з рымскага балкона крычаў пра рабочыя правы, а Арыс не мог схаваць рэўнасці: *пі́дар фашысцкі!* кінуў ён. У той самы дзень Лука сказаў Рэгіне, што Адольф Гітлер стаўся нямецкім канцлерам, а яна адказала, што яму было б разумней вучыць школьныя заданні, а не сядзець у мытніка Свэцінавіча і цэлы дзень слухаць радыё. *Ты мяне кахаеш?* нясмела пытаўся Арыс, калі гарэў Райхстаг; Яна практыкавалася з дванаццаццю кеглямі і, калі ўсе яны былі ў паветры, сказала: *Ты сёння ўжо трыццаць разоў пытаўся. Не скажу!* Лука ўдарыў кулаком аб стол, а Рэгіна ўляпіла яму поўху, першую і апошнюю ў жыцці. *Ты вар'ятка, звычайная вар'ятка*, крычаў ён скрозь слёзы, яна заломвала пальцы, суставы хрусцелі, як распалены сасновы пень пад асеннім дажджом. *Я буду даглядаць коней, я ўсё пра іх ведаю,* сказаў Арыс уладальніку цырку Тыбару Цімашэнку. *Грошы скончыліся, ці што?* прыжмурыўся стары акрабат. *Калі патраціць апошні дынар, ён да мяне вернецца,* шапнула яна Луку праз турэмныя краты. *А што калі мяне засудзяць?* пытаўся ён, але англійскі консул не падаў на яго ў суд. *Заснеш у Аўстрыі, а прачнешся ў Нямеччыне,* уздыхнуў Цімашэнка, калі гімназісты ступалі па венскім Рынгу, выкрыкваючы лозунгі аб нямецкім уз'яднанні. *Нам канец,* уздыхнула Яна. *Мы будзем змагацца,* адказаў Арыс, *не можа Гітлер заваяваць увесь свет.* Яна тужліва паглядзела на яго: *Яму няма справы да нас з табой. У* той самы вечар арабскі конь, які зваўся Хафез, ударыў Арыса капытом у лоб, і ён на кароткі час страціў прытомнасць. Ужо назаўтра ён памятаў усё, апрача таго, што некалі быў з Рэгінай. Гэтая дэталь не вернецца ў ягоную памяць аж да смерці ў Парыжы ў 1940 годзе на руках у Тыбара Цімашэнкі, які прайграў заклад, што ягоны акрабат на трапецыі Арыс Бэрбэр'ян можа без страховачнай сеткі і з завязанымі вачамі зрабіць падвойнае сальта і ўхапіцца за

рукі турка Алі, найдужэйшага чалавека Леванту. Яны дакрануліся кончыкамі сярэдніх пальцаў, Арыс упаў у бездань і зламаў хрыбет.

На другі дзень пасля Аншлюсу Іва Дэлавале ўпершыню пацалаваў Рэгіну. *Заўтра я адплываю,* сказаў ён, а *ты будзеш мяне чакаць, калі мяне кахаеш.*

Яна тужліва паглядзела на яго, як бабёр на разбураную гаць. *Не буду я цябе чакаць,* матала яна галавой, *не буду, не буду, не буду,* а ён сціскаў яе ў абдымках і паказваў, як мурашы лезуць ёй у падпахі. Казытаў яе да слёз, а пасля пайшоў.

Наступны год быў найшчаслівейшым у яе жыцці. Яна забылася пра аднаго мужчыну, а другога насамрэч і не чакала. Яна не верыла яму і так вырашыла сама. Калі перажывеш закаханасць, то можаш вырашыць усё, што хочаш, і не памылішся, і не саступіш.

Усё было добра да таго вечара ў траўні, калі яна заплаканая выбегла з кінатэатру «Космас» уражаная катастрофай цэпеліна «Гіндэнбург». Яна раптам зразумела, што ёй трыццаць два гады і што яна не дачакаецца, калі навукова-тэхнічны прагрэс выправіць тое, што папсаваў Арыс. І Арыс, і Міна, якая памерла, каб сплаціць нейкі страшны доўг, і страх, праз які яна чакала так доўга і дачакалася не таго чалавека – усё было не так, і толькі надзея, што яна паляціць у аблокі разам з каралямі і прынцамі, не давала яе душы распасціся. Аднак «Гіндэнбург» упаў. І што ёй яшчэ заставалася, як не здацца таму, якому яна не верыла, і, дачакаўшыся яго, стварыць сабе веру ў яго. А тая вера, вядома ж, была вера не ад кахання, а ад страху. Яшчэ адна рэлігія, за якой не застаецца ні святых кніг, ні гісторыі. Не ўмацоўваюць яе святыя войны і кроў бязвінных. Не выступае супраць яе войска іншаверцаў. І ніхто не прызнае ў ёй веру, бо яна не належыць нікому апрача гэтай адчайніцы, якая гэтую новую веру стварыла. Тое, чым у Рэгініным выпадку быў цэпелін «Гіндэнбург», для многіх мужчын яе пакалення была іспанская рэспубліка.

Калі пройдуць гады і дзесяцігоддзі і дваццатае стагоддзе наблізіцца да канца, унукі будуць пытацца, штó такое было з іх дзядамі, штó гэта за рамантычны шал ахапіў іхнія душы, што яны ехалі за тысячы кіламетраў бараніць нешта чужое і гінулі за Барселону і Мадрыд. У французскіх лагерах яны дачакаліся прыходу нацыстаў, якія

паслалі іх далей на ўсход Польшчы, у лагеры смерці, газавыя камеры і крэматорыі, дзе іх вялікая ілюзія канчаткова сыходзіла ў дым і попел. Вось жа, унукі не будуць ведаць, што іхнія старыя змагаліся за нешта сваё, а не за чужое! Іспанія выпала ім як апошняя вялікая надзея свету, які біўся ў агоніі. Надзея замяніла Бога, бо Бог не дачакаўся дваццатага стагоддзя. Ён памёр з апошнімі вялікімі рэквіемамі і Хрыстовымі пасіямі. Моцарт у яго яшчэ верыў, а ўжо з Вагнерам вера ператварылася ў казачку. Бэпа Сікірыч у імя надзеі ішоў бараніць Іспанію. А ягоная сястра тым часам чакала, калі цэпелін «Гіндэнбург» спусціцца на Попава поле, мільёны жанчын і мужчын па ўсім свеце спадзяваліся на сотні тысяч сваіх цудаў і пры гэтым пагарджалі адны аднымі, бо чужая надзея амаль заўсёды здавалася ім нявартай увагі і павагі. Праблема ўзнікла таму, што бальшыня мужчынаў верылі ў арганізаваныя і калектыўныя цуды, тыя, за якія варта праліваць кроў. Чужую, калі ты мацнейшы і нападаеш, або сваю, калі ты слабейшы і баронішся. Гэта было самай верагоднай прычынай выбуху рэвалюцыяў, мацнейшай за ўсе класавыя і нацыянальныя прычыны, на якія спасылаюцца гістарычныя кнігі. Дзеля мужчынскіх надзеяў пакутавалі ў абязбожаным свеце гарады, краіны і цэлыя народы, а дзеля жаночых звычайна не пакутаваў ніхто, апрача той, якая гэтую надзею мела. Толькі ў выключных выпадках пакутавалі яшчэ і сем'і. Калі іх мужчын яшчэ не дабіла вайна. Праўда, здаралася, што ролі мяняліся і мужчынскія надзеі рабіліся жаночымі.

Так, Вольга Бэнарыё, дачка багатага мюнхенскага адваката, паехала ў тыя гады ў Лацінскую Амерыку ўзнімаць рэвалюцыю. Ці яна гідзілася тым, што адбывалася ў піўных корчмах яе роднага гораду, або перастала верыць, што Еўропа можа зрабіцца кантынентам свабоды і справядлівасці, або яе захапілі спеўныя мелодыі раманскіх моваў, толькі Вольга прыехала ў Бразілію і закахалася ў Луіса Карласа Прэстэса, марксіста і правадыра паўстанцкага маршу праз бразільскія джунглі. З ім яна прайшла адну малую рэвалюцыю, якая з актуальна-палітычных прычын не згадвалася ў еўрапейскіх газетах, як у заходніх, так і савецкіх, а гісторыя пра яе збольшага маўчыць, бо ў нашым стагоддзі існуе правіла, што гісторыя не фіксуе таго, пра што папярэдне не паведамлялі газеты.

У той рэвалюцыі Вольга Бэнарыё бачыла кроў, смерць і сёлы ў агні, але ўбачыла і кветку, якая пасля яе смерці будзе шырыцца ў Міжземнамор'і і будзе вядомая пад назвай бугенвілея. У джунглях Амазоніі, дзе цёпла і вільготна, гэтая кветка амаль заўсёды бывае белая, а на адрыятычным узбярэжжы яна бывае сіняя, цёмна-ружовая і бэзавая, залежна ад таго, колькі кветцы нестае цеплыні. Спадабалася Вользе тая белая кветка, але не таму, што яна была жанчынай – як меркаваў бы той, хто ясна дзеліць свет на мужчынскі і жаночы бок, яна спадабалася ёй як спадабалася б кожнаму, хто мае чыстае вока і бачыць нешта ўпершыню. Луіс прызнаў яе прыгажосць, хоць ніколі раней не звяртаў на яе ўвагі. Таму што бачыў яе ўсё сваё жыццё.

Бачыш, як гэта добра, людзі мусяць змешвацца, каб навучыцца бачыць. Таму рэвалюцыя пераможа, усклікнуў ён, *інтэрнацыянал – у вачах жанчыны і чалавека!*

І памыліўся няшчасны Луіс Карлас Прэстэс. Паўстанне не ўдалося, і бразільскія ўлады выдалі ягоную Вольгу Нямеччыне. Яна памерла ў канцэнтрацыйным лагеры, а датай яе смерці, як і смерці бальшыні іншых вязняў, для Вользіных родных будзе кожны дзень кожнага года. Вольгу Бэнарыё варта запомніць не толькі таму, што яна была натхнёная надзеяй, як і Рэгіна, а за тое, што ў садзе за домам Сікірычаў была пасаджана адна з першых бугенвілеяў на Адрыятыцы.

Прывёз яе доктар Эльснер са з'езду батанікаў у Падуі і пасадзіў яе тут, бо свайго саду не меў. Эльснер таксама скончыў жыццё ў лагеры, але не дзеля надзеяў і ідэалаў, а таму, што быў яўрэй. Бугенвілея расла і разгаліноўвалася, цвіла заўсёды бэзавымі кветкамі, перажыла Другую сусветную вайну і ўсе няшчасці, якія здарыліся пасля яе, перажыла і бамбаванне, у якім у 1991 годзе згарэў дом, і вялікая, як найбольшая сасна, і старая, як найстарэйшая масліна, дажыла да канца стагоддзя і перажыла ўсіх, хто яе памятаў. Яна – адзіная канстанта гэтай гісторыі.

Рэгіна заснула на світанні, несуцешная, як Польская зямля, і раз'юшаная на свет, які не адчуў спачування таму, што здарылася ў Лэйкхэрсту, у штаце Нью-Джэрзі.

Калі яна прачнулася, сонца было ўжо ў паўдзённых гадзінах, а яна ўжо чакала свайго марака. Так пачаўся яе раман з Івам Дэлавале, раман, якому ніхто не пярэчыў і які мог бы скончыцца інакш, калі б у нейкі момант не скрыжаваліся ўзаемавыключныя лёсы. Рэгінін, пра які мы ведаем бадай што ўсё, і лёс Дыяны Вічэдэмоні, пра які мы не даведаемся нічога. Бо такая логіка жыцця. Тыя, хто вырашае нечы лёс, звычайна не ведаюць, што яны гэта робяць. Як і тыя, чый лёс быў вырашаны іншымі, нічога пра іх не даведаюцца, колькі б ні стараліся і якой бы салодкай ні здавалася ім помста. Ніхто нікому за сваё кароткае жыццё не паспее адпомсціць. Каб мы маглі адпомсціць, трэба было б жыць старазапаветных тысячу гадоў і ведаць больш, чым чалавек будзе калі-небудзь ведаць.

IV

На Куццю 1927 года Ката Сікірыч аблаяла Бога, далоні ёй звяло сутаргай у цёмным хлебным цесце, і больш яна не магла іх расціснуць. Спачатку ёй моцна забалела левая рука, і адразу пасля гэтага яна перастала яе адчуваць. Пальцамі правай яна яшчэ была здольная варушыць, хоць не магла вызваліць іх ад цеста, а пальцы левай застылі, як цвёрды камень Рэвеліну. Ката не адчувала страху, толькі збянтэжанасць. За некалькі секундаў, пакуль гэта ўсё гэта цягнулася, яна не магла выбраць паміж дзвюма думкамі і двума супрацьлеглымі адчуваннямі. Думкай пра закваску, якая замерла ў цесце і замест таго, каб узняць калядны хлеб, ператварыла яго ў нешта ўбога някваснае, нейкі праснак пабожных яўрэяў, і думкай пра лаянку, якую яна прамовіла ўголас і адразу адчула нясцерпны боль. З першай думкай прыходзіла раззлаванасць, з другой здзіўленне. Або Бог помсціць ёй за лаянку, а гэта значыць, што ён усё ж ёсць, або яна мусіла помсціць яму, бо яго няма нават на столькі, каб даць сілу заквасцы.

Ката чакала вырашэння гэтага сумневу, гэта было найдаўжэйшае чаканне за сорак два гады яе жыцця, і неўзабаве нічога апрача гэтага чакання не засталося. Не было рук, застылых у цесце, вачэй, якія былі гатовыя выскачыць з вачніц, не было і думак, адной і другой, не было ног і драўлянай падлогі пад імі. Ад Каты Сікірыч у той момант, калі Рэгіна ўскрыкнула, засталося толькі чаканне.

Праз дзесяць хвілін тут ужо былі ўсе суседзі, нават стогадовая сляпая Слава Туцін. Яе ўнук, капітан Барыша, трымаў бабку за руку, а яна шаптала: *дзе нябожчыца, дзе яна ляжыць, ці зачыненыя ўсе вокны…* З усіх бакоў ціснулі маладзейшыя, жанчыны пахлі траской, якая замочвалася ўжо трэці дзень, а мужчыны цвёрда сціскалі вусны, надзімаючы шчокі, як хамякі, саплі праз нос і чырванелі, каб толькі ад іх у посны дзень не чулася з ратоў ракія. Мацней-

шыя і спрытнейшыя прабіліся да самага кухоннага стала, за якім ляжала Ката, а тыя, што стаялі за імі, уставалі на дыбачкі, каб нешта пабачыць. Былі і такія, што прымяраліся да стала, ці не ўзлезці на яго і – колькі б гэта, можа, ні было непрыстойна – з найлепшага месца апошні раз паглядзець на суседку. Так, яны яшчэ ўбачаць яе ў каплічцы перад пахаваннем, труна будзе адкрытая, бо такі звычай, а твар нябожчыцы не сапсаваны хваробай або няшчасцем, каб сям'я яго хавала, але гэта ўжо не тое. Спарадкаваных, абмытых і ўбраных ва ўрачыстыя шаты нябожчыкаў можна бачыць як найменей раз на тыдзень, бо так часта памірае нехта знаёмы, нехта, да каго ходзяць на могілкі, а нешта такое пабачыш адзін раз хто ведае за колькі часу. Нават вочы ў яе яшчэ не былі закрытыя, яны глядзелі на люстру, дзе якраз плёў сетку павук, і здавалася, што Ката якраз на гэта злуецца. Менавіта так яна выглядала, і ніяк іначай. Можа, гэта быў нейкі знак, старэйшыя жанчыны мусілі б ведаць, што значыць, калі нябожчык бачыць павука, які пляце сетку. Ці значыць гэта, што яна напрацавалася за сваё жыццё і цяпер адыдзе ў рай, каб адпачыць, або нешта іншае? А можа гэты знак датычыць не нябожчыцы, а яе дома? Над гэтым домам лёс сплёў сетку няшчасцяў, і найгоршае яшчэ чакае наперадзе. Некаторыя ад гэтай думкі злёгку адхінуліся, дзве жанчыны пяражагналіся.

Бедная Ката, а пяцярых дзяцей нарадзіла, сказала адна. *Не пяцярых, а шасцярых, адно памерла ад іспанкі,* выправіла яе другая. *Гэта было не ейнае, а яе сястры,* крыху зазлавала першая. *Якой сястры, сястра нарадзіла траіх, і ўсе жывыя,* суседка была гатовая да сваркі. *Вы здурнелі, якая сястра? Няма ў яе сястры апрача Анджы. Гэта дзеці яе дзядзькі,* умяшалася трэцяя. *Змоўкніце вы ўжо, божа ж ты мой,* прашыпеў мажны мужчына, па ўсім відаць муж той першай, бо ён моцна пацягнуў яе за руку і штурхнуў яе сабе за спіну. Там яна яшчэ нейкі час нешта мармытала, а пасля канчаткова сціхла.

Глянь, цеста на руках не высахла… А як сціскае кулакі, камень бы расціснула, калі б ухапіла… Сэрца, сэрца гэта, кажу я вам… Або лопнула жыла ў мазгах… Не, не, калі лопне ў мазгах, то скрывіцца твар, а паглядзі на Кату, у яе ўсё, як і было… І яшчэ лепш, як было! Ня мае больш клопату… Прыгожая якая, Божа… І маладая, гаротніца…

Гучалі дагодлівыя галасы, адно за адным сыпаліся кампліменты і словы захаплення. Такіх красамоўнасцяў на свой адрас Ката за ўсё сваё жыццё ніколі не чула. Рэгіна застыла ўбаку, яна хацела закрычаць і разагнаць увесь гэты зброд, але голас яе не слухаўся, а суставы ў яе зрабіліся мяккія, як з ваты. Народ яе ўжо не заўважаў, яны напіралі і штурхаліся, і неўзабаве яна была ўжо прыціснутая да сцяны ў куце кухні, самотная і далёкая ад мёртвай маці. Так бы яна там і заставалася да вечара, пакуль змяняліся гледачы, калі б адзін за адным за пяць хвілін не прыйшлі браты, Джузэпэ, Бэпа і Джавані.

Што вы тут робіце з маёй маці! грымнуў найстарэйшы, і ў адно імгненне вока кухня і дом пачалі пусцець. Засаромленыя, з апушчанымі позіркамі, суседзі павалілі на вуліцу. Зарыпелі і забразгалі крэслы, дзверы лупіліся аб сцяну, чуўся прыглушаны енк прыціснутага мазаля; яны ўцякалі, як дзеці, калі нехта ў школе разаб'е акно. Не прайшло, можа, і дзвюх хвілін, як яны чацвёра засталіся адны каля сціснутага Кацінага кулака. Бэпа закрыў ёй вочы, Джузэпэ ціха заплакаў, а Джавані збялеў і пачаў дрыжаць. Хлопец раней не бачыў нябожчыкаў.

Крыху пазней прыбегла цётка Ангеліна, Каціна сястра, з Лукам на руках. Ужо з парога яна пачала галасіць. Малы маўчаў і чакаў, пакуль цётка спусціць яго на падлогу, а яна ўсё не спускала, носячы яго вакол стала і падвываючы: *Сястрыца мая, сэрца маё, ад сэрца ў цябе гэтыя сіроткі адарваліся…* Пасля нахілілася над мёртвай Катай, усё яшчэ трымаючы Луку на руках, а дзіця было цяжкае і ледзь яе не пераважыла. Калі яна зразумела, што́ робіць і што гэта не мае сэнсу, Ангеліна паспрабавала выкруціцца: *Ну, маленькі, пацалуй маму апошні раз!* Амаль перакулены дагары нагамі Лука пацалаваў мёртвую Кату ў шчаку. Зрабіў ён гэта спакойна і без ніякага страху. Па тым, што маці не зварухнулася, ён ведаў, што яна памерла. Гэта не страшна, думаў ён, проста перастанеш варушыцца, і ўсё. Гэтае здарэнне яму не запомніцца. Ён забудзецца пра яго так моцна, што будзе смяяцца, калі Рэгіна значна пазней паспрабуе яму яго прыгадаць. Істэрычную цётку Ангеліну і пацалунак у ледзяную шчаку прыгадвала яна яму і ў тую шалёную і вясёлую ноч, калі праз сорак гадоў, вярнуўшыся з Трыеста, ён сам будзе развітацца з жыццём.

Але Лука толькі смяяўся і размахваў далонямі, нібы адганяючы ад сябе дакучлівыя прывіды выдуманых кашмараў. Яна запэўнівала яго, нібыта ён сніў нешта, чаго ніколі не сніў. А гэта смешна, смяшней не бывае.

І што цяпер рабіць? дурнавата спытаўся Джузэпэ. *Пачакаем, і ўсё пойдзе само сабою,* спакойна сказаў Бэпа, выраўняў маці ногі і склаў ёй рукі на грудзях. Цётка Ангеліна сядзела каля печы і мармытала тыя дзве малітвы, якія наогул ведала, Ойчанаш і Вітаймарыю. У Джавані вярталася кроў да твару, ён іранічна падсмейваўся з цёткі і стараўся, каб яна гэта заўважыла.

Але Каціна сястра больш нічога вакол сябе не бачыла і не чула, яна ўвайшла ў той асаблівы метафізічны транс, які ахапляе нерэлігійных і свабодных ад Святога Духа жанчын, схільных да крыкаў моды і падатлівых да ўсіх фальклорных традыцый. Яна старанна прамаўляла сваю мантру і калыхалася, як усходні містык, знаходзячы асалоду ва ўсім, што адбываецца і што яшчэ будзе адбывацца. Несправядліва было б сказаць, што яна не смуткавала па сястры, яна любіла яе чыста і аддана, як любяць простыя сэрцы і душы без вялікага розуму, але гэта ніяк не было прычынай, каб з прыемнасцю не аддацца доўгай прывабнай чарадзе пасмяротных рытуалаў і звычаяў. Неўзабаве ўсе будуць прыходзіць да яе выказваць спачуванні, яна купіць чорны капялюш з вуаллю, страціць прытомнасць побач з сястрыным нежывым целам, і дужыя мужчынскія рукі падхопяць яе пад пахі і павядуць да самай магілы. Яна будзе прамаўляць словы свайго найглыбейшага смутку, аддасца паэтычнаму экстазу, і што самае важнае – усе будуць яе слухаць. Ва ўсіх пабягуць мурашкі па скуры ад яе смуткавання, ім надоўга запомніцца момант, калі аддавалі зямлі Кату Сікірыч, бедную маці пяці жывых дзяцей і шостага, якое памерла ў яе на руках. Ангеліна зробіць гэта так, што ўсе іншыя пахаванні будуць забытыя пасля гэтага адзінага, найбольшага, найсмутнейшага і найпрыгажэйшага. Яна праліе перад імі, як бісер, свае слёзы, прысарамаціць іх сваім дарам смуткавання, а нябожчыцу ўзвысіць да таго месца, якое ёй належала пры жыцці, але гэтыя бяздушныя людзі гэтага не прызнавалі.

Насамрэч шкадавання была вартая цётка Ангеліна. Добрая,

як хлеб, і тупая, як сякера, калі ўдарыць у букавы камель. Злосны хлопчык практыкаваў на ёй свае першыя падлеткавыя іроніі. Бэпа ад сораму не наважваўся на яе паглядзець, а прастадушны Джузэпэ спрабаваў яе супакойваць, клаў ёй рукі на плечы, вялізнымі пальцамі выціраў ёй слёзы са шчок, быццам тое, што ў яго памерла маці – гэта нейкая драбяза ў параўнанні з трагедыяй Ангеліны, у якой памерла сястра. Па сутнасці, ён мог бы быць яе сынам, бо да цёткі з усёй сям'і быў найбольш падобны, дык і не дзіва, што ён найбольш яе і любіў. Яна была яму бліжэйшая за маці Кату, бо нічога ад яго не чакала і не параўноўвала яго з іншымі дзецьмі, а давала яму быць такім, як ён ёсць. Незвычайны атожылак сям'і, нейкая баязлівая горная істота, якой цывілізацыя прыносіла толькі пакуты, а школа была прычынай найбольшага жыццёвага страху. Калі прыйдзе вестка, што Джузэпэ забіты ні за што ў акцыі чэтніцкай адплаты, цётка Ангеліна адзіная запаліць па ім свечку, пусціць слязу і адгаворыць сотню Ойчанашаў і Вітаймарыяў. Іншым будзе ўсё роўна, або ім нават і палягчэе, што ён больш не будзе з'яўляцца ў бацькоўскім доме і нагадваць свету, што ён складаецца з незлічоных дзівосаў, але ад бальшыні з іх чалавека ахапляе няёмкасць і сорам. Сікірычы саромеліся і за сябе, і за Ангеліну і Джузэпэ, і дзеля гэтага іх і не любілі.

Рэгіна маўчала, у галаве ў яе мяшаліся і затуманьваліся амаль усе пачуцці, якія жывое стварэнне можа насіць у глыбіні душы. Яна не была ўпэўненая, ці адчувае смутак па гэтай жанчыне, ці ёй баліць, што яна назаўсёды застанецца ў яе пад нагамі, або яна шчаслівая, што больш няма той, па чыіх мерках меўся быць скроены і ейны свет. Ні да чога яе Ката не прымушала, не ўспамінала і пра замужжа, хоць з яе перспектывы дваццаць два гады былі скрайнім тэрмінам, калі жонка мусіць легчы пад мужа і пачаць нараджаць яму дзяцей. Але ўжо і тое, што яна была такая, якая была, што дыхала побач з ёй і працавала па хаце з раніцы да ночы, выклікала ў Рэгіны няёмкасць. А цяпер, калі яе няма, не будзе і няёмкасці. Больш не зварухнуцца яе малыя круглыя кулачкі, аблепленыя цестам, якія тырчаць з задоўгіх рукавоў, на якіх рассыпалася безліч збляклых ад мыцця кветачак рамонку. Гэтыя рукавы і кветачкі яна бачыць ад нараджэння, і яны робяцца ўсё больш дробныя і бляклыя. Яна не памятае, каб калі

бачыла маці ў нейкай іншай кашулі. А цяпер яна бачыць кветачкі апошні раз, яны больш не будуць блякнуць, іх наагул больш ніколі не будзе. Яны былі балючай Рэгінінай тугою па касмічнай мерцы, паводле якой з гэтага свету праводзяць святых. Жанчын, якія за ўсё жыццё нічым не паставілі пад пытанне чыстую бязвіннасць рукавоў сваёй адзінай кашулі.

Маўчанне і спакой пры мёртвай Каце захоўваліся менш за гадзіну. Тады ў дзверы пастукаў айцец Іван, чорны крумкач, які ўжо неяк даведаўся пра свежую нябожчыцу ў сваёй парафіі. Бэпа, не сказаўшы ні слова, пусціў яго ў дом. Ангеліна з гатовасцю падскочыла з крэсла, каб далучыцца да рытуалу, тым часам як усе астатнія рабілі выгляд быццам святара не існуе. Джавані чысціў пазногці, Рэгіна не зводзіла вачэй з поля рамонкаў, а Джузэпэ выбег на двор. Ён баяўся святара, бо не ведаў што рабіць у ягонай прысутнасці, калі жагнацца, калі нешта мармытаць, а калі пабожна складаць рукі. Аднак ён памятаў, што ў школе атрымаў больш кухталёў ад настаўніка закону божага, чым ад усіх астатніх разам. А таўклі яго, як вала ў капусце, бо ён цярпеў і ніколі не плакаў. Яны думалі, што Джузэпэ ўпарціцца, і трымаліся старасвецкага педагагічнага прынцыпу, які кажа, што дзіця трэба біць, пакуль у яго слёзныя залозы не перасохнуць.

Малы Лука сядзеў на падлозе, і здавалася, што і яго з'яўленне айца Івана асабліва не зацікавіла. Яму было б цікавей, калі б праз кухню прабегла яшчарка і залезла пад буфет. А святар, вядома ж, добра ведаў сваіх парафіянаў і тое, у які дом ён заходзіць, таму і ён не звяртаў увагі на прысутных. З Ангелінінай нямой асістэнцыяй ён хуценька прамовіў свае малітвы, пражагнаў паветра над мёртвай Катай, паціснуў усім руку і спешна, не развітваючыся, выйшаў з хаты. Бо сёння Куцця, а на Куццю памірае амаль што непрыстойна.

Як толькі айцец Іван адышоў, з'явілася Дара Жывадзёрка, жанчына гадоў пад шэсцьдзесят, якая займалася ў горадзе незарэгістраваным промыслам падрыхтоўкі нябожчыкаў для пахавання. Шырокая і дужая, з рукамі як у цыркавога асілка, яна спраўляла ўсё, што засмучаная сям'я не была гатовая або навучаная рабіць. Яна сама перанесла Кату ў спальню, паклала яе на падлогу побач

з ложкам і з вялікага скуранога сакваяжа, які насіла з сабой, дастала ўсе патрэбныя прылады: бляшаны таз, драўляныя зацiскачы для выраўноўвання скрыўленых суставаў (на выпадак, калі нябожчык застыў у няправільнай пастаце), шаўковую хустку для стулення сківіцаў, розныя нажнічкі і бліскучыя медычныя інструменты, падобныя да гінекалагічных, якія не мелі практычнага прызначэння, апрача таго, каб запэўніць сям'ю ў сур'ёзнасці Дарынай працы. Яна наказала ўсім мужчынам выйсці з пакоя, а Рэгіну паслала набраць у таз вады. Калі яна вярнулася, маці была ўжо зусім голая. *Стой тут і ні пра што не пытайся,* загадала жанчына, намачыла губку і пачала абмываць мёртвае цела. Мыла яна спрытна, са звыкласцю ў рухах, якая бывае толькі ў прафесійных мыйшчыкаў посуду ў вялікіх гатэлях. Яна ведала анатомію чалавечага цела, згібы, лагчыны і пагоркі лепш за самога Творцу.

Падрыхтуй адзенне, у якім вы будзеце перасяляць маці, сказала яна, адмываючы Каціны рукі ад цеста. Рэгіна нейкі момант не магла зразумець. Якое перасяленне? Напэўна, каб пазбегнуць прыліву слёз, Дара старалася не вымаўляць словаў смерць, пахаванне, жалоба, або недзе можа чула, як пра ўсё гэта гавораць у мусульманаў. Нябожчык перасяляецца ў Ахірэт*, а паводле заслугаў ідзе далей у джэнэт*, дзе жывуць шчасныя душы, або ў джэхэнэм*, дзе грэшнікі цярпяць пякельныя пакуты. Па сутнасці гэта ўсё тое, што і ў хрысціянаў, толькі без словаў, якія выклікаюць слёзы.

Рэгіна дастала з шафы матчын чорны ўбор для ўрачыстых нагодаў – спадніцу, кашулю і жакецік, якія Ката надзявала, калі хадзіла на пахаванні. Дара апранула нябожчыцу таксама без старонняй дапамогі. А *бялізну?* ціха спыталася дачка. *Не спатрэбіцца,* цвёрда адказала жанчына, паклала цела на роўны ложак, перапляла мёртвыя пальцы на грудзях, *так, а цяпер яе больш не варушыце, можаце запаліць свечку, толькі асцярожна, каб нешта не загарэлася.*

Выходзячы з пакоя, Дара пражагналася, як бы сама сабе, і не паглядзела на вынік выкананай працы. Гэтак яна рабіла супраць сурокаў і дрэнных сноў. Узяла за працу дорага і пайшла чакаць, ці смерць у гэты перадсвяточны дзень не прынясе смутак і яшчэ ў нечыя дамы.

У тыя гады Дара Жывадзёрка была, мабыць, самай зненавіджанай асобай у горадзе, а можа і адзінай жанчынай, якой не кідалі рэплікі на вуліцы і вакол якой не хадзілі гучныя абгаворы. Калі пра Дару нешта і казалася, то паўголасам, шэптам і пад строгім сакрэтам. Людзі прымхліва баяліся яе моцы, да таго ж ты ніколі не ведаў, калі табе могуць спатрэбіцца яе паслугі. Прыходзіла яна пераважна без запрашэння пасля таго, як зробіць сваю справу айцец Іван, таму ў горадзе думалі, што паміж пробашчам і ёй існуе нешта накшталт працоўнай дамовы. Толькі гараджане ніяк не маглі вызначыцца, ці бярэ святар частку яе ганарару, або дамова з Дарай – гэта частка яго душпастырскай місіі. Вядома ж, пабожныя верылі ў другое, а бязбожныя – у першае. На падставе такіх рэчаў, больш чым паводле прысутнасці на нядзельнай імшы, можна было ведаць, хто ў якіх дачыненнях з Усявышнім.

Але ўсе пагаджаліся ў адным: Дара ў грамадскай іерархіі займала вышэйшае месца, чым айцец Іван. Пробашчы прыходзяць і сыходзяць, а яна застаецца ў вечнай сувязі са смерцю. Людзі пабойваюцца нябожчыкаў, злых духаў і прадчування заразнасці смерці. Ім не хочацца бачыць голых целаў іх бацькоў, братоў і сёстраў, мёртвых дзяцей. А ўжо тым больш усохлых палавых органаў, месцаў сораму, з якіх абляцеў і апошні волас, кораня, які цябе стварыў і ад якога застаўся толькі зморшчаны капшук, таго, пра існаванне чаго ты ведаеш але што мусіць застацца схаванае. Страшна дакранацца да халоднай скуры і варушыць застылыя канцавіны, бачыць блізкіх, якія ператвараюцца ў нешта нежывое і непатрэбнае. Нават самага глыбокага верніка не задаволіць поўнасцю суцяшэнне айца Івана, яму будзе патрэбная Дара Жывадзёрка, каб вызваліць яго ад смерці. І ўсе рады, што яна прыходзіць сама і без запрашэння, бо мала прыемнага нават прайсці міма яе дома, а не тое што пастукацца ў дзверы.

Яна жыла за мурамі, пад гарадскім шпіталем, з чэшкай Ярмілай, якая яшчэ да вайны прыехала на летні адпачынак і больш ніколі не вярнулася ў Прагу. Яе бачылі рэдка, яна не выходзіла ў горад, а ўлетку загарала і купалася на закінутых скалах каля Трстэна. Часам рыбакі бачылі, як яна ляжыць адна на сонцы, спакушаючы іх сваёй галізной. На ёй былі толькі мужчынскія салдацкія споднікі, і больш нічога. Але і пра гэта, дзеля страху перад Дарай, шмат не гаварыла-

ся. Як і пра тое, кім былі адна адной гэтыя жанчыны. А што існуюць рэчы страшнейшыя за адкрытыя абгаворы, выявіцца чатырма гадамі пазней, летам 1931-га, калі здарыцца адно з найжахлівейшых злачынстваў у найноўшай гісторыі гораду. Ярміліна знявечанае цела без галавы і грудзей Дара Жывадзёрка знайшла на закінутых скалах пасля таго, як сяброўка дзве ночы не паказвалася дома. Паліцыя не знайшла забойцу, не знайшлася і Ярміліна галава.

Да самай смерці ў канцы шасцідзясятых звар'яцелая Дара шукала Ярмілін чэрап, а людзі ў горадзе з цяжкасцю прызвычайваліся да таго, што мусяць рыхтаваць нябожчыкаў на той свет без нечай дапамогі. Улетку 1931 года абарвалася нявыказанае каханне, і больш не было каму клапаціцца аб мёртвых целах.

Суседка Мара Лапталінка, відаць, чакала перад домам, пакуль Дара Жывадзёрка скончыць сваю працу, каб пастукаць у кухоннае акно. Бэпа закаціў вочы і нічога не сказаў; Мара найбольш штурхалася, каб лепей разгледзець нябожчыцу, і вось зноў яна тут.

Трэба жыць далей, дзеці мае! сказала яна і працягнула Рэгіне каструльку з трасковай юшкай. Яна азірнулася па пакоі, Каты больш няма… *Вось, дзеці, калі вам што спатрэбіцца,* прамармытала яна і выбегла з хаты.

І толькі Джузэпэ зняў накрыўку і па пакоі разнёсся пах, які дае кухні колеры і формы, як ужо нехта грукаў у дзверы.

Сцепа Алар, Барталаў бацька і стары ўдавец, прынёс талерку поўную фрытулаў*. Усміхнуўся, нібы выбачаючыся, паціснуў руку двум старэйшым братам, раскрыў рот, каб нешта сказаць Рэгіне, але доўга не мог успомніць што. *Мая Мірыца, ёй і дваццаці не было, таксама сэрца. Некалі толькі мужчыны паміралі ад сэрца. Гэты свет звар'яцеў…* Бэпа запрапанаваў яму ракіі, але Сцепа заспяшаўся, бо ў вачах у яго зноў сабраліся слёзы. Пятнаццаць гадоў прайшло ад Мірычынай смерці, Барталу было толькі дзевяць месяцаў, і бацька мусіў замяніць дзіцяці матку. Ён яго перапавіваў, варыў яму, мыў, прасаваў і рабіў усё тое, што мужчыну рабіць сорамна. Сцепу сорамна не было, яму было тужліва. Што б ён ні рабіў, усё нагадвала яму пра Мірыцу, і штохвіліны ён заліваўся слязьмі. Ён ужо выплакаў цэлае Адрыятычнае мора і ніяк не мог супакоіцца. Людзі яго спяр-

ша шкадавалі, а пасля пачалі казаць, што Сцепа крыху таго, беднае дзіця з такім татам! Бо ж ненармальна столькі плакаць па жонцы. Можа яна была яму і добрая, але ж напэўна пад сонцам нябесным яна не адзіная. Ён пазбягаў людзей і сядзеў дома, і дзеля слёз, якія ён не мог стрымаць і ў чужой прысутнасці, і дзеля крыўдаў, якіх не мог перанесці. Як толькі яму, нават з самымі добрымі намерамі, нехта казаў, што ёсць і іншыя добрыя жанчыны і што дзіцяці трэба знайсці маці, яму гэта было як нож у сэрца. Мірыца была для яго адзіная, бо яна ў яго была першая і бо яна гэтак адышла з жыцця. Такія каханні забываюцца цяжка.

Пасля Сцепы ў дом да Сікірычаў зайшло яшчэ як найменей тры дзясяткі суседзяў, жонак і ўдоваў, старых баб, незамужніх дзяўчат, тых, што выкуплялі віну за прыемнасць палюбавацца мёртвай Катай, і тых, хто, як Сцепа, прыходзіў з чыстым сэрцам. Кожны прыносіў рондаль, каструлю, талерку, місу, патэльню… На кухонным стале адны за аднымі з'яўляліся траска набела і на юшку, на брадэт* і начырвона, падсыпаныя анчоўсы, усялякія бузары* і брадэты, ракавіны, ракі і вугры, праснакі з салёнымі сардзінкамі, макрэль у марынадзе, марскі чорт і фасоля на брадэт, посная поліўка нейкага бедняка і смажаныя скумбрыі, высушаныя абгортачнай паперай. Калі гэтыя святочныя прысмакі больш не змяшчаліся на стале, Рэгіна пачала расстаўляць іх на белым святочным абрусе, які яна паслала на падлогу пад акном. Былі тут і арэхавыя пірагі, і біскупскі хлеб, піражкі з ражкамі і сухім інжырам і цэлая гара кроштулаў* і фрытулаў. Людзі прыносілі пачастункі, кожны прамаўляў два-тры словы і адыходзіў. Ужо сцямнела, блізілася дзявятая гадзіна, калі ўжо трэба збірацца на ўсяночную, а натоўп наведнікаў не змяншаўся.

Хатнія спачатку былі разгубленыя, а пасля іх агарнула нейкая дзіўная істэрычная весялосць. Толькі цётка Ангеліна тужліва ківала галавой, да паловы адгаворвала Ойчанаш і Вітаймарыю і спынялася пасярод малітвы, якая больш не мела сэнсу, бо дух смуткавання неяк незразумела для яе згас.

Пайду я да маёй сястрычкі, пакрыўджана сказала яна і пайшла ў пакой. Лука пайшоў за ёй, але Джузэпэ схапіў яго і ўзяў на рукі. У дзіцяці задрыжала барада, умомант вочы ягоныя напоўніліся

слязьмі. *Зараз табе брат пакажа, як лётае аэранаўт,* і падкінуў яго ў паветра, і яшчэ раз, і яшчэ раз, і яшчэ раз. *Ясцэ аз, ясцэ аз,* крычаў хлопчык, разводзіў рукі і пільнаваў момант, калі больш не будзе падаць, а застанецца ў паветры, як чайка, і сам паляціць па кухні. Некалі гэта абавязкова здарыцца, ён ведае, і таму кожны раз упрошвае брата, каб той яго падкідаў, але толькі калі яны застануцца адны, бо Рэгіна і Бэпа злуюцца, калі Джузэпэ так робіць.

Калі ён быў зусім маленькі, ён таксама яго гэтак падкідаў і аднойчы падкінуў занадта моцна, і Лука прыліп да столі, як блін. Ён пра гэта не памятае, але ўсе кажуць, што так было. Апрача Джузэпэ. Джузэпэ кажа, што не было такога, і падкідвае яго, калі яны застаюцца адны. А цяпер яны не адны, і ўсё роўна ніхто не злуецца. Гэта таму, што маці памерла і больш не варушыцца. Добра, калі прыходзіць Куцця, і памірае маці, і ва ўсіх добры настрой, і ніхто не думае, што здарыцца нешта дрэннае, што па падлозе разліецца гарачае малако, што Лука будзе гуляць з нажом і парэжа палец, што брат прыклеіць яго да столі, як блін, што сястра будзе плакаць, бо ў яе пачаліся тыя дні. Якія дні? Лука не ведае, але ўсе заўсёды так кажуць і падсмейваюцца, быццам ціха пукнулі і цяпер моцна смярдзіць. Кожны затыкае нос апрача таго, хто пукнуў. Ён падсмейваецца, і па гэтым ведаеш, што гэта ён пукнуў. Джавані найчасцей пукне і падсмейваецца, а Рэгіна яшчэ ніколі не пукнула. Жанчыны не пукаюць, Лука ў гэтым перакананы.

Ён доўга падкідаў яго і лавіў, пакуль у хлопчыка не закруцілася ў галаве, і ён не папрасіў спусціць яго на падлогу. Зямля закалыхалася ў яго пад нагамі, ён двойчы спатыкнуўся паміж талеркамі і гаршкамі, калыхаліся і крэслы, на якіх кожны ў сваім куце сядзелі Бэпа, Джавані і Рэгіна. Бэпа коратка рассмяяўся і тут жа спыніўся, нібы пра нешта прыгадаўшы, Джавані пляснуў сябе па каленях, *эх, эх, эх, і* тады сястра пачала смяяцца, як шалёная. *Гэта ненармальна,* смяяўся Джузэпэ, *гэта зусім ненармальна,* казаў ён задыханы. Яна не магла спыніцца, у вачах з'явіліся слёзы, яна была ўся мокрая, па целе расцякалася прыемнае прадчуванне блізкай катастрофы. Калі аднойчы настане канец свету, тыя, хто будзе гэта ўсведамляць, таксама будуць вось гэтак смяяцца.

У пакоі акуратна падрыхтаваная да пахавання ляжала Ката. Цётка Ангеліна прылегла побач з ёй і адразу заснула. З гораду чуўся гоман тысяч людзей, якія ў адзіную ноч года, калі жывыя не спяць, ішлі ў касцёлы, перагукаліся праз затокі або самотна стаялі ў порце, глядзелі ў чорнае мора паміж барак і смуткавалі па саміх сабе. Жывыя Сікірычы сустрэлі Каляды.

У тую ноч елася і пілося, як ніколі. Гаварылі ўсе разам, хвалілі ежу, расказвалі адны адным усё, пра што звычайна прамаўчалі б, усё, што гублялася ў маўклівай братэрскай і сястрынскай нелюбові. Дзіўна быць дзіцем тых самых маці і бацькі, адным з пяці, каб цябе з іншымі амаль нічога не звязвала. І тады прыходзіць момант, калі злучаецца разлучанае, з вуснаў вырываюцца тыя самыя словы і множацца малыя цуды, якімі пасля доўга жывеш.

Калядная ноч таго 1927 года была момантам найбольшай блізкасці, а нейкім нязвыклым чынам і радасці, у жыццях Каціных дзяцей. Калі існуе гісторыя, якая вымяраецца жыццём апошняга ацалелага, тады ў гісторыі, завершанай у дзень, калі памерла ў вар'яцтве Рэгіна Дэлавале роджаная Сікірыч, не было большага свята. Штó яны казалі адны адным, якімі дробнымі пяшчотамі абменьваліся і якія пакуты і недаверы перакрэслівалі смехам, на жаль, не будзе ні запісана, ні пераказана. Усе пяцёра заснуць на кухоннай падлозе са скарынкай хлеба ў руцэ і галавою вугра на каленях, а прачнуцца ў пахмеллі і з галаўным болем, без павучання, якое нечаканае шчасце раскрывае героям казкі. Нічога з таго, што яны тады разам пражылі, не пакінула і следу. Кухня была поўная смецця, у суседнім пакоі ляжала мёртвая маці, а цётка Ангеліна стаяла, як статуя, сціскала далонямі твар і вылуплівала вочы, упэўненая, што страціла розум і што тое, што яна бачыць, не можа быць праўдай. Яна не магла ўспомніць, як яна заснула, але тое, што яна бачыла, казала ёй, што за гэты час адбылося нешта страшнае.

Каляды праходзілі ў цішыні, страху і галаўных болях. Джавані кленчыў перад унітазам і бляваў. Гэта было першае ягонае ап'яненне, і ў наступныя пятнаццаць гадоў, да з'яўлення праваслаўных святых і ап'янення помстай, застанецца адзіным. Джузэпэ не наважваўся паглядзець цётцы ў вочы, вызваляў рондалі з недаедзенай траской,

яна іх без слова брала і мыла. Лука спаў, паклаўшы галаву Рэгіне на ўлонне. Яна гладзіла яго па валасах і думала пра час, які пройдзе, перш чым гэты хлопчык стане чалавекам, пачне сам аб сабе клапаціцца і пакіне дом. Калі кацяняты застаюцца без маці, яны бадзяюцца па дварах і вулках, куляюцца ўніз па сходах, а іхняе мяўканне не дае людзям спаць. Як толькі яго пачуеш, ведаеш, што сёння ўначы або адной з наступных начэй нехта абураны выбежыць з дому і зламае хрыбет першаму, які трапіцца яму пад нагамі. Назаўтра спагадлівыя жанчыны паловяць ацалелых жывёлінак, скруцяць ім шыі, як куранятам, або патопяць іх у марскім плыткаводдзі. Адно кацяня ўсё ж выжыве. Тое, што было наймацнейшае або мела найбольш шчасця. Яно працягне род і прадоўжыць пакуты кашэчага свету. І радасць, калі жывёлы ўмеюць радавацца. Вось чаму кошка нараджае столькі кацянятаў. Ніколі не выжываюць усе. А дзеці нараджаюцца адно за адным, і нехта мусіць аб іх клапаціцца, калі яны застануцца без маці. Рэгіне выпала клапаціцца аб Луку. Яна будзе рабіць гэта як найлепш умее, пакуль будзе мець сілу, пакуль яе не агорне роспач і пакуль хлопец не стане на свае ногі.

Бэпа пайшоў да айца Івана даведацца, калі будзе пахаванне, але пробашч паехаў некуды ў Герцагавіну служыць калядную імшу. Тоўсты Аджэм, кляшторны служка і пробашчаў асістэнт ва ўсіх справах людскога і касцельнага характару, яшчэ ад самай раніцы быў п'яны, як зямля, у яго заплятаўся язык, ён прапанаваў Бэпу траварыцу* і ўрэшце, праводзячы яго з управы, скаціўся па сходах ганка. Закрыстыян Антоніё паводле звычаю сустракаў свята ў сузіранні недзе на Элафітах*, таму не было нікога, хто б займаўся пахаваннямі. Мясцовая рада зачыненая, людзі святкуюць, адны ў касцёле, другія за сталом, трэція з бутэлькай у руцэ, кожны па-свойму, у адпаведнасці з уласным адчуваннем Бога. Людзі хадзілі ад касцёла да касцёла, а дзеля таго, што імша пачыналася ў розны час, раніца ў іх прайшла ў багаслужбах.

Гэтым вечарам яны будуць параўноўваць як дзе было і які святар меў найлепшае каляднае казанне. Будуць абгаворваць айца Івана, які, як заўсёды на свята, выехаў з сваёй парафіі і пакінуў касцёл двум маладым ксяндзам з Бокі, у якіх споўнілася мара адслужыць каляд-

ную імшу ў горадзе, а сам паехаў у нейкую глухмень пад Гацкам, дзе не набярэцца і двух дзясяткаў каталікоў. Там нейкі Андра, празваны Кісмет, збудаваў касцёл увесь з мармуру, каб гэтак выкупіць грахі, якіх, як кажуць набралася нямала, калі ён працаваў у Аўстраліі наглядчыкам шахты. Той Андра званы Кісмет забіваў і гвалціў, шапталіся богабаязныя людзі, хоць таго Андру ніколі не бачылі, але і тое, што яны пра яго чулі, было настолькі сумнеўнае, што не было б дзіва, калі б выявілася, што чалавека з такім імем і мянушкай наагул не існуе. Гісторыя пра яго важная адным: у канцы яе расказваецца, што за прыезд на калядную імшу айцец Іван узяў вялікія грошы і паклаў іх сабе ў кішэню.

Пацалаваўшы замкнёныя дзверы мясцовай рады і дарэмна паспытаўшыся на рынку, што рабіць з мёртвай маці, Бэпа вярнуўся дадому з пустымі рукамі. Цётка Ангеліна ўжо вымыла ўвесь посуд, Рэгіна падмяла ў кухні, і здавалася, што ўсё зноў было ў найлепшым парадку. А менавіта так, як было да ўчорашняга дня, да таго, як Ката запусціла пальцы ў цеста і больш ніколі іх не дастала. Але нікому, нават цётцы, не было прыемна, што мінуў поўдзень, а нябожчыцу яшчэ не вынеслі. І што найгорш, Бэпа не мог сказаць, калі прыйдзе лекар, каб засведчыць смерць. Лука гуляў так, што разганяўся і бег у бок пакоя, дзе ляжала маці, Рэгіна лавіла яго, біла па пальцах, але хлопчык не пераставаў. Ён ведаў, што там ляжыць маці, што яна больш не варушыцца і што дзеля гэтага яго не пускаюць у пакой. Ён не ведаў, што́ яму можа зрабіць мёртвая маці, але чаму ён мае гэтага баяцца? Ён адчуваў, што Рэгіна баіцца, і гэтага было дастаткова для забавы. З дарослымі лёгка гуляць, калі яны баяцца за цябе і ўвогуле не гуляюць. Цяжэй, калі яны хацелі б гуляць, але не ведаюць як.

Ратуй нас Божа, яна ўжо пахне! жагналася цётка Ангеліна.

Не можа быць, яшчэ і сутак не прайшло, качаў галавой Бэпа.

Пахне, пахне, хіба вы не адчуваеце. Адліга, каб на яе халера, настойвала цётка.

Вядома ж, нічога не пахла, а менш за ўсё Каціна цела, але дастаткова было пра гэта падумаць, каб у ноздры ўвайшоў саладжавы пах мяса, праз якое не цыркулюе кроў, смурод мясной крамы, адкрытай магілы, неправетранай магільнай каплічкі, пячоры з парэшткамі

здохлай жывёлы, усяго, пра што думаюць людзі, якія ніколі не чулі пах нябожчыка і ўяўляюць яго сабе як спалучэнне ўсіх вядомых цяжкіх смуродаў. Дарэмна Рэгіна спрабавала павярнуць размову ў іншы бок, не дапамагала і тое, што зноў час ад часу прыходзілі суседзі, пыталіся, ці што трэба, і адносілі талеркі і гаршкі.

Запахла наша нябожчыца, даруй мне Божа, сястрыца мая, скуголіла цётка, і людзі стараліся чым хутчэй пайсці. Так прайшоў надвячорак, наставаў калядны вечар. Ніхто не запаліў святла, яны сядзелі кожны ў сваім куце, Лука заснуў у сястры на ўлонні, было чуваць, як цётка нюхае паветра і, як сляпая і глухая старая такса, прадвяшчае катастрофу. У гэтую жахлівую ноч усе, апрача найменшага брата, перажывуць імгненні, калі будуць ненавідзець маці Кату нянавісцю большай за любую любоў.

На шчасце, Ката не даведаецца, што кожнае ейнае дзіця, апрача найменшага і таго, што памерла, адраклося ад яе ў Калядную ноч. Для яе гэта было б страшна, яна б звар'яцела, чатыры разы запар памерла б або душа ейная ўмомант перасялілася б між старонак святых кніг, туды, дзе цярпяць свае бясконцыя пакуты святыя і прарокі, разам з Божым сынам, на якім нейкім дзівосным чынам канчаецца гісторыя ўсіх пакутнікаў і пачынаецца гісторыя грэшнікаў.

А па мерках часу, у якім яна жыла, Ката Сікірыч у любым дачыненні была грэшніцай, таму не было нічога незвычайнага ў тым, што ад яе адракліся родныя дзеці, калі адчулі ў ноздрах уяўны пах яе смерці.

Як кожная завершаная чалавечая гісторыя пачынаецца ад канца, гэтак трэба было б разглядаць і спіс Каціных грахоў, ад апошніх да першых. За месяц да смерці яна пашкадавала, што своечасова не ўзбунтавалася і выйшла за мужчыну, які першы на яе прыгожа паглядзеў, што не скончыла школу і не ўцякла некуды далёка, а нараджала яму дзяцей, адно за адным, будавала вежу да неба і шэсць разоў стварала тое, што Госпад стварыў толькі аднойчы, вырабіўшы Адама і Еву. Яна пагарджала Госпадам – калі ён увогуле ёсць! Але ўсё, што яна думала і адчувала, было складзена і задумана так, як бы ён існаваў. Ката магла ўявіць сабе, што Бога няма; чым больш няшчасцяў збіралася ў яе жыцці, гэткая магчымасць здавалася ёй

усё больш верагоднай. Але яна не магла сабе ўявіць, што пад нябесным скляпеннем існуе нешта, што не было б у складзе з святымі паданнямі. Карацей: можа Бог і не стварыў Адама і Еву, але няма ніякага сумневу, што Ева ўкусіла яблык.

А што такога здарылася, калі Ката пашкадавала, што ёй не хапіла нахабства? Аднойчы раніцай, чакаючы, пакуль узнімецца цеста на хлеб, яна ўзяла з акна Рэгініны часопісы. Яна любіла іх гартаць, яны былі поўныя цудаў свету, фатаграфіяў вялікіх гарадоў, славутых мужчын і жанчын, чые жыццёвыя гісторыі таксама былі цудамі. Нічым не меншымі, чым жыціе нейкага святога ці святой. Але гэтыя цуды былі створаны не з дабрыні і пакутаў, а з нечага іншага. Ката не ведала з чаго, ды ёй і не хацелася думаць пра такія рэчы.

Дык вось, той раніцай у часопісе «Свет» яна прачытала гісторыю пра гібель жанчыны, якую звалі Айседора Дункан. Гэта была балерына, удава рускага паэта-самагубцы, ёй захапляўся ўвесь свет. Шкада, што пра такога чалавека даведваешся, калі ён ужо загіне, падумала яма на сярэдзіне артыкулу, а перш чым дачытае яго да канца, Ката будзе ў роспачы і ўпэўненая, што яна асабіста магла Айседоры Дункан уратаваць жыццё! І хто ж тая бабішча, тая вядзьмарка з белага свету, якая Айседоры спляла такі доўгі шалік? Бо каб жа шалік не быў занадта доўгі, ён не заматаўся б за кола аўтамабіля, і яна ўсё яшчэ была б жывая. Чаму шалік быў такі доўгі? Напэўна, ён і раней валачыўся па пыле, Айседора мусіла глядзець, каб не наступіць на яго, калі спяшаецца ў тэатр, каб яго канцы не ўпэцкаліся ў гразі, як толькі пройдзе дождж, бо тады яго трэба занадта часта мыць. А калі такія шалікі мыеш занадта часта, блякне колер. Кожная занадта часта мытая ваўняная рэч неўзабаве робіцца непрыдатнай, і яе выкідаюць. Можа, было б лепш, каб яго тая няшчасная балерына выкінула пасля трох разоў, тады б гэтага не здарылася. Або каб адразу адчула нешта падазронае ў той вядзьмарцы, што пляце такія доўгія шалікі. Напэўна, яна бярэ грошы за даўжыню. Чым шалік даўжэйшы, тым даражэйшы. Больш сплеценага ў белым свеце напэўна каштуе даражэй, чым менш сплеценага. Так яно і ёсць: за ўсё бяруць грошы, нічога не робіцца з любові.

Любоў – бядняцкае шчасце. Шчасце багатых зроблена з багацця.

І гэта загубіла няшчасную Айседору. Яна была багатая і не думала, калі купляла доўгі шалік, а любіла яна так, як любяць бедныя, і насіла той шалік, каб быць найпрыгажэйшай таму, хто яе кахае. Так думала Ката, чытаючы пра злы лёс Айседоры Дункан, а тады ёй раптам падумалася пра дзве рэчы. Лепш памерці, як яна, чым жыць у свеце, у якім табою ніхто не захапляецца, у якім няма вачэй, якія ўбачаць у табе цуд. Якія будуць глядзець на цябе, як вялізныя кірні*, злоўленыя падманам, якія сустракаюцца раз на дваццаць гадоў і чыё жыццё каштуе больш за жыццё рыбакоў, на чые восці яны трапіліся. А другая рэч: такою ты можаш быць толькі тады, калі табе Бог даў шчасце належаць да прыгажэйшага роду. Калі ты рыба, ён створыць цябе макрэллю і сардзінай або падаруе табе аблічча райскай істоты, чыя смерць будзе ганьбай для забойцы. Калі ты жанчына, тады Бог даў табе магчымасць самой выбраць, кім ты будзеш – макрэллю або кірняй. У момант нараджэння паміж ёй і Айседорай не было розніцы. Гэта Каце было абсалютна ясна. Розніца ствараецца жыццём, якое адным даецца толькі каб прыводзіць на свет новыя Божыя стварэнні і рабіць тое, што прыемна Царкве, але справа гэтая нічым не важнейшая і большая, чым праца вакзальных насільшчыкаў. Іншым жанчынам жыццё даецца, каб быць акторкамі і балерынамі, чыёй прыгажосцю будзе захапляцца кожнае разумнае стварэнне. А каб табе жыццё дало нешта такое, ты мусіш адрачыся ад веры, пакаяння і лавачкі ў касцёле, якая чакае тваіх каленяў і робіць цябе адной з соцень тысячаў. Замест таго, каб на гэта наважыцца, ты чакаеш раю, нават калі зразумееш, што раю няма. Проста па звычцы або таму, што ўжо позна прамяняць гэтае жыццё на нейкае іншае. Ты не адрачэшся нават таго, у што не верыш, і гэта будзе табе найбольшым пакараннем.

Аж пакуль аднойчы ты не прачытаеш у газеце, што загінула найпрыгажэйшая жанчына нашага веку, і не зразумееш, што ты магла б яе ўратаваць, калі б мела сілу ўратаваць саму сябе.

Яна выразала з часопіса Айседорыну фатаграфію і паклала яе на дно шкатулкі з дакументамі. Калі будзе вайна або загарыцца дом, у той шкатулцы будзе ўсё, чым Ката магла б пацвердзіць права сваё і сваіх дзяцей на новае жыццё. А цяпер яна склала туды нешта, што

ёй не належыць і што нейкім чынам – хоць гэта ніколі не было прамоўлена і не выяўлена ў яснай думцы – значыла, што яна адракаецца ад дзяцей і што яны зрабіліся ёй ненавіснымі. Яна і надалей аддала б за іх жыццё, памерла б па разу за кожнае дзіця, але больш не любіла іх той чыстай любоўю Найсвяцейшай Панны замілаванай сваім дзіцем на абразе над алтаром, які ўжо зусім пацямнеў ад уздыхаў соцень тысяч душаў, што апошнія дзвесце гадоў пад ім маліліся. Адрачэнне ад родных дзяцей было апошнім і найбольшым Каціным грэхам. Яна перастала верыць у самае праніклівае з святых паданняў.

Шчырая праўда такая: і малы Хрыстос зрабіў Марыю толькі макрэллю.

Вось жа, Ката адраклася ад сваіх родных дзяцей, як неўзабаве яны адракуцца ад яе. У тых адрачэннях не было прамоўленых словаў, дзеці не маглі нават здагадвацца аб тым, што адбылося, а маці пра іх адрачэнне не даведалася, бо была ўжо мёртвая. І хоць ніхто нічога не ведаў, няшчасце ўсё ж множылася разам з нявымаўленымі пачуццямі, і было б лёгка ў адпаведнасці з гэтым сачыць за лёсам усіх Сікірычаў. Калі б не было ашаламляльнага рэпартажу пра смерць Айседоры Дункан у заграбскім часопісе, калі б Рэгіна не пакінула часопіс на кухні і калі б Ката яго не прачытала, магчыма, інакш бы жылі і паміралі яе дзеці. У часах, пра якія мы гаворым, тэорыя Дарвіна яшчэ не была агульнапрынятая, а царкоўныя вераванні ўваходзілі ў эпоху свайго найвялікшага гістарычнага крызісу, пра псіхааналіз амаль нічога не было вядома, а ідэі гістарычнага дэтэрмінізму датычылі толькі народаў і дзяржаваў – а не сем'яў, аднак, паводле ўсіх вучэнняў, вераванняў і ідэалогіяў, гэтая сям'я пражыла б дваццатае стагоддзе іначай, калі б захавалася ілюзія мацярынскай любові.

Было б лепш, калі б папярэдняе сцверджанне можна было вымавіць цішэй або некатэгарычным тонам, каб не стварыць памылковае ўяўленне пра Каціну сілу і велічыню і – што яшчэ важней – пра глыбіню яе апошняга грэху. Але як толькі будуць пералічаныя яе папярэдні грахі, будзе ясна, што гэтая жанчына не была ні моцнай, ні вялікай і што ў яе душы было ўсяго патрошку, нічога не было зашмат. Не занадта разумная і зусім не злая, яна нібы памылілася часам, калі нарадзіцца. Калі б яна прыйшла на свет пару стагоддзямі ра-

ней, у часы інквізіцыі і палявання на ведзьмаў, яна бясспрэчна была б той узорнай кабетай, якая пакуты свету і яе ўласнага полу робіць менш невыноснымі і надае ўсяму сэнс дабрыні. Можа яна б зрабілася абатысай, апекавальніцай лепрозных і чумных, бо ёй вера ў логіку і змест святых паданняў давала б сілу большую за сілу сапраўднай веры. Вера ў фабулу, прынамсі ў яе выпадку – але можа мы тут маем справу і з агульным правілам – мацнейшая за веру ў Бога. У ім чалавек раней ці пазней пачне сумнявацца, бо не ўсё навокал адбываецца паводле задуманага этычнага намеру, а ў паданні сумнявацца нельга. Аднак дзеля таго, што яна нарадзілася ў часе, калі цуды больш не нараджаліся з людскіх галоваў, іх цяпер стваралі машыны без душы і сэрца, так і ад веры ў фабулу не магло быць жыццёвай карысці. Лёс вызначыў ёй жыць і памерці з разгубленасцю ў душы.

Яна кахала свайго мужа, бо належала яго кахаць і ніхто не ведаў, ці магло быць інакш. Прынамсі Ката не ведала, а нейкія іншыя людзі можа й ведалі. Але ёй да іншых не было справы. Яна ўцякала, калі жанчыны пачыналі абгаворваць сваіх мужоў: хто сваю б'е, чый кожную пятніцу ідзе на курвы, па кім і след згубіўся, а паехаў жа ж толькі ў Герцагавіну па тытунь… Калі яны гэтак пачыналі, а пачыналі як толькі іх збярэцца больш, чым дзве, падчас збору вінаграду, перад вяселлем або пасля пахавання, Каце здавалася, што з кожнай сустрэчы мужчыны з жанчынай бывае толькі няшчасце. А не можа і не павінна быць так! А калі гэта і так, дык нам трэба жыць, быццам гэтага няма. Як жа яны гэтага не ведаюць і як ім не баліць – калі ўжо ім не сорамна – што яны так гавораць пра сваіх мужоў? Яна пра свайго ніколі не сказала дрэннага слова. Ніколі нічога дрэннага не падумала. Праўда, ён яе не біў і не выходзіў з дому часцей, чым трэба. І не ездзіў у Герцагавіну па тытунь. Ён сядзеў на зэдліку побач з комінам, разбіраў і раскладаў цвікі ў тры драўляныя скрыначкі і ўздыхаў. Дваццаць гадоў працаваў ён над тым, каб у першай скрыначцы былі найбольшыя, у сярэдняй крыху меншыя, а ў трэцяй найменшыя. Было іх шмат, імі можна было б абабіць навокал увесь дом, але й самаму павольнаму людскаму стварэнню ўсё роўна не спатрэбілася б больш за два дні, каб скласці кожны цвік у сваю скрыначку. А ён ніколі не дайшоў да канца.

Толькі аднойчы яна сказала яму, каб пакінуў ужо свае цвікі, яна яму ўсё паскладае, калі скончыць іншыя працы. Ён паглядзеў на яе, і аднаго моманту, як ластаўцы праляцець над домам, было дастаткова, каб Каце больш ніколі не прыйшло ў галаву прапанаваць яму сваю дапамогу. Што яна ўбачыла ў тых вачах? Злосць дакладна не. І не страх. Дый нават і тугою гэта нельга было назваць. У сініх вачах свайго мужа яна бачыла яго самога, які патоне, як толькі апошні цвік складзецца ў сваю скрыначку. Ледзь трымаўся на паверхні і той, каго было відаць у ягоным воку, і той, яшчэ меншы, у воку ягонага вока, і яшчэ адзін, аж да найменшага, якога яшчэ можна была бачыць, у чыім воку было яшчэ прынамсі тысячу тых, драбнейшых за парушынку мукі, але азначаных тым самым жахам збіральнікаў цвікоў.

У Каты пахаладнела пад сэрцам, і яна зразумела, што ніколі нічога не зменіцца. Ён і надалей будзе на зары адыходзіць на працу ў порт, вяртацца заўсёды ў той самы час, спяшацца хутчэй скончыць абед, сядаць на зэдлік і да вячэры, уздыхаючы, перабіраць свае цвікі. Уначы яна будзе прачынацца ад ягонай дрыготкі, будзе класці яму далоні на плечы, каб ён супакоіўся, а пер'е ў ягонай падушцы будзе мяняць як найменей тройчы на год, бо яно прэла і пачынала смярдзець ад ягоных слёз. Яна пыталася ў сябе, чаму ён такі, спрабавала намацаць ягоную бяду, імкнулася яго разгаварыць, а калі не выходзіла, месяцамі не прамаўляла ні слова. Толькі, каб аднойчы нешта здарылася. Але не! Ён штодня і штоночы рабіў тыя самыя рэчы, а Каце не было Богам дадзена дабрацца да іх сэнсу.

І як бы тады яна магла кахаць яго іначай, чым дзеля парадку, і таму што пра нічога іншага ведаць не хацела. Каціна сэрца было чыстае, але ўсё пусцейшае, пакуль урэшце ў ім не зарадзіўся сумнеў. Здарылася гэта за некалькі месяцаў да нараджэння Лукі. Кропля за кропляй, яна поўнілася атрутай, якая нічым не адрозніваласа ад той, што была ў жанчын, чые мужы прападалі кожнай пятніцы. Яна пачала сачыць за ім, выскоквала з ложка, калі ён уначы ішоў справіць патрэбу, але не магла заспець яго на гарачым. Яна не выявіла, што ён патаемна перакладае цвікі ў іншыя скрыначкі, каб назаўтра зноў мог іх перабіраць. Прадчуванне падману спярша даводзіла яе да шаленства, але калі яна падумала, што падману, можа, і няма і што

заўсёды застанецца дастаткова цвікоў у неадпаведнай скрыначцы, яе пачынала мучыць сумленне. Яна шкадавала мужа і гідзілася сабою. Як ёй нешта такое дрэннае магло прыйсці ў галаву! Калі сумленне – гэта орган, які вымярае грэх чалавека, тады Кацін грэх быў страшны. І абурыліся нябёсы, і дзіўна, што тымі днямі гром не ўдарыў ёй проста ў лоб.

Так гэта выглядала з Кацінай перспектывы, але з перспектывы тых, хто пра той грэх ніколі не даведаецца і хто б не зразумеў у чым ён, калі б ім пра яго і сказалі, гэта быў зусім малы грэх. Нагэтулькі ж малы, як і прычыны чалавечага сумлення ў маштабах цэлага свету. Без розніцы, ёсць над ім Бог або не.

Астатнія Каціны грахі таксама датычылі мужа. Часам яна магла яму нагрубіць, нават закрычаць, а аднойчы аблаяла яго проста ў твар. Яна хацела, каб ён яе ўдарыў, ёй тая аплявуха была патрэбная больш, чым глыток паветра пад марской паверхняй. Ад удару па твары магло пачацца жыццё. Але ён яе не ўдарыў і не адказаў, толькі прамармытаў нешта, што гучала як выбачэнне або як просьба пакінуць яго ў спакоі з ягонымі цвікамі.

Так прамоўленая лаянка ў Кацінай душы змяніла свой першасны сэнс, зрабілася нечым недарэчным і невыносна ганебным. Больш яна не лаялася, нават па звычцы, нават у тых выпадках, калі лаянка замяняе светлыя і бязвінныя словы, якіх не хапае ў мове. У гэтым Ката была адзіная ў горадзе, у якім нават з самым багабойным чалавекам, з жонкай зніклага марака або манашкай здаралася, што ў іх з языка саскочаць нейкія брудныя словы. Грэх лаянкі быў для яе цяжкі, як вяртанне з вайны для разбітага войска.

Пасярод дажджлівай восені, уся зраненая, гаротная і змучаная лёсам, вярталася армія зняверaных у свае дамы, якія дашчэнту разбурыў вораг, да блізкіх, у якіх дзеля сваіх пакутаў ужо не ставала душы на іншых, без узнагародаў за адвагу і магчымасці гераічнай мінуласцю кампенсаваць жывое жыццё.

Вось так Ката адчувала сябе, калі дарэмна вылаялася, а ці ў яе перад вачыма ўзнікала відовішча пераможаных, якія ад 1918 года і да канца дваццатых вярталіся з палону, гэтага ведаць немагчыма. Можа і ўзнікала, бо яна бачыла сваімі вачамі, як яны спускаліся ў бок

Трэбіня, праходзілі праз горад і ішлі далей праз Арсланагічаў мост, і ніводзін з некалькіх соцень не прамовіў ні слова, не падняў позірк з дарожнага пылу. З салдацкімі шапкамі, нацягнутымі на вушы, з фескамі, якія выглядалі зусім недарэчна – як і партрэт, на якім імператар і кароль Франц Іосіф спрабаваў выглядаць бацькам і сваім мусульманскім дзецям, з афіцэрскімі эпалетамі, з якіх абляцела пазалота імперскай славы. Босыя або ў драных ботах, разыходзіліся па дамах тыя, хто зрабіў усё, каб не было, як раней, і каб не прапала дзяржава, якую яны, можа, і не любілі, але адчувалі перад ёй абавязак, як жонка перад мужам. Яны былі абавязаныя ёй сваімі жыццямі і толькі выпадкова не паклалі гэтыя жыцці ў Галіцыі, на Сочы, пад Монтэ Малеты або недзе ў безыменных албанскіх цяснінах.

Яна, дзяржава, была ўжо старая і стомленая, без ніякага інтарэсу да сваіх падданых, ахопленая адзіным жаданнем як мага менш балюча сустрэць свой канец. Дарэмна было змагацца за яе і будзіць яе з мёртвага сну, але што іншага маглі рабіць тыя няшчасныя салдаты? Толькі тое, што Ката спрабавала рабіць з сваім мужам. Яны не маглі зразумець, чаму імперыя ўпала ў ступар, як адна душа распалася на некалькі, на столькі душаў, колькі было ў манархіі народаў і плямёнаў, але яны здагадваліся, што за ўсім гэтым стаіць шайтанава задума, вар'яцтва, якое праглыне кожнага, каму Бог не даў здурнець у тым ладзе і рытме, у якім дурнелі цэлыя дзяржавы. Гэтак і Ката не магла даўмецца, што такое з яе мужам, чаму ён такі знутры, калі звонку ўсё выглядае нармальна і па правілах, у адпаведнасці з паданнямі, у якіх сказана, як мае прамінуць век кожнага Божага стварэння.

Добры Алах стварыў жанчыну, каб адвесці бяду. Калі б не яна, шайтан бы яму зачараваў чалавека, але Ён, усёмагутны, усё прадбачыў і паводле шайтанавага вобразу і падабенства стварыў жанчыну. Розніца толькі ў тым, што мора шайтанскага зла ён замяніў у жанчыне кропляй свайго дабра. І цяпер наша справа, каб кожная чаравала свайго мужчыну, бо калі мы гэтага не зробім, яго зачаруе шайтан. Вось так, дачушка, а ты ўжо глядзі сама, але запомні, што не маеш шмат часу. Шайтан хуткі, як заяц, і ты можаш яго перагнаць толькі тым, што ў цябе паміж нагамі.

Так ёй некалі сказала ў Благаі знахарка Халіма, калі Ката прыйшла спытацца ў яе пра зёлкі і прыпаркі, чары і замовы, пра ўсё, што вярнула б яе мужа да жыцця. На той час яна ўжо нарадзіла дваіх дзяцей і ўжо магла ведаць, што для мужа чары ейнага ўлонння драбнейшыя за пясчынку і павальнейшыя за чарапаху, але Халіма была настойлівая, а ўсе казалі, што яна ведае сваю справу,

Калі яму мала аднаго разу, дай яму два, дай сто разоў кожнай ночы, пакуль яго не прабудзіш. Не можа быць іначай, і не ў ім хіба. Калі ён мужчына, а ён мужчына, і калі ты жанчына, а ты жанчына, дык асядлай яго і не пускай, пакуль яго шайтан не адпусціць. Гэта твая вайна з шайтанам. І запомні, муж табе ў гэтым не можа дапамагчы. Не вінаваць яго і не праклінай, бо цябе Бог пакарае!

Ката вярнулася з Благаю спалоханая. Яна ведала, што ёй нічога не застаецца, як толькі зрабіць тое, што ёй сказала знахарка, нават калі б яна не верыла ніводнаму яе слову. А верыла яна ці не, у гэтым і сам Усявышні не быў бы ўпэўнены, калі б ён тымі днямі займаўся Катай і ейнымі грахамі ды цнотамі. Яна сама не ведала, што́ рабіць, не было нікога, хто б ёй сказаў, дый не чула яна пра выпадкі, падобныя да ейнага, таму зрабіла тое, што было самым лагічным.

Калі б яна нарадзілася на якое стагоддзе раней, яна пайшла б да спаведніка, а калі б яе жыццё прыпала на часы яе праўнукаў, напісала б ліст у жаночы часопіс або – што, напэўна, найменш верагодна з увагі на геаграфію Кацінай душы – звярнулася б да псіхіятра.

А так яна паехала да самай славутай у краі чарадзейкі, адной з нямногіх, пра каго разышліся чуткі па ўсіх гарадах і сёлах Каралеўства сярод тых яго падданых, чые лёсы трэба было неяк перанакіраваць і надаць ім сэнс шчасця і меру чалавечага ладу.

Пры гэтым яна трымалася правіла, што ісці трэба да чарадзейкі іншай веры, бо яе суд будзе больш надзейны і пэўны. Калі прыгнечаная нягодамі жанчына ўжо ўзяла на сябе грэх прымхаў і забабонаў, які забаронены пад пагрозай пякельных пакутаў усімі чатырма верамі Каралеўства, тады ўжо будзе наймудрэй давесці справу да канца. Колькі б ні была грэшная сама чарадзейка, значна больш грэшная за тых гаротніц, якія шукаюць у яе дапамогі, лепш каб яны не былі вінаватыя перад тым самым храмам. І таму,

а таксама з прычын метафізічнага характару, чарадзейкі і прарочыцы з мусульманскімі імёнамі цаніліся найбольш у пераважна хрысціянскім каралеўстве, і таму часам здаралася нават, што нейкая менш папулярная чарадзейка возьме сабе фальшывае турэцкае імя.

Так, нейкая Пэрсіда, былая прастытутка з ваколіцаў Бялграду, у новай працы звалася Фатымай, але хутка гэта выкрылася і яна мусіла ўцякаць з сяла, ратуючыся ад раз'юшанага натоўпу. Больш пра яе не чулі, але лёгка дапусціць, што недзе там, дзе не ведаюць пра яе сапраўднае паходжанне, яна й надалей займалася прароцтвамі і чарамі. Можа ў Румыніі або Венгрыі, а не выключана, што Пэрсіда або Фатыма дабралася і да Захаду, у Вену, Парыж або Берлін, дзе чарадзейкі з Балканаў ужо карысталіся добрым попытам. Яны прадстаўляліся цыганкамі і звычайна адкрывалі свае салоны побач з яўрэйскімі кварталамі, праменадамі прастытутак, у цырках і парках атракцыёнаў. Прадказанне лёсу і насланне і адвод сурокаў у дваццатыя гады зрабіліся такой важнай справай, што здавалася, быццам еўрапейскі кантынент ахапіла своеасаблівая метафізічная паніка, выкліканая тэхналагічным прагрэсам і наступствамі вайны, і што сапраўдную веру і рэлігійныя інстытуты мог уратаваць толькі вялікі інквізіцыйны праект або ідэалагічнае вар'яцтва, чым бы былі пераможаныя забабоны пуставер'я і зноў рэстаўраваныя рэлігійныя мадэлі. Калі праз дзясятак гадоў Гітлер поўнасцю авалодае нямецкім духам і большай часткаю Еўропы, гэтае дапушчэнне акажацца слушным. Нацысты не цкавалі знахароў і чарадзеек, бо ў гэтым не было ніякай патрэбы. Іх праца страціла ўсякі сэнс, усе навокал перасталі баяцца лёсу, таму яны маглі закрыць свае салоны і перасяліцца ў тыя часткі Еўропы, у якіх бальшыня людзей не была прыхільная фюрэравай зямной місіі.

Кацін страх таго, што яна мусіла зрабіць, вядома ж, быў беспадстаўны. Яна асядлала свайго мужа, як французская дама каня, і амаль што не злазіла з яго да канца іх супольнага жыцця. Ён быў цягавіты, зусім як конь, і здавалася, што ягоная мужчынская штука – самастойная асоба, адрозная ад той, што жыла ў яго ў галаве і ў сэрцы. Тое ягонае другое «я» было нейкае бадзёрае і заўсёды гатовае, незалежнае ад змрочных настрояў, але без магчымасці ўплыву

сваёй малой галоўкі на вялікую. Ейны муж згаджаўся на штоночную еблю, якая любога іншага зусім бы вычарпала, але гэтак ён згадзіўся б і на што заўгодна іншае, каб толькі ў яго не забіралі скрыначкі з цвікамі. Каціна спакуслівасць не рабіла яго ні шчасным, ні няшчасным, але ёй гэтая заўзятая праца ў ложку пайшла на карысць. Яна ўяўляла сабе, як выганяе з яго д'ябла, гуляла з ім, спрабавала яго забіць, падала з райскіх вышыняў у мяккае пуховае бяздонне, разбівалася на тысячу крышталікаў і ў наступнае імгненне зноў злучалася ў адно, плакала, як цэлы статак удоваў, і падала з ягонага хуя звар'яцелая ад смеху, быццам сатана насамрэч перасяліўся з ягонай душы ў ейную.

Наколькі дзённае жыццё з тым чалавекам было як даткнуцца языком да ржавага якара, настолькі начныя хвіліны і гадзіны ап'янялі яе марфійным шалам. Калі б яна была іншае натуры і схільная да п'янства і няспыннага блукання на ўзмежжы ўласнай душы, Ката, магчыма, і магла б быць шчаслівая з ім. Аднак яна не ўмела замяніць жыццё на імгненні жыццёвых асалодаў.

Яна злазіла з яго толькі ў апошнія дні перад родамі, але цяга плоці вярталася да яе ўжо праз тыдзень-два пасля родаў. Ёй жахліва балела, яна курчылася і выла, прабітая распаленым мячом, але не адступала. Яна хацела, каб ён хаця б раз пра нешта спытаўся, сказаў, што не варта было б гэтага рабіць, яна ж толькі што нарадзіла, каб ён паказаўся жывым і адчуў, што і яна жывая і што ёй баліць. Можа, гэта й не было найцяжэйшае Каціна выпрабаванне або найгоршая пакута, якія яна перажыла, спрабуючы прабудзіць свайго мужа ад вечнага сну. Але гэта былі наймацнейшыя болі, большыя, чым пры родах усіх шасці яе дзяцей. Калі нараджаеш, ты не можаш спыніцца, і ўжо гэта аблягчае боль, тым часам як ягоны хуй у кожнае імгненне сваіх пакутаў яна магла і жадала выкінуць з сябе. Але ёй не дазволіла ўпартасць або нешта іншае, яна не магла адмовіцца. Як ад сэксу, так і ад жыцця з ім. Магчыма, гэта рабіла Кату і большай і адважнейшай, чым мы зазначылі напачатку і чым бы нехта з яе дзяцей некалі падумаў.

Насамрэч яны яе не ведалі, як і яна не ведала іх. Яна гадавала іх спакойна і без жарсці. Рэдка калі яна магла занепакоіцца, не мучылі яе і мацярынскія страхі, ёй не прыходзіла ў галаву, што нехта з яе

дзяцей мог бы памерці ў гарачцы. Яна ставіла ім кампрэсы з воцату, надзявала на ногі змочаныя ў ракіі шкарпэткі, чуйнавала над іхнімі начнымі страхамі і кашмарамі, але не палохалася.

Калі вясною 1915 года ад іспанскай ліхаманкі памёр трохгадовы Ліна, яна села да яго ля ўзгалоўя, гладзіла па валасах, ціха плакала і гэтак жа ціха перажыла ягоную смерць. Ні мёртвае дзіця, ні пяцёра жывых не маглі стрымаць яе ад апантаных спробаў зрабіць іхняга бацьку нармальным чалавекам і сваім мужам.

Калі дзеці засыналі, яна пракрадалася ў спальню, замыкала дзверы, зачыняла вокны і анучамі затыкала кожную адтуліну, пасля, не правяраючы, спіць ён ці не, узлазіла на яго і пачынала змаганне з д'яблам. Няважна, што вайна даўно прайграная, яна працягвала сваё і не хацела ведаць ні пра што іншае.

Дзеці, мабыць, уначы не прачыналіся і не шукалі яе, а калі і шукалі, то ніколі пра гэта не казалі. Дый як, калі дзіцячы сорам такі вялікі, большы за ўсё, што адбудзецца ў будучыні, большы за сусвет і малыя чалавечыя гісторыі ў ім. Калі нехта з іх і чуў, як маці вые і плача, вымаўляе словы *піздa* і *хуй*, доўга сярод начной цемры вымаўляе – *ябі, ябі, ябі, ябі*…, а тады, у імгненне страты розуму, калі ёй здаецца, што кожная рэч у пакоі – сцяна, шафа, люстра – мае душу, мокрую і гарачую, маці вые – *раскалі тоўстую задніцу, прабі мне піздy, д'ябле, скончы ў курву, бестыя*, калі хоць адно з Каціных дзяцей гэта чула, а на бяду гэта чула Рэгіна, тады Каціна дарэмнае змаганне і пакуты працягвалі жыць і пасля таго, як яе самой ужо не было сярод жывых. І не скончыліся, пакуль і яе дзіця не аддало апошняе дыханне.

Раніцай на святога Сцяпана таго 1927 года мёртвая Ката ляжала на тым самым шлюбным ложку, з рукамі складзенымі на грудзях – якраз так, каб паміж пальцамі можна было ўставіць свечку – калі родныя захочуць, без падушкі пад галавой і ўжо даўно халодная і застылая. Падзьмуў паўднёвы вецер, цётка Ангеліна ўздымала ў доме паніку, што яе сястра засмярдзела і што душа ейная не знойдзе спакою. Чаму? адказу яна не ведала, але прадчувала, што нешта пра гэта пішуць у святых кнігах. Малога Луку ўжо трэці раз званітавала, ён нечым сапсаваў сабе страўнік, Джузэпэ, як муха без галавы, бегаў

трушком за цёткай і ўпэўніваў яе, што гэта пахне траска, а не мёртвая маці. Бэпа маўчаў, сядзеў на зэдліку каля печы і курыў цыгарэты, адну за адной. Джавані з фазы цынізму памалу пераходзіў у вышэйшую стадыю нервовага расстройства, злосна паглядаў на старэйшага брата і меў жаданне трэснуць яго дошкай для рэзання мяса па мордзе, забіць цыгарэту яму ў горла. Забіць яго, бо нічога не робіць. А ён адзіны, хто б мог нешта зрабіць. Сядзіць і чакае, пакуль нешта здарыцца, пакуль нехта прыйдзе па маці і вынесе яе з дому, гэтак як выносяць са склепу кадку з прагнілай кіслай капустай.

У яе душа прасмярдзіць, хто яе такую ў рай пусціць, вішчала цётка Ангеліна.

Рэгіна паглядзела на цётку, пасля на Джавані, пусціла Луку з рук і незаўважна, перш чым здарыцца нешта страшнае, пайшла да матчынага пакоя. *Не адчыняй гэтыя дзверы!* закрычаў Джавані.

Рэгіна ўвайшла, узяла з шафы посцілку і склала яе пад дзвярмі. Так пах не будзе ісці з пакоя. Пасля села каля Каціных ног, глыбока ўздыхнула і апусціла рукі на калені. На іх яна адчувала Лукаву вагу. Лёгкую дрыготку дзіцяці, якога яна не нарадзіла, але якое было ейнае якраз настолькі, наколькі нейкая чалавечая істота можа належаць іншай чалавечай істоце. Малы брат быў найбольшым клопатам яе веку. А цяпер ён сіротка, падумала яна і амаль рэфлекторна шморгнула носам. Яна адчула пах свежага крухмалу, які нагадваў ёй вясну і дзіцячыя хваробы. Маці мяняла ўсім пасцель раз на тыдзень, а калі нехта захварэе сярод тыдня, мяняла яму бялізну яшчэ раз. Прыемна хварэць, калі ты дзіця, падумала далей Рэгіна і яшчэ раз коратка шморгнула. Або проста панюхала паветра ў пакоі. Што яна адчуе апрача крухмалу? Пах сухой чарвяточыны з бакоў шлюбнага ложка і нешта падобнае да ружавага алею. Ці гэта пах смерці? Можа й так, бо ў іх у доме ніколі не было ружавага алею. Але што б цяпер ні пахла ружамі, гэты пах быў ледзь чутны. Маці, вядома ж, не запахла. Яна ведала гэта ўвесь час, але ім сказаць не магла. Проста не было каму. Цётцы Ангеліне нельга сказаць нічога. Яна вар'ятка; сама па сабе, а не ад дурной галавы. У галаве ў яе зусім чыста, таму яе вар'яцтва такое ўпартае. Яна разгорне модны часопіс, ускрыкне і ўпадзе ў транс, быццам убачыла, як Хрыстос ходзіць па вадзе. Не

можа паверыць, што існуе такая прыгожая сукенка! Не можа паверыць, што бываюць такія прыгожыя жанчыны, як гэтая, што ў той сукенцы! Не можа паверыць, каб тэхніка зайшла так далёка наперад, што фатаграфія выглядае быццам на ёй жывая жанчына! Вось, зараз яна выйдзе з моднага часопіса, тая найпрыгажэйшая жанчына ў найпрыгажэйшай сукенцы, пройдзе па нашай кухні і ўцячэ, бо мы такія непрыгожыя! Вось што падумала б шалёная цётка Ангеліна, калі б разгарнула модны часопіс. Таму ад яе трэба хаваць усе часопісы. Яна невыносная. Яна вар'ятка. Як і цяпер, калі крычыць, што яе сястра не трапіць у рай, бо засмярдзела, чакаючы, пакуль яе вынесуць. А маці, на жаль, немагчыма схаваць ад цёткі Ангеліны. Позна засунуць яе пад ложак. Хоць можа і трэба было, падумала Рэгіна. Ніякага зла б у гэтым не было. Калі б яны ведалі, што́ здарыцца і што на Каляды не будзе пахавання, яны б засунулі яе пад ложак і маўчалі. Ніхто б не ведаў, і цётка таксама, што Ката памерла. І ўсё гэта было б лягчэй вытрымаць. А так яны могуць толькі чакаць. Нялёгка ім усім, але ёй, Рэгіне, усё ж найцяжэй. Яна адзіная пэўна ведае, што маці не запахла. Толькі яе не ахапіла цётчына вар'яцтва. Яна б з прыемнасцю расчыніла акно, выскачыла на вуліцу, уцякла і больш не вярнулася б. У такім вялікім свеце згубіцца няцяжка. Дарэмна б яе шукалі. Так лёгка, калі цябе няма, думала яна, калі цябе няма там, дзе ўсё тваё і дзе ўсе звар'яцелі.

Яна ўстала і нахілілася над матчыным тварам. Каціна скура была белая, як камяні на Страдуне і шэра-шызая, як мора перад бурай. Рэгіна падсунулася да яе яшчэ бліжэй, склаўшы рукі за спінай, сагнулася, як галіна, на якой віснуць дзеці, пакуль кончыкам носа амаль не дакранулася да матчынага носа. Тады яна спынілася, твар у яе расцягнуўся ў фальшывую ўсмешку, яна крыўлялася, моршчыла лоб, высоўвала язык, зважаючы, каб не дакрануцца да Каціных вуснаў. Калі яе хрыбет больш не мог вытрымаць напружання, Рэгіна выпрасталася, на момант задумалася, пасля напружылася і выпусціла доўгі перарывісты перд. *Вось так,* шапнула яна і некалькі секундаў нюхала паветра, але ў ім і надалей чуліся толькі крухмал, чарвяточына і далёкія сляды ружавага алею. Яна была расчараваная. Павярнулася і выйшла з пакоя. Маці яна больш ніколі не бачыла.

III

Апошняе, што бачыў Рафа Сікірыч, былі дзве набухлыя цыцкі, якія падскоквалі кожная ў свой бок. Калі левая ўверх, то правая наніз, калі адна паляціць управа, ледзь не адрываючыся, другая пойдзе ў другі бок, пасля яны вернуцца і сутыкнуцца, плясне спацелая скура. Трэба напружыцца, каб разабраць гэты гук сярод крыкаў і ўздыхаў, гучна прамоўленых словаў, хрусту дошак у ложку, рыпу ржавых шарніраў, гуду ўвушшу… Так цягнулася гадамі, ён спрабаваў ясна пачуць, як пляскаюць цыцкі, зафіксаваць момант, калі абедзве адляцяць у адзін бок, заўважыць знак, што рэчы нарэшце пачынаюць працаваць паводле нейкай логікі. І тады ў яго раптам пацямнела ўваччу, знікла напружанне, аслабла кожная мышца, і ён падумаў, што ператвараецца ў блін.

Ягоная жонка скача па бліне, які расцягваецца ў яе паміж сцёгнаў. Неўзабаве яна спыняецца і з глыбокім уздыхам падае на другі бок ложка. Праз некалькі секундаў дыханне робіцца рэгулярным, і Рафа ведае, што яе тут больш няма.

Ён доўга цёр вочы, пакуль да яго не вярнуўся зрок. Ён паціху вылез з ложка, стараючыся яе не разбудзіць, адамкнуў дзверы і босы выйшаў з пакоя. Рэгіна спала ў адным ложку з Лукам. Хлопчык прытуліўся да яе, як малпянятка да маці. Бэпа хроп, Джузэпэ торгаўся ў сне, Джавані спаў на падлозе каля печкі. Адно дзіця лішняе, таму нехта заўсёды мусіць спаць на падлозе. Гэта быў яшчэ адзін элемент Рафавага неспакою, доказ таго, што лад немагчымы, і ўсё, на што ён ні гляне, гэта пацвярджае.

Усяго або замала, або зашмат. Нічога няма, каб як раз. Кожнай рэчы няпарная колькасць, і нічога нельга раздзяліць на дзве аднолькавыя часткі. А калі нешта выпадкова ў парнай колькасці, тады не дзеліцца на тры… Ён заплюшчваў вочы за абедам, каб не падлічваць

зярняты рысу ў талерцы. На неба ён наважваўся глядзець толькі ў воблачныя ночы .

Ён зачыніў за сабой дзверы. Адны, другія, пасля трэція – якія вядуць на двор. Ён нацягнуў старыя чаравікі і ў споднім і кашулі рушыў уніз па сходах. Была трэцяя гадзіна ночы, сярэдзіна лютага, халодны год. Калі ён некага сустрэне, гэта будзе яшчэ адзін знак. Ён вернецца дамоў, залезе ў ложак да Каты і будзе старацца не дакрануцца да яе ледзянымі нагамі. Гэта магло б яе прабудзіць і нагадаць пра тое, што яна ў гэтую ноч не скончыла. Калі б ён сваёй мужчынскай сліззю напаўняў бочку, замест таго, каб спускаць у яе, бочка пасля ўсіх гэтых гадоў была б ужо поўная. Дзе ж яно ў ёй дзяецца, куды выліваецца? І ўсяго шэсць разоў зацяжарала. Магла б у тры разы болей. Адно дзіця памерла, каб лік быў няпарны. Да нізу сходаў ён не сустрэў нікога. Гэта добры знак. Ён не вернецца.

Яму спатрэбіліся дзве гадзіны, каб дайсці пехатою да Міладзінавых скалаў. Калі б ён надзеў добрыя чаравікі, дайшоў бы хутчэй. Але паўгадзіны болей – паўгадзіны меней, гэта нічога не мяняе. Калі б абуўся ў добрыя, то напэўна перадумаў бы і дачакаўся раніцы, а тады верф, гук чыгуначных рэек, якія б'юцца адна ад адну, невыноснае адчуванне, як калі пазногцем скрабанеш па ржавым жалезе, тады дадому, скрыначкі з цвікамі і яшчэ адна спроба супакоіцца. Вось так было б, калі б ён надзеў новыя чаравікі. І не толькі чаравікі, ён бы надзеў і штаны, чыстую белую кашулю і разбудзіў бы паўдома. Яна б спыталася, куды ён сабраўся такой парою, і што б ён мог адказаць? На Міладзінавы скалы! А што табе там рабіць, на Міладзінавых скалах? А скочу ўніз, не сетку ж закідаць! Скочыш! Як я адразу не здагадалася!

Так бы, думаў Рафа, скончылася ўся гісторыя, калі б ён пайшоў у новых чаравіках. Дайшоў бы на паўгадзіны раней і не намёрзся бы гэтак. Ён дрыжыць як авечы хвост, ляскае зубамі, сківіца не можа спыніцца, нават рукамі яе не стрымаць. Мацнейшая яна за рукі, што паднімаюць рэйкі, дарэмна ён сціскае яе і ломіць кулакамі. Яна будзе калаціцца і калі ён скочыць уніз. А ўнізе рыфы, вострыя, як дзіды ў абарыгенаў, праб'юць яму вантробы і выйдуць са спіны. Так яго знойдуць, мёртвага, а зубы і далей будуць ляскаць.

Гэтая думка яго спалохала. Мёртвыя больш не варушацца, але ў яго будуць ляскаць зубы, грызці абломкі скалы, выклікаць адчуванне горшае, чым ад дотыку пазногцяў да жалеза. Ці гэта магчыма? У ягоным выпадку – так. Калі Каціны цыцкі ніколі адначасна не рухаюцца ў адзін бок, калі адно дзіця заўсёды спіць на падлозе, калі ў скрыначцы з вялікімі цвікамі заўсёды знойдзецца нейкі малы, калі кожная рэч у доме мае няпарную колькасць – а гэта правіла, ён правяраў яго сто разоў – тады і ягоныя мёртвыя зубы будуць ляскаць, як ляскаюць цяпер? А можа ён проста баіцца скочыць, таму й выдумляе ўсялякае? Не, чаго б ён баяўся! А калі ўсё ж баіцца?

Ён стаяў на Міладзінавых скалах яшчэ хвілін дзесяць, а тады пайшоў назад. У сподніках, начной кашулі і старых чаравіках, якія валачыліся за ім, абутыя на паўступака. У горадзе днела, рыбакі ішлі ў мора, канаўлянкі з кашамі на спінах і збанамі на галовах спяшаліся на рынак, недзе крычаў асёл, рабочыя збіраліся каля верфі, малочніцы бразгалі бляшанымі бітонамі. Палова гораду сустрэла Рафу Сікірыча: слава Богу і Найсвяцейшай Панне, каб жа ж ён ужо аднойчы звар'яцеў! Немагчыма больш было глядзець, як ён па тонкім дроце над горадам пераходзіць з аднаго боку на другі і ніяк не ўпадзе. Дзівішся яму па першым часе, молішся за яго, а пасля зразумееш, што ён ніколі не сыдзе наніз, што яму няма ратунку і ўсім, асабліва яго гаротніцы жонцы, будзе лепей, калі ён аднойчы звар'яцее зусім.

Што з табой? ён ляжаў на ложку з галавой у яе на ўлонні.

Што з табой, мой любы? зубы ляскалі, і кожны раз, як ён хацеў ёй адказаць, ён прыкусваў язык.

Што з табой, душа мая? ён адчайна стараўся быць спакойны.

Што з табой, сонца Каціна? яму б палягчэла, калі б ён мог заплакаць і гэтак ёй адказаць, але слёзы не ішлі, іх не было.

Хочаш, прынясу табе цвікі, анёл мой няшчасны? ён закаціў вочы і падумаў, што ў яго разарвецца сэрца.

Яна падумала, што ад цвікоў яму будзе добра, яны лек для ягонай душы, і яна б яму іх прынесла.

Тая думка кранула яго так глыбока, што ён палка пажадаў пажыць яшчэ трошкі, толькі паўгадзіны, або год, або сто гадоў, ска-

заць, як яму шкада: ён не мог інакш, а хацеў, а цяпер ведае, што і мусіць і хоча, ён будзе жыць, нават калі б кожны дзень быў для яго як у пекле. Ён будзе жыць дзеля яе, бо яна хацела прынесці яму ягоныя цвікі, яна пра іх ведала…

Рафа Сікірыч не супакоіўся. Да вечара яго калаціла, ён не мог вымавіць ні слова. Каля поўначы ён патануў у гарачцы і больш не прачынаўся. Пакой пах воцатам і слівовіцай, Ката, як безгаловая, бегала вакол яго і мяняла кампрэсы, дзеці стаялі побач і не разумелі, што адбываецца з татам. Ніхто не разумеў, бо ніхто насамрэч не ведаў, што Рафа рабіў уначы і раніцай. Адны думалі, што ён звар'яцеў, жонка і дзеці не ведалі што й думаць, а доктар Фохт раніцай сказаў, што яны маюць справу з цяжкім запаленнем лёгкіх, напэўна ён хадзіў з ім ужо не адзін тыдзень, і што хворы не дажыве да вечара.

Рафа Сікірыч, не прачынаючыся, памёр на досвітку наступнага дня. Удыхнуў, выдыхнуў і ператварыўся ў мёртвую рэч, яшчэ адзін няпарны лік.

Гэта было 12 лютага 1924 года, у той самы дзень, калі Джордж Гершвін з аркестрам Пола Уайтмэна ўпершыню выканаў «Блакітную рапсодыю». Рэгіна прачытала гісторыю пра «Блакітную рапсодыю» праз тры гады, у тым самым часопісе, у якім быў артыкул пра смерць Айседоры Дункан. *Эх, добры мой тата*, шапнула яна, і горла ёй сціснулі слёзы. Яна хацела пачуць тую музыку, якую на другім канцы свету нехта граў упершыню, калі ў яе памірaў бацька.

Пра гэтае жаданне яна не забывалася цэлых дзесяць гадоў, да таго дня, калі Іва Дэлавале прывёз з Амерыкі грамафон і адзіную кружэлку. «Блакітная рапсодыя» была хрустка-халодным завываннем ваўкоў удалечыні, бязладным перабіраннем фартэпіянных клавішаў, жахлівым ляскатам, якім нехта невядомы кпіў са смерці яе бацькі. Гукі без ладу і мелодыі, няправільныя, як цвікі, што падаюць адзін за адным. Але Іва вёз гэтую музыку праз акіян, у драўляным куфры, які быў абкладзены саломай, каб грамафон і кружэлка не разбіліся, а гэта кранала Рэгініна сэрца больш, чым ёй дыктавала мудрасць.

Эпізод з Гершвінам быў у яе жыцці выключны, бо ў ім апынуліся

ў раўнавазе два супрацьлеглыя пачуцці: каханне і агіда. Грамафон некалькі гадоў стаяў на пачэсным месцы ў пакоі, але «Блакітную рапсодыю» яна паслухала толькі адзін раз. Гэта была адзіная грамафонная кружэлка ў Рэгініным жыцці.

Калі «Блакітная рапсодыя» была памылкай, захапленнем ад назвы або выпадковым супадзеннем дат, якую ж насамрэч музыку ўяўляла яна сабе для таты? Нейкую ж напэўна ўяўляла, паколькі ён не быў сапраўдным бацькам, як іншыя, які сядзіць на чале стала, пацее, абразаючы вінаград, дакранаецца кончыкам пальца краю сялянскага капелюша, калі сустрэне святара, ганяе дзяцей па двары, калі заспее іх за крадзяжом яблыкаў, кліча знаёмага, пабачыўшы яго на другім баку затокі, пазбягае падводных скалаў, мерае позіркам астравы ўдалечыні, расплятае сеткі і напявае пад нос заграбскія шлягеры…

Нічога з гэтага не было ўласціва яе бацьку Рафу, як не было яго ні ў водным мужчынскім, бацькоўскім вобразе, які яна магла сабе ўявіць. Можа толькі якіх дзесяць разоў у жыцці ён звярнуўся да яе з нейкімі словамі, ніколі нічога ад яе не патрабаваў і не загадваў, але калі яна падыходзіла да яго або клікала з другога боку плошчы, ён усміхаўся, даваў зразумець, што яму прыемна, і тое, як ён гэта рабіў, адрознівала яго ад іншых бацькаў. Так ён усміхаўся толькі ёй, бо толькі яна была ягоным дзіцем. Сыноў ён амаль не заўважаў. Так яму было лягчэй, бо і яны не ўспрымалі яго як тату. Яны ведалі, што нельга яму замінаць, калі ён перабірае цвікі, а ў іншы час яны маглі лічыць, што яго як бы й не было. Зрабіўшы нешта дрэннае, яны баяліся маці. Калі хацелі да каго-небудзь падлашчыцца, зноў ішлі да яе. Рэгіна адчувала, што яго гэта мусіць абражаць, і ведала, што ён гэтага не можа выказаць. Нічога ў гэтым яна не магла змяніць, апрача таго што магла ўвесь час паказваць, што яна ягонае дзіця. Ён гэта прымаў, маці гэтага нават не заўважала, а братам было ўсё роўна.

І тады ён памёр. Такая несправядлівасць не магла здарыцца выпадкова. Нехта ў гэтым мусіў быць вінаваты. Рэгініны браты – таму што не любілі яго? Або маці – бо прымушала яго быць такім, як усе іншыя? Або быў вінаваты ўвесь свет, бо быў створаны не паводле ягонай меркі. А ягоная мерка была прыстойнейшая і прыгажэй-

шая за ўсе іншыя меркі. Усё ж найбольш вінаватая Рэгіна: калі яна з дзіцяці ператварылася ў дзяўчыну – ёй амаль споўнілася дзевятнаццаць, калі ён памёр – яна радзей падыходзіла да яго або махала яму здалёк, ловячы ягоную ўсмешку. Калі б яна рабіла гэта хоць бы раз ці два на дзень, а некалі і па дзесяць разоў, можа ён не адышоў бы той ноччу, не захварэў і не памёр. Яна была апошняй дый першай маленькай птушкай шчасця ў ягоным жыцці. Дык калі не стала яе, тата мусіў памерці. Калі яна пра гэта думала, яна выразна чула ягоную музыку: цішыню, што гучыць ад пальцаў тапельца, які хапаецца за галінку, якой няма, сярод мора, якога няма. Хор астраўлянскіх сялянаў на пустцы за касцёлам, там, дзе хаваюць байструкоў, бадзягаў і тапельцаў, якіх выкіне мора, спяваў пра маракоў з патанулай галеры, бядоту, панабраную абы-адкуль, патопленую ў бітве з туркамі. Мужчынскія галасы зладжана перапляталіся, уздымалі на сякеры чырвоныя каптуры, глядзелі ў неба і блюзнерылі так, што ў пабожных людзей стыла кроў у жылах. Неглыбока закапаныя косці тырчалі з зямлі. Цяжка адрозніць паверхню скалы, тысячу разоў абмытую дажджом, ад гладкіх і дасканала круглых чарапоў самагубцаў і нічыіх дзяцей.

Рафа Сікірыч быў найменшым з дванаццаці жывых дзяцей у маці Матыі і бацькі Ёсіпа. Ён нарадзіўся няўчасна, як цуд, пра які паведамілі венскія газеты, бо Матыя Сікірыч, роджаная Валян, прывяла на свет жывое і здаровае дзіця за месяц да таго, як ёй споўнілася шэсцьдзесят два гады. У Трэбіне прыязджалі паглядзець на яго дактары з усіх куткоў Манархіі, а імператар Франц Іосіф – абажаны манарх, які, завалодаўшы за год да таго Босніяй, быў на вяршыні ўладнай моцы – паслаў Ёсіпу і Матыі ліст, у якім паведамляў ім пра сваю кранутасць нараджэннем дзіцяці і ласкава пагаджаўся быць яму хросным бацькам. Адмысловы пасланец сараеўскай вайсковай управы палкоўнік Штайнэр прыехаў з імператарскімі падарункамі і растлумачыў бацьку Ёсіпу і маці Матыі, у чым канкрэтна палягае імператарава кумаўство. Да таго, як дзіцяці споўніцца васямнаццаць, на імя апекуноў будзе выплачвацца дапамога ў памеры жалавання чыноўніка другога рангу, а пасля таго, як хлопец скончыць асноўную школу, яму, у адпаведнасці з талентам і пажаданнямі,

будзе забяспечана далейшае навучанне за поўны імператарскі кошт у Вене, Заграбе, Пешце, Празе, Браціславе…

Пакуль палкоўнік пералічваў, дзе Рафа будзе вучыцца, двое старых спалохана туліліся адно да аднаго, і насамрэч ім нічога не было зразумела. Ёсіпу ўжо пераваліла за восемдзесят, ён ужо даўно нічога не рабіў і быў цяжарам для дзяцей, дый розум памалу пакідаў яго, так што ён яшчэ не зусім звыкся з фактам, што турэцкага султана замяніў аўстрыйскі імператар*. Адзіным, што яго трымала пры жыцці, была цяга плоці, што ледзь яго не загубіла. Бо зразумеўшы, што маці ў іх на старасці гадоў цяжарная і народзіць ім сястру або брата, хоць у іх саміх ужо былі дзеці, Ёсіпавы сыны пашалелі. Найбольш дзеля ўяўлянага сораму, калі ўся Герцагавіна і палова Далмацыі прачуе, што старая баба – іхняя маці! – нарадзіла дзіця. Калі б не імператарава кумаўство, гэта й сапраўды быў бы вялікі сорам і нагода для абгавораў, якія могуць доўжыцца гадамі і з якіх часам нараджаюцца сямейныя мянушкі. Але калі ў справу ўмяшаўся імператар, выйшла, што ў гэтым быў не сорам, а вялікі, праўда, зусім незразумелы, гонар.

Калі аўстрыйскі палкоўнік увайшоў у бацькоўскую хату, яны адчулі сябе ледзь не шляхтай.

У момант Рафавага нараджэння ягонай старэйшай сястры было сорак пяць, яна ўжо мела трох унукаў, а наймаладзейшаму з Рафавых братоў ужо споўнілася васямнаццаць. Менавіта гэта было для аўстрыйскіх дактароў найвялікшым цудам. Як гэта магчыма, каб жанчына паміж шаснаццаццю і сарака пяццю гадамі нарадзіла пятнаццаць дзяцей – чацвёра нарадзіліся мёртвымі або памерлі ў першыя тыдні жыцця – а тады сямнаццаць гадоў нічога, а ў шэсцьдзесят два яшчэ адно! Яны спрабавалі задаваць агаломшанай Матыі пытанні наконт менструальнага цыклу. Спярша яна іх не разумела, а пасля пачала жагнацца і маліць Панну Марыю, каб выгнала д'яблаў з хаты. Але яны не адступалі, і тады яна заклікала на дапамогу святога Іллю, каб ён спаліў громам аўстрыйскага імператара і вярнуў добрага султана. Карацей кажучы, колькі б яны ні стараліся, дактары не здолелі раскрыць таямніцу Рафавага прыходу на свет, а дальбог было і такіх, якія сумняваліся, што яго нарадзіла Матыя.

Відаць, тут мы маем справу з пазашлюбным дзіцем адной з бабіных дачок. Гэта прымітыўныя людзі, нешта паміж чалавекам і жывёлай. Як зязюлі, адны адным падкідаюць сваіх дзіцянят, папярэджваў доктар Герліцкі сваіх маладзейшых калегаў. Стары браціслаўскі ліс не хацеў чуць клятвы чаплінскай павітухі Ёванкі, якая прымала роды ў Матыі. Абыякава глядзеў ён і на факт, што грудзі старой даюць малако. *Жаночая істэрыя не мае межаў! Калі ёй заманецца, жанчына здолее сцаць золатам!* распаляўся доктар.

Але бальшыня ўсё ж паверыла ў медычны цуд, так што Рафаў выпадак увайшоў у аўстрыйскія і нямецкія падручнікі фізіялогіі і акушэрства. Праўда, толькі як статыстычнае выключэнне, бо яго нельга было навукова апрацаваць – Матыя адмаўлялася супрацоўнічаць з навукай. Як бы там ні было, нараджэнне Рафы Сікірыча было другім укладам Герцаг-Босны* ў медычную тэорыю Манархіі. Першым і найбольш значным быў эндэмічны сіфіліс.

Хлопчык зрабіўся сямейным улюбёнцам, часткова дзеля грошай, якія кожны месяц на ягонае імя прыходзілі з Вены, а часткова і таму, што родныя браты і сёстры ўспрымалі яго хутчэй як габсбургскага прынца, чым запознены плод уласнай маці. Яны здагадваліся, што калі б з Рафам здарылася якое ліха, калі б, не дай божа, ён упаў з яблыні або нейкі вісус трапіў яму каменем у галаву, усе маглі б трапіць у турму. І не ў абы якую, а ў страшную сараеўскую турму Беледыю, пра якую па Герцагавіне хадзілі змрочныя легенды, найбольш сярод кантрабандыстаў тытуню, якія палохалі адны адных Беледыяй. Таму заўсёды нехта са старэйшых меў абавязак цэлы дзень сачыць за Рафам, хадзіць за ім, куды б ён ні пайшоў, і клапаціцца, каб малы ніколі не меў голаду або смагі. У агульнай беднасці дома Сікірычаў і трэбінскага краю наогул такое абыходжанне выглядала амаль непрыстойным. Выявілася таксама, што невялікае шчасце быць аб'ектам такой апекі.

Стары Ёсіп Сікірыч памёр на другую зіму пасля Рафавага нараджэння, і на ягонае пахаванне прыйшло больш людзей, чым пры ягонай беднасці і нетаварыскасці – яго ніколі не бачылі ні ў карчме, ні на вечарынках – можна было чакаць. Але ў народзе да памераў легенды выросла гісторыя пра Ёсіпаву плоднасць, вартую імпе-

ратарскага бласлаўлення, і людзі гэтага ўбогага бедака ператварылі ў відную постаць. Яшчэ праз дваццаць гадоў пасля Ёсіпавай смерці трэбінскія жанчыны ў ноч поўні бралі каменьчыкі з яго магілы і патаемна клалі іх у кішэні сваіх недастаткова здатных і плодных мужоў. Вера ў чарадзейную сілу тых каменьчыкаў знікне толькі на пераломе стагоддзяў, калі па Босніі і Герцагавіне разыдзецца гісторыя пра кладанскую мужчынскую ваду. Тая, зрэшты смачная і прыемная, багатая мінераламі горная вада перакрэсліць многія мясцовыя легенды пра плоднасць і знойдзе вялікі попыт у Вене.

Маці Матыя адышла праз паўгода пасля Ёсіпа. Аднойчы ўлетку папаўдні проста лягла і больш не ўстала. На яе пахаванне людзі, вядома ж, не прыйшлі. Толькі сям'я і некалькі суседак. Але затое прыйшоў імператарскі ліст спачування, у якім Ягоная Вялікасць назвалі Матыю адной з найадважнейшых маці Манархіі і прыкладам для жанчын Герцаг-Босны. Гэта быў відавочны знак, хоць і незразуметы ў Трэбіні, таго, што ў Аўстра-Венгрыі зайшоў далёка наперад працэс жаночай эмансіпацыі, а таксама таго, што існуе істотная розніца паміж балканскім і заходнееўрапейскім поглядам на таямніцу чалавечага нараджэння. Балканцы захапляюцца мужам, які апладніў жонку, а заходнікі шануюць факт, што яна прывяла дзіця на свет. Розніца ў тых поглядах тлумачыць, чаму Манархія не магла добра зрасціся па сваіх балканскіх швах. Рацыяналізм Габсбургаў тутэйшым племянным містыкам і метафізікам быў больш агідны і непрымальны, чым улада султана.

Але ў тым 1880 годзе было яшчэ зарана, каб нехта зразумеў, што новая дзяржава не скончыць добра. А якая дзяржава скончыла добра? Не было ў гісторыі чалавецтва дзяржавы, якая не скончылася крахам і якая за момант да краху не здалася сваім падданым самай бессэнсоўнай і найгоршай з усіх дзяржаваў, што некалі былі створаныя. Такі ўжо лёс гэтага грамадскага ўтварэння: нараджаецца ў крыві, а памірае з усведамленнем, што нарадзілася без прычыны. У гэтым банальным і пазбаўленым Божай задумы паўтарэнні тых самых дзяржаўных лёсаў праходзяць малыя чалавечыя жыцці. Рафава было адным з найменшых. Толькі ён пачаў як след хадзіць і прамовіў першыя словы, як застаўся без бацькі і без маці. Ён не

толькі што іх не памятаў, а і пазней сямейныя апавяданні пра іх будуць здавацца яму легендамі пра далёкіх продкаў. Свае жыцці яны пражылі задоўга да таго, як прыйшла ягоная чарга. Замест бацькоў у яго было адзінаццаць братоў і сёстраў, якія яму папераменна, хто ў каторы дзень, былі бацькам і маці.

Да школы здавалася, што ён такі, як і іншыя дзеці. Смяяўся колькі й яны, плакаў колькі й яны, і даволі добра пераносіў сваё становішча прынца. Тое, што ён усяго атрымліваў больш, чым іншыя, не падахвочвала яго патрабаваць больш, чым яму даюць. На трэбінскіх вуліцах казалі, што лепшага і сардэчнейшага дзіцяці за Рафу няма, ніякая маці падобнага яму не нарадзіла. Рафа быў анёлам, а таксама жывым доказам, які Франц Іосіф мудры ўладар.

Ведае цар, каму быць кумам, ведае арол, якія птушкі ў яго гняздзе вядуцца, дражніў хрысціянскі люд пазбаўленых улады трэбінскіх бэгаў*.

Рафа не Муя, а цэсар не стамбулец таўстазады, гучна прамаўлялі яны паўсюль, дзе магло чуць іх турэцкае вуха.

А бэгі слухалі ўсё гэта моўчкі, памалу збіралі рэчы ў дарогу на свабодны Ўсход і наракалі між сабою, што ні швабскае царства, ні тое дзіця не скончаць добра.

У іх словах не было злосці і не магло быць. Яшчэ да таго, як Турцыя зраклася Босніі, яны зразумелі, што праз нейкую неверагодную гульню лёсу засталіся жывыя, хоць іх час ужо мінуў. Ад пачатку свету ўпершыню некаму ўдалося перажыць уласны век. У наступным стагоддзі гэта здарыцца шмат з кім, але трэба памятаць, што пачалося гэта з баснійскіх бэгаў і што яны гэты свой лёс прынялі – з рэдкімі выключэннямі – з годнасцю і непарушаным адчуваннем, што яны ў гэтым свеце нешта значылі.

У тыя дні і месяцы, як і ўсе наступныя гады, калі яны толькі не выехалі або не асіміляваліся ў мяшчанстве, не спіліся, не звар'яцелі і не аддаліся веры, трэбінскія бэгі на кожную з'яву глядзелі з тугою. Тужлівай была для іх гэтая краіна, тужлівы венскі імператар, тужлівымі былі іх маёнткі, у якія ўломваўся зброд усякай веры, і тужлівы быў ім гэты хлопчык. Не прынясе яму шчасця царская ласка і багацце, а толькі няшчасце. Чалавека робіць шчаслівым толькі

тое, што належыць яму паводле Божай задумы і парадку. Усё іншае толькі павесіць яму цяжар на шыю. І не можа быць, каб бядняцкаму дзіцяці, усё адно якой веры, будзе хросным бацькам і раднёю ўладар, усё роўна якой дзяржавы. Вось што пра лёс малога Рафы думалі бэгі.

Вядома ж, не выйшла па-іхняму і вядома, што найменш мудрасці бывае ў мудрых на выгляд словах, якімі складаюцца зоркі над чалавечай галавою, але ў Рафу нешта перамянілася, як толькі ён пайшоў у школу. І хоць ён быў кемлівым, лёгка запамінаў і яшчэ лягчэй паўтараў за настаўнікам, веды ніяк у ім не прымаліся. Вызубрыць што трэба, зразумее чаго ад яго чакаюць, але ні адно, ні другое ён не быў у стане ўжыць. Новыя веды ён звязваў з папярэднімі толькі калі б яму пра гэта нагадалі або загадалі. Інакш ён вучыў усё быццам упершыню. Скажам, ён хутчэй за ўсіх дзяцей вывучыў усе літары, але яму спатрэбілася нашмат больш часу, каб звязаць іх у словы. Дый тады ён ведаў, як пішацца кожнае слова, не ўсведамляючы, з якіх літар яно складаецца.

Гэтае невытлумачальнае парушэнне ішло крок у крок з Рафавым замыканнем у сабе і стратай усякага інтарэсу да таварыства. Скончыўшы чатыры класы, ён выглядаў як стомлены і смутны дарослы чалавек. Бегаў толькі калі мусіў, удзельнічаў у дзіцячых гульнях толькі калі ад яго гэтага патрабавалі, і больш ніколі не смяяўся. Ён праходзіў між дзяцей, як цень, рэдка падаваў голас і найчасцей сядзеў пад ігрушай у школьным двары і чакаў, пакуль вартаўнік Іліяш каровіным званочкам абвесціць пачатак уроку. Ён авалодаў мастацтвам знікання. Нікуды не адыходзіў, усе ведалі, што ён недзе блізка, але калі ў гэты момант спытацца ў некага, дзе Рафа – той бы не ведаў, хоць Рафа быў, скажам, за два крокі ад яго. Трэба было добра прыгледзецца, расплюшчыць чатыры вокі, каб убачыць, што Рафа тут. І не было дзіцяці або дарослага, на каго б не дзейнічала гэтае ягонае ўмельства. Калі гэта было ўмельства і калі не патрэбнае нейкае іншае слова або інакшае тлумачэнне.

Калі аўстрыйская імперыя ўжо разлеглася па Босніі і Герцагавіне і ўзвалілася на людзей цяжарам і ярмом, як і любое іншае царства, тады і ў хрысціянскага люду прайшло жаданне дражніць мусульма-

нам вушы Рафам, які не Муя, і цэсарам, які не стамбулец таўстазады, і так хлопчык перастаў існаваць і для гэтага боку. Адзінымі, каму ён надалей быў важны і хто з нязменным запалам аб ім клапаціўся, былі браты, сёстры і аўстра-венгерская імперская канцылярыя.

І так было вырашана, што – нягледзячы на дрэнныя адзнакі – ён працягне навучанне ў Мужчынскай класічнай гімназіі ў Сараеве, нядаўна заснаванай школе, якая лічылася гонарам гарадскіх уладаў, бо была створаная паводле найлепшых венскіх узораў, з адборнымі выкладчыцкімі кадрамі, звезенымі з усіх краёў Манархіі.

Трыццатага жніўня 1891 года Рафа выехаў у Сараева. На далейшую навуку праводзіла яго ўся сям'я, якая ў міжчасе намножылася і пашырылася, часткова і на Рафавых імперскіх прыбытках. Больш за трыццаць Сікірычаў, усе апрача Рафавай пляменніцы, якая якраз нараджала, прыйшлі на новазбудаваны чыгуначны вакзал у Дуброўніку і ўсе, у тым ліку і трое непісьменных братоў, былі зачараваныя гістарычнай важнасцю моманту. Першы Сікірыч ад'язджаў у вялікі горад, але не на тое, каб быць слугою, а каб прайсці праз чары, пасля якіх іншыя будуць яму слугамі. Цяжка сабе ўявіць, а яшчэ цяжэй апісаць тое ўзрушэнне! Яно, напэўна, было не меншым за ўзрушэнне людзей, якія першымі ступілі на паверхню Месяца. Каб перажыць тое, што перажылі Сікірычы, людзі будуць узнімаць рэвалюцыі. Дзеля такога ўзрушэння ў дваццатым стагоддзі мільёны страцяць жыццё, кантыненты паплывуць у адкрытае мора, будуць знікаць адны і нараджацца новыя народы, будуць біцца спартовыя рэкорды, чалавецтва ахопіць гарачка, і ад гэтага нават зімы не будуць больш такія халодныя… Імператар Франц Іосіф дараваў Сікірычам нешта большае за ўсе багацці ягоных скарбніц.

І адзін толькі Рафа не адчуваў значнасці моманту, хоць і ведаў, якія думкі ў братоў у галаве. Але чаму менавіта яму выпала несці цяжар іх шчасця? Не было адказу, не было надзеі, што нешта можа змяніцца. Толькі вялізны смутак і слёзы, якіх ён не мусіў хаваць. Яны думалі, што ён плача таму, што пакідае дом, што яму смутна, бо доўга не пабачыць Трэбіне, і адчулі амаль што гордасць. Усё ж нечага вартае гэтае іхняе мястэчка, калі так па ім тужыш, ад'язджаючы ў рай. Яны суцяшалі Рафу, абдымалі яго і цалавалі, а ён аддаваўся

сваёй нядолі, упэўнены, што яго насцігла імператарава праклятце. Яго, хто больш за ўсё хацеў, каб увесь свет пакінуў яго ў спакоі.

Хлопчыку дапамагала яго нябачнасць, ён мог бавіць так цэлыя дні, пры гэтым ніхто яму не дакучаў і ён быў шчаслівы нейкім перакрыўленым і незразумелым для іншых шчасцем. Па дарозе ён адкрыў для сябе прыгажосць тунэляў. Пакуль колы цягніка грукаталі ў цемры, Рафа мог быць кім толькі хацеў. Упершыню ў жыцці. І было ўсё роўна, што ў яго не было жаданняў і што яму было ўсё роўна. Ён саромеўся ўволю, чырванеў у цемры, як морква ў глебе, яму нават захацелася закрычаць ад шчасця. Але гэта было б чуваць, яго крык быў бы гучнейшы за рыпенне сталі і спружынаў, якія дзіка сутыкаюцца і мелюць шлях перад сабою, таму ён маўчаў і спрабаваў затрымаць дыханне, пакуль цягнік не вылеціць з тунэля і пакуль людзі не патлумачаць памылкова ягоны румянец. Дзіця першы раз едзе цягніком, і ад страху ў яго ледзь не лопаюцца дробныя жылкі ў мазгах.

Прайшоў ужо час абеду, калі цягнік прыехаў у Мостар, дзе трэба было перасесці ў кампазіцыю, як у тыя гады называлі чыгуначны састаў, якая праз дзве гадзіны выедзе ў Сараева. Слова *кампазіцыя* дзяжурныя па станцыі і кандуктары вымаўлялі з асаблівай годнасцю ў голасе, нібыта гаворка йшла пра Моцарта і Брамса, і карысталіся любой дарэчнай і недарэчнай нагодай, каб згадаць сараеўскую кампазіцыю. *Білеты на сараеўскую кампазіцыю будзьце ласкавыя купіць на вакзале,* нагадвалі яны пасажырам, хоць бальшыня з іх не ехалі далей за Мостар. *Сараеўская кампазіцыя будзе пададзеная за сорак хвілінаў да ад'езду… У кампазіцыі абсталяваны спецыяльны вагон-рэстаран, цуд свету! венскі рэстаран на сталёвых колах… Сараеўская кампазіцыя прыязджае ў дакладны час і ніколі не спазняецца на станцыю прызначэння… Строга забаронена пляваць на падлогу ў кампазіцыі!.. Кампазіцыя складаецца з шасці, дзевяці або дванаццаці вагонаў. Загадзя мы не можам ведаць дакладна!.. Кампазіцыя мае сілу тысячы наймацнейшых коней імперыі, якая прасціраецца ад паўночных да паўднёвых мораў!.. Кампазіцыя – гэта цуд чалавечых рук, добры Алах мусіў бы добра памучыцца, каб стварыць большы цуд!.. Калі мы ўсё ж спознімся, віною*

будзе не кампазіцыя, а аб'ектыўныя ўмовы на дарозе!.. А ты, баба, едзеш далей кампазіцыяй?.. Эх, нашто табе кампазіцыя, ты й без яе дастаткова дурная! смакавалі сваё салодкае слова герцагавінскія чыгуначнікі, выразна адрозніваючы цягнік ад кампазіцыі. Тое, што ездзіла ад Дуброўніка да Мостара, было простым звычайным цягніком, але тое дзіва дзіўнае, якое абраных шчасліўцаў павязе ў слаўнае места Сараева, завецца кампазіцыя. Чаму? Э, гэта вы яшчэ пабачыце, вы, хто мае шчасце і прычыну ехаць далей з Мостара! Калі вы пераедзеце нябачную лінію, якая аддзяляе Герцагавіну ад Босніі, вам ужо будзе ясна, калі Бог перастаў ствараць свет і ў які момант заняўся кампазіцыяй. Лёгка ўявіць сабе, якую зайздрасць пасажыры цягніка адчувалі да тых, хто далей паедзе ў кампазіцыі.

Чалавечак, адказны за суправаджэнне Рафы ад Дуброўніка да Сараева, зваўся Алія і працаваў качагарам у трэбінскай гарадской управе. Выбралі менавіта яго, каб хлопчык не перажыў шок, як толькі сядзе ў цягнік. Маўляў, за Алію ў гарадской управе няма больш звычайнага і простага чалавека, дык і малому будзе лягчэй прыстасавацца і перажыць пераход з аднаго свету ў другі. Бо бывае, што і дарослы чалавек спалохаецца, калі ўпершыню перасядзе з запражнога воза ў сталёвае страхоцце і заменіць коней на лакаматыў, а што ўжо казаць пра дзіця! Але Алія ўспрыняў гэтую адказнасць як узнагароду за службу імператару і айчыне. Ён нават у сне не спадзяваўся некалі ў жыцці ўбачыць *прыўкраснае Сараева* і выклаў Рафу ва ўсіх тонкасцях усё, што будзе рабіць у Сараеве да вяртання ў Трэбіне. Ён купіць смажаныя леблебіі* і цукаты дзецям, жонцы Нафе ў Бэзістане* знойдзе найпрыгажэйшую ядвабную хустку, пасля пройдзе прашпэктам, па якім ходзяць толькі паны, пасля пойдзе ў Аліпашыну мячэць, дзе дзённыя намазы спраўляе хафіз* Сулейман-ага Фэрызаглу, найразумнейшы хафіз на захад ад Дамаску. Ён на памяць ведае не толькі Святы Куран, але і ўсё, што ад пачатку свету прыдумала мусульманская галава… А ў канцы Алія пойдзе на Скендэрыю*, гэта мабыць нейкі прашпэкт пасярод Сараева, дзе то самае прадаюць сапраўдныя венскія курвы! Але гэта не проста так сабе курвы, як Савэта і Ката ў Трэбіні, а гэта дзеўкі-шэльмы, найпрыгажэйшыя з найпрыгажэйшых, нават у султанавым гарэме мала

б такіх знайшлося! Яны па гэтых справах скончылі школу, у Вене і такія школы ёсць, і ведаюць, як з мужчыны зрабіць пеўня і жарабца, быка Рудога, за чыё семя плацяць дукатамі. Не пойдзе Алія ў ложак з сараеўскімі дзеўкамі-шэльмамі, не дай дарагі Алах, бо як бы ён тады Нафе паглядзеў у вочы і як бы пасля рабіў абдэст* – яму б толькі на іх паглядзець. Дзесяць гадоў чуе ён гісторыі пра іх прыгажосць, хто б ні ехаў з гарадской управы па справах у Сараева, бывае зачараваны тымі дзеўкамі-шэльмамі, а ёсць і такія, што да роднай жонкі пасля і кіем не дакрануцца пасля таго, як леглі з імі. Рэгістратар Хамза быў з трыма дзеўкамі-шэльмамі, дык з'ехаў з розуму, як толькі вярнуўся ў Трэбіне. Калі яны на цябе ўскочаць і заспяваюць швабскія песні, дык забудзешся хто ты і што ты. У крылатага каня ператворышся, і здаецца табе, даруй мне божа, што цябе прышпорваюць у галоп самі джэнэцкія гурыі*. Грэх гэта такі, што большых і не бывае, і не браў бы яго Алія на душу, нават калі б і не кахаў сваю жонку. А ён так яе кахае, што яму і цяпер без яе пуста, дык ён толькі зіркне адным вочкам у палац з венскімі курвамі, толькі панюхае іх водар, а напэўна ж пахнуць яны ружамі і язмінам – бо што пахне прыгажэй за ружы і язмін, і пабяжыць адтуль прэч, каб яны яго, не дай божа, не адурманілі чарамі і не давялі да спакусы.

Алія бубнеў бесперапынна і не зважаў на тое, што побач з ім сядзіць хлопчык, у якога яшчэ й пушок на вуснах не прабіўся і які, мабыць, не мае ўяўлення ні пра якія жаночыя чары.

Рафа слухаў яго і ківаў галавою. Ён мог на памяць паўтарыць усё тое, што Алія вымавіў ад Дуброўніка да Мостара, але нічога з гэтага яго не датычыла, таму ён і не думаў пра тое, што́ казаў чалавечак. Ён быў апанаваны сваімі клопатамі і толькі час ад часу апускаў позірк на Аліевы ногі, якія не даставалі да падлогі. Калі таго зусім зачароўвала захапленне Сараевам і дзеўкамі-шэльмамі, ён пачынаў ёрзаць на лаве і малаціць нагамі, як маленькі хлопчык. У гэтым відовішчы была нейкая туга, з якою Рафа лёгка мог зрадніцца.

У Мостары, першы чым была пададзеная сараеўская кампазіцыя, яны пайшлі на бурэк*. *Так загадаў гер Гайдрых,* сказаў Алія змрочна і безагаворачна. Рафа ведаў, што трэба есці, хоць страўнік у яго сціснуўся ад тугі, бо калі б ён не з'еў бурэк, Алія перад тым гер

Гайдрыхам, напэўна, сканаў бы ад страху. Чалавечак са страхам вымаўляў ягонае імя і напэўна шкадаваў, што сам ён не гераічнага складу. Бо інакш ён змаўчаў бы пра бурэк, і ў яго б засталося больш грошай на леблебіі, цукаты і хустку, падмануў бы цара і дзяржаву і лепш бы прабіўся ў жыцці. Людзі могуць і так, думаў Алія, але яму Бог не даў быць такім. Той, каму даў, прыбагаціцца, у спакоі правядзе свае зямныя дні, але ўрэшце трапіць у чорны джэхэнэм. Алію гэта суцяшала, але яму зноў жа не было ясна, чаму сэрца ў яго напаўняецца горыччу, калі ён ведае, што Бог усё бачыць і што злодзеі трапляюць у пекла. Цяжкія гэта пытанні для яго невялікага розуму! Трэба было б выкінуць іх з галавы, а тым болей сёння, калі ён едзе ў сваё найдалейшае падарожжа, якім узнагародзілі яго за верную службу венскаму імператару. Так, гэта зямная пашана, але яна была б немагчымая без ухвалення вялікага Алаха, які кожнага бачыць і ўсё ведае. Царская воля павязана з Божай. Мае сэнс быць добрым, думаў ён, гледзячы, як Рафа змагаецца з бурэкам. Гер Гайдрых нагадаў яму, каб ён і сабе купіў бурэк. Але калі ён скажа яму, што не быў галодны, той не будзе патрабаваць, каб Алія вярнуў грошы. Гер Гайдрых не скнара. Гер Гайдрых пан.

Эх, дык вось што такое кампазіцыя! Алія разявіўся, як карась, дый Рафу было не ўсё роўна, калі з бочнай каляі выкаціўся лакаматыў, удвая большы за дуброўніцкі, чорны, як дзёгаць, з бляскам, як у дзявочых валасах, ён цягнуў за сабой чатыры вагоны, якія ўжо на першы погляд выглядалі шыкоўнейшымі за найшыкоўнейшыя карэты, у якіх за турэцкім часам і звычаем ездзіў Аліпаша Рызванбэгавіч*, калі заязджаў у Трэбіне.

*Аман ярабі, вэла хаўле вела кувэтыле**, склаў рукі Алія і ў захапленні абышоў кампазіцыю. Але асцярожна, каб нешта не парушыць і не сапсаваць – каб пасля не давялося кампенсаваць страты. Або каб кампазіцыя раптам не падскочыла і не ўкусіла яго за нос.

Рафа нібыта і ўсміхнуўся. Або гэта толькі некаму магло здацца. Падабаўся яму той чалавечак, яго ножкі, якімі ён размахвае, ахоплены ўзбуджэннем, і тое захапленне, як у валачашчага сабакі, які моцна радуецца, але баіцца падысці. Такіх, як Алія, ён яшчэ ў жыцці не сустракаў. Ён быў невялічкі, і таму любы настрой ахапляў яго

цалкам, а не толькі да паловы або на тры чвэрці. Калі б Рафу ягоны настрой ахапіў усяго, ён за імгненне згарэў бы, як запалка, або знік бы, як зярнятка граду, якое ўпадзе ў двары сярод жнівеньскай спёкі. Але Алію добра, ён увесь шчаслівы праз пяць хвілін пасля таго, як быў увесь няшчасны. Любога іншага ён, напэўна, нерваваў бы, а можа і нервуе – трэба было б спытацца ў людзей, якія даўжэй Алію ведаюць, але Рафу ён спадабаўся. Не тое, каб іншыя былі яму непрыемныя, але Алія быў першы, пра каго можна было б сказаць, што ён яму сапраўды падабаецца. Перад Аліем лёгка знікнуць. Але нават калі Рафа знікае, Алія і далей паводзіць сябе, як бы ён быў тут.

Толькі яны занялі свае месцы ў кампазіцыі – вагон, што праўда, быў паўпусты, але не дай божа, каб Алія сеў на чужое месца! – і толькі лакаматыў пацягнуў вагоны ў дарогу, як ён запрапанаваў пайсці ў венскі рэстаран на сталёвых колах. Ён дакладна запомніў словы кандуктара, і не можа быць, каб той памыліўся або схлусіў. Рафу гэтая гульня падабалася, ён уяўляў сабе, як будзе дзівіцца чалавечак і што ён скажа, і яго забаўляла тое ягонае шчасце.

Вагон-рэстаран быў увесь у пазалоце і арнаментах, з глыбокім кілімам на падлозе, салоннымі крэсламі і столікамі – усё разное і з дзіўнымі закрыўленнямі, а двое афіцыянтаў мелі на сабе святочную чыгуначную ўніформу з нейкімі жоўтымі кутасамі, стужкамі і эпалетамі. Каб чалавек падумаў, што імператарская чыгунка якраз уводзіць вайсковыя чыны, афіцыянты гэта генералы, а кандуктары звычайныя салдаты. Алія злёгку адхінуўся, убачыўшы гэтыя паставы, якія лянотна і крыху пагардліва паглядалі на яго. Нікога іншага ў венскім рэстаране на сталёвых колах не было, а карлік і хлопец афіцыянтам неяк і не здаваліся патэнцыйнымі кліентамі. Але замест таго, каб прыйсці ў захапленне і роспач ад прыгажосці, не заўважыўшы, як яны на яго глядзяць, або спалохацца і сказаць – хадзем адсюль! – Алія адважна ўвайшоў усярэдзіну, ухапіўшы Рафу за руку, і нечакана аўтарытэтна прамовіў: *Ты будзеш сядзець тут!* Пасля абышоў стол і скокнуў на завысокае крэсла.

Можа некаму такое відовішча падалося б смешным, але афіцыянты не паспелі ўсміхнуцца, не прыйшло ім у галаву і заўважыць, што ў чалавечка звісаюць ножкі з крэсла, як Алія ледзь прыкмет-

на павярнуўся, нібы ў яго здранцвела шыя, і паўглыбокім голасам герцагавінскага агі прыкрыкнуў: *Хлапец, абслужы!* Афіцыянты падскочылі з ліслівасцю трэцеразрадных цыркачоў, якім не ўдаўся трук. Алія абапёрся локцем на столік і, узняўшы мезенец, махаў ім старэйшаму ў рытме сваіх словаў: *Маладому пану малінаўку, а мне ракію. Лазовую! Не, прынясі слівовіцу, але каб была не больш як дваццаць градусаў. Больш за дваццаць мне дрэнна для страўніка, дык я табе яе вярну. І не заплачу, бо я табе ясна сказаў, каб не была больш за дваццаць градусаў!*

Афіцыянты глядзелі на яго з тым страхам, пра які людзі дваццатага стагоддзя не будуць ведаць нічога і з цяжкасцю зразумеюць нават калі ім паспрабуюць растлумачыць яго праз ілюстрацыі. Гэта не страх нявольніка перад тыранам, а страх баснійскай чэрні перад вялікім візірам, страх перад пахмурным позіркам, за якім стаяць і розум, і сіла, і адвага, і звычай, і закон Неба і Зямлі. Гэта быў страх, які ў людзях, якім давялося яго адчуць, знішчае ўсякую ўнутраную і вонкавую апору. Перад візірам яны былі нікчэмныя і малыя нават і ў тым, пра што сам візір ніколі б не падумаў. Дык вось, такімі былі афіцыянты вагон-рэстарану, калі Алія казаў ім, чаго жадае.

Умомант на стале з'явіліся малінаўка і слівовіца – і не была яна ні на кроплю мацнейшая за дваццаць пяць градусаў! Рафа тады ўпершыню ясна ўбачыў твар гэтага чалавека. Раней Алія ўвесь час смяяўся, крыўляўся, сумаваў, па-дзяцінаму моршчыўся, мяняў дзесяць выразаў твару за пяць хвілін, і пры кожным твар у яго быў быццам з гумы і створаны для ўсіх магчымых прыніжэнняў. Твары прыніжаных запамінаюцца цяжэй за словы чужой і зусім незразумелай мовы. Але ў вагон-рэстаране гэты бядак ператварыўся ў змрочнага і няспешнага агу, у чыіх светлых вачах віднелася не млявасць душы, яны свяціліся лёдам застылых вулічных крынічак у сярэдзіне студня. З правільным, тыпова герцагавінскім тварам, з маршчынамі, высечанымі там, дзе ім належала быць паводле правілаў спелай мужчынскай прыгажосці, Алія быў нейкім іншым чалавекам. Рафа адчуў, што мае абаронцу, некага, хто аднолькава добра наглядае за яго вонкавым і ўнутраным светам. Алія гэта ведаў, і яму было прыемна.

Ён узяў хлопчыка за руку, пра нешта ўспомніў і скрозь нос, ціха, каб яго не чулі афіцыянты, заспяваў: *Будзь табе спакой вялікі, бяскрайні, бязмежны…**

Плацячы рахунак, Алія ніводным памылковым міргам не выдаў, што толькі што зменшыў напалову падарункі, якія задумаў прывезці сваім. Ён ведаў, што малінаўка і слівовіца будуць каштаваць столькі, гэта яму было ясна, як толькі яны ўвайшлі ў венскі рэстаран на сталёвых колах, але гэтая цана не была для яго завысокая. Яму было шкада кожнага крэйцара, які ён аддаў за бурэк, хоць за грошы, якія ён толькі што патраціў, ён мог бы купіць тры бляхі таго бурэку. Ён мог накарміць імі і цягнік Дуброўнік-Мостар, і кампазіцыю Мостар-Сараева, але гэта нешта іншае. Бурэк ён купляў на загад, а малінаўка і слівовіца не мелі да гера Гайдрыха ніякага дачынення, ні да яго, ні да яснага імператара. Ніхто не кампенсуе яму патрачаныя грошы, але хіба гэта важна і хіба такія выдаткі могуць кампенсавацца. Чэсць і частаванне не маюць цаны. І невыпадкова гэтыя два словы так падобныя, хоць і маюць рознае значэнне. Мова не дурная, хоць і дурны народ, які на ёй гаворыць. Алія гэта добра ведае, як ведае і тое, што Алах не будзе сердаваць, калі ён пацягне крыху ракіі. Баснія – краіна ракіі, гэта кожнаму турку ясна. Ведаюць гэта і тыя, што ў жыцці ніколі не парушылі Божага закону і не пацягнулі нават кроплі з пляшкі. А краіна ракіі яна не толькі ад слівовіцы і вінаграднай лазы, а ад той бяды, якая ў ракіі шукае леку. Алах не мерае аднолькавым аршынам кожнага чалавека, усіх сваіх сыноў і дачок, а бярэ пад увагу тое, ці жыве нехта між гораў, дзе імгла не разыходзіцца да траўня, ці на моры, дзе бура чалавеку прадзімае рэбры, ці ў пустыні, дзе заўсёды спёка і галава ў цябе часам закіпіць і без ракіі. Не засярдуе Алах на яго і за злосць і грубасць, якія загналі яго ў выдаткі. Нельга на чалавека, якога не ведаеш, глядзець так, як глядзелі тыя афіцыянты. Калі ты мяне можаш ні за што прынізіць, дык хай табе будзе ясна, што я цябе прыніжу ў тры разы горш.

Ён сеў ля акна і глядзеў уніз на Нярэтву, над якою да неба ўзвышаўся каньён. Шэрыя цені мякка ўлягліся адна на адну, як пласты цеста ў слоеным пірагу. Яны віліся і выгіналіся, пакуль іх сціскала вялізная рука, перш чым паміж імі выцекла зялёная вада.

Пра што ж думаў Бог, калі так іх складаў? І яшчэ пасадзіў аднуадзіную сасну на вяршыні найвышэйшай скалы. Сасна расла з каменя. Алія ясна бачыў, што наверсе няма зямлі. Калі дзьме вецер, тая сасна каранямі трымаецца за скалу, а праз яе за цэлы свет. Усё, да чаго б ты ні дакрануўся ў гэтым свеце, куды б ты ні ступіў і на што б ні сеў адпачыць, будзе часткаю таго, за што трымаецца тая сасна над Нярэтвай. І няма такога аддаленага месца на зямным шары, якое б яму не належала. Перад такім цудам чалавек мусіць быць ціхі. Перад нейкімі іншымі цудамі трэба быць шумным і радавацца ім. Першыя цуды большыя за другія. Сасна, якая расце з каменя – большы цуд, чым кампазіцыя, на якой яны едуць.

Рафа сядзеў насупраць, але не заўважаў таго, што бачыў ён. Калі ён глядзеў на Алію, да яго вярталася ягоная самота. Ён зноў адчуў, што гэта глупства – верыць у магчымасць не быць аднаму. Як толькі лепш да нечага прыгледзішся, пачынаеш заўважаць, як яно аддаляецца ад цябе. Калі глядзіш на яго дастаткова доўга, разумееш, што хутка яно знікне. Так і з Аліем. Таму лепей перастаць на яго глядзець, бо і ён мог бы знікнуць. І было б шкада, гэта была б вялікая страта, найбольшая, якую Рафа мог прыгадаць, перш чым заплюшчыў вочы, каб праз некалькі секундаў зноў убачыць, як Аліевы ножкі малоцяць паветра, бо Алія прыгадаў, як нейкія хлопцы скачуць з моста ў Мостары. І ні кропелькі не баяцца. А яму было страшна ўжо толькі паглядзець уніз, калі ён два гады таму быў па працы ў Мостары і ўпершыню падняўся на мост. Гер Гайдрых паслаў яго, бо ў ягонай маленькай дачкі быў дзень народзінаў, а ў кандытэрыі ў Кальца ёй пяклі торт. Гер Гайдрых не любіць гэтыя нашыя пірагі. Кажа, што баклава яму занадта салодкая, а туфахіі* занадта сялянскія. Дзе ж гэта хто бачыў, каб у яблык пхалі арэхі! Калі б так было трэба і калі б гэта мела сэнс, злаваўся гер Гайдрых, дык Ева б не кусала яблык, а прадавец бозы Ісма прынёс бы ёй туфахію. Гер Гайдрых пабачыў свет, таму ўсё добра ведае. Нашы пірагі не сусветныя, а толькі нашы. А хто мы? Ніхто і нішто. Калі б не было ў нас Аўстрыі, засталіся б мы сіротамі на зямным шары. І Стамбул пасля столькіх стагоддзяў махнуў на нас рукой. А чаму б ён не махнуў! Занадта шмат клопату мелі туркі з Босніяй, а яшчэ больш

з Герцагавінай. Прыбытку ніякага, адны выдаткі! І крывёю, і золатам, і чым толькі хочаш! А тады ў нас яшчэ і бэгаўство пабунтавалася*! Насунулі фескі на галовы, падаставалі старыя рушніцы, парассцілалі ваўняныя посцілкі на пустках, і то грэюць задніцы на сонцы, то ўзнімаюць бунты і паўстанні! Маўляў, не хочуць яны слухаць, што ясны султан кажа, а будуць вырашаць па-свойму. Эх, дзе ж у іх розум! Дык і вядома, што туркі павярнуліся і пайшлі. З вар'ятамі лепш справы не мець, а мы вар'яты і самі сабе непатрэбныя, а таму нам непатрэбныя і іншыя. Лепшыя, большыя і разумнейшыя! Ну дзе ж Трэбіню са Стамбулам мерацца? Гэта тое самае, калі б маленькі Алія выклікаў на бой таго прызрэнскага асілка, што летась рваў ланцугі таўшчынёю ў тры пальцы! Не дай Божа, калі мы аднойчы і Аўстрыі так надакучым, што яна нас пакіне. Не дай Божа да такога дажыць.

Нешта такое думаў, а нешта казаў Рафу добры Алія, пакуль кампазіцыя цягнулася і паўзла праз Іван-гару, так павольна, што можна было выйсці і ўздоўж чыгункі назбіраць суніцаў. Можа Алія і запрапанаваў бы выйсці, але была ноч і суніц было не відаць, нават калі яны й былі. Калі лакаматыў змагаўся з апошнім уздымам перад Брадзінай, Рафа і Алія адзін за адным паснулі. І невядома было, каторы з іх першы патануў у сон, калі, як у дэрвішскім танцы, круцілі свой зікр сталёвыя колы.

Рафу прабудзілі крыкі вакзальных насільшчыкаў. Алія і надалей, скурчыўшыся, хроп і не прачынаўся б, пакуль кандуктары не выкінуць яго з вагона. У тыя гады рэдкія былі людзі лёгкага сну. Засыналі хто дзе паспеў і спалі глыбока, не баючыся прабуджэння. А тыя, чый сон лёгкі – выдумка дваццатага стагоддзя і мадэрных часоў, у якіх лягчэй жывецца, цела менш мучыцца і растрачваецца, а душы робіцца ўсё цяжэй, таму яна ніколі дастаткова не высыпаецца.

На пероне было тлумна, як у чыстцы. Насільшчыкі, прадаўцы бозы і печанай кукурузы, дыспетчары, кішэннікі, вестуны і тыя, хто некага чакаў, паліцыянты і шпікі ў цывільным, шалахвосткі і жанчыны ў чорным, цыганяты і калекі без ног і рук, немчыкі з гідлівымі тварамі і іх прыгожыя жонкі, падарожнікі і касіры правінцыйных поштаў, уцекачы ўсякага роду, таўстазадыя, лупатыя, барадатыя і лысыя, тыя, што смярдзяць гаўном, і тыя, што злей за сабакаў

глядзяць на ўсё навокал, ёлупы і прайдзісветы, элегантнае панства, вандроўныя спевакі, госці муніцыпальных гулянак і неверагодная маса люду, пра які нельга было сказаць, якому роду ён належыць і з якой казкі паходзіць. З прыбыццём цягніка на станцыю ўсе яны пачалі так штурхацца, ціскаць адны адных і запускаць пальцы ў чужыя кішэні, што выглядала акурат быццам Ной рыхтуецца да новай экспедыцыі, і трэба чым хутчэй сесці ў карабель, каб уратавацца ад патопу. Алія моцна трымаў Рафу за руку, не хапала яшчэ яго згубіць цяпер, калі місія набліжалася да канца, а хлопчык дрыжаў ад страху.

Не да канца прачнуўшыся, ён не быў упэўнены, ці з аднаго сну не трапіў у другі і яму проста сніцца, што ён прачнуўся, а насамрэч ён патануў яшчэ глыбей, у кашмар, які хаваўся за ўсімі ранейшымі кашмарамі і пра існаванне якога ён даўно здагадваўся. Гэта ведаюць усе, і таму з дрэнных сноў абуджаюцца шчаслівыя, што не саснілі яшчэ горшыя. Твары мужчынаў і жанчын, старых і маладых, ды нават і дзяцей былі ўсе без выключэння пагрозлівыя. Яны злосна смяяліся і злосна крычалі, а сараеўская гаворка – Рафа чуў яе ўпершыню – гучала груба і цвёрда. Быццам тутэйшыя людзі ніколі не адчулі шырыні горных выпасаў і заставаліся сціснутыя, а таму мармыталі, скрыгаталі і шыпелі.

Шэра-жоўтая боза пралівалася па пероне, салеп* пах інтэнсіўна і п'янюча, як лек, які даюць смяротна хвораму, каб аблегчыць яго пакуты ілюзіяй лекавасці, гарачая халва размазвалася па сіняй абгортачнай паперы і сцякала па рукавах джэмпераў з нефарбаванай воўны. З далечыні чулася завыванне і гаўканне сабачага хору, нядаўна заведзеная гарадская скуралупня працавала поўным ходам.

З-за высокіх гор, такіх ні Рафа ні Алія яшчэ не бачылі, прабівалася ранішняя зара. За некалькі хвілінаў у даліне, у якой з канца ў канец разлёгся горад, разліліся яркія колеры, ад якіх забаляць вочы, мурашкі папаўзуць уверх па спіне аж да чэрапа, які вялікі Гётэ – пра яго ў Сараеве яшчэ толькі пачуюць! – называў апошнім пазванком. Алія ўбачыў мінарэты соцень мячэцяў – ці ёсць іх столькі ў Стамбуле? – замест пыльнай дарогі пад нагамі ў іх распасціраўся чорны брук, якому не было відаць канца, з усіх бакоў будынкі па пяць-шэсць паверхаў – як падмуркі вытрымаюць такія дамішчы? – пра-

ходзяць жанчыны з адкрытымі лыткамі – ці гэта тыя дзеўкі-шэльмы і хіба іх так шмат? – праходзяць ханумы* пад вэлюмамі, але і яны спяшаюцца, быццам у іх голыя ногі і яны не ведаюць, як бы іх схаваць…

Спатрэбіўся час, каб абодва ачомаліся і ўспомнілі, з якой справай яны прыехалі ў гэтае неверагоднае месца, у горад, які быў большы і магутнейшы за той, якім жывы чалавек мог яго сабе ўяўляць. Рафа ўсё яшчэ не разумеў, што ён тут застанецца, а Аліі ўжо было шкада, што ён адсюль паедзе. Ён дастаў з кішэні паперку. На ёй было напісана, куды трэба завесці хлопчыка, але не казалася, каму трэба яго перадаць. Але Алію гэта не занепакоіла, дзе там! бо ж гэты малы імператараў хроснік, а якім вялікім бы Сараева ні было, але ж і тут усе мусяць ведаць, што значыць быць улюбёнчыкам Франца Іосіфа. Не кожнаму ён кум! Хай ён сто разоў імператар, але ж не можа ён дзесяць разоў быць кумам. І сямі-васьмі ўжо хапае з галавой! Алія адчуў гонар, да яго вярталася ўпэўненасць у сабе, бо ён зразумеў, што ў Трэбіні ёсць нешта такое, чаго ў Сараеве няма.

З левага боку ад Міляцкі, калі перайсці Лацінскі мост, яшчэ за турэцкім часам быў збудаваны чатырохпавярховік паводле заходняй моды. Збудаваў яго Іван Караджа, буйны гандляр і перавознік, які трымаў сувязі з Дуброўнікам і Венецыяй, што не перапыняліся нават у часе паўстанняў і войнаў, калі ўсе сувязі разрываліся, а гандлёвыя караваны мусіў суправаджаць узмоцнены атрад аскераў*. Каражду аднак аскеры былі непатрэбныя, бо гайдукоў* ён не баяўся. З усімі варожымі і збунтаванымі бакамі ў яго заўсёды была дамова, а дарожныя разбойнікі яго не чапалі, бо сярод такіх ён стараўся заслужыць яшчэ горшую рэпутацыю, чым была ў іх саміх. Два-тры разы, у часе вялікага голаду і Караджорджавых паўстанняў* у Сербіі нейкія гаротнікі напалі на Караджаў караван, але ягоныя людзі не пацярпелі, а разбойнікі засталіся без здабычы. Што сталася з самімі тымі разбойнікамі, дакладна не вядома нічога, апрача таго, што ніхто з іх не вярнуўся дадому.

Расказвалі, нібыта Іван Караджа выкалаў ім вочы, што вырваў ім пазногці і што ў ноч вялікага кірмашу адразу пасля нападу сваімі рукамі распаліў вогнішча і падрыхтаваў гарачае вуголле. Пасля ён

прывязаў гайдуцкага атамана дротам да ражна і спёк жыўцом. Але так, казалі людзі на рынку, што над вуголлем было толькі тое, што ніжэй пояса. Атаман яшчэ быў жывы ў той момант, калі Караджа ўзяў нож і адрэзаў ладны кавалак тоўстага мяса і на вачах у няшчаснага зжэр яго, заеўшы цыбулінай. Гэта толькі адна з страшных гісторыяў пра Караджу, былі і іншыя. Нейкія з іх датычылі і меркаванай Караджавай схільнасці да педэрастыі і садаміі – там былі яшчэ страшнейшыя дэталі, але шчырую праўду не ведаў ніхто. Сам Іван ніколі ніводнай гісторыі пра сябе не абвяргаў, і калі хто на вуліцы кідаў у ягоны бок нейкае брыдкае слова ці абвінавачанне, ён не звяртаў на гэта ўвагі і ганарыста праходзіў міма.

Апранаўся ён паводле цывільнай моды і быў першым сараеўцам, які каля 1820 года хадзіў па горадзе ў капелюшы. Не адна дзяўчына, не выключаючы і турэцкіх ханумаў, заглядалася на яго, такі ён быў моцны і прыгожы. Асманы цанілі яго, улады паважалі, а выглядала, што меў ён добрую рэпутацыю і сярод стамбульскіх гандляроў і дыпламатаў.

Калі летам 1878 года вайсковыя аддзелы барона Філіпавіча ўжо біліся за Пашына Брда і ўваходзілі ў горад, Караджа ўстаў з хваробнага ложка, прыбраўся, надзеў на галаву капялюш і, ступаючы павольна і асцярожна, дайшоў да гарадской управы. Было яму пад сто гадоў, пра яго і пра легенды вакол яго ўжо памалу пачалі забывацца, але ён палічыў дарэчным прыйсці ў турэцкую гарадскую ўправу, выказаць шкадаванне з прычыны здачы Босніі і сказаць, што жадае з турэцкімі сябрамі застацца ў найлепшых дачыненнях. Управу аднак усе ўжо пакінулі, і ён не знайшоў там нікога, апрача аднаго слугі, ходжы* Асіма Брутуса, бацькі дзевяцярых дзяцей, пабожнага, але дзікага чалавека. Асім яго не пазнаў і раз'юшана сарваў яму з галавы капялюш. Маўляў: набраўся нахабства нявернік і надзеў паганы капялюш яшчэ да таго, як ягоныя ўвайшлі ў горад!

Страшны Іван Караджа толькі здзіўлена на яго паглядзеў і спрабаваў нахіліцца, каб падняць капялюш, але ўжо не мог.

Чорт яго бяры той капялюш, калі гэтак прападаюць імперыі, кажуць, прамовіў ён і на другі дзень аддаў душу.

Ці трэба нагадваць, што ён памёр няшчасны? Не трэба, але

і гэта адпавядае легендзе пра Караджу. Шкада, што Сараева – не горад сапраўдных сэўдаліяў*, як Мостар, і не знайшлося нікога, хто б заспяваў пра Караджу песню, якая выконвалася б пад саз* або скрыпку і захоўвала ўспамін пра гэтага незвычайнага чалавека.

Дык вось, на той адрас, у той Караджаў палац меўся Алія завесці Рафу. Ён і завёў яго і перадаў дзвюм манашкам, якія займалі гэты будынак часова, пакуль на Банскім Брэгу, прыгожай паляне каля мячэці і могілках на Мэйташы, не збудуюць кляштар. Адна звалася Разалія і была дзябёлая, румяная і ўсмешлівая, а другая звалася Паўліна і была высокая і худая, як жэрдка трэсці слівы.

Алія, убачыўшы іх, засмяяўся і адразу збянтэжыўся, язык у яго заплятаўся ад спробаў растлумачыць, чаму ён смяецца. Яны аднак зразумелі, у чым яго праблема, і пачалі яго падахвочваць. Здавалася, што ў любы момант падлога пад Аліем рассунецца і ён праваліцца скрозь зямлю і толькі гэтым добры Алах уратуе яго ад гэткага сораму

Сядзь тут, вось табе ракія, калі п'еш, а калі не п'еш, дык хай нам прабачыцца, што прапануем. Як і табе прабачыцца тое, за што просіш прабачэння, сказала Паўліна, прыкідаючыся сур'ёзнай.

Дзябёлая Разалія паказала Рафу ягоны пакой: салдацкі ложак з прыгожа расшытай бялізнай, канторскай шафай і распяццем на сцяне. Тры посцілкі, разасланыя ад сцяны да сцяны, хаваюць паточаныя чарвякамі дошкі. Гэта не тое месца, дзе хацелася б пражыць рэшту жыцця, але зноў жа ў ім была тая цеплыня, якую адчуваеш, калі нешта прызначана і спарадкавана для цябе. Хлопчык паставіў торбу каля ложка, пакуль манашка чакала, што ён скажа. Яна хацела пачуць ад хлопчыка, як яму тут добра, каб яму ўсміхнуцца. Рафа не сказаў нічога, але Разалія ўсё ж усміхнулася. Усмешка не можа нашкодзіць, усмешка яшчэ нікому ні прынесла зла, верыла Разалія і ніколі не здавалася. Яна ўсміхалася заўсёды, быццам святы Ілля ёй гэта загадаў. У гэтым быў сэнс яе місіі і спосаб, якім яна збіралася вылечыць свет няверных.

Пасля абеду, які госці з'елі разам з кляшторнымі мулярамі, Алія сказаў, што ён ідзе паглядзець горад, купіць леблебіі, цукаты і хустку. Перад Паўлінай і Разаліяй, якія падавалі абед галодным мужыкам, ён

усё ж не згадаў пра дзевак-шэльмаў. Па-супольніцку падміргнуўшы Рафу, больш каб падбадзёрыць самога сябе, ён подскакам пабег на вуліцу. *Не вяртайся позна,* крыкнула яму наўздагон Паўліна, *гэта Божы дом!* Разалія абняла хлопчыка і зноў усміхнулася. Яна ведала, што так трэба рабіць, калі нехта ўпершыню застаецца адзін. Абдымеш, і яму будзе лягчэй. А калі бачыш, што яму не палягчэла, цмокні яго ў шчаку. А ён успудзіцца, што яго пацалавала манашка! І вядома ж, яму зробіцца лягчэй.

Рафу расчуліў пах шчолаку ад яе рукава, або гэта быў пах грубага сялянскага мыла, якое ў тыя гады па ўсіх баснійскіх рынках прадавалі жанчыны з Посавіны як першы касметычна-гігіенічны выраб масавага ўжытку ў гісторыі гэтага краю. Няважна, што там сапраўды пахла, але ў Рафы на вочы навярнуліся слёзы. Ён падумаў, што Алію ён ніколі больш не ўбачыць.

Рэшту дня ён праляжаў на ложку каля адчыненага акна. *Хай дзіця адпачне, дзень і ноч быў у дарозе,* сказала Разалія. *Эх, а я калінебудзь адпачну?* кінула Паўліна, каб трошку падгарчыць прыемнасць старой сяброўцы. Рафа засынаў і прачынаўся праз кожныя дзесяць хвілін, слухаў гукі звонку, пасля зноў патанаў у сон. *Кашы, кашы, купіце корабы, кашы, пляцёнкі,* зацягваў гугнявы мужчынскі голас, грукатаў па бруку воз, брахалі сабакі, іржалі коні. Тады з мячэці пачуўся голас муэдзіна. Гучаў ён так моцна, быццам стаяў пад акном. Праз некалькі імгненняў пачуўся другі, а пасля ўдалечыні і трэці муэдзін. Пасля яшчэ ў розны час званілі касцельныя званы, бразгалі медныя катлы, якія ў няўважлівага гандляра падалі з воза, клікала на дапамогу дзіця, параненае ў ваеннай гульні вернікаў і няверных, з нейкага саду чуўся жаночы голас: *Мустафа, Мустафаааа, Муяааа, каб цябе гром спаліў, пачакай у мяне…*

Пасля гэтага ён больш не прачынаўся, пакуль яго не абудзіла святло газоўкі і Разалііна рука на плячы. Манашка была спалоханая і не ўсміхалася.

Алія абышоў усё па парадку, задаволены, што цэны тут не такія, як ён чакаў. Ён думаў, што Сараева горад дарагі, а тут усё таннейшае, чым у Трэбіні, Чапліне і Мостары, танней нават, чым у Дуброўніку, які заўсёды быў увасабленнем таннасці. Ён не толькі

накупляў леблебіяў і цукатаў больш, чым спадзяваўся, а ўзяў яшчэ і драўляны цягнік з лакаматывам. Ён быў ну проста кропля ў кроплю як кампазіцыя Мостар-Сараева! Калі яго яшчэ пафарбаваць чорнай фарбай, дык не будзе зусім ніякай розніцы! Усё мае той цягнік: і дзве трубы, і топку з вугалем, і вагон-рэстаран… Калі лепш прыгледзецца, можна было б пабачыць і тых двух афіцыянтаў, малінаўку і ракію…

Падарунак так яго натхніў, што ён пачаў марыць, як усе тры ягоныя сыны пойдуць у чыгуначнікі. Як толькі ўбачаць гэты драўляны цягнік, больш нічога ім і ў галаву не прыйдзе.

А хустак было самых розных, па розных цэнах. Найдзешавейшымі былі найпрасцейшыя: чорныя – якімі хрысціянкі пакрываюць галаву, калі ў іх нехта памрэ, і белыя – ханумы пакрываюцца імі, калі на Рамазан ідуць у мячэць. Крыху даражэйшыя хусткі каляровыя: жоўтыя, як месяц або кукурузная каша, чырвоныя, як парэзаць палец, сінія, як неба, і іншыя сінія, як мора сярод лета, і яшчэ зялёныя, як трава і сцяг, бэзавыя, як не ведаю што… Алія спярша думаў купіць бэзавую хустку, бо не мог прыгадаць нічога, што б магло быць такім бэзавым, але пасля ўспомніў пра Нафу; яна напэўна не павяжа на галаву той колер, які бярэцца невядома адкуль. Калі не ведае ён, дык і яна не будзе ведаць. Эх, а тады пачалося сапраўднае свята хустак, і Алія зразумеў нешта, пра што мусіў ведаць, але не падумаў, пакуль не пабачыў. К чорту хустку, калі яна не стракатая! А як толькі хустка стракатая, рознакаляровая, то яна ўжо не хустка, а як па-нашаму – махрама*. Рознакаляровыя махрамы былі з любымі малюнкамі – ад кветак, ружаў, гіяцынтаў і гваздзікоў да ўзораў і арнаментаў. Чым дзівоснейшыя былі арнаменты і чым цяжэй было разабраць, на што яны падобныя, тым махрамы былі даражэйшыя.

Найдаражэйшыя махрамы ў бэзістане мелі ўзоры, якіх няма і на кілімах у мячэці, а былі яшчэ і расшытыя залатымі ніткамі. Неяк абы-як, пасярод махрамы і ўпоперак узораў, нібы выпадкова, праходзіла нітка з чыстага золата. Такія махрамы каштавалі Аліін гадавы заробак. Ён глядзеў на іх і думаў: Божа мілы, які ж дурань купіць такое сваёй жонцы? Вельмі багаты дурань. Але дурань не таму, што багаты, а дурань таму, што не мае вачэй, каб пабачыць,

якія гэтыя махрамы непрыгожыя. І брыдзіць іх тое, што ёсць найдаражэйшага, золата! А золата ж Бог стварыў на тое, каб кожную рэч зрабіць прыгажэйшай.

Алія быў уражаны, бо ўпершыню бачыў, што золата можа нешта зрабіць непрыгожым. І лепш бы яму было пра гэта не дазнацца. Дай Божа ніколі не даведацца, што прыгожае можа быць брыдкім, падумаў ён і купіў сваёй Нафе найпрыгажэйшую махраму ў безістане. З узорамі, якія можа і сціплейшыя, чым на кіліме ў мячэці, але якраз па мерцы яе галавы, прыгажосці і розуму. Калі б тыя ўзоры былі прыгажэйшыя, яны б не пасавалі ёй добра, бо пад імі Нафа была б менш прыгожая. І ён бы побач з ёй адчуваў сорам. А на гэтай махраме ўзоры нібы задуманыя для яе і для яго. І калі яны на дзень народзінаў імператара пройдуць па Трэбіні або калі ён павязе яе ў Дуброўнік паказаць Страдун і тое, як дубраўчане ўмела паклалі брук, усе будуць казаць: Глядзі якая ханума, сапраўдная пані, а муж у яе глядзі які, проста як венскія школы паканчаў! І ўсё гэта дзеля добра выбранай махрамы. Або хусткі, як цяпер кажуць. Алія ганарыўся і сабою, і сваім выбарам, і сваёй Нафай, якая цяпер чакае, калі ён вернецца з далёкай дарогі, з слаўнага гораду Сараева, вялікага места, завялікага і для візіраў, таму яны ніколі ў ім не мелі рэзідэнцыі*. Можа, баяліся, што ад такой прыгажосці страцяць зрок і дар мовы.

Калі на заходзе сонца азваліся муэдзіны, Алія скончыў закупы, і грошай у яго засталося якраз на тое, каб па-панску вярнуцца ў Трэбіне. Гер Гайдрых усё ж не быў скнара. Даў свайму вернаму службоўцу дастаткова і каб пачаставацца, і каб з гонарам вярнуцца дадому. Алію зрабілася крыху сорамна за тыя думкі пра бурэк. Слава Богу, што ён баязлівец, бо як бы ён геру Гайдрыху паказаўся на вочы! Гэта нават калі не ўлічваць грэх, які б ён учыніў, пакінуўшы хлопчыка галодным. Эх, добрая рэч страх, каму Бог яго даў, думаў Алія. Толькі яго крыху непакоіла, ці залічае Алах дрэнныя думкі ў канчатковы чалавекаў рахунак і наколькі цяжкія на Аліевых вагах няўчыненыя дрэнныя справы? Ніхто гэтага не ведае, не ведае і хафіз Сулейман-ага Фэрызаглу з Аліпашынай мячэці, пра якога ён зусім забыўся, доўга выбіраючы хусткі. Зачараваў яго шоўк так,

што ён не падумаў у пару пра Бога і не паспеў у мячэць. І гэта грэх. Але ці вялікі? Ён заклапоціўся, пасмутнеў, і ўмомант ператварылася ў цяжкае волава ўся радасць сённяшняга дня. Леблебіі, цукаты і махрама… Дзе ж была ягоная галава, каб ён не бачыў, што Бог увесь час яго выпрабоўвае! Але ці гэта сапраўды так? Ён жа купляў падарункі не сабе, а каб зрабіць радасць жонцы і дзецям.

А зрабіць радасць ім гэта тое самае, што зрабіць радасць Яму, суцяшаў сябе Алія, прыладжваючы і дадумваючы тыя некалькі куранскіх сур, якія, як яму здавалася, ён памятаў і разумеў.

І ўсё ж ён сходзіць у Скендэрыю, каб паглядзець на аўстрыйскіх курваў, казачных дзевак-шэльмаў, перад якімі падаў на калені кожны, хто іх бачыў. Гэта, хлусіў сабе Алія, будзе ягонае выпрабаванне. Ён пойдзе, паглядзіць на іх і панюхае, але нават да іх не дакранецца. Ён пакажа Алаху, якая вялікая ў яго вера. Ён застанецца мізэрны, малы як ён ёсць, але цвёрды, як камень, які ляжыць у падмурку свету. Цвёрды, як камень, за які трымаецца сасна над Нярэтвай. Пакуль ён, як лунатык, ішоў у бок Скендэрыі – нейкі валацуга рассмяяўся яму ў твар на пытанне, дзе гэта, і сказаў: *ідзі роўна ўздоўж Міляцкі, і як пачуеш носам жаночы пах, там табе будзе і Скендэрыя* – ён мармытаў малітвы, якія толькі мог успомніць, і раз-пораз паглядаў на неба, чакаючы, мабыць, што Бог дасць яму знак, калі лічыць нядобрым тое, што ён цяпер робіць. За пазухай у яго ўжо раставалі цукаты, кішэні ледзь не лопаліся ад леблебіяў, махраму ён сціскаў так моцна, што дранцвелі пальцы, але нічога не адчуваў Алія, калі сэрца цягнула яго да дзевак-шэльмаў, а душа ў яго халадзела ад страху.

Была ўжо амаль поўнач, калі сястра Разалія пабудзіла Рафу. Алія не прыйшоў начаваць, і яны з Паўлінай пачалі хвалявацца, бо і ён быў пакінуты ім пад нагляд і было сказана, што гэта добры, але трошкі дзівакаваты чалавек, які ніколі не быў у вялікім горадзе, дык за ім трэба панаглядаць, каб не згубіўся. Разалія думала, што гэта было сказана жартам, хіба хлопчыка даверылі б нейкаму дзіваку, але калі Алія не вярнуўся, яе і Паўліну ахапіла паніка. Яны ж бачылі які ён, дык што ж ім не хапіла розуму не пусціць яго ў горад? Яны спыталіся ў Рафы, ці Алія выпадкам не казаў, што будзе рабіць у Сараеве, з кім сустрэнецца і куды пойдзе.

Хлопчык паўтарыў гісторыю пра падарункі, згадаў і пра мудрага хафіза, чыю малітву Алія хацеў пачуць, але прамаўчаў пра дзевак-шэльмаў. Пра такія рэчы напэўна не гавораць у прысутнасці манашак, але яму было важней захаваць Алііну таямніцу і абараніць прыяцеля. Можа яны б і не паведамілі ў Трэбіне, што Алія хадзіў да курваў, але напэўна ім бы гэта не спадабалася. Толькі таму, што яны не ведалі, чаму ён хацеў бачыць дзевак-шэльмаў.

У тую ноч у Караджавым палацы не спалі. Сёстраў апанаваў смяротны страх, а Рафа пераважна маўчаў і глядзеў перад сабою. У Разаліі і Паўліны стаялі ўваччу страшныя гісторыі з турэцкіх часоў, яны прыгадвалі розных гвалтаўнікоў, агаў* і газіяў*, якія паднімалі ятаганы на кожнага, хто скоса на іх паглядзеў, а хлопчыка мучыла навязлівая думка, што Алія мёртвы і што ён яго забіў. Забіў яго тым, што яны пазнаёміліся і што ён яго палюбіў – упершыню нейкага незнаёмага чалавека. Насамрэч, можа ён толькі яго аднаго і любіў. А браты, сёстры, пляменнікі, цёткі, дзядзькі, радня і сваякі – усе яны былі яму суджаныя лёсам, таму ён ставіўся да іх так, як дыхаў. Без сваёй волі, паводле невыпраўнай звычкі, без ніякай душы. Ён выкрасліў бы іх з жыцця, калі б мог, так, як перастаў бы дыхаць, калі нешта такое можна зрабіць па сваёй волі. Толькі Алію выбраў ён сам, і таму Алія мёртвы. У той момант ён па ім не смуткаваў. Занадта вялікая была ягоная віна, каб ён мог смуткаваць. Настолькі вялікая, што пад ёй абрынуўся б гэты дом, калі б яго збудаваў не Іван Караджа.

Цяжка сказаць, ці ёсць у чалавечым жыцці адзін дзень, які быў бы найважнейшым, але лёс Рафы Сікірыча, усё, кім ён стане і на што ягоная Ката будзе марнаваць уласнае жыццё, вырашылася перад поўднем 31 жніўня 1891 года, на другі дзень іх побыту ў Сараеве. Паўліна ўся заплаканая вярнулася з паліцыі ў суправаджэнні двух паліцыянтаў у цывільным, і Разалія спехам адвяла Рафу ў ягоны пакой. У гэтым не было патрэбы, бо ён адзіны ведаў, быў перакананы, што Аліі Чуляка больш няма сярод жывых. Яго знайшлі крыху ніжэй Врбані і Скендэрыі, на беразе Міляцкі, збітага і з перарэзаным горлам. Паліцыянты не здолелі расціснуць руку, у якой ён сціскаў Нафіну хустку. Паўсюль вакол мёртвага цела былі рас-

сыпаныя леблебіі. Дзеля таго, што кашалька пры ім не было, матыў забойства вызначылі лёгка.

Аднак яны не ведалі і ніколі не даведаюцца, дзе быў забіты Алія Чуляк. Бо не на беразе Міляцкі – сюды яго закінулі ўжо мёртвага. Ці бачыў ён дзевак-шэльмаў, ці яму нейкая спадабалася і ён заплаціў за гэта жыццём або стрымаў сваё абяцанне добраму Алаху – і гэта застанецца таямніцай паміж Аліем і Ўсявышнім. Людзі будуць ведаць толькі тое, што хустку ў яго ніхто так і не змог забраць. Спрабавалі расціснуць яму пальцы і калі рыхтавалі да пахавання. Але не выйшла.

І так у невялічкай труне, быццам хавалі дзіця, разам з целам, якое аддаецца зямлі голае, ляжаў і кавалак шоўку.

Калі Нафа не засумнявалася ў сваім мужы, а смутак і жалоба не дазвалялі ёй гэта зрабіць, тады яна ведала, што гэтая хустка прызначалася ёй. Што толькі ўзмацняла яе боль і адчуванне, што добры Алах недасяжны жаночаму розуму, калі, кіруючы гэтым светам, забірае да сябе тых, каго мы найбольш любім.

Рафа застаўся жыць з сваёй віною, але ад таго часу страціў свой дар нябачнасці. Або Сараева адрознівалася ад Трэбіня тым, што тут ніхто не мог застацца нябачны. Прыхільнае да тых, хто ўмее змагацца, добрае да людзей з хуткай думкай і вострым языком, рай для схільных да жарту і ўсякага роду забіякаў, Сараева было пеклам для маўчуноў і слабых душаў, для ўсіх, хто першы саступае дарогу. У гімназіі ён апынуўся сярод трыццаці разбойнікаў: дзяцей з прыстойных сараеўскіх дамоў, мясцовай мусульманскай знаці і малых прыбышоў з чэшскімі, аўстрыйскімі, славацкімі, славенскімі, ашкеназскімі, італьянскімі і венгерскімі імёнамі, чые бацькі пасля акупацыі 1878 года прыехалі на імператарскую службу.

І калі бацькі захавалі манеры і звычаі старога краю і з цяжкасцю прызвычайваліся да дзіўнаватага гумару і цяжкага клімату, іх дзеці ўжо нічым не адрозніваліся ад сваіх аднагодкаў ісламскай веры. Гэтыя былі нават трошачкі больш стрыманыя і спакойныя – хоць і гэта не было правілам – бо, магчыма, адчувалі далёкія сляды бэгаўскага паходжання, тым часам як усе гэтыя малыя алоісы, фердынанды, ёзэфы і францішкі цалкам перанялі самыя жорсткія формы мяс-

цовай ментальнасці, прычым у яе самай небяспечнай і маляўнічай прадмесцкай люмпен-пралетарскай форме. Іх дух, а пасля і дух гораду вызначала не гандлёва-мяшчанская чаршыя*, якая ў турэцкія часы мела свой гумар, які ведаў меру, не быў напоўнены цынізмам і рэдка пагражаў прыватнасці неабароненых. Прыбышоўскіх дзяцей, якіх у гімназіі было болей, чым мясцовых, вызначала і адзначала карнавальная разбэшчанасць турэцкай і хрысціянскай чэрні, якая стагоддзямі трымала пазіцыі на гарадскіх ускраінах, пікнікавала, вечаравала і галадавала, а з прыходам Аўстрыі ўварвалася ў Сараева і ў пэўным сэнсе яго акупавала. Гэтае ўварванне, зрэшты, не паўплывала негатыўна на сам горад, стомлены той арыентальнай грамадскай сіметрыяй, якая надакучыла і Стамбулу, але людзям з мякчэйшымі душамі і слабейшымі жыццёвымі сіламі яно часам каштавала жыцця або прынамсі розуму. Тыя, хто не ўмеў або не меў нагоды прыстасавацца, былі асуджаныя на тое, што ніколі са спакойным сэрцам не выйдуць з парога свайго дома на вуліцу. Што зноў жа парадокс, бо новае Сараева было зладжана так, што большыня людзей спакой у сэрцы знаходзіла менавіта на вуліцы.

На сёмы дзень школы Рафу пачалі біць. Ён спрабаваў бараніцца, але не ведаў як. Ён быў фізічна мацнейшы за Алоіса Шэхтэля, найзласнейшага свавольніка ў класе, сына дырэктара пошты, і мог мерацца сілай з Джамалам Сірчам, сынам багатага гарадскога ювеліра, лайдаком, які б, верагодна, скончыў свае дні сярод мэйташскіх і бялаўскіх кішэннікаў, калі б бацька не сачыў за кожным яго крокам і за найменшую правіну не сек яго конскім бізуном.

Аднак і Алоіс, і Джэмал нападалі не паводле правілаў хлапечага свету – з намерам паказаць сваю ўладу над слабейшым і авалодаць зграяй. Першае яны былі не ў стане зрабіць, а другое не прыходзіла ім у галаву. Кіраванне зграяй не было нешта, чым бы нехта ў гімназіі, дый на сараеўскіх вуліцах, наважыўся займацца. З прыходам Аўстрыі і з'яўленнем у горадзе люду з прадмесцяў у горадзе пашырылася мода на анархію. Не дай Божа, каб некаму прыйшло ў галаву строіць з сябе агу або візіра. Пройдуць гады і дзесяцігоддзі, перш чым у Сараеве з'явяцца новыя фармальныя і нефармальныя правадыры, якія будуць дыктаваць, што можна і чаго нельга. У часе, калі

Рафа Сікірыч апынуўся паміж Алоісам і Джэмалам, двума сваімі смяротнымі ворагамі, ніякага правадыра навокал не было. Але каб ацалець на гэтым свеце, ты мусіў выявіць правадырскую сілу.

І так, значыць, нападаў адзін з іх – ніколі абодва разам – і, скажам, падступна ззаду калоў Рафу цыркулем у азадак. Рафа вішчаў: *Канчай!* Нападнік паціскаў плячыма: *Гэта не я!* Як толькі Рафа адварочваўся і паглыбляўся ў нешта сваё, той зноў утыркаў цыркуль, гэтым разам ужо з усяе сілы. Рафа ледзь стрымліваў слёзы ад болю: *Канчай, гад!* Нападнік яшчэ больш бязвінна паціскаў плячыма: *Ды ня я гэта, маткай клянуся!* І трэці раз цыркуль утыркаўся яму ў азадак па самы тронак. Рафа абарочваўся і хапаў яго за шыю, пачыналася штурханіна і сумятня, а таксама тое, што ў двубоі найважнейшае: абмен лаянкамі і абразамі. Супернік стратэгічна адступаў, пазбягаў сур'ёзнай бойкі, але наносіў вельмі дакладныя вербальныя ўдары.

Мэтай было прыцягнуць увагу як найбольшай часткі класу, выклікаць смех, давесці Рафу да слёз, прымусіць яго пачаць заікацца і як папугай паўтараць тую самую лаянку, бо ён ужо не мог прыдумаць нешта ў адказ. А не мог не таму, што быў дурны, а можа й не таму, што быў менш спрытны ў словах, а таму што ён быў атакаваны, а атакаваны ў такім двубоі заўсёды ў невыгодным становішчы. Галоўны прынцып і правіла гульні палягае ў тым, што нападнік заўсёды выйграе, апрача тых выпадкаў, калі той, на каго напалі, наважыцца на крывавую бойку. Але нават і тады відавочнай бывае толькі палова перамогі, бо больш цэніцца ўменне зрабіць з некага дурня, чым збіць яго. Апрача таго, за бойку ў гімназіі каралі, а за абразы не.

Пасля таго, як Алоіс і Джэмал насычаліся здзекамі з Рафы, наставала чарга наступнага эшалону правакатараў, якія хацелі заваяваць сваю частку павагі ў класе, выпрабаваць сваю смеласць і павастрыць язык. Праз два месяцы засталося ўсяго чатыры або пяць хлопчыкаў, якія ніколі не нападалі на Рафу. Прытым ён быў адзіным аб'ектам спагнання злосці. Астатнія былі больш хітрыя і знаходлівыя, мелі старэйшых братоў або небяспечных бацькаў. Хлопчык, які пераважна маўчыць і хаваецца, адзіны не з Сараева, а дзве смешныя

манашкі папераменна прыходзяць ад яго на бацькоўскія сходы – ён быў асуджаны на штодзённыя катаванні. І ў іншых класах былі гаротнікі з падобным лёсам, але яны ніколі не былі адзіныя ў класе і ніколі такія слабыя ў душы.

Разаліі і Паўліне ён не расказваў, што з ім адбываецца. Яны заўважалі, калі Рафа прыходзіў з школы ўвесь брудны, бо дзясятак вісусаў вырашыла правесці з ім практычныя заняткі з прыродазнаўства на тэму турапольскай свінні* і выкачалі яго ў гразі пасярод школьнага двара. Яны бачылі, што вочы ў яго чырвоныя ад слёз, часам заўважалі на руках сінякі, але не ведалі што рабіць, як не ведалі і логіку свету, у які быў выштурхнуты Рафа. Апрача таго, што паводле прыроды свайго стану яны не маглі мець уяўлення пра школьныя джунглі, Разалія і Паўліна ўсё яшчэ жылі ў свеце асманскай Босніі, у якой людзі, якія нешта мелі адны супраць адных, проста адны адных пазбягалі, а страх і дрыжыкі на ўсіх наводзілі толькі тыя, хто стаяў вышэй у фармальнай іерархіі. Ты баяўся агі і агавых людзей, баяўся візіра, калі б выпадкова сустрэў яго або апынуўся ў яго на дарозе, але фактычна гэта было ўсё. І зноў жа просты люд, асабліва хрысціянскі, лічыў, што і гэтага было замнога. У свабоднага чалавека больш страху, чым у раба, бо раб баіцца толькі гаспадара і нікога болей.

Разалія і Паўліна, як і тыя нямногія сёстры законніцы, колькі іх было за турэцкай уладай, лічылі, што жывуць у становішчы дзяржаўных рабоў. Яны служылі свайму Касцёлу, галодным і няшчасным, але не ў гэтым было іх рабства. Рабамі яны былі туркам і турэцкім уладам, тыранам, якія не шануюць ні Хрыста, ні яго пастыраў, і вызнаюць няправільную веру. Гэты факт іх моцна непакоіў, яны маліліся за тое, каб асманскаму часу і парадку прыйшоў канец, а залежна ад таго, якое ў каторай было сэрца, яны ненавідзелі туркаў і ўсё турэцкае, або проста іх баяліся.

Разалія і Паўліна таму і пасябравалі, што былі абедзве зусім не прывычныя да нянавісці, а часы вялікіх пераваротаў бываюць проста як створаныя для нянавісці, і таму іх больш мусяць баяцца тыя, хто не можа абудзіць яе ў сэрцы, чым тыя, хто найбольш да яе схільны. Недахоп гэтага д'яблавага і недарэчнага для розуму дару

ў часы пераваротаў будзе часта расцэньвацца як недахоп патрыятызму, адвагі або нават і веры ў Бога. Рафавы апякункі своечасова гэта зразумелі і пастараліся трымацца чым далей ад усяго, што магло б выклікаць у іх нянавісць, а таксама ад таго, што б выявіла перад светам іх няўменне ненавідзець. Шчаслівыя і задаволеныя, што над Босніяй цяпер валадарыць хрысціянскі імператар, а не стамбульскі султан, яны пастараліся больш нічога не ведаць, не бачыць і не чуць.

Ці цябе нехта крыўдзіць? пыталася ў яго Разалія і, не чакаючы адказу, працягвала: *калі цябе крыўдзяць – ты проста ўцячы і схавайся, так разумней і мілей Богу. З дурнямі лепш не мець справу нават калі ты мацнейшы за іх. А тым болей калі ты слабейшы! Калі цябе зачэпіць мусульманін, прабач яму, бо ён злуецца, што цяпер у Босніі наш імператар. Ён б'е не па табе, ён б'е па Яго Вялікасці Францу Іосіфу, ты мусіш гэта ведаць і адысці ў бок . Ён, небарака, не вінаваты, што ў яго тата і мама не той веры. Раней ці пазней ён зразумее, што наш імператар добры, а калі зразумее, то больш не будзе цябе біць, а будзе табе прыяцелем. Так заўсёды было. А калі цябе, зноў жа, зачэпіць хрышчоны чалавек, ты яму таксама прабач. Здзічэлі людзі, і мала хто цяпер ведае, што добра, а што не. Кроў у іх перад вачыма, як бы 1878-га было мала*. Яны ўсё хочуць расплаціцца за здзек, што туркі з іх рабілі чатырыста гадоў, і б'юць каго могуць. Ні Бога не шануюць, ні людзей. Ганьба ім да веку,* пачынала злавацца Разалія, а Рафа не паспяваў яшчэ сказаць ні слова. Толькі глядзеў на твар і на рукі гэтай смешнай і мілай жанчыны, з вачэй, сініх і дробных, як у старой саламандры, пераводзіў позірк на нос, тоўсты, як спелы агурок, пасля на пальцы, якія трывожна скакалі вакол кожнага прадмета, і здавалася, што яны жывуць асобна ад яе.

Гэтая карціна яго супакойвала, а тое, што казала яму Разалія, яго не датычыла. Не датычыла таму, што нехта з іх дваіх жыў у нейкім іншым свеце. Рафавы пакуты, унутраныя, якія ён прывёз з Трэбіня, і вонкавыя, якія падаравала яму Сараева, не мелі ніякага дачынення да імператараў і султанаў, і ніводнай хвіліны не было важна, якога веравызнання ягоныя мучыцелі.

Толькі для настаўнікаў Рафа заставаўся нябачны. Да калядных святаў і зімовых канікулаў ніводзін з іх не запомніў яго імя

і прозвішча, не пазнавалі яны яго і ў твар. Адзнакі ў яго былі шэрая сярэдзіна: не тое каб зусім правальныя і не тое каб ён нечым у ведах вылучаўся. Неахайны, а часта запэцканы крывёю ці граззю, Рафа заставаўся па-за настаўніцкім полем зроку, што само па сабе незвычайна, калі ўжо не дзеля нечага іншага, дык хоць бы таму, што ў Першай гімназіі было строгае прадпісанне ўважліва сачыць за гігіенай вучняў. Венскія кадры былі вельмі ўражаныя тым, у якую брудную краіну яны трапілі: вошы, блохі, клапы, венерычныя хваробы і эндэмічны сіфіліс як нешта найстрашнейшае, што можна было сабе ўявіць… Хоць, трэба прызнаць, увесь гэты неверагодны бруд яны мелі ласку заўважыць і таму, што гэтага чакалі. І таму больш, чым нізкі гігіенічны стандарт мясцовага насельніцтва, іх здзіўляў той факт, што яны выявілі ў горадзе некалькі соцень публічных вулічных крыніцаў, а таксама правіла, што мусульмане ўмываюцца перад кожнай малітвай. Як бы там ні было: Першая гімназія мелася паслужыць паказальным прыкладам развіцця публічнай гігіены. Брудныя пазногці і вашывыя галовы разглядаліся як найвышэйшы стратэгічны інтарэс імперыі. Кроў і гразь на твары Рафы Сікірыча кідалі змрочны цень на вынікі настаўніцкіх намаганняў.

Сядаючы ў кампазіцыю на Мостар, Рафа Сікірыч вырашыў, што жывы ў Сараева не вернецца. Насамрэч ён ведаў гэта і раней, але цяпер мусіў паўтараць навучанае, каб не забыцца або каб яму не здалося, што рэальнасць гэта тое, што ён бачыць на пероне, а ўсё, што адбывалася апошнімі месяцамі, гэта толькі нейкі міраж. Разалія і Паўліна штурхаліся ў натоўпе, не зважаючы ні на годнасць сваёй місіі, ні на тое, штó б людзі маглі падумаць, калі б убачылі, як дзве манашкі плачуць горкімі слязьмі, перадаючы хлопчыку праз акно кошыкі з хлебам, печанай курыцай, яблыкамі, бутэлькамі з малаком і вадою – каб малы ні ў чым не меў нястачы і каб, не дай Божа, да Трэбіня не памер з голаду. А людзі маглі падумаць усё што заўгодна, калі Паўліна пачала крычаць на ўвесь голас, каб Рафа ні ў якім разе не хадзіў у публічныя прыбіральні. Там збіраюцца ўсялякія людзі і поўна ўсялякіх хваробаў. Яна крычала, бо пра гэтае папярэджанне, як і пра дзясятак іншых, яны забыліся яму сказаць, і цяпер яна дарэмна і марна спрабавала перакрычаць лакаматыў.

Рафа махаў ім, пакуль яны маглі яго бачыць, але ведаў, што ягоная рука не махае так, як махалі іх чатыры. Яму гэта забалела і будзе балець заўсёды, кожны раз, як ён будзе прыгадваць, як дзве адданыя Богу жанчыны праводзілі яго ў дарогу, як яны яго любілі і з якой бояззю пускалі яго ў белы свет у палымянай веры, што ён да іх вернецца.

Калі матак і можна па нечым пазнаць і калі мацярынства не ёсць нешта, чым біялогія спрабуе падмануць і падманвае чалавечы розум, тады яны пазнаюцца па гэтай боязі. Рафа адчуў яе ў Разаліі і Паўліны, а пасля таго – больш ніколі. Тое, што ён не быў у стане адказаць ім на іх любоў, застанецца адным з рэдкіх грахоў, якія ён будзе ясна адчуваць усё сваё жыццё.

Другім грэхам было, што ён не верыў ва ўсё тое, у што верылі яны. Гэта, магчыма, магло яго ўратаваць. Ён і сам усвядоміць гэты факт пятнаццаццю гадамі пазней, калі пачне перабіраць свае цвікі і зразумее, што зараз яму было б лягчэй трымацца за сваю жыццёвую нітку, калі б ён навучыўся прастадушнасці Разаліі і Паўліны. Але, як не мог ён утапіцца і сагрэцца ў сямейнай шматлюднасці, гэтак не адчуваў сэнсу ў суцяшэнні службы Божай і шчаснай суцяшальнай моцы прыналежнасці да царкоўнага статку.

Аднойчы перад сном Паўліна расказала яму пра дзень, ён запомніў – 15 студзеня 1882 года!, калі Сараева атрымала свайго арцыбіскупа. У прысутнасці высокіх гасцей у драўляным касцёльчыку Святога Антонія Ёсіп Штадлер зрабіўся першым паміж пастырамі. Яна жыва апісвала залатыя кутасікі і гузікі на ўніформе каменданта гораду генерала Германа Далена, які прыйшоў павіншаваць арцыбіскупа, расказвала Рафу, чым яны далей частаваліся, які быў суп, і з якіх частак цяляці была згатаваная смажаніна, пасля згадала і тое, што падавалі белы хлеб, але генерал запатрабаваў чорны. *Дален ім ні за што ні пра што абасраў усю прыемнасць,* менавіта так Паўліна і сказала і вымавіла менавіта гэтае слова – абасраў! Яна не лаялася, не гаварыла грубых словаў, але нічога не хлусіла і не перакрыўляла. Гэтаму слову там насамрэч было месца, у той гісторыі пра вялікі дзень ейнага жыцця ў веры, дзень, калі Сараева стала Хрыстовым горадам. Рафа быў сапраўды расчулены і амаль

бачыў у гэтай жанчыне Алію. Аж да самага канца гісторыі, калі яна прызналася, што ў той дзень не была ні ў тым касцёле – бо для яе і Разаліі там месца не было, ні на тым абедзе. Нічога з усяго таго, пра што яна расказвала, яна не бачыла на свае вочы, а толькі паверыла ў тое, што расказвалі іншыя. Але і тыя самі там не былі, а ім расказалі тыя, хто быў. Паўліна была суцешана, бо ўмела бачыць сапраўдным тое, што з ёй не адбывалася. Рафу Бог такой моцы не даў, таму для Рафы ён і не існаваў.

У Трэбіні яго сустракалі як малога імператара. Быццам ён ужо атрымаў доктарскую ступень, а не правёў адно паўгоддзе ў гімназіі. Зноў цэлая сям'я сабралася на дуброўніцкім вакзале, а па дарозе дадому яны засыпалі яго пытаннямі датычна найбольш хаваных сусветных і метафізічных таямніц. Пра ўсё, што іх калі-небудзь мучыла і на што яны не мелі адказу, бо не канчалі імператарскіх школаў, Сікірычы пыталіся ў Рафы: *Чаго болей – касцёлаў у Вене ці мячэцяў у Стамбуле?.. Каго больш – кітайцаў ці мурашоў?.. Колькі разоў на дзень абедае аўстрыйскі цар?.. Ці жывуць людзі на зорках і як там – горача ці холадна?.. Колькі гектараў зямлі маюць багатыя сараеўцы?.. Ці ёсць яшчэ туркі ў Сараеве і што там кажуць – колькі нашы іх будуць яшчэ цярпець?.. Ці вернецца Ісус на зямлю, калі ўвесь свет аднойчы ў яго паверыць?.. Ці існуе нейкае стварэнне хутчэйшае за чыгунку або чыгунка хутчэйшая за ластаўку?.. Ці людзі ў Сараеве ядуць баклаву?.. Ці ёсць такія, што не вераць у Бога?.. Ці ёсць замежныя мовы, апрача турэцкай, якіх ты не навучыўся?.. Як палацінску сказаць туфахія?.. Наколькі, прыблізна, чалавек робіцца разумнейшым, калі скончыць усе школы?..*

Ён мусіў ім адказваць на ўсё, а калі не ведаў адказу або пытанне было без ніякага сэнсу, Рафа выдумляў і хлусіў. Яны верылі кожнаму ягонаму слову – чаму б адукаваны чалавек хлусіў? – і былі задаволеныя, бо ён вырашаў іх жыццёвыя сумневы, над якімі яны гадамі ламалі галаву, а цяпер ён ім за адну секунду ўсё тлумачыў.

Сем дзён цягнуліся частаванні і ваджэнні Рафы з адных пасядзелак на другія. На ўсяночнай яго пасадзілі ў касцёле ў першым радзе, побач з гарадскім кіраўніцтвам і вайсковымі прадстаўнікамі. Перад калядным абедам павятовы кур'ер даставіў яму віншаванне

і падарункі ад імператара, на другі дзень яго пажадаў бачыць карэспандэнт венскай газеты, які хацеў нагадаць забыўчывай публіцы пра першае герцаг-босанскае кумаўства аўстра-венгерскага суверэна. Рафа цярпеў гэта ўсё і чакаў моманту, калі паведаміць Івану, найстарэйшаму брату і правадыру сямейнага клану, што ў Сараева ён не вернецца. Калі надаралася нагода – яму не хапала адвагі, калі набіраўся адвагі – не было Івана, і ўрэшце Рафа зразумеў, што існуе лягчэйшы і прасцейшы спосаб уратавацца ад гімназіі і ўсяго, што яго цісне і мучыць.

Раннім ранкам напярэдадні новага 1892 года ён устаў з ложка раней за ўсіх, узяў вяроўку, якой прывязвалі бычкоў перад лягчаннем, залез на сліву ў двары і адзін край прывязаў за найніжэйшую галіну, а з другога зрабіў пятлю. З цяжкасцю неяк прасунуў туды галаву, бо вяроўка была тоўстая амаль як ягоная рука, паглядзеў на вокны, за якімі сном праведніка спала ягонае племя, пасля на неба над ганкам хаты і ўрэшце на брук, якім была абкладзеная сліва. У момант, калі ён кінуўся ўніз, Рафа ўжо не шкадаваў ні аб чым. Нейкую кароткую долю секунды, у якую ўвесь бачны свет паляцеў угару, яму было ўсё адно і ўсё роўна, а пасля ён адчуў, як страшная сіла рве яму галаву, як лопаюцца барабанныя перапонкі, перапыняецца дыханне, сэрца замест таго, каб замерці, пачынае шалёна біцца… Ён забыўся пра ўсё, што ведаў і дзеля чаго лез на дрэва, і гэта ўжо быў не той самы Рафа, не чалавек, а істота – можа, жывёла, можа, грэшная душа ў пекле – якая шукае цвёрдую зямлю пад нагамі.

Хто ведае, як доўга ён вісеў, і хто ведае, колькі бы яшчэ правісеў, калі б міма дома Сікірычаў не праходзіў брат Амброз Галоня, манах, які мучыўся бяссоннем і займаўся вывучэннем уплыву світання на раслінны свет. Брат Амброз пераскочыў нізкую каменную агароджу, схапіў Рафу за ногі і пачаў клікаць на дапамогу. Сястра Славіца выбегла з дома першая і босая ўзлезла на дрэва. Манах бачыў, як яе поўныя малака грудзі выпадаюць з кашулі – не прайшло яшчэ дзесяці дзён, як яна шосты раз нарадзіла, ён спрабаваў не глядзець на яе, але не было куды адвярнуцца, а заплюшчыць вочы не здагадаўся, такі страх браў яго ад Рафавага хрыпення. Ён хрыпеў так, як хрыпяць старыя перад смерцю, якіх сотні брат Амброз правёў на той

свет. Славіца спрабавала развязаць вузел, але не выходзіла, на тое была патрэбная мужчынская сіла. Яна налегла грудзьмі на тоўстую галіну старога дрэва, на іх белі засталіся чырвоныя сляды, брат Амброз глядзеў на іх, не памятаючы сябе ад страху, і на момант яму здалося, што ўсё гэта не сапраўднае, што ён звар'яцеў ад шматлікіх бяссонных начэй.

З Рафавых нагавіцаў выпаўз кал і павольна, як змяя па гарачым камені, спусціўся па манахавым плячы, пакідаючы на габіце брыдкі жаўтлявы след.

Хлопец меў шчасце або няшчасце ў тым, што вяроўка была занадта тоўстая і не зацягнулася яму вакол шыі. Замест таго, каб памерці, ён зажыў смяротныя пакуты, яму ўсё балела, і ён страціў голас. Ён ляжаў у ложку, каля якога з ім папераменна сядзела ўсё Сікірычава племя. Брат Амброз трымаў яго за руку і мармытаў Ойчанашы і Вітаймарыі. Ён рабіў гэта, каб у яго ні пра што не спыталіся, а не таму, што верыў, нібы хлопчыку магла дапамагчы малітва. Не прайшло было і пяці хвілінаў, як Рафу знялі са слівы, а Іван Сікірыч ужо соваў брату Амброзу ў руку пяць дукатаў, каб толькі ён нікому не сказаў, што здарылася. Іван хацеў яго падкупіць, яшчэ не ведаючы, ці застанецца Рафа жывы. Манаху затуманілася ў галаве, быццам нехта на імгненне расчыніў браму ў пекла, каб выветрыць адтуль увесь грэшны смурод, яму здалося, што ён ужо больш не ачомаецца, ён адштурхнуў Іванаву далонь, дукаты зазвінелі па бруку, манах увайшоў у дом за дзіцем, каб больш ніколі не паглядзець Івану ў вочы. Цяпер ён стаяў тут, прамаўляў малітвы, якія толькі мог прыгадаць, і пільнаваў момант, калі можна будзе ўцячы з дома. Бог вызначыў яму весці клопат аб зёлках, пладах і дрэвах, а не аб чалавечых няшчасцях. Аб іх хай клапоцяцца кляшторныя браты, якія лягчэй тыя няшчасці пераносяць.

Вядома ж, ужо назаўтра ўсё Трэбіне ведала, што імператарскі хроснік падняў на сябе руку. Пытайся ў Бога, як людзі пра гэта дачуліся і з чыіх вуснаў працёк гэты сорам, але брат Амброз Галоня дакладна нікому нічога не сказаў. А дзеля таго, што ніхто па-за домам не бачыў Рафавага вешання і што нікога чужога каля ягонага ложка не было, было ясна, што пусціў гэтую вестку ў свет

нехта з саміх Сікірычаў. Або нейкай дачцэ, нявестцы або ўнучцы нябожчыка Ёсіпа прыйшло ў галаву выставіцца пакутніцай перад суседкамі і яна прагаварылася пра тое, што здарылася, або нейкі брат упіўся ракіяй у карчме ў Аладзіна і патлумачыў местачковым п'яніцам, чаму ён п'е.

Іван цэлымі днямі хадзіў па Трэбіні, як турэцкі газія, і роў, каб усе чулі: *Дзе гэтая кляшторная свіння, каб я яму тупым нажом выразаў пячонку! Дукаты даў яму, каб маўчаў, ябі яго Муя Башага ў гнойную дупу!*

Апрача таго, што ён браў грэх на душу, абгаворваючы законніка, які ўратаваў ягонага брата, і ён сам ведаў, што гэта грэх, але яму было лягчэй абылгаць невінаватага, чым разбіваць сабе галаву, маючы змяю на грудзях, Іван яшчэ ўзяў сабе д'ябла на шыю тым, што памянуў нябожчыка Мую Башагу, аскера і авантурыста, які ўжо невядома ў якой бітве падхапіў пранцы і на вачах ва ўсяго мястэчка гадамі развальваўся як ад жывых ранаў, гэтак і ад таго, што хвароба далася яму і ў мазгі. Урэшце нос у яго ператварыўся ў каросту, і шапталіся, што ў яго і хуй адваліўся і замест мужчынскай штукі ў яго зеўрала шчыліна, быццам лопнуў пераспелы кавун або, даруй мне божа, ён у пакаранне ператварыўся ў жанчыну. Некаторыя кляліся, што бачылі, як ён у садзе за домам капаў яму, хаваў сваё мужчынства і чытаў малітву над магілай, але такім не верылі, бо гэта былі людзі, якія ненавідзелі аскераў, як і ўсё што ні ёсць мусульманскае, таму маглі павыдумляць што заўгодна супраць суседзяў іншай веры. Гісторыя пра адпалы хуй Муі Башагі мела свой пачатак у страху ад яго і ягонай хваробы. Жорсткі гвалтаўнік Муя, усведамляючы свой стан і тое, як ён у ім апынуўся, не пагражаў нікому кінжалам або сякерай. Мажны і дужы, ён кожнаму, хто пераступіць яму дарогу, казаў, што падпільнуе яго ўначы, яго або некага з яго блізкіх, і засуне яму сваю страшную штуку ці ў дупу, ці ў пізду, ці ў вока… Людзі палохаліся і пазбягалі яго як маглі, але толькі калі ён памёр, пачалі ціха згадваць ягонае імя ў розных жартах і зласлоўях.

Аднак ніхто ў гэтым так не даў сабе волю, як Іван Сікірыч, ніхто не крычаў па вуліцах, бо ўсе ведалі, што ў нябожчыка Муі ёсць два сыны, яшчэ дужэйшыя, чым быў іх тата, і нагэтулькі ж больш

жорсткія, наколькі маладосць бывае больш жорсткая за старасць. Сын Хамід сядзеў ужо пяты год у сараеўскай турме, бо абрабаваў і забіў нейкага французскага падарожніка, а малодшы Мэджыд працаваў у Дуброўніку насільшчыкам. І дзеля таго, што Іван цэлымі днямі паўтараў сваю кляцьбу, нехта паведаміў Мэджыду, што Сікірыч ходзіць па вуліцах і абражае нябожчыка бацьку.

Была субота, калі Мэджыд Башага з'явіўся ў мястэчку з круком на акулы ў правай і вяроўкай у левай руцэ. Ён нічога не казаў, ні з кім не вітаўся, толькі хадзіў без складу і ладу, а людзі хаваліся ў свае дамы і крамкі, добра ведаючы, каго той шукае. Не знайшлося такога, хто б папярэдзіў Івана пра вяртанне маладога Башагі, а сам ён быў настолькі безгаловы і заняты сваімі ўласнымі нягодамі, што нават не адхінуўся, калі той як з-пад зямлі з'явіўся перад ім каля Арсланагічавага моста.

Ён ні разу яго не ўдарыў. Стаяў перад Сікірычам, глядзеў яму ў вочы, глядзеў доўга, так доўга, што цень перасунулася з аднаго канца моста на другі, а калі Іван паспрабаваў яго абысці, смяротна напалоханы, але ўсё яшчэ не разумеючы, што ён у нечым перад Мэджыдам вінаваты, асілак выпусціў вяроўку і ўхапіў Івана за тое месца, дзе злучаюцца сківіцы. Прыціснуў вялікім і сярэднім пальцамі, Іван войкнуў і рэфлекторна разявіў рот, а Мэджыд прабіў яму круком шчаку. Пырснула кроў, Сікірыч ад шоку ўпаў на калені, але Башагу гэта ніяк не збянтэжыла. Ён нахіліўся якраз на столькі, колькі трэба, і быццам корпаючыся з куфрам, у якім паламаўся замок, доўга і педантычна прывязваў вяроўку да крука. Добра зацягнуўшы вузел, пацягнуў за вяроўку, Івану здалося, што зараз ён здзярэ яму твар з чэрапа, а Мэждыд толькі трошкі гучней шапнуў: *Хадзем, сабака, зараз будзеш лізаць Мую Башагу магілу!*

Іван Сікірыч прайшоў на каленях праз усё мястэчка, сярод людзей, якія праходзілі міма і рабілі выгляд, што яго не бачаць, або што Мэджыд вядзе харта, а не чалавека. Іван стагнаў, бо яму балела і крук усё больш раздзіраў яму шчаку, і добра ведаў, што ніхто яму не дапаможа. І ён бы не дапамог, калі б быў на іхнім месцы. Калі яны прыйшлі на могілкі, Мэджыд сеў на суседнюю магілу, а Іван лізаў каменны надгробак і зямлю на Муевай магіле. Калі добра аблізаў

адзін бок магілы, Мэджыд шапнуў: *Ліжы гаспадару другую нагу,* і Іван пераходзіў на другі бок. *Ліжы рукі… Ліжы грудзі геройскія… Ліжы гнойны хуй Муі Башагі, пёс няверны!* Апошнія словы Мэджыд выкрыкнуў, і Іван чакаў удару. Але той ні разу яго не ўдарыў, хоць тыя самыя загады тым самым тонам і парадкам паўтараў гадзінамі. Настаў вечар, Мэджыд паклаў на калені капшук і пачаў скручваць цыгарку за цыгаркай. Іван часам паглядаў на яго спадылба, на што той толькі шыпеў: *Ліжы!.. Ліжы!.. Ліжы!..*

Апынуўшыся на супрацьлеглым, далейшым ад Мэджыда баку магілы, Іван ускочыў на ногі і пачаў уцякаць. Рукамі ён сціскаў крук, заплятаўся за вяроўку, якая цягнулася і балюча рвала яму мяса, крычаў, маліў і плакаў, чакаючы ўдару ў патыліцу, і не мог сабрацца з сіламі хоць бы настолькі, каб зразумець, што асілак за ім не бяжыць. Мэджыд застаўся сядзець на магіле насупраць бацькавай, курыў і безуважна глядзеў у іншы бок. Калі б нехта прыйшоў і пабачыў яго такім, падумаў бы, што сын засумаваў і прыйшоў пагаварыць у думках з мёртвым бацькам.

Спатрэбіўся час, каб да Івана зноў вярнулася ягоная злосць. Ён скуголіў і клікаў матку, калі сёстры даставалі з яго крук, слёзы цяклі ў яго, калі яны ракіяй спрабавалі абмыць рану і спыніць кроў. Урэшце яны зашылі рану рыбацкай ніткай, бо кроў не хацела спыняцца. Але і гэтага было недастаткова. Штохвіліны ён сплёўваў кроў у бляшаны таз, складаў далоні, як у малітве, і позіркам шукаў таго, хто яму дапаможа. Рафа ляжаў у іншым пакоі, насмерць перапалоханы, бо бачыў, якой дарогай ідзецца на смерць, і ўсведамляў сваю віну за тое, што здарылася з братам. Добра было б знікнуць, але чалавек не снег, каб так лёгка растаць. Ён зразумеў гэта крыху запозна.

Ён сніў Алію Чулька і дзвюх манашак. Яны сядзяць у трапезнай Караджавай вілы, ядуць і смяюцца. Перад імі пустыя талеркі, з якіх яны бяруць відэльцамі кавалкі нічога, падносяць да ратоў і жуюць. Ён спрабуе іх даклікацца, сказаць, што талеркі ў іх пустыя, і што, колькі б ні елі, яны застануцца галодныя, але яны не чуюць. Той самы сон цягнуўся да раніцы. Заставалася яшчэ пяць дзён да вяртання ў Сараева. Дакладней, да дня, калі яго паспрабуюць туды вярнуць.

Раніцай Іван узяў паляўнічую стрэльбу і, нічога не сказаўшы, выйшаў з дома. Кожных пару крокаў ён пляваўся крывёю, прыспешваў хаду і змрочна глядзеў у пыл. Тройчы абышоў ён усё мястэчка, але не знайшоў таго, каго шукаў. Калі ён яго наагул шукаў. Калі Іван Сікірыч наагул наважыўся страляць у Мэджыда Башагу. Не, ён не страляў бы ні ў яго, ні ў каго іншага! Ён узяў стрэльбу, каб выглядаць страшным і каб прагнаць з душы пакуту. Як да яго вярталася злосць і ён ужо не быў заплаканым дзіцем, а мужчынам, якому даўно пераваліла за пяцьдзясят, так у ім рос і адчай. Для мястэчка гэта была звыклая карціна. Часта здаралася, асабліва вясною, калі застаіцца кроў у жылах і расхістаюцца нервы, што відны і паважаны гаспадар пачне хадзіць паўсюль са зброяй у руках. Адзін возьме стрэльбу, другі сякеру, трэці вілы і так нейкі час бадзяецца, хмурыцца на ўсіх, каго ўбачыць, позіркамі як гарматнымі ядрамі бурыць горад, але як правіла не знаходзіць таго, хто быў бы прычынай ягонага смутку. Людзі навокал быццам бы спачувальна цмокаюць языкамі і ўздыхаюць, але калі шчыра, бальшыня зларадна паціра рукі, бо вось яшчэ ў некага душа расшчапілася напалам, жыццё лопнула ўваччу або розум пачаў па кроплі выцякаць, і недалёка той дзень, калі выцеча дарэшты, і тады замест гаспадара і галавы сям'і, якога ўсе шанавалі і віталі, у горадзе з'явіцца яшчэ адзін дзівак, дурань, вар'ят, ёлуп і шаленец. Неўзабаве яго бруднага, засцанага і ашалелага жанчыны будуць мётламі гнаць з гарадскіх двароў. Асаблівую прыемнасць з такіх відовішчаў мелі знатнейшыя трэбінскія мусульмане, тыя, што з прыходам Аўстрыі пахваліся па дамах, бо выпадкаў атупення і вясновага вар'яцтва было цяпер непараўнальна больш, чым за турэцкім часам, а бальшыня пацярпелых былі хрысціянскай веры або з нізоў турэцкага люду – што для іх было бадай тое самае. Яны пераконвалі саміх сябе, а пасля і ўсё мястэчка, што ў прыстойных мусульманскіх сем'ях такіх выпадкаў не бывае, што, вядома ж, была няпраўда. Вар'яцелі і бэгі, і іхнія дочкі і сыны, але яны не бадзяліся па вуліцах, а цярпелі свае душэўныя пакуты ў чатырох сценах. Калі Іван Сікірыч з'явіўся са стрэльбай і вялікай ранай пасярод твару, ніхто не падумаў, што ён шукае Мэджыда Башагу і што магла б здарыцца нейкая бяда. Мястачкоўцы запісалі яго ў спіс з імёнамі будучых і цяперашніх вар'ятаў.

Так за два дні з сям'ёй Сікірычаў здарыліся тры ганьбы, адна горшая за другую: наймаладзейшы Рафа падняў на сябе руку, найстарэйшага Івана прымусілі аблізаць магілу Муі Башагі, пасля чаго ён – прынамсі для астатніх местачкоўцаў – страціў розум. Ва ўсіх дамах, дзе рассялілася патомства Матыі і Ёсіпа, запанавала аднолькавая маркота. Схіленыя позіркі, маўчанне, рэдкія ўздыхі, нехта з жанчын усхліпне над катламі, дзе вываравалася бялізна, нехта закашляе, піскне дзіця, бо гуляла за дзвярмі, якія рэзка адчыніліся, мяўкне кот або забрэша сабака, але ніхто не вымавіць ні слова. У дамах, куды павыходзілі замуж Сікірычанкі, мужы кідалі змрочныя позіркі на распухлыя лыткі і шчыкалаткі сваіх жонак, але нічога не казалі. Маўчалі нават і свякроўкі, якія звычайна першыя мелі што сказаць пра нявестчыну сям'ю. Але ж яшчэ ўчора паўсюль задзіралі нос, бо іхні сваяк быў царовым хроснікам, і таму пагражалі бакалейніку, які падсоўваў ім намоклую соль, або хваліліся перад суседствам, што Франц Іосіф неўзабаве запросіць іх у Вену, каб паказаць ім свой палац. Хто б ні зваўся ў Трэбіні Сікірычам і ў чый бы дом ні выйшла замуж дзяўчына з Сікірычаў, той пачынаў памалу адчуваць сябе Габсбургам. Як толькі нейкая суседка згадвала кума Стэву з Нікшыча, які прыедзе на Вялікдзень і прывязе тры негушскія шынкі, яна магла чакаць у адказ: *Эх, а што ж нам прышле наш кум з Вены!* Гаўно той Стэва з Нікшыча, калі ў цябе кум сам аўстрыйскі імператар! Суседка апускала позірк, у ражочках вуснаў у яе збіралася злосць, а імператарская сваячка частавала яе яшчэ адной філіжанкай кавы – толькі каб пачуць, якім голасам тая ад яго адмовіцца. Дык вось, цяпер прыйшоў час выраўняць рахункі! Рафа павесіўся на слівавай галіне, а з многіх галоваў пападалі імператарскія кароны.

Іванава ганьба хвалявала іх меней. І хоць ён быў найстарэйшы і ягонае слова мела вагу не толькі сярод маладзейшых братоў, але і ў дамах зяцёў, яго з лёгкасцю зракуцца, бо ён быў не першы і не апошні, хто праз сваю ўласную дурасць страчвае розум і гонар. Калі тут і будзе нейкае праклянцце, дык яно ўпадзе толькі на ягоны дом і дамы яго дзяцей. Сёстры пачнуць пляткарыць пра яго, браты пазамыкаюць перад ім свае дамы і не будуць пра яго згадваць. Пройдзе няшмат часу, і ў мястэчку забудуцца, хто каму брат. Івану гэта было

ясна. Ён не стрэліў са стрэльбы, якую пранёс па мястэчку, а Мэджыд Башага вярнуўся ў Дуброўнік. Найстарэйшы Сікірыч звалiўся, як вапняковы слуп. У ягоных руках застаўся адзіны козыр, але ён быў наймацнейшы. Імператарскі хроснік ляжаў у ягоным доме.

Што з табой, даражэнькі? глядзеў на яго Іван, як арол глядзіць на сваё хворае птушаня, якому б з радасцю выдзеўб мазгі. *Нічога,* птушаня скурчылася пад коўдрай, загледзеўшыся на нешта далёкае ад усяго, на што ў гэты момант можна было глядзець. *Як нічога?* скрыгатаў зубамі Іван. Той нічога не адказаў, падумаў – можа, пройдзе. *Як нічога?* загрымеў над ім брат, *ці ты ведаеш, што ты нам усім нарабіў, крывапіўца праклятый?* Рафа не адказваў і не варушыўся. Ён стараўся, каб было незаўважна, што ён дыхае, што ён наагул ёсць. Галава ў яго была пустая, у ёй мільгалі абрыўкі ўчорашніх сноў, драбочкі пылу патаналі ў глыбіні позірку і траплялі ў бляск аднаго сонечнага променя. *Адказвай!* роў Іван. *Адказвай!* Хлопчык успомніў Аліевы пальцы. Два з іх былі нязвычныя – вялікі і ўказальны. Пазногці на іх былі аднолькавай велічыні і формы, як на левай, так і на правай руцэ. Ён паглядзеў на свае пальцы. Пазногці моцна адрозніваюцца. Ва ўсіх, апрача Аліі. Вялікі і ўказальны пальцы ў Аліі былі як браты-блізняты. *Што ж ты так няўчасна нарадзіўся, каб ты быў праклятый, што ж ты выпаўз на свет, байструк чортаў, што ж мы цябе не задушылі ў першы дзень*… галасіў Іван як па нябожчыку. Рафа ўсміхнуўся.

Ён мог яго забіць, было б не шкада, і ніхто б не засмуціўся. Можа, ён нават і ў турму б не сеў. Мог задушыць, і сказалі б, што памёр ад наступстваў павешання. Усё Трэбіне ведала, што ён вешаўся. Было б вялікае пахаванне, прыйшлі б вайсковыя прадстаўнікі і імператарскія святары, а ганьба з часам забылася б. Зрэшты, такая ж імператарава, як і Іванава. Напэўна, задушыў бы яго, як толькі б той пачаў смяяцца! Скруціў бы яму шыю як каляднаму індыку, калі б не трымаў у галаве і тое, што вінаваты Мэджыду Башагу, і тое, што спрабуюць забраць у яго местачкоўцы і сям'я. Скончыць Рафа школу, паедзе Рафа ў Вену, свет даведаецца пра Рафу, дадуць Рафу пасаду пры двары… А чыя будзе выключная заслуга, хто Рафу ўратаваў ад смерці і наставіў на добры шлях? Іван! Ніхто іншы, а толькі Іван! Не належыць Рафа ўсім

Сікірычам, а толькі яму і Францу Іосіфу! Усе іншыя Рафу задушылі б, быццам гэта не чалавек, а шчаня або кацяня! Скінулі б у Трэбішніцу, каб і цела не ўсплыло ніколі на дзённае святло.

Цягнік выехаў з паўгадзінным спазненнем. Хлопчык сядзеў ля акна. Ён быў бледны, позірк у яго быў абсалютна пусты. *Хворы, ці што?* спытаўся кандуктар. *Дзе там хворы, яблычак мой румяны!* адказаў Іван, дуракавата ўсміхаючыся ўніформе. *Румяны, як цялячы азадак,* пагардліва адказаў кандуктар, відавочна абражаны розніцай паміж сваім мундзірам і абтрапанай Іванавай адзёжай. З таго часу, як чыгунка падзешавела, пачала ездзіць розная абадрань. Хутка і жывых парасятаў пачнуць пускаць у вагоны, а мы ж толькі пачалі рабіцца панамі – думаў службовец імператарскіх чыгунак, спадзеючыся, што Іван абурыцца, і ён выкіне яго з цягніка. Але той не абураўся. Ён быў ціхі і спалоханы фактам, што ўпершыню едзе ў такую далёкую дарогу. Не паехаў, калі б не мусіў, не паехаў, нават калі б гэта было пытанне жыцця і смерці! Яго палохала ўніформа чыгуначнікаў, палохала думка, што ён прыедзе ў Сараева і там разгубіцца і страціцца, што не будзе ведаць, як давесці Рафу да тых манашак. Ад малога дапамогі няма. Ужо трэці дзень не прамовіў ні слова. Можаш біць яго па галаве, можаш лупцаваць па голым азадку, можаш паставіць яго на калені на кукурузу і вярбовым дубцом хвастаць па пятах – усё гэта Іван спрабаваў – але той ні слова, ні піску. Толькі маўчыць, і толькі калі ў яго пад бізуном лопне скура на спіне, завішчыць, даруй мне божа, быццам звер або быццам у яго душа на адным а задніца на другім канцы свету. Апошняе, што ён сказаў, было, што ў Сараева ён не вернецца. Вось дурань, не вернецца ў царскую школу! Такой нісянеіцы Іван яшчэ не чуў. Можаш зганьбіць роднага брата, можаш плюнуць на тых, што цябе нарадзілі, можаш госпаду Богу паказаць праз локаць, калі спытаецца ў цябе пра здароўе, можаш падняць на сябе руку, але царскай міласцю і кумаўствам, даражэнькі мой, не грэбуюць! Прыблізна так ён яму сказаў або неяк падобна… Ну можа не дакладна такімі словамі, бо ў Івана са словамі выходзіць не гладка, дый раззлаваў ён яго ўмомант, дык можа сказаў нешта іншае, а можа і ўвогуле нічога не сказаў, а толькі пляснуў па вуснах, але сэнс быў той. *Мо-*

жаш зганьбіць роднага брата…, шаптаў Іван ціха сам сабе, каб ніхто не чуў, і ганарыўся тым, якія разумныя словы прыдумаў. Імі ён разганяў крыўду, якую нанёс яму кандуктар. Бач ты, цялячы азадак! Эх, пакажа ён яму цялячы азадак, калі Рафа скончыць школу. Знойдзе яго, улепіць аплявуху і загадае, каб яго звольнілі…

Хочаш бурэк? спытаўся Іван, калі яны праз мостарскую станцыю ішлі ў касу. Ён трымаў малога за каўнер, што надзейна – то надзейна, але Рафа зноў нічога не адказаў. І не мусіць! Загаворыць, як прагаладаецца. Ніхто яшчэ не забіў сябе тым, што перастаў есці, дык і ён не памрэ, разважаў Іван і купіў сабе бурэк. Тоўсты прадавач працягнуў яму свой тавар, загорнуты ў абрывак газеты, а нейкаму пану перад ім – напэўна нейкаму швабу – прадаў бурэк у тонкай белай паперы. Ён дакладна бачыў: куча разарваных газецін і акуратна паскладаны стосік панскай паперы. І як ён каго ацэньваў, так і бурэк загортваў у адно або ў другое. А каштавала для ўсіх аднолькава! Ён быў разлаваны, але зноў не наважыўся запярэчыць. Яму было ясна, што свет зладжаны несправядліва, але каб гэтак і настолькі, гэта і для Івана было занадта. Ён жаваў свой бурэк, тлушч цёк па барадзе, ён кусаў радкі гатычных літар, што адбіліся на цесце, і запэўніваў сябе, што ніякі д'ябал яго больш ніколі не намовіць выправіцца так далёка ад дому. Можа мы не такія вялікія паны, можа й смярдзім цыбуляй і ракіяй, але мы, браце, не такія, што ў нас адна папера будзе для бедных, а другая для багатых.

Цяпер сядзі ціха, сказаў Іван, рассеўся ў чырвоным фатэлі сараеўскай кампазіцыі і дастаў пляшку з ракіяй. Бурэк быў так сабе, зашмат цыбулі, а бульба нейкая ёлкая, дык ён слівовіцай спрабаваў загасіць бунт у страўніку. У дарожную торбу ён на ўсякі выпадак паклаў таксама ланцуг і вісячы замок, каб прывязаць Рафу, калі яму захочацца паспаць, але цяпер яму было крыху няёмка перад людзьмі. Што скажуць кандуктары, калі пабачаць, што ён накладае на малога кайданы? Ну так, ён ягоны, і ніхто не мае права ўмешвацца ў тое, што ён робіць з плоццю ад сваёй плоці, але зноў жа – людзі ўсякія бываюць. Пачнуць кпіць, кідаць нейкія заўвагі, а Івану было б мілей, каб да яго больш ніхто не звяртаўся. Толькі хай не глядзяць на яго, хай для іх ён зусім не існуе.

Не варушыся, а то я табе ногі пераламаю! папярэдзіў ён хлопчыка, насунуў шапку на вочы і патануў у сон, у якім спрабаваў прымірыць праслую цыбулю і сапсаваную гламочскую бульбу, якая хто ведае колькі разоў перамерзла на марозе, перш чым трапіла ў Іванаў бурэк. Грукаталі ў правільным рытме колы кампазіцыі, быццам бясхібная Божая рука трэсла касцельныя званы і заклікала паству да пакаяння. Набліжаўся патоп, і ўпэўнена сябе адчувалі толькі тыя, хто меў найменш чаго страціць. Іван меў найменш ад найменшага і мог патанаць глыбей за ўсіх пасажыраў у кампазіцыі.

Яго абудзіў балючы шум у скронях. Ён падумаў, што боль паходзіць ад гуку колаў, і цвёрда сціснуў хлопчыка за локаць, Рафа ціха вякнуў, значыць ён тут! а тады адчуў, што нешта дзіўнае адбываецца ў яго ў вантробах. Ён чуў панічны кліч уласных кішак, усё слабейшай была моц мышцы, якая спрабавала затрымаць тое, што вырывалася навонкі. Вырывалася дзікае полымя, тлустае, балючае і ліпкае. Ён не ведаў што рабіць! Або выскачыць з цягніка і высрацца, як чалавек, і няважна, што Рафа можа ўцячы, або затрымаць полымя ў сабе і адстаяць права найстарэйшага сына, захаваць гонар перад трэбінскім мяшчанствам, уратаваць душу… Адзінае, чаго нельга дапусціць, гэта накласці ў нагавіцы! Пачуецца смурод, яго паглыне агульная пагарда, яго выкінуць з цягніка, заедуць ботам у пахвіну… Кампазіцыя павольна паўзла праз Іван-гару, амаль што ўжо спынілася, у яго лопалася галава, з вачэй сыпаліся іскры. Усімі сіламі сціскаючы найважнейшую мышцу свайго цела, ён выхапіў з торбы ланцуг і, не прамовіўшы ні слова, пачаў замацоўваць і замыкаць хлопчыку ногі. Яго не хвалявала, ці ўбачаць яго кандуктары, ён сцягнуў ланцуг як мага мацней, і тады, у апошнія імгненні сваёй няўсранасці пабег праз вагон. Пасажыры неўразумела глядзелі на яго, пані ў капелюшы падскочыла і нахмурылася – можа гэта нейкі кішэннік, што ўцякае ад паліцыянта? – на шчасце, яе торбачка была на сваім месцы, бо той ужо выскачыў з вагона. Ён спатыкнуўся аб нейкае галлё і бразнуўся пасярод камення, мышца расслабілася, струменьчык пырснуў у нагавіцы, але даволі хутка Іван спахапіўся, загаліўся і з грымучым рыкам выпусціў з сябе ваду, агонь і невыносны смурод прапушчанай праз кішкі слівовіцы. Нясцерпна ба-

лела галава, ён заплюшчыў вочы і напяўся, каб выціснуць з сябе тое, што яшчэ заставалася ў вантробах. Пасля, не трацячы часу на падціранне, нацягнуў нагавіцы і пабег за цягніком. Жах чалавечага сэрца часам бывае такі, што чалавек больш не адчувае болю. Ён бег, як ніколі ў жыцці.

Легенда пра імператарскага хросніка на гэтым скончылася, бо кішкі Івана Сікірыча запрацавалі якраз у той момант, калі кампазіцыя цягніка на лініі Мостар-Сараева была амаль на самым версе Іван-гары, якая аддзяляе Герцагавіну ад Босніі, перашкаджае пранікненню міжземнаморскага клімату ў кірунку Сараева і ўяўляе сабою выпрабаванне для архітэктараў і складальнікаў раскладу чыгуначнага руху, бо няма лакаматыва, які б заехаў на Іван-гару з хуткасцю большай за чалавечы пешы крок. Але як толькі кампазіцыя пераедзе верх гары і перавал каля Брадзіны, яна на поўнай хуткасці з'едзе ў бок залатых далін і Сараеўскага поля, так што яе не дагналі б і найшпарчэйшыя арабскія скакуны. Дарэмна Іван Сікірыч бег за апошнім вагонам, дарэмна крычаў і лаяўся ў начной цемры. Ён застаўся адзін сярод невядомага краю, у якім чулася толькі ваўчынае выццё і далёкія стогны лесуноў і русалак. На шчасце, год быў без снегу і моцных маразоў, інакш ён бы да раніцы замерз.

Сям'я паведаміла пра Рафава знікненне, яны распытвалі дзе толькі маглі, ці яго нехта бачыў? ці хто нешта чуў? ці ёсць недзе дзеці, пра якіх невядома чые яны? і патрацілі ўсе ашчаджэнні на аплату фальшывых паведамленняў і на дэтэктываў, якіх слалі аж да Біхача, Вішаграда і Бродскай брамы. Але хлопчык як скрозь зямлю праваліўся. З сараеўскай гімназіі прыйшоў запыт, чаму Рафа Сікірыч не з'явіўся на занятках, дзве манашкі кожны тыдзень слалі лісты з просьбай адгукнуцца, прыязджалі і нейкія людзі з паліцыі, падазраючы, што сям'я не дазваляе хлопчыку вярнуцца ў школу…

Праз месяц прыйшоў змацаваны пячаткай афіцыйны ліст ад дырэктара гімназіі Івана Полака, у якім вучань першага класу Рафа Сікірыч апавяшчаўся пра тое, што з прычыны недатрымання дысцыпліны і неапраўданых пропускаў заняткаў ён выключаны з школы і што гэтае рашэнне пераслана асабіста міністру асветы. Яшчэ праз тры тыдні замест імператарскай грашовай дапамогі

прыйшло патрабаванне вярнуць грошы за папярэдні месяц. Гэта для Сікірычаў быў знак, што імператар Франц Іосіф адрокся ад свайго хросніка, нават не пацікавіўшыся, жывы ён або мёртвы. Замест таго, каб занепакоіцца, замест таго, каб паслаць людзей, што шукалі б яго па ўсёй імперыі, і замест таго, каб зрабіць тое, што робяць у цяжкіх сітуацыях хросныя бацькі, імператар запатрабаваў вярнуць яму грошы! Горка расчараваліся Сікірычы ў манархіі зімою таго 1892 года.

Местачкоўцы зларадна назіралі за іх трагедыяй, але нягледзячы на гэта рэпутацыя Габсбургаў ва ўсім Трэбіні ўпала на найніжэйшы ўзровень! Гэта была не тая дзяржава, на якую яны спадзяваліся, дый ейны імператар не аднолькава ставіўся да ўсіх сваіх падданых. Ці ў Вене кумаўство не мае ніякай вартасці? Што б там ні было, народ адчуваў, што гэта несправядліва. Ні з Двара, ні з сараеўскай управы больш ніколі не прыйшло ніводнага афіцыйнага ліста ў сувязі з імператарскім хроснікам. Сікірычы вярнулі грошы і яшчэ заплацілі працэнты і гербавы збор.

А Іван проста ад усяго гэтага адмежаваўся. У яго прысутнасці пра Рафу нельга было згадваць: ні пра яго, ні пра Франца Іосіфа, ні пра местачкоўцаў, ні пра што з таго, што яму было важна і што некалі яго прыгнятала. Ён рэдка спускаўся ў горад, займаўся сваімі пчоламі, а калі яго мучылі ўспаміны, ён дакранаўся да рубца на шчацэ і адразу пра ўсё забываўся. Жыў ён так яшчэ пяць гадоў, а тады, дажджлівай вясною 1898 года, калі ён пасля зімы раскрываў вуллі, на яго напаў і пакусаў рой шэршняў. Бестыі былі забраліся ў вулей, пазабівалі пчолаў і пасяліліся ў ім. Ён ледзь дапоўз да хаты і неўзабаве памёр. Хавалі яго ў закрытай труне, бо твар у яго быў такі знявечаны, што суседзі не паверылі б, што гэта Іван.

Пройдзе больш за дзесяць гадоў, перш чым Рафа Сікірыч, ужо як жанаты чалавек, зноў прыедзе ў родны горад. Адны яго не пазналі, другія не хацелі пазнаць. Ён спытаўся ў братоў, ці нешта з маёмасці належыць яму. Яны яму сказалі, што не і што калі ён не хоча рызыкаваць жыццём, хай больш не пытаецца. Ён больш не пытаўся і больш нікога з сям'і пасля таго не бачыў. Ён працаваў вакзальным насільшчыкам у Коніцы, прыбіраў мостарскі вакзал і малоў куку-

рузу нейкаму прадаўцу бозы, спаў у яго ў падвале і рабіў выгляд, што нічога не чуе, калі тлусты стары ўначы мацаў яго дрыготкімі рукамі, разгружаў караблі каля Мэткавіча, насіў кантрабандны тытунь у Спліт і Шыбенік…

Ён рос і вырастаў, як бур'ян пры дарозе, бязвольны, якім стварыў яго Бог, і заўсёды самотны, без патрэбы ў сябрах і таварыстве. Тое, на чым ён трымаўся, быў той жах, які ён перажыў, калі вісеў на дваровай сліве. Ён працаваў цэлымі днямі, каб пасля мог спаць свабодны, без думак і сноў.

У Дуброўнік ён трапіў таму, што ў Мэткавічы больш не было працы, а выпаў вялікі снег, і нічога не хадзіла ў Коніц і Ябланіцу. Ён уладзіўся працаваць у гарадскім порце і знайшоў кватэру ў бабы Пэткі, старой дзеўкі, апошняга атожылка некалі шанаванай капітанскай сям'і, цяжкой п'яніцы, якая ці то ад старасці, ці то ад алкаголю ўжо крыху кранулася розумам. Распрадаўшы большменш каштоўныя хатнія рэчы, бацькавы марскія дзённікі, дзедаву калекцыю люлек – іх было некалькі соцень, з усіх кантынентаў, з дрэва, гліны, а адна, грэцкая, з каменю, шаснаццаць ватыўных абразоў – найстарэйшы з часоў да Стогадовай вайны, і безліч марскіх і геаграфічных картаў, крэсленых пёрамі найвялікшых партугальскіх, англійскіх і бокельскіх майстроў, баба Пэтка больш не мела адкуль здабываць грошы на ракію і месяцамі шукала ў порце кватарантаў. Маракі ў чаканні адплыцця, работнікі на разгрузцы і разнастайныя лайдакі, якія боўтаюцца ва ўсіх партах і на ўсіх чыгуначных вакзалах, усе як адзін адхілялі бабіну прапанову. Па-першае, яна была дарагая – баба прасіла бутэльку ракіі кожны другі дзень, што ў тыя часы каштавала сур'ёзных грошай, а па-другое – неяк яна не стварала ўражання таго, у каго б чалавек без вялікай патрэбы пераспаў. Малая і згорбленая, з даўгім ведзьміным носам на худым твары, уся ў нечувана брудных лахманах, яна пахла ўсімі найнепрыемнейшымі пахамі, якія чалавечы нос можа сабе ўявіць. Найперш чуўся смурод, і толькі тады з'яўлялася яна сама, скандуючы накшталт разносчыка газет: *Прыстойнага мужчыну вазьму на кватэру, ніякіх курваў, ніякага свінства!* Партовыя работнікі празвалі яе баба Смярдуха і гналі яе ад сябе. Яе гэта заўсёды

здзіўляла! Кожны раз, як яе адганялі, яна як бы нікла і яшчэ крыху змяншалася, і тады можна было заўважыць, што яна глядзіць умольным позіркам сабакі, упэўненага, што людзі – гэта істоты, якія не выходзяць з дому без косткі ў кішэні. Тады яна дакульгвала да наступнага карабля на разгрузцы і зноў здзіўлялася, калі яе гналі і адтуль. Колькі б разоў яна ні чула брыдкія словы, баба Пэтка ніколі не магла да іх прызвычаіцца. Калі работнікі апоўдні перакусвалі і на дэсерт ім хацелася з некага паздзекавацца, адзін браў бутэльку, у якой заставалася яшчэ на палец віна, і крычаў: *Эй, Смярдуха, хочаш выпіць?* Баба свяцілася радасцю, як Ева, убачыўшы першы ўзыход сонца, і скіроўвалася да бутэлькі. Яна бегла, калі гэта можна было назваць бегам, спатыкалася і падала, і калі ўрэшце дакульгвала, бутэлька ляцела ў мора, усе істэрычна смяяліся, а завадатар злога жарту казаў: *Давай, Смярдуха, скачы за віном, каб нам тут болей не смярдзела.*

Той самы спектакль паўтараўся дзень пры дні, і нічога ў ім ні на ёту не мянялася. Баба кожны раз кідалася да бутэлькі, бутэлька кожны раз ляцела ў мора, работнікі смяяліся з тым самым запалам.

Рафа адмаўляўся, калі баба Пэтка прапанавала яму кватэру, з тых самых прычынаў, з якіх адмаўляліся і іншыя, але не ўдзельнічаў у жартах з яе і не перакусваў разам з усімі. Аднак дарэмна ён спрабаваў схавацца, каб нічога не бачыць і не чуць. Дзе б ты ні знайшоў сабе месца, каб адламаць хлеба і нарэзаць сала, у любым кутку грушскага порту і за сто метраў навокал чуўся смех. І было ясна, што гэта зноў мучаць бабу Смярдуху. Гэта пачало даводзіць яго да шаленства, парушала яго дзённы спакой, штодзённыя нягоды душы ператварыліся ў дзікае трымценне, у нешта такое, што нагадвала рэха калідораў сараеўскай гімназіі. Ён напружана вычэкваў смех, а калі ўрэшце чуў яго, яму хацелася біцца галавою аб каменную партовую агароджу. Ён мог выбіраць: або ўцякаць з Дуброўніка, або пасяліцца ў бабы Смярдухі і купляць ёй ракію.

Віла «Rosa Bella» была найвялікшым і найпрыгажэйшым будынкам пры ўсходнім уездзе ў горад, збудаваная ў 1771 годзе як дакладная копія дома ў Пэрасце, у якім жыла нейкая Ружа, мясцовая прыгажуня і нязбытнае каханне Пэтчынага прапрадзеда. Ён маладым

хлопцам пешкі прыходзіў у Боку, спяваў пад Ружынымі вокнамі і дарэмна дамагаўся ейнага сэрца, якое было абяцанае старому венецыянскаму гандляру. Як толькі ў яго памрэ жонка і пройдзе год жалобы, венецыянец прыедзе па Ружу і забярэ яе з сабою. Усё рабіў Пэтчын прапрадзед, каб змяніць тое, што было запісана лёсам, і выглядае, што меў у гэтым, прынамсі што датычыць Ружы і яе жаданняў, пэўны поспех. Аднак дзеля таго, што лёс немагчыма падмануць, Ружа захварэла і за адзін летні месяц прайшла шлях ад найпрыгажэйшай бакяльчанкі да халоднай магілы. Венецыянскі гандляр страціў грошы і тую, што будзе даглядаць яго ў старасці, а малады дубраўчанін застаўся без кахання свайго жыцця. Ён зарокся, што ніколі не ажэніцца, і пайшоў у мора. Быў ён шалёна адважны, служыў капітанам і на гандлёвых, і на вайсковых караблях – на службе ў розных войскаў і дзяржаваў, наважаны пакінуць свае косці на дне нейкага мора, каб яго памяталі па геройскай легендзе, а не па няшчасным каханні. Аднак смерць яго не хацела, і ён вярнуўся дадому. У старых гадах вельмі багаты, але па-ранейшаму верны Ружынай памяці. Ён загадаў збудаваць яму дом, які ва ўсіх дэталях будзе тоесны ейнаму. Пасылаў краслярояў і будаўнікоў у Пэраст і патраціў вялікія грошы на тое, каб Ружыны родныя дазволілі ім перамаляваць і перамераць унутранае размяшчэнне пакояў. Так узнікла віла «Rosa Bella», дасканалы архітэктурны ўспамін, а ён свае апошнія гады праводзіў у меланхоліі абыходу пакояў, у якіх жыла Ружа. Ён збудаваў дом, каб пераступіць парог, які быў яму забаронены, сядзеў і курыў люльку ля акна, пад якім спяваў Ружы песні пра каханне.

Аднак урэшце ён парушыў уласны зарок і перад смерцю ажаніўся з сямнаццацігадовай сялянкай з Канаўлаў. Яна не была асабліва прыгожая, і яшчэ менш працавітая і разумная, але яе звалі Ружа. Тая канаўлянка была прапрабабкай бабы Пэткі і першай уладаркай вілы «Rosa Bella».

Звонку мураваны будынак яшчэ захоўваў сваю арыгінальную прыгажосць, але той, хто б увайшоў усярэдзіну, а такога да Рафы не здаралася як найменей пятнаццаць гадоў, убачыў бы нешта, што было больш падобнае да найглыбейшых каманаў пекла – дзе

пыхлівыя французскія грэшніцы замест парфумы купаюцца ва ўласным гаўне – чым да дома даўняй сямейнай славы і няшчаснага кахання. Баба Пэтка, мабыць, ніколі не выносіла смецце і не бачыла каштоўнасці ні ў якай з тых рэчаў, што яна не здолела прадаць. На падлозе парахнелі найкаштоўнейшыя сукенкі, у сувоях няўжытага шоўку нераставалі чэрві, рассыпаліся ў оргіях молі святочныя капітанскія ўніформы. І ў гэтым пераважна безаблічным нагрувашчанні ўсякай усячыны найстрашнейшае ўражанне пакідалі рэшткі ежы шматгадовай даўнасці. Рафа бачыў цэлы некрануты хлеб, можа, з тых часоў, калі баба Пэтка яшчэ магла выклікаць у іншых спачуванне, ён быў зялёны, як стары касцельны звон, які невядомыя стварэнні аплялі тонкім павуціністым руном, сярод якога ў старазапаветным адзінстве жылі калоніі ўсялякай жамяры. Дзеля таго, што іх не знішчалі і што ў віле «Rosa Bella» ў іх не было натуральных ворагаў, чарвякі, моль, макрыцы, мурашы, прусакі, восы, матылі, шэршні, павукі, сараканожкі і вухавёрткі перанялі нешта са звычаяў паважных стварэнняў. Не раўнуючы як леў, наверсе абламанага кандэлябра ляжаў, склаўшы лапкі, з заспаным позіркам прусак велічынёю з перапялінае яйка і глядзеў Рафу проста ў вочы. Ён, можа, пра нешта б яшчэ ў яго і спытаўся, але паленаваўся патурбавацца.

Рафа прынёс шуфель і тачку і павыкідаў смецце з свайго пакоя. Пабяліў сцены і заліў вапнай дзіры, у якіх жыў лішак жывога свету, аддраіў падлогу і разаслаў на ёй свой матрац. Той матрац разам з вялікім салдацкім куфрам застануцца адзінымі рэчамі ў пакоі. Ён запрапанаваў бабе Пэтцы прыбрацца так ва ўсім доме. *Запомні адно, я ў гэтым доме пан і гаспадар,* абражана адказала яна і два дні з ім не размаўляла. *Тут няма бабы Смярдухі, віла «Rosa Bella» – гэта табе не грушскі порт,* яшчэ сказала яна, і Рафа зразумеў, што ў бабіна жыццё лепш не лезці. Яна больш не належала гэтаму свету, але калі ты не занадта адчувальны на бруд, калі не баішся хваробаў і калі не празмерна прымхлівы, то з ёй можна было жыць. У доме яна была ціхая, загаворвала толькі калі ён гэтага хацеў, цэлымі днямі грэлася ля кухоннай печы, піла ракію і грызла цыбуліну. Рафа не бачыў, каб яна ела нешта яшчэ апрача цыбулі. Разы два-тры ён прынёс ёй сыру

і сала, але баба грэбліва ад іх адмовілася: *Я табе больш не маладая дзеўка, мне ўжо цяжка ідзе тлустае.* Пад ракію з цыбуляй яна бавіла цэлыя дні і больш у порт не хадзіла.

Нельга забыцца на зло, якое табе нарабілі, сказала яна аднойчы, *нельга быць паняй сярод хамаў.*

Рафа купляў ракію для аплаты жытла дзе трапіцца. Спачатку стараўся не купляць ні найдаражэйшай, ні найдзешавейшай, але пасля пабачыў, што бабе ўсё роўна. Толькі каб была моцная і злая, а ці гэта будзе лазовіца, слівовіца, ражковіца ці гаўновіца – казалі, што чарнагорцы робяць ракію з авечага і казінага памёту, – гэта ўжо бабе Пэтцы было ўсё адно. А ўжо калі ён прыносіў ёй бутэльку віна, яна была найшчаслівейшым чалавекам на свеце. Вочы ў яе рабіліся шкляныя, і калі яна ўсміхалася, Рафу здавалася, быццам запахла поле лаванды. Ён сядаў побач з ёю і ўжо хто ведае каторы раз слухаў гісторыю пра тое, як была збудаваная віла «Rosa Bella» і як бабін прапрадзед хадзіў пехатою ў Пэраст спяваць балады прыгажуні Ружы. Толькі ў гэтай гісторыі і толькі пры дапамозе ракіі і віна Пэтка выглядала нармальнай і разважлівай. *Ну, ці ж не дурань быў дзед майго дзеда, даруй яму Божа,* казала яна, уволю насмяяўшыся з яго дурной галавы і з таго, як стары сядзеў пад акном і ўяўляў сябе маладым, што кліча адзінае каханне свайго жыцця.

У мяне маладая дачка, і ты, я бачу, таксама малады, сказаў яму Ніка Азінавіч, у якога ён раней месяцамі купляў ракію.

Завецца Ката. Дачка мая. І прыгожая, як карцінка, сказаў ён, калі Рафа прыйшоў другі раз.

Пара ўжо вам. І ёй, і табе, працягваў Ніка праз два дні.

Хочаш хоць бы паглядзець на яе? спытаўся ён наступнага разу. Рафа яму нічога не адказваў, рабіў выгляд, што не чуе або што яго не цікавіць тое, што́ той яму кажа, але калі ён зноў прыйшоў па ракію, яго сустрэў ужо не Ніка. У збянтэжанай дзяўчыны дрыжалі рукі, калі яна пералівала ракію, яна паглядала на яго спадылба, трошкі хмурылася, але нічога не казала.

Ты ёй спадабаўся! сказаў Ніка наступным разам. Рафа зноў не адказаў, але бацька больш не чакаў ад яго адказу. Усё ішло да лагічнага вырашэння, і ён быў задаволены.

Што такое было з Нікам Азінавічам, бедным але паважаным удаўцом, каб выдаць дачку за чалавека нетутэйшага, які не мае ні каранёў, ні сям'і, ні дома, ні імя, ні месца пад сонцам? Гэтае пытанне будзе непакоіць усё шырэйшае суседства, пакуль цэлае пакаленне не спачне пад каменнымі плітамі на Баніноўскіх могілках*. Пакуль усе не памруць, яны не перастануць здзіўляцца, а адказ – хоць ён просты і зразумелы, як толькі падумаеш сэрцам, а не галавой – ніколі ім не прыйдзе ў галаву. Ніка шукаў якраз такога зяця, бо не хацеў застацца адзін. Кату ён любіў той любоўю, у якой яшчэ адчуваўся боль ад смерці яе нябожчыцы маці, і яго ахапляў жах пры думцы, што яна пойдзе ад яго ў чужы дом. Другую дачку, Ангеліну, ён адпусціць, яму яшчэ будзе і прыемна, калі яна адыдзе, але Ката – гэта нешта зусім іншае, яна засталася ў татавым сэрцы. Як людзі не могуць гэтага зразумець і адкуль тая думка, што бацькам аднолькава дарагое кожнае дзіця? Некаму можа і так, але не Ніку. Ён знайшоў зяця па меры сваіх адчуванняў, і – як ён думаў – па меры гаспадарскага розуму: Рафа падаўся яму салідным хлопцам і ўзорным бедняком, якога нейкае няшчасце – бо што ж яшчэ? – прымусіла жыць у бабы Пэткі. У яго нікога не было, і ён рабіў уражанне чалавека, які будзе клапаціцца аб сваёй жонцы. Дый які б мужчына клапаціўся больш, чым той, чыя маёмасць пачынаецца і залежыць ад жаніцьбы? Так думаў Ніка Азінавіч і застаўся ўпэўнены, што не памыліўся.

З Рафавай перспектывы ўсё выглядала крыху інакш. Ён паверыў, што падабаецца Каце – а ён і сапраўды падабаўся – як неўзабаве паверыць і ў тое, што яна яго кахае. Ён толкам не разумеў, што́ тое падабанне і каханне маглі б для яго значыць, але нашто яму было ўпірацца? Ката лёгка пераносіла ягонае маўчанне. Кацін бацька не чакаў адказаў на зададзеныя пытанні. Ні адно, ні другое не парушалі ягонага спакою. Лепшую радню цяжка было б і знайсці. Ён кіўнуў галавою, і гэта азначала ягоную згоду.

У неперапыннай гісторыі самоты Рафы Сікірыча адзіным выключэннем была дачка Рэгіна. У дзень ягонай смерці 12 лютага 1924 года толькі яна сапраўды некага страціла, бо толькі Рэгіна прымала яго такім, які ён быў. Усе астатнія ад Рафы раней ці пазней адракліся, бачылі яго іншым, чым ён насамрэч быў, або спрабавалі

яго змяніць. І нікога, апрача яе, не мучыла сумленне ад таго, як ён адышоў са свету.

А сумленне – добры сведак смерці. Лепшы за слёзы і любы выказаны ці нявыказаны смутак. Тыя, хто застаецца жыць, адчуваюць віну перад памерлымі, і тая віна – адзінае, што іх звязвае са светам ценяў. Віна – гэта тое, што мёртвыя бацькі пакідаюць сваім дзецям і ад чаго яны робяцца дарослымі людзьмі. Калі віны няма, дык не было тады і бацькі з маці. Дакладней, тады яны не былі бацькамі родным дзецям. І таму Рэгіна была Рафавым дзіцем і з ёй працягнуўся ягоны род. У дзень ягонай смерці ёй яшчэ не споўнілася дзевятнаццаці, але яна прыняла на душу вялікую пакуту, якую будзе цяжка насіць і па якой будзе пазнавацца чыстае і непадробнае няшчасце. А высакароднасць няшчасця залежыць ад таго, як пранясеш яго праз жыццё.

II

Дождж падаў без супынку ўжо дваццаць сёмы дзень. У порце адзін за адным танулі баркасы, за якімі ўжо больш не было каму глядзець, жанчыны ў чорным вызіралі з-за фіранак і хаваліся, як толькі на дарозе з'яўляліся людзі. Вайскоўцаў лепш не бачыць, бо невядома чаго яны шукаюць. А ўсе іншыя, хто можа трапіцца, яшчэ горшыя за вайскоўцаў. З Герцагавіны ад нейкага часу раз-пораз спускаліся згаладалыя людзі, орды здзічэлых шаленцаў прыбывалі з Босніі і Чарнагорыі, рабавалі ўсё на сваім шляху і ішлі далей уздоўж узбярэжжа ў бок Трстэна і далей да Заострага і Макарскай. Поўнай праўды пра падзеі на фронце было цяжка дазнацца. Аўстрыйская прапаганда шырыла паведамленні, што Сербія дажывае апошнія дні, а яе войска і насельніцтва ўцякаюць у Албанію. Італьянскія караблі, нібыта, набліжаюцца да Дуброўніка. Пра французаў і англічан ані почуту. Можна было б сказаць, што аўстрыйскі імператар ужо выйграў вайну. Але ежы было ўсё меней, сяляне ўзнялі да неба цэны на бульбу і збожжа, а ўлада быццам неяк замкнулася ў сабе. Мерзнуць у сваіх канцылярыях, быццам чакаюць, у які бок павернуцца мокрыя бляшаныя пеўні на дахах назіральных пунктаў.

Ніка Азінавіч сядзіць у змроку віннага пограбу і з тройцай сабе падобных вядзе развагі пра тое, у якім часе дзіця набывае чалавечую душу. Неўзабаве год, як у яго памер унук, а айцец Іван адмовіўся весці пахаванне і не захацеў адслужыць памінальную імшу. Хлопчыка звалі Ангеліна. Гэтае імя далі, каб яно яго абараніла – бо ён нарадзіўся зарана і быў меншы за бохан бядняцкага хлеба. Але малая сястра празвала яго Ліна. Яго своечасова не пахрысцілі, але не таму, што Ката і Рафа не зрабілі ўсё належнае. Зрабілі, тройчы хадзілі ў плябанію, але той самы айцец Іван не меў часу. Праўда, у тыя дні і месяцы шмат людзей паміралі, праўда, што святар меў больш пільныя справы і што трэба было хрысціць дзяцей тых, хто

мог сытней пачаставаць, але калі ўжо так і калі айцец Іван быў вінаваты, што Ліна памёр няхрышчанай душою, ці ж можна было аддаваць яго зямлі, як сабаку?

Не, пачуўся першы голас са змроку. *Дальбог не,* пацвердзіў другі. *Што тыя ксяндзы ведаюць! Яны табе на адной назе з і богам, і з д'яблам,* злаваўся трэці. Ніка пацягнуў дым.

На момант разгарэўся жар цыгаркі, змяшанай з сушанай мяты і дробкі тытуню, і на кароткі час асвятліў твары людзей. Адзін з іх быў ненатуральна тоўсты, галава ягоная была насаджаная на цела, якое выглядала як тая доўбня, якой разбіваюць гнілыя караблі, і міргаў дробнымі блізка пасаджанымі вачыма. Другі твар выглядаў празмерна выцягнутым, з конскай сківіцай і выразам здзіўлення, які, хутчэй за ўсё, быў азнакай фізіяноміі, а не сведчыў пра тое, што той твар нечаму дзівіўся. Трэці твар быў дробны і амаль схаваны пад вялізным французскім берэтам. На зэдліку перад бочкай сядзела дзесяцігадовая дзяўчынка. Яна была прыгожая. Твар яе належаў некаму, хто не баіцца. І больш за ўсё на свеце хоча паказаць, што не баіцца.

Калі няхрышчанае, гэта значыць не тое, што яно было без душы, а што душа не была хрышчаная, сказаў Тоўсты. *Туркі няхрышчаныя, але кажуць, што і ў іх ёсць душа,* пацвердзіў Выцягнуты. *Не кажуць, а так і ёсць, маюць яны душу, як і ўсе іншыя,* абурыўся трэці. Ніка пацягнуў дым, і было відаць, што першыя двое нахмурыліся, а трэці надзьмуўся. *На чыім баку туркі?* спытаўся тоўсты з'едліва. *Нейтральныя. Як гаўно ў маладухі!* сказаў Выцягнуты. Галава пад берэтам не адгукнулася. Доўжылася чаканне, у якім Тоўсты гучна соп, Выцягнуты цмокаў языком, каб справакаваць адказ, дзед Ніка дыхаў, дзяўчынка пазнала б яго дыханне з соцень іншых. Яна наставіла вушы, каб пачуць, ці дыхае трэці, але адтуль, дзе ён сядзеў, не даходзіў ніякі гук. Яе забаўляла, што яго больш няма. А тады яна падумала, што яго і сапраўды няма. Памер, як Ліна. Проста перастаў дыхаць. Гэта можа стацца з кожным. Бо вайна. Дзед Ніка пацягнуў дым, але яна была недастаткова хуткая. Не паспела ўбачыць галавы пад берэтам.

Што мне да Турцыі. Я не маю спакою, бо не ведаю, што было з тым дзіцем. І куды трапіла ягоная душа. Гэта мая кроў, а вас хвалюе Турцыя, бо вашай крыві гэта не закранула, сказаў дзед Ніка. *Ну*

як не закранула…, хацеў нешта сказаць Выцягнуты. *Так не закранула. Інакш ты б не думаў пра Турцыю,* перапыніў яго дзед. Калі той яшчэ скажа хоць слова, ён выганіць яго прэч, і хай тады думае і робіць што хоча. А на двары дождж, падае і будзе падаць вечна. Або пакуль не скончыцца вайна.

У нейкі дзень дзед сказаў, што дождж гэта добра і што трэба маліцца, каб быў дождж і на заходнім фронце. Калі ідзе дождж, забіваюць толькі бомбы і кулі. Не забіваюць атруты. Кожная кропля ратуе чалавечае жыццё. Калі дождж будзе падаць дастаткова доўга, усе мы будзем уратаваныя. Калі пахне гарчыцай, паміраюць салдаты, сказаў адмірал Штэрк. Ён не сапраўдны адмірал, а звычайны гадзіннікавы майстар, але як пачалася вайна, розум у яго замгліўся, і ён пачаў называць сябе адміралам. Калі паверыш яму – направіць табе гадзіннік і перадасць надзейную інфармацыю з заходняга фронту. А калі пасмяешся з яго, калі скажаш – *Ёза, ты такі адмірал, як я святы Пётра!* як сказаў яму Анціша Бакунін, тады не будзе ні гадзінніка, ні навінаў з фронту. Ну ладна навіны, але што як не будзеш ведаць, каторая гадзіна? Пасля таго, як Андрыіца Чурлін і Бэка Альбі пайшлі на вайну, а Альбі Абінун уцёк ад вайны ў Амерыку, адмірал Штэрк застаўся адзіным гадзіншчыкам у горадзе. Дарэмна Бакунін перад ім выбачаўся, кланяўся да зямлі і прысягаў, што сам асабіста павысіць яго да фельдмаршала, майстар так і не згадзіўся направіць яму насценны гадзіннік! І цяпер Бакунін ні ўдзень, ні ўначы не ведае каторая гадзіна! *Хацеў паразбураць касцёлы, пазабіваць усіх, хто з галунамі – ад імператара да начальніка, адмяніць паліцыю, а цяпер во, паглядзіце – не ведае каторая гадзіна,* сварыўся дзед Ніка на Бакуніна і казаў, што невядома яшчэ хто з іх двух большы вар'ят, адмірал Штэрк ці Анціша Бакунін. Але ён слухаў уважліва інфармацыі з фронту, верыў і памятаў нават тое, чаго не разумеў. Вось, напрыклад, тое, што калі запахне гарчыцай, паміраюць салдаты. Дзяўчынка не ведала, што такое гарчыца, і не пыталася ў яго, бо думала, што пра такое трэба ведаць. А як не ведаеш, дык лепш пра гэта не казаць. Яна нюхала паветра і спадзявалася пазнаць пах гарчыцы, калі аднойчы перастане дождж. Яна будзе першая ведаць, калі пачнуць паміраць салдаты.

Няма большай сілы за Расію, сказаў Тоўсты, каб перапыніць непрыемнае маўчанне. *Гэтага мы не ведаем,* азваўся раптам жывы гаспадар берэта. У *Расіі сонца ўсходзіць два разы на дзень,* настойваў Тоўсты, *адзін раз на захадзе, другі на ўсходзе.* Хм, а іх вучылі ў школе, што на ўсходзе ўсходзіць, а на захадзе заходзіць! Яна чакала, што дзед Ніка яму пра гэта скажа. *Расія ад гэтага не сіла, а дурная краіна. Добра вядома, дзе ўсходзіць сонца,* задзірліва прамовіў Ажылы. *Ладна, калі ў нас ужо ўсе такія разумныя,* уздыхнуў Выцягнуты. Дзед Ніка яшчэ раз пацягнуў дым і кінуў цыгарку пад ногі. Яе не трэба было гасіць, бо вада прабралася ўжо і ў пограб і цыгарка згасла сама. Дзяўчынка ведала, што будзе далей. Дзеду хацелася б, каб тыя трое пайшлі, але ён не ведаў, як ім гэта сказаць. І гэтак было ўжо не адзін дзень. Прыйдуць, каб схавацца ад дажджу, а тады ніяк не адыходзяць. Яна нічога не ведала пра тых людзей, ні як іх завуць, ні куды яны адыходзілі. Але заўсёды на тым самым месцы, якраз перад іхнім вінным пограбам, яны раптам баяліся прамокнуць. І дзед запрашаў іх зайсці, частаваў разведзеным воцатам і чакаў, калі яны пойдуць. Яго цікавіла, што было з Лінавай душой, а тыя трое ўвесь час спрачаліся. Усё роўна аб чым. Але чаму менавіта ў іх пограбе, калі дзеда Ніку спрэчка не цікавіла? Ён заўсёды быў злы, калі яны ўрэшце адыходзілі. Ён таксама не ведаў, хто гэтыя людзі, а можа не ведаў і іх імёнаў. Дзяўчынка ў яго не пыталася, бо і не хацела ведаць, як іх завуць. Тыя людзі былі нетутэйшыя. Дзед казаў, што да вайны іх не бачыў. Папраўдзе, ён іх баяўся. Да таго, як яны ўпершыню схаваліся ад дажджу ў ягоным пограбе, дзед баяўся толькі Бога. Ён так казаў, і яна яму верыла. Ён мог іх выгнаць, але як і чаму? Ён казаў, што не ведае.

Яны пайшлі незадоўга да таго, як пачало змяркацца. І так кожны дзень. На шчасце, дні рабіліся ўсё карацейшыя. *Не дай Божа, калі яны аднойчы заначуюць,* казаў дзед маці. Яна ў кухні вывarвала бялізну, а бацька перабіраў цвікі пры цьмяным святле ад агню ў печцы. Браты, схаваныя ад позіркаў, сварыліся за дзве каменныя кулькі. *Не дай Божа, не дай Божа,* паўтараў ён і хадзіў з канца ў канец па пакоі. Ён або нешта шукаў, або намагаўся пра нешта ўспомніць. Апусцілася цемра, і цяпер усё жыццё ў хаце залежала ад яго. Важна,

каб чым раней мінула ягоная злосць, каб ніхто не сказаў яму грубага слова і каб браты не пабіліся. Тады ён будзе забаўляць іх, пакуль яны не заснуць.

Сотню сотняў гадоў таму, калі людзі яшчэ не ведалі, што вецер дзьме ў ветразі і што круцяцца колы ў возе, перш чым былі на свеце няхрышчаныя стварэнні, замест камянёў і скалаў усюды былі сасновыя лясы. А ў іх жылі русалкі і лесуны, і было іх больш, чым у свеце людзей. У тых лясох і птушак было болей, чым цяпер, а яшчэ мядзведзяў, ліс, ваўкоў і ўсялякіх стварэнняў, якіх нельга сабе і ўявіць. Усе былі лагодныя, ніхто нікога не крыўдзіў і ніхто нікому не рабіў зла. Адзінае, чаго ў тых лясох не было, дык гэта людзей. Калі нейкі доўбня наважваўся зайсці ў лес, маці плакала па ім, бо ён ніколі ўжо не вяртаўся дадому. Ні жывы, ні мёртвы, так што і ў Судны дзень ніхто б ягоную душу не расшукаў. Такі быў закон! І яго прыдумалі не людзі і не госпад Бог. Гэта быў закон лесуноў і русалак. Яны бераглі лес ад усяго чалавечага і божага, а вы зараз угадайце для каго! Не, не для д'ябла, бо было гэта сотню сотняў гадоў таму, калі д'ябла яшчэ не існавала. Русалкі і лесуны бераглі лес для звярэй, а звяры бераглі лес для іх. І так бы і засталося да канца свету, калі б не здарылася вось што: У рыбака Цыпаліча захварэла дачка, а ў тую дачку быў закаханы малады Лубінка. Хлопец быў разумны, як кніга, добры, як ціхае мора, і такі прыгожы, што ніхто б не мог сказаць, як што́ ён прыгожы. Калі нехта казаў, што нешта такое прыгожае, як Лубінка, усе смяяліся і называлі яго дурнем. Шукаў Лубінка леку для сваёй Сардэніцы, шукаў паўсюль ад Бокі да Трыеста, але нідзе не знаходзіў. Вылечыць яе можа толькі джунджур-боб, сказалі яму найлепшыя знахары. Ведаеце, што такое джунджур-боб? Не ведаеце! Ну дык даведаецеся ў канцы казкі. І Лубінка не ведаў, што такое джунджур-боб, і самі знахары не ведалі, і ніхто жывы, хто жыў ля мора сотню сотняў гадоў таму, не ведаў, што такое джунджур-боб. Але ведалі, што ёсць такія бабы па той бок густых русалчыных лясоў, што раслі там, дзе цяпер камяні і скалы. Дык той, хто захварэе на такую хваробу, што яму спатрэбіцца джунджур-боб, лічы што ўжо памёр. Але не думаў так прыгожы Лубінка, а сем разоў пацалаваў сваю Сардэніцу, каб ёй хапіла пацалункаў, пакуль ён не вернецца,

і пайшоў у лес, каб перайсці на другі бок, туды, дзе растуць чароўныя джунджур-бабы. Усе яго адгаворвалі, адгаворваў яго і стары Цыпаліч, казаў, што возьме яго за сына, калі ён застанецца, заклінаў яго даччынай прыгажосцю, але Лубінка не даў сябе адгаварыць. Калі на свеце ёсць джунджур-боб, я мушу па яго ісці – так ён сказаў і пайшоў праз лес. І як толькі зрабіў ён тры крокі, лес яго праглынуў. Калі б і хацеў, ён бы ўжо не мог вярнуцца. Такі парадак завялі русалкі. Хто аднойчы ўвойдзе, той ніколі не выйдзе. Ішоў ён так дзень, два, тры, сустракаў розных звяроў, мядзведзяў з заечымі вушамі, зайцоў з мядзведжымі галовамі, крылатых ваўкоў, якія жывяцца кедравымі арэшкамі, а замест вады п'юць смалу, але ніводзін звер яго не спалохаўся, бо русалкі дамовіліся так, каб у лес ніколі не ўвайшоў страх. На сёмы дзень прыйшоў Лубінка да палацу, які быў большы за горад і вышэйшы за неба. Вяршыні найвышэйшых вежаў былі такія высокія, што іх і арол не пераляціць. Палац быў збудаваны не з каменю, а з солі, і жылі ў ім русалкі і лесуны. Лубінка адразу гэта зразумеў, але не ведаў як. Проста так прыйшло ў галаву. Ён стаяў перад брамай, сэрца ў яго білася так, што ледзь не выскоквала, але ён успомніў пра сваю Сардэніцу і пастукаў. Ён і не моцна ўдарыў, але брама перад ім рассыпалася, як пясок, у чыстую белую соль, і раптам з'явілася прыгажуня з касою з чыстага золата, са станам, як кіпарыс, і крыламі з ветру. Гэта была Вар'я, каралева русалак. Што ты робіш тут, няшчасны? спыталася ў яго каралева. Іду на другі бок лесу па джунджур-боб! смела адказаў ёй Лубінка. Да другога боку яшчэ ніводзін чалавек не даходзіў, усміхнулася яму русалка. А ці даходзіў хоць адзін да твайго палацу? спытаўся Лубінка. Не, адказала яму каралева. Кожны па дарозе забіў нейкага ляснога звера або хаця б растаптаў мурашку. А тут такое правіла, што ты ў той самы момант ператворышся ў таго, каго ты забіў. Палова звярэй, якіх ты сустрэў, некалі былі людзьмі, сказала яму русалка і спыталася, нашто яму джунджур-боб. Трэба для леку. А хіба ты хворы? Не я хворы, а мая Сардэніца. І дзеля яе ты гатовы ператварыцца ў ляснога звера? дзівілася каралева. Калі б гэта дапамагло яе вылечыць, я б і ў пацука ператварыўся. Задумалася каралева, і было ёй прыкра. І як ёй яшчэ магло быць, калі на такога героя натрапіла. А ці твая

Сардэніца прыгажэйшая за мяне? спыталася яна. Як каму, адказаў Лубінка. Мне так! Але дзе ж бы бедная Сардэніца была прыгажэйшая за каралеву русалак! Каралева Вар'я за ўсіх жанчын на свеце была прыгажэйшая. Але бяда была ў тым, што Лубінка быў найпрыгажэйшы з усіх мужчын. Прыгажэйшы за ўсіх лесуноў разам узятых, і Вар'я ў яго закахалася! Давай так, кажа яна, я набяру табе джунджур-бобу, а ты аддасі мне сваё сэрца! Не магу я табе аддаць сэрца, бо маё сэрца замкнёнае, а ключы ад яго ў маёй Сардэніцы, кажа ёй Лубінка. Пра ключы ты не хвалюйся, сказала русалка, калі дасі мне сэрца, я яго сама адамкну. Пабачыў Лубінка што мае русалка чароўную моц, але ёсць у яе лек для Сардэніцы, і пагадзіўся. Тры дні чакаў ён перад саляным палацам, пакуль каралева прынясе джунджур-боб, а на чацверты дзень прыйшла Вар'я, усе ногі зраненыя, душа ледзь трымаецца, бо і ёй быў далёкі шлях да другога боку. Мілая русалка, дай мне джунджур-боб, адразу кажа ёй Лубінка, а яна сціснула нешта ў далоні і кажа: Не дам, спярша вырві тваё сэрца як заруку таго, што ты вернешся да мяне. Як жа мне яго вырваць, я ж не змагу жыць без сэрца? Зможаш, чаму б ты не змог, хто ў русалчыным лесе сэрца вырве, той і без сэрца пражыве, толькі любіць не зможа. Я табе яго вярну, як споўніш абяцанне, і будзем мы жыць шчаслівыя ў саляным палацы. Што ж рабіць Лубінку, вырваў ён сабе жывое сэрца, а русалка дала яму дзве каляровыя кулькі. Гэта джунджур-бабы, хай Сардэніца заплюшчыць вочы, скрыжуе сярэдні і ўказальны пальцы і правядзе імі па джунджур-бабах. Як толькі ёй здасца, што іх чатыры, а не два, яна будзе здаровая. А ты вернешся да мяне, бо ў мяне тваё сэрца. Вялікае няшчасце здарыцца з табою, калі не вернешся. Паабяцаў Лубінка каралеве Вар'і, але ў той самы момант ведаў, што абяцанне не споўніць. Калі ён прыйшоў дадому, Сардэніца ўжо ледзь дыхала, развіталася з бацькам і маці, гатовая легчы ў халодную магілу. Але як толькі правяла яна скрыжаванымі пальцамі па чароўных джунджур-бабах, вярнуліся да яе сіла і здароўе, скочыла яна з ложка і настала вялікае святкаванне. Сем дзён і сем начэй балявалі яны ад Бокі да Трыеста. Усе святкавалі, апрача Лубінкі і Сардэніцы. Калі дакранаўся ён да яе – нібы да дрэва дакранаўся, калі глядзеў на яе – нібы на нябожчыцу глядзеў, а калі хацеў пацалаваць

яе, Сардэніца адварочвалася. Ён быў для яе халодны, як лёд, і брыдкі, як жаба. Выглядаў як яе Лубінка, а быў чужы, як чорны арап. Яна не ведала, у чым бяда. А ён ведаў! Яны не былі ўжо прызначаны адно для аднаго, але сем дзён і сем начэй разам плакалі. Толькі гэта ім і засталося ад кахання – разам плакаць. За той час каралева русалак зразумела, што Лубінка не вернецца, што ён яе падмануў і што дарэмна трымае яна ў руках яго замкнёнае сэрца. Яна была няшчасная, яна была ў роспачы і была гатовая аддаць усё сваё каралеўства за ягонае каханне. Іншыя русалкі казалі ёй, што яна накліча бяду, лесуны цэлы дзень скакалі і спявалі вакол яе, спадзеючыся, што нехта з іх заваюе яе сэрца і гэтак уратуе каралеўства, але яна ні на воднага нават не паглядзела. Каралева ўзяла ключ, які адмыкае ўсе сэрцы, і сказала – калі ты не мой, дык не будзеш нічый! Сунула ключ у замок Лубінкавага сэрца, і як толькі яна гэта зрабіла, пачаў бурыцца саляны палац і пачаў сохнуць лес. На той жах ніхто не мог глядзець, і ўсе жывыя стварэнні на Зямлі заплюшчвалі вочы. Калі ўсе міргнулі сямнаццаць разоў, на месцы русалчынага лесу засталіся толькі камяні і скалы, а палац ператварыўся ў слуп солі высокі да неба. Бура знесла соль у мора, і ад таго часу мора салонае, а ўсе стварэнні ад таго часу міргаюць. Пачалі яны міргаць, бо не маглі бачыць, як гіне русалчына каралеўства. Калі на восьмы дзень Лубінка пайшоў у лес, каб прасіць у Вар'і вярнуць яму сэрца, не было ўжо болей ні лесу, ні русалак, ні дзіўных звяроў. Усё прапала, бо каралева ўчыніла зло, захацеўшы адамкнуць сэрца, якое належала іншай. Вось так прапаў лес над морам і так з'явіліся людзі без сэрца, а на свеце запанавала няшчасце.

Закончыў ён казку, як і заўсёды, у змроку і цішыні. Ніхто не задаваў пытанняў, і толькі хлопчыкі перадавалі адзін аднаму каменныя кулькі і кожны раз, калі праводзілі па іх скрыжаванымі пальцамі, ім здавалася, што іх чатыры. Гэта быў доказ таго, што дзед Ніка нічога не выдумаў і што сотню сотняў гадоў таму сапраўды існавалі джунджур-бабы, чароўны лек ад смяротных хваробаў. Дзяўчынцы такія доказы не былі патрэбныя. Яна верыла дзедавым казкам, бо мусіш верыць, што гэта праўда, калі яно такое страшнае. Казкі, у якіх усё канчаецца шчасліва, могуць быць і выдуманыя. А страшныя казкі праўдзівыя. Калі дзед некалі і хлусіў, то

сёння напэўна не. Дзяўчынка мерзла, хоць была накрытая тоўстымі пярынамі, паміж братамі, чые гарачыя целы спакойна даспяць да раніцы. Яна не спала і спрабавала пачуць біццё свайго сэрца, як яна яго чула, калі добра затыкала вушы або калі досыць доўга не дыхала. Але што б яна ні рабіла, цяпер яна не магла пачуць сваё сэрца. І яе напаткаў лёс прыгожага Лубінкі! Хто ведае, як і чаму! Яна нікога не падманула, нічога не схлусіла, і ўсё ж засталася без сэрца. Нешта ў гэтым свеце знікне, яна ўбачыць, калі развіднее. Дзяўчынка была перакананая і была ў роспачы. Браты спакойна спалі. З імі нічога не здарыцца.

Дождж падаў дваццаць восьмы дзень. Дайшлі чуткі, што паўсюль навокал апаўзаюць пласты зямлі і камення. Кажуць, што на Корчуле і Хвары ў мора адышлі цэлыя масліннікі і вінаграднікі разам з дамамі і каменнымі агароджамі. Людзі стаяць на беразе і глядзяць на свае дзялкі пад вадою. Нічога ім не застаецца, як толькі ператварыцца ў рыб і пачаць гадаваць водарасці. Ад раніцы да маці Каты прыходзяць жанчыны з суседства і кожная кажа тое самае. Як адышлі Корчула і Хвар, так і мы, калі працягнецца дождж, усе будзем пад вадою! Яны пералічаюць назвы зніклых астраўных сёлаў, шмат хто ў горадзе мае там родных. Пералічаюць імёны людзей. Робяць гэта так, нібы чытаюць школьны журнал, і ў вачах іхніх расце жах. Упершыню пра нейкае няшчасце гаворыцца без найменшага зларадства. Дзяўчынка перакананая, што яна ва ўсім гэтым мае нейкую ролю. Яна вінаватая за набліжэнне патопу. Жанчыны міргаюць, з вачэй у іх капаюць слёзы страху. І яна міргае. Увесь свет пачаў міргаць, калі прападаў русалчын лес. Гэтай раніцай міргаюць хутчэй і часцей. Ніхто не гаворыць пра вайну. Упершыню за апошнія два з паловай гады.

Вы звар'яцелі, дурныя бабы! крычыць дзед Ніка на жаночы гурт у хустках і махае рукамі ў паветры, нібы разганяе мух. *Якая з вас першая пачала румзаць, каб я ёй косці пералічыў! Адкуль вы што ведаеце пра Хвар і Корчулу, калі ўжо дзесяць дзён не выплыла ніводная лодка? Хто вам і як далажыў?* лютаваў дзед і ўрэшце задаў цалкам разумнае пытанне. Хто ім паведаміў, што масліннікі сплылі ў мора?

Як бы яны ні былі перапалоханыя, жанчын пакрыўдзіў ягоны

выбух. Ніхто ім асабліва нічога не паведамляў, але калі віруе цэлы горад, дык жа тады праўда. Не так ужо важна, як гэтая праўда пераплыла карчуланскую і пэлешацкую пратоку. Дрэнная вестка чуецца далёка, і які б дурань нешта дрэннае выдумляў і хлусіў? Яны накінулі на галовы свае чорныя фартухі і выйшлі на дождж. Калі б не мужыкі, менш няшчасця было б на свеце. Дзяўчынка была на іхнім баку. Дзеду сёння раніцай верыць нельга. Ён злуецца, бо ведае, што тыя трое зноў прыйдуць. Ён чакаў іх ужо ад самага прабуджэння і ніяк не мог прыдумаць, як іх прагнаць. Яшчэ адна цяжка зразумелая рэч. Магла ж маці прагнаць з парога вар'ята Фіргу, калі той прыходзіў прасіць хлеба, а яна не мае і паловы ягонай сілы, дык як жа дзед не можа прагнаць гэтых людзей? Толькі бацька і сёння спакойны. Перабірае свае цвікі і глыбока ўздыхае. Так дзед Ніка ўздыхае, калі прайграе ў брышкулу, але гэта здараецца раз на паўгода. А бацька кожныя дзве хвіліны прайграе ў брышкулу. Ён спакойны, але яму найцяжэй. Дзяўчынка крыху суцешылася. Калі бацька можа з сваімі ўздыхамі, тады можа і яна. Без сэрца.

Каля паўдня нехта пагрукаў у дзверы. Дзед закаціў вочы, на момант ад іх былі відаць толькі бялкі. *Малая, яны прыйшлі! Хадзем у пограб!* Дзяўчынка ўскочыла і пайшла да дзвярэй, гордая, што дзед заўсёды яе кліча, калі трэба ісці ў пограб. Братоў не кліча ніколі. Праўда, яны б і не пайшлі, але гэта няважна. Важна, што ён ніколі іх не кліча. Яны на гэта не прыдатныя! *Ооооо, гэта ты!* дзед быў узрадаваны. Пуйдзін Домінка нават адскочыў ад нечаканасці. Ён не спадзяваўся, што Ніка калі-небудзь так яго сустрэне. Яны былі аднагодкі, раслі разам і ў маладосці разам рыбачылі. Ва ўсякім разе – сябры, але можа й не такія, што засумавалі б, не пабачыўшыся два дні. *Гэта не яны, не ідзем у пограб!* радаваўся дзед. Пуйдзін Домінка абтрос плашч, нешта яму калола ў крыжы, і дзед у яго спытаўся, нашто той выходзіў з дому, калі яму нешта коле. Госць бліснуў вачыма, маўляў – маю нешта важнае, дзед разявіўся, маўляў – а што такое? Пуйдзін Домінка падняў бровы амаль на верх ілба, маўляў – строга сакрэтна. *Што?* прашаптаў дзед. *Ніхто не мусіць даведацца, інакш усё прапала,* сказаў Пуйдзін Домінка. *Едзе караван. Прыязджаюць перавознікі… Ды не можа быць!* здзівіўся дзед. Дзяўчынка нічога не

разумела. Маці выйшла з кухні, быццам ёй не спадабалася тое, што́ яна пачула. Бацька перастаў перабіраць цвікі. *Перавознікі!* здзіўлена паўтарыў ён. Не было аніякага сумневу, што едуць перавознікі і што гэтую сакрэтную інфармацыю трэба было трымаць пры сабе. Бо калі людзі дазнаюцца, усё прапала.

Яны запалілі па цыгарцы з мятай і тытунём. Прыйшлі добрыя весткі, дык не выпадае скнарнічаць і шкадаваць каму б то ні было, а тым болей сабе. Нейкі час яны смакавалі цыгаркі, а пасля дзед спытаўся: А *як мы даведаемся, што яны прыйшлі?* Пуйдзін Домінка ўсміхнуўся, нібыта ён адмірал Штэрк: *Я ўсё абладзіў. Яны мне паведамяць!*

Дзед у чаканні перавознікаў зусім забыўся пра нязваных гасцей. Дзяўчынка не забылася, але была шчаслівая, што забыўся ён. Ад таго дня, як пачаўся дождж, ім яшчэ не было так добра. Або нават ад пачатку вайны. Добрыя дні цяжка прыгадваюцца, калі ўсё пойдзе наўскасяк. А ўжо даўно ўсё пайшло наўскасяк і насуперак парадку, пра які кажуць і цар, і святар. Некаторым неба мусіць упасці на галаву, каб яны зразумелі, што нешта не так – для такіх усё пайшло наўскасяк, калі ў Сараеве забілі Фердынанда. Тады і Пуйдзінаму Домінку дайшло з задніцы ў галаву. Іншыя прадчувалі няшчасце яшчэ ў часы Балканскіх войнаў*, калі былыя васалы разарвалі на кавалкі тое, што некалі было турэцкім. Недзе тут зусім блізка пралівалася кроў за зямлю, а гэта ніколі не бывае добра. Няма зямлі, якая была б таго вартая, але яшчэ большая бяда ў тым, што пасля першай галавы, якая ўпала за зямлю, цана зямлі пачынае галавакружна расці і разам з тым высвятляецца, што кожная яе пядзя шукае новых гаспадароў. І тады кроў ужо ліецца да бясконцасці. Людзі мусілі ведаць, што пасля таго, як будзе пастаўлена пад пытанне тое, што турэцкае, тое самае будзе і з тым, што аўстрыйскае. Стамбул не меў сілы захаваць зямлю, ану паглядзім, ці мае сілу Вена! Таму ў Сараеве быў забіты Фердынанд, і так пачалася вялікая вайна. Людзі чакаюць, калі прыйдзе іх чарга страціць галаву, ежы ўсё меней, а разбойнікі і гайдукі зноў лютуюць на дарогах. Таму вестка пра тое, што едуць перавознікі, больш важная за той тавар, які яны вязуць. Яны пацвердзяць, што на свеце ўсё яшчэ існуе пара-

дак і справядлівасць і што паважаюцца законы зямлі, якія важнейшыя за дзяржаўныя. А часам здаецца – што важнейшыя і за Божыя. Перавознікі дакажуць, што яшчэ існуе адэт, старадаўні звычай! А адэт – адно з рэдкіх турэцкіх словаў, якое захавалася ў Далмацыі, нават у астраўлянскай гаворцы. Што і не дзіўна, бо як інакш сказаць, чым што перавознікі едуць паводле старасвецкага адэту.

Яны не сумняваліся, што гэта праўда, хоць ад апошніх караванаў прайшло гадоў пятнаццаць. Але ад таго часу, як выбухнула вайна, радзей пачалі хадзіць гандлёвыя караблі, а чыгунка больш прастойвала, чым працавала, загаварылі пра перавознікаў. Нехта быў у Сараеве і бачыў іх. Туркі зразумелі, што лепш гандляваць, чым ваяваць на чужую карысць, і актывізавалі ізмірскія кантакты, Аўстрыя разбіла Сербію, і зніклі перашкоды для кантрабанды, Сірыя мае лішкі сушанай бараніны і казляціны і плануе перакінуць іх на захад, бульба з Анатоліі, кукуруза і жыта невядома адкуль, спецыі, цукар, віно, ракія… Так фантазіравалі людзі, і ўсе фантазіі былі звязаныя з усходам. Туркі, арабы, неперасяжныя яўрэйскія гандляры, Дамаск і Багдад, таямніцы змяістага пісьма, якое паўзе справа налева, легенда пра Майсея, які перавёў народ праз пустыню, мячэці, павернутыя да ўсходу сонца, незразумелыя звычаі і традыцыі – усё гэта завалодвала думкамі хрысціянскага люду, які перад тым вагаўся паміж аўстрыйцамі і італьянцамі, а цяпер голад прымусіў яго паверыць, што ратунак прыйдзе з іншага боку свету, таго, які не адчувае паху гарчыцы, фасгену і дыфасгену і не ўдзельнічае ў гэтай нашай вайне, якая з кожным днём робіцца ўсё менш нашая. А дзеля таго, што пра ўсход нічога не было вядома, апрача таго, што адтуль ідуць караваны, так надзея на ратунак звялася да весткі пра перавознікаў.

Было вядома і якою дарогай яны маюць прыйсці. Той самай, якой хадзілі стагоддзямі. Туркі падгоняць тавар да Любовіі, дзе яго пяроймуць фачане. Перад Смрданскім вартавым пастом пад Баняй Кавілячай тавар перагружаецца, *у перавоз не ідуць без двух сотняў коней!* разумнічаў і перабольшваў Пуйдзін Домінка, фармуецца новы караван і паромам перапраўляецца праз Дрыну. Было б прасцей, каб туркі перайшлі на баснійскі бок і толькі тады перагрузіліся, але яны гэтага не робяць, не рабілі, і калі Баснія была іх. Ад гэ-

тай ракі гоняць іх злыя павер'і, пачаткі якіх сягаюць даўніх часоў, калі султан Мэхмэд Эль Фатых выправіўся заваёўваць Боснію*. Тады рака звалася Зялёнка, была яна набухлая вадою і ніхто апрача адважнай Куюнджычыхі, маткі трох братоў з Усціколіны, не наважыўся пераплыць паромам па султана. Тая жанчына, больш чым хто іншы, дапамагла Эль Фатыху заваяваць Боснію. Яна прыплыла па яго і ягонага каня, але жывёліна пасярод вады перапалохалася, упала ў раку і ўтапілася. На што султан ускрыкнуў: Бу су дэрын! Што па-турэцку значыць – гэтая вада глыбокая! Паводле слова Дэрын ад таго часу Зялёнка пачала звацца Дрынай, а памятаючы пра лёс султанавага каня, турэцкія перавознікі неахвотна праз яе перапраўляліся. Дык вось, пасля таго, як фачанскі караван каля Смрданскага паста пераходзіў раку – Пуйдзін Домінка ведаў пра гэта ўсё, а былі й такія, хто ведаў больш за яго і пераказваў далейшыя падрабязнасці – ён накіроўваўся да багатага сэмбэрскага мястэчка Яні. Там караван дагружаўся кукурузай і збожжам і ішоў далей паўз Дрыну, прабіраўся праз каньёны і высокія падрынскія горы і, калі Бог дасць, праз пяць начлегаў даязджаў да Дуброўніка.

Цяпер ім спатрэбіцца і дзесяць начлегаў, думаў дзед Ніка, *часы цяпер няпэўныя, і перавознікі мусяць быць асцярожныя.* Пуйдзін Домінка важна ківаў галавою. Бацька вярнуўся да сваіх цвікоў. Дзед відавочна раздумваў, ці скруціць яшчэ тры цыгаркі, але яму гэта падалося занадта марнатраўным. Усё ж невядома, колькі тавару прыйдзе з караванам і колькі што будзе каштаваць. Зразумеўшы, што з курэннем на сёння скончана, Пуйдзін Домінка зазбіраўся дадому. Паведаміць, як толькі даведаецца, што караван набліжаецца да гораду. Хай не хвалююцца, хутка ў доме будзе ўсё, чаго душа пажадае.

Прывіды відавочна чакалі, пакуль госць пойдзе, бо не паспеў яшчэ Пуйдзін Домінка спусціцца па сходах, як яны ўжо пагрукалі ў дзверы. *Памажы, суседзе, ратуй ад даджу!* крычала галава ў берэце. Зніякавелы, нібы ўжо зусім забыўшыся пра добрыя весткі, дзед накінуў сурдут, маці з дакорам паглядзела на яго і нічога не сказала. Як ты будзеш мужчыну, ды яшчэ роднаму тату, казаць такія рэчы? Дзяўчынка шмыгнула за ім. Яна старалася быць як мага больш не-

прыкметнай, бо была ўпэўненая, што маці аднойчы не пусціць яе з дзедам у пограб. Гэтым яна скажа яму, што не варта прымаць дома тых людзей.

Ён наліў разведзены воцат, і збан пайшоў па коле ад вуснаў да вуснаў. З вуліцы даходзіла яшчэ трошкі святла, і іх было відаць лепш, чым учора. Тоўсты быў нізенькі, з тонкімі кароткімі ручкамі. Было відаць, што ён ніколі ў жыцці нічога не рабіў. Выцягнуты быў выцягнуты не толькі ў твары. Ён быў як трыснёг, сагнуты ўверсе пад цяжарам галавы. Далоні ў яго былі вялікія, як лапаты, але ён не выглядаў небяспечным. Затое дробнагаловы з берэтам быў страшны. Ці ад несувымернасці галавы і цела, або таму, што цела ў яго сапраўды было вялізнае, дзяўчынцы ён здаваўся сёння ўтрая большым і дужэйшым за дзеда Ніку. Учора яна магла яго бачыць толькі пры агні ад цыгаркі, і ён не быў такі, не быў ён такі і заўчора, а тады яны прыйшлі каля паўдня, калі ўсё было добра відаць. Заўчора і Выцягнуты быў крыху ніжэйшы і таўсцейшы, а ў Тоўстага не былі такія малыя дзіцячыя ручкі… Яны кожны дзень мяняюцца, падумала яна. Дзед бязгучна адкрываў рот, як рыбіна, калі выцягнуць сеткі, бо хацеў загаварыць першы, але не ведаў што сказаць. Нельга прагаварыцца пра перавознікаў. А можа і ён бачыць, што тыя людзі то меншыя і слабейшыя, то большыя і злейшыя.

Кажаш, ксёндз цвердзіць, што ў малога не было душы, першым загаварыў Выцягнуты. *Эх, і не сорам яму,* ускочыў у размову Тоўсты. *Няма ў ксяндзоў сораму,* адазваўся монстр у берэце. *А ў ходжаў, дзякаваць Богу, ёсць,* сказаў Выцягнуты. *А што табе ходжы, ці яны ёсць у Дуброўніку?.. Ды нічога, я проста так кажу… Кіньце вы гэта, дык што там было з душою?* умяшаўся Тоўсты. Дзед і далей варушыў вуснамі і ніяк не мог загаварыць. *Ці б яны столькі мылі задніцы, калі б думалі пра душу?.. Ты пра каго? Зноў пра ходжаў?.. Ды не, дальбог! Як згадаю пра задніцу, табе адразу ходжы ў галаве… Перастаньце людзі, будзьце сур'ёзныя. У чалавека дзіця памерла, а ксёндз не хацеў яго пахаваць,* закрычаў Тоўсты. *Не трэба зараз пра гэта,* сказаў дзед. *Як не трэба!* абурыўся Выцягнуты, *табе што, сёння ўжо ўсё роўна?* Дзед не адказаў. У яго дрыжала ніжняя губа, быццам ён зараз заплача або моцна раззлаваны. Дзяўчынка спалохала-

ся. Сэрца ў яе білася, як шалёнае. Усё ж яно тут, падумала яна. Але страх не зменшыўся. *Як жа яму будзе ўсё роўна!* пляскаў сабе па каленях Тоўсты, *ён жа не жывёла, каб яму было ўсё роўна. А чалавек! Хрышчоны чалавек! Праўда, стары, ты ж хрышчоны чалавек?* Дзед маўчаў і глядзеў на мыскі чаравікаў. *Скажы, каб цябе трасца, ты хрышчоны чалавек? Бачыш, нічога не кажа! Зойдзеш да яго схавацца ад дажджу, а ён маўчыць. Лепей нам было б застацца на вуліцы. Было б лепей, так?* Тоўсты развёў рукамі, маўляў – не мае ўяўлення, а Монстр устаў і ходзіць па пограбе, амаль чапляючыся берэтам за бэлькі на столі. Ходзіць і вельмі нервуецца. А яшчэ больш стараецца паказаць, як ён нервуецца.

Ты, малая, ткнуў ён яе ў лоб указальным пальцам, *ці ты маеш душу?* Яна паглядзела на дзеда, але той нібы не заўважаў, што адбываецца. Склаўшы рукі і абапёршыся на калені, ён глядзеў, што робіцца ў гразі на падлозе. Монстр не аднімаў палец, тыркаў яе, каб адказала, а яна чакала дзеда. Вельмі доўга чакала. Прайшлі, можа, гадзіны, можа й дні, час, які няма чым змераць. І не дачакалася. Пра тое, што адбывалася далей, дзяўчынка забудзецца, і ўжо толькі таму быццам нічога і не здарылася. Прывіды доўга смяяліся, адзін за адным ляпалі дзеда па плячы, білі яго па спіне, быццам ён папярхнуўся, абдымалі яго і пляскалі па шчоках, а ён сядзеў у той самай позе, слёзы капалі са шчокаў і падалі на гразкую падлогу пограбу, там памалу збіралася малое возера. *Стары баіцца, што мы ў яго заначуем,* сказаў Выцягнуты перад адыходам. Быццам дзед гэтага не чуе.

У той вечар дзед Ніка не расказаў казкі. Маці сказала, што яму нядобра і таму ўсе мусяць сядзець ціха. Дзяўчынка ў водбліскаў полымя ад печы глядзела, як цвікі перапраўляюцца з адной скрыначкі ў другую. А тады агонь згас. Хлопчыкі біліся і валтузіліся пад пярынай, яна ведала, што больш ніколі не спусціцца з дзедам у пограб. І пажадала, каб перавознікі ніколі не прыйшлі. Або каб прыйшлі і не далі яму нічога. Дзед ляжаў у іншым пакоі і горка шкадаваў, што занадта стары для гэтай вайны. Калі б яго мабілізавалі з прызывам старэйшых узростаў, ён бы скончыў жыццё на Сочы, у Галіцыі, Албаніі, або на нейкім з сотняў палёў бітвы, дзе білася адважнае

імператарскае войска. Памер бы як чалавек, вываліў бы свае кішкі ў снег, гарчычны пах знёс бы яго да д'ябла, здарылася б нешта нармальнае і звычайнае. Як было з тысячамі іншых, так было б і з ім. Усё лёгка, калі ты не самотны, а адзін з многіх, і ўсё лёгка, калі родныя не ведаюць, з якога смутку і болю ты складзены.

На дваццаць дзявяты дзень дождж скончыўся. Невядома як і калі перастала ліць. Людзі на світанні павылазілі з хатаў, а дажджу больш не было. З боку мора неба пачало праясняцца, сям-там нават сонца прабівалася праз аблокі, па вуліцах разбегліся дзеці. Столькі дзён іх не пускалі з хаты, і ў іх назбіралася сілы, якую цяпер трэба было выпусціць. Яны ганялі па горадзе пацукоў, тых былі сотні, яны вылазілі з затопленых скляпоў і паграбоў, і калі нейкага лавілі, падкідалі яго нагою і крычалі: *Выраслі ў крысы крылы сакаліны!* Аднак пасярод гэтай дзіцячай сумятні адбывалася нешта яшчэ, што мусіла быць таямніцай. Хаваючыся адны ад адных, старыя людзі з кашамі, джутавымі мяхамі і ўсялякімі торбамі ішлі да Дуброўніцкай Рыекі. Калі сутыкаліся двое знаёмых, яны прыдумлялі найневерагоднейшую хлусню пра тое, куды ідуць з пустымі мяхамі і торбамі. Кожны спадзяваўся, што той другі ўсё ж не ведае, што едуць перавознікі, і кажа праўду, нібыта ідзе ў горы, бо забыўся там нешта да пачатку дажджоў. У кішэнях яны сціскалі дукат або два, заручальныя пярсцёнкі, медальёны з выявай Найсвяцейшае Панны, ланцужкі, завушніцы, ваенныя аблігацыі і самыя розныя грошы. Усё тое, што для перавознікаў магло б уяўляць нейкую каштоўнасць. Дзед Ніка і Пуйдзін Домінка былі адны з нямногіх, што ішлі разам.

А, ідзем паглядзець, ці ёсць дзе сухія дровы, сказаў Домінка адміралу Штэрку, які нёс на спіне лазовы кош як найменей удвая большы за яго. *Калі ён яго і пухам наб'е, дык да дому не дацягне,* шапнуў прыяцелю Ніка.

А я іду ў адміралітэт. Паведамілі, што прыйшло афіцэрскае жалаванне, пахваліўся Штэрк. *Можа і апошняе, бо мы прайграём вайну!* дадаў ён без страху, што яго маглі б пачуць непатрэбныя вушы.

Упершыню адмірал Штэрк згадаў пра магчымасць, што Аўстрыя прайгра́е вайну. Абодва адчулі сябе аднолькава няёмка. Гадзіншчык вар'ят, няма ніякага сумневу, але які б ён ні быў вар'ят, дагэ-

туль ён ніколі не гаварыў пра паразу. Што б гэта магло значыць? Лепш маўчаць і не наклікаць бяду, і яны пайшлі далей, кожны са сваімі змрочнымі прадчуваннямі, прыгнечаныя тым, што адмірал сапсаваў ім радасць ад чакання перавознікаў.

Месца збору было на Макошыцы, а не на дарозе ў Трэбіне. Магчыма, з меркаванняў канспірацыі, з асцярожнасці перад дарожнымі разбойнікамі. А перад Макошыцай было на што паглядзець! Рознымі сцежкамі, хаваючыся ад сяброў і суседзяў, у розны час, нехта яшчэ на досвітку, прыйшло туды некалькі соцень людзей. І ўсё йшлі і йшлі. Яны змрочна глядзелі адны на адных і толькі зрэдку нехта з некім вітаўся. Пад тыя позіркі і без словаў распадалася сяброўства і разрывалася кумаўство. Некаторыя, такіх было мала, весела балбаталі і паглядалі на гадзіннік, калі ж ужо прыйдзе той караван. Гэта былі тыя, што прыйшлі ў парах або нават малымі групамі: калі яны некага і раззлавалі, калі якому суседу схлусілі, куды ідуць, то прынамсі сваім блізкім сказалі праўду.

Дзед Ніка і Пуйдзін Домінка выбралі сабе добрае месца з выглядам на той бок, адкуль чакаўся караван, разаслалі мяхі і селі. Ніка дастаў падрыхтаваныя раней цыгаркі, яны закурылі і пачалі разглядаць людзей. Даўно ўжо не збіралася столькі людзей на адным месцы. Можа яшчэ ад 1914 года і таго тыдня пасля замаху, калі спярша смуткавалі па эрцгерцагу і яго цяжарнай жонцы, пасля ладзілі дэманстрацыі супраць Сербіі, а тады трошкі паграмілі сербскія майстэрні і крамкі.

Ніка не граміў, але Пуйдзін Домінка граміў! Ён разбіў вітрыну ў крамцы Свэты Стойніча, пра якога добра ведалі, на чыім ён баку, расійскі сцяг тырчаў у яго з задніцы, а Сербія заўсёды была ў яго пры сэрцы. Пазней Домінка шкадаваў. Не столькі таму, што разбіў Свэту вітрыну, бо калі б не ён, разбіў бы нехта іншы. Але ён зайшоў праз тую вітрыну, патаптаў люлькі і цыбукі, параскідваў мяхі з тытунём і надаваў гаспадару поўхаў. Гэтага ён сабе дараваць не мог. Ён уляпіў поўху мацнейшаму за сябе чалавеку, а той не бараніўся. Тады ён ударыў яшчэ раз і яшчэ раз. І яшчэ дзевяць разоў. Бога маліў, каб Свэта ўдарыў яго ў адказ. Або хоць бы ўхіліўся. Але не! Свэта стаіць, як Арланда, і не ўхіліцца, і не міргне вокам. Ён глядзеў

перад сабою, недзе паўзверх галавы Пуйдзінага Домінка, і толькі машынальна тузаўся пры кожным удары. Урэшце ён уцёк з Свэтавай крамкі і бег праз горад, быццам і ён серб і за ім гоняцца, а пасля доўгімі днямі не мог прыйсці ў сябе. Прайшла ў яго ахвота да ўсяго, што прывяло яго да Свэтавай крамкі. Ён хацеў толькі, каб ніколі больш Свэту Стойніча не сустрэць, бо не ведаў, як бы мог міма яго прайсці. Згарыць ад сораму, калі раптам апынецца перад ім, думаў ён. А чаму? Ды таму, што заўсёды прыстойна вітаўся з тым чалавекам і не замінала яму ні Свэтава сербскасць, ні Свэтава рускасць. Ён ніколі не думаў пра гэта як пра нешта, што б мусіла яго датычыць. Калі ўдавалася нешта зарабіць і трэба было пачаставацца дыхтоўным тытунём, ён ішоў да Свэты. Той запрашаў яго сесці і даваў яму панюхаць з пяці мяшэчкаў, дзе тытунь быў адзін лепшы за другі. Ніколі яго не падмануў, ніколі не ўзяў задорага. Дык як жа ён мог мець нешта супраць такога чалавека? Ніяк! Аж пакуль не забілі Фердынанда, і ў яго не паехаў розум, так што ён пайшоў біць вітрыну першай сербскай крамкі, якая яму патрапіцца, і збіць чалавека мацнейшага за сябе. Чалавека, які не адкажа яму, бо без ніякай віны апынуўся на вінаватым баку. Доўга мучыўся Пуйдзін Домінка праз выпадак з Свэтам Стойнічам, і не надта яму палегчала, калі праз два тыдні пасля таго ён пачуў, што той з сям'ёю выехаў у Сербію. Гэты свет не такі вялікі: раней ці пазней Пуйдзін Домінка недзе сустрэне Свэту і праваліцца перад ім скрозь зямлю. А калі і не сустрэне, дык ніколі не забудзецца, што́ здарылася пасля таго, як у Сараеве забілі Фердынанда. Можа, Свэта Стойніч некалі й забудзецца, але Пуйдзін Домінка пра свой сорам забыцца не зможа. Такі ўжо ён чалавек. Прыстойны і паганы, сказаў бы Ніка.

Ім было на руку, што сабралася столькі народу. Цэлы месяц людзі мала выходзілі з дому, а цяпер дождж нарэшце перастаў і зноў усе пацягнуліся да грамады. Праўда, што тут сабраліся не надта гаваркія, праўда, што некаторыя пераглядаюцца між сабою, як пеўні перад бойкай, праўда, што могуць і пазабівацца, калі тавару не хопіць на ўсіх, але ўсё роўна ўсім было неяк прыемна. Пасля доўгага задушлівага існавання між кухняй і пограбам, Ніка мог вольна дыхнуць на поўныя грудзі. Яму балела, што дзяўчынка раніцай на яго

нават не паглядзела. Змаўчала яна і калі ён сказаў, што прынясе нешта і для яе – перавознікі заўсёды мелі ў сябе слодычы для дзяцей, шаўковыя хусткі для жанчын, нейкі прыгожы цыбук, наргілу або нейкую іншую дробнасць. Яна рабіла выгляд, што не пачула або што ёй усё роўна. А ёй не ўсё роўна! Столькі разоў яна падлашчвалася і падмазвалася, каб ён прынёс ёй нешта з гораду. І ён заўсёды прыносіў, бо ведаў, што яна будзе рада. Даваў вялікія грошы за пару фінікаў, прыносіў ёй першыя спелыя гранаты, шпільку для валасоў, плюшавага зайца… А цяпер яна нават не глянула на яго! А яму было вельмі важна, каб яна паглядзела, каб узрадавалася яму, абняла яго і папрасіла ўзяць яе з сабой. Ці можа якраз таму і не паглядзела, што яму было важна. Яшчэ дзіця, а ўжо ведае, якімі карамі жанчыны караюць мужчынаў, якія іх любяць. Для Нікі Азінавіча гэта было нешта новае ў жыцці. Ягоная Бара ніколі не карала яго маўчаннем. Не паспела, бо зарана памерла, але ён быў пераканаы, што гэткіх ці падобных рэчаў яна рабіць не магла. Бара была для Нікі ўвасабленнем самога анёла, і таму ён больш не жаніўся.

А што калі малая мае праўду? Ён не паварушыўся, калі той ёлуп яе напалохаў, трымаў ёй палец на лбе і глядзеў на яе так, як паляўнічы глядзіць на медзведзяня, прымяраючыся, куды яму ўляпіць кулю, каб не папсаваць футра. Так, ён ведаў, што нічога не здарыцца і што трэба проста пачакаць, пакуль нязваныя госці не пойдуць, але дзяўчынка не ведала. А калі б і ведала, якая розніца! Яна хацела, каб ён яе абараніў. А замест гэтага пабачыла, як ён схіляе галаву перад сілай. Ён яе не абараніў, і што да яе, дык гэтага хапіла. Яна напэўна думае, што ёй тыя разбойнікі даравалі жыццё і што дзед не паварушыў бы і пальцам, калі б яны захацелі яе забіць.

Я іду дадому! устаў ён і ўзяўся за свой мех. Пуйдзін Домінка схапіў яго за руку: *Што з табой, можа я што не так сказаў?.. Не, але мне трэба дадому. Зараз жа!.. Ты здурнеў? Едзе караван. Тавару ўсякага. Што з табой?.. Нічога, але я пайду… А што скажаш дома? Што ты ім скажаш, калі будзеш карміць іх вотруб'ем, а іншыя, калі ўжо не зусім горкія беднякі, будуць есці тое, што прывязуць перавознікі?*

Ніка спыніўся. Стары казаў праўду. Не можа ён вярнуцца дадому з пустым мехам. Ён зрабіў нешта дрэннае, і не было б добра, каб

зараз зрабіў нешта яшчэ горшае. Але невыноснай была думка, што дзяўчынка цяпер думае тое, што яна напэўна думае, і што яна ім пагарджае.

Я пакрыўдзіў Рэгіну. Страшна, сказаў ён.

Каго пакрыўдзіў? не зразумеў Пуйдзін Домінка.

Малую сваю. Унучку, ад гэтых словаў вочы ў яго напоўніліся слязамі.

Пакінь дзіця ў спакоі, моцна трымаў ён Ніку за руку, *забудзецца, мала што там было.*

Пуйдзін Домінка пастараўся зрабіць, што мог. Ён сказаў тое, што не думаў, але верыў, што Ніка якраз гэта хацеў пачуць. Ён ніяк не мог зразумець, што́ гэты чалавек, ягоны прыяцель, робіць з сваім жыццём. І заўсёды рабіў. Замест таго, каб змірыцца са смерцю жонкі і знайсці другую, ён застаўся адзін. З дзецьмі размаўляе, як з дарослымі, засталося толькі яшчэ з птушкамі і козамі пачаць размаўляць на роўных…

Ніка зноў сеў на мех, а ў галаве ў яго круцілася думка, што́ ён зробіць, калі вернецца дадому. Скажа ёй, што дзеля яе ён бы… Не, нічога ёй не скажа. Сёння нічога. Калі яна нават не паглядзіць на яго і калі не возьме тое, што ён ёй прынясе, ён зробіць выгляд, быццам нічога не адбылося. Але заўтра! Ён тую тройцу сустрэне з сякерай – ці ўзяць у Домінкі паляўнічую стрэльбу? – і прагоніць іх з парога. Малая будзе гэта бачыць… Не! Рэгіна будзе гэта бачыць. Ад гэтага моманту ён больш не скажа ні малая, ні дзіця, ні дзяўчынка… Яна мае імя! Калі б ён думаў пра яе як пра Рэгіну, ён бы так сябе не павёў. Ці павёў бы? Цяпер гэта няважна. Важна, што ён з сякерай і стрэльбай прагоніць іх з парога! Аблае іх так, як нікога ніколі не лаяў. І скажа ім, чаму яны могуць увайсці толькі праз ягоны труп. Таму што закранулі тое, што для яго найдаражэйшае. Рэгіна яму даражэйшая, чым абедзве дачкі. Калі робішся бацькам, пачынаеш баяцца родных дзяцей, а калі робішся дзедам, ты найшчаслівейшы на свеце. Гэтага ён ім не скажа, але гэта трэба запомніць! Калі б ён так думаў, ніколі б не здарылася тое, што здарылася. А калі яны не дай божа нападуць на яго, ён будзе страляць! Таму лепш у Домінка ўзяць стрэльбу. З сякерай ніколі не можаш быў пэўны. Будзе страляць і заб'е іх! Ніводзін

суд на свеце яго за гэта не асудзіць. Калі нехта гвалтам урываецца да цябе ў дом, ты маеш права яго забіць! А што калі й ня маеш права? Калі трэба, ён сядзе і ў турму, але свайго больш не саступіць! Калі б ён і ўчора гэтак думаў, дык сёння б гэтак сябе не адчуваў. Лепш ужо легчы ў зямлю, чым каб так разрывалася душа. А ў яго проста душа разрываецца!

Яны сядзелі так ужо дзве гадзіны, а людзі ўсё прыходзілі і прыходзілі. Выглядала, што ўвесь Дуброўнік даведаўся пра перавознікаў. Пуйдзінага Домінку гэта ў нейкі момант пачало нерваваць. Дакладней, ён раззлаваўся, зразумеўшы, што ўсе, можа і адначасна з ім, даведаліся пад сакрэтам пра тую самую вестку. Эх, што ж мы за людзі, падумаў ён. Гонару менш, чым у найгоршай нехрысці! А цяпер яшчэ й гэты Ніка: ён раз-пораз на яго паглядае, спрабуе завязаць нейкую гутарку, а той адказвае коратка, відаць, што яго нічога не цікавіць, і далей углядаецца ў адну кропку, моршчыцца, як стары дуб – кожную хвіліну ў яго ўскоквае новая маршчына. Было бачна, што ён перажывае нейкія вялікія пакуты. І што найгоршае, Пуйдзін Домінка быў перакананы, што для тых пакутаў не было аніякае прычыны.

Туркі абрабавалі караван! У Трэбіні, каля Арсланагічавага моста, прабіваўся праз натоўп чалавечына ў канаўлянскім строі. *Няма нам іншай рады, як сабрацца і ісці ў горы!* хапаўся ён за пістолю – можа і двухсотгадовай даўніны – каб паказаць, што ён ужо сабраўся.

А што нам там рабіць? Калі яны абрабавалі перавознікаў, дык тады нічога ад тавару не засталося. Мне памірaць неахвота! Я не іду! абураўся Чара Недарэз.

Ну а я дальбог пайду! Каб у мяне ад турэцкага гвалту дзеці засталіся галодныя, чуўся іншы голас. Маса закалыхалася і пачала раздвойвацца, кожны рушыў у свой бок, сыпаліся лаянкі, даставалася і Богу і яго мацеры і турэцкаму дзіцяці ў матчыным улонні, а былі і такія, што проста апусцілі насы, пахапалі свае мяхі і кашы ды павярнулі дадому. *Ніхто адсюль не пойдзе!* выскачыў Канаўлянін наперад, размахваючы пістоляй. *Ану хто тут здраднік свайго роду! Вось гэтымі рукамі яго прыкончу!* закрычаў ён. Людзі адступіліся.

Ніка і Пуйдзін Домінка не далучыліся ні да адных, ні да другіх,

а адышлі ўбок і чакалі, пакуль пройдзе гнеў або здарыцца тое, што мусіць здарыцца. Тое, што раз'юшаная пяхота зараз вырушыць на Трэбіне, ім не здавалася асабліва верагодным. Калі й пойдуць, дык напаўдарозе астынуць.

Канаўлянін скакаў навокал, як шалёны, бегаў вакол натоўпу, як аўчар вакол статку, і збіраў аднадумцаў. Неўзабаве іх было ўжо сем, нібыта падабраных ад злога бацькі і яшчэ горшай маткі: адзін з вадзяной галавою – ніхто яго не ведаў, другі ў падраных нагавіцах і босы – той ня меў за душою нічога, апрача гатовасці да бою, тры гарадскія хлюсты з прыстойных дамоў – дэзерціры, што хаваліся ад вайсковых позваў, а зараз былі б не супраць пабіцца з туркамі, і яшчэ адзін, якога звалі Срэтан Казамара, сербскі расстрыга, які яшчэ ад часоў сараеўскага замаху ўмеў спрытна выбіраць зручны бок. Ішоў паліць сербскія хаты і граміць крамы, усё каб толькі нехта не запаліў ягоную. Срэтан пасля Канаўляніна быў самы жорсткі. Зрываў людзям шапкі з галоваў, цягаў нязгодных за вусы і гразіў кожнаму, хто выступаў супраць паходу на Трэбіне.

Сёмы ў гэтай дзіўнай кампаніі быў адмірал Штэрк. *Трэба раздзяліцца на стралкоў!* пацягнуў ён за рукаў Канаўляніна. І *прызначыць камандзіра, я тут найвышэйшы чынам!* насядала назольная муха на волата з пістоляй. Дзеля таго, што ён быў не з гораду і ня меў гадзінніка, які б мог сапсавацца, Канаўлянін не ведаў, хто гэты чалавек. Але ён яму адразу не спадабаўся. Гідкі гэты гарадскі звычай, калі цябе мацаюць, як нешта кажуць. І калі ўвесь час нешта ад цябе хочуць. Ён штурхануў адмірала Штэрка, але не моцна. Так, як мужчына штурхае іншага мужчыну, калі той яму замінае, але адмірал расцягнуўся на зямлі і, лежачы на спіне, пачаў крычаць: *Правакатар! Правакатар! Людзі, не верце яму.* А людзі адступаліся колькі маглі і колькі ім дазвалялі Канаўлянінавы паплечнікі.

Яны не ўмяшаліся, калі ён схапіў адмірала Штэрка за глотку і пачаў яго душыць і раўці, каб той замаўчаў. І калі адмірал не хацеў замаўчаць, а і далей вымаўляў незразумелыя, але відавочна непрыязныя словы. Не ўмяшаліся і калі адмірал Штэрк пачаў хрыпець. Ніхто не наважыўся сказаць Канаўляніну, каб той адпусціў яго, растлумачыць яму, што адмірал вар'ят, але ён наш і напраўляе

сапсаваныя гадзіннікі, пакуль адмірал не звяў у ягоных руках і не застаўся ляжаць на зямлі.

Глянь, усцаўся, свіння! засмяяўся коратка Срэтан Казамара і адразу спахмурнеў. Мабыць, чакаў, што і іншыя засмяюцца, але ўсе маўчалі.

Канаўлянін разгублена глядзеў на справу сваіх рук, на мёртвага чалавека, які ляжаў раскірэчаны і глытаў вылупленымі вачыма неба, якое за гэты час незаўважна для ўсіх праяснілася, і нехта спакойны і засяроджаны мог бы спытацца – што сінейшае? Вочы нябожчыка ці неба пасля дваццаці васьмі дзён дажджу?

Першая ахвяра на момант спыніла палкаводца і ягоных людзей. Не, ён не быў спалоханы тым, што некага толькі што забіў, ён дзівіўся ў думках, як лёгка вылецела душа з чалавека, які яму супраціўляўся. Гэта паказала, як мала ён быў варты і як мала па сутнасці быў жывы. Як мураш – выпадкова наступіш на яго, і больш яго няма. Або начны матылёк. Машынальна махнеш рукой, а ён ужо размазаўся па далоні. Канаўлянін не мог адчуваць сябе вінаватым. Ці ўчыніў ён нешта незвычайнае, нешта такое, чаго людзі не робяць іншым людзям? Не! Было б інакш, калі б ён яго зарэзаў або раскроіў галаву дзяржальнам пістолі. А гэта было б ужо занадта, калі чалавек не вінаваты! А гэты можа быў вінаваты, а можа й не быў. Д'ябал яго ведае. Бог размяркуе ягоную душу куды трэба. Або святы Пётра. Усё роўна. Канаўлянін не настолькі вучоны, каб разбірацца ў такіх рэчах.

Вы бачылі? Бачылі? Паглядзіце добра. І ты паглядзі. Ану выйдзі і паглядзі, ці будзеш бунтаваць, паглядзі, што бывае з бунтаўнікамі! зайшоў у натоўп людзей вадзяначны. А людзі глядзелі некуды ўбок, не хацелася ім мець справаў ні з вадзяначным, ні з Канаўлянінам, нічога яны не бачылі, нічога не чулі… І ніхто іх пасля не зможа абвінаваціць. Але мулялі ім дукаты ў кішэнях. Трэба было іх неяк схаваць, зашыць у падбіўку, пакласці пад язык, засунуць у задніцу, калі трэба, а не так легкадумна хадзіць з апошнім хатнім багаццем. Пакуль маўчыш, галаву не страціш. Але дукаты можаш! Раней ці пазней Канаўлянін падумае пра дукаты, і тады прапала. Караван не прыйшоў, перавознікаў няма, дом далёка…

Можа, пачакаем да раніцы? хітра спытаўся Чара Недасек, *калі сёння выйдзем на Трэбіне, да вечара не дойдзем. А і лепш было б узброіцца!*

Канаўляніну ў першы момант прапанова падалася разумнай. Трэбінцы сустрэнуць іх і парэжуць, як ягнятаў, калі яны выйдуць вось так. Але калі ён зараз распусціць войска, ён добра гэта ведаў, заўтра больш яго не збярэ. Гэта дубраўчане! Яны заўсёды ўмелі схавацца ад любой бітвы. Туркі сем разоў палілі ўсё ад Груды і Віталіны да Цаўтату і ўваходу ў горад, а гэтыя віталі іх з абдымкамі. Кілімы слалі ім па Страдуне, частавалі, падмазваліся і хвалілі. І так сем разоў! Ну але зараз дальбог так не будзе!

Добра, пачаў Канаўлянін, *такія мы да бою не гатовыя. Праўду кажаш. Таму зробім так: у каго дома ёсць стрэльба, кінжал або пістоля, хай ідзе і возьме. А ў каго няма, хай застаецца тут!*

Вядома ж, адразу выявілася, што ўсе маюць зброю і што горад узброены лепш, чым армія Франца Іосіфа. Ваяўнічыя і лютыя кінуліся ісці дадому, каб раннім ранкам вярнуцца ўзброенымі да зубоў. Толькі хай іх Канаўлянін адпусціць дадому. Сярод некалькіх соцень чалавек не знайшлося ніводнага, хто б не быў зараз здольны кінуцца ў бой з туркамі. *Два паляўнічыя карабіны маю!* цягнуўся да пераду Пуйдзін Домінка, каб Канаўлянін яго ўбачыў, а Срэтан Казамара запісаў у сваю кніжачку.

Але калі яны ўжо думалі, што так лёгка яго абдурылі, Канаўлянін зноў узяў слова: А *ўсе грошы і дукаты, якія ў вас ёсць пры сабе, пакіньце тут, яны будуць вам вернутыя, як толькі прыйдзеце са зброяй!* Маса раптам прыціхла, вочы зноў пачалі блукаць па баках, і больш нікому не хацелася дадому. Тыя, хто яшчэ хвіліну таму меў у пограбе цэлы арсенал, раптам не мелі больш ніякай іншай зброі апрача, ну можа, рыбацкіх восцяў. Срэтан Казамара хітра ўсміхаўся, ляпаў алоўкам па сваёй чорнай кніжачцы і чакаў, што вырашыць правадыр.

Яны спрабавалі яго падмануць, але пасля сямі турэцкіх наездаў Канаўлы таксама набраліся розуму. Не будзе больш турэцкіх пасядзелак у Дуброўніку на канаўлянскіх спінах! Ён ганарыўся сабою і сваім розумам і глядзеў на іх з вышыні. Так, як сокал глядзіць на зай-

ца, які скубе траўку і робіць выгляд, што яго няма. Думае заяц, што птушка сляпая пры здаровых вачах. Эх, халера, упіваўся Канаўлянін асалодай ад сваёй ролі, а тады зразумеў, што няма і нейкай асаблівай карысці з таго, што ён не даў сябе перамудрыць. Дубраўчане застануцца тут на ўсю ноч, але раніцай яму ўсё роўна не будзе з чым ісці на Трэбіне. Хто прынясе стрэльбы? Іх занадта шмат, каб вытрасці з іх дукаты і паслаць па зброю. Збунтуюцца, калі ён паспрабуе гэта зрабіць, яны хутчэй памруць, чым пакінуць яму на захаванне сваё майно. Гэта адзінае, чаго ў іх нельга адабраць. За гэта яны аддадуць сваё жыццё, у гэтым увесь іх гонар, уся адвага і пашана! Дубраўчанаў не цікавіць нічога апрача дукатаў і сваёй задніцы. Таму яны сюды і прыйшлі. Чакаюць, што туркі пашлюць ім сыр і шынку, каб яны размянілі дабро на дабро, каб гандлявалі і лізалі турэцкую задніцу, а тое, што туркі, прыходзячы або адыходзячы, папаляць усё хрышчонае разам з гарадской брамай, гэта дубраўчанаў не хвалюе. Погань і сарамата! Множацца між сабою, ваююць між сабою, плююць адны на адных і няма ім справы да свету, што застаецца па-за іх мурамі. Яны не пускаюць гэты свет усярэдзіну, калі ён не пакажа ім сілу або калі ён не турэцкай пароды. Тады яны пускаюць яго і вабяць чарамі, падлашчваюцца, гладзяць турка па задніцы, каб ён ужо больш і сам не ведаў, нашто прыйшоў. Глядзіць гэтак Канаўлянін на сваё войска, і ўсё яму неяк здаецца, што яму бліжэйшы турак, чым яны. Ён глядзеўся б з ім праз прыцэл, забіваў бы і быў забіты, ягоную галаву пранёс бы на канцы дзіды, а сельскія прыгажуні падалі б непрытомныя, як бы і турак Каняўлянінаву галаву ўмураваў у вежу на мяжы, каб папярэдзіць кожнага хрысціяніна, што перад ім свет, дзе ўладарыць паўмесяц з зоркай. Турак для яго нейкім дзіўным чынам брат, а гэтыя людзі, што сціскаюць дукаты ў потных далонях і пільнуюць, як бы ўцячы, яны яму ніхто. І хай ксёндз на нядзельнай імшы кажа сто разоў, што гэта не так, усё адно яны яму будуць ніхто. Страшна, калі правадыр зразумее, што ягоны люд яму не дастае нават да лытак.

І толькі над табарам пачало згушчацца сутонне, як пачуўся тупат коней. *Гэта яны!.. Перавознікі!.. Караван!* зашапталася маса. Канаўлянін уздрыгнуў – не можа ж быць, каб трэбінскія бэгі

прапусцілі тавар! – а ягоныя людзі неяк памалу адсунуліся ўбок. Або так толькі здалося. Срэтан Казамара засунуў кніжачку за пазуху. Сёння яна яму больш не спатрэбіцца. Але замест каравана з-за павароту з'явіліся толькі чатыры коннікі. *А дзе тавар?.. Няма тавару!.. Ну, гэта толькі пярэдняя варта!.. А гэты ёлуп нам кажа, што туркі абрабавалі караван!.. Маглі грэх на душу ўзяць!.. Ці ўжо відаць караван?..* Капелюшы ў коннікаў былі насунутыя на лоб, было відаць, што яны прыехалі здалёк, такіх капелюшоў – прынамсі як выглядала з такой адлегласці – Дуброўнік яшчэ не бачыў. *У мае часы яны насілі фескі,* сказаў Ніка. *Хе, і фачане цяпер не такія, як былі!* радаваўся Пуйдзін Домінка, што нарэшце ўсё ідзе як трэба. Радасць тая, аднак цягнулася нядоўга, акурат столькі, колькі спатрэбілася коннікам, каб пад'ехаць так блізка, што было відаць – гэтыя людзі пад капелюшамі не маюць твараў. Калі яны пад'ехалі яшчэ бліжэй, былі відаць толькі вочы ў проразях чорных каптуроў. Яны выглядалі як вестуны чумы з ілюмінаваных царкоўных манускрыптаў.

Сесці на зямлю! загадаў коннік на вараным кані. Ён заехаў у натоўп, каб напалохаць людзей, конь заіржаў і ўзняўся на дыбкі, зазвінелі падковы на каменні і бліснулі чатыры салдацкія стрэльбы з прымкнутымі штыхамі. Маса пападала на зямлю са стогнамі, уздыхамі і міжвольнымі зваротамі да Бога і Найсвяцейшай Панны. У полі схіленых людскіх галоваў знікла і Канаўлянінава гвардыя. Толькі ён і надалей стаяў, выпрастаны і разгублены, з пістоляй за поясам, развёўшы рукі, нібы гатовы злавіць парсюка, які бяжыць па двары. *А з табой што, Каралевіч Марка*, недачуў, ці што?* даехаў да яго атаман. *Хочаш, каб Джэрзелез Алія* цябе папрасіў або каб здзёр з цябе скуру? Сядай на зямлю, чуеш, што я кажу!* Калі б слёзы былі нечага вартыя, Канаўлянін бы ў той самы момант выплакаў усё сваё жыццё. Хлынуў бы ракою і знік у траве між каменя, каб яго больш ніколі не было. Ён імгненне павагаўся, хоць не ведаў паміж чым, а тады асцярожна, нібы ўнізе тырчалі іголкі, сеў у траву і назаўсёды знік з усіх гераічных легендаў.

Адбывалася гэта на другім баку паляны, таму Ніка можа і не чуў кожнае слова, але тое, што чуў, падалося яму знаёмым. Як і грубыя горскія боты з нявыраблена скуры, якія развальваліся на

коннікавых нагах. Гэты голас ён ужо некалі чуў, ён добра яго ведаў, занадта добра, каб памыліцца. Ён яшчэ трошкі схіліўся і згорбіўся, схаваў галаву між каленяў, каб быць як мага менш прыкметным. Дастаў з кішэні тры з чатырох дукатаў і вялікім пальцам зацiснуў іх у зямлю. Пуйдзін Домінка дрыжаў побач з ім і зіркаў вакол сябе, быццам збіраўся ўскочыць і кінуцца ўцякаць. Панавала магільная ціша. Яе парушалі толькі нечыя ўсхліпы.

Двое на гнедых безупынна аб'язджалі кругам вакол масы, а чацверты, той, які даехаў апошні і быў відавочна найменш звыклы да коней, спрабаваў злезці з вялізнай белай кабылы. Але яна кожны раз зрушвалася з месца, і ён зноў не наважваўся. *Ды скачы ты ўжо, не на дзеўку ж скачаш!* кінуў яму, праязджаючы міма, вершнік на гнедым, на што гэты проста зваліўся з кабылы і бухнуўся на зямлю, як цяля, адчэпленае з мясніцкага крука. Капялюш зляцеў у яго з галавы і ледзь не ўпаў каптур. Пачуўся нейчы рогат, але чалавек хутка ўскочыў, і было відаць, што ён нездарова тоўсты. Ён насунуў капялюш і прамовіў: *Слухайце мяне добра, калі хочаце захаваць галовы на плячах. Вашы галовы, не нашы! Па адным будзеце падыходзіць сюды, вытрасаць усё з кішэняў у гэты мех, адыходзіць на другі бок і там зноў сядаць. Зразумелі? Каб пасля не было, што нехта не зразумеў, бо каго зловім са схаваным золатам або грашмі, той атрымае кулю ў лоб! Ясна?* З усіх бакоў у адзін момант пачуўся плач, стогны, крыкі, адначасныя праклёны і мальба, гоман і выццё – какафонія, якую, мабыць, можна пачуць толькі каля ніжняй брамы чыстца. Верхавод пальнуў у паветра, вараны падскочыў, відавочна не звыклы да стралянiны. *Паварушыце мазгамі, людзі! Мы прапануем вам жывымі і здаровымі вярнуцца да жонак і дзяцей!*

Ніхто не хацеў быць першы. Усе штурхаліся між сабою, тыя, што ззаду, па-здрадніцку пхалі нагамі ў спіны тых, што спераду, пакуль скарбнік не ўхапіў першага за каўнер і не пацягнуў да сябе. *Не трэба, калі табе Бог мілы!* крычаў няшчасны Сцепа Машклініца, шавец, бацька дванаццаці дзяцей, адзін з тых рэдкіх багабойных людзей, якія двойчы на дзень ходзяць на імшу і даюць міласціну нават калі не маюць чаго есці. *Э, памыліўся ты браце, ніякі Бог мне не мілы,* адказаў яму тоўсты скарбнік і расчыніў мех. Сцепа паглядзеў на

яго больш-менш так, як святы Сэбастыян глядзеў на гурт лучнікаў, засунуў руку ў кішэню і выцягнуў адтуль акуратна складзеную белую хустачку. У ёй быў дукат з Напалеонавым аблiччам. Сцепа пацалаваў дукат і апусціў яго ў мех. Тоўсты зарагатаў: І *ўсе гэтыя прыкіданні былі, каб мяне падмануць?* Шавец мусіў скінуць сурдут, тоўсты добра яго пратрос і адарваў мізэрную падшыўку, але нічога не знайшоў. Зашпурнуў сурдут у натоўп. Пасля Сцепа мусіў скінуць і нагавіцы, пасля разуцца і ўрэшце разматаць анучы са ступакоў. Тоўсты ўсё добра перагледзеў і закінуў у масу людзей, але нічога не знайшоў. З *адным-адзінюткім дукатам ты збіраўся сустракаць перавознікаў?* Басаногі, у адной кашулі, якая ледзь прыкрывала сорам, стаяў Сцепа Машклініца і амаль што адчуваў сябе вінаватым. Яго захапіла тое самае, што захапіла і іншых, тое самае жаданне і прага па нечым дыхтоўным. Бедны Сцепа нават не ведаў, што б ён купіў у перавознікаў. Ён пайшоў, як і ўсе, хаваўся, як і ўсе, і хлусіў кожнаму пра тое, куды ідзе. Ён сеў голым азадкам на траву і спрабаваў прыкрыцца крысом кашулі.

Тоўсты выбраў з масы наступнага. Той быў крыху багацейшы, але спрабаваў схаваць два пярсцёнкі ў шкарпэтцы, і ў пакаранне атрымаў прыкла́дам па галаве. Адзін раз, і пачуўся толькі ўскрык, а пасля і другі. Тады ўжо лопнуў лоб, пацякла кроў, і людзі пабачылі, што тут жартаў не будзе.

Наступны, які паспрабуе падмануць, будзе збіраць свае мазгі па ўсім лузе! крыкнуў верхавод, які сядзеў на сваім вараным крыху наводдаль і адначасна глядзеў за масай і за тым, што робіць скарбнік.

Ніка пазнаў траіх з чацвярых разбойнікаў. Дробнагаловы з берэтам – гэта атаман на вараным, выцягнуты з конскай сківіцай ездзіць вакол на гнедым, а тоўстагаловы, які ў пограбе выглядаў галоўным, рабуе людзей. Чацверты коннік яго не цікавіў, але ён бы й не мог яго пазнаць, бо той яшчэ не прамовіў ні слова і наогул нічым сябе не выдаў. Ніка і цяпер не разумеў, у чым быў сэнс іх штодзённых адведзінаў. Яны сядзелі гадзінамі ў ягоным пограбе, і гэта мусіла мець нейкую сувязь з тым, што цяпер адбываецца. Ці яны спрабавалі нечага ў яго даведацца? Калі і так, ён гэтага не заўважыў. Ён быў легкадумны і напалоханы, думаў, што мусіць іх перацярпець, пакуль яны

не адыдуць. І яны адыходзілі, але вярталіся зноў. І ён бы іх пражыў і выкінуў з галавы, калі б учора не здарылася тое… Ён падумаў пра Рэгіну, якая цяпер гуляе пад кухонным сталом, пакуль Ката замешвае хлеб з вотруб'я. Пад тым сталом стаіць яе дом, які яна чысціць і парадкуе, глядзіць за дзецьмі, сустракае мужа, калі ён вяртаецца з працы, і завязвае дзеду чаравікі, бо яму цяжка нахіляцца. Гэтага Ніка не разумеў. Чаму дзеду ў яе фантазіі цяжка нахіляцца, і нехта мусіць яму завязваць чаравікі? Усё іншае ў Рэгініным доме перамалявана з ягонага дома. Розніца толькі ў тым, што дзед пад сталом слабы і нямоглы. Калі ён яшчэ там. Калі Рэгіна сёння не выкінула яго з свайго дома.

Час ішоў, і бандыты ўсё больш нервавaліся. Яны спяшаліся, бо неўзабаве настане вечар і нечая шалёная жонка можа ўзняць паліцыю на пошукі мужа. Або пачнуць прыходзіць самі жонкі, узачнецца крык і віск, аднекуль з'явіцца войска і хто ведае, што́ тады будзе. Да тоўстага ў рабаванні і ператрасанні рэчаў далучыўся той чацверты. Ён біў людзей, зрываў з іх адзенне, але і надалей не прамаўляў ні слова. Ніка падумаў, што гэта нехта з гораду, хто мае прычыны баяцца, каб яго не пазналі. Саскочыўшы з каня, ён найперш накрыў мёртваму адміралу Штэрку твар анучай. Значыць, ён яго ведаў.

Тыя, чыя чарга дайшла пазней, маглі без лішняй рызыкі схаваць які дукат або пярсцёнак, бо ўжо не было часу на грунтоўны ператрус кішэняў. Чара Недарэз хацеў гэтым скарыстацца, працягнуў тоўстаму дукат і пярсцёнак з сінім каменем, што таго, магчыма, і задаволіла б, але не ягонага калегу. Той нешта шапнуў тоўстаму на вуха, бедны Чара мусіў раздзецца, і ў яго па кішэнях і ў шкарпэтках знайшлі яшчэ чатыры дукаты, два ланцужкі і сем пярсцёнкаў. Ён дрыжаў ад страху і холаду, пакуль у цемры меха знікалі адна за адной залатыя манеты.

За гэта ты заслужыў, каб мы забілі цябе дакладна трынаццаць разоў, сказаў тоўсты. У гэты момант маўчун зняў з пляча стрэльбу і спрытным рухам, нібы зграбае сена, загнаў штых Чару ў жывот. Чалавек застагнаў і сагнуўся, а маўчун пракалоў яго пад лапаткай. Ён прабіў яго роўна трынаццаць разоў, калі Чара Недарэз ужо ляжаў

ня зямлі. Пасля гэтага справа пайшла значна хутчэй, людзі кідалі ў мех усё, што мелі, у тоўстага дрыжаў голас, ён больш не пагражаў і, здавалася, хацеў, каб усё гэта хутчэй скончылася.

З заходам сонца Ката ўжо амаль звар'яцела ад трывогі. Дзед Ніка не вяртаўся, хлопчыкі дурэлі па хаце, дзяўчынка не вылазіла з-пад стала і не падавала голасу, а Рафа ўсё больш нервова корпаўся ў цвіках, уздыхаў як пугач і ўвесь час паціху падпердваў. Яна б зараз магла яго забіць! Замест таго, каб пайсці насустрач старому і дапамагчы яму данесці дадому тавар, ён тут сабе забаўляецца і заадно дрэсіруе задніцу. Усе ў доме пярдзяць гучна, і толькі ён адзін баіцца. Думае, што пердне ціха, але памыліцца і так заскуголіць задніцай, што і дзеці засмяюцца. Замест таго, каб перднуць, як чалавек. Але гэта хай сабе. Вось што з дзедам Нікам? Дзе Ангеліна? Яна таксама не пойдзе яго шукаць, а будзе толькі сноўдацца навокал цэлы дзень. Так Ката спрачалася сама з сабой, а тады кінула незамешаны хлеб, абулася і выбегла з хаты. Стала пры верху сходаў і не ведала, куды падацца, каб неяк не разысціся з дзедам. Пасля перадумала і вярнулася дадому. Хлопчыкі якраз пачалі біцца, і Рафа спрабаваў іх разняць. *Каб вас чорт, каб вас чорт…*, стараўся ён, але нічога не выходзіла, і ён вярнуўся на свой зэдлік. Ката прыгразіла, што возьме Нікаў бізун і ўсіх адлупцуе, калі ў некага пацячэ з носа кроў. На шчасце, кроў не пацякла, і хлопчыкі супакоіліся самі па сабе.

Рэгіна пад сталом хавала дзеда. Ён памёр ад пашырэння венаў і туберкулёзу. Яна падрыхтавала яму труну – трэснутыя старыя начовачкі, зрабіла крыж з паламанай мяшалкі і ціха праз нос напявала імшу. Яна ніколі не чула памінальнай імшы і таго, што святар кажа на пахаванні, таму прыдумляла сама. *Дзед падох, бо ад яго не было карысці,* гугнявіў святар. *Ён быў добры, рэзаў свіней, злітуйся над ім, Ісусе і Марыяааа, і* крапіў з чаркі на ўсе чатыры бакі. *Гаўно людское, пізда каровіна, кішкі кацячыя, курва, кароста, сліна і крыж святы, злітуйся над ііііім,* шчыраваў далей ён, так захапіўшыся, што забыўся, што яго могуць пачуць іншыя. *Дзед падох, усім святым у Ісусе, палілася дрыстачка, гаўно, пярдзёж, кароста і сліна,* складала рукі дзяўчынка, а з яе ўжо амаль крычаў нязвыклы святар. *Дай Бог, каб яго чэрві елі, у імя айца і сына і святога духаааааа, аа-*

аааааман! Калі яна апускала начовачкі ва ўяўную магілу, яна адчула, як распаленыя абцугі вырываюць ёй вуха. Яна здзівілася і спалохалася. *Ты зусім здурнела?* вочы ў маці наліліся крывёю, здавалася, зараз яна яе праглыне. Нават і бацька быў зноў на нагах. *Да д'ябла і цябе і твае бабскія гульні!* сказаў ён самае рэзкае з усяго, што ведаў. Ёй захацелася паўпарціцца, кінуцца на падлогу і біцца аб яе рукамі і нагамі, пакуль яны на каленях не папросяць яе перастаць, але маці не адпускала вуха, а сціскала яго ўсё мацней. У дзяўчынкі самі сабою пацяклі слёзы. Ёй балела і пякло, але што найгоршае: яна ведала, што не зрабіла нічога дрэннага, але ніхто б ёй не паверыў. У сваім доме яна хавала свайго дзеда. Пра іхняга яна і не думала. Іхны дзед перастаў існаваць пасля таго, як той чалавек хацеў пальцам забраць у яе душу. Або зрабіў нешта іншае, гэта ўжо няважна. Іхны дзед яе не абараніў, таму святар не будзе служыць па ім імшу. Яе святар! Няма імшы для тых, у каго няма душы.

Ужо сцямнела, а рабаўнікам засталося яшчэ дзясяткі тры неабабраных ахвяраў. На другім баку паляны, дзе сядзелі абрабаваныя, ужо адчувалася, як сувымерна страце майна расце адвага натоўпу. Нехта ўжо гучна лаяўся, *ёб тры вашы мацеры!* чуліся пагрозы, *знайду, дзе б вы ні схаваліся, і кішкі вам на кій намотаю!..* Людзі варушыліся, і не было ясна, ці які з іх ужо не ўцёк і неўзабаве не прыйдзе з аблавай. Тоўсты скарбнік ужо некалькі разоў упрошваў верхавода ўсё кінуць, мех ужо быў дастаткова поўны, хопіць ужо наравіцца, але маўчун не згаджаўся. Яму быў важны і самы апошні пазалочаны пярсцёнак. Ён раздаваў людзям поўхі, рваў ім кашулі і нагавіцы, чуліся кухталі, аплявухі, ускрыкі, але ад яго ні гуку.

Гэты напэўна нямы, але дзіўна, што не глухі, ён чуе, што тыя яму кажуць, не разумеў Пуйдзін Домінка.

Або нямы, або наш, змрочна адказаў Ніка. *Тыя астатнія не нашы!.. Адкуль ты ведаеш?.. Ды так, ведаю,* яму не хацелася тлумачыць, дый як бы ён растлумачыў тое, што з гэтымі людзьмі за апошнія дні выпіў тры літры воцату і правёў больш часу, чым з роднымі дзецьмі.

Але не можа гэта скончыцца вось так! Ён не ведаў, як можа, але быў перакананы, што вось так не можа. Ну ладна дукат – ён і так

ужо тры ўклаў у зямлю, як у святочны пірог – ладна пярсцёнак нябожчыцы жонкі, ён мусіў кінуць яго ёй у магілу, але яму не далі, сказалі, што золата можа спатрэбіцца жывым, ладна поўхі, якія яго яшчэ чакаюць. Калі ўжо паказаў сябе аслом, дык ён не большы асёл за тых, што таксама паказалі сябе асламі. Як будзе з іншымі, так будзе і з ім. Нічым ён не лепшы і не разумнейшы за ўсіх гэтых людзей. Але тая тройца яму найперш цэлымі днямі дакучала, а пасля здзекавалася і абражала. І на ім набіраліся яны смеласці на тое, што цяпер робяць. І дальбог набраліся! Палец на Рэгініным ілбе быў як палец Божы. Ён не наважыўся паўстаць супраць яго.

Ніка Азінавіч ніколі не быў героем. Ён жыў дакладна так, як яго выхавалі ў дзяцінстве. Яму казалі: нельга красці, нельга лаяцца, нельга забіваць, нельга падманваць. А трэба цярпліва чакаць сваёй чаргі, паважаць людскія і нябесныя законы, дбайна працаваць, і жыццё табе ўсё гэта верне. Іншым бацькі казалі тое самае, як і іх дзеці будуць казаць гэта сваім дзецям, і дзецям сваіх дзяцей пакуль існуе свет, людзі і дзеці. Але мала такіх, хто будзе гэтага прытрымлівацца ў жыцці і будзе дакладна такі, як казала бацькоўская навука. Ніка, на ягоны жаль, быў адзін з такіх. Усе скажуць – баязлівец, але ён не быў баязліўцам, проста яго навучылі, што сілай і лаянкай нічога не даможашся. Сотню сотняў разоў ён мог на ўласныя вочы ўпэўніцца, што гэта хлусня і што гвалтаўнікі ў жыцці заўсёды маюцца лепей, але не можа чалавек проста так змяніцца і з аднаго ператварыцца ў нешта іншае. Як злодзея ні біццё, ні турма не адвучаць красці, так і сапраўднага прыстойнага чалавека свае ўласныя вочы не пераканаюць, што ён не маецца добра. Калі цябе крыўдзяць, сыдзі ім з дарогі! Ён трымаўся гэтага, бо думаў, што так лепей, але яшчэ і таму, што так яму было лягчэй. Тое, што яму дасталася ў спадчыну, ён перадасць і сваім дзецям. Нічога ён не прапіў і ў карты не прайграў, але нічога і не зарабіў. Вінагароду ён меў аж да апошняга куста столькі, колькі яму пакінуў бацька. Ён жыў у бацькавым доме і гадамі лапіў бацькаву лодачку, пакуль яна зусім не раскрышылася. Тады сам справіў новую. Такі лад жыцця наўрад ці мог прынесці яму нешта большае. Так было ў Нікавы часы, і хто ведае, ці калі-небудзь магло быць інакш. Калі й так, дык тых часоў ніхто не памятае.

Але няправільна было б казаць і думаць, што прыстойныя людзі маюцца горш. Ім добра, бо яны могуць так пражыць жыццё. Як забойцу лёгка зарэзаць чалавека, так лёгка і тым, хто гэтага ніколі не зробіць. Аднак цяжка, калі лёс памяняе ролі і ад чалавека больш нічога не залежыць.

Ён стаяў, развёўшы рукі, пакуль маўчун рыўся ў яго ў кішэнях. Тоўсты трымаў раскрыты мех і глядзеў яму проста ў вочы. Можа, правяраў, ці Ніка пазнаў яго, а калі і так, то хутка перастаў. Як жа ж ён яго не пазнаў бы.

Я думаў, што ты разумнейшы! сказаў ён са шкадаваннем у голасе. *Ты не пусціў нас у дом, бо баяўся, каб мы ў цябе што не скралі, а тут паверыў, што едуць перавознікі. Ды Божа ж ты мой, якія перавознікі! Мы думалі, што абчысцім пяць дурняў, а тут прыйшло паўгорада! Ну хай сабе яны, а ты чаго?*

Ніка маўчаў, але шукаў спосабу неяк паказаць яму, што ён не баіцца. Ён думаў, што тоўсты гэта зразумее, калі далей будзе глядзець яму ў вочы, але тоўстаму было ўсё роўна. Было добра відаць, што яму ўсё роўна. Калі ён гаварыў, ён зноў пачаў кружыць позіркам па паляне, баючыся, што там магло нешта здарыцца або што прыедзе аблава.

У гэты момант пад'ехаў атаман на вараным: *О, каго я бачу! Кумок наш дарагі! Воцату не знойдзецца, кумочку? А дзе ж тваё дзіцятка? Я вось золата набраў, самая пара шукаць нявесту, дык я ўжо падумаў…*

Вершнік не паспеў скончыць фразу, як Ніка вырваўся ад маўчуна, схапіўся за стрэльбу ў яго на спіне, рвануў яе, рэмень лопнуў, маўчун расцягнуўся на зямлі, з яго зляцеў капялюш, сярод людзей узняўся гоман. Ніка Азінавіч накіраваў стрэльбу на чалавека, які пакрыўдзіў Рэгіну, і без лішняга роздуму пацягнуў за спуск. Але перш чым пачуўся пусты ляск спускавога кручка, метал штыха ўпіўся яму між рэбраў. Ён упаў з ясным і чыстым адчуваннем канчатковага жыццёвага падману. Тоўсты выпусціў з рук стрэльбу – штых застаўся тырчаць у Ніку – і пабег да свайго каня. Але было позна. Пасля таго, як першая ахвяра адкрыта ўзбунтавалася, астатнія паўскоквалі на ногі і кінуліся на дзікі штурм.

Маса людзей у адно імгненне праглынула дваіх рабаўнікоў, таго, які першы хацеў уцячы, і таго, які хацеў застацца да канца. Помста была кароткая, бо было занадта шмат ахвочых адпомсціць. Ламаліся пальцы на нагах ад удараў у паўмёртвыя целы, грубыя сялянскія пяты праломвалі скроні, пазногаць нечага пальца застаўся ў ноздры, кулакі патаналі ў глыбокім зыбкім сале, нехта ўспомніў і схапіў стрэльбу, каваны прыкла́д прабіў чэрап, пырснулі мазгі і ператварыліся ў памыі, якімі кормяць убогіх ваенных свінняў. Усё гэта працягвалася не даўжэй за дзве хвіліны. Тады натоўп як па камандзе спыніўся.

Не забівайце, трэба іх судзіць! выпаліў нехта, можа, каб зняць з сябе адказнасць. *Гатова, памерлі,* сказаў іншы.

Тоўсты разбойнік ляжаў з размажджэранай галавой, на якой цэлым і пазнавальным засталося толькі адно шырока расплюшчанае чорнае вока, аздобленае доўгімі дзявочымі вейкамі. Калі прыгледзецца да яго, можна было падумаць, што гэта вока найдабрэйшага чалавека, які і мураша не затопча, а калі й мае нейкія грахі, дык яны маглі б датычыць залішняй пяшчоты да хлопчыкаў. Аднак калі ў тоўстага каптур быў сарваны з галавы, другі разбойнік застаўся схаваны. Нехта мусіў яго адкрыць, але з нейкай прычыны людзі пачалі разгублена аднеквацца, адступаць ад целаў і хавацца ў натоўпе. Неўзабаве ўжо ніхто не будзе ведаць, хто быў у першых шэрагах, хто найбольш біў і зламаў пальцы або чый пазногаць засеў у ноздры аднавокага тоўстага бандыта.

Давай сюды мех з дабром! пачалі крычаць тыя, што прабіліся найбліжэй да мёртвых целаў. *Так, давай сюды! Кожны хай возьме сваё!*

Пачаўся крык і віск – што чыё і колькі ў каго забрана. Калі ўпрыгожанні яшчэ можна было распазнаць, то франц-іосіфаўскія і напалеонаўскія дукаты належалі ўсім і нікому. Ахопленыя панічным страхам, каб іх не падманулі і яшчэ раз не абрабавалі, людзі пазабываліся пра мёртвых бандытаў. Тоўстая кабыла мірна пасвілася на краі паляны і толькі ўзнімала галаву і міргала, калі нехта крыкне ад таго, што яму зашчамілі нагу або што нехта іншы ўжо скраў з меха ягонае залатое распяцце і медальён з Найсвяцейшай Паннай.

Нікава галава спачывала на сябравых каленях, канец штыха тырчаў у яго пад правым смочкам. Стары з цікаўнасцю глядзеў, як у яго з кожным удыхам і выдыхам шырыцца дзіра на кашулі, а металічнае лязо, на якім не было відаць крыві, расце да неба. Яго гэтая карціна забаўляла і вызваляла ад іншых думак. Калі ён дастаткова засяроджваўся, ён нават больш не адчуваў болю. Пуйдзін Домінка безупынна гаварыў, задаваў пытанні, абціраў яму рукавом пот з ілба, некага клікаў і без ніякай разумнай прычыны ўвесь час мітусіўся. Як дзіця, якое не можа супакоіцца. Як дзіця, якое пытаецца – чаму гэта? чаму тое? як гэта? якое тое? – а ты цярпліва яму адказваеш, пакуль яно не засне. Аднак яму ён не можа нічога адказаць. Бо не разумее ніводнага слова з таго, што ён кажа. Дзіўна, бо Пуйдзін Домінка ня ведае замежных моваў. Дык на якой жа ён тады мове гаворыць? Эх, хто будзе ведаць, штó наагул здарылася, пакуль ён ляжаў на гэтай паляне і спаў, а вакол яго тапталіся людзі! Людзі некуды спяшаліся, беглі як шалёныя, але не заміналі яму. Ён спакойна выспаўся і сам сабе дзівіўся. Раней яму б усё замінала, ён будзіўся б ад кожнага шолаху і адчуваў бы зайздрасць да тых, хто спіць з цвёрдым вухам. А цяпер і з ім усё ў найлепшым парадку. Ён мусіў састарэць, каб дачакацца сапраўднага сну. Не замінае яму болей і звар'яцелы Домінка. Ён адчуваў, што зараз зноў засне, і таму быў шчаслівы. Ката не будзе злавацца, яна лёгка залапіць дзірку на кашулі. У яе гэта добра выходзіць. У яе залатыя рукі ад маці. Самае важнае – гэта як след выспацца.

Людзі, памёр чалавек! закрычаў Пуйдзін Домінка што было моцы, але людзі яго не чулі. Яны валтузіліся вакол пустога меха з золатам.

Няма больш майго Нікі, людзі! працягваў крычаць ён, больш сабе, чым іншым.

Толькі ў адным кароткім праблісну падумаў ён пра свае дукаты, але застаўся сядзець на паляне з Нікавай галавой на каленях, адчуваючы, што з кожным момантам у яго застаецца ўсё менш прычынаў некаму пра гэта нешта казаць. Неўзабаве прыйшлі нейкія жанчыны, з'явілася войска і паліцыя, доктар Ганс Эбэрліх узяў яго за руку і павёў да экіпажа, а ягонага сябра Ніку Азінавіча панеслі ў бок гары нейкія чорныя людзі. *Куды яго нясуць?* спытаўся ён у Эбэрліха.

Усё будзе добра, адказаў шваб, і на партовыя агні апусцілася суцяшальная імгла вераналу.

Ніка Азінавіч быў адной з чатырох ахвяраў таго дня пасля вялікіх дажджоў. Ён, адмірал Штэрк, Чара Недарэз і – калі і яго можна назваць ахвярай – Анціша Бакунін!

Нікога асабліва не здзівіла, а яшчэ менш кранула, калі выявілася, што нямым рабаўніком быў насамрэч самы славуты гарадскі анархіст і няўдалы венскі студэнт. Шмат каму і палягчэла, бо ў Анцішы ў горадзе не было ні радні, ні сваякоў. Ягоны бацька, капітан Антэ Бартулавіч быў з Котарскай Бокі і перабраўся ў Дубровнік, калі перастаў плаваць. Сапраўдных прычынаў пярэбараў людзі не ведалі, але магчыма яны тычыліся Анцішынай маці, знатнай пані з Трыеста, якую котарцы за яе капелюшы і занадта кароткія спадніцы звалі Курва Трыестына. Неўзабаве пасля таго, як сям'я купіла дом на Пілах, капітан памёр, а пані Франчэска ўсе мужавы ашчаднасці патраціла на Анцішына венскае навучанне. Аднаму д'яблу вядома, у якую кампанію ён там трапіў, але пасля дарэмна змарнаваных сямі гадоў Анцішу выгналі ў месца яго нараджэння за ўдзел у антыманархічных дэманстрацыях і рыхтаванне замаху на дырэктара Оперы. Першае яму, можа, і забяспечыла б нейкую рэпутацыю ў горадзе, але другое – што ён хацеў забіць дырэктара Оперы! – выклікала толькі кпіны і пагарду. Замест таго, каб прыціхнуць і чакаць, пакуль людзі забудуцца пра ягоны венскі эпізод, Анціша бунтаваў і сварыўся, запэўніваючы кожнага, што Опера – адзін з галоўных інструментаў уціску прыгнечаных народаў Манархіі, а яе дырэктар – надзвычай важны фактар дзяржавы як найвышэйшага сродку тэрору над індывідуумам. Ён не заўважаў, што яго дражняць і правакуюць, каб ён тую самую гісторыю расказваў соты раз. Было позна, калі да яго ўрэшце дайшло, што з яго зрабілі найбольшага гарадскога дзівака. Тады ўжо было ўсё роўна, што ён кажа. Часам яго называлі Анціша Каруза, а часам Анціша Бакунін, але абедзве мянушкі былі аднолькава зняважлівыя.

Невядома, у чыёй галаве ўзнік план рабунку і хто выдумаў і пашырыў гісторыю пра перавознікаў, але ўсё кажа пра тое, што гэта быў Анціша. Другі забіты разбойнік быў не з Дубровніка, ніхто

яго не ведаў, а пра тых дваіх, якія ўцяклі на конях, таксама можна было меркаваць, што яны не з гораду. Інакш дубраўчане ўжо неяк ведалі б або пачулі, што ў нейкім доме некага не хапае. А такі рабунак мог прыйсці ў галаву толькі таму, хто тут жыве, знае гэтых людзей і ведае, чым іх можна завабіць. Галоўнае было іх выцягнуць з гораду, намовіць іх пазбіраць па хатах золата і нечым іх спакусіць. Едуць перавознікі! Усе пра гэта ведалі, і адзін ад аднаго хавалі, і кожны верыў, што пра гэта ведае ён адзін. Калі было б інакш, гэты план, магчыма, прапаў бы або здабыча была б сціплейшая. А так людзі ішлі з намерам скупіць увесь караван, накарміць і задаволіць усіх дома, а астатняе перапрадаць і вярнуць сабе выдаткі. Анціша прыдумаў дасканалы план, але яму было важней адпомсціць гораду, які яго прынізіў, чым здабыць сабе багацце. У гэтым была ягоная памылка. Ён хацеў пакінуць іх без апошняга крэйцара голымі і босымі на пустой паляне, а тады глядзець, як яны абдураныя і прыгнечаныя вяртаюцца дадому. Можа гэта яму і ўдалося б, калі б дождж не ішоў амаль месяц і калі б ягоныя супольнікі проста ад нуды не заходзілі да Нікі Азінавіча ў пограб.

У адзін дзень былі пахаваныя Рэгінін дзед і Анціша Бакунін. Нікава пахаванне было найвялікшым ад пачатку вайны, а можа горад большага пахавання ніколі й не бачыў, апрача выпадкаў, калі хавалі біскупаў. У апошні шлях яго праводзілі тры святары, прыйшлі амаль усе, каму ён сваёй смерцю дапамог вярнуць золата, сабралася мноства жанчын і дзяцей, былі прадстаўнікі вайсковых і паліцэйскіх уладаў, агенты ў цывільным, якія расследавалі справу каравану, і вялікая колькасць цікаўных, гаротнікаў і валацугаў, якія прывалакуцца на любы вялікі збор нацыянальнага або гістарычнага значэння. Ніка Азінавіч зрабіўся героем і пакутнікам, казалі, што ён з голымі грудзьмі ішоў на дулы стрэльбаў, не баронячы сябе і свае правы, а свядома абраўшы смерць, каб іншыя маглі годна жыць. Ён захаваў маёмасць сваіх суграмадзянаў і гонар гораду. Толькі ягоная адвага ўратавала Дуброўнік ад найбольшага рабунку ў яго гісторыі. Так казалі тыя, хто праводзіў дзеда Ніку ў апошні шлях. А прачытаўшы свае словы над адкрытай магільняй, яны падыходзілі да Каты і Ангеліны, абдымалі іх і суцяшалі, абяцалі,

што ахвяра іхняга бацькі ніколі не будзе забытая. Дзяўчынка трымалася ўбаку, уцякала ад вільготных далоняў, якія дакраналіся да яе твару і валасоў, слухала і запамінала. Замест таго, каб абараніць яе, якая яго любіла і была ягоная, ён бараніў людзей, якіх не любіў і нават не ведаў.

Анцішу Бакуніна пахавалі за мурамі могілак сярод цёрну і дзікай капусты, бо людзі прыгразілі, што разаб'юць магільню капітана Анты Бартулавіча, калі ў ёй пахаваюць і ягонага сына. Айцец Іван не хацеў удзельнічаць у пахаванні, тлумачачы гэта тым, што Анціша быў анархіст і антыхрыст і тым самым нічога не вартыя сакраманты, на якія спасылалася няшчасная маці. Яна заплаціла двум работнікам, каб яны выкапалі магілу, і пахавала сына сама. Калі ў гэтым сумным лёсе і было нейкае суцяшэнне, дык хіба толькі тое, што Анцішу Бакуніна горад не будзе памятаць як дзівака. Ягоны разбойніцкі чын перарасце ў легенду, якая нейкі час будзе расказваць пра канфлікт антыхрыста Анцішы і пакутніка Нікі, а пасля Нікава асоба паблякне і знікне з гэтай гісторыі, канчатковая версія якой будзе расказваць пра тое, як Анціша Бакунін падчас Першай сусветнай вайны з трыма супольнікамі перабіў і абрабаваў дабрачынцаў, якія спрабавалі ўратаваць горад ад голаду.

У адрозненне ад яго, злашчасны Канаўлянін скончыў жыццё бясслаўна. За некалькі месяцаў да падзення Манархіі ён быў асуджаны на смерць і павешаны ў турэмным двары. Як ён трымаўся пад шыбеніцай і ці пакаяўся за забойства апошняга гарадскога гадзіншчыка? Пра гэта нічога не вядома, як не вядома і пра месца, дзе ён пахаваны, але можна думаць, што айцец Іван не забыўся пра ягоную грэшную душу і даў даручэнні ў справе яе супакою.

Цела тоўстага разбойніка ніколі не было ідэнтыфікавана і было пахаванае ў бляшанай труне за вайсковым палігонам. Двое збеглых разбойнікаў ніколі не былі знойдзеныя. Тым часам паліцыя займалася справай каравану да канца вайны і падзення Манархіі. Сербскае каралеўскае войска ўжо рыхтавалася да паходу на Адрыятычнае мора, перамовы пра стварэнне дзяржавы паўднёвых славянаў былі завершаныя, Габсбургі замест дзяржаўных былі занятыя сямейнымі трагедыямі, а агенты ў цывільным усё яшчэ апытвалі

людзей, прыслухоўваліся да размоваў у корчмах і вінных пагрэбах і спрабавалі даведацца ад жанчын і дзяцей, якімі шляхамі па горадзе пашыралася чутка пра прыезд перавознікаў. Інспектар Альда Тамазэа, якому было даручана весці гэтую справу, быў перакананы, што гэты рабунак не маглі арганізаваць і так дасканала правесці чатыры чалавекі і што напэўна існавала сетка людзей, што хадзілі ад дома да дома і расказвалі ўсім, што едуць перавознікі. Праўда, Тамазэа ніяк не мог зразумець, як нехта мог паверыць у з'яву, якая знікла з адыходам Асманскай імперыі з Балканаў. Але і гэтая таямніца будзе разгаданая, думаў ён, як толькі ён знойдзе людзей, што разносілі тыя чуткі.

Альда Тамазэа быў выпраўлены на пенсію адразу пасля прыходу новых вызваліцеляў, а палкоўнік каралеўскага войска выгнаў яго з кабінета, калі ён спрабаваў яму растлумачыць прыроду гэтай крымінальнай справы і падкрэсліць неабходнасць вырашэння справы каравану незалежна ад узнікнення новых міждзяржаўных дачыненняў у Еўропе. Прыгнечаны і разгублены, Тамазэа вярнуўся ў родную Пулу, дзе за свой кошт і без ніякай мэты з тыдня ў тыдзень пісаў афіцыйныя лісты і адсылаў іх дуброўніцкім уладам.

У вас за пазухай хаваецца атрутная змяя, і раней ці пазней вас чакае рабунак стагоддзя…

У доме нябожчыка Нікі Азінавіча насталі часы беднасці і маркоты. Ад яго ашчаднасцяў не засталося нічога, вінаград здзічэў, бо яго не было каму даглядаць, а першае сутоннe заўсёды прыносіла памнажэнне пустых думак і нуду. Хлопчыкі пераказвалі адзін аднаму дзедавы казкі, але часта біліся дзеля адрозненняў у інтэрпрэтацыі, так што маці мусіла забараніць ім гэтую гульню. Дзяўчынка за некалькі месяцаў вырасла, змянілася і зрабілася сур'ёзнай. Пра дзеда, як выглядае, ёй удалося забыцца. Аднак яна не забылася пра джунджурбабы. Яна брала дзве кулькі, заплюшчвала вочы і праводзіла па іх скрыжаванымі пальцамі. Цуд не знік. З двух кулек рабілася чатыры.

I

Позняе лета 1904-га, блізіцца збор вінаграду, дажджоў было ні замнога, ні замала, год, які можна было толькі пажадаць. Прынамсі што да вінаграду і віна. Пад балконам сядзіць Аўгуст і паміж каленямі трымае кавалак арэхавага дрэва. Што гэта будзе? Грыф для скрыпкі, якую французскі амбасадар урачыста падорыць чарнагорскаму каралю Ніколу, калі прыйдзе да яго на паклон? Або мадэль карабля «Santa Maria delle Grazie» для капітана Войкі Шышкіча, якая ўпрыгожыць ягоны дом у Пэрасце? Або гэта ўсё ж будзе галава Каралевіча Маркі, якую замовіла для свайго дома сараеўскае таварыства аматараў гор? Аўгуст ніколі наперад не ведае, што пачне рабіць з якога кавалка дрэва, а сядзіць і чакае з долатам у адной і малатком у другой руцэ, пакуль яму не прыйдзе ў галаву якая задума. Нейкія дні добрыя, каб будаваць караблі, а нейкія зусім не. І няма чаго капітану Войку яго прыспешваць. Ён яму ясна сказаў, што карабель паводле прыкладзенага чарцяжу будзе зроблены за тры дні – але толькі калі на гэта будзе надвор'е! Скажам, калі падзьме паўднёвы вецер і паднімецца мора, так што ніхто не выплыве, вось тады за мілую душу можна схавацца недзе ад ветру і дажджу і будаваць карабель. А на скрыпку часу яшчэ два месяцы. Яе зрабіць лёгка, калі адпаведнае дрэва, але яго трэба чакаць. Пакуль яно выпадкова не аб'явіцца сярод дзясяткаў нібыта такіх самых бярвёнаў. Не ўсе арэхі аднолькавыя, а найлепшы з іх герцагавінскі. Былінка, якая прынялася на камені і не выпіла занадта вады, пакуль расла і ператваралася ў дрэва. Баснійскі арэх, можа, дае добрыя плады, але ў душы ён падобны да чалавека, які без меры гуляе, жарэ і п'е, без карысці для жонкі і дома і заўчасна старэе. Яго драўніна лёгка гніе і цяжка сохне. А калі і высахне, зробіцца крохкая і непрыдатная на скрыпку. Папраўдзе, непрыдатная ні на што! Калі Аўгусту судзіць, дык ён заўсёды скажа, што за герцагавінскі лепшага арэху няма!

Кажуць, грэх сячы дрэва, якое дае добрыя плады! Так, і Аўгуст гэта прызна́е; калі прыйдуць неўрадлівыя гады, без пшаніцы, бульбы і кукурузы, няма нічога лепшага, як паесці арэхавых ядраў. Ёсць людзі, што цэлымі днямі ядуць адну рыбу. Бядота і скнары! А ён да рыбы так ніколі і не прызвычаіўся. Калі б Бог стварыў чалавека, каб той жывіўся рыбай, дык зрабіў бы яму плаўнікі на спіне і дазволіў бы яму дыхаць пад вадой! Хлусяць тыя, хто кажа, што Ісус карміў людзей рыбамі, як хлусяць і тыя, хто кажа, што ёсць такое дрэва махагон, якое нібыта лепшае за арэх. Дык найперш, Аўгуст таго махагону ніколі ў руках не трымаў, а па-другое, тыя, хто кажа, што нешта за нешта лепшае, мусілі б спярша сказаць, чаго бракуе арэхаваму дрэву, каб нечым той махагон быў лепшы за яго. Дык вось, нічога б яны не сказалі! І не скажуць, бо не знойдзеш у арэху хібы, хоць бы й сто гадоў шукаў!

З таго часу, як ён з Толміна* перабраўся ў Трстэна, а гэта ўжо гады й гады, ён тут ужо паўжыцця, Аўгуст Лішчар да іншага дрэва долатам не даткнуўся. Тыя, хто любіць дуб і сасну, хай сабе габлююць сталы, труны і дзверы бядняцкіх дамоў. Хай габлююць і маўчаць! Калі Бог ствараў свет, найперш ён стварыў майстроў і дылетантаў, а пасля арэх і дуб. Першым ён загадаў упрыгожваць ягоны свет, а другім – габляваць і маўчаць. Хай робяць, каб бядота не ўзбунтавалася! Але хай нічога не кажуць! Як толькі такія загавораць, Аўгуст адразу ідзе прэч з карчмы, хоць бы ў яго і паўпляшкі віна засталося на стале.

Ён ведае што кажа, бо на кані або чыгункай аб'ездзіў паўсвету, ад Шкоф'яй Локі да Солуні, і заўсёды купляў толькі арэшыну. Мусіш ездзіць, бо дрэва не прыйдзе да цябе само, а людзі без вялікай бяды і патрэбы свой арэх сячы не будуць. Калі ён гэтак праязджае праз Буну, Мостар і Лішціцу і бачыць шыкоўныя дрэвы, з чыіх камлёў, калі пастукаеш, гучаць Моцарт і Брамс, часам яму хочацца набыць стрэльбу, сабраць банду гайдукоў, прыйсці да гаспадара пад браму і крыкнуць: Арэх або жыццё! Але гэта толькі жарт, мама Фаніка і тата Пэпі не выгадавалі яго разбойнікам, дый не забіраў бы ён нічога гвалтам. Разумее ён і тое, што людзям дарагія і тыя дрэвы, і плады, што яны даюць, і продак, што іх пасадзіў. Для іх арэх у дварэ – як дуброўніцкім панам герб над уваходам у дом. Няма тут

розніцы! І адно, і другое паказвае, што чалавек тут пусціў карані. Але не ведаюць тыя людзі, не могуць ведаць, колькі каштуе душа ссечанага арэху.

Няма большай бяды за вайну і хваробы! Пра гэта пішацца ў святых кнігах, так што Аўгуст супраць гэтага нічога сказаць не можа, але ягонай працы і ягонаму мастацтву войны і эпідэміі толькі на карысць. У 1878 годзе ён пасек у Герцагавіне і ў Босніі столькі арэху, колькі не пасек за ўсё жыццё. На шчасце, быў ён яшчэ малады, меў сілу і дапамагала яму двое чалядзінкаў – Фэрыз і Ёсіп, хто ведае, дзе яны цяпер! Секлі яны ў кожным сяле і горадзе, а людзі ім прадавалі свае дрэвы за бесцань. Прыгнечаныя паразай і прыходам хрысціянскай улады, яны прадавалі свае маёнткі, калі знаходзіліся пакупнікі, і ехалі ў Турцыю. Аўгуст рабіў ім паслугу, бо яны атрымлівалі грошы за нешта, за што не спадзяваліся нічога атрымаць. Але ўсё роўна кожны бэг, ага – ці хто там яшчэ ў іх быў! – кожны той з турбанам або фескай на галаве стаяў сярод свайго гаю або двара, і слёзы каціліся яму па твары, калі секлі ягоны арэх. Нялёгка глядзець, калі мужчына плача! Тады свет страчвае нешта такое, чаго і Бог не можа вярнуць. Калі мужчына плача, гэта знак, што разбураюцца царствы, мяняюцца звычаі і прыходзяць лепшыя часы для ненароджаных дзяцей і часы памірання для кожнага, хто кланяўся старому сцягу. І толькі калі секлі арэх, тыя людзі разумелі, што́ значыць пакінуць месца, у якім ты нарадзіўся. Можа нехта з іх і змірыўся б і прыняў аўстрыйскага цара, але было позна, бо арэха ўжо не было.

А тады насталі гады няўроду, запанавалі тыф і дыфтэрыя, паўстанні па Сербіі і Македоніі, час беззаконня ў былых турэцкіх ускраінах, па Вужыцкай Нахіі падалі мінарэты, як згнілыя таполі, беды і нягоды шырыліся хутчэй, чым захапленне новаздабытай свабодай і ўладарамі, якія жагнаюцца і ходзяць у касцёл. Аўгуст, часам з чалядзінкамі, а часта і сам, аб'язджаў спустошаныя мясціны і сек арэхі. У часы, калі праца ў яго ішла найлепей, ён меў па пяць складоў і гэтулькі ж майстэрняў: у Шапцы, Сараеве, Мостары, Спліце і Трстэне.

Ён вырабляў мэблю для аўстрыйскіх адміністрацыйных будынкаў, касцёлаў і мячэцяў, выразаў выявы ўладароў і народных герояў,

рабіў скрыпкі для каралёў і гайдукоў, пакуль часы зноў не перамяніліся. Як для іншых – палепшыліся, а як для яго – зрабіліся горшыя, чым калі. Здабываць арэшыну цяпер было цяжэй, а замоваў было ўсё меней. Мэблю цяпер прывозілі з Вены, паўсюль запанавалі дылетанты, якія з абы-якога дрэва зробяць гару скрыпак. Людзі страцілі адчуванне эстэтыкі, усе пачалі баляваць і забаўляцца, узніклі вандроўныя тэатральныя трупы, гастралююць аперэты, арганізуюцца балі і ўрачыстасці на ўзор парыжскіх і венскіх, людзі памалу але пэўна трацяць розум. Спачатку Аўгуст быў ад гэтага ў роспачы, а пасля пачаў знаходзіць злосную прыемнасць у гэтым набліжэнні краху. У яго застаўся толькі дом у Трстэне, астатнія ён прадаў, бо не меў за што іх утрымліваць, дый гады пачалі прыціскаць, усё часцей яму не дае працаваць рэўматызм, страціў ён і сілу ў руках, дзеці пажаніліся і павыходзілі замуж у Заграбе і Карлаўцы, і застаўся ён сам з сваёй Матыльдай…

Хоць не так яму і дрэнна! Ён не наракае, хіба што найбліжэйшым сябрам! З астатнімі ён нават не размаўляе, а сябры на тое і створаны, каб часам ім пажаліцца. Часам ён ім і дакучае сваім ныццём, і калі яны перастаюць яго наведваць, Аўгуст не злуецца, а едзе да іх. У Дуброўнік, Чапліну, Сараева… І заўсёды рыхтуе ім нейкі падарунак: Карлу Штублеру*, найстарэйшаму сябру, чыгуначнаму службоўцу, ён прывёз на Іліджу насценную аптэчку з арнаментамі, якія перакапіяваў з карцінкі нейкай багдадскай мячэці. Штублер, вядома, быў у захапленні. Аўгуст яму цэлых сем дзён жаліўся на рэўматызм, а сябар суцяшаў яго, і яму не прыходзіла ў галаву згадаць пра сваё хворае сэрца. Іву Солду ў Чапліну ён прывёз фігуру караля Томіслава* на ўздыбленым кані, якая цяпер стаіць на асобным месцы ў Солдавым гатэлі, побач з партрэтам імператара. Мію Чыпіку ён вырабіў венецыянскага гандальера з Міевым тварам. Яго жонка Здэнка ўсе дзесяць дзён дзівілася падабенству…

Не трэба Аўгусту грошай на жыццё! Ён зарабіў на тры жыцці, але не можа змірыцца з тым, што яго дагналі гады – Матыльда яму сто разоў на дзень кажа, каб адпачываў! – а яшчэ яго грызе тое, што яму не замаўляюць працу і ён робіць толькі падарункі для сяброў. У тыя дні і месяцы ён злы на ўсё і ўсіх, яму не падабаюцца ні ўлада,

ні святары, яго нярвуюць газеты, якія дзеці шлюць яму з Загараба, ён злуецца на Матыльду. Але што найгоршае – калі няма працы, Аўгуст усё хутчэй старэе і занепадае. Пачаў забывацца, скажа нешта раніцай, а ўвечары ўжо не памятае, што казаў. Вылятаюць з галавы імёны, ён не памятае, дзе пакінуў акуляры, паедзе ў Дуброўнік і напаўдарозе ўжо не ведае чаго туды ехаў… Тады ён упадае ў роспач, але ў яшчэ большую роспач упадае Матыльда. Яна баіцца яго страціць, баіцца, што стары заўчасна адкіне боты, пердне ў бутэльку і закоціць вочы – так ён жартуе! – і што яна застанецца адна. Таму цяжка апісаць, якая радасць запанавала ў доме Лішчараў у Трстэне, калі пасля шасці пустых месяцаў за некалькі дзён прыйшлі чатыры замовы! Скрыпка для караля, карабель для капітана Войкі, Каралевіч Марка для аматараў гор і чацвертая замова: цацкі для ненароджанага ўнучаняці аднаго дубраўчаніна.

Той чалавек прыйшоў яму сказаць, што ягоная дачка зацяжарала, дакладней, яна на чацвертым месяцы, і што ён хацеў бы таму дзіцяці падараваць цацкі з арэхавага дрэва. Колькі б гэта ні каштавала! Так і сказаў. Весялун нейкі, крыху ненармальны, але Аўгусту вельмі спадабаўся. Іначай бы ён напэўна не згадзіўся. Па-першае: ён ніколі ў жыцці не рабіў дзіцячых цацак! Па-другое: ці ж гэта не абраза шляхетнаму дрэву марнаваць яго на такія глупствы? Патрэцяе: Аўгуст бы ў гэтым не прызнаўся, але яму трошкі страшна рабіць нешта ўпершыню. А чацвертае найважнейшае: той чалавек хоча цацкі, якія ён пакладзе ля калыскі, калі дзіця народзіцца, дык каб цацкі аднолькава падыходзілі і калі народзіцца хлопчык, і калі дзяўчынка! Цяжэйшай замовы ў Аўгуста яшчэ не было. Дні і ночы ён толькі й думае пра тое, што́ магло б быць супольнае для мужчынскага і жаночага свету. Ён пачаў ад таго, з чым бы любілі гуляць хлопчыкі і дзяўчаткі, але вельмі хутка ўзняў сваё пытанне на ўніверсальны ўзровень, пачаў разважаць аб полавых адрозненнях, чытаў, што́ пра гэта пішуць у мудрых кнігах, замовіў даслаць яму з Загараба філасофскіх і багаслоўскіх трактатаў.

Ён паехаў у Заастрог* пагаварыць з братам Анджэлам, кляштарным бібліятэкарам, вучоным і прагрэсіўным чалавекам, які мірыў царкоўны лёд з агнём сучаснага жыцця і прачытаў усе важ-

ныя кнігі аднаго і другога боку. Майстар спярша пытаўся ў яго здалёк, пасля манах разгаварыўся пра тое, што паміж мужчынам і жанчынай розніцы ў розуме няма, але жанчыны больш чуллівыя, а мужчыны больш мітуслівыя. *Толькі што яе чуллівасць робіць свет шчаслівейшым, а яго мітуслівасць прыносіць няшчасце. Вось галоўная розніца паміж мужчынам і жанчынай!* усклікнуў брат Анджэл, але ў гэтай мудрасці Аўгуст не бачыў для сябе вялікай карысці і тады ён проста выклаў манаху сваю праблему. *Якія цацкі зрабіць дзіцяці, калі невядома хлопчык гэта ці дзяўчынка?* Манах разгубіўся, у яго быццам і вочы заслязіліся ад пытання, на якое ў яго няма адказу, ён доўга думаў і глядзеў на Аўгуста – нейкі іншы святар або разумнік напэўна б выкруціўся так, што сказаў бы, маўляў, цацкі гэта марнаванне часу і няма чаго пра іх думаць, але брат Анджэл быў не з такіх. Для яго не існуе менш важных пытанняў. Ад таго, колькі ног у мурашкі, да таго, чаму Пётра здрадзіў Хрысту, кожны адказ быў для яго важны. *Не ведаю, што табе сказаць, браце Аўгусце,* сказаў ён тонам старазапаветнага каянніка. А *што калі замест цацак зрабіць калыску?* Не, гэта для Аўгуста было б тое самае, як прызнаць, што ён нешта не ўмее зрабіць з арэхавага дрэва. Гэтым бы ён пацвердзіў, што састарэў, плюнуў бы на ўсё, што стварыў за жыццё. І ўрэшце схлусіў бы кліенту! Схлусіў бы дубраўчаніну, што на свеце існуе нешта, чаго нельга зрабіць з арэшыны. Не існуе нічога, апрача кухоннай печы. Толькі печ нельга зрабіць з арэхавага дрэва. Для ўсяго астатняга важна толькі мець розум і майстэрства. Не можа быць, каб ён страціў розум.

Аўгуст не сядзіць пад балконам так, як звычайна, калі спрабуе ўбачыць у дрэве, што́ з яго будзе зроблена. Папоркаецца са скрыпкай, Каралевічам Маркам і караблём «Santa Maria della Grazie», а насамрэч у яго толькі цацкі ў галаве. Ужо гадзінамі нічога не робіць, і калі ў яго ад напружання здаюць нервы і дранцвеюць рукі, Аўгуст стукае па долаце, у дрэве застаюцца неглыбокія засечачкі, але ніяк не можа пачаць працаваць. Урэшце ён прыміраецца з лёсам – да нараджэння дзіцяці яшчэ ёсць час – і бярэцца за найлягчэйшае. За два дні кавалак арэшыны ператворыцца ў галаву Каралевіча Маркі, змрочнага вусача з нізкім ілбом і апушчанымі бровамі, з-пад якіх

бачны бычыны позірк, які вось-вось рынецца ў рашучы бой з Мусам Кесэджыем*. Аўгуст за трыццаць гадоў зрабіў ужо некалькі сотняў Каралевічаў Маркаў. Кожны раз ён стараецца зрабіць тую самую галаву, без зменаў у выразе твару або форме носа, бо няма як інакш уявіць сабе партрэт чалавека, калі ніхто не ведае, як ён насамрэч выглядаў. Кожны скульптар або мастак, майстар або дылетант, робіць свайго Марку, і чым больш разоў паўторыць тую самую працу, тым большая магчымасць, каб людзі паверылі, што славуты герой выглядаў менавіта так. Аўгуст, тут няма ніякага сумневу, можа лічыцца аўтарам кананічнага варыянту аблічча Каралевіча Маркі. Яго ўжо даўно капіююць, і гэта Аўгуста злуе, але ён усведамляе, што гэта яму дапамагае. Нізкі лоб, апушчаныя бровы і бычыны позірк! Калі гэта сапраўды Каралевіч Марка, хай усе ведаюць, што такім яго стварыў не Бог, а толмінскі майстар, арэхавы князь, Аўгуст Лішчар!

Ну проста з заплюшчанымі вачыма ён зрабіў яшчэ аднаго Марку! Ад пачатку і без выпраўленняў, напаўсілы і без ніякіх намаганняў. Так і мусіць быць. За гэтых трыццаць з гакам гадоў, фактычна – амаль сорак, а калі лічыць першыя сталярскія працы – дык і сорак пяць, Аўгуст авалодаў арэхавым дрэвам як Напалеонавы войскі Еўропай, але Каралевіча Марку ён мусіць рабіць з абмежаваннем у майстэрстве і ведах характэрным для майстравай маладосці. Груба і наўмысна недакладна, без той тонкасці, з якой ён робіць іншыя рэчы. Бо калі б ён зрабіў Марку гэтымі рукамі, якія ўмеюць усё, гэта ўжо не быў бы Марка і ніхто б яго не пазнаў. Эх, каб яму сабраць усе героевы галовы, якія ён некалі зрабіў, і паставіць і адну за адной у рад. Які б гэта быў рад! І ўсе аднолькавыя, і ні па адной не відаць, калі яна зроблена і што ён адчуваў, калі яе рабіў, ці ён тады хварэў, ці ў яго якраз нараджалася дзіця, ці ён рэзаў яе сярод пякельнага ювелірства Башчаршыі або яна ўзнікла ў Шапцы. Пра каго ён думаў, калі працаваў, ці было яму ад нечага цяжка на душы… Нічога з гэтага не відаць па галовах Каралевіча Маркі. Таму яны і ёсць мастацтва.

Назаўтра раннім ранкам ён накіраваўся ў Дуброўнік. Пагаварыць з тым чалавекам і адчуць, якім будзе ягонае ўнучаня. Некаму падасца дурасцю распытваць дзеда, які ў яго будзе ўнук, але Аўгуст верыць у такія рэчы. Мы такія, якімі нас пажадалі бачыць яшчэ да

таго, як мы нарадзіліся. Гарады поўныя прынцаў і прынцэс, дык лёгка сабе ўявіць, пра што думалі іх дзяды і бабкі, калі чакалі ўнукаў. У сёлах больш маўклівых і працавітых людзей, якія часта бываюць падобныя да сваіх валоў. У бальшыні гэта сёмыя ці восьмыя сыны ў бацькі і маці. Калі яны іх і жадалі, то іх фантазія была ўжо вычарпаная. Гэтых людзей ніхто сабе ніяк не ўяўляў, таму яны такія і выйшлі.

Так мудраваў Аўгуст, пакуль над морам распускаўся новы сонечны дзень, а цвыркуны ўжо ладзілі свае інструменты. Як оперны аркестр перад выкананнем столькі разоў паўторанага твору, што кожны музыкант ведае партытуру напамяць і з чыстай прыемнасці нацягвае струны і праводзіць па іх смыкам.

Будучы дзед вельмі ўзрадаваўся, убачыўшы майстра. *Каго бачаць мае вочы!* усклікнуў ён і абняў яго. Няма сэнсу ні так казаць, ні абдымаць некага, з кім амаль незнаёмы, але Аўгусту гэта не замінала. Абняў і ён гаспадара, каб чалавеку не было непрыемна, калі ён зразумее, што зрабіў нейкае глупства. Дый навошта быць вечным мармылём? Недарэмна Матыльда яму пра гэта кажа. Часам і Аўгуст мусіць прызнаць, што старая сёе-тое разумее.

Гаспадар завёў яго ў дом, і дом быў якраз такі, як Аўгуст чакаў. Дом гарадской бядоты без герба і каранёў, якая пакаленнямі рупліва працавала, абкопвала свае сады і вінаграднікі, хадзіла ў рыбу, прадавала герцагавінскі тытунь і збірала мала-памалу, дукат за дукатам, цагліну за цаглінай – пакуль не ўзбілася на гэта. Ні брыдкае, ні прыгожае, ні дарагое, ні таннае, а такое, як і яны самі. Добрыя людзі. І дачка ў яго не Бог ведама якая прыгажуня, але не скажаш, што і брыдкая. Сапраўдная чыстакроўная далмацінка, якая з гадамі размокне і распаўнее і, узяўшыся ў бокі і крыху расставіўшы ногі, будзе клікаць дзяцей у сутонні. Ён мог цяпер уявіць сабе яе ў арэшыне.

Ката? Была адна каралева, якая звалася Катарына Косача. У Рыме шукала яна справядлівасці для свайго каралеўства, там і памерла. У касцёле яе магіла. Кажуць, была прыгожая,* сказаў Аўгуст, а яна ўсміхнулася. Акурат так, калі б ён сказаў ёй, што яна прыгожая. І гэта яму спадабалася.

Муж у яе нейкі спакойны чалавек, зашмат маўчыць, а як толькі

загаворыць, пачынае ламаць пальцы. Проста неяк пякельна моцна ломіць. Добра, што негаваркі, бо застаўся б без пальцаў.

Будзе дзеўчынка! сказаў дзед, вымавіўшы гэтае слова неяк не патутэйшаму.

Бог ведае, адказала маці, *можа зноў будзе хлопчык!* Бацька паціснуў плячыма, трошку паламаў вялікі палец і задумаўся, але нічога не сказаў.

А, не ведаю, якое ў нас будзе дзіця. Разумнае і прыгожае! Багатае то напэўна не, няма ў каго. Мяне больш хвалюе не тое, якім яно будзе, а тое, якімі будуць да яго людзі. Па гэтым трэба глядзець. Хай не будзе горшае за іншых, хай не будзе злейшае і хай не зажадае для сябе больш, чым жадае той, хто побач. Вось, я б хацеў неяк так. Калі будзе такое, дык больш верагодна, што будзе шчаслівае ў жыцці і менш няшчасця забярэ з сабой у магілу. Хоць ніколі не ведаеш. Бо не ты вырашаеш, як табе будзе, і не іншыя, не вырашае нават Бог. Ведаеш, як кажуць у Герцагавіне: гаўно мне выпала! Дык вось, калі табе занадта часта будзе выпадаць гаўно, тады дарма ўсё іншае. Двое рыбакоў возьмуць тую самую сетку, тую самую вуду і прынаду, пойдуць разам на тое самае месца і адначасна закінуць вуды. Адзін зловіць зубатку на дваццаць кіло, а другі нічога. Другому гаўно выпала.

Так казаў будучы дзед, мяшаючы гаворкі і акцэнты, быццам ён жыў на ўсіх чатырох баках аднаго свету. Бацька і маці слухалі, і здавалася, што яны б не перапынялі яго, калі б ён гаварыў і да самай раніцы. З гэтага Аўгуст быў пэўны, што будучае дзіця будзе хутчэй ягонае і што цацкі трэба рабіць паводле яго. І гэта ўжо нешта, хоць прагрэс і не такі вялікі.

Пазней яны селі ў двары, Ката вынесла віна і салёнай макрэлі, і Аўгуст тады ўпершыню пабачыў яе жывот. Малы закруглены жывоцік, як на ўсходніх карцінках, па якім яшчэ нельга было даведацца, што яна носіць дзіця. На імгненне ён спалохаўся, што яна магла б спараніць. Часта здараецца, што без ніякай прычыны маці выкіне з сябе ненароджанае дзіця. Яно проста выцеча ў яе з крывёю. Не, нельга пра такое думаць. Гэта было б страшна і для іх, і для яго. Прапала б у яго вялікая замова, тая, якой доўга чакаюць, а шмат

хто і не дачакаецца. Колькі было такіх, каму трэба было толькі даць аздобіць Сікстынскую капліцу, і яны зрабіліся б найбольшымі мастакамі ў гісторыі! Аўгуст даўно развітаўся з думкай, што ён мог бы быць найбольшым у гісторыі. Ён не найбольшы нават у гэтым бедным народзе, які не мае сваіх мастакоў, але ў арэху большага за яго няма! І няма важнейшых замоваў, чым гэтая: стварыць нешта для чалавека, які яшчэ толькі народзіцца! Было б нядобра, калі б жанчына спараніла. Гэты чалавек быў бы няшчасны, гэтая жанчына была б няшчасная і гэты малады пальцалом разам з імі. Няшчасны быў бы і Аўгуст! Яго натхніла гэтае адкрыццё. Ён цяпер звязаны з людзьмі, з якімі ён не знаёмы, не ведае нават, як іх завуць. Апрача таго, што будучая маці завецца Ката.

Эх, які прыгожы дзень! уздыхнуў Аўгуст. Макрэль на ягоны густ была крыху перасоленая, а віно занадта горкае. Але шчыра кажучы – Аўгуст не любіць рыбу, а віно ён у жыцці піў толькі каб напіцца. Цяпер яму напіцца не хочацца. Усё, чаго б ён хацеў, гэта каб гэты дзень цягнуўся чым даўжэй, каб нічога не змянілася і каб ён застаўся з гэтымі людзьмі да вечара.

Так і сталася. У Трстэна ён вярнуўся за поўнач. Матыльда ўжо спала, і ён з адчуваннем нявернага мужа ціха ўлез да яе ў ложак. Колькі б ён ні падарожнічаў і ні вандраваў, Аўгуст ніколі не спаў з іншай жанчынай, нават ніколі не глянуў на іншую жанчыну, але з ім часта здаралася адчуваць сябе няверным мужам. Заўсёды, калі нешта для яго рабілася важнейшым за Матыльду. А цяпер яму важнейшыя былі тыя цацкі. Але не толькі цацкі, а і дзіця, якое народзіцца. Ён сваіх дзяцей не чакаў з такім радасным страхам.

Ведаю! крыкнуў ён перш, чым расплюшчыў вочы. Ён хацеў сказаць ёй, але рука намацала пусты бок ложка – Матыльда, як звычайна, устала першая. Гэта яго ўсхвалявала, але ён вырашыў, што не ўстане, пакуль ёй не скажа. *Эўрыка!* закрычаў ён на ўсю глотку. *Эўрыка, эўрыка, эўрыка…*, крычаў ён, пакуль не забалела ў горле, але дарэмна. Матыльда відавочна не была дома. Ён сярдзіта адкінуў коўдру і кінуў чаравік у другі канец пакоя. Пасля падумаў, што гэтак, мабыць, непрыгожа. Не можа мастак злавацца, калі яму ў галаву прыйшла геніяльная ідэя, а яшчэ злавацца толькі таму,

што побач няма жонкі. Ён спусціўся ў пограб, пацягнуўся, каб дакрануцца да бэлькі ў столі, але яму не хапіла сантыметра ці двух. Якраз на столькі ён зменшыўся за апошнія некалькі гадоў. Выпіўшы кубак малака, ён пойдзе ў дрывотню і выбера пяць найлепшых паленаў арэшыны. Як найменей пяць спатрэбіцца яму на тое, штó ён задумаў. На цацку для будучага дзіцяці пойдзе больш дрэва, чым на малы касцельны алтар. Так і мусіць быць! Касцёл служыць на тое, каб выпраўляць і перапраўляць дарабленых і тым самым ужо непапраўных людзей. А гэта будзе для некага, каму алтар усё яшчэ не патрэбны і дай Божа, каб не быў патрэбны ніколі.

У кнізе «Сучасныя інтэр'еры гарадоў будучыні» выдання «Кнігарні Чэлап» Аўгуст знайшоў план і бакавы разрэз дома, у якім бальшыня еўрапейцаў будзе жыць каля 1950 года, значыць, роўна праз сорак пяць гадоў. Аўтар кнігі, інжынер Адольф Фозэ, як напісана ў прадмове, узяў пад увагу ўсе сённяшнія і будучыя дасягненні тэхнічнай рэвалюцыі, культурны прагрэс нашай цывілізацыі і наагул духоўнае ўзняцце чалавека на вышэйшую стадыю гуманізму, блізкую будучыню, у якой запануюць роўнасць і братэрства… Аўгуст купіў «Сучасныя інтэр'еры гарадоў будучыні» год перад тым у Заграбе, ён гартаў кнігу па дарозе ў Трстэна, а пасля ўпаў у глыбокую роспач і вырашыў больш не браць гэтую кнігу ў рукі.

Калі б ён дажыў да 1950 года, што, вядома ж, немагчыма, яму было б сто дзесяць гадоў і ён быў бы занадта стары, каб зажыць усе тыя прыемнасці, якія тады з'явяцца. Ён нарадзіўся зарана і жыў на самым схіле адной змрочнай эпохі, напоўненай невуцтвам і прымітывізмам, войнамі, бунтамі і беспатрэбным праліццём крыві. Яшчэ ўчора палілі ведзьмаў, паўсюль скакалі турэцкія аскеры, размахваючы аголенымі ятаганамі, гатовыя скараціць на галаву кожнага, хто б ім не скарыўся. Так працягвалася, можа і тысячу гадоў, а тады раптам нешта здарылася, быў вынайдзены тэлеграф, запрацавала чыгунка, газавыя свяцільні ператварылі ноч у дзень, і чалавецтва паскораным ходам рушыла да шчасця, дабрабыту і розных задавальненняў. Яго засмучала тое, што ён гэта ведае, а плёну тых пераменаў ужо не дачакаецца. Вось таму ён вырашыў

тую кнігу больш не разгортваць. Ён думаў завезці яе ў Дуброўнік Саламону Леві і за паўцаны саступіць для ягонага антыкварыяту. На шчасце, не паспеў, бо тады б яму не прыйшла ў галаву геніяльная ідэя: ён збудуе з арэшыны дом, у якім еўрапейцы будуць жыць у 1950 годзе! Гэта будзе цацка будучага дзіцяці, і ўсё роўна будзе гэта хлопчык ці дзяўчынка. Дом – адзіная рэч у гэтым тужлівым свеце, якая аднолькава належыць мужчынам і жанчынам.

На ніжнім паверсе гасцёўня з трыма фатэлямі, гарбатным столікам і канапай колераў французскага сцяга. У куце аўтамат, каб чысціць абутак, і люстэрка, якім можна рухаць ва ўсе бакі. Тут і лядоўня з ахаладжальнымі напоямі, праектар для паказу рухомых карцінак і хатні тэлеграф. На верхнім паверсе, апрача прыбіральні і вялікай лазенкі, салон для настольных гульняў з більярдным сталом, фартэпіяна і японскай мэбляй з бамбуку, далей кухня з электрычнай плітой, лядоўняй і рознымі прыладамі, функцыю якіх Аўгуст выявіць не здолеў. Можа, аўтар паставіў іх тут на ўсялякі выпадак і сам не ведаў, чым яны будуць служыць. Тут і спальня з шлюбным ложкам, шафамі і электрычным сталом для масажу, а паверхам вышэй яшчэ два пакоі і ўрэшце на гарышчы прасторная кладоўка, куды Адольф Фозэ паскладаў хатнія рэчы з мінуласці. Ён зрабіў гэта, каб падкрэсліць кантраст, але Аўгуст убачыў у гэтым і меры засцярогі. Калі будучыня скончыцца крахам або калі людзі аднойчы ёю насыцяцца – а і гэта магчыма! тады проста старыя рэчы вынесуць з гарышча і вернуць туды, дзе яны некалі былі. Дом будучыні вечна заліты сонечным святлом, бо ўвесь паварочваецца за сонцам з дапамогай электрычнага прыводу. У доме вялікія вокны і выгляд на альпійскае возера, над якім узвышаюцца заснежаныя горныя вяршыні і ляцяць драпежныя птушкі. Аднойчы, у далёкім 1950 годзе, гарады зжывуцца з прыродай, будуць размяшчацца побач з жытлом дзікіх жывёлаў і сярод лясоў, там, дзе чыстае паветра і колеры лашчаць вока. Індустрыйныя зоны будуць перанесеныя ў пустыню Сахару і пад марскую паверхню, а магчыма перабяруцца і на Месяц… Людзі будуць падарожнічаць электрычнымі цягнікамі, электрычнымі экіпажамі, балонамі і электрычнымі аэрапланамі. Хаджэнне пехатою будзе зведзенае да мінімуму, а ўсе жывёлы

будуць жыць на свабодзе. Ніхто не будзе есці мяса, раўнінная частка Еўропы будзе залаціцца палямі збожжа, не будзе ні дзяржаваў, ні ўрадаў, кароль будзе мяняцца кожны год, а яго імя будуць выцягваць жэрабем з барабана. Караляванне будзе дазволена кожнаму паўналетняму грамадзяніну, які папярэдне не парушыў закону…

Ну добра, Аўгуст не паверыў зусім усяму! Але Фозаў дом быў добрай асновай для таго, што ён задумаў, без электрычных апаратаў, шматфункцыянальнай мэблі і залішняга аптымізму. Апрача таго, будучаму дзіцяці ў 1950 годзе будзе ўжо сорак пяць гадоў, а гэта не той час, калі чалавек толькі пачынае жыць. Аўгуст збудуе дом, які будзе аднолькава добры і заўтра, і ў 1950 годзе.

Французскаму амбасадару ён паслаў ліст, у якім са шкадаваннем паведаміў, што з прычыны хваробы не можа зрабіць скрыпку для караля Ніколы. Капітану Войку ён адпісаў, што з «Санта Марыяй» нічога не выйдзе, бо ён лічыць ніжэй сваёй годнасці рабіць макет карабля, які ніколі не існаваў. «Хай вам будзе сорамна за тое, што спрабуеце падмануць сваіх дзяцей. Прызнайцеся ім, што вы абплылі свет на ржавым ламаччы, а не на Калумбавых каравелах!», напісаў ён яму і папярэдзіў, каб ён яго не шукаў і не спрабаваў угаварыць, бо тое, што Аўгуст Лішчар сёння вырашыў, мае сілу да канца ягонага жыцця! Ён ганарыўся сабою, ён зноў адмаўляўся ад замоваў, як у найлепшыя свае часы, і перастаў паводзіць сябе як спалоханы стары, перакананы, што ён больш нікому не патрэбны.

Наступныя месяцы ён ад зары да зары будаваў дом з арэшыны, і пры гэтым яму ні разу не забалела спіна, не апухлі суглобы, у руках і далонях ён адчуваў тую самую сілу, якую меў, калі даўно, недзе ў Босніі, сам паднімаў з зямлі камель стогадовага арэха. Саму канструкцыю ён збудаваў хутка, за сем або восем дзён. Не спатрэбілася яму болей і на раздзяленне дома на пакоі і выраб унутраных сходаў, але сапраўдная праца пачалася з дзвярамі ў пакоі, абсталяваннем і хатнімі рэчамі. Найперш трэба было з іголак, лёзаў і нажнічак на пазногці вырабіць інструменты, каб можна было, напрыклад, выдзеўбці ванну велічынёю з вялікі палец або начовачкі для хлеба меншыя за пазногаць. На гэтыя начовачкі ён патраціў два дні і намучыўся больш, чым з дзесяццю галовамі

Каралевіча Маркі. Але ўрэшце яны выглядалі як сапраўдныя. Яшчэ цяжэй было ўпрыгожыць арнаментам стылёвую мэблю, паставіць ручкі на дзверы, зрабіць набор мініяцюрных кухонных нажоў. Чым даўжэй ён працаваў, тым больш заўважаў рэчаў, якіх не хапае і якія патрэбныя ў кожным доме. Ён трымаўся правіла, што няма нічога настолькі дробнага, чаго нельга было б вырабіць. Кухонныя анучы ён зрабіў з кавалачка шоўку, а дываны – з Матыльдзінай святочнай сукенкі .

Кожную суботу ён ездзіў да будучага дзеда, сядзеў з ім перад домам і пад віно з макрэллю сустракаў заход сонца. Ён глядзеў, як у Каты расце жывот і прыпухае твар, і слухаў, як хрусцяць пальцы ў будучага бацькі, калі ён хто ведае што спрабуе сказаць. З гэтымі людзьмі ён раздзяляў спакой, якога ніколі раней не адчуваў. Цацку ён абвясціў таямніцай і сюрпрызам і ні за што на свеце не хацеў здацца і расказаць, што ён будуе. Ката дакучала яму, маліла, каб ён ёй сказаў, штурхала яго і цягала за сурдут. Яна дакраналася да Аўгуста, а калі ён што не выносіў, дык гэта калі людзі да яго дакранаюцца, прыбіраюць нябачны волас з пляча, весела ляпаюць па спіне або хапаюць за локаць, калі хочуць сказаць нешта важнае… Але супраць Каціных дотыкаў ён нічога не меў. Ён смяяўся, адмахваўся і казаў, што ён стары чалавек і што яму прыемна, калі такая маладая і прыгожая жанчына нешта ад яго хоча. Ката чырванела і бегла ў кухню, а дзед торкаў яго локцем у рэбры, узнімаў бровы і бліскаў вачыма. Ну проста як гаспадар бардэля, які навязліва прапануе сваіх дзяўчат! Але не было ў гэтым нічога непрыстойнага, ніякай задняй думкі. Толькі дзяціная радасць старых людзей, якія крыху падурнелі, чакаючы новага жыцця.

За месяц да родаў пачалося спаборніцтва паміж Аўгустам і дзіцем, якое прыходзіць на свет. Былі недакончаныя яшчэ два пакоі, а трэба было яшчэ зрабіць будучых жыхароў дома: мужа, жонку, траіх дзяцей і сабаку. А таксама будку для сабакі. Жыхары таксама будуць з арэхавага дрэва. Лялькі з анучаў заўсёды яго раздражнялі, а яны б і не падышлі, калі б нарадзіўся хлопчык. Хлопчыкі ніколі не гуляюць з анучнымі лялькамі, а людзі і сабакі з арэшыны – частка як дзявочага, так і хлапечага свету. Кожны суглоб на фігурцы мусіць

быць рухомы, людзі будуць сядзець, стаяць і хадзіць, паварочваць галаву і варушыць пальцамі, а ў сабакі будуць рухомыя сківіцы – каб было відаць, калі ён брэша. Ён прыдумаў ім і твары. Спачатку ён хацеў, каб дарослыя былі падобныя да Каты і яе мужа. Але з чаго раптам дзіця хацела б, каб цацкі былі з тварамі маці і бацькі? І ён перадумаў. Як яму такое глупства наогул прыйшло ў галаву!

Апошнімі днямі ён працаваў і ўначы, толькі каб дом быў гатовы ў пару. Давялося адмовіцца ад сабакі, а таксама вырашыць, што дзяцей будзе толькі двое. І так настала апошняя субота, а павітуха сказала, што Ката мае нарадзіць на працягу наступнага тыдня. Аўгуст да самай раніцы дарабляў браму, а тады прылёг на гадзінку, перш чым гарбар Антэ прыедзе з запрэжкай, каб завесці яго і цацку ў Дуброўнік. Усё было гатова: муж і жонка сядзелі ў фатэлях і глядзелі адно на аднаго, дзеці лёталі перад домам, блішчала чысцінёю белая кухня, на стале стаялі талеркі на абед. Талеркі ён зрабіў не з арэшыны, а з гіпсу. Чаму? Неяк яму падалося недарэчным рабіць з шляхетнага дрэва талеркі. Яны мусяць лёгка біцца, калі дойдзе да сямейнай сваркі і наступяць часы адчаю. А цяпер, пакуль усё ў парадку, усе ўсіх любяць і жывуць у дабрабыце сучаснага жыцця, талеркі на стале мяняюцца як поры года. Адны на сняданне, другія на абед, трэція на вячэру. І зноў спачатку. У малым свеце арэхавага дома час мінае хутчэй. Пяці хвілінаў дзіцячай гульні дастаткова, каб прайшоў дзень, а за паўгадзіны праміне год. За год з крыві і плоці пройдзе цэлае драўлянае стагоддзе. У свеце з арэхавага дрэва жывецца даўжэй. Жывецца столькі стагоддзяў, колькі ў чалавека ёсць дзяцінства.

Адзінае, што ў доме засталося недаробленае, быў надпіс над брамай. Аўгуст доўга пра гэта думаў, перабіраў у думках розныя назвы, але ніводная не была дастаткова добрая. Дзіцяці гэта, можа, і не будзе важна, але майстар хацеў даць назву свайму мастацкаму твору. Найпрыгажэйшай рэчы, якую ён стварыў сваімі рукамі, нечаму, дзеля чаго было варта мучыцца гэтыя месяцы і што апраўдвала цэлыя гады Аўгуставага жыцця. Можа ён і не вялікі мастак, можа толькі ўявіў сабе, што ён выключэнне сярод цяслярскіх дылетантаў, але гэта было нешта, у чым ніхто не можа ўсумніцца.

Ніхто на свеце. А створана яно аднаму адзінаму дзіцяці. Гэта яго радавала. Тое, што найважнейшы мастацкі твор з арэхавага дрэва будзе прызначацца дзіцяці.

Ён спаў на кушэтцы, якую месяц таму перанёс у пограб, каб працаваць, не замінаючы Матыльдзе. Ён хроп, скрыгатаў зубамі, і соп, як стары лясны грызун, а тым часам памалу днела і зара праз адчыненае акно сваім румяным зяннем асвятляла дом шчаслівых людзей. Яна кранула светласцю драўляныя твары мужчыны і жанчыны, якія ў гульні ценяў мянялі выразы, ад стомы і задумення да дурнаватай весялосці, характэрнай людзям, калі іх агорне тое асаблівае шчасце, якое прагоніць усякую думку пра тое, што ў жыцці яшчэ могуць здарыцца нейкія дрэнныя рэчы. У момант іх найвялікшай шчаснасці святло засланіла галава гарбара Анты: *Майстру, ужо зара, белы дзень!* Аўгуст, як паслухмяны салдат, ускочыў з кушэткі, і дзень мог пачынацца.

Яны прыехалі ў апошнюю хвіліну, калі ў Каты ўжо адыходзілі воды, павітуха бегала па хаце і бразгала бляшанымі тазамі, пальцаломны бацька стаяў перад домам белы, як сцяна, і ледзь паварушыўся, калі дзед і Аўгуст паклікалі яго, каб ён ім дапамог. Павітуха ледзь пусціла іх у Кацін пакой. *Гэта не для мужыкоў!* крычала яна, *вам абы ўсунуць, а далей не ваш клопат!* працягвала яна, пакуль Аўгуст спехам спрабаваў навесці парадак у арэхавым доме. *Бяжыце прэч, ці вам ужо святы Ілля маланкай розум адбіў!* вішчала яна, пакуль Аўгуст расстаўляў дзяцей і дарослых. Бацька, малітоўна склаўшы рукі, кленчыў перад распяццем, дзеці спалі, а маці глядзела ў бок Кацінага ложка. Павітуха выпхнула яго з пакоя, перш чым ён паспеў праверыць, ці дзіцячыя галовы павернутыя да сцяны. Хоць будзе адбывацца нешта найпрыгажэйшае на свеце, але гэта не для іхніх вачэй.

Уся тройца села перад домам, з якога неўзабаве пачуліся Каціны крыкі. Яна клікала маці, Ісуса і Марыю, стагнала, як хворы сабака пад дажджом, тады зноў крычала і казала *Рафа, Рафа, мой добры Рафа…* Пачуўшы гэта, бацька ламаў пальцы, а Аўгуст зразумеў, што яго завуць Рафа. Рафа і Ката. Гучыць складна, з такімі імёнамі добра разам старэць, падумаў Аўгуст. І нейкія хатнія гэтыя імёны.

Добра ім будзе, будуць працаваць і нажывуць яшчэ нешта ў гэтым жыцці… Гэтак ён разважаў сам з сабою, каб не глядзець на тых дваіх. Стары курыў цыгарку за цыгаркай і трымаўся так, нібы набліжаецца канец свету, а не нараджэнне дзіцяці. Ён так баяўся за дачку, што было ясна відаць, як ён не рады ўнучцы. Гэта нармальна. І Аўгуст гэтак сама баяўся за Матыльду, і калі яна нараджала, ён быў гатовы адрачыся ад дзіцяці, як Пятро ад Ісуса. Калі б Бог тады ў яго спытаўся, ён сказаў бы яму: Спыні гэта, Госпадзе! Спыні, хай бы мы ніколі й не мелі дзяцей! На шчасце, ні ў бацькаў, ні ў дзядоў Бог ні пра што не пытаецца. Бо калі б пытаўся, дзеці б не нараджаліся, або іх маглі б мець толькі бяздушныя людзі і тыя, хто не любіць сваіх жонак і дачок. Але ўсё будзе добра! Заўсёды будзе. Або амаль заўсёды. Сёння будзе добра. У Рафы і Каты будзе дзіця, і яны будуць шчаслівыя. Гэта чуваць у іхніх імёнах. Калі ўжо Аўгуст і Матыльда маглі быць шчаслівыя, хоць імёны ў іх больш пасавалі румынскім цыркачам, чым шлюбнай пары, дык як бы Рафа і Ката сёння не былі шчаслівыя? Урэшце і Аўгуст пачаў ламаць пальцы. Хрусцелі адначасна дробныя костачкі чатырох мужчынскіх рук, і гэта гучала так, быццам паляўнічы на дзікоў прабіраецца праз сухое кустоўе. Дзед курыў, моцна сціскаў кулакі, слухаў Каціны крыкі і гуканні Бога. І ўрэшце, калі схваткі скончыліся, зноў пачулася: *Рафа, Рафа, мой добры Рафа…*

Пятага красавіка 1905 года дакладна а чацвертай гадзіне папаўдні дзіця нарадзілася. Апошні крык быў доўгі, як дарога на край свету, востры, як шабля ў руцэ апошняга героя, і высокі, як сонца ў небе. У тое імгненне нічога важнейшага пад зоркай нябеснай адбывацца не магло. Войны спыніліся, калі ў той дзень нехта ваяваў, маракі на крэйсеры «Князь Пацёмкін Таўрыдскі» на нейкі момант перасталі быць галодныя і злыя, цар Мікалай II замер, не данёсшы да вуснаў кубачак гарбаты, глыбока задумаўся фінскі рыбак з нажом, які ён усадзіць у свайго сябра, Хасэ Манітас паглядзеў быку ў вочы і ўбачыў у жывёліне брата, Джон Элдар Эвіян не чхнуў, нюхнуўшы табакі, Наталля Васілеўна апошні раз азірнулася на маладога хлопца, які ніколі яе не забудзе, імператар Франц Іосіф замаўчаў пасярод фразы, і ніхто не падумаў, што гэта ад старасці, стары Бора ўзяў на

калені малога белага сабачку, каралеўскі кат дастаў хлопчыку з вока парушынку, бабёр скончыў гаць і адпачываў, японскі імператар выкашляў костачку чарэшні… Усё, што на Зямлі гаворыць, ходзіць і адчувае, спынілася ў момант нараджэння дзіцяці. Гэта немагчыма! Гэта немагчыма! Ускрыкнулі людзі, пачуўшы гэта. Але як яны маглі ведаць што магчыма, а што немагчыма? Як, калі іх тут не было? А Аўгуст ведаў. Ён плакаў, чакаючы трэці ў чарзе, калі павітуха падасць яму на рукі нованароджаную дзяўчынку. Плакалі ўсе прысутныя, апрача Каты і сям'і з арэшыны.

Гэта быў канец. І разам з тым пачатак аднаго жыцця. Чамусьці так яно выглядае. Дзіця нараджаецца, а тыя, хто сустракае яго – з усёй радасцю і шчасцем – адчуваюць, што нечаму ўсё ж надышоў канец. І што далей, прынамсі што датычыць іх, больш нічога няма. Але гэта зусім не сумнае адчуванне, і няма ў ім ніякага страху. Прынамсі Аўгуст яго не адчуў. І дзед. І Рафа. І Ката. Але некаму з іх – цяжка цяпер сказаць каму, бо душы ў іх пераліваліся адна ў адну, а думкі забываліся дзе чыя, – прыйшло ў галаву, што лёгка было б памірaць і што смерць прыйшла б без ніякага страху, калі б памірaлі яны ў тым самым ложку і ў той самы час, калі на свет прыходзіць дзіця. Такія думкі, як і сны, лёгка і хутка забываюцца. І знікае пачуццё, з якім яны з'явіліся, дык чалавек можа іх і пасаромецца. Або падумае, што нехта тут некаму нешта схлусіў.

Аўгуст узяў шыла і над брамай шчаслівага дома каліграфічна вывеў малымі рукапіснымі літарамі: арэхавы палац. Ён разбудзіў драўляную дзяўчынку і паставіў яе перад брамай. Яна назаўсёды засталася шчаслівая.

КАМЕНТАРЫ

Ст. 5 *Страдун* – галоўная вуліца ў гістарычным цэнтры Дуброўніка.

Ст. 7 *Гламач* – закінутае мястэчка на поўдні Босніі.

Ст. 12 *Лапад* – паўвостраў у прадмесці Дуброўніка з рэнесанснымі віламі і папулярнымі пляжамі.

Ст. 18 *Колачэп* – востраў недалёка ад Дуброўніка, самы паўднёвы населены востраў Харватыі.

Ст. 21 *Ўоліс Сімпсан і Эдвард* – Ўоліс Сімпсан – каханка кандыдата на брытанскі каралеўскі пасад Эдварда VIII, а пасля ягонага адрачэння ад пасаду – яго жонка. Чалавек года тыднёвіка «Time» у 1936 годзе.
Трстэна – прадмесце Дуброўніка з славутым дэндрарыем.

Ст. 35 *Бітва на Нярэтве* – наступальная аперацыя нямецкіх, італьянскіх, харвацкіх і сербскіх сілаў супраць югаслаўскіх партызанаў у паўднёвай Герцагавіне ў студзені-красавіку 1943 года, якая закончылася перамогай партызанаў. За часы камуністычнай Югаславіі – адзін з галоўных сімвалаў антыфашысцкага супраціву.

Ст. 36 *Млет, Корчула* – астравы на поўдні Адрыятычнага ўзбярэжжа Харватыі.

Ст. 41 *Сінь* – горад у Далмацыі са старадаўнім францішканскім кляштарам, месца паломніцтва.
Зэніцкая турма – у Зэніцы, горадзе ў Босніі на паўночны захад ад Сараева, лічылася найстрашнейшай турмой на Балканах.
Борыс Кідрыч – славенскі партыйны функцыянер, памёр у 1953 годзе ад лейкеміі.

Ст. 47 *Усташы* – удзельнікі Харвацкага рэвалюцыйнага руху, нацыяналістычнай фашысцкай арганізацыі. Да Другой сусветнай вайны дзейнічалі як тэрарыстычная арганізацыя ў змаганні за незалежнасць Харватыі. Пасля абвяшчэння Незалежнай дзяржавы Харватыя 10 красавіка 1941 года ўсташы стаялі на чале НДХ.

Вукаварскі з'езд – з'езд Сацыялістычнай рабочай партыі (камуністаў) Югаславіі ў ліпені 1920 года, на якім партыя змяніла сваю назву на Камуністычная партыя Югаславіі.

Ст. 53 *Пасля якога пачалася вайна* – сілы ЮНА і чарнагорскай Тэрытарыяльнай абароны пачалі наступ на Дуброўнік і артылерыйскі абстрэл 1 кастрычніка 1991 года. Адначасна пачалася блакада горада, якая працягвалася да мая 1992 года.

Ст. 64 *Пэтр Першы Караджорджавіч-аб'яднальнік* – першы сербскі кароль дынастыі Караджорджавічаў (1903–1918), кароль сербаў харватаў і славенцаў (1918–1921).

Ст. 66 *Аляксандр Караджорджавіч* – сын Пэтра I, рэгент Каралеўства Сербіі (1914–1918), Каралеўства сербаў харватаў і славенцаў (1918–1921), кароль сербаў харватаў і славенцаў (1921-1929), кароль Югаславіі (1929–1934).

Генерал Пэра Жыўкавіч – дзяржаўны і вайсковы дзеяч даваеннай Югаславіі, пасля 1941 г. на эміграцыі.

Генерал Нэдзіч – Мілан Нэдзіч, сербскі палітык, у часы нямецкай акупацыі 1941–1944 гадоў прэм'ер марыянетачнага сербскага ўраду, у 1946 годзе скончыў самагубствам, скочыўшы з акна турмы.

Дымітрые Лёціч – сербскі палітык, лідэр фашысцкай партыі Югаслаўскі народны рух «Збор», у часы нямецкай акупацыі актыўна супрацоўнічаў з немцамі, загінуў у аўтамабільнай аварыі ў 1945 годзе.

Ст. 67 *Дзядзька Дража* – Драгалюб Міхаілавіч, сербскі вайсковы дзеяч, камандуючы рухам чэтнікаў у часы Другой сусветнай вайны, за ваенныя злачынствы і супрацоўніцтва з нямецкімі акупантамі расстраляны ў 1946 годзе.

Раўна Гора – мясцовасць у Сербіі, дзе ў маі 1941 года была заснаваная армія чэтнікаў – т. зв. Раўнагорскі рух.

Ад Трыглава да Джэўджэліі – гара Трыглаў у Славеніі і горад Джэўджэлія ў Македоніі – крайнія геаграфічныя пункты на паўночным захадзе і паўднёвым усходзе Югаславіі.

Прынц Павал – рэгент Югаславіі ад 1934 да 1941 года, у перыяд малалецтва караля Пэтра II.

Футбалістаў, якія ў Фінляндыі перамаглі расейцаў – падчас найвышэйшага напружання ў адносінах паміж Ціта і Сталіным у 1952 го-

дзе на Алімпіядзе ў Хельсінкі ў адной васьмой фінала зборная Югаславіі ў двух драматычных матчах перамагла зборную СССР – 5:5 і 3:1.

Голы вострaў – галоўны лагер югаслаўскага «ГУЛАГу», дзе сядзелі палітычныя зняволеныя

Ст. 68 *Алея Вялікіх* – на Новых могілках у Бялградзе, дзе пахаваныя найвыдатнейшыя людзі Югаславіі і Сербіі.

Нядзельнай раніцай чацвёртага траўня 1980-га – дзень смерці Ёсіпа Броз Ціта.

Ст. 71 *Ветэрана Солуні* – Солунскага (Салоніцкага) фронту Першай сусветнай вайны ў 1915-1918

Ст. 72 *У Нэгоцінскім краі* – у ваколіцах Нэгоціна на мяжы Сербіі з Балгарыяй

Ст. 77 *Калі забілі караля Аляксандра* – кароль Аляксандр Караджорджавіч быў забіты ў Марселі ў 1934 годзе македонскімі і харвацкімі тэрарыстамі.

Ст. 83 *На Суцесцы і Нярэтве, Козары і Раманіі* – месцы славутых бітваў югаслаўскіх партызанаў з войскамі Восі.

Ст. 96 *Атранцкая пратока* – паміж берагамі Італіі і Албаніі, выхад з Адрыятычнага мора.

Ст. 100 *Башчаршыя* – стары рынак і галоўны турыстычны аб'ект гістарычнага цэнтру Сараева.

Ст. 101 *Срдж* – гара (413 м), ля падножжа якой размешчаны Дуброўнік.

Ст. 113 *Баклава* – кандытарскі выраб з слоенага цеста з арэхамі ў сіропе.

Ст. 114 *Заім Імамавіч, Нада Мамула і Рэйхан Дэмірджыч* – першыя два папулярныя выканаўцы сэўдалінак, традыцыйнага фальклорнага жанру гарадской любоўнай песні баснійскіх мусульманаў, трэці – баснійскі актор тэатру, кіно і тэлебачання.

Самун – традыцыйны сараеўскі хлеб круглай формы.

Ст. 115 *Нікшыч* – другі па велічыні горад у Чарнагорыі.

Удба – УДБА (Uprava državne bezbednosti) югаслаўская служба дзяржаўнай бяспекі (1946–1991).

Ст. 118 *Яхарына* – горны масіў над Сараевам.

Ст. 120 *Незалежная дзяржава Харватыя (НДХ)* – дзяржава-сатэліт нацысцкай Германіі, абвешчаная ўсташамі 10 красавіка 1941 года. У яе склад увайшла частка сучаснай Харватыі (без Істрыі і большай часткі Далмацыі, уключаных у склад Італіі) і ўся сучасная Босніі і Герцагавіна.

Ст. 121 *Антэ Павэліч* – харвацкі дзяржаўны дзеяч, кіраўнік руху ўсташаў, у 1941–1945 – кіраўнік (Правадыр) Незалежнай дзяржавы Харватыі. Пасля вайны ў эміграцыі, у 1945 годзе завочна асуджаны югаслаўскім судом на смерць. Памёр у Мадрыдзе ў 1959 годзе.

Ст. 125 *Бэгава чорба* – традыцыйны баснійскі суп з гароднінай і курыным мясам.

«Нікола Шубіч Зрынскі» – патрыятычная опера харвацкага кампазітара Івана Зайца (1876), у якой апявацца перамога харвацкага і венгерскага войска над туркамі ў Сігетварскай бітве (1566). Арыя «У бой, у бой!» стала харвацкай патрыятычнай песняй.

Ст. 127 *Улашыч, Звезда, Ураніца* – горныя масівы ў цэнтральнай Босніі.

Сэўдалійскай тугі сараеўскіх вуліц – маецца на ўвазе традыцыйная гарадская песенная культура баснійскіх мусульманаў.

Ст. 129 *Давід Штрбац* – хітры і дасціпны селянін з апавяданняў і драмаў сербскага пісьменніка Пэтра Кочыча(1877–1916).

Ст. 132 *Ясэнавац* – канцэнтрацыйны лагер у Славоніі часоў НДХ, адзін з найбольшых канцлагероў у Еўропе часоў Другой сусветнай вайны. У ім загінула больш за 80 тысячаў чалавек – пераважна сербы, яўрэі і цыганы.

Чавапы – від кебабу, запечаныя на грылі каўбаскі з меленага мяса.

Ст. 149 *Эстафета маладосці* – штогадовае спартова-палітычнае мерапрыемства ў Югаславіі на дзень нараджэння маршала Ціта 25 мая. Тысячы юнакоў і дзяўчат беглі па ўсіх рэспубліках СФРЮ, перадаючы эстафеты, урачыстасць заканчвалася ў Бялградзе перадачай іх кіраўніку дзяржавы.

Ст. 153 *Брач і Шкой* – Брач – востраў ля Адрыятычнага узбярэжжа Харватыі, Шкоі – група маленькіх незаселеных астравоў паміж астравамі Корчула і Пэлешац.

Ст. 154 *Ён ненавідзеў Сталіна яшчэ да рэзалюцыі Інфармбюро* – пава-

енны савецка-югаслаўскі ідэалагічны канфлікт меў вынікам рэзалюцыю Інфармацыйнага бюро камуністычных і рабочых партый ад 29 чэрвеня 1948 года, дзе югаслаўскаму кіраўніцтву было ультыматыўна запрапанавана змяніць свой самастойны курс і «прызнаць свае памылкі». Гэта прывяло да разрыву адносінаў паміж Югаславіяй і СССР, якія аднавіліся ў 1953 годзе пасля смерці Сталіна.

Ст. 155 *Ознашу ці удбашу* – ОЗНА (Odjeljenje za zaštitu naroda) служба бяспекі ў камуністычнай Югаславіі (1944–1946). Пасля рэарганізацыі ОЗНА ў 1946 годзе функцыі тайнай паліцыі пераняла УДБА.
Да лета 1948 года нападаў на Сталіна – да разрыву Ціта са Сталіным.

Ст. 156 *Джэймс Сцюарт* – амерыканскі актор 1930-50-х гадоў.

Ст. 161 *Моладзь сцякала крывёю ў Сталінградзе* – 369-ы ўзмоцнены пяхотны полк арміі НДХ (Харвацкі легіён) ваяваў пад Сталінградам.
Бараніла харвацкія межы на Дрыне – па рацэ Дрыне праходзіць мяжа паміж Босніяй (у 1941–1945 у складзе НДХ) і Сербіяй.
Срэмскі фронт – лінія абароны краінаў Восі пасля вызвалення Бялграду ў кастрычніку 1944 года. Пасля прарыву фронту сіламі югаслаўскіх партызанаў з падтрымкай савецкай арміі акупаваная частка Югаславіі была вызваленая.

Ст. 163 *Парпарэла* – пірс і пляж у Дуброўніку.
Яблаціца – горад у цэнтральнай Босніі.

Ст. 167 *Дабярэцца да мяжы ў Горыцы* – Горыца, горад у Славеніі на мяжы з Італіяй.

Ст. 168 *Куды хіліць кароль Пэтар* – Пэтар II Караджорджавіч, апошні кароль Югаславіі (1934–1945), ад 1941 года ў эміграцыі. Пасля 1945 года жыў у Лондане, апошнія гады правёў у Амерыцы, дзе і памёр у 1970 годзе.

Ст. 171 *Там шмат аптантаў з Істры* – у 1947 годзе паўвостраў Істра (Істрыя) быў далучаны да Югаславіі, італьянскае насельніцтва паўвострава мела права выехаць у Італію.

Ст. 180 *На Сочы* – рака Соча (*im.* Isonzo), па якой да 1918 года праходзіла мяжа паміж Італіяй і Аўстра-Венгрыяй. Падчас Першай сусветнай

вайны паміж маем 1915 і лістападам 1917 года на Сочы адбылося дванаццаць крывавых бітваў, у якіх загінула больш за 300 тысячаў італьянскіх і аўстра-венгерскіх салдатаў.
Монтэ Малеты – мясцовасць у Паўднёвым Тыролі, дзе 7 чэрвеня 1916 года адбылася бітва паміж італьянскай і аўстра-венгерскай арміямі.

Ст. 182 *Маршалат* – заснаваны ў 1953 годзе адміністрацыйны орган пры маршалу Ёсіпу Броз Ціта.

Ст. 191 *Труманавы яйкі* – паваенная гуманітарная дапамога, пакеты з якой саюзнікі скідалі з самалётаў. У пакетах сярод іншага былі яйкі ў парашку.

Ст. 196 «*Палітыка*» і «*Аслабаджэнне*» – найбуйнейшыя газеты ў Бялградзе і Сараеве.

Ст. 198 *Шайкача* – традыцыйная сербская шапка, падобная да пілоткі, ад пачатку XX стагоддзя лічыцца сімвалам сербскага нацыянальнага руху.
Сербіянцы – сербы з Сербіі.

Ст. 199 *Пераходзілі Дрыну* – з Сербіі ў Боснію.

Ст. 201 *Мой бацька спаў з ваўкамі на Ўлашычу* – Улашыч – горны масіў у цэнтральнай Босніі.

Ст. 202 *Дэвотка з Каралёвай Суцескі* – Каралёва Суцеска – паселішча ў цэнтральнай Босніі, дзе месціцца францішканскі кляштар XIV стагоддзя.

Ст. 207 *У чыю старадаўнюю пляцёнку ўтканыя векавыя жаданні гэтага народа* – харвацкая пляцёнка (pleter, pletenica) – элемент харвацкага нацыянальнага арнаменту з трох пераплеценых стужак.

Ст. 209 *Будаўніцтва чыгункі Брчка-Банавічы* – першая моладзевая «працоўная акцыя», падчас якой у 1946 годзе больш за 60 тысяч маладых людзей збудавалі ў паўночнай Босніі ўчастак чыгункі даўжынёю 92 кіламетры.

Ст. 210 *Аднаго дамабранскага падафіцэра* – Дамабранства – назва рэгулярных узброеных сілаў НДХ у 1941–1945 гадах.

Ст. 214 *Хурмашыца* – печыва, прамочанае сіропам.

Ст. 216 *Груж* – прадмесце Дуброўніка, дзе месціцца гарадскі порт.

Ст. 223 *Віс* – востраў ля Адрыятычнага ўзбярэжжа, у часе Другой сусветнай вайны пасля капітуляцыі Італіі ўвосень 1943 года заняты партызанамі. Нейкі час там была сядзіба Ёсіпа Броз Ціта і генеральны штаб партызанскага руху.

Ст. 235 *Як Ліндберг перад палётам* – Чарлз Ліндберг, славуты амерыканскі авіятар, які ў 1927 годзе ўпершыню ў гісторыі адзін пераляцеў праз Атлантычны акіян.

Ст. 243 *Італьянскую акупацыйную зону* – Італія ў 1941–1943 гадах займала Істру і частку Далмацыі.

Ст. 245 *І там, дзе яго завуць жыдоўскім, і тут, дзе завуць яўрэйскім* – Яўрэй па-харвацку Žid, па-сербску Jevrej.

Ст. 249 *Барбут* – від гульні ў косці.

Ст. 251 *На калядным прыёме ў Вялікага жупана* – НДХ адміністрацыйна была падзеленая на 22 жупы, на чале цывільнай улады ў якіх стаялі вялікія жупаны.

Ст. 254 *Боза* – слабаалкагольны густы і салодкі ферментаваны напой з забрадзілага проса або кукурузы.

Ст. 255 *З Врбаса чулася шаргія* – Врбас – рака, на якой стаіць горад Баня Лука, шаргія – традыцыйны струнны інструмент турэцкага паходжання.
Гісторыя двух сяброў, Латыфа і Сулеймана – героі сэўдалінкі «Put putuje Latif aga».

Ст. 271 *Марак са Зворніка* – Зворнік – горад на паўночным усходзе Босніі, далёка ад мора.

Ст. 280 *Каймакчаланская бітва* – бітва ў 1916 годзе паміж сербскімі і балгарскімі войскамі на Солунскім фронце Першай сусветнай вайны пад Каймакчаланам на мяжы з Грэцыяй.
Мохачская бітва – бітва ў 1526 годзе каля венгерскага Мохача паміж венгерскімі войскамі і туркамі на чале з Сулейманам I, якая скончылася перамогай туркаў.
Рэвелін – сярэднявечная крэпасць у Дуброўніку.

Ст. 281 *Рудольф Валентына* – зорка амерыканскага кінематографу

эпохі нямога кіно, поп-ікона і сэкс-сімвал 1920-х, памёр у 1926 годзе, калі яму быў 31 год.
Сцяпан Радзіч – харвацкі палітык, заснавальнік і лідэр Харвацкай сялянскай партыі. Дэпутат парламента Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў. У 1928 годзе забіты сербскім нацыяналістам падчас пасяджэння парламента.

Ст. 295 *Рэпрадукцыя Прэдзічавай «Косаўскай дзяўчыны»* – Косаўская дзяўчына, гераіня сербскага эпасу, якая дапамагае параненым сербскім воінам на полі бою. Алегорыя Сербіі і адзін з сімвалаў сербскай культуры. Яе ў 1919 годзе выявіў на сваёй карціне сербскі мастак Ураш Прэдзіч.

Ст. 301 *Красавіцкая параза* – 6 красавіка 1941 года краіны Восі напалі на Югаславію, у выніку кароткай Красавіцкай вайны 17 красавіка югаслаўскія ўлады падпісалі капітуляцыю, краіна была падзеленая паміж Германіяй, Італіяй, Венгрыяй і Балгарыяй.
Разумнікі вакол маладога караля Пэтра – кароль Пэтар II пакінуў краіну і жыў у выгнанні ў Лондане.

Ст. 310 *Легіён Францэціча* – Юрэ Францэціч – адзін з кіраўнікоў руху ўсташаў, пасля ўтварэння НДХ – намеснік Павэліча ў Босніі, камандзір 1-й рэгулярнай дзейнай брыгады («Чорнага легіёна») – элітнага падраздзялення харвацкага войска.
Раманія – гарыстая мясцовасць на ўсход ад Сараева, падчас Другой сусветнай вайны кантраляваная югаслаўскімі партызанамі.

Ст. 324 *Скадарлія* – багемны квартал у старым Бялградзе.

Ст. 326 *Мір-Ям* – псеўданім сербскай пісьменніцы Міліцы Якаўлевіч, аўтаркі папулярных рамантычных раманаў часоў Каралеўства Югаславіі.

Ст. 327 *Гаршкі з аксаміткамі на акне Бэгавіны* – Бэгавіна – старадаўні квартал у мястэчку Столац па дарозе з Дуброўніка ў Мостар.
Буна – кароткая рэчка ў наваколлі Мостара.
Тэкія – прытулак дэрвішаў, суфійскі манастыр.
Вележ – горны масіў над Мостарам.

Ст. 335 *Баш-Чэлік* – персанаж сербскага фальклору, адпаведнік Кашча Несмяротнага.

Ст. 343 *Псішэ* – прастакутнае або авальнае люстэрка, шарнірна замацаванае паміж дзвюма стойкамі.

Ст. 359 *Ахірэт* – у мусульманскай традыцыі – той свет, «будучы свет».
Джэнэт – рай.
Джэхэнэм – пекла.

Ст. 361 *Фрытулы* – далматынскі святочны пачастунак, смажаны ў алеі шарык з дражджавога цеста з разынкамі, пасыпаны цукровай пудрай.

Ст. 362 *Брадэт* – рыбны булён з таматным соўсам і цыбуляй, звычайна падаецца з палентай.
Бузар – соўс на белым віне з часнаком, паніровачнымі сухарамі, пятрушкай, алеем і цыбуляй.
Крошгулы – далматынскае печыва, смажанае ў алеі ў форме грабенчыкаў, пасыпанае цукровай пудрай.

Ст. 365 *Траварыца* – дэстылат з вінаграду, настоены на зёлках.
Элафіты – Элафіцкія астравы, група невялікіх астравоў на паўночны захад ад Дубраўніка.

Ст. 369 *Кірня* – рыба з сям'і каменных акунёў.

Ст. 387 *Турэцкага султана замяніў аўстрыйскі імператар* – Аўстра-Венгрыя акупавала Боснію ў 1878 годзе.

Ст. 388 *Герцаг-Босна* – назва Босніі і Герцагавіны, ужываная ў канцы XIX стагоддзя.

Ст. 390 *Бэг* – шляхецкі тытул у Асманскай імперыі, ветлівы зварот да заможнага і паважанага чалавека.

Ст. 394 *Леблебія* – нут, турэцкі гарох.
Бэзістан – крыты рынак у Сараеве, збудаваны ў 1555 годзе.
Хафіз – мусульманін, які ведае на памяць Каран.
Скендэрыя – квартал у старым Сараеве.

Ст. 395 *Абдэст* – рытуальнае абмыванне перад малітвай.
Джэнэцкія гурыі – райскія панны.
Бурэк – традыцыйны несалодкі пірог з слоенага цеста з рознай начынкай.

Ст. 396 *Аліпаша Рызванбэгавіч* – асманскі вяльможа, герцагавінскі паша (1832–1851).

Аман ярабі, вэла хаўле вела кувэтыле – пабожнае выслоўе як выраз здзіўлення: «О мой Госпадзе, няма ні сілы, ні моцы, [як толькі ў Бога ўсемагутнага]».

Ст. 399 *Будзь табе спакой вялікі, бяскрайні, бязмежны...* – радок з песні «Nema te više, Alija».

Ст. 400 *Туфахія* – печаны яблык, начынены мёдам і арэхамі.

Ст. 401 *А тады ў нас яшчэ і бэгаўство пабунтавалася* – паўстанне баснійскіх бэгаў (Вялікае баснійскае паўстанне) у 1831–1833 гадах у адказ на рэформы султана Махмуда II.

Ст. 402 *Салеп* – безалкагольны напой з кораня аднайменнай расліны.

Ст. 403 *Ханума* – замужняя мусульманка, ветлівы зварот да жанчыны.
Аскер – жаўнер у турэцкім войску.
Гайдукі – бандыты-паўстанцы супраць асманскай улады.
Караджорджавы паўстанні – паўстанні сербаў супраць асманскай улады ў 1804–1813 і ў 1815 гадах, у выніку якіх была абвешчаная незалежная Сербія.

Ст. 404 *Ходжа* – мусульманская духовая асоба, тэолаг, прафесар у медрэсэ.

Ст. 405 *Сэўдалія* – выканаўца сэўдалінак.
Саз – струнны інструмент, часта ўжываны для акампанементу пры выкананні сэўдалінак.

Ст. 407 *Махрама* – баснійская хустка.

Ст. 408 *Завялікага і для візіраў, таму яны ніколі ў ім не мелі рэзідэнцыі* – рэзідэнцыя асманскіх візіраў (султанавых намеснікаў) у Босніі мясцілася ў Траўніку.

Ст. 410 *Ага* – малодшы вайсковы і цывільны тытул у Асманскай імперыі.
Газія – герой войнаў з няверным.

Ст. 412 *Чаршыя* – цэнтр мусульманскага горада або мястэчка; вуліца або пляц з крамамі і майстэрнямі; гандлёвыя кварталы.

Ст. 414 *Турапольская свіння* – харвацкая аўтахтонная парода свойскай свінні, паходзіць з рэгіёну Тураполле на поўдзень ад Заграба.

Ст. 415 *Кроў у іх перад вачыма, як бы 1878-га было мала* – у 1878 годзе Боснію акупавала Аўстра-Венгрыя.

Ст. 437 *Баніноўскія могілкі* – галоўныя могілкі Дуброўніка.

Ст. 449 *Балканскія войны* – у Першай балканскай вайне (1912–1913) Балгарыя, Грэцыя, Сербія і Чарнагорыя ваявалі з Асманскай імперыяй за пашырэнне сваіх тэрыторый, у Другой балканскай вайне (1913) Балгарыя ваявала з Грэцыяй, Сербіяй і Чарнагорыяй за перадзел тэрыторыяў, заваяваных падчас Першай балканскай вайны.

Ст. 451 *Калі султан Мэхмэд Эль Фатых выправіўся заваёўваць Боснію* – султан Мэхмэд Заваёўнік захапіў Боснію ў 1463 годзе.

Ст. 464 *Каралевіч Марка* – сербскі князь XIV стагоддзя, герой эпасу паўднёвых славянаў.
Джэрзэлез Алія – герой баснійскага мусульманскага эпасу, тыпалагічна блізкі Каралевічу Марку.

Ст. 479 *Толмін* – горад у Славеніі на мяжы з Італіяй.

Ст. 481 *Карл Штублер* – чыгуначнік Карл Штублер, прадзед Міленкі Ергавіча.
Кароль Томіслаў – першы харвацкі кароль (925–928).

Ст. 482 *Заастрог* – папулярны курорт каля Макарскай з старадаўнім францішканскім кляштарам.

Ст. 484 *Муса Кесэджыя* – фальклорны супернік Каралевіча Маркі.

Ст. 485 *Катарына Косача* – апошняя каралева Босніі (1446–1461).

Ергавіч, М.

Е69 Арэхавы палац : раман / Міленка Ергавіч; пер. з харвацкай мовы Сяргея Шупы. — Мінск : Зміцер Колас, 2019. — 508 с.

ISBN 978-985-23-0042-1

«Арэхавы палац» – раман-сага, у якім расказваецца гісторыя далматынскага горада Дуброўнік і яго навакольля праз гісторыю адной сям'і. У пятнаццаці раздзелах аўтар запрашае ў падарожжа праз XX стагоддзе з адваротным адлікам часу, яно пачынаецца ў 2002 годзе псіхічным зломам і смерцю 97-гадовай Рэгіны Дэлавале і канчаецца яе нараджэннем. У гэтых карцінках сямейнага жыцця перад чытачом раскрываюцца драмы і трагедыі штодзённага і нештодзённага жыцця. Кніга можа служыць мастацкімі ўводзінамі ў гісторыю Югаславіі мінулага стагоддзя. Гэта трэцяя кніга Міленкі Ергавіча, якая выходзіць па-беларуску (раней выйшлі «Сараеўскае мальбара» і «Іншала, мадона, іншала»).

Адрасуецца шырокай чытацкай аўдыторыі.

УДК 821.163.4-31

ББК 84(4Хор)-44

Літаратурна-мастацкае выданне

Ергавіч Міленка

АРЭХАВЫ ПАЛАЦ

Раман

Адказны за выпуск *Зміцер Колас*

Падпісана ў друк 08.01.2019.
Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк лічбавы.
Усл. печ. л. 29,41. Ул.-выд. арк. 26,72.
Наклад 500 асобнікаў.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/291 ад 17.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.